ЗЬМЕСТ

Праз прызму жыцьця *(Сяргей Будкін)* ... 8
На хвалі вяртаньня *(Віктар Жыбуль)* ... 11

«Мы — апошнія зь першых ластавак...»: Анатоль Вольны *(Антон Рудак, Віктар Жыбуль)* ... 14
АНАТОЛЬ ВОЛЬНЫ
Кастусь Каліноўскі *(Разьдзелы з паэмы)* ... 26
«Ў мармуровым сьнягу...» ... 28
Сінія кветкі ... 29
З цыклю «Літаратурныя сылюэты»
Міхась Чарот ... 38
Алесь Дудар ... 42

«Хто ўзімку жыве, як вясной...»: Юрка Лявонны *(Віктар Жыбуль)* ... 44
ЮРКА ЛЯВОННЫ
Падарожнае (У падшэфную) ... 55
З поўдню ... 55
Зімовая радасьць ... 56
Роднае ... 56
Правады ... 57
«Я хачу няшмат чаго...» ... 58
Вось таму... ... 59
Мой май ... 59
У дзяцінстве ... 60
Аборт ... 61

Уладыслаў Галубок і яго Муму *(Васіль Дранько-Майсюк)* ... 64
УЛАДЫСЛАЎ ГАЛУБОК
Забытая хатка ... 79
Будучыня ... 80
Мінуўшчына ... 81
Бор ... 81
У бальніцы ... 82
Гонар ... 82
Голад ... 83
Белы вянок *(Драма ў адным акце)* ... 85

«Жыцьцё ня за, а перада мной»: Юлі Таўбін *(Андрэй Хадановіч)* ... 94
ЮЛІ ТАЎБІН
Адкінуўшы фіранку ... 107
Ты помніш ... 107
«Даверлівы — зусім не скептык...» ... 108
Лірычнае хваляваньне ... 108
Сталасьць ... 109
Занатоўкі ... 110
Дужы вецер і маладзік з Гётэвае аповесьці ... 112

Таўрыда *(Фрагмэнты з паэмы)* 115
Зь нізкі «Сьмерць» 118
Сябрам *(З расейскамоўных вершаў)* 119

Лірык двух нараджэньняў: Зяма Піваараў *(Віктар Жыбуль)* 122

ЗЯМА ПІВААРАЎ

Зь яўрэйскіх матываў *(Ліст у Амэрыку)* 134
Пантамімічны гэст 134
Качагар 136
Песьня пра дзяўчыну і Біра-Біджан 137
«Я стаю…» 138
Гутарка з электраманцёрам 139
Мэтрапалітэн 140
Павятовы гарадок *(Урывак з паэмы)* 141
Аляксандр Пушкін. Дэман *(Пераклад З. Піваварава)* 143

Босы на вогнішчы: Міхась Чарот *(Ганна Севярынец)* 144

МІХАСЬ ЧАРОТ

Каб я быў 155
Бунтар 155
Нашы дні 156
Вясну пяю 157
«Я зноў — дзе поле каласамі…» 158
Балотам сьнежным праз сасоньнік 159
Маладняк 160
Зарунела, зарунела… 161
Шляхам зімнім 161
Вясна і дзяўчына 162

Сьвятло зялёнай зоркі: Алесь Дудар *(Ганна Севярынец)* 164

АЛЕСЬ ДУДАР

Я малады 177
Цені 177
«за маым акном — абрывы…» 178
«Заблудзіла зялёная зорка…» 179
«І ў нязнанай цьмянай далі словаў новых мы шукалі…» 179
Трыюмф 180
«Маліліся пад крыжам…» 181
«Асыпае чэрвень белы сад…» 182
Кніга 183
Зварот 183
Хрушчы 184
«Я радзіўся за хатай пад плотам…» 185
«Пасеклі наш край папалам…» 186
«Цені блудзяць па твары…» 187
На станцыі 188

«Я — прага быць...»: Майсей Кульбак *(Вольф Рубінчык)* 190

МАЙСЕЙ КУЛЬБАК

Зорачка 203
Ці маеш ты хлеб? 203
Сусьвет 204
Месячная ноч 205
«Хто блукае па садзе? Мой дзень кінуў цень...» 206
Гультай 206
Вечна, вечна 207
Козачка 207
Віно старое бродзіць ува мне 208
«Навошта мне знаёміцца з тугой...» 209
«Ах, песьня, песьня, сьветлая душа...» 209
«Сьнягі. Сьнягі. Сьвятло ад зоркі вострае, як крык...» 209

Міхась Зарэцкі і яго пекла, зь якога няма выйсьця *(Васіль Дранько-Майсюк)* 210

МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ

Пела вясна 219
Дзіўная 219
Паэма пра чорныя вочы 225

«Душу я выпяю да дна...»: Валеры Маракоў *(Антон Рудак, Віктар Жыбуль)* 228

ВАЛЕРЫ МАРАКОЎ

Зь вёскі 244
«Сьціскаецца сэрца не таму, што восень...» 244
«Над сінім лесам, шэрым полем...» 245
«Эх ты, поле! Шырокае поле...» 246
«Тут так хораша, сьвету так многа...» 246
«Пеў пякучыя песьні свае салавей...» 247
Жаданьне 248
«Там...» 248
«Пракрычалі пеўні ўночы...» 250
«Пазнаў і я, што ёсьць прырода...» 250
Адышоўшым 251
Заяц 251
«Я помню, — яблыні цьвілі...» 252

«На ледзяной гітары»: Тодар Кляшторны *(Андрэй Хадановіч)* 254

ТОДАР КЛЯШТОРНЫ

Зь нізкі «Кляновыя завеі» 269
На ледзяной гітары 270
«Белыя паляны, белыя гаі...» 271
Ліст у Сібір 272
Хочу жыць 273
«Плачуць асеньнія клёны...» 274
Зазімак 275
Мая любімая 276
У вёсцы 278

Калі асядае муць *(Фрагмэнты з паэмы)* 279
Растратчык 283

«І скамарох, і грэшнік»: Ізі Харык *(Вольф Рубінчык)* 286

ІЗІ ХАРЫК

«Сын з горам вярнуўся, о Божа!..» 298
«Ня трацьце сябе ў паняверцы...» 298
«Век настане такі...» 299
«Мы валім лес, вясёлыя сябры...» 299
«У нашым садзе не сустрэць нікога...» 300
У шэрым змроку 300
«Сьпявала ноч пяшчотнаю гітарай...» 301
Цьвіце жыта 301
«Я прачнуся і ўстану на досьвітку, рана...» 302
З паэмы «На чужым вясельлі» 303

Зьміцер Жылуновіч і яго крыўда *(Васіль Дранько-Майсюк)* 304

ЦІШКА ГАРТНЫ

Восень 391
З цыклю «Горад»
І. Адвячоркам 319
ІІ. Ноччу 320
«Больш за ўсіх» *(Апавяданьне)* 320

«...У рамашкавым полі»: Сяргей Фамін *(Віктар Жыбуль)* 334

СЯРГЕЙ ФАМІН

«Я бачыў вас даўно. І многа праляцела...» 348
«Калыхнулася месяца сінь...» 348
«Восень зноў...» 349
«За вакном задыхаецца вецер...» 349
Зь нізкі вершаў «Дымнае жыта» 350
Вясна 351
«Сіняй ноччу ў месячную замець...» 351
«Пад звон сярпоў — нямала перажыта...» 352
«Пагубляла рубіны рабіна...» 353
Прыяцель 354

«Дыхтоўны пошчак творчай стромы»: Сяргей Астрэйка *(Віктар Жыбуль)* 356

СЯРГЕЙ АСТРЭЙКА

«Вясна... І сінія завеі...» 365
«Я іду дарогай... Навакол загоны...» 365
Глухая ноч 366
На расьцяробе 367
Прошвы пэўнасьці 368
З паэмы «Змарагды кроз»:
Чаму каганцы дагарэлі (Містэрыя сну) 369
Канцы дарог (Вятрачы плач) 371

З паэмы «Бэнгалія»

Надломаны крык Сузарыты 373
Нелад 374
Народжаны голас 375

Неадменны сакратар Адраджэньня: Вацлаў Ластоўскі *(Язэп Янушкевіч)* 378

ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ

Дума на Полацкім замчышчы 393
«Формаў трупехлых я вораг дасконны…» 393
Рэйнскі вадапад 394
Кёльнскі сабор 395
У Альпах 395
Чытаючы Гамэра 396
Зорнік 396
На ўзьмежы 398
Пішы… 398
У час аблогі 399

«Як з ускрытай вены…»: Сяргей Мурзо *(Віктар Жыбуль)* 400

СЯРГЕЙ МУРЗО

Вясна ў ліцейнай 409
Увечар 409
Ля сталёвых бліскучых станін 410
З цыклю «Дарога» 411
Вечар 411

Выйсьці зь ценю: Васіль Шашалевіч і яго драматургія *(Ганна Кавалёва, Аляксей Стрэльнікаў)* 412

ВАСІЛЬ ШАШАЛЕВІЧ

Сымфонія гневу *(П'еса ў трох актах)* 423

Зьвесткі пра аўтараў 436

ПРАЗ ПРЫЗМУ ЖЫЦЬЦЯ

Гэтая кніга — не пра ахвяраў.

У ёй расказваюцца гісторыі маладых і амбітных людзей, якія жылі напоўніцу. Кахалі і верылі, расчароўваліся і памыляліся. Яны засьпелі гістарычныя зьмены, сталі сьведкамі зьяўленьня новай краіны. І менавіта ім выпаў лёс фармаваць яе культурнае аблічча.

...Іх перапынілі на паўслове. Лёс усіх герояў гэтай кнігі абарваўся трагічна, як і жыцьцё значнай часткі ўсёй інтэлігенцыі таго часу. Але Беларусь выжыла, і цяперашняму пакаленьню выпаў лёс падлічыць страты. Мы мусім гэта зрабіць, каб кожная ахвяра была названая і аплаканая.

І гэта толькі першы ўзровень ушанаваньня.

Беларусы ўспрымаюць сваю гісторыю ў двух кірунках — трагічным і гераічным. Мы ганарымся перамогамі пад Грунвальдам і Воршай, сьмеласьцю і нескаронасьцю Касьцюшкі, Плятэр і Каліноўскага. І кажам пра тое, што беларусаў у розныя часы прыціскалі, падзялялі, зьнішчалі. Якраз у такім рэчышчы ўспрымаецца тэма сталінскіх рэпрэсіяў. І гэта безумоўна надзвычай трагічная старонка нашай гісторыі, але каб глыбей асэнсаваць і перажыць гэтую траўму, важна перайсьці і на другі ўзровень, а менавіта — паглядзець на мінулае праз прызму жыцьця. Ушанаваць творцаў ня



Пленум Цэнтральнага бюро Ўсебеларускага аб'яднаньня паэтаў і пісьменьнікаў «Маладняк». Менск, 21–23 сакавіка 1925 г.

1-ы шэраг (сядзяць, зьлева направа): Нічыпар Чарнушэвіч (арыштаваны ў 1930 г., атрымаў 5 гадоў ссылкі), Паўлюк Шукайла (арыштоўвалі ў 1930 і 1938 г., расстраляны ў 1939 г.), Кандрат Крапіва, Алесь Дудар (арыштоўвалі ў 1929, 1930, 1936 г., расстраляны ў 1937 г.), Андрэй Александровіч (арыштоўвалі ў 1938 і 1949 г., правёў 9 гадоў у лягерах і 6 гадоў у ссылцы), Апанас Гаруновіч (арыштаваны ў 1937 г., расстраляны ў 1938 г.), Алесь Якімовіч;

2-гі шэраг (сядзяць): Анатоль Вольны (арыштаваны ў 1936 г., расстраляны ў 1937 г.), Лазар Каплан (далейшы лёс невядомы), Усевалад Ігнатоўскі (дапытвалі ў 1930 г., скончыў жыцьцё самагубствам у 1931 г.), Міхась Чарот (арыштаваны і расстраляны ў 1937 г.), Уладзімер Дубоўка (арыштоўвалі ў 1930, 1937, 1949 г., у турмах і ссылцы правёў 24 гады), Янка Купала (дапытвалі, рабіў спробу самагубства ў 1930 г.);

3-ці шэраг (стаяць): Максім Лужанін (арыштаваны ў 1933 г., атрымаў 2 гады лягераў), Мікола Аляхновіч (арыштаваны ў 1936 г., правёў у лягерах 4 гады), Ілары Барашка, Валяр'ян Ляшэвіч (арыштаваны ў 1933 г., правёў 3 гады ў ссылцы), Кузьма Чорны (арыштаваны ў 1938 г., правёў 8 месяцаў у турме), [Яўгенія Пфляўмбаўм], Адам Бабарэка (арыштавалі ў 1930 г., правёў 7 гадоў у ссылцы, паўторна ў 1937 г. асуджаны на 10 гадоў лягераў, праз год памёр), Язэп Пушча (арыштаваны ў 1930 г., 5 гадоў пазбаўленьня волі), Міхась Зарэцкі (арыштаваны ў 1936 г., расстраляны ў 1937 г.), Уладзімер Паскрэбка (арыштаваны ў 1937 г., расстраляны ў 1938 г.);

4-ы шэраг (стаяць): Язэп Падабед (арыштаваны ў 1936 г., далейшы лёс невядомы), [Кузьма Мурашкевіч], Янка Туміловіч (арыштаваны ў 1936 г., 7 гадоў пазбаўленьня волі, памёр у лягеры ў 1937 г.)

толькі за тое, што іх забілі, але і за тое, што яны зрабілі: прыняць іх у нашым часе, асэнсаваць тое, што яны пасьпелі стварыць, працягнуць іх гісторыю далей і распавесьці пра іх саміх. Без патасу. Нам трэба размаўляць пра сваё мінулае, задаваць яму нязручныя пытаньні і спрабаваць убачыць яго такім, якім яно было, — недасканалым, супярэчлівым і, самае галоўнае, — натхняльным. На роздум, крэатыў і новыя зьдзяйсьненьні.

Праект «(Не)расстраляныя» аб'яднаў вакол сябе каля 50 чалавек, якія хочуць, каб забітыя 80 гадоў таму творцы жылі надалей і сталі часткаю сучаснае культурнае прасторы.

Дзякуючы музыкам паэзія 1930-х загучала ў розных стылях — ад блюзу да рэпу. Вядомыя беларускія выканаўцы запісалі ў студыі 12 песень, а пасьля зьявіліся яшчэ пяць, ужо з ініцыятывы іншых музыкаў, якія захацелі далучыцца да праекту. Усе гэтыя трэкі аб'яднаныя пад адной вокладкай у выглядзе музычнага альбому.

Дзякуючы дасьледнікам пра творцаў дазналіся тысячы людзей. У межах праекту прайшлі 23 адкрытыя лекцыі ў Менску і ўва ўсіх абласных гарадах.

Дзякуючы апэратарам, гукарэжысэрам, мантажыстам аўдыё- і відэаматэрыялы праекту захаваныя і даступныя для слуханьня і прагляду. Альбом «Нерасстраляныя» зьявіўся на асноўных лічбавых платформах і ў сацыяльных сетках. На Youtube можна знайсьці відэавэрсію канцэрту «(Не)расстраляная паэзія»,



які прайшоў 29 кастрычніка 2017 году ў менскім клюбе «Брюгге». Таксама можна паглядзець відэавэрсіі ўсіх адкрытых лекцыяў, што праходзілі ўвосень 2017 і 2018 гг. у менскай кнігарні «Логвінаў». На пачатку 2020 году на падставе гэтых лекцыяў на адукацыйнай плятформе «Лятучы ўнівэрсытэт» зьявіўся адукацыйны курс.

Дзякуючы дызайнэрам гэты праект атрымаў прыгожую аздобу. Наста Шастак распрацавала стыль праекту. Таксама ўбачыла сьвет сэрыя з 12 «маўклівых кніг» — нататнікаў з выявамі паэтаў і цытатамі зь іхных твораў. На задуму аўтаркі Кацярыны Пікірэні, мы мусім запоўніць гэтыя пустыя старонкі сваімі думкамі, словамі, творамі, як бы дапісаць тое, чаго не пасьпелі расстраляныя творцы. Дызайн гэтай кнігі распрацаваў Анатоль Лазар (Wiecier Mechaniczny).

А яшчэ героі праекту ажылі ў віртуальным сусьвеце. Анатоль Вольны цяпер можа ставіць лайк Валерыю Маракову, Міхась Чарот рэпосьціць верш Зямы Піваварава, а Майсей Кульбак усьміхаецца толькі што дададзенай фотцы Ізі Харыка. У Facebook ёсьць 12 пэрсанальных старонак паэтаў, дзе публікуюцца іхныя творы, фота, успаміны. Суполкі «(Не)расстраляныя» ёсьць у Facebook, Instagram і «ЎКантакце».

Лягічным працягам праекту стала кніга з гісторыямі жыцьця пісьменьнікаў, іхнымі абранымі творамі ды ілюстрацыямі, частка зь якіх друкуецца ўпершыню. Аўтары артыкулаў ня проста перадаюць сухія радкі біяграфій, яны даюць кантэкст таго часу, і мы разумеем, як тады жылі і чым дыхалі маладыя пісьменьнікі.

Гэтае выданьне прызначанае для самага шырокага кола чытачоў — ад школьнікаў да навукоўцаў. Кніга выйшла тарашкевіцаю на знак павагі і да паэтаў, якія збольшага дарэформавым правапісам і карысталіся, і да самога правапісу, які таксама ў сутнасьці расстралялі. Браніслаў Тарашкевіч ды большасьць ягоных паплечнікаў-моваznаўцаў былі пакараныя сьмерцю ці этапаваныя ў лягеры. Іхныя кнігі сканфіскавалі зь бібліятэк і кнігарняў ды спалілі. Моўным рэдактарам гэтага выданьня пагадзіўся стаць Вінцук Вячорка, адзін з аўтараў сучаснага зводу правілаў беларускага клясычнага правапісу.

Адукацыйны курс «(Не)расстраляная паэзія» Лятучага ўнівэрсытэту

Праект «(Не)расстраляныя» не сканчаецца выхадам гэтае кнігі і ўжо зробленымі справамі. Мы ўсе можам стаць удзельнікамі гэтага вялікага праекту, каб вярнуць тое, што ў нас забралі. Героі таго часу мусяць ажыць у вашых песьнях, творах, малюнках. Проста ў вашых думках.

Праект «(Не)расстраляныя» прысьвячаецца ўсім пацярпелым ад сталінскіх рэпрэсіяў беларусам і іхным сем'ям.

Сяргей Будкін,
аўтар ідэі і кіраўнік праекту «(Не)расстраляныя»

НА ХВАЛІ ВЯРТАНЬНЯ

Ва ўсёй гісторыі беларускага прыгожага пісьменства (маю на ўвазе літаратуру як БССР, так і Заходняе Беларусі) 1920—1930-я гг. — адзін з найцікавейшых пэрыядаў. Узрушаныя зьменамі ў грамадзтве, пісьменьнікі арыентаваліся на пошук і экспэрымэнт, пашыралі стылёвыя і эстэтычныя абсягі айчынных паэзіі, прозы і драматургіі, абнаўлялі і стваралі новыя жанры, асвойвалі новыя мастацкія кірункі. Менавіта тады адна за другой у Беларусі ўтвараліся літаратурныя арганізацыі: «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», «Беларуская літаратурна-мастацкая камуна», «Пробліск»... Маладыя творцы ішлі ў літаратуру сотнямі, і кожны хацеў — у меру ўласных здольнасьцяў — сказаць сваё слова. Ахопленыя марамі пра шчасьлівую будучыню, яны перадавалі думкі й пачуцьці праз квяцістыя вобразы, сьмелыя мэтафары ды імпэтныя рытмы.

Аднак, на жаль, ня толькі з культурным уздымам асацыюецца ў нас гэты пэрыяд: многія пісьменьнікі сталі ахвярамі сталінскага тэрору. Вяртацца ў літаратуру яны пачалі толькі празь дзесяцігодзьдзі, пасьля рэабілітацыі, і для многіх гэтае вяртаньне, на жаль, было пасьмяротным. Для тых жа, каму быццам пашчасьціла пазьбегнуць рэпрэсіяў, жорсткая савецкая рэчаіснасьць пакідала малы выбар тэмаў і сродкаў для творчасьці і неймаверна звужала прастору самарэалізацыі...

Сёньня ўзьнялася чарговая хваля інтарэсу да творчай спадчыны рэпрэсаванага пакаленьня. У бібліятэках, клюбах, арт-прасторах, унівэрсытэцкіх аўдыторыях арганізуюць літаратурныя імпрэзы, прысьвечаныя пісьменьнікам 1920—1930-х гг. Усё часьцей іхная творчасьць прыцягвае ўвагу музыкаў самых розных кірункаў. Арганізуюцца навуковыя канфэрэнцыі — згадайма «Ўзвышаўскія чытаньні», што праходзяць у Беларускім дзяржаўным архіве-музэі літаратуры і мастацтва вось ужо два дзесяцігодзьдзі. У 2017 годзе на тэлеканале «Белсат» выйшаў фільм рэжысэра Ільлі Бажко і сцэнарысткі Марты-Дарыі Клінавай «Зьніклая паэзія», героямі якога сталі Тодар Кляшторны, Майсей Кульбак, Ізі Харык і Юлі



Канфэрэнцыя «Маладняка»

Зьлева направа: 1 шэраг — М. Нікановіч, В. Маракоў, С. Шушкевіч, Ю. Лявонны, С. Фамін, П. Броўка, М. Хведаровіч, А. Мардвілка; 2 шэраг — К. Губарэвіч, В. Казлоўскі, Я. Ліманоўскі, І. Барашка, Г. Базыленка, —, Я. Пфляўмбаўм, А. Сянкевіч, Н. Вішнеўская, —, П. Галавач; 3 шэраг — М. Лынькоў, М. Мікіцін, А. Траецкі, —, В. Каваль, Я. Туміловіч, Ю. Гаўрук, Я. Бобрык, А. Звонак, А. Моркаўка, Я. Мазуркевіч, Н. Маркава, С. Баркоўскі; 4 шэраг — —, А. Вечар, —, Т. Хадкевіч, —. Люты 1928 г.

Таўбін. Узгадваць бязьвінна забітых суайчыньнікаў на Дзяды стала ўжо нацыянальнай традыцыяй: так, у Курапатах цяпер штогоду ладзяць «Ночы расстраляных паэтаў».

Праект «(Не)расстраляныя», ініцыяваны Сяргеем Будкіным, — спроба шырока і рознабакова інтэграваць спадчыну паэтаў міжваеннага пэрыяду ў сучасную беларускую культурную прастору, пазнаёміць зь іхнаю творчасьцю як мага болей неабыякавых да мастацтва людзей. І гэтую спробу можна лічыць удалай. Паэзія рэпрэсаваных і, здавалася б, прызабытых аўтараў загучала ў песьнях сучасных выканаўцаў са сцэнічных пляцовак і інтэрнэт-старонак. А каб дапамагчы сёньняшняму пакаленьню зарыентавацца ў біяграфіях і творчасьці паэтаў, быў адмыслова распрацаваны цыкль папулярных лекцыяў, відэазапіс якіх можна знайсьці ў сеціве.

Фільм «Зьніклая паэзія»

На ролю лектараў былі запрошаныя ня толькі навукоўцы-літаратуразнаўцы, але і выкладчыкі, гісторыкі, крытыкі, літаратары, якія маюць пэўны досьвед папулярызацыі культурных здабыткаў. Так зарыентаваны на шырокія колы праект «(Не)расстраляныя» не замыкаецца ў межах уласна навуковых, а робіцца сапраўды народным. Рознасьць аўтараў, іхнага досьведу, падыходаў да паданьня матэрыялу спараджае рознастылёвасьць прачытаных лекцыяў, а значыць, і апублікаваных у кнізе тэкстаў. Аўтары не абмяжоўваліся нейкім агульным фарматам, а дзейнічалі так, як ім падказвалі інтуіцыя і ўласнае ўспрыманьне асобы творцы. Сярод аўтараў ёсьць і тыя, хто даўно займаецца вывучэньнем творчай спадчыны свайго «героя», і тыя, хто адкрыў для сябе пісьменьніка зусім нядаўна і працягваў адкрываць яго, рыхтуючы лекцыю.

Падыход часткова прадыктаваны і лёсамі спадчыны пісьменьнікаў, і ступеньню іх дасьледаванасьці. Скажам, біяграфіі Міхася Чарота, Уладыслава Галубка, Цішкі Гартнага і Міхася Зарэцкага даволі добра вывучаныя, пра гэтых аўтараў выходзілі навуковыя манаграфіі, а іхныя творы даўно сталі хрэстаматыйнымі. Таму цалкам лягічна, што аўтары лекцыяў не імкнуліся трымацца жанру біяграфічнага нарысу, а ўбачылі нагоду паразважаць над пэўнымі аспэктамі творчасьці ці нават папалемізаваць з апанэнтамі свайго героя. Добра дасьледавана і біяграфія Валерыя Маракова — найперш дзякуючы яго пляменьніку Леаніду Маракову, які выдаў кнігу «Валеры Маракоў. Лёс. Хроніка. Кантэкст» (1999) і пакінуў пасьля сябе ўнікальны сайт са зьвесткамі пра многія тысячы рэпрэсаваных беларусаў.

Сайт Леаніда Маракова

Імя Вацлава Ластоўскага было вернута значна пазьней за імёны многіх іншых названых тут пісьменьнікаў, і вялікая заслуга ў гэтым належыць Язэпу Янушкевічу — вядомаму навукоўцу, аўтару кнігі «Неадменны сакратар Адраджэньня» (1995) і ўкладальніку «Выбраных твораў» В. Ластоўскага (1997). Натуральна, што прачытаць лекцыю пра Ластоўскага было прапанавана менавіта яму.

Жыцьцяпісы й творчасьць астатніх аўтараў дасьледаваныя куды горш. Каб атрымаць поўнае ўражаньне пра пісьменьніка як асобу, біяграфіяў у даступных крыніцах бывае яўна недастаткова, таму ў лектараў узьнікла натуральнае жаданьне «паказаць жывога Кульбака, накалькі гэта магчыма праз 80 гадоў пасьля яго фізычнай сьмерці» (Вольф Рубінчык), паразважаць, «якія з падзеяў, характарыстык, дэталяў, што пакідае па сабе паэт, найважнейшыя» (Ганна Севярынец), або, урэшце, упісаць творчую спадчыну таленавітых, але ўсё ж недаацэненых творцаў у сусьветны кантэкст (Андрэй Хадановіч). А, напрыклад, «расьцярушаныя» па розных дакумэнтах, нешматлікіх успамінах і дробных публікацыях жыцьцяпісы Юркі Лявоннага, Зямы Піваварава, Сяргея Мурзо патрабавалі грунтоўнай рэканструкцыі, сыстэматызацыі даступных на сёньня зьвестак. Варта зазначыць, што надрукаваныя тэксты многіх лекцыяў істотна адрозьніваюцца ад тых, якія прагучалі ў кнігарні «Логвінаў» і выкладзены ў інтэрнэце: усё ж такі вусны і пісьмовы спосабы падачы маюць сваю спэцыфіку і адрозьненьні. Дый дасьледнікі мелі магчымасьць скарэктаваць, дапрацаваць, дапоўніць свае матэрыялы.


Вядома ж, біяграфіі рэпрэсаваных пісьменьнікаў патрабуюць удакладненьняў, перагляду, пераасэнсаваньня — як і творчая спадчына. Мы ведаем, як асьцярожна, з аглядкай на ідэалягічную адпаведнасьць адбывалася яе вяртаньне ў канцы 1950-х — 1960-я гг. У зборнікі выбранага часта ўключалі творы тэндэнцыйныя,


з палітычным падтэкстам і публіцыстычным патасам. Усё гэта рабілі, каб давесьці, што аўтар быў ніякі ня вораг савецкай улады, а, наадварот, услаўляў яе ў сваіх творах. Пры гэтым вартыя ці нават выдатныя тэксты заставаліся па-за межамі кніжных выданьняў. Таму сёньняшняе вяртаньне істотна адрозьніваецца ад вяртаньня таго, ранейшага: яно, як напісала Ганна Севярынец, «неабходнае і неадменнае, бо разам зь імі [пісьменьнікамі] вяртаецца тое, што так мэтадычна і пасьпяхова ў нас адбіралі: мужнасьць барацьбы за сваё, упартасьць стварэньня свайго, шчырасьць і шчодрасьць у выказваньні свайго, усьведамленьне свайго права „людзьмі звацца“».

Пры ўкладаньні падборкі мастацкіх твораў, якія дапаўняюць лекцыйны матэрыял у гэтай кнізе, найперш хацелася аддаць перавагу творам, якія найбольш яскрава адлюстроўваюць мастацкую індывідуальнасьць кожнага аўтара. Адны з гэтых твораў даўно сталі набыткамі зборнікаў выбранага і паэтычных анталёгіяў, зь іншымі сучасны чытач меў змогу пазнаёміцца толькі нядаўна.

Скажам, у падборку Сяргея Астрэйкі ўвайшлі ўрыўкі з паэмы «Бэнгалія», аб'ёмны фрагмэнт якой толькі нядаўна адшуканы ў прыватным архіве і апублікаваны ў часопісе «Дзеяслоў». Ніколі не перадрукоўваліся пасьля сьмерці аўтара і творы Сяргея Мурзо, якіх на сёньня вядома надзвычай мала, — падборку склалі ўсе беларускамоўныя вершы паэта, выяўленыя ў калектыўным зборніку «Рытмы будаваньня» і газэце «Віцебскі пралетары». З розных прыжыцьцёвых выданьняў сабраныя і творы Зямы Піваварава, аўтара адзінай кнігі «Лірыка двух нараджэньняў».







Вокладкі сучасных выданьняў твораў Юлія Таўбіна, Алеся Дудара і Юркі Лявоннага

Асобная гаворка пра аўтараў, якія пісалі на ідышы — мове, што была ў БССР адной з чатырох дзяржаўных, але цяпер выйшла з актыўнага ўжытку. Беларускія пераклады Майсея Кульбака і Ізі Харыка выдаваліся ў савецкія часы, аднак ня ўсе яны маюць аднолькава добрую якасьць, а сёе-тое зь безумоўна вартых твораў не было перакладзена зусім. Таму некаторыя вершы даюцца ў сьвежым перастварэньні сучасных перакладнікаў Ганны Янкуты і Андрэя Хадановіча.

Першапачаткова праект меў назву «(Не)расстраляная паэзія», але адной паэзіяй у выніку не абмежаваўся. Так, сапраўды, многія з пададзеных у кнізе аўтараў творча рэалізоўваліся найперш як паэты: не забываймася, што паводле сваёй задумы праект адпачатку меў музычны ўхіл, а рыфмаванае слова ўсё ж уяўляе найбольшы патэнцыял для песеннага ўвасабленьня. Аднак, напрыклад, гурт «Relikt» напісаў песьню паводле апавяданьня «Паэма пра чорныя вочы» празаіка Міхася Зарэцкага, а Зьміцер Вайцюшкевіч паклаў на музыку адзін зь нямногіх вершаў драматурга Ўладыслава Галубка. Прозу нароўні з паэзіяй пісалі Майсей Кульбак, Анатоль Вольны і Цішка Гартны. Са спадчыны апошняга — на параду лектара Васіля Дранько-Майсюка — выбрана апавяданне «Больш за ўсіх», дзе аўтар найбольш глыбока і неадназначна раскрывае псыхалёгію шараговага савецкага актывіста, празьмерна адданага бальшавіцкай партыі. Зьмешчаны ўрывак з п'есы Васіля Шашалевіча «Сымфонія гневу», якую ўпершыню апублікаваў Сьцяпан Лаўшук у часопісе «Тэатральная Беларусь» (1992, № 4).

Вядома ж, выданьне не было б паўнавартасным без ілюстрацыяў, якія дапамаглі б чытачу «адрозьніць Дудара ад Чарота» і ўвогуле адчуць калярыт эпохі. Пераважная большасьць выяваў узятая з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіву-музэю (БДАМЛМ), некаторыя — з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, прыватных архіваў Ірыны Багдановіч, Галіны Самко (дачкі Галіны Гайлевіч), Таісы Злоцінай (пляменьніцы Сяргея Мурзо).

Можна сказаць, што праект даў аўтарам-дасьледнікам дадатковыя імпульсы ўласьці й выдаць кнігі герояў сваіх лекцыяў. Апошнім часам выйшлі кнігі выбраных твораў Юлія Таўбіна, Алеся Дудара і Юркі Лявоннага, укладзеныя адпаведна Андрэем Хадановічам, Ганнай Севярынец і аўтарам гэтай прадмовы. Спадзяемся, гэтая тэндэнцыя будзе мець працяг.

Віктар Жыбуль, рэдактар-укладальнік кнігі

Антон Рудак, Віктар Жыбуль

мы — апошнія зь першых ластавак




Анатоль Вольны



Будуць помніць, хто голавы зьвесіў;
Іх успомняць сардэчнаю ласкаю.
Мы – апошнія зь першых буравесьнікаў,
Мы – апошнія зь першых ластавак.

Анкета Анатоля Вольнага — дэлегата І Усебеларускага зьезду паэтаў і пісьменьнікаў «Маладняк». 24 лістапада 1925 г.



АНКЕТА

Дэлегата І-га Ўсебеларускага Зьезду Поэтаў і Пісьменьнікаў.

„М А Л А Д Н Я К ".

І. Прозьвішча, імя Вольны Анатоль

2. Калі радзіўся 1902

3. З якой мяйсцовасьці Чэрвеньскі раён

4. Партыйнасьць . . . . кандыд

5. Соцыяльнае паходжаньне сялянін

6. Ці быў у Чырвонай Арміі і колькі часу . . . . . Быў — 2г

7. Нацыянальнасьць . . . . Беларус

8. Ад якой філіі(організацыі) Менскай

9. Адукацыя . . . . . няпоўная

І0. Дзе працуеце(установа). . Ізб. Маладняк

ІІ. Якія маеце друкаваныя зборнікі . . . . . „Камс. Ноты" „Два" Вайсковы кал. „Гаротаюдная фадасьці"

І2. З якога часу пішэце . . . 1922г

І3. Да якога літкірунку сябе залічаеце . . . . . .

І4. № мандату і права голасу № 12 з рашэньня

І5. А д р а с . . . . . .

Подпіс Ант. Вольны

„24" лістапада . . . . 1925 г.

Камсамолец-контрарэвалюцыянэр

Анатоль Вольны (Анатоль Юстынавіч Ажгірэй) нарадзіўся 19 лістапада (2 сьнежня) 1902 году на станцыі Пухавічы, у сям'і паштовага чыноўніка. Да рэвалюцыі, падлеткам, Анатоль Ажгірэй вучыўся ў ігуменскай гімназіі, а пазьней — у менскай гімназіі Зубакіна і Фальковіча разам зь іншым «маладнякоўцам» Алесем Дударом, які фактычна і «прывёў» сябра ў літаратуру. Пазьней у аўтабіяграфіі паэт пісаў: *«З 14 гадоў ня быў дома. Сталеў і рос у камсамоле».* У 1920 г. пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную армію, браў удзел у баях з палякамі, быў паранены. Пасьля дэмабілізацыі працаваў у ЦК ЛКСМБ, быў рэдактарам газэты «Малады араты» [20]. У ёй 22 сьнежня 1921 г. зьмясьціў і сваю першую публікацыю — нататку пад назвай «Дапамагае словам і справай». Як паэт дэбютаваў амаль праз год, 7 лістапада 1922 г., вершам «Май в Октябре» ў менскай расейскамоўнай газэце «Красная смена» — органе ЦК ЛКСМ Беларусі.[1]

Няцяжка заўважыць, што камсамольска-чырвонаармейская біяграфія наклала адбітак і на творчасьць паэта: нават яго першы зборнік, выдадзены ўвесну 1924 г. супольна з Андрэем Александровічам, называўся «Камсамольская нота». Гэтым зборнікам фактычна пачыналася кнігавыдавецкая дзейнасьць літаратурнага згуртаваньня «Маладняк», а неўзабаве яна перарасла ў рэгулярную сэрыю «Кніжніца

[1] Некаторыя крыніцы пачатак літаратурнай дзейнасьці А. Вольнага датуюць 1920 годам. Сапраўды, у газэце «Савецкая Беларусь» выйшла некалькі вершаў пад псэўданімам *Вольны* (але без імя ці ініцыяла). Аднак, паводле «Слоўніка беларускіх псэўданімаў і крыптанімаў» (1983) Янкі Саламевіча, такім псэўданімам у той час карыстаўся Самуіл Плаўнік (Зьмітрок Бядуля). Дый сам А. Вольны ў маладнякоўскай анкеце на пытаньне «Зь якога часу пішаце?» адказаў: *«1922»* [3, арк. 34].

Анатоль Вольны (у цэнтры) з мададнякоўцамі.
Зьлева направа: 1-ы шэраг — Н. Чарнушэвіч, А. Бабарэка, А. Вольны, Я. Пушча, А. Александровіч; 2-і шэраг — А. Гурло, М. Зарэцкі, 1925 г.



„Маладняк“» (выходзіла цягам 1925–1926 гг.). Верш, які даў назву кнізе і, адпаведна, успрымаецца як праграмны, належыць менавіта Анатолю Вольнаму:

Той Ньюпор[2], што ў небе часта так грахоча,
Што вядзе грымучы зь сінявою говар...
Гэта толькі першы дэлегат рабочы,
З нотай Камсамолу к сонечным прасторам.
Нота наша кажа: «Сонца, мы прымусім,
Мы цябе прымусім печы нам паліць!
Наша воля — крэмень, наша сіла — самі мы!
Ў сто мільёнаў ухнем — пойдзеш нам служыць!
Ведай, сябар сонца — узрастае сіла,
Што агорне песьняй сіні небазвод,
Фабрыку збудуе з сонечных праменьняў...
Сіле той сягоньня — васямнаццаць год!» [11, с. 7]

Радок пра «фабрыку з сонечных праменьняў» як прыклад яркай вобразнасьці працытаваў у артыкуле «Белорусские имажинисты» расейскі паэт, празаік і кінасцэнарыст Мацьвей Ройзман [15, с. 7]. Адам Бабарэка ў рэцэнзіі на кнігу зазначыў, што «Камсамольская нота» «чытаецца з захапленьнем», «узьнімае дух і надае бадзёрасьці» і «пераконвае кожнага, што стан сьвядомасьці чырвонай зьмены накіраваны на пабудову новага шчаснага жыцьця» [5, с. 71–73].

[2] *«Ньюпор»* — марка французскіх самалётаў, што пачынаючы з 1911 г. мела распаўсюд у Расеі, а пазьней – у СССР. *(Заўвага ўкладальніка.)*

Анатоль Вольны напісаў паэму «Беларуская камсамолія» (1925), актыўна асьвятляў працу камсамолу і ў газэтных артыкулах і нататках. А ў вершы «Сёньня» (1924) экстатычна ўсклікаў: *«Сёньня ў сэрцы сонца жмурыцца, — / Сёньня ў сонцы сэрца камсамоліц!»*. І ўсё гэта, па словах Леаніда Маракова, не зашкодзіла Анатолю Вольнаму набыць вядомасьць «майстра контрарэвалюцыйных анэкдотаў» [17]. Цяжка сказаць, што канкрэтна стала нагодай для такой характарыстыкі, але самі па сабе гумар і сатыра, як пабачым далей, былі неад'емнай і арганічнай часткай творчасьці Анатоля Вольнага.

Сінія мары

Вядома ж, ніяк нельга абмінуць яшчэ адну грань асобы Анатоля Вольнага — паэт-лірык. Сьледам за «Камсамольскай нотай» ён выдаў дзьве кнігі вершаў: «Чарнакудрая радасьць» (1925) і «Табе» (1927). На думку літаратуразнаўца Міколы Мішчанчука, першая кніга атрымалася больш гарманічнай і цэласнай: яе аснову складае паэма з элемэнтамі драматызацыі «Кастусь Каліноўскі», дзе аўтар зьвярнуўся да тэмы паўстаньня 1863–1864 гг. І хоць, згодна з ідэалягічнымі ўстаноўкамі 1920-х гг., А. Вольны не ўва ўсім трымаўся гістарычнай праўды (ну ня мог Каліноўскі сказаць: *«Дапаможа шляхта паўстаньню / Так, як кашаль ліхой хваробе»*!), паэту «ўдалося раскрыць трагедыйны характар паўстаньня, паказаць ахвярнасьць і веліч місіі яго правадыра, паяднаньне чалавечых душ і сэрцаў з душою і сэрцам свайго заступніка» [18, с. 37].

Грунтоўна і трапна акрэсьліла паэзію А. Вольнага Ірына Багдановіч: «Яго паэтыку вылучала імпульсіўнасьць, эмацыянальная парывістасьць рытмаў, жаданьне адысьці ад усталяваных вершаваных формаў. Гэта быў авангардны паэт футурыстычнага кшталту, які любіў экспэрымэнтаваць з радком. <...>

А. Вольны любіў арыгінальнасьць у выказваньнях, ужываньне нязвыклых формасловаў і спалучэньняў слоў, а таксама стылістычна афарбаваных слоў для дасягненьня эфэкту эпатажу, кідкасьці, хаця думка пры гэтым часта застаецца досыць ардынарнай» [6, с. 304].



Выступ Анатоля Вольнага перад чырвонаармейцамі, меркавана 1925 г.



Вокладка кнігі Анатоля Вольнага «Табе». Менск: ДзяржаўнаевыдавецтваБеларусі, 1927 г. Мастак ня вызначаны

Напэўна, адзін з найчасцейшых стылістычных прыёмаў Анатоля Вольнага — выкарыстаньне эмацыйна афарбаваных калярыстычных вобразаў і эпітэтаў, прычым улюбёны колер у яго — сіні. У невялічкім зборніку «Табе» (40 старонак кішэннага фармату 8,5×12,5 см) словы «сінь», «сіні» і аднакарэнныя сустракаюцца 25 разоў, у тым ліку ў паказальнай назьве лірычнае паэмы (або цыклю зьвязаных між сабою вершаў?) «Сінія кветкі...». У чытача могуць выклікаць усьмешку паэтычныя выказваньні кшталту: *«Вось таму гэтак п'ю я і плачу, / Што цьвярозым сіней за ўсіх стану»* альбо *«Сам народ наш сіні — / Волат той цудоўны!»*. Аднак ключ да разуменьня «сіняй» вобразнасьці можна знайсьці ў іншых радках А. Вольнага: *«Сінь нябесная, / Сінь далёкая... / — Ні дастаць яе, / — Ні сарваць»* [9, с. 11], *«Так заўсёды... / Шукаем мы ў сьвеце / Птушкі тэй, што знайсьці немагчыма, / Ад яе вечна гінуць паэты: / Неіснуючай, / Песеннай, / Сіняй...»* [9, с. 25]. Яшчэ на пачатку 1960-х Ніл Гілевіч заўважыў, што эпітэт «сіні» ў А. Вольнага «зьяўляецца сынонімам прыгожага, выдатнага, высакароднага», што паэт называе сіньню самыя ўзвышаныя пачуцьці, напрыклад, каханьне, а «сіняя птушка» (у свой час «выпраўленая ў палёт» бэльгійскім пісьменьнікам і драматургам Марысам Мэтэрлінкам) — гэта «сымбаль шчасьця, недасягальнага, неіснуючага, ілюзорнага» [12, с. 123]. Сіні — гэта і колер нябёсаў, таксама далёкіх, размытых і бязьмежных... Такім чынам, за ўсімі «нагрувашчаньнямі беспрадметных, нерэальных „сініх" вобразаў» (Н. Гілевіч) хаваюцца роздумы пра пошукі цяжка дасяжнага шчасьця ды імкненьне да высокіх рамантычных ідэалаў. А выказваньне пра тое, што ў пагоні за сіняй птушкай «вечна гінуць паэты», выглядае нават прароцкім... Праўда, для адлюстраваньня вялікіх і нязбытных савецкіх мараў больш пасаваў бы чырвоны колер, але сіні толькі надае выказваньням А. Вольнага ўнівэрсальнасьці: у розныя часы душамі людзей могуць завалодваць самыя розныя ідэалы, але вынік трагічны...

Супярэчнасьць паміж ідэалам і рэальнасьцю ў паэзіі А. Вольнага можа датычыць ня толькі грамадзкага, але і інтымна-асабістага, якое ў кнізе «Табе» ўсё ж пераважае. Яе лірычны герой — чалавек са складаным унутраным сьветам, і вобраз яго далёкі ад ідэальнага: ён «згарае ў піўнушках» і «вядзе барацьбу зь ветракамі», за што адчувае дакоры сваёй каханай, якой хацелася б, каб ён урэшце стаў чалавекам. І ён адказвае ёй цытатамі з С. Ясеніна і самога сябе: *«Чарнакудрая радасьць мая, / „Сумасшедшее сердце поэта" — / Цямней ночы, / Сьвятлей серабра»* [9, с. 8]. Творчасьць Сяргея Ясеніна была блізкая Анатолю Вольнаму: памяці загінулага расейскага паэта ён прысьвяціў верш «У вянок Ясеніну» («Аршанскі маладняк», 1926, № 1). Герой А. Вольнага (як і герой С. Ясеніна) знаходзіцца ў цяжкім, пакутлівым пошуку праўды, сябе і свайго шляху. *«Я і сам чалавека шукаю — / Адкажы, які шлях будзе сьветлым?»* — разгублена пытаецца ён. Урэшце ў пытаньнях пачынае гучаць амаль што адчай: *«З халодным сэрцам жыць прыгожа, / А як зь пякельным болем жыць?.. / Магу дзяліць я радасьць з кожным, / А гора з кім мне падзяліць?..»* [9, с. 18].

І ўсе пошукі, ваганьні, расчараваньні лірычнага героя як бы паказаныя праз прызму ўсё таго самага сіняга колеру. Сінім насычаныя і элемэнты пэйзажыстыкі ў паэме: *« — Ты была мне сястрой, / Ты была мне, як маць... / Сінь зайшла за гарой, / Каб сіней яшчэ стаць...»* [9, с. 13]. Такое багацьце, нават лішак сіняга выглядаюць у паэзіі А. Вольнага знарочыстым канцэптуальным ходам і ў пэўнай ступені эпатажным прыёмам.

Вольны, Вольскі і Пушкінзон

У сувязі зь вялікай прыхільнасьцю Анатоля Вольнага да сіняга колеру ўспамінаецца герой сатырычнага раману Андрэя Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» — паэт Ягор Гарачы зь мянушкай Пушкінзон, адзін зь вершаў якога пачынаўся словамі:

Сэрца ня хоча стрымаць
Радасьці кіслай і сіняй! [19, с. 53]

Выглядае на тое, што прататыпам Пушкінзона мог быць Анатоль Вольны.

Увайшоў ён у гісторыю літаратуры і як прататып маладога шляхціча Вольскага ў аповесьці «Салавей» Зьмітрака Бядулі [1, с. 881]. І таксама ў шаржаваным, камічным выглядзе: «...быў плеткаром усёй ваколіцы. Меў вялікі спрыт пасварыць паноў між сабою, а сам заўсёды выходзіў сухім.

Выгляд у яго быў досыць плюгавы: нізенькі, рыжыя валасы, чырвоныя вочкі, якія пры гутарцы стараўся рабіць шчырымі і жаласьлівымі. <...> Ён падлізваўся да кожнага пана, ад якога спадзяваўся мець якую-колечы выгаду. Славіўся таксама па фальварках і маёнтках як вершаплёт, хаця ў вочы звалі яго талентным паэтам» [7, с. 48].

Як рэагаваў Анатоль Вольны, калі зь яго рабілі падобныя карыкатуры? Мо і крыўдаваў: ня кожнаму спадабаецца, калі падкрэсьліваюць яго невысокі рост або «жарабячы голас» (А. Мрый). А мо і ставіўся да ўсяго з патрэбнай доляй гумару, бо сам быў знаны жартаўнік і пры выпадку мог адказаць сваім крытыкам узаемнасьцю.

«Лунныя лапы»

Пры ўсёй трапнасьці і завершанасьці лірычнага выказваньня ў А. Вольнага, а таксама яго імкненьні стварыць арыгінальны вобраз, чытачы і дасьледнікі бачаць у ягонай паэзіі пэўныя недахопы: «зьмястоўную звужанасьць, традыцыйную камэрнасьць перажываньняў», «беспрадметнасьць разважаньняў» (М. Мішчанчук). Аднак больш за ўсё паэтычную манеру Анатоля Вольнага псуюць няўдалыя рыфмы і моўна-стылістычныя неахайнасьці — як, напрыклад, у пачатку паэмы «Мне і тут безь Беларусі цесна»:

Вецер
віўся,
сьмяяўся,
кружсыў...
Вецер
травы да долу
хіліў...
Ой, зялёныя скроні расьлін
Ў пэрлямутры граніту завіў.
І такія
сьмяшныя сьляды
Лунных лап на уцёсах ляглі,
Фасфарыстыя ўхмылкі луны —
Нібы май ды зьвініць ў бубянцы [10, с. 22].

Уладзімер Дубоўка, які вызначаўся надзвычай дбайным стаўленьнем да друкаванага слова, у артыкуле «Пра нашу літаратурную мову» (1927) разгледзеў гэты ўрывак, падрабязна прааналізаваўшы кожную словаформу. Адукаваны чытач ведае, што слова «луна» і вытворных ад яго ў беларускай мове няма, слова «бубянцы» — таксама (трэба «бомы»), а «сьмяшныя» мусілі б быць «сьмешныя» — з націскам на першы склад... Колькасьць русізмаў, сустрэтых у вершах А. Вольнага, змусіла У. Дубоўку даць калегу строгую вымову: «...Пішы або па-расейску, калі ты лепш ведаеш гэтую мову, або вывучы раней беларускую мову, калі хочаш пісаць па-беларуску» [13, с. 67]. Выраз «лунныя лапы» «пайшоў у народ», яго пачалі ўжываць і іншыя пісьменьнікі як сынонім стылістычнага ляпсусу ў літаратурнай мове.

Тут трэба зазначыць, што на пачатку творчага шляху Анатоль Вольны сапраўды «ня ўмеў пісаць па-беларуску» [14, с. 387]: яго публікацыі за 1922–1923 гг. пераважна расейскамоўныя. Але з утварэньнем «Маладняку» рэзка і незваротна перайшоў на беларускую мову, спасьцігаць якую яму дапамагаў Алесь Дудар. І вяртацца зноў да расейскай А. Вольны наўрад ці стаў бы: ён быў шчырым прыхільнікам беларусізацыі і яго самога засмучала, што ў многіх нацыянальных дзеячоў дзеці гавораць не па-беларуску... [8]

Дадамо, што пасьля 1927 г. А. Вольны публікаваў паэтычныя творы ўжо вельмі рэдка, аддаваў перавагу іншым жанрам.

З калегамі па «Маладняку». 1924—1925 гг.

Зьлева направа: 1-ы шэраг — Я. Падабед, А. Якімовіч, М. Чарот, А. Дудар, Я. Пушча; 2-і шэраг — А. Бабарэка, Н. Чарнушэвіч, П. Трус, А. Вольны, А. Александровіч, К. Чорны.



Арганізатар, празаік, драматург, кінасцэнарыст

Анатоль Вольны ўвайшоў у гісторыю як адзін з заснавальнікаў літаратурнага аб'яднаньня «Маладняк», рэдагаваў аднайменны часопіс. У 1924 г. разам з Уладзімерам Дубоўкам і Андрэем Александровічам быў спэцыяльна выпраўлены ў Крым шукаць магілу Максіма Багдановіча, улетку 1935 году вітаў на менскім вакзале Рамэна Раляна...

Быў Анатоль Вольны і адным з пачынальнікаў беларускай прыгодніцкай прозы: у 1925 г. у суаўтарстве з А. Александровічам і А. Дударом напісаў раман «Ваўчаняты» пра змаганьне вясковай моладзі з палякамі й войскам С. Булак-Балаховіча, аповесьці «Два» і «Антон Савіцкі» аб барацьбе беларускіх сялянаў супраць прыгнятальнікаў. Ну і, вядома ж, быў майстрам сатырычных і гумарыстычных твораў.

Пачынаючы з 1925 г., пераважна пад псэўданімам Алёша ён зьмяшчаў у пэрыёдыцы фэльетоны, а з 1927-га яны ўвогуле зрабіліся адным з асноўных літаратурных жанраў пісьменьніка. Выходзілі яны і асобнымі кнігамі: «Зборнік фэльетонаў» (1927) і «Суседзі» (1932). За дзесяць гадоў (1925–1935) А. Вольны апублікаваў каля 100 фэльетонаў і гумарэсак на розныя актуальныя тэмы; ягонымі героямі часта былі, як ён сам напісаў у прадмове да сваёй кнігі, *«лодыры, злачынцы, п'яніцы, бюракраты, галавацяпы і г. д.»* [2, с. 3]. А таксама літаратурныя сучасьнікі, калегі па пяры, якім Алёша прысьвяціў цыкль гумарыстычных «літаратурных сылюэтаў» — гэткіх сяброўскіх шаржаў: Міхась Чарот, Андрэй Александровіч, Алесь Дудар, Міхась Зарэцкі, Міхась Лынькоў, Рыгор Мурашка, Пятрусь Броўка, Максім Лужанін, Тодар Кляшторны, Сымон Баранавых, Уладыслаў Галубок, Рыгор Кобец, Васіль Сташэўскі... Натуральна, блізкім А. Вольнаму быў і жанр пародыі — асабліва ўдалай атрымалася падборка пад назвай «Люты ў творчасьці беларускіх пісьменьнікаў. Як бы гэта выглядала, каб беларускія пісьменьнікі пісалі аб Лютаўскай рэвалюцыі», напісаная ў суаўтарстве зь Леанідам Свэнам (Лявонам Савёнкам), будучым дзеячом беларускай эміграцыі. Чаго вартая, напрыклад, напоўненая гомасэксуальнымі матывамі пародыя на вядомую ў той час імпрэсію «Камсамолка» Міхася Зарэцкага:

Я намаляваў...
Я намаляваў бы гэты вобраз Лютаўскай рэвалюцыі...
О, Керанскі — кручынавая радасьць мая!..
Я памятую яго...
Я ўяўляю яго абавязкова дзяўчынай.
О, каб ён быў камсамолкай...
Чаму камсамолкай, ня ведаю!.. Я такі захоплены!..
О, Керанскі — кручынавая радасьць мая!
Твае дзівосна яркія формы я памятую...
Я ўсё памятую!..

. . . . . ,. .

Мне раптоўна зрабіўся прыкрым гэты млявы твар Керанскага, гэты мяккі мяшчанскі уют.
О, каб ён быў камсамолкай! [3, с. 8]

Актыўна працаваў Анатоль Вольны і як кінасцэнарыст. Паводле ягоных сцэнароў паставілі некалькі фільмаў: «Хвоі гамоняць» (1929, суаўтар сцэнару К. Дзяржавін), «У агні народжаная» (1929), «Гатэль „Савой“» (1930), «Сонечны паход» (1931), «Новая радзіма» (1935). Асобнай кнігай выйшла ягоная кінааповесьць «Шасьцідзясятая паралель» (1935). Як зазначае дасьледнік літаратуры Валянцін Смаль, «яго працы ў кінадраматургіі вызначаліся патасам услаўленьня савецкай улады, а героі часта атрымліваліся ня проста рамантызаванымі, а агітацыйна-плякатнымі. У цэлым яго дзейнасьць у гэтай галіне мастацтва была своеасаблівым адлюстраваньнем тагачаснай эпохі, адказам на запатрабаваньні часу» [23, с. 17]. За сцэнарную творчасьць Анатоль Вольны ў 1935 годзе атрымаў званьне заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

Адзін з найбольш яскравых фільмаў, дзе ён сцэнарыст, — гістарычная карціна «Ў агні народжаная» (другая назва — «Волат», 1929). Яна стала дэбютнай для маладога рэжысэра Ўладзімера Корш-Сабліна — будучага клясыка беларускага кінэматографу. Фільм у сымбалічнай форме распавядае пра гісторыю беларускага народу, яго барацьбу за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленьне ад шматлікіх ворагаў, якімі выступаюць немцы, палякі і жаўнеры аддзелу С. Булак-Балаховіча. Ёсьць і абагульнены вобраз «пана-прыгнятальніка» — апошні нашчадак роду Гедзімінаў князь Сапега, якому мусяць падпарадкоўвацца бедныя сяляне. Кульмінацыя фільму — забойства палкоўніка-балахоўца чырвоным выведнікам, за якое спалілі цэлае мястэчка і расстралялі жыхароў. І толькі дзякуючы Чырвонай арміі беларускі народ пазбаўляецца акупантаў і бярэцца ўдарнымі тэмпамі адбудоўваць сваю маладую рэспубліку пасьля вайны і разрухі.



Паглядзець фільм «У агні народжаная» з музыкаю «Relikt»

Нягледзячы на відавочны ідэалягічны складнік, фільм і сёньня прыцягвае ўвагу рэжысэрскай (Уладзімер Корш) і апэратарскай (Давід Шлюглейт) працай, дзякуючы якой успрымаецца як значнае дасягненьне беларускага кіно раньняга пэрыяду, яскравы ўзор айчыннага кінаавангарду. Фільм цікавы і тым, што ў ім, хай і ў нэгатыўным сьвятле, згадваецца Беларуская Народная Рэспубліка, фігуруюць яе дзеячы, у адным зь якіх пазнаецца Вацлаў Ластоўскі. Гэтая стужка — адзіны выпадак у беларускім савецкім кіно, калі ў кадар трапіў бел-чырвона-белы сьцяг. Між іншым, у 2012 г. у межах праекту «Тузін. Немаўля» музыку да фільму напісаў гурт «Re1ikt», які ўзяў удзел і ў цяперашнім праекце «(Не)расстраляныя» — гэтым разам зь песьняй, напісанай паводле апавяданьня Максіма Зарэцкага.

Каханьне гераіні

Сучасьнікі пісалі, што Анатоль Вольны быў чалавекам вонкава прывабным і прыемным у зносінах: «У яго былі блакітныя вочы, сьветлыя валасы, якія завіваліся. Невысокага росту хлопец у кашулі-касаваротцы, Ажгірэй быў гумарыст, весяльчак, любіў сяброўскія кпіны». Падчас працы ў ЦК ЛКСМБ Анатоль Вольны захапіўся сваёй калегай, камсамолкай Соняй Фрай, вядомай маладой падпольніцай з Жытоміру. Нават свой псэўданім Анатоль Ажгірэй нібыта пазычыў у яе: «фрай» у ідышы акурат і азначае «вольны». Тады ж, на пачатку 1920-х, узьнікла ўзаемная сымпатыя між Анатолем Вольным і іншай ягонай таварышкай па працы ў камсамоле, прэсе і кнігавыданьні — Верай Харужай, якая, аднак, ужо ў 1924 годзе была перакінутая ў Заходнюю Беларусь для арганізацыі падпольнай камуністычнай дзейнасьці. Калі Харужая была асуджаная польскім судом на восем гадоў зьняволеньня, у лістах яна пастаянна згадвала каханага: «Думаю о Толе»; «Расскажите, как там Толя»; «С какой радостью я смотрела в родные знакомые лица. Был там и Т.»; «Снова спрашиваю о Толе. Где он, что с ним? Ох, как хочу его найти…». Увесну 1929 году захоплены тон раптам зьнік: «Твоё сообщение о В. и огорчило, и поразило, и возмутило до глубины души. О, чёрт побери! У меня слов нет, мне тяжело, мне невыносимо больно, больно. Ведь это… преступление и позор… Теперь я понимаю, почему он молчит, почему молчат о нём все ребята, кого я только ни спрашивала, что с ним… Нет, нехорошо (о, только ли нехорошо?) узнавать о друзьях, дорогих и близких, после многих лет разлуки то, что я узнала о В. (…) А В. ведь один из самых дорогих и близких…». Што менавіта хавалася за гэтымі радкамі — застаецца загадкай [21].



Вера Харужая




Ганна Савіч

Акторка

Мастак Яўген Ціхановіч узгадвае, што Анатоль Вольны разам з Валерам Мараковым бываў частым госьцем у доме Міхася Чарота на Ленінскай вуліцы, 35. Паэты разам выпівалі, чыталі вершы і весела бавілі час. Мэмуарыст выказвае здагадку, нібыта ўвагу паэтаў прыцягвала перадусім жонка гаспадара Ганна [24, с. 297], былая акторка Першага Беларускага драматычнага тэатру. Ня дзіва, што менавіта яе Анатоль Вольны выбраў на ролю графскай дачкі ў сваім фільме «Хвоі гамоняць» (стужка не захавалася). У выніку Ганна Савіч пакінула мужа і, як сьведчаць ягоныя сваякі, зьвязала свой лёс са сцэнарыстам.

Паўстаньне гневу

У 1934 годзе на ўвесь СССР прагрымеў посьпех фільму «Чапаеў» братоў Васільевых. Ужо налета Масква загадала менскім таварышам стварыць «фильм, посвященный белорусскому Чапаеву». Пасьля ўпартых пошукаў правобразам героя быў выбраны Алесь Салавей (1897–1920) — адзін з заснавальнікаў знакамітай «Рудобельскай рэспублікі». Сцэнар даручылі пісаць дасьведчаным у гэтай справе Анатолю Вольнаму і Рыгору Кобецу. Ён быў апублікаваны ў двух нумарах газэты «Літаратура і мастацтва» (1 і 7 траўня 1936 г.). Аўтары атрымалі шмат крытычных заўвагаў, асабліва што да вобразу галоўнага героя, які яны імкнуліся максымальна абагульніць і рамантызаваць. Але калі ўжо мусілі пачацца здымкі фільму, што атрымаў назву «Паўстаньне гневу», Анатоля Вольнага арыштавалі, а яго суаўтар Рыгор Кобец, колішні анархіст-махновец, прадчуваючы нядобрае, неадкладна выехаў з БССР [22].



Крыж зь імем Анатоля Вольнага ў Курапатах, дзе, магчыма, яго расстралялі. Фота Сяргея Будкіна

Першы ў сьпісе

У «беларускай» частцы «Списка лиц, подлежащих суду военной коллегии Верховного суда Союза ССР», падпісанага 15 верасьня 1937 году, імя Анатоля Вольнага стаіць першым. Арыштаваны ён быў 4 лістапада 1936 г., у адзін дзень з Валерам Мараковым, Міхасём Зарэцкім і Сымонам Баранавых, як удзельнік контрарэвалюцыйнай арганізацыі. У пратаколах допытаў у сьнежні 1936 г. ад імя Сяргея Знаёмага напісана: «Зарецкий, Граховский, Шашалевич, Вольный и Сташевский саботировали в творческой работе — занимались только переводами...». Дапытваў Анатоля Вольнага сумнавядомы сьледчы В. Быхоўскі, начальнік аддзяленьня ў справах «нацыянал-фашыстаў». На сьледзтве Вольны паводле пратаколу допыту нібыта паказваў: *«Москва проводит в Белоруссии русификаторскую политику, всё самобытное белорусское уничтожается...»*. Запісана ў пратаколах таксама, што Вольны і яго аднадумцы змагаліся супраць савецкай улады, за аддзяленьне Беларусі ад СССР [16]. Сьледчыя мелі што нагадаць Вольнаму і зь ягонай творчасьці — варта перачытаць хоць бы адну толькі паэму «Кастусь Каліноўскі», дзе пад крытыкай парадкаў у Расейскай імпэрыі лёгка прачытваўся скепсіс у адрас савецкай дзяржавы, кіраванай з Масквы.

На завяршэньне хацелася б выказаць спадзеў, што калі-небудзь нарэшце ўбачыць сьвет і том найлепшых выбраных твораў Анатоля Вольнага: пасьля трагічнай сьмерці пісьменьніка ягоная спадчына асобным выданьнем дагэтуль не выходзіла...

Літаратура

1. *Адамовіч А.* Да гісторыі беларускае літаратуры. — Мн.: Зьміцер Колас, 2005.

2. *Алёша.* Суседзі: Гумарэскі і фэльетоны. — Мн.: БДВ, 1932.

3. *Алёша і Свэн.* Люты ў творчасьці беларускіх пісьменьнікаў. Як бы гэта выглядала, каб беларускія пісьменьнікі пісалі аб Лютаўскай рэвалюцыі // Савецкая Беларусь. 1927. 12 сак.

4. Анкеты дэлегатаў 1-га ўсебеларускага з'езда аб'яднання пісьменнікаў, прывітальныя тэлеграмы з'езду // БДАМЛМ. Ф. 225, воп. 1, адз. зах. 6.

5. *Бабарэка А.* Збор твораў у 2 т. — Вільня: Ін-т беларусістыкі — Беласток: Бел. гіст. т-ва, 2011. Т. 1. Літаратурна-крытычныя працы.

6. *Багдановіч І.* Авангард і традыцыя: Бел. паэзія на хвалі нац. адраджэння. — Мн.: Бел. навука, 2001.

7. *Бядуля З.* Салавей: Аповесьць (працяг) // Узвышша. 1927. № 3.

8. *Васіль Дэ Эм* (Дранько-Майсюк Васіль). Расстраляныя літаратары. Анатоль Вольны, які кпіў з ахвяраў першай хвалі рэпрэсіяў 1930 году, а ў 37-м зь яго ўжо не было каму кпіць // Радыё Свабода [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.svaboda.org/a/28786249.html. — Дата доступу: 27.09.2018.[3]

9. *Вольны А.* Табе. — Мн.: БДВ, 1927.

10. *Вольны А.* Чорнакудрая радасьць. — Мн.: Выд. ЦБ «Маладняк», 1925.

11. *Вольны А., Александровіч А.* Камсамольская нота: Вершы. — Мн.: Б-ка «Чырвоная зьмена», 1924.

12. *Гілевіч Н.* Акрыленая рэвалюцыяй (Паэзія «Маладняка»). — Мн.: Выд-ва мін-ва выш., сярэд. спец. і праф. адукацыі БССР, 1962.

13. *Дубоўка У.* Збор твораў у 2 т. — Мн.: Лімарыус, 2017. Т. 2. Драматызаванае апавяданьне. Артыкулы. Дакументы. Лісты.

14. *Дудар А.* Выбраныя творы. — Мн.: Лімарыус, 2017.

15. *Жыбуль В.* «Паклаў пачатак беларускаму імажынізму...»: Пра Міхася Чарота і адну маскоўскую публікацыю // Роднае слова. 2011. № 10.

16. *Маракоў Л.* Біяграфіі // Kamunikat: Беларуская інтэрнэт-бібліятэка [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=25492.

17. *Маракоў Л.* Вольны Анатоль // Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794–1991. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.marakou.by/ru/davedniki/ahvyary-i-karniki/ahvyary?id=25707.

18. *Мішчанчук М.* «Магу дзяліць я радасьць з кожным, а гора з кім мне падзяліць?..» // Роднае слова. 1992. № 12.

19. *Мрый А.* Творы: Раман, апавяданні, нататкі. — Мн.: Маст. літ, 1993.

20. *Рублевская Л.* Вольный и неволя // Портал «Беларусь сегодня» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/volnyy-i-nevolya.html.

21. *Северинец А.* Вера Хоружая: жена героя, вдова труса, любимая поэта // Velvet: белорусский женский портал [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.velvet.by/shopwindow/stil-zhizni/obshchestvo/vera-khoruzhaya-zhena-geroya-vdova-trusa-lyubimaya-poeta.

22. *Селицкая Л., Селеменев В.* Сага о Соловье // Портал «Беларусь сегодня» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/saga-o-solove.html.

23. *Смаль В.* «Сэрца ласкай вішнёваю плёскае...»: Пуцявінамі Анатоля Вольнага // Роднае слова. 2002. № 11.

24. *Ціхановіч Я.* Партрэт стагоддзя. — Мн.: Лімарыус, 2015.

[3] Гэтая самая дата доступу да ўсіх наступных электронных рэсурсаў у бібліяграфіі.

КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ

(Разьдзелы з паэмы)

I

Я ведаю Беларусь, што паўстанцкай куляю
Сьвішча:
«Вольнай
Хачу
Быць!»
І другую Беларусь — бабулю, —
Беларусь — край лучын і журбы...
Эх, старая,
Старая бабуля!
Дай мінуўшчыну ўспомнім сталёвую:
Колькі ў сэрца асаджана куляў
Ў грудзі нашых чароўных палёў?
Цяжка, цяжка было пад няволяю
Аўсом нашым паклоны біць...
.....
.....
Гэй, ды што ж?
Усё здолеем,
Будзем песьняй мінуўшчыну біць.
Я ведаю Беларусь ды буйную,
Што ў паўстаньні хмялее ўсё болей,
І другую Беларусь — бабулю,
Пакуль рукі ня ўзьніме для боек.

III

Кастусь Каліноўскі:

Бедната!
Сьмялей шаг!
Ярчэй выгляд!
Зернем буйным галовы раскінуць!
Беларусь — паном ня быдла, —
Альбо жыць, альбо ўсім загінуць...
Адзін раз на сьвет радзіцца,
Адзін раз захмялець мятульгой,
Дык пойдзем жа, пойдзем жа біцца,
Хто зь сякерай, хто з голай рукой.
Няхай ведаюць ўсе: беларусы
«Ў ката й мышку» ня любяць гуляць

І свае галовы русыя
Не задарам будуць кідаць.
Бедната!
    Сьмялей шаг!
    Ярчэй выгляд!
Зернем буйным галовы раскінуць!
Беларусь — паном ня быдла, —
Альбо жыць, альбо ўсім загінуць...

VII

Ой, ці вольна жыць,
Ці загінуць нам, —
Ой, працоўны люд,
Сьвістані з пляча.

Будзем песьняй біць
І нажом садзіць:
Альбо згінуць ўсім,
Альбо — ўсё здабыць!

Галавою стой,
Беларусь мая!
Гэй, ды зь песьняй ў бой,
Ой, сярмяжная!

А маскоўскі цар
Сьцеле мякка нам.
Беларусь мая, —
Ёй я ўсё аддам.

Беларусь за «ўсё»
Вельмі дзякуе...
    Ці —
        Слабодная!
    Ці —
        Ніякая!

X

Кастусь Каліноўскі:

Можа хто баіцца кулі
Ды ад жару хаваецца ў цень?
А мы сьпіны даволі гнулі
І ўсё чулі «двадзесьця пеньць!»

Хто пачуў толькі гэтыя словы,
Той шануе мужычую волю.
Нам ня шкода свае галовы
Параскідаць, як зерні, па полі.
Многа было, ды мала засталося:
Не разьбіць нам сягоньня паноў.
Столькі зерняў ня маюць калосьсі,
Колькі выбіта нашых галоў.
— Хай жа ўспомніць на прызьбе нас спадчына
Жменькай
Простых
Вясковых слоў.
Будуць помніць, хто голавы зьвесіў;
Іх успомняць сардэчнаю ласкаю.
Мы — апошнія зь першых буравесьнікаў,
Мы — апошнія зь першых ластавак.

[1924–1925]

*** * ***

Ў мармуровым сьнягу
вецер
песьні
пісаў...
Вецер сьпеў
завіваў
у лілёвы
вянок, —
Я цябе пакахаў,
Я цябе пакахаў...

Ў мармуровым сьнягу
вецер
песьні
пісаў...
Зь сінявокіх нябёс,
зь несызьмернай
глыбі
вецер зоркі
зрываў,
зь непакорнасьцю нёс.

Зьнікнеш зоркай і ты...
зьнікнеш
зоркай
і ты
зь сінявокіх нябёс,
зь несызьмернай
глыбі...

[1926]

СІНІЯ КВЕТКІ...

Сэрцу песьняй
маліцца
— ня нова.
Хочу споведзь я любай прынесьці...
Ах вы, словы,
Цудоўныя словы!
Ах ты, песьня,
Чароўная песьня!..

Ты сказала з журбою ласкавай
Скрозь усьмешку журботных брывей:
— Мне ня трэба
Ні песень,
Ні славы,
Толькі ўрэшце ты стань чалавек!

Адказаў сваёй любай на гэта:
— Чарнакудрая радасьць мая,
«Сумасшедшее сердце поэта» —
Цямней ночы,
Сьвятлей серабра.

І казала ласкавей чаромхі,
Сінім цьветам абсыпала слоў:
— Ну пашто,
Ну куды цябе
гоніць
Твайго сэрца ўскіпеўшая кроў?

Ну пашто ты згараеш ў піўнушках
І вядзеш барацьбу зь ветракамі,
Калі вочы твае
гэта сушыць,
Калі ў сэрцы ад гэтага — камень?

Словы кволыя
        больлю сум точаць,
І ня ведаю, што адказаць...
Адказалі ёй сінія вочы:
— Прадалася
мая
        чыстата...
Адказалі каханай на гэта:
— Адпачыць трэба сінім ад мар,
Толькі сэрца так больлю ўскіпела,
Толькі ў сэрцы вішнёвы пажар.
Адказалі ў імглістых завеях —
Сінь вятры параскідаюць ў клоччы,
Заквітнець яшчэ сінь не пасьпее,
Сінь чаромхай раскідае ноч.

Ну а сінь?..
Мы таму мо і бачым,
Бо мы ведаем, —
        ёсьць і туманы.
Вось таму гэтак п'ю я і плачу,
Што цьвярозым сіней за ўсіх стану.

*

Я з шыпшынавых гнёзд
        Гэту песьню
        Прынёс,
        Там, дзе песьня
        Цьвіла
        Ды пад хусткай
        Нябёс.
        Ты была мне
        Сястрой,
        Ты як маці
        Была...

*

Сінь нябесная,
        Сінь далёкая...
        — Ні дастаць яе,
        — Ні сарваць;
        — Ні надзець мне
        Чарнавокую,
        Ў сіняй хустачцы
        Пагуляць...

Сэрцу мала ўсё —
Песьні
Склала ёй
З сумнасіняга
Серабра.
Дзе глыбокае —
Там і боль для нас.
Недалёкае
Ўсім дазволена…
Вось таму так
Зажурыўся я…
Найглыбейшага
— Не сказаць…
Сінь нябесная,
Сінь далёкая!..
— Ні дастаць яе,
Ні сарваць…

*

Я учора адзін
Супакоіў сябе:
— Ты была мне сястрой,
Ты была мне як маць…
Сінь зайшла за гарой,
Каб сіней яшчэ стаць…

*

Так заўсёды ў жыцьці і бывае…
Просіш ты, каб я стаў чалавекам.
Я і сам чалавека шукаю —
Адкажы, які шлях будзе сьветлым?

Адкажы, які шлях ў сьвеце сіні,
Калі песьняй жыцьцё засяём мы?..
Запалілась вось ты на хвілінку
І спаліла маё жыцьцё.

Зьнікла ты… Мне б сказаць так нягожа,
Толькі як адшукаеш шляхі?..
І любіць цябе ў песьні няможна,
Ды і роўнай табе — не знайсьці.

*

Кахаць жыцьцё ты навучыла, —
Ў вар'яцтвах я
Сваіх —
Заціх.

І вось цяпер пішу для мілай:
— Я хочу
Чыстым,
Чыстым
Быць.

Маё каханьне засталося...
А дзе ж тваё?
А дзе ж і ты?..
Пад ветрам сыплюцца пялёсткі,
Жалобай сьцежкі спавілі...

Калі і як чужым зрабілася —
І песьні боль,
І што было,
І ўсё, што ў нашым сэрцы ўзьвілася,
Што нашым раньнем расьцьвіло...

Кахаць жыцьцё ты навучыла,
Ў вар'яцтвах я
Сваіх
Заціх.
І вось цяпер пішу для мілай:
— Я хочу
Чыстым,
Чыстым
Быць...

Сэрца сёньня ў смутку,
Сэрца словы точыць,
Як з шыпшыннай болі,
Радасьцю сказаць.
Я ня хочу болей,
Любая, ня хочу —
На крыжы шыпшынай
Сэрца расьпінаць!
Ўчора я ня ведаў,
Што мне ноч варожыць,
Думаў я у ночы —
«Жысьць» сваю —
Сьпяю...
Толькі ж так нягожа
Ў гэту нашу ростань
Звонам пахавальным
Выліць боль сваю.
Я скажу на ростань:

— Сэрца раніць досыць!
Досыць сэрца жытам
З болем раскідаць!
Так на сьвеце сіне,
Так на сьвеце проста,
Так ласкава любай
Вішаньню сьпяваць.

З халодным сэрцам жыць прыгожа,
А як зь пякельным болем жыць?..
Магу дзяліць я радасьць з кожным,
А гора з кім мне падзяліць?..

Глядзі мне ў вочы…
Кажуць праўду —
Каханьня ў іх мне
Не схаваць,
Каханьня песьні
Нам ня здрадзяць,
Не адцьвітуць яны
Ніяк.

Я сэрцам песень хочу сінім,
Хаця у песьнях быць з табой…
Ах, што усьмешка на хвіліну,
Пасьля яе — глыбей нам боль.

*

Цяпер «сябры» мае пачалі
Вакол мяне свой дзікі вой.
Так для цябе яны шукалі
Абраз таму,
Хто жыў з табой.

Няхай…
Тваё пачуе сэрца,
Хто ў песьні боль расьпяў сваю!
Я і цяпер мацней у сьвеце
Ласкава-сьветлую — люблю…

Я і цяпер скажу праўдзіва:
— Ня гэта
Здолею
Цярпець,
Хай толькі гора, што схіліла,
Апошнім будзе для цябе.

*

Ня муч і дай мне быць з табою,
Іначай болю
Не стрымаць нам...
Калі каханьне — гэта сон,
Дык я ня хочу прачынацца.

Ня муч! Каханьнем прабачай!
Якою ж здолееш ты сілай
На ўсё жыццё сказаць «прашчай»?
І як глядзець, што тое згіне,
Аб што я сэрца раскалоў,
І што было калісьці сіньню,
Што нашым некалі было...

*

Ты думай, любая, што вечна
маё каханьне сум прадзе,
І калі сэрца затрапешча,
Дык прывітаньне будзе мне...

Віецца верш ў каханьня строму,
І я, я сам сказаць бы мог:
— «Другія вершам перамогуць,
А я б каханьнем перамог»...

*

Цяжка, так цяжка!
Сьветлая, дай рукі,
Хай ўспаміны зьвяжуць,
Сэрца больлю скруцяць!

Крывёй ад калючак
Сыпляць розы ўвосень...
Сьветлая, — балюча...
Сэрца боль — ня зносіць.

Муч! Да дна! Да краю...
Не хлапчук. Ня плачу.
Шляхі сэрцам чую,
Як прайсьці — ня бачу.

Далей ў п'яным зельлі
Сэрцу жыць — нягожа.
І любіць мне нельга,
Не любіць
— Няможна.

Здрадная
І дарагая...
Не завянь ты ўвосень...
. . . . . .
Хто ж ласкавей песьні
Сваёй любай зложыць?..

*

Успаміны ў сэрцы лучыняць.
Ўсе гавораць — зрабіўся я гіцаль,
Ўсе гавораць — я сэрца раскінуў
Пазаплатанай рукавіцай...

Так заўсёды — шукаем мы ў сьвеце
Птушкі тэй, што знайсьці немагчыма,
Нібы нехта чаруе паэтам —
Мільгане птушка наша — ды згіне...

Вось чаму вочы часта так ў сьлёзах мае,
Я ачышчусь, паверце, паверце!..
У пачуцьцях ня буду больш сэрца паліць —
Маё сэрца...

Ах, усьмешкі і сьлёзы ня новы!..
Я няказаных хочу казаць,
Хочу я у засмучаных словах
Душу песень маіх адшукаць...

Успаміны у сэрцы лучыняць.
Ўсе гавораць — зрабіўся я гіцаль,
Ўсе гавораць — я сэрца раскінуў
Пазаплатанай рукавіцай...

...Няўжо і ты абвінаваціш
Таго, хто боль тваю тушыў,
І сьмеху смутак мне ў адплату
Ванзіш у сэрца, як шыпы?

Так заўсёды...
Шукаем мы ў сьвеце
Птушкі тэй, што знайсьці немагчыма,
Ад яе вечна гінуць паэты:
Неіснуючай,
Песеннай,
Сіняй...

*

Быў я радасным, аж дасюль
Быў даверчывым, як дзіцёнак...
Тым, хто выхаладзіў маю душу,
Я ні песень ня шлю, ні праклёнаў...

Словы сыплю вішнёваю грудаю,
Ў іх каханьне тваё заву здрадаю...
Называў я цябе чарнакудраю,
Называў я цябе сваёй радасьцю.

Так ніколі ніхто не кахаў,
Можа з больлю, а можа ад сьмеху...
Я ў пачуцьцях сябе раскідаў
І пайшоў беспрытульным па сьвету.

Я прыду, дарагая, — вярнуся!
Хай спрабуюць боль хвоі лячыць...
Прывітаю,
Замоўкну,
Схілюся,
Прысьмірэўшы, як шопат начны...

Так заўсёды ў жыцьці і бывае...
Просіш ты, каб я стаў чалавекам,
Я і сам чалавека шукаю,
Адкажы, які шлях будзе сьветлым.

Круг адчуваньняў
Гэткі вузкі...
Дык як на сьвеце жыць бяз болю?
І чым глыбей, тым боль калючай,
Дык як ў жыцьці мне быць здаволеным?

Круг адчуваньняў
Лёгка зьмерыць...
Я хочу ў болі быць зь бязьмежнымі...
Мне прыгажэй зь пятлёй на сэрцы,
Чым шлях шукаць сабе заежджаны.

Няхай маіх шляхоў
Сягоньня
Не відаць!
Няхай крывёй
Віюцца

Сьцежкі!
Маёю больлю
Хай да дна
Сабе, хто хоча,
Сэрца
Цешыць!

Затое
Здолеў я,
Я, гэткае
Знайсьці,
Што
Ў годах
Будзе
Вечным
Раньнем:
Калі мяне
Ня знойдуць
У жыцьці,
Дык будзе жыць
Маё
Каханьне…

[1926]

Анатоль Вольны (зьлева) і Міхась Чарот. 1925 г.



З ЦЫКЛЮ «ЛІТАРАТУРНЫЯ СЫЛЮЭТЫ»

МІХАСЬ ЧАРОТ

«Мастацкі сылюэт?..
Т-а-а-ак...
Мне вось гэта, як таму дзеду.
— „Дзействіцельна. Пад'яжджае. Так як да саломы...“
Ухопіш хіба яго вось гэты сылюэт?
Хіба толькі так, як да саломы».

Астап Вішня

Калі гэта было, каб беларускі падпасак з-пад саламянай страхі, ды яшчэ з-пад Рудзенску, ды быў здольны, ды яшчэ і як здольны:

— І да паэзіі.

— І да прозы.

— І да драматургіі.

А скажам, каб у Івана Іванавіча Іванова, з установы, ды яшчэ зь менскай, і здольнасьцяў:

— Ні да паэзіі.

— Ні да прозы.

— Ні да драматургіі.

Ёсьць пасьля гэтага справядлівасьць?

І не кажыце!

Зноў жа:

Чарот хаця ж часамі і ня піша, а яго хочуць друкаваць. А Іван Іванавіч хаця ж і піша, а яго ня хочуць друкаваць.

Ну, яшчэ скажам, каб гэтак год цягнулася. Ну, каб два, ну, каб яшчэ паўгода. А то дзесяць гадоў зараз міне.

Юбілей надыходзіць.

Спраўляць будуць.

Зноў жа:

Іван Іванавіч Іваноў, можа, нарадзіўся ў радзільным прыюце і спавівала яго, можа, спавівальная бабка, а гэты падпасак з-пад Рудзенску,

— Пхэ:

— «Мне калісьці казала маці,
Што радзіўся і я ў хляве,
Як карову пайшла даглядаці —
Ой, ды й ліха маёй галаве».

У хляве?

А вось народзіцца ж гэткае.

Ды яшчэ і дзесяцігадовыя юбілеі спраўляе.

Болей таго.

Некаторыя цяпер дык яшчэ і пераймаюць:

— І мы, і мы былі пастушкамі.

— І мы нарадзіліся ў хляве.

Але гэта дарма, што нарадзіліся ў хляве, бо гэта толькі палова працы, каб быць Чаротам, другая палова працы — прыгледзець, каб карова чым-небудзь цяжкім на галаву не наступіла, бо іначай у нашых умовах часамі вырастаюць крытыкі.

*

Ці радзіўся Чарот у хляве, ці не, гэта нарэшце нам дакладна не вядома, але той факт, што ён напэўне нарадзіўся, я магу пацьвердзіць чэсным словам.

І гэта я з ахвотай зраблю, бо ведаю, што чалавеку, які, раз даўшы слова, не зманіў, будуць верыць і ў далейшым.

Дык вось:

Як толькі нарадзіўся Чарот, у Рудзенск наляцелі крытыкі.

Падзівіліся, паглядзелі, а потым:

— Палымянец!

— Ды яшчэ і крычыць!

А потым саркастычна:

— І мы крычаць можам!

Малы Чарот слухаў словы крытыкаў, сасаў матчыну грудзь, зноў слухаў, а потым адарваўся ад грудзі, ды да маткі:

«Крыжам бы іх каля плоту.

Ды — трах!

Які тут страх?»

Потым гэтыя словы Чарот запісаў у паэму «Босыя на вогнішчы».

Калі Чароту ўжо быў адзін год і 8 месяцаў, прыехалі некаторыя культурныя дзеячы дапамагаць Чароту вызначыць ідэалягічны шлях.

— Бачыце, — пачалі яны, — тут з аднаго боку ня трэба, але затое ж з другога боку трэба... А ў агуле, калі прыняць пад увагу...

Чарот слухаў, слухаў, а потым:

— Ня ведаюць, якой яны веры.

Ат, халеры!

Культурныя дзеячы абразіліся і паехалі.



ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН.

МІКОЛА ПУПОЧАК

Гэта наўмысля і імя і прозвішча — і Мікола і Пупочак. Гэта імя Пупочка я наўмысля выдумаў для таго, каб чалавека, якога я хачу пад гэтым імем і прозвішчам захаваць, не знайшоў пракурор.

Наш Менскі пракурор тав. Гінзбург.

Бясспрэчна, калі пракурор захоча, то мы яму дапаможам у гэтым.

Герой, пра якога мы пішам, працуе ў літаратуры. У каля-літаратурным жанры.

Яго прыкметы: баіцца самакрытыкі, а калі злёгку закранаюць гісторыю ягоных агіднасцей, то ён пагражаючы адгукаецца:

— Шкодныя гутаркі!

(Урэшце, я заўважу, што, апынуўшыся параўнаўча на ягоным месцы, і другія крычаць тое самае).

Гэта падобна на тое, калі чалавек, якога рэжуць і які пачынае крычаць караул, чуе халодны адказ забойцы:

— Шкодныя гутаркі!

«Героя», аб якім я пішу, нельга абвінавачваць у залішняй арыгінальнасці.

Гэта падхалім, якіх не мала ў тым жанры, у якім ён працуе.

Але гэта падхалім, калі так можна выславіцца, па-за хатаю, па-за сваёй сям'ёй.

У межах-жа свае сям'і, у межах свае хаты, ён далёка пакінуў за сабою славутага чэхаўскага сямейнага дэспата.

Ды і што чэхаўскі сямейны дэспат супроць яго?

Ружовая здань з мінулага стагоддзя. Не болей!

Пачнем з таго, што чэхаўскі герой здзекаваўся з аднае жонкі, ды і тая была ў яго першая, а наш герой, па водле папярэдніх дадзеных, здзекуецца з 9 (дзевятай), ды і тая ў яго не апошняя.

... Далей мы дадзім слова змучанаму сэрцу апошняй на дадзеным этапе жонцы нашага «літаратурнага героя».

Далей у дужках да яе слоў мы будзем рабіць толькі свае халодныя друкованыя каментарыі.

(Першы каментарый, — дзевятая жонка нашага героя ўглядаецца ў ваш твар і насцярожана чулліва гаворыць вам):

— Тое, што яшчэ да мяне ў яго было восем жонак, я гатова яму дараваць...

(Таму што жанчына адчыняе нам з вамі, таварыш чытач, сваё сэрца, таму што з сэрца жанчыны вырываецца адзін толькі балючы крык, мы, таварышы чытачы, будзем чулымі. Даруем яе мужу лёс васьмі папярэдніх, як яна гэтага просіць, але будзем уважлівымі да лёсу гэтай дзевятай жанчыны. Хай сабе яна нас аб гэтым не просіць. Хай! Але мы павінны гэта зрабіць у імя лёсу 10 (дзесятай). Бо ад дзевятай да дзесятай,—адзін толькі крок.

— Пагаварыце з ім,—вы-ж пісьменнік, — ён-жа ваш таварыш!

(Значыць так, таварыш пісьменнік, выходзіць, герой гэтага фельетона наш таварыш... Для нас з вамі гэта нечакана і коўдна... Можа на некаторых з нас гэта нават і паклёп, а можа і сапраўды некаторыя з нас лічылі яго за таварыша, бо па тым знешнім гэтага чалавека, якое мы лічылі за далікацтва, мы не заўважылі ў ім нягодніка і падхаліма).

— Бо ў той час як я ляжала хвораю пасля аборту, мой муж у маёй прысутнасці, каля майго ложка, умаўляўся з дзесятаю жонкаю аб спатканні з ёю, растлумачваючы мне гэта сваім «пісьменніцкім» тэмпераментам.

(... І яшчэ шмат чаго гаварыў наш герой сваёй дзевятай жонцы... Гаварыў аб тым, што і дзевятая жонка ў яго не апошняя... Апошняя ў папа жонка... Што іх, жонак, у яго павінна быць трынаццаць. Гэта, бач, мара, вышэйшы ідэал, мэта ягонага жыцця, выкананая ім толькі пакуль-што на дзевяць трынаццатых).

Напаследак жанчына зноў просіць:

— Пагутарце з ім, — можа ён яшчэ ісправіцца?

... Я абяцаў гэтай жанчыне пагутарыць з «ім». І я добрасумленна выконваю сваё слова. Я гутару з ім. Вось гэтымі маімі радкамі гутару. А калі і гэта не дапаможа, то я папрашу нашага Менскага пракурора тав. Гінзбурга, — каб ён пагутарыў з гэтым героем. У тав. Гінзбурга гэта выйдзе куды больш пераканаўча.

Анатоль ВОЛЬНЫ.

А. Вольны. Мікола Пупочак. Фэльетон. Газэта «Літаратура і мастацтва», 31 сьнежня 1935 г.

*

Потым пачалася літаратурная школа Міхася Чарота.

Сядзе Міхась Чарот з алоўкам, а сьвіньні пільнуюць.

А як пачне Чарот вершы пісаць — яны ў грады.

Нахіліцца Чарот над паперкай, а сьвіньні лушчаць капусту, пахрукваюць.

Кожны раз непасрэдна пасьля гэтага Чарот плакаў.

Чаго плакаў, невядома, — мабыць, білі.

Потым плакала і маці Чарота, гледзячы на ісьпісаныя сынам кавалачкі паперы.

Чарот кажа, што маці плакала таму, што за душу, кажа, хапала ад яго вершаў.

З гэтай жа прычыны, кажа, і сам ён плакаў.

Толькі наўрад, каб маці Чарота плакала, чытаючы вершы сына, бо была яна непісьменная, а апрача таго, мабыць, плакала з тае прычыны, з якой і прычытвала:

— Ня будзе зь цябе, Міхась, добрага пастуха, — ня будзе!

Бацька ж Міхася, які бачыў практыкаваньні сына з алоўкам часамі, адчаяна-сьмела меркаваў:

— А ці ня думае хлапец выбіцца на настаўніка? — меркаваў бацька.

Нарэшце паступіў Чарот у народную школу.

І ў школе на занятках зноў паспрабаваў вершы пісаць.

Думаў, мабыць, што біць ня будуць.

Зноў лінейкаю па руках пахлопалі.

Гэта былі першыя воплескі аўтару за яго вершы.

Але, мабыць, вельмі вялікая ахвота была ў Чарота да вершаў, калі ўсё ж такі яе канчаткова ня выбілі.

Потым, як падрос Чарот, Алесь — старшы брат Чарота — паспрабаваў быў адвезьці Міхася ў сэмінарыю.

А ў сэмінарыі:

— Хто бацька?

А потым:

— Дык чаго ж ты, чортава дзіцянё, сунесься?

Гэта быў «прыём» Чарота ў школу.

Чарот нават і не зьдзівіўся.

Ня мог жа ён чакаць, каб у сэмінарыю яго прынялі, як Апалёна.

Выслухаў Чарот гэта адказ і паехаў дахаты.

Зноў? — пытаюцца.

Зноў! — кажа.

Трэба, мабыць, кажуць, прыняць, бо штогод прыяжджаць будзе.

Прынялі...

*

А цяпер, пасьля ўсяго таго, на Беларусі гавораць —

Крытык:

— Я першы сказаў, што з гэтага хлапчука няйначай як Чарот выйдзе.

Гісторык:

— Ух, які хлус! Я ў гістарычным асьвятленьні куды раней заўважыў гэтую постаць!

Дзяяч:

— Ай, ай, ай, якія манюкі абодвы. Гэта ж у маёй запісной кніжцы яшчэ за 1896 год запісана:

«Нарадзіўся будучы першы беларускі пралетарскі паэта, Міхась Чарот. Аўтар будучай славутай паэмы „Босыя на Вогнішчы“».

Сам жа Міхась кажа, што яго зрабіў Чаротам Кастрычнік.

[1928]

АЛЕСЬ ДУДАР

Пішу пра таго паэта, пры выступленьнях разам зь якім у прэзыдыюм прыходзяць запіскі з запытаньнямі:

— Сямейны склад выступаючых паэтаў?

А потым ужо:

— Таварыш Дудар, дазвольце з вамі пазнаёміцца.

...І таварыш Дудар дазволіць пазнаёміцца, а на другі дзень затое таварыш Дудар у роспачы будзе пісаць:

«Завядуць мяне людзі ў зьвярынец
І напішуць: рукамі не чапаць».

У роспачы на другі дзень таварыш Дудар п'е кефір і слабенькія віны.

«Люблю, кажа, піць каньяк, бо, па-першае, ён кісьленькі, а па-другое, не ап'яняе».

На выгляд Алесь Дудар вельмі сымпатычны малады хлапчук.

...Вось чаму і запіскі прыходзяць у прэзыдыюм, вось чаму, памятую, аднойчы нават нейкая старушка ветхая, дрэўная старушка, памыкнулася было гаварыць яму камплімэнты.

Сымпатычны малады чалавек выслухаў камплімэнты, а потым:

— Не іначай, кажа, як праўда-тэорыя аб тым, што ў прыродзе ніякая погань не прападае...

Бабушка абразілася і кінула какетаваць.

Алесь Дудар нам, рэдакцыйным працаўніком, вядомы тым, што ён шмат ходзіць.

Гэтай першапачатковай кваліфікацыі яго навучыў Галубок, у якога некаторы час працаваў Дудар, навучыў як якасьці, неабходнай для вандроўнага артыста.

Што і казаць, артыстам ад гэтага Дудар ня стаў, але праз тое ходзіць ён шмат і ходзіць старанна.

Цяпер вось далі Дудару ўсе магчымасьці вучыцца. Што гэта значыць:

— Працы, значыць, у цябе ніякай. Сядзі сабе, значыць, ды пасьвіствай.

А Алесь Дудар ходзіць.

Ходзіць, на хаду вершы піша. На хаду крытыкуе. На хаду залікі рыхтуе, на хаду хваробу пераходзіць.

Вось вам, таварышы-чытачы, гэтак кажучы, «надворны Дудар» — жывы Алесь Дудар.

Ну, але для нас ня так важна, дзе і з кім знаёміўся паэта, для нас больш важна яго творчасьць, як казаў адзін крытык, крытыкуючы вушы аднаго пісьменьніка . . . . . .

«Шавіністам, мешчанінам
Абзавуць каго папала —
Абы толькі хлеб ды чын ім,
Ды каб грошай перапала.
А тады... Тады ўсё роўна:
За камуну, за саветы,
Захлынуцца немым ровам
За цялячую катлету».

Зь вершаў Алеся Дудара.

23 сьнежня 1904 году ў лесе здохла нешта вялікае, бо ў гэты дзень, згодна календару, нарадзіўся беларус, які:

1) Пакуль што ня здрадзіў сваёй бацькаўшчыне.

2) Напісаў вышэйпададзеныя радкі, якія, будзем верыць, пазбавяць іх аўтара ад выказаных у іх нацыянальных асаблівасьцяў некаторых інтэлігентаў зь «беларусов».

Яшчэ зусім маладым, казаў Алесь Дудар, я супроць гэтага гатунку інтэлігэнцыі дэманстратыўна сьлед пакідаў.

Цяпер Алесь Дудар падрос і, не раўнуючы з другімі сучаснымі паэтамі, гэтага ўжо ня робіць, але добрыя рысы варожасьці да ўсяго здрадніцкага, да ўсяго несумленнага ў адносінах да сваёй краіны, да сваёй БССР, знайшлі сабе вялікі адбітак у яго творах.

Я некалі ахрысьціў Алеся Дудара «рэвалюцыянэрам зь пялёнак». З таго ж прыблізна часу пачынаецца і літаратурны стаж Алеся Дудара.

Яшчэ ў дзіцячыя годы Алесь Дудар прызадумаўся над сваім будучым лёсам.

З расійцаў Пушкін, думаў малады Алесь, вырас у найвялікшага паэту, Гогаль у найвялікшага празаіка, Бялінскі ў найвялікшага крытыка, а яны да гэтага яшчэ і беларусамі не былі.

Паглядзім, што зь мяне вырасьце, рашыў малады Алесь, і пачаў пісаць разам і вершы, і прозу, і крытыку.

Што лепей у Дудара выходзіць, цяжка сказаць...

Тыя, каго ён хваліць, кажуць, што крытык Алесь Дудар значна лепшы, чым паэта.

Тыя, каго ён лае, гавораць, што як крытык Алесь Дудар нікудышны, а як паэта добры.

Гэткім чынам, што вырасьце з Алеся Дудара — цяпер цяжка сказаць. Адно зразумела: і як паэт, і як празаік, і як крытык Алесь Дудар здольны.

А адгэтуль: нешта, значыць, зь яго ды вырасьце.

Хай жа расьце Алесь Дудар!

[1928]



Віктар Жыбуль

хто ўзімку жыве, як вясной...



Юрка Лявонны




Ёсьць настроі... А ў іх — пералівы.
Ёсьць часіны — здаюцца сном.
Толькі той на сьвеце шчасьлівы,
Хто узімку жыве, як вясной!

Леанід Мікалаевіч Юркевіч (псэўданім Юрка Лявонны) нарадзіўся 16 (29) ліпеня 1908 г. у горадзе Чавусах Магілёўскай губэрні (цяпер раённы цэнтар Магілёўскай вобласьці), у прадмесьці Зарэчча. Бацька быў настаўнікам, а пазьней, у савецкія часы, паэтавы бацькі працавалі, як тады казалі, «саўгандальслужачымі» [3, с. 16]. Сям'я мела свой дамок і надзел зямлі ды вяла напалову сялянскі лад жыцьця, таму ў некаторых анкетах паэт пазначаў сваё паходжаньне як сялянскае [11, арк. 113]. Бацька меў даволі багатую бібліятэку, дзякуючы чаму будучы паэт прызвычаіўся чытаць досыць рана — з шасьці гадоў. Вучыўся ў чавускай школе (сямігодцы) 2-й ступені, дзе яму пашанцавала з настаўнікамі расейскай літаратуры. Паводле самога Ю. Лявоннага, менавіта ў школе ў яго выявілася «некаторая здольнасьць да пісьменства». У студзені 1925 г. малады паэт наведваў Магілёўскія агульнаадукацыйныя курсы, на якіх пазнаёміўся і зь беларускай літаратурай. *«Адразу надта зацікавіўся ёю,* — успамінаў Ю. Лявонны, — *але наогул аб сучасным стане літаратуры меў вельмі дрэннае прадстаўленьне»* [8, с. 104].

Літаратурную дзейнасьць паэт пачаў увесну 1925 г. зь сялькораўскіх заметак у магілёўскай газэце «Соха и молот». Тамсама быў надрукаваны і ягоны першы верш «В дни скорби» (на расейскай мове). Неўзабаве газэта спыніла існаваньне, і Юрка Лявонны пачаў стала супрацоўнічаць з газэтай «Магілёўскі селянін», у якой зьмяшчаў вершы, карэспандэнцыі, артыкулы, тэатральныя рэцэнзіі і г. д. Тады аўтар падпісваў творы яшчэ сваім прозьвішчам — *Л. Юркевіч*, але зь верасьня 1925 г. узяў псэўданім *Леанідаў*. Паэт прызнаваўся, што характар і кірунак ягоных тагачасных вершаў *«дыктаваўся, звычайна, той ці іншай кампаніяй; гэтак, прыкладам, напісаны „У будучыну!" (Да Дню ўраджаю), „Частушачкі" (да юбілею газэты) і г. д.»* [8, с. 105].

У кастрычніку 1925 г. малады паэт уступіў у Магілёўскую філію Ўсебеларускага аб'яднаньня паэтаў і пісьменьнікаў «Маладняк». Сяброўства ў «Маладняку» спрыяла паэтычнаму сталеньню Ю. Лявоннага. *«Пачынаю грунтоўна і стала займацца вывучэньнем тэхнікі вершаваньня, разборам навейшых аўтараў і наогул — самаадукацыяй у гэтым напрамку»* [8, с. 105], — напісаў ён пра гэты пэрыяд. Неўзабаве Юрка Лявонны быў дэлегаваны на 1-ы Ўсебеларускі зьезд «Маладняку», які адбываўся ў Менску 25–29 лістапада 1925 г. На вялікім групавым здымку ўдзельнікаў зьезду Юрка Лявонны сядзіць у другім шэрагу ў абдымку з Паўлюком Трусам.



Анкета
для сяброў і кандыдатаў Магілёўскае філіі Маладняка.
113
1. Імя і па бацьку прозьвішча. Леанід Мікалаевіч Юркевіч /„Леанідаў"/.
2. Калі радзіўся..... 16-га ліпеня 1908 году.
3. Нацыянальнасць... Беларус
4. З якой мясцовасьці... мяст. Чавус, Магіл. вакругі, праф. Зарэчча.
5. Сацыяльнае паходжаньне... селянін.
6. Чым займаюцца бацькі ... земляробствам
7. Партыйнасць.... ——
8. Калі пачаў пісаць... з 1924-га году.
9. Ці друкаваўся да гэтага часу.... друкаваўся
10. З якога часу працуе ў Маладняку ... з восені 1925 г.
11. Адукацыя ... студэнт 1-га курсу педтэхнікуму
12. Адрас Магілёў Чэл., Быхаўская вул., Акульчаў пасял. Белпедтэхнікум
„10/Х" - 25 г. Подпіс: Л. Юркевіч /Леанідаў/
Заключэньне К.Б. Маладняка. Залічыць членам-абітурыентам - Біл. №102

Анкета сябра «Маладняку» Юркі Лявоннага.
Аўтограф. 10 кастрычніка 1925 г.

Паўлюк Трус і Юрка Лявонны на І Усебеларускім зьезьдзе «Маладняку». Менск, 1925 г.



Неўзабаве псэўданім *Леанідаў* перастаў задавальняць паэта, і з сакавіка 1926 г. ён пачаў падпісвацца ўжо як Юрка Лявонны, набыўшы вядомасьць у літаратуры менавіта пад гэтым імем. Новы псэўданім ён утварыў ад сваіх сапраўдных імя і прозьвішча — Лявон (Леанід) Юркевіч. Пра свае тагачасныя прыхільнасьці ён пісаў наступным чынам:

> *«З расійскіх паэтаў — гледзячы па настрою — найбольш люблю барабаннасьць Маякоўскага, размах Ясеніна, ціхую сугучнасьць Дароніна.*
>
> *З старэйшых маладнякоўцаў найбольш падабаецца мне кампазыцыя вобразаў Яз. Пушчы і арыгінальная проза К. Чорнага»* [8, с. 106].

Да творчасьці самога Ю. Лявоннага кіраўніцтва Магілёўскай філіі «Маладняку» спачатку ставілася даволі насьцярожана, адзначыўшы схільнасьць маладога паэта да фармальных экспэрымэнтаў у духу імажынізму. Як вядома, паэты-імажыністы (у Расеі — В. Шаршаневіч, С. Ясенін, А. Марыенгоф і інш., у Беларусі — Я. Пушча) імкнуліся максымальна напоўніць вершы мэтафарамі, выяўлялі парадаксальнасьць паэтычнага мысьленьня, схіляліся да гіпэрбалаў, гратэску. Багата незвычайных, ускладненых мэтафараў і ў раньніх вершах Ю. Лявоннага, асабліва напісаных акурат у тым 1926 годзе: *«На марозе жаданьняў вецьце / Заплялося ў бунтоўным сьне. // <...> / І прагоніць кудлатая радасьць / З пасівелых палёў туман. // Хутка думак прыстане човен / Да празрыстых дзён-берагоў»* (верш «Падарожнае»); *«Толькі ночы густыя валосьсі / Кудлачыць гудком правадыр»* («У цягніку»); *«Сіньню глыбокай запылены / Вецер за хатамі строчыць», «Думак кіпучае марава / Ловіць прапенны лёт. / Вечар на грудзях карáлевых / Ласкай заморанай лёг»* («Вечарам»); *«Крыe пасьцілкай лілёваю / Рэчку любоўнік-туман. / Радасьць прыгожа-вясновую / Ноч пад вакном разьліла»* («Вясной»); *«Разбуянь маёй песьні напевы, / Расьсьцялі па зямлі каўром!..»* («Зімовая дарога»); *«На калёсах мінулае трусіць, / І скрыпяць разапрэўшыя восі... / Залатым, самацьветным абрусам / Крыe даль журавінная восень»* («Захавалась мінуўшчына цесная...»); *«Ківаўся вечар на грэбню чмарым, / Калі зазьзяла вада пажарам, / Калі на рэйдзе ўдваіх*

матросы / Сьвістком часалі зары валосьсе» («З поўдню») [4, с. 7]. На прынцыпе мэтафарычнага ланцужка аўтар амаль цалкам мог будаваць вершы, напрыклад:

Зямля, успацеўшы лужамі,
Аб каханьні з плугам марыць.
Абкруціўся ружовымі стужкамі
Разьвясёлы хлапчына-мараc!

І сьмяецца ў далёкае неба
Пад сінеючай дымкай бяроза.
Заўтрашняй ломкі рэбус
Пальцам старому грозіць!.. [8, с. 21]

Нават рэаліі новай сацыялістычнай эпохі паэт мог віртуозна ўставіць у верш, зрабіць арганічным складнікам сваёй вобразнай сыстэмы: *«Ў п'яным лесе — сягоньня грозна. / Ў п'яным лесе — сьвяточны мітынг. / <...> / Пакахаў камсамолку-бярозку / Старшыня веснавеяў — Май!..»* («Маем сонечным») [8, с. 18].

За «хібы фармальнага парадку» Ю. Лявоннаму, згодна з ідэалягічнымі наказамі таго часу, давялося «пакаяцца». 13 траўня 1926 г. у «Аўтабіяграфічнай характарыстыцы» ён напісаў:

«Лічу для сябе досыць шкодным маё апошняе захапленьне імажынізмам, якое, безумоўна, не зусім адпавядае мэце аб'яднаньня, да якога я належу...

Думаю, што гэта плынь, пад цьвярозым поглядам на мэты пралетарскай творчасьці, — пройдзе, як і шмат чаго праходзе ў 17 гадоў!..

Застанецца толькі здаровы, рэальны падыход да абмалёўваньня жыцьця, застанецца бадзёрае, сьветлае мэтаімкненьне на грунце кляса-ва-марксы[с]цкай ідэалёгіі» [8, с. 106–107].



Юрка Лявонны, 1927 г.

Адначасова з навучаньнем у пэдтэхнікуме, у 1926–1929 гг., Юрка Лявонны працаваў у газэце «Магілёўскі селянін», дзе выступаў з «аглядамі творчасьці пачынаючых паэтаў». Прыкметна, што і самому Ю. Лявоннаму на той момант было ўсяго 18–19 гадоў. Аднак двухгадовы літаратурны стаж і сяброўства ў «Маладняку» ўжо да чагосьці абавязвалі — хутка ж высьпявалі паэты ў 1920-я гады! Юрка Лявонны зьвяртаў увагу і на вартасьці, і на хібы ў іхнай творчасьці, знаходзячы ў творах сваіх аднагодкаў тое, за што яшчэ нядаўна ўшчувалі яго самога. Так, напрыклад, разглядаючы вершы чавускага паэта Лявона Кісялёва (1908–1942), Ю. Лявонны пісаў: *«Гэта — „вобразна"... Але — цяжка для разуменьня шырокімі сялянскімі коламі, дзеля якіх прызначаецца наша газэта... <...> У тав. К-ва прыкметна здольнасьць і працавітасьць у апрацоўцы свайго матар'ялу. Менш „завумнічаньня", большая чыстата мовы, уважлівае чытаньне — і посьпехі, безумоўна, будуць!»* [6, с. 3].

З 1926 г. Юрка Лявонны супрацоўнічаў таксама і зь літаратурным аддзелам менскай газэты «Савецкая Беларусь». Ягоныя творы ўсё часьцей публікаваліся на старонках ня толькі магілёўскіх (альманахі «Дняпроўскія ўсплёскі», «Раньне»), але і менскіх выданьняў: часопісах «Маладняк», «Малады араты», «Чырвоны сейбіт», газэтах «Чырвоная зьмена», «Зьвязда». Аднойчы паэт паставіў перад сабою мэту надрукавацца ў двух супрацьлеглых паводле ідэйна-эстэтычных установак часопісах — «акадэмічным» «Узвышшы» і «лева-футурыстычным» «Росквіце». (Першае выданьне арыентавалася на клясычныя традыцыі эўрапейскай літаратуры, а другое гэтыя традыцыі адмаўляла.) Мэты сваёй ён дасягнуў і вельмі ганарыўся гэтым. Праўда, калегі па пяры паставіліся да ўсяго вельмі скептычна. «Абедзьве рэдакцыі далі месцы для

прааўленьня „амэрыканізму“ гэтага акрабата... — пісаў Зьмітрок Астапенка сябрам літаратурнай суполкі «Ўзвышша». — І абедзьве рэдакцыі пэўна не далі б шчырае парады таму, хто не здабыў сабе вядомасьці (як мне хочацца ўзяць гэтае слова ў коскі!) праз друкаваньне вершаў „по всяким случаям“» [1, с. 174].

У Магілёве Юрка Лявонны пазнаёміўся з актрысай Тэатру рабочай моладзі Яўгеніяй Гольбэрг, зь якой неўзабаве ажаніўся. У 1930 г. ён пераехаў з жонкай у Менск, паступіў у Менскі вышэйшы пэдагагічны інстытут на крытычна-творчае аддзяленьне літаратурнага факультэту. У адной групе зь ім вучыліся паэты Эдзі Агняцьвет, Валеры Маракоў, Сяргей Мурзо, Зяма Піваваравў, Станіслаў Шушкевіч, крытыкі Саламон Левін і Пятро Хатулёў. Вось як пісаў пра знаёмства зь Юркам Лявонным паэт Сяргей Грахоўскі, які прыехаў у беларускую сталіцу годам пазьней і паступіў у тую самую навучальную ўстанову: «Малады, статны й прыгожы юнак, трошкі артыстычнага складу, з густымі каштанавымі валасамі, у шчыгульным шэрым касьцюме ў дробную клетачку, у белай кашулі з модным гальштукам кватараваў са мною амаль па суседзтву. Гэта і быў Юрка Лявонны. Мы часта разам езьдзілі ў трамваі да Даўгабродзкай вуліцы, ішлі па маім, ужо даўно не існуючым, Трамвайным завулку. Я зварочваў у брамку й ішоў у свой маленькі катушок, наняты ў доўгім драўляным доме. Часам, загаварыўшыся, праводзіў Юрку трохі далей, на вуліцу Фурмана [або Фурманская. — В. Ж.], дзе цяпер Пугачоўская. І Лявонны жыў у маленькім пакойчыку ў прыватным доме. У ім, апрача ложка, этажэркі, канапкі й малога століка, была... мілая, улюбёная ў паэзію Жэня, артыстка Тэатру рабочай моладзі. Але яна ўжо адыграла сваё: сарвалася з тэатральнай канструкцыі, зламала нагу і стала толькі гаспадыняю і добрай дарадчыцай паэта» [3, с. 16].

1930–1932 гг. сталі для паэта сапраўдным зорным часам. За гэты кароткі пэрыяд у яго выйшлі 5 кніг паэзіі з характэрнымі, вытрыманымі ў духу эпохі назвамі («Камсамольскія вершы», «Штурм», «Жалезныя віхуры», «Разьбег», «Стала і мужна») і зборнік нарысаў «Крок пяцігодкі». Пісьменьнік Станіслаў Шушкевіч успамінаў, як з гэтай нагоды прафэсар Пятро Бузук сказаў Ю. Лявоннаму: «Віншую з творчай актыўнасьцю. Летась выдалі два зборнікі, сёлета два. — І раптам пажартаваў: — Яно ўжо, можа, і замнога... Памятаеце, у Багдановіча: „Трэба з сталі каваць...“? Лявонны пачырванеў, а прафэсар, усьміхнуўшыся, шырокім крокам пайшоў па калідоры» [12, с. 3].


Сярод даволі немалой творчай спадчыны Юркі Лявоннага вялікую частку займаюць надзённыя вершы, прысьвечаныя грамадзянскай вайне, Чырвонай арміі, Асінбуду, зьезду калгасаў, клясаваму змаганьню ў Заходняй Беларусі, антырэлігійнай барацьбе, разнастайным палітычным падзеям і знакавым для савецкай гісторыі датам. Вось назвы некаторых ягоных вершаў 1930–1933 гг. : «Юбілейная чырвонаармейская», «У дзень вызваленьня», «Усяго адно прайшло дзесяцігодзьдзе», «На хвалі сталінскіх прыбояў», «Першамай у Заходняй Беларусі», «Мы не аддзелім героя ад клясы!», «Партрэт ілжэўдарніка», «Кастрычніцкая песьня», «Кляра на трыбуне», «Камуна БВА». А вось пара цытатаў:

Радзеюць змрокі ночы,
І цемры гіне мох.
На рыштаваньнях крочым
Да новых перамог.
Прагналі прыганятых мы,
І ўюцца думкі роем...
Імчыцца сьпеў над хатамі
І над заводаў строем [7, с. 31].
(«Юбілейная чырвонаармейская», 1929)

Або:

Пыл рэлігійны
з подумак сьцершы,
Славім агністую ноў.
Дазвольце вітаць —
ну, хоць гэтым вершам —
Чарговы зьезд
змагароў! [7, с. 52]
(«Канфэрэнцыі бязбожнікаў», 1931)

Вокладка кнігі Юркі Лявоннага. «Комсамольскія вершы». Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1930 г. Мастак Георгі Берэндгоф



Асноўны недахоп такіх вершаў — нават ня ў зьмесьце (на многіх тагачасных творах так ці інакш адбілася ідэалёгія), а ў тым, што ў іх ніяк не выяўляецца творчая індывідуальнасьць Юркі Лявоннага: такія вершы ў той час мог напісаць хто заўгодна. Складаецца ўражаньне, што паэт не асабліва стараўся, пішучы падобныя вершы. Імажынісцкая аздоба зьнікае або зводзіцца да мінімуму, і застаецца голая рыторыка...


Юрка Лявонны як чалавек з тонкім густам да слова, да паэтычнай формы і сам адчуваў, што многія вершы яго не дацягваюць да высокага ўзроўню, але быў перакананы: *«Сапраўднае я яшчэ напішу, значнае — наперадзе, а пакуль што ў наш віхурны час патрэбны агітка і частушка, лёзунгавы верш і рыфмаваны подпіс пад малюнкам»* [3, с. 16]. Юрка Лявонны ня ведаў, што чакае яго наперадзе, і, на жаль, напісаць сваё «сапраўднае», максымальна рэалізавацца як творца ён так і не пасьпеў. Але аскепкі таго «сапраўднага» ўсё ж такі не ў адных, дык у другіх вершах прабіваліся вонкі, нягледзячы ні на ўсе навязаныя ідэалягічныя наказы, ні на ўнутраныя самапераконваньні самога паэта.

І сёньня творчасьць Юркі Лявоннага вабіць зусім не агіткамі і частушкамі, а творамі, у якіх ёсьць яркія вобразы, непадробныя лірычныя інтанацыі, трапныя назіраньні. За свой кароткі век ён пасьпеў зразумець, што *«На парозе да жыцьця / Востры адчуваньні»*, што *«Мала часу працякло, / Многа перажыта»*, што *«Кожны з нас на зямлі толькі госьць: / Гэта — вечная радасьць і драма»*, што *«Пралятаюць — і шчасьце, і гора, / Як ружова-расьцьвечаны дым»*... Юрка Лявонны цікавы нам як паэт, здольны ў ружовым золку ўгледзець аваднёў, што гудуць на недасяжных для звычайнага вока струнах, убачыць, як валіцца «зялёны месік на калені ў срэбны сьнег» і далі ружавеюць крыштальнай цьвеценьню, як *«Кружаўным абрусом разгартаецца / Вышываная шоўкам раніца»*, як *«Адценьнямі яблык гатункаў апорт / Лізнуў адвячорак дарогу»*. Ён здольны пачуць і як *«рагочуць сьняжынкі ў высі»*, і як *«зор пялёсткі сьмяюцца і гаснуць»*. Вось ён, сапраўдны Юрка Лявонны — паэт, у грудзёх якога бушуе «залатая замець», жаданьні заплятаюцца вецьцем «у бунтоўным сьне», а думкі то чоўнамі плывуць «да празрыстых дзён-берагоў», то «разьлятаюцца, як з дубоў лісты».

Народжанаму на ўскрайку невялікага гарадка, Юрку Лявоннаму былі аднолькава падуладныя і гарадзкая, і вясковая тэматыка. З канца 1920-х — больш ужо гарадзкая, натхнёная жыцьцём у Магілёве і Менску, якая рабіла Ю. Лявоннага адным з прадстаўнікоў урбаністычнай плыні ў тагачаснай беларускай паэзіі. Згадаем ягоныя вершы «Вуліца», «Горад», «У горадзе», «Новы Магілёў», «Магілёўская вясна», «На вуліцы нядаўна», «Вакзал» і іншыя. Правады, паравозы, фабрычныя коміны, вітрыны, ліхтары, электралямпы — звычайныя вобразы для ягоных твораў.

Чыстыя камяніцы,
Рознакалёрны бляск.
Друкарні фасад сьвіціцца
Сотняй электралямп.
Гады праляцелі шквалам,
Снарадамі —
па страсе,
І адышлі навалы,
І ў будаваньні ўсе.
(«Друкарня», 1932) [7, с. 64]

Натхнёнае і ўсё ж па-мастацку вытрыманае апяваньне тэхнічнага прагрэсу, індустрыялізацыі знайшло адлюстраваньне ў такіх творах, як «Самалёт» або «Верш пра дырыжабль»:



Вокладка кнігі Юркі Лявоннага «Разьбег». Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1931 г. Мастак ня вызначаны



Вокладка кнігі Юркі Лявоннага «Стала і мужна». Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1932 г.

Каб хутчэй віравалі вены,
На змаганьне
З завеяй злой,
Мы прышыем надхмар'яў пену
Алюмініевай іглой!
. . . . . .
Удоўж і ўпоперак,
Плынна і вольна,
Пад кабінкі шпурляючы шыр,
Хай ляцяць над краінай раздольнай
Эскадрыльлі блішчастых машын! [8, с. 87–88]

Задумваўся паэт і пра магчымасьць жыцьця на іншых плянэтах. Адзін зь ягоных вершаў так і называецца — «Размова з марсіянамі»:

А хмаркі надыдуць —
Касьмічная ростань,
І пеніцца гладзь акіяну.
З цыліндру фантазій
Пытліва і проста
Глядзяць на Зямлю марсіяне... [8, с. 85]

Як можна меркаваць са зьместу некаторых вершаў, Юрка Лявонны цікавіўся заходнеэўрапейскай літаратурай. У вершах ён згадвае А. Конана Дойла зь ягоным Жэрарам, Райдэра Гаґарда, Марыета, Купэра, Бадлера і г. д. Але такіх літаратурацэнтрычных вобразаў, як у Юлія Таўбіна, мы ў яго не знаходзім.

Юрка Лявонны быў здольны перадаваць у паэзіі ня толькі свае ўласныя пачуцьці й настроі. Героі ягоных вершаў — гэта і прызваны ў войска Пятрок, і беспрытульнік Сёмка, і сялянка Маланьня, якая ідзе на сход, і нават жанчына, якая толькі што перажыла аборт. Так у вершаваных радках адбіваюцца маленькія жыцьцёвыя гісторыі з сваімі радасьцямі і драмамі, дзе аўтар або спачувае героям, або асуджае іх, як, напрыклад, у вершы «Мешчанін»:

Зноў сварка з жонкаю...
Якая мэлядрама!
Яе жаданьні кінуўшы ў касьцёр,
Мой гаспадар стварае з быта яму,
Дзе часам захлынаецца і сам ён,
Як захлынулася жаночае жыцьцё [9, с. 40].


Акрамя ўжо выдадзеных кніг Ю. Лявоннага, былі праанансаваныя і яшчэ некалькі падрыхтаваных да друку: зборнік апавяданьняў «Човен у моры», кніга выбраных вершаў «Радком і сэрцам», а таксама супольны зборнік Юркі Лявоннага, Станіслава Шушкевіча і Зямы Піваварава «Ордэр на заўтра» [8, с. 76]. Аднак яны ня выйшлі, а паэт працягваў друкавацца ў пэрыёдыцы, але пераважна ўжо як журналіст, нарысіст, тэатральны рэцэнзэнт. Што ж здарылася? Як згадвае С. Шушкевіч, паэт сапраўды задумаўся пра якасьць сваіх вершаў і вырашыў з выданьнем кніг не сьпяшацца [12, с. 3]. А паводле зьвестак Леаніда Маракова, прычына ў тым, што Юрка Лявонны быў абвінавачаны ў пашырэньні «контрарэвалюцыйных вершаў» [10, с. 54, 56]. Але на той час усё абышлося выключэньнем з пэдынстытуту, у якім паэт нават даволі хутка здолеў аднавіцца. Навучаньне ён сумяшчаў з працай у рэдакцыях часопісу «Работніца і калгасьніца Беларусі» (1932–1933; 1935–1936), газэты «Зьвязда» (1933–1934). У 1934 г. Юрка Лявонны быў прыняты ў Саюз пісьменьнікаў БССР.



Юрка Лявонны, фота ўпершыню апублікаванае ў газ. «Літаратура і мастацтва», 30 ліпеня 1968 г.

Пасьля заканчэньня літаратурнага факультэту ў 1934 г. Ю. Лявонны быў разьмеркаваны ў Бабруйск, дзе кароткі час (верасень — сьнежань 1934 г.) выкладаў літаратуру ў пэдагагічным тэхнікуме і працаваў у акруговай газэце «Камуніст». Вярнуўшыся ў Менск, паэт пачаў працаваць у рэдакцыі грамадзка-палітычнага вяшчаньня Радыёкамітэту.

Акрамя вершаў, Юрка Лявонны пісаў апавяданьні, фэльетоны, нарысы, артыкулы, тэатральныя нататкі, рэцэнзіі на спэктаклі і кінафільмы. Зьвяртаўся і да перакладаў — пераважна з расейскай і ўкраінскай моваў. У 1936 г. Ю. Лявонны разам з С. Грахоўскім пераклаў раман Жуля Вэрна «20 000 льё пад вадой», які



Вокладка кнігі Юркі Лявоннага «Выбранае». Мінск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1960.

ў беларускім варыянце атрымаў назву «80 000 кілямэтраў пад вадой». Але выйшаў пераклад толькі ў 1937 г. — ужо пасьля арышту абодвух перакладнікаў, таму на тытульным аркушы было пазначана толькі прозьвішча рэдактара Янкі Маўра.

Юрка Лявонны быў арыштаваны 30 кастрычніка 1936 г. у Менску ў сваім доме пад адрасам вул. Фурманская, д. 9, кв. 2. Паводле Леаніда Маракова, «з падсьледных, якія праходзілі зь ім разам, толькі Л[явонны] пасьля бясконцых катаваньняў не пацьвердзіў, што Цішка Гартны „контрарэвалюцыянэр", „нацдэм" і г. д.» [10, с. 56]. Жонка паэта спрабавала дамагчыся яго вызваленьня, хадзіла па розных інстанцыях, зьвярталася да сьледчых і г. д., спадзеючыся, што «памылка» будзе выпраўлена. Спатканьне з мужам ёй дазволілі толькі ўвесну 1937 г. [5, с. 91]. Пра апошнія месяцы жыцьця Ю. Лявоннага ўспамінае ягоны сябар С. Грахоўскі:

«У верасьні 1937 мяне перавялі ў гарадзкую, кацярынінскіх часоў, турму і кінулі ў агульную камэру. Якраз пад ёю, акно пад акном, у сутарэньні сядзеў Юрка Лявонны. Вокны забіты так званымі „намордникамі". Сьвятло падала толькі зьверху, а гук ішоў угору. Мы адразу пачалі зь Юркам перагаварвацца. Яму прыпісалі некалькі страшных артыкулаў, а ён толькі пасьмейваўся, што ўсё гэта глупства, няма ніякай зачэпкі для абвінавачваньня, суцэльная хваравітая фантазія сьледчых. Суд разьбярэцца, усё рассыплецца пылам, і мы хутка сустрэнемся дома. Ён быў заўсёды аптымістам, і не хацелася расчароўваць скепсісам.

Лявоннага ведала ўся турма і кожны досьвітак чакала яго выхаду „ў этэр". Нас, „палітычных", адразу пазбавілі кніг і газэт. На апошнім паверсе сядзелі непаўналетнія злачынцы. Іх старанна перавыхоўвалі — давалі газэты і чыталі кнігі, але не дазвалялі курыць. Лявонны зь імі ўстанавіў сувязь: на досьвітку дыктарскім голасам гукаў: „Атанда! Давай каня". Празь якую хвіліну на завязаных матузках спускаўся скрутак газэт проста ў „намордник" Юркавай камэры, а назад па сыгнале „трымай!" узьнімаўся пачак махоркі. Неўзабаве з падвальнага акна чуўся выразны, добра пастаўлены голас Лявоннага: „Увага! Слухайце навіны". І пачынаўся сьцісьлы агляд газэтных паведамленьняў, потым ён пераходзіў да турэмных навін: каго выклікалі на допыт, хто на каго накляпаў, каго арыштавалі. З асабліваю асалодаю ён паведаміў, што былы пракурор Глезер, які падпісваў на нас ордэры, на трэцім паверсе турмы выносіць парашу. Кожны досьвітак, пакуль драмалі наглядчыкі, турма слухала „перадачы" Лявоннага.

Прыкладна ў канцы верасьня Лявонны „ня выйшаў у этэр". Усе ўстрывожыліся. Выстукваю „бястужаўкай" у яго камэру: „Дзе Юрка? Чаму маўчыць?" Адказ: „Выклікалі на суд бяз рэчаў". Назаўтра зноў маўчыць шостая камэра, на наступны таксама. Праз чатыры дні паведамілі з сутарэньня: „Не вярнуўся. Забралі рэчы"» [3, с. 16].

Пазасудовы орган НКВД 28 кастрычніка 1937 г. асудзіў Юрку Лявоннага як «члена шпіёнска-дывэрсійнай арганізацыі» да найвышэйшай меры пакараньня з канфіскацыяй маёмасьці. Расстраляны 29 кастрычніка 1937 г. Рэабілітаваны вайсковай калегіяй Вярхоўнага суду СССР 25 красавіка 1957 г. Асабовая справа Ю. Лявоннага № 10242-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі [10, с. 56].

Драматычны лёс напаткаў сям'ю паэта. Праз год пасьля расстрэлу Юркі Лявоннага, 5 лістапада 1938 г., арыштавалі ягоную жонку Яўгенію Гольбэрг, якая на той час працавала бухгальтаркай у «Белсольэнэрга». 28 лістапада асаблівая нарада НКВД асудзіла яе як «члена сям'і ворага народу» да 8 гадоў папраўча-працоўных калёніяў, праз Воршу яе этапавалі ў так званы «Алжыр» (Акмолинский лагерь жён изменников Родины) НКВД Казаскай ССР [10, с. 56]. Дачку Іну (нарадзілася ў канцы 1935 г.) адправілі ў дзіцячы дом, і сьляды яе згубіліся. Яе маці з Казахстану этапавалі ў Усьцьвымлаг (пасёлак Важаёль недалёка ад Варкуты, Комі АССР). Там яна пазнаёмілася з другім мужам, ад якога нарадзіла другую дачку Ірыну. 5 лістапада 1945 г. Яўгенія Гольбэрг была вызваленая, а 2 чэрвеня 1956 г. рэабілітаваная трыбуналам БВА. (Асабовая справа Я. Гольбэрг № 6656-с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.)

Нейкі час Яўгенія Гольбэрг жыла ва Ўкраіне, а пасьля рэабілітацыі вярнулася ў родны Магілёў. У 1970 г. яна з дапамогай празаіка Пятра Шасьцерыкова і паэта Васіля Матэвушава падрыхтавала кнігу вершаў Лявоннага, аднак выдаць яе не ўдалося — як адказалі супрацоўнікі рэдакцыі выдавецт-

ва «Беларусь», празь перагружанасьць матэрыяламі [2, арк. 5]. У 1989 г. А. Гольбэрг пераехала да дачкі ў Фэадосію (Украіна), дзе і памерла 13 ліпеня 1992 г. [2, арк. 15].

Архіў Юркі Лявоннага не захаваўся: ён згарэў у часы Другой усясьветнай вайны разам з домам яго сястры Арыядны, расстралянай нацыстамі. Рукапісы некаторых раньніх вершаў («У Дзень Ураджаю», «Ветру», «Раніца ў лесе», «Ў двору!», «Крыху рамантызму», «Дарога») захаваліся ў Беларускім дзяржаўным архіве-музэі літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ) у фондзе «Маладняку» [11, арк. 99–101, 114–119]. Першае пасьлярэабілітацыйнае выданьне выбраных твораў паэта ўбачыла сьвет у 1960 г. Але спадчына Ю. Лявоннага прадстаўленая ў кнізе ў містыфікаваным выглядзе: пад многімі вершамі стаяць даты, зусім не адпаведныя рэальнаму часу напісаньня (творы 1920-х гадоў датуюцца 1930-мі): такое ўражаньне, што ўкладальнік спрабаваў стварыць ілюзію, нібыта Лявонны цягам усяго свайго кароткага жыцьця плённа працаваў як паэт і нішто яму не замінала, хоць гэта было ня так. У новым выданьні выбраных твораў Ю. Лявоннага «Пералівы» [8] храналёгія пададзеная карэктна, уключана і нямала вершаў, якія ў прыжыцьцёвыя зборнікі не ўваходзілі.

Творы Юркі Лявоннага ня раз прыцягвалі ўвагу кампазытараў. На ягоныя словы напісалі песьні Якаў Гелер («Баявая чырвонаармейская»), Аляксей Туранкоў («Маладое», «У паход»), Ісак Любан, Міхаіл Мацісон, Самуіл Палонскі, Несьцер Сакалоўскі, Мікалай Чуркін, Уладзімер Тэраўскі. А цяпер да гэтага сьпісу дадалася новая песьня — «Зімовая радасьць» у выкананьні гурту «Vuraj».

Літаратура і крыніцы

1. *Галасы пакалення*: Лісты маладых пісьменнікаў другой паловы 20-х — першай паловы 30-х гадоў да Пятра Глебкі / Публ. Я. Кісялёвай // Маладосць. 1989. № 7.

2. *Гольберг Я., Макаренко И.* Письма к С. Граховскому. 22.02.1980–16.03.1993 // БДАМЛМ. Ф. 201, воп. 4, адз. зах. 198, арк. 5.

3. *Грахоўскі С.* Рэквіем па другу // ЛіМ. 1988. 26 жн.

4. *Жыбуль В.* «Вобразаў мяцежных мітульга»: Метафара ў лірыцы Юркі Лявоннага // Роднае слова. 2018. № 7.

5. *Заерко А. Л.* Репрессированная Беларусь. Брянск: Издатфонд — Издат, 2016.

6. *Л. Ю.* [Лявонны, Ю.] Вясковая рунь (Агляд творчасьці пачынаючых паэтаў) // Магілёўскі селянін. 1927. 5 мая.

7. *Лявонны Ю.* Выбранае. — Мн.: Дзяржвыд БССР, 1960.

8. *Лявонны Ю.* Пералівы: Выбраныя вершы. — Мн.: Галіяфы, 2018.

9. *Лявонны Ю.* Стала і мужна: Вершы. — Мн.: ДВБ, 1932.

10. *Маракоў Л.* Ахвяры і карнікі. — Мн., 2007. С. 54, 56.

11. Пратаколы агульных сходаў, акруговай канферэнцыі, аўтабіяграфіі, анкеты, заявы членаў аб'яднання, літаратурныя творы і інш. дакументы Магілёўскага філіяла «Маладняку» // БДАМЛМ. Ф. 225, воп. 1, адз. зах. 9.

12. *Шушкевіч С.* З маладнякоўскага племя: Да 60-годдзя з дня нараджэння Юркі Лявоннага // ЛіМ. 1968. 30 ліп.

ПАДАРОЖНАЕ

(У ПАДШЭФНУЮ)

Поле, поле! Гуляе вецер...
Пералескі... І срэбны сьнег...
На марозе жаданьняў вецьце
Заплялося ў бунтоўным сьне.

Раззлаваліся ёлак атрады...
Вецер, вецер! Ня рвіся дарма...
І прагоніць кудлатая радасьць
З пасівелых палёў туман.

Хутка думак прыстане човен
Да празрыстых дзён-берагоў.
Толькі золкі — руковыя пчолы
Зашнуруюць з усіх бакоў!

Вось прыехалі. Стала падвода.
Скрозь па вёсцы відаць агні,
Бо ўжо радасьць мая — на ўзводзе,
І на струнах — гудзяць авадні!..

[1926]

З ПОЎДНЮ

Я бачыў мора — пад колер сталі —
У ціхім шэпце крылатых хваляў.
У кроплях пены, з руковым тварам —
На ўлоньні крымскіх, паўднёвых чараў.

Я бачыў мора юнацкім зрокам —
Хавалась сонца ў грудзёх шырокіх...
Ківаўся вечар на грэбню чмарым,
Калі зазьзяла вада пажарам,
Калі на рэйдзе ўдваіх матросы
Сьвістком часалі зары валосьсе.

Я бачыў — мора кудысь няслося —
Ды толькі ціха... Ці мо — здалося?..
Купалась раньне ў празрыстых хвалях, —
Імкнулась моцна да сьветлых даляў.

Я бачыў мора… Ды мо — ня тое?!.
Навошта ж столькі у ім пакою?..
Аб чым жа хвалі на Чорным сьняць?..
Вакол — прыгожасьць і цішыня…

Адэса, 10–20 жніўня [1926]

ЗІМОВАЯ РАДАСЬЦЬ…

Ёсьць настроі… А ў іх — пералівы.
Ёсьць часіны — здаюцца сном.
Толькі той на сьвеце шчасьлівы,
Хто узімку жыве як вясной!
Я стаю адзінокі на полі, —
Ціха сыплецца золкаў пясок…
Распрануўся вецер — і голы —
Па ральлі — ў карагодны скок!..
Дуб гальлё пабялелае зьвесіў,
І ня ведаю — можа, ўва сьне —
Паваліўся зялёны месік
На калені у срэбны сьнег…
Вецер шэпча ліхія пагрозы —
Колькі злосьці… Куды ж яе дзець?..
Прытулілі б мяне вы, марозы,
Да асмужаных бельлю грудзей!..
Я раздумаў — ня выллю сьлязамі,
За мяне — хай скрыгоча зіма…
Ой ты, замець — сівая замець, —
Прыгажэй за цябе — няма!..

[1927]

РОДНАЕ

На парозе да жыцьця
Востры адчуваньні,
Шолах нізкага трысьця,
Залатое раньне…
У сярэбранай цішы
Расплыліся зданьні.
Сэрца, сэрца! Калышы
Зжытае каханьне…

Ой, празрыста, быццам шкло,
На палях, пад жытам...
Мала часу працякло,
Многа перажыта!
Паразьбегліся гады —
Іх мне не стрымаці!
А жыве юнацкі ўздым
На зялёнай гаці...
На дубох — узоры лісьця.
І далёка гай,
Дзе сказала ты калісьці:
«Пачакай!..»
Памятаю — ці ўва сьне?
(Думкі не застылі) —
Церусіўся зь вішань сьнег,
І гарэлі жылы...
«У сярэбранай цішы
Гэтак лёгкі здані...
Ты мяне закалышы
Чарамі каханьня».
. . . . . .
Я ня помню і ня знаю —
Ці было, ці не...
Толькі вецьце таго гаю
Шэпча аба мне!..

1927

ПРАВАДЫ

За высокім вакном правады —
Гнуткай медзьдзю апраўлены дрот.
І бягуць тэлеграмы ўпярод,
І сплываюць, як ранічны дым...

Кожны з нас на зямлі толькі госьць:
Гэта — вечная радасьць і драма...
Як па медных дратох тэлеграма —
Прамільгне і мая маладосьць.

І ня ўспомняць таго, што чыталі,
Што казалі пяшчотнае: «Вер!»...
Паглядаць будзе сёньняшні верш
Мармуровай, забытай скрыжалью.

За высокім вакном правады
Дзіўнай музыкай сэрца нітуюць.
Песьню іхную — гэтак прастую —
Ловяць вёскі, палі, гарады...

Правады, уцякаючы, звоняць,
Абдае іх рыжэючы пыл,
І гудзяць пры дарогах слупы
Ад Дзьвіны да глыбокага Дону.

За высокім вакном правады,
За высокім вакном — шумны горад...
Пралятаюць — і шчасьце, і гора,
Як ружова-расьцьвечаны дым.

1927

*** * ***

Я хачу няшмат чаго —
Суму, каб разьвеяцца,
Ды таго, гарачага,
Што ў вачах сінее так.

Я хачу, каб — першае —
Сэрца білась песьняю,
Каб працоўных вершамі
Захапіла, ўзьвесьніла...

Я хачу — і будзе мо —
Каб паменей холаду,
Каб жыцьцё у грудзі нам
Улівала моладасьць.

Я хачу, каб век малы
Скончыць перамогаю,
Без пакуты, зьдзекваньня
Йсьці сваёй дарогаю.

Я хачу ня згубы,
Толькі крыху радасьці,
Ды каб тая, любая,
Да пары ня здрадзіла!..

[1927]

ВОСЬ ТАМУ…

Вось таму
і ў радкох
        насталёваных
Асядае часамі
іржа,
Што ня можна
пачуцьці жаць,
Дзе ‘шчэ нэрвы —
не
        загартованы…
…Вось таму
і кажу
        так глыбока
(І кажу — так,
здаецца,
        ня першы):
Калі кругавід
не шырокі —
Не пішыце
ні прозай,
        ні вершамі!..

[1928]

МОЙ МАЙ

        …Ты, гавораць, —
        вясёлы месяц:
        Наляцеў, нагрымеў, пераблытаў.
        Над садамі пялёсткі павесіў
        І пусьціў ветравеі па жыту.

Ты ды я, —
нам, здаецца, па дваццаць:
Мне — узростам,
табе — па запалу;
Мы сышліся,
каб тут прывітацца
І пайсьці па жыцьцёвых шпалах…

...У цябе — крышталёвае цела,
А па сіле —
ты быццам леў!
Нават муха —
і то зазьвінела,
Шукаючы пары на шкле.

Маладосьць! Агнявыя краскі...
Зацьвітай жа
вішнёвым цьветам!
Ой ты, май мой,
чароўная казка, —
Загрымі па ўсяму сусьвету!

Хтосьці швэндае ўдзень,
нібы ноччу,
На шляхох
прычытаньнямі сьвішча...
Май мой стромкі!
Ды плюнь яму ў вочы
На вясельным на гэтым ігрышчы...

...Па-над садам гайдаецца воўна,
Гэта значыць —
пялёсткаў рой.
Ты за тое ў мяне і каштоўны,
Што ўздымаеш вясновы настрой!..

[1928]

У ДЗЯЦІНСТВЕ

У дзяцінстве сумным і мяцежным, —
Шмат агня ў жыцьцёвых дымарох, —
Разухабіць я любіў бязьмежжа
На мітычных, кволых караблёх.

Я жадаў пабачыць акіяны,
Ўздыхі скал, какосы і міндаль,
Тыя выспы, дзе цьвітуць плятаны
І ў салоных пырсках пена хваль...

Будняў пыл я адвяргаў з пагардай,
Бо прыгоды — буйнаю ракой
У раманах Райдэра Хагарда,
Марыэта, Купэра і Ко...

Мараў дым расьсейваецца з часам
(Прыйдуць сталасьць і развага дум...).
Па-інакшаму гучыць цяпер абраза
І другі хвалюе сэрца шум.

І ў жыцьці — ня палкія асобы,
Поўныя героікі да дна.
Бачыш ты, як рвуцца Перакопы
Чорных дзён, харомаў і агня?..

Стары быт, струхнелы і ніякі,
Захаваны ў прошласьці начэй,
Прасякае штормавая накіп
Электрычнымі маланкамі вачэй...

І таму ў аўтобусныя рыкі
Зрэдку йдзе прыгодніцкі экстаз, —
Бо цяпер — далёка Порта-Рыка,
І агонь рамантыкі пагас...


1928

АБОРТ

Калі ішла — гарэлі блікі
На скрыжаваньнях шэрых пліт,
І так хацелася паклікаць
Таго, хто болем
Ў сэрца ўліп.

Было звычайна ўсё і проста
Ў абломках чэрвеньскага дня.
І не было каго на ростань
Ні прыгалубіць,
Ні абняць...

Афіша дакумэнтальнага фільму «Аборт».
Мастак Павал Гуткоўскі, 1925 г.



І сьцены душнае бальніцы
Схавалі нерашучы крок.
Гарэлі ў сонцы камяніцы,
І ад чаканьня
Стыгла кроў.

А як на поўдзень
Сталі цені
І спахмурнеў бальнічны сад —
Дрыжэлі вузкія калені
І пакаёвы далягляд...

І зьнікла радасная мэта, —
Маўклівы доктар
Яе сьцёр.
І бляск халоднага пінцэта
На міг запаланіў жыцьцё.


Было забойства эпілёгам.
Пасьля яго — ня йдуць назад...
І толькі сонца
Дзесь за логам
Кідала золата ў закат.

[1931]



Васіль Дранько-Майсюк

Уладыслаў Галубок і яго Муму



Чакай, брат! Бяз часу ня лезь у магілу!
Узмацуецца дух твой — яшчэ аджывеш!
Сьвет, браце, убачыш, пачуеш ты сілу
І песьню свабоды гуртом запяеш!

І сябры, і ворагі прызнавалі — у 1920-я гады ягоны вандроўны тэатар быў самы папулярны ў Беларусі. Глядацкую любоў Уладыслаў Галубок тлумачыў як сапраўдны галівудзкі рэжысэр: *«Яны прагнуць відовішча... Зацікавіць іх можна толькі моцнымі перажываньнямі. Падзеі павінны быць цікавымі! І — зразумелымі. Хай гэта будзе адвечная барацьба паміж сумленьнем і [падступствам], чысьцінёй і брудам, сьвятлом і цемрай, але толькі так, каб глядач суперажываў разам з акторам!»* [1].


Сваім спэктаклям прыдумляў нечаканую рэкляму.

У «Савецкай Беларусі» за 1925 год чытаем пра гастролі Галубка ў Слуцку: «З самай раніцы красаваліся непамерна вялікія плякаты: „Стой! Ты бачыў «Ганку»? Сьпяшы купіць білет, дармова завязём на спэктакль на пажарнай лінейцы". І даўгая пажарная лінейка з гэткімі плякатамі праз увесь дзень круцілася па ўсім Слуцку. — Твой білет, — раздаецца голас пажарнага. — Садзіся. — Пусьціце мяне, — чуваць голас маладухі, — я купіла білет раней. — Не, я раней: я чакаю даўно.

І нарэшце ўвесь пажарны карнавал падаецца к нар. дому. Зьвіняць званкі, гоман, хохат. Яскравы агонь з факелаў разьлівае шырокі сьвет на публіку...» [13].

Эстэцка-паэтычны тэатар Аляксандра Таірава альбо авангардныя вычварэньні Ўсевалада Меерхольда былі аднолькава чужымі для Галубка.

Мастак Яўген Ціхановіч успамінаў: «Яму не падабаўся Меерхольд... У п'есе „Лес" ніякіх дэкарацый, сцэна пустая... на фанэрнай скрынцы сядзяць Аркашка дый Нешчасьліўцаў, ловяць рыбу. Ні табе вудаў, ніякіх снасьцяў... Адной толькі мімікай ды жэстыкуляваньнем дасягаецца ўражаньне, быццам трапечацца ў руках Аркашкі вялікі лешч. Гэты спэктакль мы з Галубком глядзелі ў Ленінградзе, дзе ён увесь час ірваўся кінуць залю і бегчы дамоў: „Што гэта за відовішча, калі глядзець няма чаго?"». У пастаноўках жа


1

БЕЛАРУСКІ
ДЗЯРЖАЎНЫ ВАНДРОЎНЫ ТЭАТР
ПАД КІРАЎНІЦТВАМ НАРОДНАГА АРТЫСТА ЎЛ. ГАЛУБКА

УЛАДЫСЛАЎ ГАЛУБОК

Праграмка тэатру Ўладыслава Галубка

Уладыслаў Галубок з музыкам-дударом.
Пачатак 1930-х гг.



Галубка былі «сапраўдныя яечня з двух дзясяткаў яек, украінскі боршч, катлеты з гарачай бульбай і кіслым малаком, якія… падаваліся на сцэну па ходу спэктакля» [14].

Зь юнацтва Галубку было далёкае «высокае мастацтва».

Ён «захапляўся танцамі цыганят і аддаваў апошнія грошы… каб яны танцавалі, а ён мог любавацца» [12].

Быў вялікім прыхільнікам нямога кінэматографу. Асабліва любіў глядзець нямецкія прыгодніцкія стужкі пра сьледчага Ст'юарта Ўэбса, сэрыял «Гамункулюс» Ота Рыпэрта, не прапускаў мэлядрамаў з Даніі рэжысэра Пэтэра Урбана Гада, дзе грала першая ў сусьветным кіно жанчына-вамп Аста Нільсэн.

Першым спэктаклем, які ўбачыў у сваім жыцьці ў 15-гадовым узросьце, была мэлядрама «Нещасне кохання». «П'еса была ўспрынята як сапраўднасьць і пакінула надзвычайна моцны сьлед на вельмі доўгі час. Уладыслаў паўгода хадзіў сам ня свой…» [12].

З гэтага часу мэлядрама — улюбёны жанр героя нашага артыкула, праз што многія крытыкі ганілі п'есы Ўладыслава Язэпавіча.

Віталь Вольскі, напрыклад, пісаў: «Яго сцэнічныя творы складаліся зь мяшчанскіх п'ес, з грубых бытавых камэдый і сьлязьлівых мэлядрам» [6].


Галубок на гэта адказваў: *«Чаму гэта мэлядрама раптам разьюшыла абаронцаў высокага мастацтва? Нават У. Меерхольд пачаў зь пераасэнсаваньня мэлядрамы! Ды мэлядраматызм проста ўрываўся ў яго праграмныя пастаноўкі „Зоры" Э. Вэрхарна і „Вялікадушнага раганосца" Ф. Кромэлінка. Паспрабуйце прыбраць мэлядраму з „Адысэі", з „Дон Кіхота"! З „Вайны і міру"! Яна не замінае вялікаму мастацтву, а ўпрыгожвае яго»* [1].

Зьмітрок Бядуля гэтаксама адзначаў, што пастаноўкі Галубка маюць «чыста кінэматаграфічны характар. Ён дае ў сваіх п'есах танны гумар і галаваломныя эфэкты» [3].

А Зоська Верас проста была абураная адной зь першых рэжысэрскіх працаў Галубка — камэдыяй «Забыўся падперазацца»: «Гэта была не камэдыя... а нешта такое пошлае і грубае, што і акрэсьліць трудна... Мо дзе на кірмашы ў балагане мела б посьпех... Але ці аўтар меў права прынізіць і сябе, і родную мову, каб спадабацца публіцы на найніжэйшым узроўні культуры? <...> ...Я змагла толькі сказаць: „Як вы, пане Ўладыславе, маглі пасьля «Апошняга спатканьня», пасьля ўсіх апавяданьняў, якія я вам перапісвала, як вы маглі так сябе прынізіць?"» [5].

Так, на спэктаклях Уладыслава Галубка, ягонымі ж словамі, «глядач не шукае шапэнаўскіх арый, ён рад, калі яму паграе гармонік ды цымбалы» [7].

Ягоныя пастаноўкі падкрэсьлена простыя, пазбаўленыя складаных мэтафараў, тонкіх мастацкіх сымбаляў, тут няма паўтонаў і багацьця псыхалягічных адценьняў, яны і сапраўды ў нечым нагадвалі кірмашовыя паказы.


Выдавецтва Мінскага Народнага Камісарыяту Асьветы

АПОШНЯЕ СПАТКАНЬНЕ

ДРАМА у 4 АКТАХ

УЛАДЫСЛАВА ГАЛУБКА.

Ex libris
Центральный государственный архив литературы и искусства БССР
Библиотека Инв. № 1609-А
Государственный архив литературы и искусства БССР
Библиотека ИНВ. № 2662

ВІЛЬНЯ, ——— 1919 г.
Друкарня „Прамень"

Уладыслаў Галубок. Апошняе спатканьне. Драма ў 4 актах. Вільня: друкарня «Прамень», 1919 г.

Галубок дакладна ведаў, для якой публікі ён ставіць, і таму, адрозна ад Францішка Аляхновіча, унікаў уплываў Ібсэна альбо Гаўптмана, аберагаў простую душу селяніна ад таго, каб «радаваць» яго экспрэсіяністычнымі ўспадкаваньнямі ці адкрытым сымбалізмам, як гэта любіў рабіць Янка Купала. Гэтаксама не ператвараў свае пастаноўкі ў відавочна сацыяльныя выказваньні на манер Флярыяна Ждановіча.



Францішак Аляхновіч і Ўладыслаў Галубок, 1918 г.



Уладыслаў Язэпавіч жыў, як вядома, у час авангарду, адкрытых сьмелых пошукаў ува ўсіх сфэрах мастацтва, і таму ягоныя эстэтычныя погляды на тое, якім павінен быць тэатар, не заўсёды знаходзілі разуменьне.

Напрыклад, знакаміты тэатральны мастак Оскар Марыкс, якога выправілі афармляць пастаноўкі Галубка, адкрыта прызнаваўся: «Я і многія іншыя не разумелі яго. Ён шукаў ляканічнага ўвасабленьня думкі. Марыў аб выразнасьці ў „дзьвюх прасьцінах". А для мяне ісьці да У. Галубка — азначала адмовіцца ад прасторы сцэны, азначала — ідэю, выказаную на велізарным палатне, раскрываць у кавалку бервяна» [1].

Скепсіс Марыкса не падзяляў драматург Міхайла Грамыка, які адзначаў: «Абстаноўка ігры Галубка і яго трупы па многаму нагадвае першабытны шэксьпіраўскі тэатар, калі пісалі на аншлягу „лес" і публіка бачыла лес, хоць ніякіх дроў на сцэне не было. Так і ў Галубка. Трэба самому надзвычайна захапляцца ігрой, захапляць ёю другіх, каб не зьвяртаць увагі на тое, што ў самы трагічны момант акту ледзь не на галаву артысту ляціць кавалак сьцяны. І заўважце: толькі два-тры чалавекі ў залі паспрабавалі хіхікнуць! Лягчэй захапляць ігрой, калі дапамагаюць сцэнічныя эфэкты; лёгка на аўто зрабіць 50 вёрст, куды цяжэй пехатой прайсьці 7–8» [9].


У той жа час іншыя гледачы лічылі, што асноўны недахоп спэктакляў Уладыслава Язэпавіча заключаўся ў неадпаведнасьці сьціслай сцэнічнай прасторы і манумэнтальна-бязьмежнай імпэтнасьці жарсьцяў, якімі былі насычаны ягоныя творы.

Крытык, які схаваўся пад псэўданімам А. Зьніч (імаверна, Аляксандар Шлюбскі), адзначыўшы вялікія вартасьці спэктаклю «Блуд» («Пан Сурынта»), лічыў, што «выканана п'еса была ня надта добра. <...> ... Масавыя сцэны ў першым акце выйшлі зусім няўдала з прычыны малой сцэны» [10].

Калі, прыгадаўшы крытычныя шпількі Зьмітрака Бядулі, параўноўваць спэктаклі героя нашага артыкула з кінэматографам, дык Галубок быў сапраўдным Мэльесам — зь ягонымі падкрэсьленамаляванымі заднікамі, бракам глыбіннай пэрспэктывы і адпаведна — кірмашовым акторскім выкананьнем.

Калі казаць пра псыхалягічную напоўненасьць Галубковых пастановак, то дзьвюхмерная сцэнічнамастацкая прастора спэктакляў была прасякнута чорна-белым успрыманьнем рэчаіснасьці. Пэрсанажы падзяляліся пераважна на тры катэгорыі: цалкам станоўчых (сярод якіх часам трапляўся адзін супэргерой), страшных пачвараў-садыстаў і бязвольных ахвяраў.

Але разам з тым нельга было сказаць, што Галубок быў толькі рэжысэрам спэктакляў клясы «Б».



Пралёг.

Вечар. На могільніку. Чуваць сьпевы самаўя.

Крадучыся Казак.

Каз. (над магілай). Брат мой, калі ты памірай на тваіў вусмарцістыла свмяротнае ложа мяцьце, браты, я паміраю, як памірае на волынік са скутымі рукамі і нагамі, паміраю за праўду, за волю, за сваіх братоў падданых, — ты пасылаў гэтае праклянь це дзікаму звяру пану Сурынце за яго учынкі, ты просіў мяне, калі настане дзень помсты, прыйсьці на тваю магілу і сказаць, так слухай брат мой, дзень помсты надышоў, а расправа зараз будзя. (крадучыся ўнік у кусты.)

Выходзя Сурынта, жонка і няня з дзіцяці.

Сур. Няначка, асьцярожна, не зачапіся і не выпусьці дзіцятко.

Ня. О не, вялікі пане, трымаю як дыямэнт дарагі.

Прыгожы быў дзень, прыгожы і вечар, а самаўі, як звяроваюцца у лесе.

Рубечка, пасьпешайма у палацы, ісьці робку пацягнула, надыходзя ноч.

П'еса Уладыслава Галубка «Пан Сурынта».
Аўтограф. 1929 г.



Умоўна-шаржаваны грым артыстаў, падкрэсьлены лубок маляванага задніку, вострыя дыялёгі, нечаканае спалучэньне гумару і брутальнасьці, шалёная рэжысэрская энэргетыка, якой былі напампаваныя спэктаклі Галубка, цудоўная беларуская мова — усё стварала эстэтычную адметнасьць і пачуцьцё мастацкасьці, пра якую, магчыма, і ня думаў сам рэжысэр.

Што яднала Галубка з Меерхольдам ды іншымі творча далёкімі яму калегамі-эстэтамі — дык гэта імкненьне рабіць спэктаклі як мага больш дынамічнымі.

Вядомы факт, што Ўсевалад Меерхольд на рэпэтыцыях хадзіў з сэкундамерам і як агню баяўся неапраўданых псэўдаглыбакадумных паўзаў.

Падобнае рабіў і Галубок.

У ягоных спэктаклях няма чэхаўскага маўчаньня, шэпту, атуленага хваравіта-вялым рытмам ды інэрцыяй.

Кожная пастаноўка Ўладыслава Язэпавіча — гэта ўмела скамбінаваная сэрыя эмацыйных выбухаў.

Героі тут ня думаюць, яны дзейнічаюць (забіваюць, гвалтуюць, кідаюцца ў бой, кахаюцца, помсьцяць), жывуць хутчэй інстынктамі, а не развагаю.

Тут шмат крыку, песень, мардабою, абдымкаў, палымяных прамоваў. Ціха гаварыць героі Галубка ня ўмеюць.

Яны рабы сваіх жарсьцяў, а таму гінуць як мухі, трапляюць у турмы, становяцца банкрутамі й калекамі, вар'яцеюць.

Уладыслава Язэпавіча называлі «душагубам беларускай сцэны».

Вінавацілі, што ў ягоных п'есах паміраюць шмат герояў.

Галубок адказваў: *«Мяне празвалі душагубам беларускай сцэны, а вось у Шэксьпіра ў „Гамлеце“ аж пяць сьмерцяў, але ж яго не называюць душагубам»* [1].

«Маладняковец» Анатоль Вольны высьмейваў «крывавасьць» п'есаў Уладыслава Галубка.

У гумарыстычнай падборцы «Як бы гэта выглядала, каб беларускія пісьменьнікі пісалі аб Лютаўскай рэвалюцыі» чытаем пародыю на тэатар Галубка:

> «Падымаецца заслона. За сцэнай — страляніна.
>
> Мікалай II (*выходзіць з задніх дзьвярэй*):
>
> — Ах, Божа мой! (*страляніна*).
>
> *Мікалай плача, лезе пад стол* (*страляніна*).
>
> (*Заслона.*)
>
> *Выпаўзае танк, а на ім Керанскі* (*страляніна*). *За сцэнай лупяць з гарматаў* (*страляніна*).
>
> Керанскі (*крычыць*):
>
> — Вайна да пераможнага канца. Ура! (*Страляніна.*) *Ранены куляю ў самае сэрца Керанскі падае, потым падымаецца і ўцякае за граніцу* (*страляніна*).
>
> *На сцэне льецца кроў, якая паступова затаплівае ўсю залю. З-за куліс на чоўне выплывае Галубок і гавора прамову на антырэлігійную тэму.* (*Страляніна. Заслона.*)» [2].

Галубка (які, дарэчы, быў сябрам «Маладняку») раздражнялі такія жартачкі.

Аднойчы, вярнуўшыся дамоў са сходу гэтага літаратурнага аб'яднаньня, рэжысэр, паводле ўспамінаў Яўгена Ціхановіча, ускрыкнуў: «Маладняк, каб ты ня ўзрос!» [14].

Але, як вядома, крыўдзімся мы звычайна, у пераважнай большасьці, на праўду.

Гумарэска Анатоля Вольнага дастаткова пераканаўча перадавала рэжысэрска-драматургічны стыль пастановак Галубка.



Уладыслаў Галубок з трупай вандроўнага тэатру. [1929–1930 гг.]

Ён і праўда любіў натуралістычныя эфэкты.

І калі падчас сцэнаў баляў, застольляў, гулянак, выпівак (абавязковых амаль для кожнага ягонага спэктаклю) на сцэне былі сапраўдныя ежа і пітво, то эпізоды забойстваў вонкава выглядалі ня менш праўдзіва, чым кадры разрэзанага вока жанчыны з «Андалюскага сабакі» (1929 г.) Люіса Бунюэля.

Паводле гісторыка Анатоля Валахановіча, «каронным нумарам Галубка была сцэна сьмерці пана Сурынты. У актора Б. Бусла, у п'есе — ягонага працаўніка, бліснула лязо нажа. Удар! Сурынта схапіўся за сэрца, пахіснуўся, і ўсе гледачы ўбачылі, як празь яго пальцы цячэ кроў, расплываючыся чырвонай плямай на белай кашулі. У залі крыкі, ледзь ня страта прытомнасьці. <...> У выніку — адмоўныя адносіны да станоўчага героя, але забойцы, і гром апладысмэнтаў Галубку — пану Сурынту. Усе ў залі рады, што ён жывы... Галубок павязваў пад кашулю мяшэчак з журавінамі» [4].

Калі Анатоль Вольны любіў пакпіць з падобнай эстэтыкі, то згаданы ўжо Міхайла Грамыка ў артыкуле «Галубок у Мар'інай Горцы» пісаў: «Канешне, лёгка крытычна падысьці да любой рэчы. Можна вынайсьці слабыя бакі нават і ў Шэксьпіра: „Ужо занадта трупаў на сцэне", — гаварыў, здаецца, Гамсун пра Шэксьпіра. Ёсьць мерцьвякі і ў Галубка; ёсьць, можа, не зусім даведзеная псыхалягічна дзейнасьць герояў. Галубок бярэ жыцьцё, кавалак жыцьця, выхоплівае яго як яно ёсьць; дзьме ў гэтую сырую гліну жыцьця моцным духам сваёй жвавай, захапляючай ігры, — і ты... перажываеш тое, што павінен перажываць кожны глядач у добрым тэатры» [9].

Пачуцьцё штохвіліннай небясьпекі — абавязковы псыхалягічны чыньнік ягоных спэктакляў.

Героі рызыкуюць кожнае імгненьне.

Просты глядач назіраў за пэрсанажамі Галубка з такім жа вострым адчуваньнем, зь якім публіка ў цырку дзівілася на які-небуць карказломны акрабатычны нумар.

Нечаканае адчуваньне страты, раптоўная трагедыя, якую перажываюць героі амаль кожнай п'есы Ўладыслава Язэпавіча, — зь ягонага страшнага дзіцячага ўспаміну, калі раптоўна 7 кастрычніка 1895 году гіне бацька, «майстар сьлясарнай справы», які «ў часе звароту са службы дадому быў забіты злачынцамі рэвальвэрнымі стрэламі» [12].

Вандроўная трупа рэжысэра паважна рызыкавала падчас сваіх гастрольных паездак па Беларусі.

Этнограф Міхась Грынблят пісаў: «Успамінаецца паездка зь Негарэлага ва Ўзду зімою ўначы на развалках, калі паабапал нашага абозу доўга суправаджалі нас дзьве гайні ваўкоў, і іх вочы сьвяціліся злавеснымі агеньчыкамі...» [1].

Падчас гастроляў у Галубка стралялі. Было гэта, паводле артысткі Тацяны Шашалевіч, «на Аршаншчыне... у час спэктакля „Дыктатура" І. Мікіценкі... стралялі ў Галубка за кулісы». Актор Уладзімер Дзядзюшка ўспамінаў: «Мы кінуліся ў грымёрку на гук стрэлу... Бачым — шкло ў вакне разьбітае... Уладыслаў Язэпавіч выцірае кроў са шчакі. Бурчыць: „З абрэза... кавалкам шкла шчаку прыхапіла. Грыміравацца цяжка будзе..."» [1].

Але ня толькі гэтыя асобныя небясьпечныя для жыцьця эпізоды суправаджалі ягоны тэатар.

У першай палове 20-х гадоў калектыў Галубка бытаваў у надзвычай цяжкіх варунках.

Вось як пра гэта пісаў А. Зьніч: «Аж да красавіка 1921 г. трупа была ў вельмі цяжкім становішчы. Яна мела вельмі слабую матэрыяльную дапамогу. Артыстаў разглядалі як аматараў... <...> ...Зь яе адзін за адным выходзяць лепшыя працаўнікі. Тыя працаўнікі, што засталіся, матэрыяльна не забясьпечаны, бо трупа грае для рабочых, якія ня маюць магчымасьці дорага плаціць за білеты. На нітачцы вісела жыцьцё трупы. <...> Зімою трупа не зважае ні на якую пагоду. Напрыклад, у пачатку гэтага году трэба было паставіць спэктакль у аднэй вёсцы вёрст за 7 ад гораду. Мяцеліца была страшэнная. Чакалі падвод — не дачакаліся. І вось, сабраўшы патрэбныя рэчы, выбіраюцца артысты і цягнуцца сьнежным полем з вузламі „по образу апостольского хождения"» [11].

Гэты эпізод зь «мяцеліцай» пацьвярджае, наколькі Галубок быў па-сапраўднаму яркім лідэрам, магчыма, самым харызматычным сярод тагачасных беларускіх тэатральных рэжысэраў. Бо цікава, ці змаглі б Флярыян Ждановіч, Еўсьцігней Міровіч або Францішак Аляхновіч знайсьці патрэбныя словы, каб заахвоціць сваіх артыстаў, без усялякіх падводаў, з рэквізытам і касьцюмамі на плячах адправіцца на злом галавы, у сьнежную завею, дзе, акрамя ўдзячна-безграшовых сялян ды заўсёды галодных ваўкоў, іх больш нічога не чакае?

Ня ведаю, хто яшчэ валодаў бы такой гіпнатычнай сілай перакананьня. Галубок мог угаварыць якога заўгодна ўпартага чалавека.

Менавіта ён быў адзіны сярод менскіх беларусаў, хто здолеў залагодзіць па-дзіцячаму ўпірлівага Максіма Багдановіча. Зоська Верас згадвала менскія падзеі часоў Першай усясьветнай вайны: «Мы вымушаны былі перавозіць дзіцячы прытулак у Ратамку. Дні ўжо былі кароткія, холад, а ехаць трэба фур-

Сцэна спэктаклю «Суд» (крайні справа — Уладыслаў Галубок у ролі Авечкі). 1920 г.



манкай вёрст 30... Раптам М. Багдановіч кажа: „І я паеду". Мы ўсе ахнулі: „Што вы кажаце! У такі холад!..". Зазлаваў Максім: „Што я — маленькі? Волі сваёй мець не магу? Сказаў — паеду, і паеду! Не забароніце". Зноў пасыпаліся пратэсты. Адзін Галубок маўчаў. Калі ж пачалася сапраўдная сварка, Галубок абазваўся: „Ціха, ша! Успакойцеся! Я пайду і хутка вярнуся, тады пабачым". Не было Галубка з гадзіну. Нарэшце... уваходзіць Галубок з аграмадным кажухом! „Маеце, дзядзька Максім, паедзеце"» [5].

Умеў Галубок знаходзіць выйсьце зь цяжкой сытуацыі і для свайго тэатру.

Аднаго разу, калі зноў не зьявілася абяцаная падвода, а шлях быў надзвычай далёкі, Галубок, пашкадаваўшы сваіх артыстаў, падгварыў выпадковага міліцыянэра «арыштаваць» ягоны тэатар.

Скрыпач Міхась Лучанок узгадваў: «Гастралявалі мы ў мястэчку Лоеў. Адсюль трэба было ехаць у вёску Жары. На прыстані нас чакалі з падводамі. Давезьлі да вёскі. Паказалі мы спэктакль, а назад ехаць — няма падвод... На параход мы спазьніліся, трэба было пеша ісьці аж да Лоева... Што рабіць?.. На шчасьце, з намі быў міліцыянэр з раёну. Ён спыніў выпадковую падводу і загадаў загрузіць нашы рэчы, сказаўшы, што мы арыштаваныя і нас трэба пераправіць у раён... „Арыштаваныя" трымаліся бадзёра і весела. Я граў на скрыпцы „Вызваленьне славян", а хормайстар Несьцер Сакалоўскі заўзята біў у бубен» [1].

Многія крытыкі (дый сам Галубок, калі выступаў з сваімі абавязковымі мітынговымі прамовамі, якімі заўсёды пачынаў спэктаклі) сьцьвярджалі, што п'есы героя нашага артыкула маюць падкрэсьлена рэвалюцыйнае гучаньне, там выкрываюцца крывавая мінуўшчына царскага ладу, дзікасьць паноў, жандараў і г. д., і г. д.

Усё гэта быццам і так, але калі чытаеш уважліва, то прыходзіш крыху да іншых высноваў.

Жыхары вёскі не маглі так непадманна моцна любіць тэатар Галубка, калі б там была толькі адна сацыялістычная агітацыя.

Калі вандроўны тэатар паказваў спэктакль з жыцьця сялянскіх дзяцей, што паехалі ў горад па навуку, а сталі рэвалюцыянэрамі-бамбістамі («Апошняе спатканьне»), то перад гледачамі разгортваўся не гераічны баявік пра тое, як сьмелыя хлопцы «завалілі» царскага чыноўніка, а гісторыя таго, як дзеці становяцца фанатыкамі, што прыводзіць некалі дружную сялянскую сям'ю да пагібелі.

Калі сяляне глядзелі гэтую сапраўдную трагедыю, то, хутчэй за ўсё, станавіліся на бок не галоўнага героя, а простага турэмнага вартаўніка, які казаў пра гэтых рэвалюцыянэраў: *«Чаго трэба ім... Якой скулы не хапае ім... сытыя, здаровыя, жыць і ня думаць пра турму... І хто іх бацькі, уразумець трудна, гэта каб не расталкаваць дурням, што забіваць нікога ня можна, што сьвятыя Божыя запаведзі забараняюць рабіць гэта...»* [8].

Вартаўнік, безумоўна, ня быў у «Апошнім спатканьні» станоўчым пэсанажам, але, як вядома (і Галубок гэтым прыёмам цудоўна карыстаўся), калі пры таталітарнай сыстэме хочаш сказаць, што думаеш, — укладзі свае словы ў вусны адмоўнага героя.

У трохактавай драме «Бязьвінная кроў» (захаваўся толькі першы акт) перад намі два фанатыкі — Гаспадар (заможны шляхціч, які ненавідзіць сялян) і яго сын-сацыяліст Студэнт. У канцы дзеі яны сварацца. Гледачы лягічна мусяць быць на баку юнака, але аднолькава асьлепленыя сваёй лаянкай бацька і сын даводзяць Гаспадыню (Студэнтаву маці) да сьмерці. Так Галубок пераканаўча паказвае: фанатычнае вызнаваньне якой-хаця (нават самай добрай) ідэі можа прывесьці толькі да трагедыі.

Ува многіх сваіх «антыпанскіх» спэктаклях («Ганка», «Пан Сурынта») Галубок ня столькі выяўляе і асуджае злачынствы шляхты, колькі выступае супраць тупой, запалоханай пасіўнасьці большасьці, якая нічога ня робіць, каб памяняць сваё жыцьцё.

У «Ганцы» вінаватая ў сьмерці галоўнай гераіні-сялянкі не падступная Палкоўніца, якая разлучыла яе, цяжарную, з каханым Васілём, а менавіта гэты бязвольны сынок, бо дазволіў карыстацца сабой, як марыянэткай.




Афіша спэктаклю «Суд»

Галоўнай пачварай у п'есе «Пан Сурынта» (твор напісаны пад уплывам «Бутрыма Няміры» Францішка Аляхновіча) быў не тыран і дэспат Сурынта, які катаваў прыгонных, пазбаўляў цноты дзяўчат, жыў з уласнай дачкой як з жонкай, а хітры, падступны, бы шэксьпіраўскі Яга, Аканом, які з аднолькавым спрытам дурыць і свайго пана, і паўстанцаў.

Гераіня п'есы «Бязродны» простая дзяўчына Гапка, цяжка захварэўшы, паддаецца ўплыву айчыма-алькаголіка, пакідае разам са сваім дзіцяткам-немаўляткам родную хату і гіне дзесьці на дарозе. Вяртаецца маці (якая бегала па доктара) і, ня вытрымаўшы гора, вар'яцее.

Магчыма, менавіта гэтую п'есу меў на ўвазе Зьмітрок Бядуля, калі пісаў пра «кінэматаграфічны характар» і «галаваломныя эфэкты» твораў Галубка. Празь некалькі гадоў вяртаецца з войска Янук, каханы Гапкі і бацька яе дзіцяці. Герой дазнаецца пра трагедыю. І тут варта працытаваць апошні, пяты акт п'есы:

> «Дзікая пушча. На сьнезе ляжаць торба і косьці чалавека.
>
> Я н у к (*ідзе храмаючы*). Зьмяркае, і дарогі далей няма, ваўкі выюць. <...> (*Убачыў торбу.*) Што гэта? <...> Што я бачу, ці праўда, мая шапка, мой ліст, няўжо тут, тут сходзіць дарога, няўжо тут сьмерць знайшла ў дзікай пушчы? О вы! Нямыя сьведкі, ці бачылі вы дарагую маю Гапку, як блудзіла яна, скажыце, скажыце? (*Убачыў косьці і хвацію у рукі чэрап.*) Гапка! Гапка!» [8].



У Менскую філію Усебеларускага
аб'яднаньня пастаў і пісьменьнікаў „Маладняк"

Заява
Галубка Ўладыслава

Прашу Вы за вялікі гонар быць
сябром Маладняка, дзеля чаго
прашу Запісьць мяне у склад
сяброў гэтай арганізацыі.

1/V. 26г.

Заява Ўладыслава Галубка аб уступленьні ў «Маладняк», 1926 г.

Група беларускіх пісьменьнікаў. Зьлева направа: 1-ы шэраг — Францішак Аляхновіч, Зьмітрок Бядуля, Аляксандар Уласаў, Янка Купала; 2-і шэраг — Макар Краўцоў, Альбэрт Паўловіч, Міхась Чарот, Уладыслаў Галубок, Язэп Фарботка, Алесь Гарун. Травень–чэрвень 1920 г.



Амаль у кожнай сваёй п'есе Галубок усімі даступнымі сродкамі (і для большай выразнасьці часам нават выходзячы за межы эстэтыкі, як у апошнім прыкладзе) вучыць, настаўляе, заклікае простага гледача-беларуса скінуць зь сябе рызманы памяркоўнай рахманасьці, навучыцца нарэшце думаць сваёй галавой, не паддавацца нічыім уплывам, ня быць, кажучы словамі філёзафа Валянціна Акудовіча, «вечнымі дзецьмі». Бо іначай, паводле Галубка, беларусаў не чакае нічога іншага, як гібель.

У вобразе Гапкі з п'есы «Бязродны» Ўладыслаў Язэпавіч, у сутнасьці, паказаў саму Беларусь — пасіўную, несамастойную, інэртную. Рэжысэр яскрава паказаў: калі наша краіна, наш народ будзе слухаць чужыя намаўленьні, то ў фінале ад усіх нас застануцца адно толькі раскіданыя па мэтафарычнай пушчы Эўропы косьці, і ніхто ўжо не пазнае, чые яны і якому народу належалі.

І тут можна зразумець нелюбоў Уладыслава Галубка да эстэцтва. Якая можа быць гульня ў вытанчанае мастацтва, якімі можна займацца фармальнымі пошукамі, калі народ не навучыўся казаць «не», калі ў яго яшчэ і намёку на думкі ня ўзьнікла, што трэба абрэзаць на сабе тыя вяроўкі, якія ператвараюць кожнага з нас у марыянэтак.

Адным зь любімых твораў Галубка было апавяданьне І. Тургенева «Муму».

> *«Каб стаць свабодным, трэба знайсьці ў сабе сілы патапіць сваё Муму, —* казаў Галубок. *— Расейскі мужык Герасім гэта зрабіць здолеў. А мы, беларусы? Калі зможам здабыць сабе волю і стаць па-сапраўднаму свабоднымі?»*

Літаратура

1. *Адхінуўшы заслону часу…*: Успаміны пра Уладзіслава Галубка. — Мн.: Маст. літ., 1979.

2. *Алёша і Свэн* [Вольны А. і Савёнак Л.]. Як бы гэта выглядала, каб беларускія пісьменьнікі пісалі аб Лютаўскай рэвалюцыі // Савецкая Беларусь. 1927. 12 сак.

3. *Бядуля З.* Тэатр і выхаваньне мас // Полымя. 1922. № 1.

4. *Валахановіч А.* Уладзіслаў Галубок: Першы народны артыст БССР. — Мн.: Харвест, 2013.

5. *Верас З.* Я помню ўсё: Успаміны, лісты. Гародня, 2013.

6. *Вольскі В.* Асноўныя этапы разьвіцьця дзяржаўных тэатраў СССР // Маладняк. 1932. № 2–3.

7. *Галубок.* Дзяржаўны, вандроўны… // Савецкая Беларусь. 1928. 24 ліп.

8. *Галубок У.* Творы: Драматургія. Паэзія. Проза. Публіцыстыка. — Мн.: Маст. літ., 1983.

9. *Грамыка М.* Галубок у Мар'інай Горцы // Савецкая Беларусь. 1923. 10 ліп.

10. *Зьніч А.* «Блуд» — драма Галубка // Савецкая Беларусь. 1923. 24 ліп.

11. *Зьніч А.* II-я Беларуская трупа // Савецкая Беларусь. 1923. 30 жн.

12. *Касьпяровіч М.* Уладыслаў Галубок // Полымя. 1929. № 7.

13. *Цікавая рэкляма* // Савецкая Беларусь. 1925. 5 лют.

14. *Ціхановіч Я.* Партрэт стагоддзя. — Мн.: Лімарыус, 2015.

ЗАБЫТАЯ ХАТКА

Над соннай далінай
Відаць хмызьнячок,
Пры ім сірацінай
Хаціна-ламок.
Жыве там гаротны
Дзядуля з дня ў дзень,
Збалелы, маркотны,
Снуе толькі цень.
Калісь быў ён молад,
Дуж быў, як той леў;
І холад і голад
Ён заніштo меў.
Жыцьцё прамінула,
Як сон той вясной, —
Старога сагнула
Бяда, неспакой;
Меў дзетак — вось сына
Забрала вайна;
Другога машына
Ў магілу зьвяла;
За імі і маці
Пайшла на той сьвет...
Астаўся у хаце
Адзін-адным дзед.
Сядзіць скачанеўшы,
Сагнуты дугой,
Ня піўшы, ня еўшы,
Зь нямою душой...
Віхура за хатай
Гудзіць і шуміць,
З пагудкай заклятай
У шыбы гручыць.
І як бы галосіць
Над ім, сіратой,
І нібыта просіць
На вечны спакой...
Крапіўся дзядуля —
Займацца стаў дух,
Прыйшла сьмерць-зязюля,
Як сьвечка, патух.
Чырвонае сонца
З-за лесу ўзышло,
У хатцы аконца
Агнём заліло,

Ды хатка пустая —
Ўжо дзеда няма!
Цяпер там гуляе
І холад, і цьма.

[1908]

БУДУЧЫНЯ

Кіпіць работа, плыве пот,
І крык і гул, як гром;
Туды, сюды сную народ.
Будуюць новы дом.
Лапаты рэжуць глыб зямлі,
Зьвініць сталёвы лом;
На месцы даўняй старыны
Будуюць новы дом.
Штодзень угору сьцены йдуць,
Ушыр і ўдоўж кругом;
Баліць мазоль, і рвецца грудзь,
А ўсё ж будуюць дом!
Настане дзень, надойдзе час,
Мы крэпку столь зьвядзём,
І лепшай прышласьцю для нас
Быць мусіць новы дом!
Працуйма, брацьця! Хай хутчэй
Наш льецца пот цурком:
Прыжджэм і мы сьвятлейшых дней,
Як скончым строіць дом!..

[1912]

МІНУЎШЧЫНА

Заглох і апусьцеў стары сад. Затаіўшы нуду аб мінуўшчыне, стаіць ён, як знак пракляцьця.

Высока пад сінім небам спляліся галінамі калматыя ліпы, украпаныя чорнымі гнёздамі вараньня, хрыплы крык каторага аддаляецца цяжкім рэхам ад раньня да вечару.

Паміж зеляніны стаіць, апёршы страху на высокіх слупах, дом, быццам высахшы старац.

Нудна і нават шорахна глядзець на колішняе месца жыцьця, сілы і працавітасьці. Нават зелень плакучых бярозак нікне, адбіваючыся на трухлявых сьценах. Дзе ж падзеліся багатыры і іх бязьмежнае права?

— Няма іх, няма! Адкрасавалі, — шапаціць вецер між зялёных кустоў. — Адкрасавалі, як тыя краскі, што красавалі тут калісь.

Цяпер толькі сівы палын, здружыўшыся з крапівой, запанаваў і заглушыў усё ўшчэнт.

Пакінут дом, пакінут сад, няма і сьледу, што тут было паўвеку назад.

Яшчэ пры жыцьці нябожчык гаспадар пад шумок адпаліваў такія штукі, што і цяпер душа халадзее, таму ўсё тое хоць крышку ў памяці засталося... Бяз працы, без клапот правалок ён тут сваё пустое жыцьцё. Толькі старушка гаспадыня, калі, бывала, кране яе сумленьне, убівалася і замалівала свае грахі. Але не дайшлі малітвы: застыгалі на месцы, а час бег, — пара прыйшла, ударыў гром: сільны і праўдзівы; растрос і разагнаў каго куды, быццам туман у полі, і з той пары змоўк сад, заціх вясёлы дом, зрабіўся падобны на халодную магілу. Цяпер тут толькі чутно, як гукаюць совы, мітусяцца кажаны ды дробны дожджык шапаціць, што мінуўшчына ня вернецца назад.

[1911]

БОР

Краскі красуюць і вянуць. Людзі родзяцца і ўміраюць. Гарады будуюцца і рассыпаюцца. Усяму бывае свой пачатак, і ўсяму бывае свой канец.

Прагавіта зьбіраючы сілу, непамерна высока разросься пад сінім небам гай. Глянуўшы на зялёную сьцяну, узгляд астанаўліваўся на даўных векавых дубах, соснах, што гэтак горда паглядалі ўвыш. Зялёная мураўка быццам падзывала к сабе падарожнага адпачыць у цяньку ад гарачых праменьняў сонца, і чалавек, каторы ў часе маркоты шукаў месца, дзе б можна было збыць цяжкія думкі, знаходзіў тут спакой і, прыслухоўваючыся к чароўным шэптам, упадаў у крэпкі сон.

«І чаго, чаго толькі ня бачылі мы за свой век! — шаптаў лес падарожнаму. — Былі мы сьведкамі, як сьвісталі тут кулі, як лілася кроў і валіліся бязь ліку людзі, вялікія героі знатнага роду, і каго любілі, і каго ненавідзелі яны, — разьнёс усіх вецер прахам па полі. Ужо-ткі патроху і з памяці мінуўшчына зыходзіць, толькі вось курганчыкі каля аблогі служаць яшчэ памяткай даўніх часоў людзкой няпраўды. Жывыя людзі на вачах мярцьвелі, гнілі на зямлі і ў зямлі, і быццам у памяць па іх на спарахнелых касьцях вырастала вярбіна ці лапушнік, а то магутны дуб.

Спытацца, то, пэўне, усякі з нас служыць памяткай якога-небудзь чалавека, бо няма тут і пядзі зямлі, каб не была збрызгана кроўю людзкой і не ляжалі ў зямлі пажоўклыя людзкія косьці...

Было ўсяго: і стогну, і пракляцьця. Але мы жывём толькі на карысьць чалавеку, і хоць служым памятнікам усяго даўнага, усё ж такі нас карысьлівы чалавек прамяняе на грошы, і толькі астануцца ад нас пачарнеўшыя пні ды зялёныя сіроткі-курганчыкі...»

Так і было. Захаладзела, сьнег як пасьцілкай заслаў усё; абяліўся лес, быццам адзеўся ў новую апратку. Але гэта апратка была надзета як перад сьмерцю: вось яшчэ дзень, другі — і ўсё харство векавога лесу павінна было легчы ў ног карысьлівага чалавека.

Як гром, праняслося па ўсім лесе рэха ад тапара. Першая зь берагу застагнала і ніцма лягла елка, а там клаліся ўпавалку пышныя дубы, як сталетнія старцы, каторыя ў часе навальніцы ня дбалі на страх.

Не было міласэрдзя: заўзятая рука ня млела, разьяраны тапор рубаў направа і налева, жудасна зьвінела піла, сіла прагавіта напірала ўсё далей і далей. Лес выміраў на вачах, толькі дзе-нідзе тырчэлі маладыя дрэўцы, прыгнуўшы свае вярхоўкі, быццам плачучы над забітымі таварышамі, — ціха шапацела

асіна ды дрыжэў абмёрзлы хмызьняк, каторага, можа, шкадуючы, абмінуў тапор. На пратаптаным сьнягу каля пнёў жоўтыя апілкі выглядалі быццам кроў лесу; а кругом з усіх старон яшчэ высіўся бор, з трывогай гледзячы на зямлю, дзе бязь ліку ляжала мёртвай брацьці, і чакаў сабе сьмерці.

[1911]

У БАЛЬНІЦЫ

У вялікім сьветлым пакоі земскай бальніцы справа і зьлева на ложках, а то і дзе-нідзе на падлозе ляжалі з пабялеўшымі тварамі хворыя. Сонца, заліваючы яснымі бляскамі сьцены, кідае праменьні свае ў вочы няшчасным. Гледзячы на гэтыя глыбока запаўшыя твары, страх ахоплівае здаровага чалавека, жаль сьціскае сэрца — хочацца плакаць... То некалькі дзён таму, нават некалькі гадзін, можа, і ня думалася гэтым бедакам апынуцца ў гэтым пакоі, але лёс накіраваў іначай: скрыганулі дзьверы бальніцы і... зачыніліся. Ці надоўга? Мо зусім адгэтуль ня выйсьці, а толькі старая каняка зацягне замучанае цела на могільнік?

Хто згадае будучыню? І кожны хворы, затаіўшы ў душы надзею, прыглядаецца харaству дня, бліскучаму сонцу, а думкі лятуць і лятуць...

Пры самых дзьвярах на цьвёрдым ложку ляжыць дзіцянё — круглая сірата. Разумны погляд яго вачэй квапна спатыкае ўсякага, хто толькі ні заходзіць у бальніцу, хоць ведае ён добра, што яму чакаць некага, яго даведацца ня прыйдзе ніхто, ніхто... Нават тут, у бальніцы, дзе ён ляжыць ужо даўно, збрыдзеў усім: тут не прывыклі доўга займацца хворымі, а ён ляжыць і ляжыць — чужы, далёкі для ўсіх, і толькі думкі, сумныя думкі ўюцца ў яго збалелай галоўцы. Уюцца думкі, калі быў яшчэ здаровым, калі быў падпасавічам, як лётаў ён па ўзгорках і хмызьняках са скацінкай, а вось цяпер прыйшлося яму ляжаць прыкаваным да ложка і глядзець, як побач яго сьмерць косіць і косіць, і толькі чутно было, як сумна і зважна гудзелі званы, цяжка і глыбока ўздыхаў сірата, а думка гвалтам уціскалася: калі ж зазвоняць па ім?

[1913]

ГОНАР

На краю бярозавага гушчару, пад калматай елкай, вырас непамерна вялікі баравік.

Колькі было гонару, неба толькі адно ведала; ад раньня да зьмярканьня як чмель гудзеў, скоса пазіраючы звысака ўніз, дзе расьлі апенькі, казлы, лісіцы і ўсялякая, як казаў ён, пошасьць.

— Што ж вы, дармаеды, — пад шум баравы мармытаў баравік, — я старшына, мне ж толькі пашана ад лесу і людзей. — Ні рост, ні сіла не раўня вам, карлюкам.

— Яго праўда, яго праўда! — шаптала сямейка апенек, прытуліўшыся к спарахнеламу пню.

— Глянуць на нас — сьмеху варта, камель як лазіна і шапка, — зжальcя Божа, — толькі знак той! А ў яго ж галава з салятырку[1] і нага як вывараценъ.

Ішоў лесам мужык і няўзнак падслухаў гонар баравіка.

— Э, стары грыбазвон, дос плявузгаць, хадзі-тка ў кош, пабачым, што рэкнеш, як палезеш у печ.

І, прыгнуўшыся к зямлі, звольна падняў яго ўгару, павёўшы вострым нажом па грубым ашыйку.

Але як угледзеў, што ўнутры капашыліся чэрві, мякнуў аб зямлю, наступіў шырокім, як засланка, лапцем і пайшоў паважна сабе далей.

[1913]

[1] Сподак.

ГОЛАД

Худы, ледзьве жывы вартаўнік Сёмкавай сялібы сабака Дудка, ня раз галадаўшы колькі дзён узапар, цяпер ня вытрымаў і пайшоў ад свайго гаспадара шукаць шчасьця на старане. Доўга, бядак, туляўся ад хаты да хаты, ад вёскі да вёскі бяз жаднай пажывы і нарэшце бязь сіл заваліўся пры нейкай драцяной загарадзі, водзячы соннымі вачыма перад сабою.

Кругом было ціха, але так ціха, што ён нават чуў, як вурчэлі галодныя трыбухі і быццам штурхалі яго зь месца, каб ісьці — без адкладу ісьці.

— Пайду, калі так, — памысьліў ён, — як будзе, то будзе, не пажыўлюся — вядомы канец.

Ідучы крок за крокам ля драцяной загарадзі і сланяючыся з боку ў бок, узгляд яго застанавіўся на пекным доме, што, як багатыр, стаяў паміж зеляніны, ласкава ўглядаючыся маляваным дахам у неба.

А што каб зьвізытаваць туды, можа, костачку або скарыначку падняў бы, напэўна, тут з голадам зусім не знаёмы.

Але ж як прайсьці, калі так заблытана дротам загарадзь, што носа ня ўткнеш, а ня тое каб усяму пралезьці...

Хацелася разагнацца, скакануць, як калісь бывала, увысь, ды дзе ж: сілы той, што ўперад была, цяпер і паміну не было.

Так пайшоў далей, прыглядаючыся на красачкі і зеляніну, што расьлі за загарадзьдзю.

Вось жыцьцё дык жыцьцё, мысьліў ён, гэта ня тое што ў нас у вёсцы, куды вокам ні кінь, усюды то крапіва, то палын, і ўсё ж гэта горкае і калючае, і ў гэтых думках, пераступаючы крок за крокам, убачыў пад драцяной загарадзьдзю сьвежападрытую яму.

— А... вось дзе шчасьце напаткала мяне, — гледзячы на жоўценькі пясочак, радаваўся ён і, доўга ня мысьліўшы, падагнуў лапы, прытуліўся як мог да зямлі і, як відзіш, апынуўся там.

— Пажыўлюся — добра, а не — не шукай мяне, мой гаспадарок, не пайду адсюль, няхай хоць адзін сабачы сын спаткае сьмерць у пачэсным месцы.

Гэтак ідучы з выцягнутай, як прадла, галавой, ён падышоў к шырокаму ганку і паступіўся дзьвюма лапамі на ўсходках.

Прыемны дух засьвідраваў у носе яго і разбудзіў сонныя, галодныя трыбухі.

— Не пужайся, — быццам нехта шапнуў яму, — ідзі бяз боязьні...

Толькі пераступіў апошнюю ўсходку і хацеў зрабіць рэвізію на падлозе, як на спатканьне к яму паважна ішоў беленькі пудлік зь нейкімі цацкамі на шыі.

Убачыўшы гасьця, ён перш сабраўся было заекатаць і падняць усіх на ногі, але, як убачыў, што госьць пакорна лёг перад ім, падтуліўшы хвост і лапы, паласкавеў і пачаў абнюхваць яго пакамечаную поўсьць.

Відаць, пакорнасьць касьцістай асобы разжаліла яго і прымусіла зьвярнуць увагу.

Дудка ня дурань быў, угледзеўшы ў вачах гэтага дабрадзея ласкавы пагляд, ён перш выпрастаў адну нагу, тады другую, стаў на ногі і пайшоў сьледам за ім, у той бок, адкуль нёсься прыемны пах смачнай стравы.

Пудлік, закруціўшы хвост абаранкам, ішоў уперадзе, пазіраючы на галоднага гасьця.

Сюды, сюды, быццам хацеў сказаць ён, углядаючыся на бедака.

Сюды... Дудка, не спрачаючыся, ішоў; і чым бліжэй пасоўваўся, тым прыятнейшы пах разьлягаўся кругом і падманьваў яго к сабе.

Нарэшце ў белай, як сьнег, талерцы ўгледзеў той прысмак, каторы здалёку цягнуў яго к сабе.

Нюхнуўшы троха зьверху, з радасьці ён ледзьве не звар'яцеў, памкнуўся было расправіць сваю шырокую мяліцу, каб праглынуць усё, што толькі бачылі вочы, але чы то з боязьні, чы з далікатнасьці адвярнуў галаву ўбок і жаласьліва глянуў у вочы свайму дабрадзею.

Той, падагнуўшы хвост, сядзеў і маўчаў.

Значыць, можна, калі так, памысьліў Дудка і звольна, не сьпяшаючыся, пацягнуў языком па страве.

Надта ж смачна паказалася яму. Не разьбіраючы ўжо, чы можна хватаць так, як хватаў удому, ядучы зь сьвіньнямі, увабраўся туды з галавой і як відзіш спаражніў усё да капелькі.

Засталася толькі костачка, каторую ён пакінуў напасьледак. І вось цяпер, калі дайшла чарга да яе, пачаў лавіць костку на сьлізкай талерцы.

Ведама, хто не прызвычаены да гэткага шыку, то зь непрывычкі не патрапіць зграбна ўзяцца, і Дудка надта нязграбна пераняў яе на зубы і, хапаючы костку зубамі на паветры, на вачах свайго збавіцеля клыком адбіў споры кавалак талеркі.

Вось так спраўляецца, памысьліў пудлік, гледзячы на вышчарблены ражок і на костку, што, як цукерак, захавалася ў шырокім яго горле.

Дудка тым часам аблізваўся і паглядаў на дзьверы, каб выйсьці. Толькі сабраўся ступіць, як пачуў, што нешта ў старане зашасьцела, і ўбачыў, як чыясь доўгая цень выпаўзла з-за вугла.

Ён зірнуў і абмёр. К яму краўся нейкі чалавек быццам бы са стрэльбай у руках.

— Ату... — зразу зароў ён і злажыўся...

Нешта зашумела, пляснула і пацягнула дымам.

Відаць было, як Дудка нёсься па дарожцы к таму месцу, кудой увайшоў, а посьле спыніўся і сеў, пазіраючы на тую яму, што так недалёка ўжо была.

Чырвоныя плямы закрасаваліся на жоўтым пяску, і промні сонца выпаўзьлі з-за зялёнага куста і доўга асьвячалі цела галоднага бедака.

[1913]

БЕЛЫ ВЯНОК

Драма ў адным акце

З жыцьця Заходняй Беларусі

АСОБЫ

Г а р а с і м — селянін, 40 г.

Я г о ж о н к а — хітрая кабеціна, 35 г.

А к с і н ь н я — іх дачка, 10 г.

В о й т — польскі служачы, шапка зь белым арлом, 35 г.

Р а з н о с ь н і ц а тавараў, 35 г.

ДЭКАРАЦЫЯ

Сялянская хата. Пасярэдзіне і справа (ад суфлёра) дзьверы. Зьлева акно. Збоку стол; на ім запаленая лямпа, люстэрка, скрыначка, а ў ёй дзіцячыя цацкі і медзякі — грошы. З боку ад стала, пры сьцяне, пасьцель, на ёй сьпіць дзяўчынка А к с і н ь н я . За сталом сядзіць у роспачы Г а р а с і м . Печ. Ля печы сякера. На лаве шапка. Дзея адбываецца ўвечары, летам. За сцэнай ліхтар са сьвечкай.

Г а р а с і м . Падаткі, падаткі. Думка не выходзіць з памяці, і ўстаю, і кладуся — усё падаткі, падаткі. Ну, чым жа заплачу? Чацьвёртую павестку пан пасылае. Эх, напіцца б з гора ды бяды... Хоць на хвілю атупела б галава... (*Паўза.*) І гэтага няможна, няма грошай. (*Паўза.*) Шчасьлівая дачушка, Аксіньня, нагулялася за дзень і сьпіць, нішто яе ня рупіць... Былі б цацкі, а гора ня будзе. (*Перабірае на стале яе цацкі.*) Што гэта? Грошы? Адкуль яны? А, яна ж зьбірала ягады — зарабіла, купіць хоча кніжку... (*Паўза.*) Падаткі, падаткі, думка ня сходзіць з памяці. Эх, напіцца б... (*Задумаўся.*) А што, каб... узяць. Што будзе... (*Паўза.*) Дзіця даруе мне... (*За шапку.*) Даруй, дзеткі, бацьку-п'яніцу, ён зьневажае цябе, змушае плакаць горкімі сьлязьмі. З часам, дзеткі, падрасьцеш — будзеш ведаць, чаму твой бацька п'яніца. (*Выходзіць.*)

А к с і н ь н я (*абудзілася*). Дзіўна, чаму гэта мяне на сон морыць, і мамка нічога ня кажа — маўчыць. Але годзе спаць, пабягу зараз на сяло і запытаюся ў дзяўчат, калі па ягады пойдзем. А цяжка зьбіраць маліны, ой, цяжка. З аднаго боку — лесьнікі панскія, а з другога — глядзі, каб на сонную гадзюку не наступіць. Учора я наступіла... І за малым-малым не пакусала мяне. Уцякла. Зарабіла грыўню, а страху мела — вой-вой!.. Але нічагуткі: зьбегаю ў дзялянку, зьбяру ягад і прадам, і як будзе рубель, куплю сабе кніжку. Тут мае цацкі, тут мае грошы. (*Шукае.*) А дзе ж яны?.. Няма... забралі... Хто ж гэта забраў? (*Плача.*)

Уваходзіць ж о н к а .

Ж о н к а . Ну, чаго плачаш?

А к с і н ь н я . Ды нічога, я так.

Ж о н к а . На пагоду ці на дождж?

А к с і н ь н я . Гэта я ўспомніла, як мяне ў лесе гадзіна хацела ўкусіць. (*Кажа гэта, манячы.*)

Ж о н к а . Ува сьне?

А к с і н ь н я . Ды не, учора ў лесе, як зьбірала ягады.

Ж о н к а . А дзе ж твае грошы, што зарабіла?

А к с і н ь н я . Грошы... грошы не аддаў мне фурман; ён купіў у мяне ягады. (*І гэта маніць.*)

Ж о н к а . Купіў? Дзіўна! А калі ж ён аддасьць?

А к с і н ь н я . Казаў, сягоньня.

Ж о н к а . Ну, дык схадзі да яго і скажы, каб аддаў грошы, есьці няма чаго.

А к с і н ь н я . Добра, я пайду.

Ж о н к а . А бацька дзе?

А к с і н ь н я . Ня ведаю, яго не было. (*Пайшла.*)

Ж о н к а . Каб яно затанула, гэткае жыцьцё, дажыліся да астатку. Грошай няма, хлеба няма, скаціна пазводзілася. Ужо чацьвёртую абвестку прыслалі падаткі плаціць. Што будзе? Прагоніць пан зь зямлі, старцамі пойдзем у сьвет.

За сцэнай забрахаў сабака. Уваходзіць в о й т .

В о й т . Твой гэта сабака на дарозе мяне пераняў?

Ж о н к а . Калі руды, то мой.

В о й т . І што ж сабе думаеш, маўчаць буду?

Ж о н к а . А што здарылася, паночку?

В о й т . За нагу рвануў.

Ж о н к а . Ах, каб яго ваўкі, ён у нас такі — спадцішка.

В о й т . Ну, а я рвану, каб усе ведалі, будзе ведама табе і твайму сабаку, што войт, а не абы-хто.

Ж о н к а . Паночку, то што ж будзе?

В о й т . Як паклічу на суд, будзеш ведаць.

Ж о н к а . І адкуль такое насланьнё?

В о й т . Ну, годзе. Не за тым я прыехаў, каб сабака за лыткі рваў. Падаткі ёсьць?

Ж о н к а . Няма, паночку!

В о й т . І за чацьвёртым разам няма?

Ж о н к а . Адкуль жа іх узяць? Самі ведаеце.

В о й т . А няма падаткаў — зь зямлі вон. Пан такіх ня любіць, і мне такія не даспадобы. Я калі зьяўлюся да каго ў хату, сабак не выпускаюць, а пераймаюць і частуюць.

Ж о н к а . Паночку, пабойцеся Бога!

В о й т . Ня Бога трэба баяцца, а пана; пан — твой бог. Можа прагнаць, можа пакінуць, можа ўзяць падаткі і ня ўзяць. Пан! Дзе твой мужык?

Ж о н к а . Ня ведаю. А нашто пану?

В о й т . Расьпісацца трэба.

Уваходзіць Г а р а с і м .

Ж о н к а . А вось ён, лёгкі на ўспамін.

В о й т . Гэй ты, чортаў смык, дзе цягаесься?

Г а р а с і м . Ды тут, ля хаты.

В о й т . Падаткі калі будуць?

Г а р а с і м . Я ўжо і сам ня ведаю.

В о й т . Я не прыехаў жартаваць, а кажы толкам: калі падаткі будуць?

Г а р а с і м . Хіба ўвосень.

В о й т . А што, увосені хлеба намалоціш, шмат насеяў?

Г а р а с і м . Чаму ж бы не насеяў, але насён не было. А прытым град поле папсуў.

Ж о н к а . Увосень мо заробім. Будуць сячы лес, а мы пацярэбім.

В о й т . Падпішы гэтую паперу! Вось тут.

Г а р а с і м падпісвае.

Ж о н к а . А можна ведаць, што гэта?

В о й т . Папера, якая такіх арандатараў выкіне вон з панскіх абшараў. Сабаку прытрымай. (*Пайшоў, а за ім Гарасім.*)

Ж о н к а . Вось табе новае ліха. Цяпер зь зямлі прагоняць, калі паперу падпісаў. Што будзе — на старасьці засталіся жабракамі і самі, і дзіця.

Уваходзіць Г а р а с і м .

Ж о н к а . Ну, што, падпісаў?

Г а р а с і м . Адкуль я мог ведаць?

Ж о н к а . Ня ведаеш?! А зекры заліць гарэлкай мог ведаць. О... чортава кузьня, гад смалены!

Г а р а с і м . І чаго, баба, лаесься? Старайся нейкі спосаб дабраць, няўжо адрачыся зямлі?

Ж о н к а . Ды раней ты вырачасься кашулі, пакуль я выракуся зямлі. На коленках папаўзеш да пана, ногі цалаваць будзеш, а зямлю выпрасіш.

Г а р а с і м . Так нас і паслухаюць.

Ж о н к а . А не паслухаюць, дык горш для цябе; ня будзе табе ні хвілінкі спакою: я цябе загрызу!

Г а р а с і м . Рабі што хочаш. (*Сеў.*)

Ж о н к а . П'янюга, абібок!

Р а з н о с ь н і ц а празь дзьверы.

Р а з н о с ь н і ц а . Можа тавары крамныя патрэбны?

Ж о н к а . Ды на ліха яны — капейкі за душой няма.

Р а з н о с ь н і ц а . То можа заначаваць дазволіце? Ноч набліжаецца.

Ж о н к а . Заходзьце.

Уваходзіць зь вялікім клумкам р а з н о с ь н і ц а .

Р а з н о с ь н і ц а . Пахвалёны ў хату!

Ж о н к а . Адкуль ідзяцё?

Р а з н о с ь н і ц а . Ведае цыган, адкуль ён ідзе? З-за сьвету. Жыцьцё наша валацужнае. Кутка ўласнага няма.

Ж о н к а . Але ж, пэўна, добра зарабляеце, калі не абрыдла цягаць за сабой гэткі клумак.

Р а з н о с ь н і ц а . О, яшчэ і як абрыдла! Ды нічога ня зробіш. Хлеб.

Ж о н к а . Купляў хто ў нашым сяле?

Р а з н о с ь н і ц а . Ды не, толькі з шляху ўзышла. Ваша першая хата паслужыць мне прыпынкам.

Ж о н к а (*да мужа*). Чаму гэта Аксіньня не ідзе?

Г а р а с і м . А куды яна пайшла?

Ж о н к а . Ды па грошы да фурмана. Ягады купляў, ды грошы не аддаў.

Г а р а с і м . Як мне ведама, ён ягад у яе не купляў і грошай ня вінен.

Уваходзіць А к с і н ь н я .

Ж о н к а . Ну як? Аддаў? (*Паўза.*) Чаго ж маўчыш? Кажы: грошы прынесла?

А к с і н ь н я . Не аддаў.

Ж о н к а . Чаму не аддаў? (*Паўза.*) А можа ты страціла?

А к с і н ь н я . Мамачка, даруйце, я вам зманіла! Я па грошы не хадзіла, бо ніхто ня вінен: яны згінулі... у скрынцы былі...

Ж о н к а . Ах, так! (*За палку.*) Ты мяне на ашуканства браць?

Г а р а с і м (*спаміж іх*). Сядзь, шалёная, не палохай дзіця!

Ж о н к а . Як-то сядзь, ды я... (*Замахнулася.*)

Г а р а с і м . Кажу, не гарачыся, біць ня будзеш, бо ў гэтым не яе віна, а мая — я ўзяў грошы!

Ж о н к а . Ты? Ах ты, п'янюга прагорклы! За яе грошы напіўся?

Г а р а с і м . Так, за яе.

Ж о н к а . Чакай жа ты мне!

Г а р а с і м . Аксіньня, дачушка, даруй мне, гэта я ўзяў твае грошы; узяў я ня дзеля таго, каб зрабіць табе боль, а каб заліць балючыя раны сэрца. Цяжка мне, сумна мне; усё гіне, усё валіцца ў бяздоньне. Ты сама, дзіцятка, бачыш наша становішча; зямельку і тую адбіраюць. (*Плача.*)

А к с і н ь н я . Ня плачце, татачка, ня трэба мне грошы!

Ж о н к а . Табе ня трэба, яму ня трэба, а падаткі плаціць трэба? А ведаеш ты, сабака бяздомны, што нас зь зямлі выкідаюць?

А к с і н ь н я . А за што, мама?

Ж о н к а . А за тое, што падаткі ня плацім. Пан шкадаваць ня будзе!

Р а з н о с ь н і ц а . Пані гаспадыня, аб чым у вас шум?

Ж о н к а . Ды аб тым, што гэты п'янюга ў дзіцяці грошы ўзяў ды прапіў.

Р а з н о с ь н і ц а . Толькі ўсяго? І за гэта сварыцца? Кіньце! Хадзі, дзеткі, да мяне, я табе дам грошы. (*Выпусьціла з рук мяшэчак грошай.*) А ліханька, з рук валяцца. (*Як выпалі ў разносьніцы грошы, маці хітра глянула.*) Ну, а цяпер будзе ціха.

А к с і н ь н я грошы аддае маці.

А к с і н ь н я . Цётачка, якая вы добрая, дзякую вам!

Р а з н о с ь н і ц а . Ня трэба, дзеткі, ня трэба! Няхай у вашай хатцы згода будзе! Не магу бачыць сваркі.

Ж о н к а . Вы добра абмяркуйце: у хаце ні хлеба, ні солі, а ён абы капейку — у шынок.

Г а р а с і м . Не разумееш душы чалавека, не разумееш! Ня сам я ў шынок іду, а доля горкая заганяе туды... хата валіцца, падрубы згнілі, зямлі і той няма. Эх, чаму ж ня ўдарыць гром і не пахавае мяне, гаротнага, тут, на месцы?

Р а з н о с ь н і ц а . Кіньце сварку, неяк будзе!

Г а р а с і м . Так і будзе. Голас мой не пачуе ніхто, а сьлёз сьвет не пазнае.

Ж о н к а . Ну, годзе ўжо, годзе!.. І так горка ўжо!

Р а з н о с ь н і ц а нечага шукае.

Ж о н к а . Чаго шукаеце, страцілі што?

Р а з н о с ь н і ц а . Аршын дзесь задэчыла і сама ня ведаю.

Ж о н к а . Як мне здаецца, да нас прыйшлі без аршыну.

Р а з н о с ь н і ц а . Пэўне, на дарозе згубіла.

Ж о н к а . Можа дзе недалёчка? Аксіньня, зьбегай пашукай!

Р а з н о с ь н і ц а . А мы разам.

А к с і н ь н я . Згода, цётачка, разам!

Ж о н к а . Запалі ліхтар, а то нічога ня ўбачыш!

А к с і н ь н я . Я пайду і так. (*Пайшлі.*)

Г а р а с і м . Прыказка нездарма кажа: сьвет не бяз добрых людзей. Чужы чалавек, а прыняў у сваё сэрца і нашу бяду.

Ж о н к а . Добра прымаць, меўшы гэтулькі грошай. Ты бачыў?

Г а р а с і м . А нашто я маю заглядацца на чужое дабро?

Ж о н к а (*ласкава*). Нам, браце, ня суджана мець нічога людзкага, апроч гэтага ламачча, а мець хацелася б, ой, як хацелася б. (*Паўза.*) Ну, скажы, чым дрэнна, каб мець гэтулькі грошай: апрануўся б, хату новую ўзгарусьціў і чарку гарэлкі яшчэ.

Г а р а с і м . Перш падаткі заплаціў бы.

Ж о н к а . Вось гэта разумна! Перш падаткі. Ты мне даруй, што я накрычала на цябе.

Г а р а с і м . Крычы, я не баюся. Зьвягі толькі не люблю.

Ж о н к а . Праўду кажучы, ты сам вінен, у такую пару разважаеш, як дзіця, а пры тым паперу войту падпісаў.

Г а р а с і м . Падпішаш, калі загадае.

Ж о н к а . Так вось што! Гора горам, а радасьць радасьцю. Схадзі ты ў шынок і прынясі гарэлкі... Маеш грошы?

Г а р а с і м . Гарэлкі? Жартуеш, ці што?

Ж о н к а . Ня жарты, а сапраўды. Прынясі гарэлкі сюды, а рэшту выпі там.

Г а р а с і м . Нашто табе гарэлка?

Ж о н к а . Вось дурны, піць будзем. Хіба дрэнна? Ну, ідзі, пакуль ня злосная.

Г а р а с і м . А можа, ня трэба піць? Нешта ахвота адпала адразу.

Ж о н к а . Ну, хутчэй ідзі, у мяне важная справа ёсьць!

Г а р а с і м . Якая такая справа?

Ж о н к а . А вось бяжы, тады скажу.

Г а р а с і м . Не пайду.

Ж о н к а . Ну і дурны. А ў мяне спосаб ёсьць, як паперу тую вярнуць назад, што войту падпісаў.

Г а р а с і м . Жартуеш, баба!

Ж о н к а . А вось ідзі — і папера будзе ў нас, а падаткі ў пана.

Г а р а с і м . Я трачу прытомнасьць. (*Доўга думаў і пайшоў.*)

Ж о н к а . Толькі не марудзь. (*Думае.*) На сяле яе ніхто ня бачыў, грошы немалыя.

Уваходзіць А к с і н ь н я .

Ж о н к а . Ну што, знайшлі?

А к с і н ь н я . Цёмна! Трэба запаліць ліхтар.

Ж о н к а . А я ж табе казала.

А к с і н ь н я . А дзе ліхтар?

Ж о н к а . У сенцах.

А к с і н ь н я . Мамачка!

Ж о н к а . А што?

А к с і н ь н я . Мамачка, не крычыце на татку, ён ня вінен!

Ж о н к а . Ды я не крычала.

А к с і н ь н я . І на мяне не крычыце! Я зманіла.

Ж о н к а . І на цябе не крычу.

А к с і н ь н я . Я зараблю шмат грошай і ўсе вам аддам. Мне грошы не патрэбны.

Ж о н к а . Ну добра, ідзі ўжо, ідзі!

А к с і н ь н я . Матуленька, а я вам пахвалюся! Яна мне абяцала, як знойдзецца згуба, на сукенку даць.

Ж о н к а . Вось бачыш, як добра. Шукай, будзеш мець гасьцінец!

А к с і н ь н я . О, я буду шукаць, папрашу белай тканіны, і мне пашыюць белую вопратку. (*Адышлася і вярнулася назад — пацалавала матку і пабегла.*)

Ж о н к а . Ах, хоць бы ўдалося! А тады наша зямля, наша будова!

Уваходзіць Г а р а с і м .

Ж о н к а . Ну вось, адразу відаць, што выпіў, вочы і тыя пасалавелі.

Г а р а с і м . Ня тое каб пасалавелі, але так, нешта ў галаве каламуціць.

Ж о н к а . Нябось і сілы больш, і адвагі больш.

Г а р а с і м . А пэўне, што цяпер перад войтам не ўздрыгнуўся б.

Ж о н к а . Веру, веру.

Г а р а с і м . Табе патрэбны падаткі? Во падаткі — мазольныя мужыцкія рукі. Табе патрэбны словы? Маеш словы. Эх, сказаў бы… што з гарматы.

Ж о н к а . Адважны, адважны ты ў мяне.

Г а р а с і м . Ну а чым я не адважны? Я адважны. Праўда, калі цьвярозы — маўчу, а вып'ю — агрызнуся. Хіба няпраўда?

Ж о н к а . Ды якая там праўда, калі ты ануча.

Г а р а с і м . Як-то ануча?

Ж о н к а . А так — каб ты быў крышку сьмялейшы, не сядзеў бы бяз хлеба, і зямля наша была б.

Г а р а с і м . Усё наша пры нас. Зямлі я не аддам, бо ня год, ня два баранаваў яе і плаціў падаткі, а цяпер ня маю чым, могуць пачакаць, не згалее ад гэтага пан.

Ж о н к а . Падаткі ёсьць, толькі трэба ўзяць іх.

Г а р а с і м . А дзе іх узяць? Хіба прысьніла?

Ж о н к а . Не прысьніла, а сваімі вачыма бачыла, і ты бачыў.

Г а р а с і м . У каго?

Ж о н к а . У разносьніцы.

Г а р а с і м . Ну і што?

Ж о н к а . Так вось, кіўні пальцам — і грошы ў тваёй кішэні, і зямля пры нас.

Г а р а с і м . Не разумею.

Ж о н к а . На сяле яе ніхто ня бачыў.

Г а р а с і м . Але што трэба зрабіць?

Ж о н к а . Адабраць грошы.

Г а р а с і м . Што ты, баба? Да цябе нячысты прыстаў. Пераж агнайся!

Ж о н к а . Не палохайся, дурненькі, не адганяй шчасьця, калі само ў рукі ідзе.

Г а р а с і м . Ну дык у чым рэч? Адбяры! Сьмеху варта. У бабы адабраць грошы. Ды яна, мае міленькія, такі вэрхал падыме, што нябожчыкі пачуюць. Спрабуй жа ты ў мяне што адабраць, то я за сякеру вазьмуся.

Ж о н к а . А вось жа зямлю адабралі, а за сякеру ня ўзяўся, а яшчэ дзьверы войту адчыніў.

Г а р а с і м . А што мне было рабіць?

Ж о н к а . Тое, што было, ня вернеш. Рабі так, як кажу. Адбярэш, і маўчаць будзе.

Г а р а с і м . Як-то маўчаць, калі яна жывы чалавек?

Ж о н к а . Яна будзе спаць.

Г а р а с і м . А як абудзіцца, дзе падзенесься?

Ж о н к а . Тут будзеш.

Г а р а с і м . Рабі сама, я няздольны на злачынства! За свой век блага нікому не зрабіў.

Ж о н к а . Дарма не марнуй часу на пустую гутарку, а то будзе позна.

Г а р а с і м . І слухаць не хачу!

Ж о н к а . Ты добра памяркуй, якое тваё жыцьцё: калі ты быў сыты? Ніколі! Калі ты меў боты — ніколі! Век на табе зрэб'е, век на табе лапці. Ты ўспомні: на каго ты працаваў? Што ў цябе ёсьць? Зямля і тая не твая. А старасьць за дзьвярыма. Што тады будзе? Выганіць пан з хаты, і пойдзем як мышы рудыя ў сьвет.

Г а р а с і м . Не было да гэтага часу граху, няхай і ня будзе; бедны жабрак, але сумленны.

Ж о н к а . Злыдзень, не адмаўляйся, кожная хвіля дорага; табе здаецца, я жартую, гад смалены; паперу падпісаў і сьлюнкі распусьціў. Зрабі, што кажу, а то самога са сьвету зьвяду. Бачыш ты яго — не магу, не магу. Калі ня рвалі сабакі твае ногі, дык парвуць, калі жабраваць будзеш. Самога будуць пускаць начаваць, бо свайго кутка мець ня будзеш. На яшчэ грыўню, выпі ды прыходзь, бо калі так ня зробіш, вочы табе павысмальваю. (*Палажсыла грошы на стале.*)

Г а р а с і м . Рабі што хочаш, а так не зраблю.

Ж о н к а . Тады вон з хаты, я сама зраблю. Вон! (*Выпіхае.*)

Г а р а с і м . Ачмурэла баба, дальбог.

Ж о н к а . Так, ачмурэла, бо голад прымушае. А галодны чалавек ня ведае, што робіць. Трэ будзе — табе галаву сякерай адсяку. Са мной жарты малыя... апошні раз пытаюся... ідзеш?

Г а р а с і м узяў грошы, выйшаў.

Ж о н к а . О, як жа цяжка было ўгаварыць... упёрся, як бык...

Уваходзяць р а з н о с ь н і ц а і А к с і н ь н я .

Ж о н к а . А што, знайшлі?

Р а з н о с ь н і ц а . Знайшлі, ля самага лесу быў.

Ж о н к а . А хто ж знайшоў?

А к с і н ь н я . Я.

Р а з н о с ь н і ц а . У яе вочкі сьвецяць добра, як зоркі, за гэта гасьцінца ёй дам.

А к с і н ь н я . Цётачка, як я рада, — буду мець новую вопратку.

Р а з н о с ь н і ц а . Будзеш, дзеткі, будзеш, дам табе лепшай тканіны, дам грошы, каб пашылі.

А к с і н ь н я . Якая вы добрая! Матуленька, чулі, — усё ў мяне будзе.

Ж о н к а . На сьвеце жывучы, усяго нажывеш.

А к с і н ь н я . Мама, а куды татка пайшоў?

Ж о н к а . Да суседзяў. А нашто ён табе?

А к с і н ь н я . Я хацела прасіць і татку, і вас, каб вы не сварыліся; я буду памагаць вам, і ў нас будзе хлеб.

Ж о н к а . Будзе — ды ня ў нас.

Р а з н о с ь н і ц а . Ну, нашто так разважаць? Не заўсёды так будзе.

Ж о н к а . Праз усё жыцьцё гэтак... доля ўжо такая... ну, Аксіньня, ты зусім асалавела, сьпіш ужо. Кладзіся!..

А к с і н ь н я . Добра, мамачка, лягу.

Р а з н о с ь н і ц а . Гляджу я на вашу дачушку і радуюся: залатое дзіця... столькі розуму... уцеха на старасьці...

Ж о н к а . Якое яе жыцьцё ў гэткай нудзе?

А к с і н ь н я . Ну, мамуленька, пайду спаць. Бывайце здаровы, ня гневайцеся на мяне.

Ж о н к а . Добра ўжо, добра; не дуры галавы, цётка таксама адпачыць хоча.

Р а з н о с ь н і ц а . Праўду кажаце, за дзень натупалася, з вамі размаўляю, а вочы зьліпаюцца.

Ж о н к а . Ну дык і кладзецеся.

А к с і н ь н я . І з вамі, цётачка, разьвітаюся...

Р а з н о с ь н і ц а . Сьпі, маё дзіцятка.

А к с і н ь н я . Ах, хоць бы прысьніць белую вопратку. Вось я і пайшла. (*Выйшла ў бакоўку.*)

Ж о н к а . А вы кладзецеся тутака.

Р а з н о с ь н і ц а . Дзякую, мне абы прыткнуцца.

Ж о н к а . Вось гэтым накрыйцеся, а я пайду старога пашукаю. (*Пайшла.*)

Р а з н о с ь н і ц а . Ох, жыцьцё, жыцьцё, век па чужых хатах.

А к с і н ь н я . Цётачка, а-ку-ку-ку. (*Празь дзьверы.*)

Р а з н о с ь н і ц а . Ты яшчэ ня сьпіш?

А к с і н ь н я . Ня сплю, цётачка! Усё думаю, як буду мець новую вопратку, як выйду на вуліцу і ўсе зьдзівяцца.

Р а з н о с ь н і ц а . Выйдзеш, дзеткі, выйдзеш.

А к с і н ь н я (*пасьля вялікай паўзы*). Цётачка!

Р а з н о с ь н і ц а . А што?

А к с і н ь н я . А мне хочацца паглядзець, якую дасьце вопратку?

Р а з н о с ь н і ц а . Ну, калі так хочаш, устану ды пакажу. (*Устае.*)

А к с і н ь н я . Цётачка, даруйце, я вас патурбавала.

Р а з н о с ь н і ц а . Нічагутка, пакажу. (*Разьвязала клумак.*) Вось гэта табе падабаецца? (*Дастала з клумка белую з блакітнымі стужкамі сукенку, дала Аксіньні, тая прылажсыла да грудзей, склаўшы накрыж рукі.*)

А к с і н ь н я . Падабаецца, цётачка, падабаецца.

Р а з н о с ь н і ц а . А вось табе і вяночак, белы, як сьнег. (*Кладзе на галаву.*)

А к с і н ь н я . Цётачка, мусіць, прыгожа?

Р а з н о с ь н і ц а (*дае люстэрка*). Глянь, дзеткі, глянь!

А к с і н ь н я глянула і дзіка ўскрыкнула.

Р а з н о с ь н і ц а . Дзеткі, што з табой?

А к с і н ь н я . Страшна мне, страшна, вазьмеце, не хачу, баюся... (*Зьдзела.*)

Р а з н о с ь н і ц а . Чаго ж ты, дзеткі, спалохалася?

А к с і н ь н я . Я была падобна...

Р а з н о с ь н і ц а . Да чаго?

А к с і н ь н я . Да нябожчыцы.

Р а з н о с ь н і ц а . І зусім не, пакінь, дзеткі, палохацца; нядобра супроць ночы сьмерць успамінаць.

А к с і н ь н я . І мамы няма.

Р а з н о с ь н і ц а . Мама прыйдзе, не палохайся, дзеткі, кладзіся, кладзіся.

А к с і н ь н я . Цётачка, вы мне падаравалі гасьцінец, а я вам аддаю сваё месца, — яно і цяплейшае і раскашнейшае.

Р а з н о с ь н і ц а . А ты ж дзе ляжаш?

А к с і н ь н я . А тутака.

Р а з н о с ь н і ц а . Ну, добра... дзякую табе, родненькая!

А к с і н ь н я (*кладзецца*). Я, цётачка, накрыюся з галавой... каб адразу заснуць, сьмерці баюся.

Р а з н о с ь н і ц а . Сьпі! (*Пайшла ў бакоўку.*)

А к с і н ь н я . Цётачка, а прыйдзе мама, так скажаце, што гэта падарункі вашы... і я спалохалася сьмерці.

Р а з н о с ь н і ц а . Пакінь ты, дзеткі, супроць ночы сьмерць успамінаць.

А к с і н ь н я . Ня буду, цётачка, ня буду. (*Закрылася.*)

Р а з н о с ь н і ц а выйшла. Вялікая паўза. Ж о н к а паглядзела праз акно, а пасьля ўваходзіць. Агледзелася, агонь зьменшыла. Упускае Г а р а с і м а . Гэстам паказвае, каб ён сеў. Прыкрая і доўгая паўза.

Г а р а с і м . А чые гэта рэчы?

Ж о н к а . Вось табе і на! Пакуль з шынка вярнуўся — і забыўся. Падарунак для Аксіньні.

Г а р а с і м . Ага, успомніў! Дрэнныя думкі доўга ў галаве не сядзяць. (*Глядзіць на вянок.*)

Ж о н к а . Ды пакінь ты ўглядацца!

Г а р а с і м . Белыя кветкі, як вочкі маёй дачушкі; гляджу я на гэты вяночак і бачу яе перад сабой. Мне здаецца, што яна зараз зьявіцца перада мной у гэтай вопратцы і запытаецца, хто я: сумленны чалавек ці забойца?

Ж о н к а . Зусім раскіс... і гарэлка не памагла.

Г а р а с і м . Быццам я ня піў...

Ж о н к а . Ну, здаецца, усё абгаварылі, застаецца зрабіць канец. Чуеш? Сьпіць!

Г а р а с і м . Баба, што ты робіш?.. Вусьцішна... Сумленны ж я чалавек.

Ж о н к а . І будзеш.

Г а р а с і м . Баюся! Абудзіцца, наробіць крыку.

Ж о н к а . Ото ж дурань... (*Дае гарэлку.*) На выпі і зрабі, што кажу! Ну, пі, табе кажу!

Г а р а с і м . Што са мной?.. (*П'е.*)

Ж о н к а . Падаткі аддамо, зямля наша, скінеш лахманы. (*Дае сякеру.*)

Г а р а с і м (*са страхам*). Забіць...

Ж о н к а . А то як жа... сам казаў — абудзіцца, у астрозе згніеш.

Г а р а с і м . О не... Згінь ты, прападзі!..

Ж о н к а . Ня бойся! Адзін раз сякерай кіўнеш, і лепшая доля перад намі.

Г а р а с і м . Што яна робіць са мной, куды нахіляе?

Ж о н к а . Куды нахіляю? А вось туды (*паказвае*), бо калі не паслухаеш... Сам толькі памятай... Табе на дарозе катарга.

Г а р а с і м . Але ж як гэта можна?

Ж о н к а . Усё можна... абы жыць... Чалавек, калі топіцца, не глядзіць. Сьмерць — страх!

Г а р а с і м . А дзе ж ты падзенеш?

Ж о н к а . Дзе?.. За хатай вір глыбокі — завалаку, што ў магілу. Ану, хутчэй, больш адвагі, вунь яна... Я выношу сьвятло... Чуеш? (*Узяла лямпу і выйшла.*)

Г а р а с і м (*сеў*). Не, не магу... будзь ты проклята!

Ж о н к а (*праз акно*). Доля лепшая перад намі, аддамо падаткі, будзем самі жыць і дзіця гадаваць...

Г а р а с і м . Не магу!..

Ж о н к а (*уваходзіць зь лямпай*). Разьвяжы пятлю, што душыць нас, хоць бы дзеля Аксіньні... жабраваць будзе па сьвеце.

Г а р а с і м (*схамянуўся*). Жабраваць, маё дзіця... (*Заплакаў.*) Маё дзіцятка, не дапушчу... Згодны. (*Узяў сякеру.*) Няхай будзе спакой у палацах пана і ў беднай хаце. Выйдзі!

Ж о н к а зь лямпай выйшла.

Г а р а с і м замахнуўся сякерай, але ў гэты час А к с і н ь н я хутка са сну ўсхапілася. Гарасім са страху дзіка ўскрыкнуў, кінуў сякеру, выбег на сярэдзіну сцэны, нэрвова заплакаў.

А к с і н ь н я (*ня ведаючы, у чым справа, падышла да бацькі, супакойвае*). Ня плачце, татаньку, падаткі мы аддамо, ня плачце!

Уваходзіць ж о н к а зь лямпай, а з бакоўкі — р а з н о с ь н і ц а . Жонка са страхам глядзіць то на разносьніцу, то на Аксіньню.

З а с л о н а

[1921]

Андрэй Хадановіч

жыцьцё ня за, а перада мной



Юлі Таўбін



Хачу жыць, падаючы, —
але не занепадаючы.
Высока паднятым сілай часоў,
здабыць сталае месца на гале зямной.
Ведаю свае заганы.
Але гэта — мая задача.
Мне — дваццаць першы год.
Жыцьцё ня за, а перада мной.

Аўтару гэтых радкоў сапраўды няма яшчэ дваццаці аднаго. І ён піша пра свой скон, прычым нават не адзін верш, а цэлую вялікую нізку зь пяці твораў, першы зь якіх я тут працытаваў. І большасьць радкоў потым выявяцца прарочымі (вось толькі, на жаль, ня гэты: *«Жыцьцё ня за, а перада мной»*). Бо, калі трохі перафразаваць клясыка, ня толькі паэт пільна ўглядаўся ў сьмерць, але і яна пачынала прыглядацца да яго. І прыведзеныя тут радкі — адны з апошніх, напісаных аўтарам па-беларуску. Далей першы арышт «нацдэма» і высылка ў Цюмень, дзе паэт будзе працаваць у мясцовым тэатры і яшчэ пару гадоў пісаць па-расейску. Пакуль яго не арыштуюць другі раз — і ўжо незваротна, бо потым толькі допыты, катаваньні ў «амэрыканцы» і самая трагічная для нашай культуры ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937-га. Калі разам зь дзясяткамі іншых дзеячоў беларускай літаратуры будзе расстраляны геніяльны паэт і выдатны перакладнік Юлі Таўбін.

Можна ганарыцца, што ў Беларусі быў свой Рэмбо (я пра фэнамэнальную адоранасьць і раньнюю сталасьць аўтара, які ўсю сваю «нятленку» стварыў у 17–21 год). Можна толькі ўяўляць, чаго дасягнуў бы гэты творца, ня зьнішчы яго на самым узьлёце сталінскі мэханізм масавых забойстваў. Але трэба сказаць неабходнае: творчасьць паэта вартая самай пільнай увагі нават і без папраўкі на гэтыя трагічныя акалічнасьці, бо ён пасьпеў напісаць некалькі твораў, якія абавязкова зоймуць пачэснае месца ў нашым літаратурным каноне. Варта толькі належным чынам перачытаць аднаго з самых недаацэненых у нас лірыкаў.

Яго «паўзабытасьць» пачынаецца ўжо з вымаўленьня прозьвішча. Ня ўсе правільна паставяць у ім націск. А націск падае на першы склад — Та́ўбін. (Бо прозьвішча, паводле сямейнай легенды, паходзіць ад нямецкага «die Taube» — «галубка»). Юлі (ці Юдаль, сын Абрама) Таўбін нарадзіўся ў Расеі, у Астрагоску (Острогожск) Варонескай губэрні, у яўрэйскай сям'і. «Мой бацька, — расказваў Таўбін маладому Лужаніну, — быў маленькі аптэкар, належаў да партыі эсэраў. Аднойчы, у першыя гады рэвалюцыі, зьнік бязь сьледу. Я амаль ня помню яго».

А яшчэ паэта рэдка згадваюць самога па сабе, часьцей — разам са Зьмітраком Астапенкам — у складзе так званай „амсьціслаўскай плеяды", як дадатку да творчасьці «галоўнага» з трох аўтараў, народнага паэта Аркадзя Куляшова, адзінага зь іх, хто перажыў сталінскія рэпрэсіі й ваенныя катаклізмы, а таму было каго



Амсьціслаў. Дом на вуліцы Пірагоўскай, дзе ў 1920-х гг. жыла сям'я Таўбіных. Сучаснае фота Віктара Жыбуля

ўзнагароджваць ганаровым званьнем. Між тым Куляшоў быў наймаладзейшым зь сяброў-паэтаў. І Таўбін, які ў дзесяць гадоў пераехаў з Расеі ў Амсьціслаў, а потым вучыўся там у пэдтэхнікуме, быў адным з тых, хто прывёў будучага клясыка ў літаратуру. Ва ўспамінах Аляксея Зарыцкага «Жылі-былі паэты» чытаем: «Таўбіна звалі — Юлька, Куляшова — Аркашка, толькі Астапенка нязьменна заставаўся Зьмітраком. У 1969 годзе напісаў я маленькую паэмку „Сонца скрозь лісьце", героямі якой былі паэты-амсьціслаўцы. У гэтай паэмцы былі такія радкі: *„Аркашку, як малодшага, паслалі / Мы па віно, каб улагодзіць сум"*. У рэдакцыі аднаго з нашых часопісаў „Аркашку" адразу ж пераправілі на „Аркашу". „Як жа гэта, народны паэт і раптам — Аркашка..."».

Праз шмат гадоў Куляшоў згадае сваіх пабрацімаў у нізцы вершаў «Маналёг». Там шмат не зусім праўды, ёсьць нават зусім няпраўда, як бывае ў савецкіх мэмуарыстаў. Але па-за сумневамі — любоў да сяброў ды неспакойная памяць пра іх:

Маўчыць нябыт каменных пліт паважных,
Дзе з надпісаў дажджы змываюць пыл,
Там я блукаў, але імёнаў вашых
Не адшукаў на вокладках магіл.

Няма куды сваю жалобу ўскласьці
Ні жонкам, ні знаёмым, ні бацькам.
Сябры мае, хіба аб гэтым шчасьці
У маладосьці марылася нам?

Вяло нас музы строгай бласлаўленьне
На шлях цяжкі, ды што казаць аб тым...
Я — ваша памяць, вы — маё сумленьне,
Я — дрэўка, вы — трывалы сьцяг на ім.

Менавіта **культ сяброўства** — першае, чым зьвяртаюць на сябе ўвагу вершы самога Таўбіна. Гэта перадусім творы, прысьвечаныя сябрам з „амсьціслаўскай плеяды". «Яны былі неразлучныя, — пісаў Рыгор Бярозкін, — і бачылі іх заўсёды разам... Многае зьвяртала на сябе ўвагу ў гэтай садружнасьці: бескарысьлівая ўлюбёнасьць пачынаючых вершатворцаў у абранае імі вясёлае і цяжкое рамяство, іх шчырая, хоць і трохі наіўная, вернасьць высокаму культу сяброўства...» Таўбін прысьвячаў вершы і Астапенку, і Куляшову з Астапенкам разам, і Заіру Азгуру, і Ўладзімеру Хадыку, і многім іншым.

Апынуўшыся на кароткі час у Маскве пасьля цюменскай высылкі, Таўбін спрабуе наладзіць кантакт з тоўстымі часопісамі і нават друкуе ў «Знамени» і ў «Огоньке» два свае вершы. Першы, «Тэдзі», на першы погляд, досыць каньюнктурны, прысьвечаны арышту антыфашыста Тэльмана. Але зьвярну ўвагу на два нюансы. Па-першае, літаратурныя паралелі. Чытаючы такое:

Круглый год мы выгружали возле Западной губы
Нидерландское какао, австралийские бобы.
Русский лес, испанский перец, аргентинский антрацит...
Элеваторы дрожали, под ногой гудел гранит, —

мімаволі згадваеш «П'яны карабель» Арцюра Рэмбо зь ягонай «пшаніцай з Фляндрыі й брытанскаю бавоўнай». Па-другое, дата арышту Тэльмана, як заўважыў Віктар Жыбуль, падазрона супадае з датай арышту самога Таўбіна. І каньюнктурны верш пры такім чытаньні адразу робіцца нашмат больш асабістым і кранальным. Другі верш называецца «Сябрам» і максымальна ўвасабляе, можна сказаць, «закрывае» тэму сяброўства ў Таўбіна:

И много я людей встречал, и был у них различен труд,
Но улыбались мне они по-дружески и там, и тут.

Я лягу спать — не спится мне. Я встану рано поутру.
Хороших песен нужно им, мои собратья по перу.

Зьлева направа: Аркадзь Мардвілка, Зьміtрок Астапенка, Віктар Казлоўскі, Юлі Таўбін, Валеры Маракоў, Станіслаў Шушкевіч. 1928 г.



И пусть мы трижды пропадём, и пусть я трижды пропаду,
Когда я песни для друзей на самом деле не найду.

Когда мы песни не найдём — найдёшь ли ты, добуду я ль,
Весёлой песни для друзей, которым сердца мне не жаль.

На колькі гадоў раней Таўбін напісаў па-беларуску прысьвечаны З. Астапенку шчымлівы верш «Ты помніш», які выбраў Лявон Вольскі, зрабіўшы зь яго песьню для праекту «(Не)расстраляная паэзія»:

Нячутна шамацела лісьце,
Саткалі зоры з срэбра ніць...
У тую ноч мы пакляліся
Жыць і любіць...
Любіць і жыць.

І мы жылі... І мы любілі...
І несьлі прагу і любоў...
Часы дзяціных сноў-ідылій
Да нас ня вернуцца ізноў...

На фоне шматлікіх вершаў, прысьвечаных сябрам і сяброўству, кідаецца ў вочы адсутнасьць у Таўбіна любоўнай лірыкі. Не бяруся судзіць аб прычынах, але адрасатак вершаваныя творы паэта практычна ня

маюць. З адным выключэньнем. «Апрача вершаў, — згадвае пра Таўбіна Максім Лужанін, — ён прывёз зь Цюмені дзьве паэмы: „Міхайла“ пра Ламаносава і „Асада“ з часоў грамадзянскай вайны… Абедзьве рэчы, як прызнаваўся ён аднойчы, былі напісаны, бо даглядала яго добрая жаноцкая душа, актрыса мясцовага тэатру, дзе ён працаваў заглітам. Можа, у гэтай сяброўкі паэта засталося і яшчэ што з твораў яго. На жаль, мы не спыталіся ні яе імя, ні прозьвішча». Відавочна, ёй прысьвечаны і верш, які паэт спрабуе надрукаваць незадоўга да арышту ў часопісе «Октябрь»:

Ці ты помніш зарослую сажалку, на пагорку дамок-церамок,
Крыкі пеўня на золку паўсонныя і смалярні суседняй дымок?

Гарадок быў ня першае велічы, ды ня горшы ад іншых наўкруг.
Ад вакзалу чатыры аўтобусы йшлі да прыстаняў — транспартны рух!

Цэлы сьвет уяўлялі мы цацачным, бо любілі з пагорка глядзець
На пакгаўзы, на чоўны з баркасамі, параходы, старую мячэць.

Мы тварылі ва ўбогім тэатрыку. Жартавалі, што меншых няма.
Выканкам гэтак шчодра падтрымліваў, што артысты рыдалі рыдма.

Касьцюмэрка ўпадала ў гістэрыку і суфлёр надрываўся з дупла,
Валасы рваў загадчык ад роспачы… Безнадзейная справа была!..

Толькі справа была даспадобы нам, мы глядзелі з грымэркі ў партэр.
За сэзон мы на ногі паставілі паўнавартасных восем прэм'ер.

Ты зьбягала са сцэны з букетамі, а мастацкага кіраўніка
Ўшанавалі вайсковаю граматай ад імя камандзіра палка.

Нас любілі старшыні калгасныя, забіралі ў гастрольны прыгон:
Хлестакова кармілі яечняю, меў гарэлку скупы Гарпагон.

А пасьля мы з табой разьвіталіся, разьляцеліся, як вераб'і.
Мне пісалі, ты зоркай зрабілася ў Кабардына-Балкарскім краі.

Што там вершы? Бясплодныя выдумкі. Сьвет важнейшы ад нашых папер.
Выкананьня ўсіх мрояў, як некалі, пажадаю табе і цяпер.

Рэжысэраў ня вельмі прыдзірлівых, каб крыві не псавалі яны.
Доўгіх дзён і ўсялякае радасьці, і каханьня да самай труны.

(Пераклад з расейскай мой. — А. Х.)

Верш ня быў надрукаваны, а супрацоўнік часопісу абмежаваўся такой паблажлівай адпіскай, артаграфія захаваная:

«Уваж. т. Таубин

Ваше стихотворение мало художественно. Это, в сущности, безискусственное описание некоторых биографических частностей, при чем перечисляемые факты лишены широкого значения и вряд ли вообще интересны кому нибудь, кроме адресата.

Юлі Таўбін (крайні справа) на высылцы ў Цюмені, 1935 г. Побач — сябры Аляксандар Кучынскі і Зьмітрок Паваротны



Ни обобщающих образов, ни ярких красок, ни сильных чувств — ничего этого здесь нет. Собственно, от поэзии здесь только рифма. Уберите ее — и получится самое обыкновенное письмо. Поэзия требует высокого напряжения мыслей и чувства, ярких действенных средств выражения, неустанной работы над собой. Без этого стихи мертвы и скучны

Литконсультация „Октября“

Вс. Лобода».

Другая выразная рыса Юлія Таўбіна — яго **ўрбанізм**. На фоне тагачасных беларускіх аўтараў Таўбін — бясспрэчна гарадзкі паэт. Ён не гадаванец вёскі, які асьцярожна адкрывае для сябе горад. Наадварот, горад камфортна пачуваецца ў таўбінскіх вершах ужо ад моманту старту. Спачатку ў нечым правінцыйны, але бязьмежна дарагі й тонка дэталізаваны Амсьціслаў, потым — менскія ўрбаністычныя краявіды. *«І ля бліжняй да нас трансфарматарнай вежы / Электрычных праменьняў дуга»*. Горад найбольш цікавіць паэта ў яго памежных, пераходных станах. Раніца і асабліва гарадзкі вечар, як некалі ў Бадлера, — сталы прадмет натхненьня і ў нашага аўтара.

Даверлівы — зусім ня скептык —
Ўсяму я веру, ўсё цаню...
Як толькі ноч накіне кепку,
Лаўлю і шум, і цішыню.
<...>
Завулкаў ціш і вуліц шумы,
Недатыкальнай сіні гладзь,
І гэты дом, і сіні нумар,
На ім:
16/45.

Вёска ж — хутчэй прадмет стылізацыі, эпізадычны досьвед. Тут Таўбін — збольшага ў гасьцях. Цікава, што паэт, зрабіўшы крок у бок вёскі, сустракаецца зь Міхасём Стральцовым, які празь дзесяцігодзьдзі прагне прымірыць горад і вёску ў вобразе «сена на асфальце». У Таўбіна — «сялянская фурманка на гарадзкім бруку»:

І вось яна мінае
Манто і паліто,
Спакойныя трамваі
І дзёрзкія аўто.

І ў вуліц ліхаманку,
І ў сьпёку, ў пыл і дым
Імчыць мая фурманка
Па бруку гарадзкім.

Яшчэ адна важная рыса творчасьці паэта — яго **культурацэнтрычнасьць** (у спалучэньні з фантастычнай **віртуознасьцю**). Юлі Таўбін — паэт надзвычайнай культуры, вельмі глыбокай начытанасьці, таленавіты паліглёт, што чытаў розныя літаратуры ў арыгінале, а таму самім характарам свайго таленту — літаратурацэнтрычны аўтар.


«У Таўбіне, — успамінае Максім Лужанін, *— клекатала нястрымная прага тварыць. Невысокага росту, кучаравы, з таўставатымі „пушкінскімі" губамі, ён увесь час варушыў імі. Нешта расказваў, чытаў свае і не свае радкі, нават сьпяваў, выдумляючы словы й матывы». «Разумны, на той час, можа, самы культурны чалавек у нашым асяродзьдзі, ён жыў кнігаю... Прыходзіў дамоў, чытаў уголас сваё і чужое, забываючы, што астывае шклянка чаю... Божа мой, колькі ўсяго ведаў на памяць Юлька, як усе называлі Юлія Таўбіна! Не тамы, не паліцы, а цалкам бібліятэкі. Да самазабыцьця мог чытаць чые-небудзь вершы ноч давідна і так жа натхнёна і лёгка пераходзіў на ўласную імправізацыю...»*

«Пухлагубы Юлі Таўбін, — згадвае Аляксей Зарыцкі, *— быў увесь ва ўладзе паэтычнай стыхіі. Ён то пісаў свае вершы, то ў вольную хвіліну паціху напяваў на розных мовах чужыя, і так у старасьвецкім доме на менскай ускраіне гучалі строфы то Купалы і Багдановіча, то Пушкіна і Міцкевіча, то Бэранжэ і Вэрлена, то Байрана і Шэлі, то Шылера і Гайнэ... Тут не было імкненьня паказаць сваю надзвычайную вучонасьць і начытанасьць. Не, аніяк не! Проста радкі й строфы любімых паэтаў зрабіліся арганічнай часткай духоўнага сьвету Таўбіна, увайшлі ў кроў і плоць, і ўслухоўвацца ў іхнае гучаньне стала ў юнака-паэта неадступнай жыцьцёвай патрэбай...». І яшчэ: «Таўбін чытаў нам вершы нямецкіх, французскіх і ангельскіх паэтаў. Звычайна свае і чужыя вершы ён чытаў спакойна і ня вельмі выразна — нарасьпеў, часам нават мармычучы. Але калі пачынаў чытаць вершы свайго любімца Вэрлена, то вокамгненна рабіўся нейкім іншым, не падобным да сябе. Ён ускокваў на расхістаны табурэт і пачынаў чытаць выразна і зычна, падмацоўваючы натхнёнае чытаньне мімікай і жэстыкуляцыяй».*



Юлі Таўбін. Цюмень, 1935 г.

Вось жа няма чаму дзівіцца, што скразны ў творчасьці Таўбіна — вобраз паэта, які стварае паэзію пра саму паэзію, якую да яго стваралі іншыя паэты, і гэта не таўталягічнае «масла масьленае», а сьвядомы творчы прынцып! Што аўтар мог закончыць свой верш пачаткам Шылеравай п'есы «Падступнасьць і каханьне»:



Вокладка кнігі Юлія Таўбіна «Тры паэмы: Райком. Свэаборг. Гарадок». Менск: Белдзяржвыдавецтва, 1931 г. Мастак ня вызначаны

«Einmal für allemal» (*«Раз і назаўсёды»*). Што ў вершы «Вячэрнія радкі» ён размаўляе са шматлікімі паэтычнымі папярэднікамі: *«От, я чую гоман оды, / Мяккасьць плаўную элегій, — / То сышліся карагодам / Паэтычныя калегі. // Гэты — з арфай, гэты — зь лерай, / Той зь пяром гусіным з намі, / Гэты — зь белаю паперай / І алоўкам фірмы „Hammer“»*. Гэта і Андрэ Шэнье, што гіне на гільяціне, і Тарквата Таса, і Пушкін з Багдановічам, і французскі паэт эпохі барока Сырано дэ Бэржэрак, які аж двойчы ўрываецца ў творчасьць Таўбіна, рытмікай і вобразнасьцю як бы абяцаючы будучыя баляды Караткевіча: *«За мною з палаца імчалі ганцы, / Я шпагаю іх калоў... / І ведаў я многа прыгожых жанчын, / А болей — прыгожых слоў»*.

З часоў Арыстотэля нас вучылі, што жыцьцё *über alles*, а мастацтва — толькі яго перайманьне. А тут сама рэчаіснасьць бачыцца праз прызму мастацтва, і яшчэ невядома, што зь іх больш рэальнае: *«Трамвай праляцеў, як двухстопны анапэст, / І іскры дрыжаць за вакном»*.

Што да віртуознасьці, то Юлі Таўбін далёка пераўзыходзіў амаль усіх сучасных яму аўтараў (дый сёньня пераўзыходзіць большасьць нашых паэтаў) у фармальнай вынаходлівасьці, рытмічнай гнуткасьці, інструмэнтаваньні радка. Эвалюцыю аўтара можна акрэсьліць так: ад вучнёўства ў Пушкіна праз уважлівае чытаньне эўрапейскай паэзіі (найперш Гайнэ) да экспэрымэнтаў у духу Маякоўскага і канструктывістаў.

У найлепшых раньніх, умоўна кажучы, ***«пушкінскіх»*** вершах мы знойдзем ураўнаважанасьць і ляканічнасьць, ледзь заўважную іранічную дыстанцыю і трапнасьць у выбары канкрэтнай дэталі. У пазьнейшы, ***«маякоўскі»***, пэрыяд адбываецца пераход да акцэнтнага, танічнага верша, нарастаньне экспрэсіі, ускладненьне строфікі, экспэрымэнтальная рыфма, пэўная кідкасьць, плякатнасьць; верш разьлічаны на вусную дэклямацыю, на чытаньне-«пэрформанс». На ўзроўні графікі — характэрны для тых часоў запіс «лесьвічкай». Апошнюю тэндэнцыю ілюструюць «антыамэрыканскія» вершы Таўбіна: «Злучаныя Штаты», «Праклён», «Каляндар». Па-сацыялістычнаму каньюнктурныя, яны разам з тым дэманструюць неймавэрную фармальную вынаходлівасьць (аўтар увесь час імкліва разьвіваецца як паэт) і непадробную жарсьць. Нават ствараючы верш на сьмерць Маякоўскага, разьвітваючыся з кумірам і апанэнтам, паэт «шукае трэцяга» — літаратурнага пасярэдніка, амэрыканца Ўолта Ўітмэна, што дапамагае яму зьвярнуцца да расейскага самагубцы як да аднаго з «Таварыства мёртвых паэтаў»:


Вы жыцьцю аддаліся суздром,
Лупцавалі пясьнярыкаў куцых,
У асілкавым патасе строф
Вы падслухалі шум рэвалюцыі. (...)
З Вамі разам мы будзем вітаць
Нашы новыя вёсны і ранкі...
. . . . . .
Капітан, капітан, капітан!
. . . . . .
У газэтах жалобныя рамкі...

Але наймацней тэма сьмерці праходзіць у паэта праз «яўрэйскія» вобразы. Наагул, **яўрэйская** тэматыка ў Таўбіна вартая спэцыяльнага грунтоўнага вывучэньня. Найбольш яскрава яна выяўлена ў вялікай паэме «Таўрыда», апублікаванай у 1932 годзе асобнаю кнігаю. З таго часу большасьць яе фрагмэнтаў не перавыдавалася (надта ж нязручныя для савецкіх часоў!). Кампазыцыйным ключом да паэмы можа служыць «Боская камэдыя» Дантэ зь яе падзелам песень на тры часткі: «Пекла», «Чысьцец» і «Рай».

Пра невыпадковасьць паралеляў з Дантэ могуць казаць згадкі Максіма Лужаніна: «За кароткі час свайго жыцьця ў Маскве ён значна пасунуўся наперад у мовах. Аднойчы, нібыта жартам, пахваліўся, што тыдні за два пачне чытаць і перакладаць з італьянскай. Гаворка забылася. Але... зьявіўся ў падмаскоўны пасёлак, дзе мы мелі прытулак у халодным пакойчыку недабудаванага дома. Прынёс томік у скураным пераплёце і з парога, не распрануўшыся, пачаў чытаць Дантэ».

Жахлівыя пагромы ў Расейскай імпэрыі пачатку стагодзьдзя — як яшчэ мог уяўляць сабе ня-дантаўскае ***пекла*** яўрэйскі паэт, якому ня суджана было дажыць да Галакосту?

Пагром пачынаецца так:
на рынку
п'яны салдат, невядомы нікому
(падрана кашуля,
ў крыві барада ўся),
крычыць:
«апо-ошнюю...
хлеба...
скарынку...
апошнюю...
хлеба...
і тую абважылі хрыстапрадаўцы!..»




Вокладка зборніку Юлія Таўбіна «Мая другая кніга». Менск: Белдзяржвыдавецтва, 1932 г.



Вокладка кнігі Юлія Таўбіна «Таўрыда». Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1932 г. Мастак Мэер Аксэльрод

Ролю *чыстца* выконваюць эпізоды, зьвязаныя з эміграцыяй у Амэрыку часоў Першай усясьветнай вайны. А потым, зразумела, савецкі ***«рай»***, а калі трохі канкрэтней, то заплянаванае Сталіным масавае перасяленьне яўрэяў у Крым. Такая сабе яўрэйская калектывізацыя. Вядома, што Таўбін ня першы, хто карыстаўся такой аналёгіяй. І Бальзак сваю «Чалавечую камэдыю», і Гогаль сваю паэму «Мёртвыя душы» плянавалі як трохчасткавы адпаведнік Дантэ. Вядома таксама, што ўсім ім «пекла» ўдавался лепш за «чысьцец», а паказ «раю» быў увогуле праблематычным. Ня стаў выключэньнем і Таўбін, чые «пекла» і «чысьцец» нашмат больш пераканаўчыя з мастацкага гледзішча за «яўрэйскі калгасны рай» у Крыме. Таму пакінем яго ў спакоі і лепей зьвернем увагу на фрагмэнт з другой часткі паэмы, з вобразам эмігрыйнага чыстца. Фрагмэнт разьвівае тэму, зь якой гэтая лекцыя і пачыналася:

Юлі Таўбін. Паэма «Таўрыда». Фрагмэнт рукапісу. 1931 г.


Дарога выходзіць,
Заходзіць дарога,
Радзіцца новае зерне з старога.
І новыя травы растуць на цмяху,
І новая хвалі турбуюць раку,
І новыя брэгі ўзьнімаюцца,
новыя краявіды
І песьня
выводзіць мяне пайлуку
Да жоўтага стэпу
Таўрэды.
1931

Капітан загарнуўся ў плашч.
(Моцны вецер яго прабраў...)
Ён ня чуе, як ціхі плач
падымаецца з морскіх траў.

Ён ня бачыць,
як дзіды рук
расстаўляе над морам сьмерч, —
як вядзе гэты дзікі рух
маладая красуня —
Сьмерць.

Натуральным працягам уласьцівых Таўбіну тэмаў і матываў ёсьць і ягоныя пераклады. Сярод іх — і колькасна, і якасна — вылучаюцца пераклады позьняга нямецкага рамантыка Гайнрыха Гайнэ, бадай што самага ўлюбёнага Таўбінам заходнеэўрапейскага творцы. Паэт ня быў першым, хто пераствараў Гайнэ па-беларуску (раней было некалькі перакладаў Максіма Багдановіча), але таўбінскія вэрсіі — безумоўная ўдача, бо адначасова перадаюць дух нямецкага арыгіналу і робяць уражаньне на беларускага чытача як выдатныя паэтычныя творы. І, вядома ж, справа найбліжэйшага часу — уключэньне іх у том як належыць падрыхтаванага «Выбранага» Гайнэ. Магчыма, самым хрэстаматыйным зь перакладзеных Таўбінам вершаў ёсьць гэты:

ЛЁРЭЛЯЙ

Ня ведаю, што за насланьне,
Што сумныя думы мае...
Старое апавяданьне
Быту мне не дае.

Сьвяжэе... цямнее ў прасторы...
Спакойна на Рэйне... Ўгары
Іскрацца высокія горы
Агнямі вячэрняй зары.

Цудоўная паненка
Сядзіць там ля самых нябёс.
Зіхціць залатой сукенкай,
Расчэсвае золата кос.

Залатым грабянцом яна іх
Расчэсвае, песьню пяе —
Моцная і дзіўна́я
Мэлёдыя яе.

Плыўца на чаўне памалу
Агортвае дзікай тугой.
Ня сочыць ён рыфы і скалы,
Ён сочыць за дзеўчынай той.

Я бачу — ўжо хвалі ўзгралі...
Плывец, навекі бывай!..
І гэта сваёю песьняй
Зрабіла Лёрэляй.

Але тэмы каханьня й сьмерці маглі вырашацца нямецкім паэтам па-іншаму. З уласьцівымі яму іроніяй і чорным гумарам. І менавіта гэтым інтанацыям, здаецца, Таўбін-перакладнік дае рады найлепш. Настолькі, што некалькі перакладаў з «іранічнага» Гайнэ як невялічкі асобны разьдзел увайшлі ў нядаўняе выданьне арыгінальных вершаў Юлія Таўбіна. Напрыклад, такі:

ЖАНЧЫНА

Было ў іх каханьне бязь меж, бяз дна,
Ён злодзеем быў, была шлюхай яна —
Як з поўным вяртаўся ён мехам —
Яна памірала са сьмеху.

Нуда не ступала да іх на парог,
Яна засынала ў яго на грудзёх,
А як павялі яе ўцеху —
Яна памірала са сьмеху.

Тады перадаў ён: «Прыйдзі да мяне,
Мне горна, мне цяжка ў праклятай турме.
Я клічу цябе, маю ўцеху...»
Яна памірала са сьмеху.

А шостай задушаны быў ён пятлёй,
А сёмай засыпаны быў ён зямлёй,
А восьмай за чаркай ягоная ўцеха
Бадай не памерла са сьмеху.

Незадоўга да апошняга арышту Таўбін паслаў у ленінградзкае аддзяленьне выдавецтва «Художественная литература» свае пераклады на расейскую мову ангельскіх і ірляндзкіх паэтаў — Ў. Б. Ейтса, Альфрэда Гаўсмана, Гілбэрта Кіта Чэстэртана ды іншых. Празь недагляд цэнзуры яны выйшлі ў кнізе «Антология новой английской поэзии», якая зьявілася праз 20 дзён пасьля сьмерці паэта. Вершы, якія Леанід Маракоў назваў голасам з таго сьвету. Быў сярод перакладаў і Ейтсаў твор «Ружы», трагічны й сам па сабе, напісаны пасьля разгрому дублінскага паўстаньня і расстрэлу яго кіраўнікоў, сярод якіх былі Джэймс Коналі і Патрык Пірс.

«Слова — пустое дело! —
Так Пирс проговорил. —
Не жар ли благоразумных слов
Нашу розу иссушил
Иль, может, ветер из-за горького моря
Повинен в этом был?»

— «Ее полить только надо, —
Джеймс Конноли в ответ, —
И куст зазеленеет
И выбьется на свет.
И будет славой сада
Прекрасной розы цвет».

Но Пирс ему на это:
А воду где возьмем?
Иссякли все колодцы,
Жара стоит кругом.
И только нашей кровью
Мы розе жизнь спасем.

(пераклад Юлія Таўбіна)

«На вецер, — кажа Патрык Пірс, —
Ляцела слоў так шмат,
Што горкі вецер высушыў
Ірляндзкіх ружаў сад,
Яго зялёныя лісты
Ня вернуцца назад».

«Наш сад, — сказаў Джэймс Коналі, —
Зазелянее зноў,
Давай старанна паліваць,
І ружу нашых сноў
З табой наяве вырасьцім
Для дочак і сыноў».

«А дзе нам, — кажа Патрык Пірс, —
Узяць вады, калі
Засохлі ўсе калодзежы?
Каб ружы расьцьвілі,
Палітыя, нам трэба кроў
Аддаць сваёй зямлі!»

(пераклад Андрэя Хадановіча)

Далучаю й свой пераклад «Ружаў» — як даніну памяці яго першага беларускага (хай сабе й расейскамоўнага) перакладніка. З надзеяй, што неўзабаве ня толькі вершы, але і паэтычныя пераклады Юлія Таўбіна будуць належным чынам апублікаваныя, ацэненыя чытачамі — і ўвойдуць у літаратурны ўжытак:

Літаратура

Таўбін Ю. Агні. — Мн.: БДВ, 1930.

Таўбін Ю. Каб жыць, сьпяваць і не старэць... — Мн.: БДВ, 1931.

Таўбін Ю. Тры паэмы. — Мн.: БДВ, 1931.

Таўбін Ю. Мая другая кніга. — Мн.: ДВБ ЛіМ, 1932.

Таўбін Ю. Таўрыда. — Мн.: ДВБ ЛіМ, 1932.

Таўбін Ю. Выбраныя вершы. — Мн.: Дзярж. выд-ва БССР, 1957.

Таўбін Ю. [Паэзія.] — Мн.: Беларусь, 1969.

Таўбін Ю. Выбранае. — Мн.: Зміцер Колас, 2017.

Бярозкін Р. Голас маладосці // Таўбін, Ю. [Паэзія]. — Мн.: Беларусь, 1969.

Бярозкін Р. Пра Юлія Таўбіна // Кніга пра паэзію: Літаратурна-крытычныя артыкулы. — Мн.: Маст. літ., 1974.

Жыбуль В. Юлі Таўбін — паэт вечаровага задумення // Роднае слова. 2011. № 9.

Зарыцкі А. Жылі-былі паэты // За словам-падарункам: Успамін, крытычныя артыкулы, нарысы. — Мн.: Маст. літ., 1985.

Ліхадзіеўскі С. Поэзія Юлія Таўбіна // Полымя. 1931. № 9.

Лужанін М. Юлька і Змітрок // Лужанін, М. Трое: Аповесці, апавяданні, эсэ. — Мн.: Маст. літ., 1989. С. 389–395.

Маракоў Л. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі, 1794–1991: Энц. даведнік. У 10 т. Т. 2. — Мн., 2003.

АДКІНУЎШЫ ФІРАНКУ

Адкінуўшы фіранку,
Гляджу праз пыл і дым, —
Сялянская фурманка
На бруку гарадзкім.

Вітрыны, і афішы,
І коміны ўгары...
Паветра дымам дыша,
Ў паветры дым і крык.

І вось яна мінае
Манто і паліто,
Спакойныя трамваі
І дзёрзкія аўто.

І ў вуліц ліхаманку,
І ў сьпёку, ў пыл і дым
Імчыць мая фурманка
Па бруку гарадзкім.

Жнівень 1929

ТЫ ПОМНІШ

Зьм. Астапенку

Ты помніш, помніш, безумоўна,
І тую ноч, і той настрой,
Што панаваў над намі роўна, —
І над табой, і нада мной...

Драты дрыжалі пераборам,
Аб нечым дзіўным месяц сьніў,
І рысы даўняга сабора
Так чотка млелі ў вышыні.

Нячутна шамацела лісьце,
Саткалі зоры з срэбра ніць...
У тую ноч мы пакляліся
Жыць і любіць...
Любіць і жыць.

І мы жылі... І мы любілі...
І несьлі прагу і любоў...
Часы дзяціных сноў-ідылій
Да нас ня вернуцца ізноў...

Жыцьцё далей нас весьці стане,
Надорыць новых песень-дум,
І мужнай сталасьці жаданьні
На нас пячатку пакладуць.

А ўжо ня вернецца з гадамі
Ні тая ноч, ні той настрой,
Што панаваў тады над намі —
І над табой, і нада мной.

Ліпень 1929, Амсьціслаў

* * *

Даверлівы — зусім ня скептык —
Ўсяму я веру, ўсё цаню...
Як толькі ноч накіне кепку,
Лаўлю і шум, і цішыню...

Мне ўсё тут люба...
Ўсё знаёма —
Будынку даўняга фасад...
Ў забытым садзе — патаёма
Так хітра сплеценых прысад...

Завулкаў ціш і вуліц шумы,
Недатыкальнай сіні гладзь,
І гэты дом, і сіні нумар
На ім:
16/45.

17.08.1929, Амсьціслаў

ЛІРЫЧНАЕ ХВАЛЯВАНЬНЕ

Так вечар прыходзіць лірычнаю зданьню,
Балядным героем — сьпявакам старым...
Лірычнае хваляваньне
Праходзіць, як вецер, па сэрцы маім.

Ўрачыстыя оды скандуючы, вербы
Схіляюцца каля варот
І шэпчуць: «Пішы без хлусьлівых гіпэрбал,
Пішы без узвышаных троп».

Паперу — на зэдлік... Пяро — на канапе...
Душа разагрэта вячэрнім агнём.
Трамвай праляцеў, як двухстопны анапэст,
І іскры дрыжаць за акном.

Я зь вершам праходжу жыцьцёвыя тракты,
Я зь вершам — і ў крозах, і ў сьне...
Харэі і ямбы, і пругкія дактылі
Заўсёды на варце ў мяне.

Мы пройдзем супольна і будзем змагацца,
Супольна зьбіваючы кожны рыф —
І стромкія сьцены алітэрацый,
І ўзгоркі клясычных рыфм.

Так вечар праходзіць, так сунецца раньне,
Змываючы з захаду грым.
Лірычнае хваляваньне
Заўсёды, як вецер, на сэрцы маім.

1929

СТАЛАСЬЦЬ

Рамантычная крыга растала,
Сьвет паўстаў без хлусьлівых акрас...
Надыходзіць сапраўдная сталасьць,
Па-сяброўску вітаючы нас.

Мы губляем зьбянтэжана зачур, —
Ён з паўночнай трызьні маладой
Запароскай пагоняй казачай
Ці вараскай узорнай ладзьдзёй.

Але нам адгукаюцца пеўні,
Узрываючы ў рань рэзананс —
Маладосьці, як вецер, няпэўнай,
Назаўсёды падведзен балянс.

Што ж...
Ня першых нас мары манілі...
Ўсіх нас лашчыла цёплая ноч.
Ў неспакойныя ветры і мілі
Мы трымаем старое стырно.

І бывай, паэтычная кволасьць, —
Ты прайшла, як навеяны сон...
Хай бяззубай рамантыкі голас
Пераправіць жывы мікрафон.

Мы жылі ды ўзрасталі нядарма.
І што можам аддаць — аддамо.
Наша сталасьць прыходзіць ударнай
Ад высокіх фабрычных дамоў.

Наша сталасьць — ад працы і боек,
Наша сталасьць — ад бацькаўскіх крат...
Яна ўвойдзе ў мой цесны пакоік —
Вартаўнік мой, і сябра, і брат.

За хвіліну яе не прыдбаеш —
Яна прыйдзе як плён маіх мук,
Баявая мая,
жывая,
Зь сілай думкі, з трываласьцю рук.

Бо ў даўгія працоўныя ночы,
У цяжкія ды ўпартыя дні
Набылі мы сапраўдныя вочы,
Адышлі ад дзіцячай трызьні.

Маладосьць наша крыгай растала.
Палюбілі мы сьвет без акрас.
Рэчаісная сьціплая сталасьць
Спатыкае настойлівых нас.

10.X.1930, Менск

ЗАНАТОЎКІ

Уладзімеру Хадыку

1

Кожны з маленства злучаны выракам,
А потым крывёю аплочвае чыншы.
На Беларусі зрабіцца лірыкам
Куды лягчэй, як чым-небудзь іншым.

Вагон прарываецца рыбай празь нерат,
Бярозы гальлём быццам б'юцца аб шыбы, —
І так мая лірыка рвецца наперад,
Як гэтая самая ў нераце рыба.

...З маленства з нас кожны злучаны выракам
І плоціць за вырак багатыя чыншы...
Гавораць, што жыць лірыкам,
Магчыма, цяжэй, як іншым.

2

Ёсьць на сьвеце лірычныя сьцюжы
(Іхны шлях — і няпэўны, і сьлізкі).
Калі ветры з кім-небудзь падружаць,
Пачынаецца гэта з калыскі.

Падарожныя думкі і зіркі —
У радках падарожных і ўзрушных.
Аглядаю удоўжкі і ўшыркі
Беларускія сьветлыя пушчы.

Трэба мераць на новыя меркі
Гэта поле і сьвежыя ветры...
У куфэрку кавалак паперкі
І лісты амсьціслаўскіх паэтаў.

Не зважайце на зблытанасьць сказаў —
Гэта пах цягніковага дыму.
Будзем жыць мы з радзімаю разам
Падарожнікамі маладымі.

3

Падарожным усё дазваляецца —
Можна зьбіць чытача з панталыку.
Гэты верш і вянок прысьвячаецца
Уладзімеру Хадыку.

Не зважаю на шэпты трывожныя:
Дзе галоўнае ў гэтым і колькі?
Занатоўкі мае падарожныя, —
Вось і толькі.

1930

ДУЖЫ ВЕЦЕР І МАЛАДЗІК З ГЁТЭВАЕ АПОВЕСЬЦІ

...Пачынаецца дужы вецер,
і гудзе тэлеграфны слуп...
Маладзік, як напудраны Вэртэр,
не знаходзіць месца на сьвеце
(набліжаецца дзень з далін),
але тут выступаюць вербы,
тут прыходзіць канец канцэрту,
яны робяць яму кавэрзы,
захапляючы ў цень галін...
Пачынаецца вецер сіберны,
і гудзе тэлеграфны слуп.
Тут канае сьлязьлівы Вэртэр,
заключыўшы законны шлюб.

А тымчасам —
дзікунскі вецер
з папуасавага Самоа́
дзьме ўва ўсе прасьветы на сьвеце,
і гудзіць на стале самавар...
...А тымчасам —
кіно адчынены
і афішы сьвішчуць — «анонс».
Вецер дзьме ў прасьветы і шчыліны,
вадзянымі сычыць рашчынамі,
ён гугнявіць —
восень прычынаю —
у яго «праванскі» пранонс.

А тымчасам —
        ў тэатрах душацца
і ўжо гнуцца крукі ад хутр...
Хоць маленькага б даць ім душцу
з асеньніх салоных віхур!

Вецер лашчыць і вецер ка́туе,
вецер-вораг і вецер-сябар.
Ён заставай застаўся за статуем —
у яго там лятучы штаб.

А тымчасам —
        аўто мільгалі,
пранасілі замежных гасьцей...
І хавалася ў сьценах сьцень...
Было неба чарней амальгамы,
шумы, шолахі, амаль гамы
паўнагучнымі галасамі
гаманілі часьцей, часьцей...

А тымчасам —
        кахалі,
                раджалі,
дапівалі старое віно,
паміралі;
з сусьветнага жалю
гулялі
ў дваццаць адно;
сьмяяліся,
        песьні склада́лі,
стаялі ў чарзе перад скла́дамі
па цукар ці па сандалі
ці па гумавыя прылады;
скакалі дваранскія вальсы
з жахліва сьмелымі па,
адпушчалі даўгія валасы
і марылі пра Рэйн ці По,
ці пра рэвалюцыю ў Валісе.
Ганьбавалі паэзіі спад,
сьпявалі на розныя галасы
адзін матыў —
                ці по-
мніце гэты час (ён нядаўні)?
...Вецер з баабабавага Самоа́...

Песьня перарастае складальнікаў,
песьня складаецца сама.

А тымчасам —
крывёю і потам —
Муляры клалі цэглы,
цесьляры дошкі цягалі,
печкуры бяз працы ня бегалі,
тынкары рабілі работу,
гарнякі падрывалі горы,
маракі ўзьляталі на мачты,
астраномы сачылі зоры,
інжынэры крэсьлілі хорды,
пекары пяклі хлеб нясмачны,
салдаты вартай пасталі,
маляры фарбавалі столі,
чыгуначнікі выпраўлялі саставы,
земляробы зямлю пераправілі —

Зь мяса, жалеза, сталі,
з глебы, дошак, стомы,
вады, паветра, гравію,
цэглы, цягліц, цела,
песень, прамоў, паперы —
з жывога і нежывога —

узьнялі высокія сьцены,
узьнялі высокую веру,
узьнялі ў высокую эру —
высокую эпоху!

. . . . . .

Пачынаецца
вецер
рэзкі,
аж гудзе тэлеграфны слуп.
Адчыняецца ў горадзе Менску
у царкве — чыгуначны клюб.

Маладзік —
старадаўні Вэртэр,
маладзік —
цукраваны торт —
ён зьбялеў, ён баіцца памерці,
бо дужэюць хмары і ветры,
але мы не баімся сьмерці —

гэта ўсё для эпохі першай
песень, рук і рэторт.

1930

ТАЎРЫДА

(Фрагмэнты з паэмы)

*

Пагром пачынаецца так:
на рынку
п'яны салдат, невядомы нікому
(падрана кашуля,
ў крыві барада ўся),
крычыць:
«апо-ошнюю...
хлеба...
скарынку-у...
апошнюю...
хлеба...
і тую абважылі хрыстапрадаўцы!..»

Тады —
у іншым канцы народу
чалавек з насунутым на вочы картузом
і сукаватым дубнячком —
пачынае разважаць
пра жыдоўскія ўціскі,
што ад іх усе нашы нядолі і нягоды,
што цар дазваляе сваім сыном
біць гэту нечысьць да самага скону,
хаты іх разьвеяць па сьвеце тлом.

Тады крычаць аднекуль зблізку:
— Бі
жыдоў
і сіцылістаў! —
Так пачынаецца пагром.

*

Яны нас уціскаюць, рабуюць усё чыста,
яны паўстаюць на бацюхну-цара...
— Бі
жыдоў і сіцылістаў!
— Ур-ра!

Грошы нам круцяць, жонак нашых ціскаюць,
кідаюць бомбы ў бацюхну-цара...
— Бі
жыдоў і сіцылістаў!
— Ур-ра!

Дзяцей нашых рэжуць і кроў п'юць міскамі,
просяць прыгону ў бацюхны-цара...
— Бі
жыдоў і сіцылістаў!
— Ур-ра!

Вось што мне сказаў анегдысь пан прыстаў:
«Беце іх у славу бога і цара!»
— Бі
жыдоў і сіцылістаў!
— Ур-ра!

<...>

*

А калі —
душаць цябе,
пачынаюць цкаваць, як шчанё,
Гвалцяць дачок тваіх,
забіваюць
сыноў тваіх —
Тады бацькаўшчына —
перастае быць бацькаўшчынай
І ходзяць кругі перад вачыма —
жоўтыя, жоўтыя...

А калі —
гоняць цябе, —
стагнаць пачынай?
З голаду памірай,
калі адмоўлена ў працы?
Хай тады тройчы праваліцца праклятая
бацькаўшчына!
Хай яна будзе для іншых ласкаваю
бацькаўшчынай!
Попел яе спапялі!
Схапі яе чорная немач!
І ўводзяцца ў слоўнікі
дзьве новыя грацыі —
«Імі»
і «Эмі».

Пакідаецца
ўсё роднае і блізкае,
наседжанае доўгімі гадамі...
Параход гутаецца, як калыска,
зь людзьмі, трубамі і вінтамі.

На палубе пасажыраў трэцяе клясы,
дзе куфэрак на куфэрку
і душа на душы, —
можна б аперціся на балясы,
але марская хвароба
не дае жыць.

Мілянскі шкляр,
схіліўшыся, шэпча:
«Santa Madonna!»
А-ах...
Га-ах...
Дзеці галосяць...
Лаецца капітан...
Лэйзэр,
сьціснуўшы скроні,
згадвае пра Ірэну
і як яго злопаў
добры Левіятан.

Людзі
нежывымі галасамі
расказваюць свае гісторыі —
усе яны падобны адна на адну...
Людзі
ляжаць
ад валасоў да пазногцяў хворыя...
Ці бачылі яны
вясну?

А з музычнага салёну
першае клясы
далятае...
Nocturno?
Вальс?
— Ня ўсё роўна...
Дзеці адной бацькаўшчыны,
дзеці адной клясы, —
радасьць
усьміхнецца вам
не ў шляхох вандроўных!

*

Толькі сонца праменьняў крыж
акуне ў акіянаў соль —
капітаны ідуць на брыдж
і ўзіраюцца на бусоль.

Як палошча дзікун-пасат
гумаваныя іх плашчы!..
Пасажыры глядзяць назад —
там іх бацькаўшчына ляжыць...

Вы, што сьлёз пралілі струмкі,
сьмерць пабачылі сам-насам, —
праваджаюць вас мерцьвякі
і ківаюць здалёку вам.

Выплываюць з-пад хваль густых,
наплываюць на параход...
Капітан, ты ня бачыш іх?
Капітан, паглядзі на ўсход!

Капітан загарнуўся ў плашч.
(Моцны вецер яго прабраў...)
Ён ня чуе, як ціхі плач
падымаецца з морскіх траў.

Ён ня бачыць,
як дзіды рук
расстаўляе над морам сьмерч, —
як вядзе гэты дзікі рух
маладая красуня —
Сьмерць.

<...>

16.VIII.1930 — 22.IX.1931
Ворша — Амсьціслаў — Менск

ЗЬ НІЗКІ «СЬМЕРЦЬ»

1

Калі я буду паміраць
і рабіцца дакучным целам...
А я хачу, каб гэта было ня хутка, — таму
Я цяпер хачу жыць, жыць, —
жыць жыцьцём, аднаму мне зразумелым,
Жыцьцём, уласьцівым толькі мне аднаму.

Бачыць, як сонца сьмяецца на брудным акне,
Акунаць сваё цела ў халодныя ўлоньні рэчак,
Плысьці на моры ў рыбачым чаўне,
Хадзіць па полі сярод цнатлівых грэчак.
Я хачу спатыкаць сяброў і таварышак,
маладых і сталых;
Хачу даверлівых жаночых пацалункаў
і моцных поціскаў мужчынскіх рук,
Каб адчуваньне жыцьця ніколі мяне не пакідала, —
Поўнае і шматкаляровае,
як вясёлкавы паўкруг.
Я хачу наведаць аграмадныя гарады,
Далёкія краіны з мовамі чужымі, —
Я хачу,
каб сьвет
паветра,
сухазем'я
і вады
Жыў,
дрыжаў
у кожнай, самай дробнай маёй жыле.
Каб мяне хвалявалі
страты, здабыткі, разьвітаньні і стрэчы,
Каб я мог сказаць пра сябе:
«Я жыў, пакуль тэрмін мой не прайшоў...
Каб мяне праціналі сваёю магутнасьцю рэчы
Блізкіх маіх спадарожнікаў-таварышоў.
Хачу
жыць,
падаючы,
але не занепадаючы.
Высока паднятым сілай часоў,
здабыць сталае месца на гале зямной.
Ведаю свае заганы.
Але гэта — мая задача.
Мне —
дваццаць першы год.
Жыцьцё ня за, а перада мной».

1932

СЯБРАМ

(З расейскамоўных вершаў)

Я ў падарожжах паўжыцьця, я вандраваў за годам год,
На Поўначы, на Поўдні быў, глядзеў на Захад і на Ўсход.

Я па гарах і ў гушчарах вярсту адольваў за вярстой,
На караблі і па зямлі, і на кані, і пехатой.

Я добра ведаю Каўказ. Скалісты бераг, стромкі мыс.
Стаяла раньняя вясна, шумеў каштанамі Тыфліс.

Ня помню вуліцы, дзе жыў, але высока, угары, —
І на Давыдавай гары піў вінаградныя дары.

Там Ленкарань дастаць рукой, да Кабулеці пераход…
Я палюбіў цябе, Каўказ, калі было мне дваццаць год.

А потым плыў дванаццаць дзён, да дзірак зачытаў раман,
Каб на трынаццатую ноч убачыць Ціхі акіян.

На фіялетавых гарах японскі вырас кіпарыс,
А ля вакзалу на латках карэйцы прадавалі рыс.

Будыйскі кланяўся манах матросам нашым на рагу,
Я ж сябра-штурмана знайшоў… Цікава? Расказаць магу.

Бо ўсюды на зямлі я свой, учора, сёньня і пасьля.
Я ва Ўкраіне часты госьць, а Беларусь — мая зямля.

Ёсьць за Ждановічамі лес — зь ялінаў, хвой, ялінаў, хвой…
Там дабягае да слупа атавы жоўтае прыбой.

За слупам тым быў рыжы яр — асеньні вечар, шум лісьця́…
Там за сядзібай коней пас хлапчук зь мінулага жыцьця.

А потым рэйкі, рэйкі спрэс… Імжа, туманы і аер…
І я паволі прачытаў: «Rzeczpospolita — СССР».

Была рака, памежны гай, і ежа смачная была,
Калі з памежнікамі боршч мы елі з аднаго катла.

Я мераў зь імі супрацьгаз, а потым некалькі застаў
Уважна слухалі, *што* я па-беларуску ім чытаў.

Я ў падарожжах паўжыцьця, паміж балот, пяскоў і скал,
Я Захад ведаю і Ўсход, я знаю Нёман і Байкал.

Палякі, немцы, латышы — паўсюль шукаў я хараства.
А наастачу вам скажу: мне падабаецца Масква.

Па доўгіх вуліцах яе маторны вёз мяне трамвай,
Я тросься й рыхтаваў залік: тут ці здавайся, ці здавай!

У летні сквар ратуе парк. Залез пад душ, купіў сітро,
А потым — на Ахотны рад, і эскалятарам з мэтро...

Я вандраваў за годам год, я ў падарожжах паўжыцьця,
Я шмат народаў сустракаў і мовы розныя, хаця —

Як паліглёту ні вучы прыстаўкі, склоны, карані,
Найлепш умее размаўляць душа з душою ў цішыні.

Я многіх сустракаў людзей, і кожны меў даволі спраў,
Ды мне ўсьміхаліся, і я іх цеплыні часьцінку браў.

Кладуся спаць — а сну няма. І я на досьвітку пішу,
Каб песьня новая мая сагрэла хоць адну душу.

Бо што такое ў сьвеце я — і ты, мой сябра па пяры, —
Бяз файных песень, па якіх сумуюць нашыя сябры?

Бо разарвуся, ды знайду (а не знайду — зусім бяда!)
Вясёлых песень для сяброў, якім і сэрца не шкада!

1936
Пераклаў Андрэй Хадановіч



Віктар Жыбуль

лірык двух нараджэньняў




Зяма Півавараў

Піць
радасьць
хачу,
Як п’юць прыгаршчамі
бярозавік малыя дзеці



За сваё кароткае жыццё Зяма Півавараў пасьпеў выдаць усяго толькі адзін невялікі зборнічак вершаў — «Лірыка двух нараджэньняў». Асабісты архіў паэта не захаваўся, фатаздымкаў таксама засталося вобмаль: вядомыя толькі тры, адзін зь якіх — групавы. Даволі сьціпла выглядае і бібліяграфія ў даведніку «Беларускія пісьменьнікі». Да таго ж паловы газэтных нумароў з публікацыямі Зямы Піваварава проста няма ў беларускіх бібліятэках. Мала пра паэта напісана і ўспамінаў. Галоўныя біёграфы З. Піваварава — гэта ягоная сястра Ліза Піваварава і былы аднакурсьнік Станіслаў Шушкевіч.

Зяма (Залман Рувімавіч) Півавараў нарадзіўся 24 траўня (5 чэрвеня) 1910 г. у мястэчку Касьцюковічы Клімавіцкага павету Магілёўскай губэрні (цяпер горад у Магілёўскай вобласьці) у сям'і Рувіма Мэеравіча і Бэлы Залманаўны Піваваравых. Вядома, што маці была старэйшая за бацьку [16, арк. 1]. Акрамя Зямы, у сям'і была дачка Ліза 1912 году нараджэньня. Бацька працаваў шапавалам — вырабляў з воўны валяныя шапкі, капелюшы, валёнкі ды іншыя рэчы. У 1914 г. ён быў змабілізаваны на фронт, прайшоў Першую ўсясьветную вайну, потым ваяваў на расейскай грамадзянскай вайне ў складзе Чырвонай арміі, пакуль у 1918 г. ня быў забіты дзянікінцамі [8, арк. 20].



Зяма Рувімавіч Піваварў

Радзіўся ў м. Касьцюковічы
Маг. губ. у 1910 г. Маці
была старэйшая за бацьку.
Бацька быў мабілізаваны
і памёр на фронце грамадзянскай
вайны. Ліза (1912) і Зяма (1910)
засталіся без бацькі.
Маці зрабіла рукзак
з мяшка і пашла ў дзяду
у Чэрнікаў (цяпер Піваварава).
Былі цяжкія бальшавіцкія часы.
Дзеці ледзьве не
памерлі ад голаду. Пераляжалі тыфозныя
і адпусьцілі. Маці — бедная
Залманаўна Зяме і Лізе

З запісаў Станіслава Шушкевіча пра Зяму Піваварава. Аўтограф 1971 г.

Маці, ня маючы ніякіх сродкаў для існаваньня, мусіла выправіць дзяцей на выхаваньне да дзеда. Яна зрабіла зь меха заплечнік і пайшла разам зь дзецьмі пехатой у Чэрыкаў. На шляху іх падсьцерагала небясьпечная прыгода. Вось як яна апісаная ва ўспамінах Станіслава Шушкевіча — хутчэй за ўсё, са словаў або самога Зямы Піваварава, або ягонай сястры Лізы:

«Было гэта восеньню 1918 году. Чужая хата, ні дроў, ні хлеба. Маці пашыла зрэбную торбу, паклала ў яе ўсе пажыткі, і яны пакінулі роднае мястэчка Касьцюковічы, пайшлі ў далёкі горад Чэрыкаў. Выбоістая дарога. Навокал неспакойна. Уздоўж Сажа гойсае белагвардзейская банда.

У адным зь пералескаў на дарозе маці прысела пад дрэвам. Зь сястрычкай Лізай яны прытуліліся да сваёй карміцелькі й задрамалі. І раптам конскі тупат. Некалькі коньнікаў акружылі дзяцей і маці.

— А ну, вытрасай свае пажыткі, што там у цябе ў торбе?! — крыкнуў адзін з бандытаў.

На сырую мурожную траву высыпалася старая бялізна, акраец хлеба і дзясятак пасінелых бульбін.

— Куды накіроўваецеся?

— Да дзеда Піваварава ў Чэрыкаў, — адказаў напалоханы хлопчык.

— А што ў цябе тырчыць за плячыма? Скідай кашулю! — выкрыкнуў бандыт.

Хлопчык хуценька скінуў кашулю, а бандыт узмахнуў плёткай, ударыў і паімчаўся ў лес» [17, с. 2].



Вокладка часопісу «Беларускі піянэр» (1925, № 6), у якім дэбютаваў Зяма Піваварaў


Дзед будучага паэта, Мэер Піваварaў, быў даволі набожным юдэем, і ў якасьці настаўніка для Зямы і Лізы ён запрасіў старога яўрэя-талмудыста, які прыходзіў дадому і даваў навуку; потым дзеці пайшлі вучыцца ў Чэрыкаўскую сямігодку [16, арк. 2]. Паводле ўспамінаў сястры, Зяма быў вельмі здольны хлопчык. Ён паступіў адразу ў другую клясу, а па яе заканчэньні вытрымаў іспыты ў чацьвёртую [8, арк. 20]. Потым ён ужо ня меў магчымасьці пераходзіць праз клясу, бо, ня маючы сродкаў для існаваньня, даваў урокі малодшым дзецям, якія адставалі ў вучобе, і быў вельмі заняты грамадзкімі абавязкамі ў школе і піянэрскім атрадзе. Зяма і Ліза жылі разам з маці ў дзедавым доме да 1924 г., пакуль не знайшлі сабе асобнае жытло.

Пазьней маці, Бэла Залманаўна Піваварава, спрычынілася да калгаснага руху на Чэрыкаўшчыне. У 1927 г. камітэт беднаты выбраў яе старшынёю сельскагаспадарчай садова-агароднай арцелі («Эмес»), а ў 1930 г. гэтая арцель увайшла ў калгас. Тады, у часы калектывізацыі, над Магілёўскай акругай шэфстваваў вядомы машынабудаўнічы завод «Красное Сормово», які месьціцца і дагэтуль у расейскім Ніжнім Ноўгарадзе. Дванаццаць сармаўчан-«дваццаціпяцітысячнікаў» (рабочых, пасланых камуністычнай партыяй у вёскі) прыехалі кіраваць калектывізацыяй у Чэрыкаўскі раён. Слабодка Сталыпіна на ўскраіне Чэрыкава, дзе яны пасяліліся, была перайменаваная ў Сормава, а заснаваны там калгас атрымаў назву «Чырвоны Сормавец». Бэла Залманаўна Піваварава ўвайшла ў праўленьне гэтага калгасу, была актыўнай і адказнай працаўніцай, за што неаднойчы атрымлівала граматы за працоўныя посьпехі [8, арк. 20; 15, арк. 2–3].

У школьныя гады, у пятай клясе, Зяма Піваварaў і пачаў пісаць вершы. Цікаўнасьць да паэзіі зьявілася ў яго пад уплывам маці, якая добра ведала беларускую мову і народную культуру, была абазнаная ў вясковым жыцьці. Школьныя сябры з захапленьнем слухалі Зяму, калі ён выступаў на школьных вечарынах [8, арк. 20]. Ягоныя вершы спачатку рэгулярна зьмяшчалі ў насьценнай газэце, а потым і ў пэрыядычным друку. Яго першай публікацыяй стаў верш «Я піянэр і шчыра веру...» у менскім часопісе „Беларускі піонэр“, 1925, № 6.[1]

[1] Дзякую Вольфу Рубінчыку, які зьвярнуў маю ўвагу на публікацыю. — *В. Ж.*

Старонка часопісу «Беларускі піянэр» (1925, № 6) з дэбютам Зямы Піваварава.



№ 6 БЕЛАРУСКІ ПІОНЭР 21

НАШЫ ПОЭТЫ.

ГЭРЦОВІЧ.

* * *

Юныя дзеці,
Леніна ўнукі. Шмат нас як будзе на сьвеце—
Кончацца мукі.
Трэба цяпер нам вучыцца, трэба
Шчыра за працу—ўсім працаваць!
Толькі навукай зруйнуем мы неба,
Толькі з навукай жыцьцё будаваць.

З. ПІВАВАРАЎ (Чэрыкаў).

* * *

Я піонэр і шчыра веру,
Што блізка, блізка ўжо той час,
Калі Кастрычнік пераверне
Усіх паноў з зямлі зараз.
Тады прыгнечанаму люду
Настане вольнае жыцьцё,
Як ён пазбавіцца ад бруду
Паноў; іх вымяце сьмяцьцём...

Н. ШАКУН (Менск).

* * *

Нас ворагі ўсюды яшчэ абхінаюць,
Няшчасця нам хочуць, канчыны нам ждуць...
Ды нашых братоў комунараў замежных,
Як толькі сумеюць—гнятуць.
І кепска жывецца братом-комуністам
У Польшчы вар'яцкай. Чакаюць падмогу яны.
Ўжо хутка праб'е час вялікі расплаты,
Як рынем за межу ўсе мы...
Але-ж, каб змагчы нашых ворагаў-катаў,
Нам трэба вучыцца, і трэ' працаваць.
Дык дружна-ж у школу, за кніжку, таварыш!
Каб мог у змаганьні і ты памагаць.

сон. Быццам ён у ботах, у вопратцы і павадыром атраду. Спіць, а сьмех па'губах так і бегае, а потым, як закрычыць:

— Рыхтуйся, піонэрыя!.

Многа ён яшчэ чаго камандзерскага выкінуў. Але як прачнуўся, то нідзе нічога й ня было.

— Гэта ўсяго быў толькі сон,—загаварыў ціха Янка.

Пад паўдня Янка зноў пашоў у клюб і расказаў свой сон павадыру і ўсім піонэрам. Піонэрам стала Янку вельмі шкода, што ён гэткі бедны, бяз сьвіткі й чаравік. І вось на агульным зборы павадыр казаў піонэрам:

— Трэба дапамагчы Янку хто чым можа.

— Трэба, трэба!—падхапілі ўсе.

Янка павесялеў. Ніколі ён не сьмяяўся, а як вышаў з клюбу, дык засьпяваў і барджэй да хаты. Бег ён дадому з вялікаю радасьцю. Бацькі ў хаце ня было. Янка ня мог дачакацца таго часу, каб сказаць тату аб гэтым. Але хутка прышоў і бацька. Янка барджэй кінуўся да яго:

— Татка, татка! што я сёньня чуў!

— Што, сынок?—запытаўся ў яго бацька.

— Мне, татка, піонэры пашыюць боты!..

Ну, няхай. Падзякуем ім шчыра.

Доўга не прайшло часу як павадыр, ідучы па вуліцы, зайшоў да Янкі і сказаў:

— Ідзі, брат, у клюбе забяры боты, гатовыя купілі на тваю нагу.

Янка ад радасьці ня ўспеў і шапкі адзець —памчаўся да клюбу.

Цераз пяць хвілін Янка нёс у руках боты. Бацька, як толькі ўбачыў, вельмі-ж абрадаваўся.

— Ня верыў я, але цяпер убачыў, што ўсётакі беднаму чалавеку ўміраць ня прыходзіцца цяпер. Шчыры дзякуй ім, – гаварыў з прыемнасьцю бацька.

Хутка Янка стаў піонэрам, добрым і прыкладным. Янкаў бацька пачаў вельмі паважаць піонэраў, бо ён убачыў, што яны ня ворагі, а добрыя сябры для беднага чалавека і доўга з таго часу стараўся адгоджваць усім піонэрам за іх падарунак сыну Янку.

Піонэр *Алесь Баравік* (13 гадоў).

Але найбольш друкавалі юнага паэта калінінскія акруговыя газэты «Малады камуніст» і «Наш працаўнік». Некаторыя свае тагачасныя вершы Зяма падпісваў *«Піонэр Піваваравў»*, і іх можна назваць піянэрскімі ўва ўсіх сэнсах — і паводле зьместу, і паводле мастацкай якасьці: творы маюць яшчэ вучнёўскі характар і адлюстроўваюць тыповыя ідэалягемы, на якіх выхоўваўся тагачасны піянэр.

Як і многія іншыя прадстаўнікі тагачаснай літаратурнай моладзі, Зяма Піваваравў лічыў сваім паэтычным абавязкам выказваць у вершах радасьць: *«Больш ня будзе, больш ня будзе пана. / Будзем жыць цяпер мы без паноў»* (верш «Пастух», 1925); узносіць хвалу «кастрычніку сьмеламу» («Вер ты, сонца, верце, зоры», 1925); смуткаваць з нагоды сьмерці чырвоных правадыроў («На сьмерць М. В. Фрунзэ», 1925). Але часам сярод усёй гэтай поўнай схематызму рыторыкі прабіваліся парасткі цікавых вобразаў і параўнаньняў, якія сьведчылі, што Зяма Піваваравў ня быў пазбаўлены арыгінальнага таленту:

Шмат, ой шмат жа мы цярпелі,
Ці ведаў хто із нас жсыцьцё?
Наша моладзь толькі тлела,
Як акурак, кінуты ў сьмяцьцё [4, с. 2].
(«Вер ты, сонца, верце, зоры», 1925)

У 1927 г. Зяма закончыў Чэрыкаўскую сямігодку і паступіў вучыцца ў Амсьціслаўскі пэдагагічны тэхнікум. У гэты час ён пачаў наведваць Амсьціслаўскую літаратурную студыю пры Аршанскай філіі «Маладняку». З 13 студыйцаў 9, як і Зяма Піваварaў, былі студэнтамі тэхнікуму, 2 — студэнтамі пэдагагічных курсаў і яшчэ двое — вучнямі сямігодак. Студыя выдавала ўласны часопіс «Юнацкі кліч», які друкаваўся на машынцы. Напрыклад, у № 5 гэтага часопісу за 1928 г. зьмешчаныя вершы ўдзельнікаў студыі Зямы Піваварава, Зьмітрака Астапенкі, Сяргея Калугіна, Іларыёна Максімава, Юлія Таўбіна, Янкі Гоманава і Ганны Сапрыкі. Своеасабліваю штаб-кватэраю Амсьціслаўскай студыі быў дом Таўбіных, які часта ператвараўся ў штосьці кшталту літаратурнага клюбу. Нейкі час тут кватаравалі З. Астапенка і А. Куляшоў, часта бываў і З. Піваварaў. Як піша Л. Сідарэнка, «тут абмяркоўваліся новыя творы таварышаў, розныя літаратурныя навіны, пляны друкаванага на машынцы часопісу „Юнацкі кліч“. Спрачаліся пра паэзію і прозу, пра новыя кнігі беларускіх пісьменьнікаў, пра літаратурныя арганізацыі і плыні ў Беларусі, пра падзеі ў краіне, пэдтэхнікуме. Тут заўжды гучаў сьмех, было шумна, весела і цікава» [12]. У траўні 1928 г. студыя адзначыла трохгадовы юбілей выставаю выданьняў і літаратурнай вечарынай. «Перад студыяй паўстае задача выхаваць са сваіх шэрагаў некалькі таварышоў, якія працуюць у сучасны момант над прозай» [14, с. 119], — пісаў тады часопіс «Аршанскі Маладняк».

Літаратурная студыя шмат дала Зяму Піваварaву: яго радкі сталі больш адточанымі і дасканалымі, а тэматычны дыяпазон значна пашырыўся. Сярод іншага паэт зьвярнуўся і да яўрэйскай тэматыкі. Так, верш «Зь яўрэйскіх матываў» (1928) адрасаваны беларускаму яўрэю, які ў пошуках лепшай долі зьехаў у Амэрыку, але, на думку З. Піваварава, нічога добрага яго там не чакае — у адрозьненьне ад роднай Беларусі:

Алэйхем шолэм! ў вас там сьмерць і холад,
А ў нас вясновыя гараць агні.
Стаіць як велікан, як нейкі волат,
О Беларусь мая — Эрусалім!
Алэйхем шолэм! ў вас там сьмерць і холад [5, с. 6].



Удзельнікі літаб'яднаньня пры Амсьціслаўскім пэдагагічным тэхнікуме. Сядзяць (зьлева направа): Ігнат Сарочанка, Зяма Піваварaў, Янка Гоманаў; стаяць: Мікола Борданаў, Зьмітрок Астапенка. 1929 г.

А вось намеры яўрэяў зьяжджаць у Бірабіджан — цэнтар будучай Яўрэйскай аўтаномнай вобласьці СССР — З. Піваварaў сустракаў прыхільна:

Біра-Біджан на далёкім усходзе,
Біра-Біджан — гэта сінь васількоў.
У Біра-Біджане шчасьце знойдзеш
У гаворцы сталёвых сярпоў.
Там зязюля ізноў закукуе,
Закалышыцца сіняя гаць...
У нас на Беларусі будуюць,
І вам яшчэ шмат будаваць [15, с. 32].

Пазьней З. Піваварaў напіша станоўчую рэцэнзію на кінафільм «Шукальнікі шчасьця» пра яўрэяў-перасяленцаў, якія пераехалі ў бірабіджанскі калгас «Ройтэ фэлд» («Чырвонае поле») [7, с. 4].

Празаймаўшыся ў пэдтэхнікуме два гады, Зяма Піваварaў вырашыў, што, каб быць актуальным і запатрабаваным паэтам, трэба паглыбіцца ў рабочы асяродак. Ён кінуў вучобу і зьехаў у Ленінград. Аднак на заводзе месца яму не знайшлося, і Зяма ўладкаваўся качагарам на электрастанцыю. Пад уражаньнем ад сваёй працы ён напісаў верш «Качагар»:


Качагар!
зірні на сваю топку,
на чатыры футы
падымі ваду.
Засьмяесься
ўсьмешкаю салодкай,
што такі пажар
разьдзьмуў [15, с. 30].

У Ленінградзе Зяма Піваварaў далучыўся да мясцовага беларускага асяродку. Ён наведваў Беларускі дом асьветы, падтрымліваў кантакт зь Беларускім студэнцкім зямляцтвам, стаў сябрам Беларускай сэкцыі Ленінградзкай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў (ЛАПП). Кіраваў сэкцыяй таленавіты паэт Рыгор Папараць, у яе ўваходзілі Янка Шарахоўскі, Рыгор Баркан (Ліпнёвы), Барыс Пятроўскі, Зіна Кагановіч, Барыс Добкін, М. Зяньковіч, Б. Капылкоў. Плёнам дзейнасьці філіі стаў альманах «Цагліна ў падмурак» (1931), куды ўвайшлі тры вершы З. Піваварава. Адзін зь іх заканчваецца радкамі:

Я стаю...
І думак моцныя усплёскі
Ўзварушылі глыб
Юнацкае душы.
У разьбезе дзён
Я чую дзіўны лёскат,
У гэтым лёскаце
Хачу я жыць [15, с. 34].

У студзені 1931 г. паэт езьдзіў дэлегатам на «Тыдзень савецкай Беларусі», што праходзіў у Маскве. Там 5 студзеня ён разам зь іншымі беларускімі (А. Александровіч, П. Глебка, К. Крапіва, С. Фамін, М. Хведаровіч, І. Харык) і расейскімі (А. Жараў, М. Сьвятлоў, І. Уткін) паэтамі выступіў на сцэне клюбу Фэдэрацыі аб'яднаньня савецкіх пісьменьнікаў (ФОСП) з сваімі вершамі [10, с. 1]. Як пісаў С. Шушкевіч, у той самы дзень З. Піваварaву «выпала шчасьце пазнаёміцца зь вядомым рускім паэтам Мікалаем Асеевым. Асееў захапіўся творамі маладога паэта, шчыра павіншаваў яго з твор-

чай удачай і пераклаў некалькі яго вершаў на рускую мову. Адзін зь іх ён зьмясьціў у часопісе „Ленинград“, а астатнія — у газэтах» [17, с. 2]. У варыянтах біяграфіі З. Піваварава, напісаных С. Шушкевічам і Л. Піваваравай, згадваецца і канкрэтны верш, зьмешчаны ў часопісе, — «Гутарка з электраманцёрам» [16, арк. 3]. Аднак пошукі гэтай публікацыі ў часопісе «Ленинград» (выходзіў у 1930–1932 гг.) плёну не прынесьлі. Магчыма, пераклад надрукаваны ў нейкім іншым выданьні. Да таго ж у часопісе «Полымя» за 1934 г. напісана, што згаданы верш пераклаў не М. Асееў, а іншы расейскі паэт — Ільля Садоф'еў [2, с. 245]. Каб высьветліць, як жа там было папраўдзе, — патрэбныя дадатковыя пошукі. Але ў кожным разе Зяму Піваварава заўважылі вядомыя расейскія літаратары. Роля М. Асеева ў жыцьці З. Піваварава перакладамі не абмежавалася. Ён вырашыў пераканаць маладога паэта набыць вышэйшую адукацыю. І напісаў ліст вядомаму беларускаму празаіку і грамадзкаму дзеячу Платону Галавачу «аб тым, што трэба ўладкаваць З. Піваварава на літаратурную вучобу». Адрасат абраны невыпадкова: «Платон Галавач у той час выконваў абавязкі намесьніка наркама асьветы. Ён ужо быў заняты стварэньнем першай у Беларусі крытычна-творчай сэкцыі пры Вышэйшым пэдагагічным інстытуце імя Горкага» [17, с. 2].



Вокладка альманаху «Цагліна ў падмурак», у якім друкаваўся Зяма Піваваравў. Ленінград: Дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры, 1931 г. Мастак Уладзімер Качагура



Вокладка кнігі Зямы Піваварава «Лірыка двух нараджэньняў». Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1934 г.

У выніку Зяма Піваваравў у 1931 г. вярнуўся ў Беларусь і паступіў на літаратурны факультэт Беларускага вышэйшага пэдагагічнага інстытуту. Разам зь ім вучыліся Валеры Маракоў, Юрка Лявонны, Станіслаў Шушкевіч, Эдзі Агняцьвет, Сяргей Мурзо ды іншыя паэты. У гэты час ён друкаваўся ў часопісах «Маладняк», «Полымя», газэтах «Савецкая Беларусь», «Літаратура і мастацтва». У 1932 г. у друку анансаваўся супольны зборнік вершаў Ю. Лявоннага, З. Піваварава і С. Шушкевіча «Ордэр на заўтра» [3, с. 76], але ён ня выйшаў. Затое ў 1934 г. убачыла сьвет першая (і адзіная) пэрсанальная кніга Зямы Піваварава «Лірыка двух нараджэньняў».

Кніга складаецца з васьмі вершаў: «Лірыка двух нараджэньняў» (1933), «Мы — рабочыя-такеляжнікі» (1931), «Мэтрапалітэн» (1934), «Голад і цывілізацыя» (1933), «З гістарычных дат» (сьнежань 1931), «Гутарка з электраманцёрам» (1931), «Размова са швэдзкім майстрам» (1932), «Мінулае камандзіра» (1932).

Які сэнс укладзены ў назву кнігі? Вось эпіграф да аднайменнага верша: *«Ведаеце, таварышы? Я два разы нарадзіўся, і тое, што я ўступіў у калгас, зьяўляецца маім другім нараджэньнем (З выступленьня калгасьніка на сходзе калгасьнікаў)»* [6, с. 3]. Гэта верш пра чалавека, які выбірае свой далейшы шлях у няпростай гістарычнай сытуацыі:

Былі дарогі дзьве,
і сьцежкі дзьве,
Зь іх адна —
жабрацтва і нягод,
Другая парасткам
цягнулася к вясьне
На пакрыты золакам усход.
Стаяў.
Рукамі сьціснуў скроні,
Варажсыць пачаў
забабоннай варажбою —
На якой дарозе быць сягоньня?
І якой пайсьці цяпер хадою?
І вырваў я
пасьля даўгіх турбот
Сваё сэрца,
што старой крывёй атручана,
Кайстра жабрачая кінута ў брод,
Мне з другім жсыцьцём
спраўляць цяпер заручыны [6, с. 4–5].

У той час наваствораныя калгасы ўспрымаліся як штосьці прынцыпова новае і небывалае раней, зь імі — шмат у чым дзякуючы савецкай прапагандзе — зьвязвалася абнаўленьне вясковага жыцьця. Зяма Піваварaў сапраўды сутыкаўся з гэтаю зьяваю шчыльна: як мы згадвалі, ягоная маці была калгаснай актывісткай. Але ўсе астатнія творы, уключаныя ў кнігу, датычаць ужо не калгаснай тэмы, а іншых праяваў новай, сацыялістычнай (або наадварот — старой, „буржуазнай") рэчаіснасьці. Многія зь іх таксама прысьвечаныя тэме працы, будаўніцтва новага ладу, пераўтварэньня рэчаіснасьці.

У вершы «Мы — рабочыя-такеляжнікі» (прадстаўнікі гэтай прафэсіі падымаюць і перамяшчаюць грузы) чалавек атаясамліваецца з мэханізмам: *«Нашы атамы, / жсылы / ды нэрвы // Занадта / складаныя / камбайны. // Душа наросхрыст, / вэерам, // Але... / удумны, / важкі / рух. // І калі / не хапае / канвэерам, // Цісьнем / на канвэеры / ўласных рук»* [6, с. 8–9].

Верш «Мэтрапалітэн», напісаны пад уражаньнем ад будаўніцтва маскоўскага мэтро, перадае эўфарыю стварэньня новага сьвету і крушэньня старога: *«Скалатнула сталіца / пыл вякоў, // Мудры салют аддае Крамлю, / падняўшы грунт / мэтрапалітэнны, // І званы яе цэркваў / (сарака саракоў) // З гулам разьбіліся / аб зямлю, // Прадчуваючы гул / падземны»* [6, с. 11].

Верш «Голад і цывілізацыя» — пра нямецкую дзяўчыну Бэрту, працаўніцу ткальнае фабрыкі, якая вельмі хацела трапіць на пляж, але не магла, бо пляж — прывілея багацеяў: *«Пляж — / дачных цягнікоў лёт / шпаркі, // Пляж — / плаці за пляж / і нават за куфаль / халоднай вады, // Пляж — / бюргераў з загарэлымі / каркамі, // Пляж — / манаполія / сытае / грамады»* [6, с. 12–13]. Дзяўчыне нічога не застаецца, як набыць на рынку танную мазь для загару, якая назаўтра ж сыдзе «сухімі лішайнымі палосамі». Тут паэт нечакана перапыняе аповед і напаўняе фінал верша рэвалюцыйным патасам: *«Заўтра, / у прыступе гневу / штурмуючы неба, // Ад гострай нянавісьці / скрывіўшы рот, // На завулках і вуліцах / запытаецца / хлеба // Магутнымі залпамі / Рот Фронт! // Тонкая мода / цывілізацыі / таннай — // Цяжкі клумак / з пустымі рэчамі. // Стоп! / ня пройдзеш хадою / вульгарнай // Па рабочых / кварталах / Нямеччыны»* [6, с. 16–17].

У вершы «З гістарычных дат» асобнымі штрыхамі паэт паказвае жыцьцё «жабрачнага народу» «пад імпэратарскім ботам і цяжкай рэформай Сталыпіна» і адначасова грозіць пальцам ворагам СССР: *«Ім хочацца / закрэсьліць нас / на эўрапейскай / карце. // А мы / ў сталёвым гарце / будзем / на варце!»* [6, с. 21].

Герой верша «Гутарка з электраманцёрам» — чалавек, бясконца ўлюбёны ў сваю, здавалася б, мірную прафэсію: *«Я хачу, / каб мае правады / Загаварылі / мовай чалавечай»* [6, с. 22]. Аднак і тут на пярэдні плян выходзіць патас барацьбы з ворагам: *«А мы ўключым электраток, / А ты мне, дружа, дапамажы, / Каб электрычнасьці / кожны глыток / Нашых ворагаў / за-ду-шыў»* [6, с. 23].

Верш «Размова са швэдзкім майстрам» — пра будаўніцтва Асінстану (Асінаўскай электрастанцыі ў Аршанскім раёне), дзе працаваў пасланы швэдзкай фірмай «STAL» майстар, зь якім вядзе гутар-

ку лірычны герой. Распавядаючы пра посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, герой раіць іншаземцу: *«Майстра, будзьце нашым, / арыстакратычныя манеры / кіньце. / У вас засталася стакгольмскіх / звычак рэшта: / Гэта там / падкручваць можна / турбінны вінцель / З арыстакратычным, пагардлівым гэстам»* [6, с. 26–27] і ўшчувае яго за тое, што ён, магчыма, спаў, калі савецкія рабочыя пад кіраўніцтвам сакратара партыйнай ячэйкі ліквідоўвалі аварыю на станцыі.

Верш «Мінулае камандзіра» — пра былога шахтара з Макееўкі на Данбасе Пятра Кузьняцова (яму верш і прысьвечаны), які ў часе Першай усясьветнай вайны адмовіўся выконваць працоўны загад, пратэстуючы супраць цяжкіх умоваў працы і жаданьня гаспадара шахты «паболей вугалю… аддаць ненасытнай вайне». У фінале гучыць заклік перайсьці ад пратэсту аднаго рабочага да масавага страйку: *«Няма чаго / хлапцам гібнець / у дарозе торнай — / Праз пару дзён / на а-гуль-ную / забастоўку!..»* [6, с. 32]. Макееўка, пра якую пісаў З. Півавараў, у наш час апынулася ў складзе так званай «ДНР». Там па-ранейшаму здабываюць вугаль, але і сёньня ў шахтароў зьяўляецца шмат прычынаў для страйкаў, асноўная зь якіх — затрыманьне заробку на 4–6 месяцаў. І калі набраць у інтэрнэт-пошуку спалучэньне «Макеевка забастовка», то можна пабачыць мноства сучасных публікацыяў з загалоўкамі «В Макеевке от безысходности забастовали шахтеры», «В Макеевке боевики подавили бунт шахтеров» ды інш. Так верш, напісаны Зямам Півавараўым у далёкім 1932 годзе, нечакана стаў актуальным і ў наш час.

Кніга Зямы Півавараўа выклікала крытычны розгалас. Напрыклад, Пятро Хатулёў апублікаваў вельмі станоўчую рэцэнзію на яе. Ён напісаў, што «вершы З. Півавараўа, нягледзячы на ўсе недахопы, становяць сабой новае і сьвежае ў беларускай паэзіі». На думку крытыка, «калі адкінуць рыфмы і інтанацыйную расстаноўку слоў, унасьледаваную выключна ад Маякоўскага, мы атрымаем радкі блізкія да прозы, але маючыя сваю паэтычную сілу. <…> Асязальнасьць вобразу ствараецца праз параўнаньне духоўнага з паняцьцямі, узятымі з галіны матэрыяльнага і матэрыяльных працэсаў. <…> Псыхалягічны паказ прагнасьці да жыцьця і радасьці праз „асязальнасьць“, якая не ператвараецца ў самажыўнасьць, рэчавасьць — у сваім спэцыфічным для Півавараўа праяўленьні, вылучае паэта сярод іншых, робіць яго арыгінальным» [13].



Зяма Півавараў

Іншы крытык, Міхась Ларчанка (між іншым, будучы шматгадовы дэкан філфаку БДУ), палічыў рэцэнзію П. Хатулёва блытанай і хвалебнай («салаўіным тонам») і зазначыў, што яна можа толькі нашкодзіць маладому, здольнаму аўтару, «якому трэба не пачываць на ляўрах, а сур'ёзна і ўдумліва далей удасканальваць сваё майстэрства, вучыцца і вучыцца, каб даць сапраўды высакаякасныя і з мастацкага і з ідэёвага боку творы» [1, с. 3].

На кнігу таксама адгукнуліся літаратурныя крытыкі А. Баско і Саламон Левін. Апошні зазначыў, што ў З. Півавараўа «ёсьць свая творчая манера, некаторая арыгінальнасьць». Найлепшымі вершамі ён назваў «Лірыку двух нараджэньняў» і «Мы — рабочыя-такеляжнікі». Адзначыў уплыў Э. Багрыцкага, Б. Пастэрнака, У. Лугаўскога і асабліва У. Маякоўскага. Крытык пісаў:

> *«Разгледзеўшы вершы З. Півавараўа за апошнія гады, можна сказаць, што ён дасягнуў многага. У яго вершах зьявілася ня толькі актуальная тэматыка, новыя ідэі, новыя праблемы, але гэта ўсё пацягнула за сабой палепшаньне формы яго вершаў, новыя вобразы. Як пэўны мінус у творчасьці Півавараўа трэба адзначыць амаль поўную адсутнасьць паказу камсамолу. Гэты прабел у сваёй творчасьці паэт павінен у самым хуткім часе запоўніць. <…>*
>
> *Асабліваць большасьці вершаў Півавараўа заключаецца ў тым, што ён імкнецца даць рытарычную, аратарскую мову, але гэтая рытарычнасьць заўсёды зьвязана з пэўнай эмацыянальнасьцю. З. Півавараў імкнецца сваю паэзію наблізіць да добрай прамовы, прамовы эмацыянальнай, пераканаўчай. З. Півавараў піша свае вершы самымі разнастайнымі памерамі. І гэта ня дрэнна»* [2, с. 246].

Верш Аляксандра Пушкіна ў перакладзе Зямы Піваварава. Публікацыя выйшла ў газэце «Віцебскі пралетарый» 18 сьнежня 1936 г., калі Зяма быў ужо арыштаваны.



*) Дрэва атруты

Дэман

У дні, калі былі мне новы
Усе уражанні быцця—
Дзяўчыны позірк, шум дубровы
І ноччу спевы салаўя,
Калі ўзнёсласць і юнацтва,
Свабода, слава і любоў,
Калі натхнёнае мастацтва
Маю ўскалыхнулі кроў,—
У хвілі шчасця і надзеі
Самоту навявалі мне,—
Тады тайма суровы геній
Пачаў прыходзіць да мяне
І з кожнай стрэчай нашай новай
Яго усмешка у цішы,
Калючыя глыбока словы
Былі атрутай для душы.
Невычарпальнаю хлуснёю.
Заўсёды бога спакушаў,
Назваў цудоўнае маною,
Заўжды натхненнем пагарджаў.
Не верыў ён любві, свабодзе;
На свет з насмешкаю глядзеў—
І яе было таго ў прыродзе
Чаго-б уславіць ён хацеў.

Пераклаў З. ПІВАВАРАЎ.

(Пятро Хатулёў і Саламон Левін былі аднакурсьнікамі З. Піваварава ў пэдагагічным інстытуце і падзялілі з паэтам трагічны лёс: былі расстраляныя разам зь ім у адзін дзень, абодва пражылі толькі па 25 гадоў.)

У 1934 г. Зяма Півавараў закончыў інстытут і ўладкаваўся на працу ў рэдакцыю газэты «Чырвоная зьмена». Адбылася ў тым годзе і важная падзея ў асабістым жыцьці паэта: ён ажаніўся. Яго абраньніцай стала студэнтка Арцёмаўскага пэдагагічнага інстытуту Лілія Маркаўна Персіна родам з Данбасу (пасёлак імя Арцёма, Арцёмаўск, цяпер Кіпучае Луганскай вобласьці, Украіна). Закончыўшы інстытут у 1935 г., яна пераехала на сталае жыхарства да мужа ў Менск і працавала ў адной зь сярэдніх школаў выкладчыцай фізыкі [8, арк. 20 адв.]. Сам Зяма Півавараў у гэты час працаваў загадчыкам літаратурнага аддзелу ў газэце «Чырвоная зьмена». Мабыць, адчуваючы напружаную атмасфэру 1930-х, ён вырашыў не прыцягваць да сябе як да паэта залішняй увагі, апублікаваўшы цягам двух гадоў пасьля выхаду сваёй кнігі ўсяго пяць вершаў: «Павятовы гарадок» (урывак з паэмы, 1934), «Замоўк трыбун (На сьмерць Кірава)» (1934), «На сьмерць Анры Барбюса» (1935), «Сьмерць камэндора» (1935) і «На Далёкі Ўсход» (1936). А магчыма, іншыя вершы проста не траплялі ў друк. Нашмат больш актыўна З. Півавараў друкаваўся як тэатральны і кінарэцэнзэнт. У «Чырвонай зьмене» за 1936 г. выйшлі яго артыкулы «„Бедность не порок“ (На спэктаклі ў г. Віцебску)», «Мастацкая выстаўка пагранічнікаў», «Вечар вадэвіляў у БДТ-2», рэцэнзіі на кінафільмы «Шукальнікі шчасьця», «Сын Манголіі», «Дзеці капітана Гранта» ды інш. Як зазначыў Вольф Рубінчык, з гэтых рэцэнзіяў «можна здагадацца, што чалавек ён быў добразычлівы, заўвагамі не злоўжываў...» [11].

Займаўся З. Півавараў і перакладамі: з мовы ідыш пераставараў вершы Зэліка Аксэльрода («Адказнасьць») і М. Юрына («Кантрасты»), з расейскай — Аляксандра Пушкіна («Дэман» і «Абвал»), з башкірскай — Даута Юлтыя («Начное спатканьне»). Калі ідыш і расейскую ён ведаў з маленства, то верш башкірскага паэта перакладаў, як можна здагадацца, праз падрадкоўнік. Тое самае датычыць і перакладу знакамітага раману Даніеля Дэфо «Рабінзон Круза». Ён зроблены З. Півавараўым з расейскага выданьня. Да такой практыкі ў 1930-я гады зьвярталіся досыць актыўна, бо творцаў, якія перакладалі б непасрэдна з заходнеэўрапейскіх моваў на беларускую, бракавала. Дакладней кажучы, яны (як Юрка Гаўрук, Уладзімер Дубоўка, Аркадзь Мардвілка, Юлі Таўбін) былі ўжо рэпрэсаваныя і ня мелі магчымасьці займацца літаратурнаю працаю. Але неўзабаве чарговая хваля рэпрэсіяў не абмінула і Зяму Півавараўа. Беларускі «Рабінзон Круза» ўбачыў сьвет у 1937 г., пасьля арышту З. Півавараўа, і прозьвішча

перакладніка ў выданьні не пазначана. Аднавіць аўтарства перакладу атрымалася дзякуючы дакумэнтам з архіву Станіслава Шушкевіча [16, арк. 4].

12 лістапада 1936 г. Зяму Півоварава арыштавалі органы НКВД. Ягоная жонка была ў той момант на 4-м месяцы цяжарнасьці, і сын нарадзіўся 4 траўня 1937 г., калі бацька знаходзіўся ў зьняволеньні [8, арк. 20 адв.]. А ў ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 г. паэта расстралялі. Рэабілітавалі пасьмяротна вайсковай калегіяй Вярхоўнага суду СССР 8 сакавіка 1958 г. Але нават тады сваякі не маглі даведацца дакладнай даты і абставінаў сьмерці З. Півоварава: ім было паведамлена, што ён памёр у месцах зьняволеньня 14 ліпеня 1938 г. [8, арк. 20 адв.].

Лілію Персіну таксама чакаў трагічны лёс. 31 сьнежня 1937 г. яна была арыштаваная як «жонка ворага народа» і разам з 7-месячным сынам Раманам сасланая ў Акмолінск (Казахстан). У невыносных умовах яна хацела нават скончыць жыцьцё самагубствам. Адбыўшы сямігадовую ссылку, вярнулася на сваю радзіму, у Горлаўку (Украіна). Паколькі за гады ссылкі яна страціла спэцыяльнасьць пэдагога, працавала эканамістам у электрамэханічных майстэрнях трэсту «Горлівськвугілля». У 1949 г. захварэла на рак вока (паводле іншых зьвестак — мозгу). Перанёсшы 5 апэрацыяў, яна памерла ў цяжкіх пакутах 7 красавіка 1953 г. [8, арк. 20 адв.; 9, арк. 27].

Сын Зямы Півоварава Раман закончыў сярэднюю школу ў Магілёве (1954), Іванаўскі будаўнічы тэхнікум (1956), завочнае аддзяленьне Харкаўскага індустрыяльнага інстытуту. Жыў і працаваў у Горлаўцы, а з 1965 г. — у Рызе [8, арк. 20 адв.]. Кожнае лета інжынэр Раман Півавараў браў адпачынак, уладкоўваўся экскурсаводам на далёкія адлегласьці і ў дарозе чытаў экскурсантам вершы свайго бацькі, якога ён ні разу ў жыцьці ня бачыў [8, арк. 20 адв.; 9, арк. 27]...

Літаратура і крыніцы

1. *Ларчанка М.* Пра крытыку «салаўінага» парадку // Чырвоная змена. 1934. 3 жн.

2. *Левін С.* З. Півавараў, «Лірыка двух нараджэнняў», вершы. ЛіМ, ДВБ. 1934 год // Полымя рэвалюцыі. 1934. № 6-7.

3. *Лявонны Ю.* Стала і мужна: Вершы. — Мн.: ДВБ, 1932.

4. *Півавараў З.* Вер ты, сонца, верце, зоры...: [Верш] // Малады камуніст. 1925. 24 вер.

5. *Півавараў З.* З яўрэйскіх мотываў (Ліст у Амэрыку) [Верш] // Аршанскі маладняк. 1928. № 7.

6. *Півавараў З.* Лірыка двух нараджэнняў. — Мн.: ДВБ, 1934.

7. *Півавараў З.* «Шукальнікі шчасця» // Чырвоная змена. 1936. 21 мая.

8. *Пивоварова Л. Р.* Биография Зямы Пивоварова. Машынапіс // БДАМЛМ. Ф. 71, воп. 3, адз. зах. 262, арк. 20–20 адв.

9. *Пивоварова Л. Р.* Письмо С. П. Шушкевичу, 14.01.1983 // БДАМЛМ. Ф. 71, воп. 3, арк. 262.

10. *Рест Б.* Неделя советской Белоруссии // Литературная газета. 1931. 9 янв.

11. *Рубінчык В.* Зяма Півавараў — кінакрытык // Belisrael. Незалежны ізраільскі сайт [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belisrael.info/?p=12422.

12. *Сідарэнка Л.* Мсціслаў у жыцці паэта Аркадзя Куляшова // Мстиславль info: Путеводитель по городу [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://mstislaw.by/msc-sla-u-zhycc-pajeta-arkadzja-kuljashova.

13. *Хатулёў П.* «Лірыка двух нараджэнняў» З. Півоварава // ЛіМ. 1934. 16 ліп.

14. *Хроніка* // Аршанскі маладняк. 1928. № 7.

15. *Цагліна ў падмурак:* Альманах Беларускай сэкцыі ЛАПП. — М.: Дзярж. выд. маст. літ.; Л., 1931.

16. *Шушкевіч С.* Зяма Рувімавіч Півавараў // БДАМЛМ. Ф. 71, воп. 3, адз. зах. 123.

17. *Шушкевіч С.* У буднях працоўных гартаваўся радок // Чырвоная змена. 1971. 17 крас.

ЗЬ ЯЎРЭЙСКІХ МАТЫВАЎ

(Ліст у Амэрыку)

Майн фрайнт[1], пагавару з табой,
Ты знаеш, як у сэрцы плешча муць,
Хай будзе ў сэрцы зноў спакой —
Мэлёдый дзікіх не люблю.
Майн фрайнт, пагавару з табой.

Алэйхем шолэм![2] ў нас цяпер вясна,
У кожнага так шчокі кармазыняць.
Прыйшла яна, прыйшла, каго гукаў,
Прыйшла, каб кветкі кінуць.
Алэйхем шолэм! ў нас цяпер вясна.

Хай хто паспробуе адняць з душы імкненьні —
Таму ня будзе ў дзікай роспачы спагады.
Лепш сам пастаўлю час я на калені!
Люблю свой край, навошта мне Канада.
Хай хто паспробуе адняць з душы імкненьні!

Алэйхем шолэм! ў вас там сьмерць і холад,
А ў нас вясновыя гараць агні.
Стаіць як велікан, як нейкі волат,
О Беларусь мая — Эрусалім!
Алэйхем шолэм! ў вас там сьмерць і холад.

Бывай, бывай! У нас цяпер вясна —
У кожнага так шчокі кармазыняць.
Прышла яна, каб кветкі рассыпаць
На дол душы дажджом і ліўнем.
Бывай, бывай! Цяпер у нас вясна.

[1928]

ПАНТАМІМІЧНЫ ГЭСТ

Россыпамі літараў
папера ўвабрана,
Мозак узрушан
нясьліненымі ямбамі.
Што гэта?
Гістарычная панарама,
Расквечаная тлустымі
фарбамі?

[1] Мой дружа. *(Заўвага З. Піваварава).*
[2] Здароў — вітаю. *(Заўвага З. Піваварава).*

Друкуй рубільнікам!
каб сьвятла болей!
Замала сонечнага
сьвятла для нас,
Рух трымаць
не па крывой параболе,
А па зямлі,
намі ўслаўленай.

Вось яно:
рукі закасаны, —
не шукай ратунку,
Галава ня скінецца
ад трансьмісійных
казусаў.
І...
сэрца,
здэцца,
выскачыць
прастрэленым ладункам —
радасна.

Ідзем ад Нараўскай брамы
ды на вуліцу Стачак,
на штурм, — высокі набой.
Там, дзе колісь месяц,
як бядак,
жабрачыў.
Там, дзе
нашы хлопцы
ляглі галавой.

Туды ідзем,
дзе пераблыталіся
правады антэн;
Ня вамі ўсё здабыта,
абтлусьцелыя каркі,
Гэта вам ня боская камэдыя
Дантэ
І не санэцікі
славутага Пэтраркі.

Бач, як жыцьцёвы карабель
распростваецца, —
Здорава навучыўся
мінаць
мелі.

А паэты пілікаюць (можа, мне здаецца) —
Адчыніць бы душ іхніх
зачыненыя
разьмеркавацелі.

Вось яно:
рукі закасаны, —
не шукай ратунку,
Галава ня скінецца
ад трансьмісійных
казусаў.
І...
сэрца,
здэцца,
выскачыць
прастрэленым ладункам —
радасна!

Менск, ліпень 1931 г.

КАЧАГАР

Ён малады,
здаровы і вясёлы,
і пеніць радасьць
малады задор,
Ды з ухмылкай
дзіўна-васільковай
уваходзіць ў нізкі калідор.
Качагар!
зірні на сваю топку,
на чатыры футы
падымі ваду.
Засьмяесься
ўсьмешкаю салодкай,
што такі пажар
разьдзьмуў.
Адвячоркам
з камсамольскай гордасьцю
ты у спрэчках выступіш, Панас.
Сваю частку
ўласнае маёмасьці
аддасі, бясплатна,
у калгас.

Будзе жыцьце
мчацца ходам шпаркім,
падкідай вугольле —
палкі жар...
Будзе горад зь вёскай
качагаркай,
будзе
качагарам
пралетар.

[1931]

ПЕСЬНЯ ПРА ДЗЯЎЧЫНУ І БІРА-БІДЖАН

Ой, Хана, любая Хана,
Бляск сярпоў, залачоная рань.
Ты стаіш прад вачыма ў тумане,
Ты стаіш, чарнавокая здань.
Сыпле гай залатою лістотай,
Сыпле гай адзьвінеўшую квець,
Штосьці гай пахіліўся дрымотна,
Штосьці гай хоча марна гарэць.
Не зважай, што сьцюжы так веюць,
Не зважай, што пажоўкла трава...
Пачакай: заружавее
Гэты шызы маркотны туман...

———

Верасьнёвае помніцца раньне.
Верасьнёвая ростань, пэрон,
«Зай гізунт», — усьміхнулася Хана,
Ўздрыгануўся зялёны вагон.
— Мо ня ўбачу цябе больш ніколі,
Не сустрэну ніколі нідзе.
Заірзалі машынныя коні
Па рэйках сталёвых надзей.
Я застаўся адзін на пэроне,
І ахутаў мне голаў туман.
Заімглела у ціхім сутоньні
Ў неабдымных прасторах рань.
Ах, далёка, далёка краіна,
Гэта мудрасьць сівых вякоў.
Хай пажоўклыя кветкі гінуць,
Пажоўклыя кветкі слоў.
Біра-Біджан на далёкім усходзе,
Біра-Біджан — гэта сінь васількоў.

У Біра-Біджане шчасьце знойдзеш
У гаворцы сталёвых сярпоў.
Там зязюля ізноў закукуе,
Закалышыцца сіняя гаць...
У нас на Беларусі будуюць,
І вам яшчэ шмат будаваць.

[1931]

* * *

Я стаю...
І думак моцныя усплёскі
Ўзварушылі глыб
Юнацкае душы.
У разьбезе дзён
Мне чуцен дзіўны лёскат...
Стаю...
Гляджу ў нямую шыр.
Хто разьвяжа
Дзіўнасьць гэтых сьцежак,
Разухабіць шлях
У падарожжы?..
Той, хто мае
Мускульную сьвежасьць,
Паказацца волатам
Ці зможа?
Хай вясна мая —
Квяцістае улоньне
Мяне абніме
Казкаю чароўнай.
Тады душа
Расквечанай гармоняй
Празьвініць струною
Гулка-звоннай.
Ня першы я пляту
Вянок ёй злататканы,
Вянок ня з руж,
А словам-пэрлямутрам.
Вясьне маёй
Іду я на спатканьне
І бачу шчок яе
Кволы пурпур.
Я стаю...
І думак моцныя усплёскі
Ўзварушылі глыб
Юнацкае душы.

У разьбезе дзён
Я чую дзіўны лёскат,
У гэтым лёскаце
Хачу я жыць.

[1931]

ГУТАРКА З ЭЛЕКТРАМАНЦЁРАМ

Мы ўключым электраток,
А ты мне, дружа, дапамажы,
Каб электрычнасьці кожны глыток
Змог
    іх
        задушыць.
Дружа, бягуць гады,
Не стрымаць
іх бег
        адвечны.
Я хачу,
каб мае правады
Загаварылі
мовай чалавечай.
Не спалохаюсь
бомбы,
        міны
І суровасьці
замежных крат,
На нашай
станцыі
Адна толькі
турбіна
У сорак восем
тысяч
        кіляват.
Чуеш рокат адвечны
дамкратаў, кранаў
                стогн.
Яны падымаюць
        на свае плечы
Мільёны
мільёнаў тон.
Ты ідзеш?
Бывай!

А мы ўключым электраток,
А ты мне, дружа, дапамажы,
Каб электрычнасьці
кожны глыток
Нашых ворагаў
за-ду-шыў.

Ленінград, 1931 г.

МЭТРАПАЛІТЭН

Прапаўзуць пад зямлёй
рэйкі-каляіны,
Брудная карá зямлі
ўзьдзёрта.
Гэта нястомны ўдар
па гліне
Кайлá
камсамольскай
кагорты.
Мэтрапалітэн!
Разам з сэрцам нашым
у тахт заляскай,
Прарві сотні
некранутых
міль.
Мэтрапалітэн —
не фантастычная казка,
А бальшавіцкая
слаўная
быль.
Скалатнула сталіца
пыл вякоў,
Мудры салют аддае Крамлю,
падняўшы грунт
мэтрапалітэнны,
І званы яе цэркваў
(сарака саракоў)
З гулам разьбіліся
аб зямлю,
Прадчуваючы гул
падземны.
Масквіч!
У зялёным вагоне
пад Масквой
Пад айчынай тваёй,
пад айчынай маёй —

Праімчым,
нібы сьмерч
узбунтаваных
марэй,
Каб дрыжэла пад шпалай
прыбітая гліна.
Масквіч!
Мы зробім з табой
яшчэ адзін рэйс
У магутную моладасьць
нашай краіны —
Пад айчынай тваёй,
пад айчынай маёй.

[1934]

ПАВЯТОВЫ ГАРАДОК[3]

(Урывак з паэмы)

Слабыя промні
Вільгаць пілі
Там, дзе выдры
Ды ваўкі.
На горцы сеці
Падсушылі
Да касьцей прамоклыя
Рыбакі.

І покуль сонца
Зусім ня зьнікне там,
Будуць сядзець
На беразе яны.
Покуль у горадзе
Не пераклікнуцца
Царкоўныя і касьцельныя
Званы.

Кожны раз
Віснуць хмары хмурыя
Над горадам
У непагодны час.
І падымаюць
Ветры буйныя
На Сожы хвалі
Кожны раз.

[3] Урывак паказвае малюнак старога дарэвалюцыйнага беларускага гарадка *(Заўвага З. Півавараваа)*.

І на гары
На правым беразе
(Куды цяжка ўзьбірацца на кані)
Крыльлі распластаў
Дажджлівы верасень,
Калыхаючы сонныя агні.

Бурным раньнем
Чуецца ракі вой,
І хай толькі
Нагою ступіць
На берагі хадок —
Пахне туманамі
І травой
Павятовы гарадок.

На глухой вуліцы
Плач раньні,
Жаночых надрываў
Голас тонкі —
Цягне ўдаву ўраднік
За продаж
Самагонкі.

На глухой вуліцы
Загасла
Начная зарніца.
Хтосьці сэрца
Людзкое крануў.
Шэпчуць у сынагозе
Пра аўстрыйскага
Загінуўшага прынца
І пра абвешчаную вайну.

З жахам абрываецца
Лісток календара.
Выглядаюць вочы
Крывавай даты.
Тады выходзяць
Амаль з кожнага двара
Санлівыя
Салдаты.

Бурным раньнем
Чуецца ракі вой,
І хай толькі нагою
На берагі хадок —
Пахне туманамі
І травой
Павятовы
Гарадок.

[1934][4]

ПЕРАКЛАД

Аляксандар ПУШКІН

ДЭМАН

У дні, калі былі мне новы
Усе уражаньні быцьця —
Дзяўчыны позірк, шум дубровы
І ноччу сьпевы салаўя,
Калі узьнёсласьць і юнацтва,
Свабода, слава і любоў,
Калі натхнёнае мастацтва
Маю ускалыхнулі кроў, —
У хвілі шчасьця і надзеі
Самоту навявалі мне, —
Тады тайма суровы геній
Пачаў прыходзіць да мяне.
І з кожнай стрэчай нашай новай
Яго усьмешка у цішы,
Калючыя глыбока словы
Былі атрутай для душы,
Невычарпальнаю хлусьнёю.
Заўсёды Бога спакушаў,
Назваў цудоўнае маною,
Заўжды натхненьнем пагарджаў.
Ня верыў ён любві, свабодзе:
На сьвет з насьмешкаю глядзеў —
І не было таго ў прыродзе,
Чаго б уславіць ён хацеў.

[1936]

[4] Пераклад друкаваўся двойчы: у газэтах «Чырвоная зьмена», 1936, 6 чэрвеня, і «Віцебскі пралетары», 1936, 18 сьнежня. Другая публікацыя выйшла ўжо пасьля арышту перакладніка. *(Заўвага ўкладальніка).*

Ганна Севярынец

босы на вогнішчы



Міхась Чарот



Я шумлівы чарот, я мяцежны бунтар.
Я балота буджу гучным шумам.
У вадзе я жыву і абмыт дажджом хмар,
Але змоўкнуць ня дам сваім струнам.

Аднойчы менскай вуліцай ішоў хлопец — стромкі, блакітнавокі, апрануты ў саматканую вышываную сьвітку. З боку паглядзець — звычайны хлопец, хіба што прыгожы, як дзяўчына. Тонкія рысы твару, даўгаватыя, рамантычнай хваляй валасы, далікатныя рухі. І не падумаеш нават, што за сьпінаю гэтага хлопца досьвед Першай усясьветнай, бясконцыя франтавыя і тылавыя дарогі, акупаваны Менск, сьмяротная небясьпека і адчайная рамантыка антыпольскага падпольля, у якім ён быў адным з кіраўнікоў і актыўных дзеячоў, — не, не падумаеш. Усё, што кідаецца ў вочы, — ягоная сьвітка: просты вясковы крой, багатая вышыўка. І дзяўчына, што ўва ўсе вочы глядзела на хлопца пасярод менскай вуліцы, глядзела не на яго — на адзежу. «Мне надта спадабалася ваша сьвітка. Я сьпяваю ў хоры Тэраўскага, мы па ўсім горадзе зьбіраем касьцюмы для выступаў — набываем строі, вышыванкі, паясы, мо прадасьце нам сваю сьвітку?» — «А як яна адна ў мяне? Калі патрэбная вам сьвітка, дык бярыце разам са мной, бо пець я таксама ўмею».

У гэтую дзяўчыну гэты хлопец тае самае хвіліны закахаўся — безнадзейна, без аніякага адказу. Прыгажуня Алеся Александровіч, салістка хору Тэраўскага, актрыса, потым — жонка дыплямата і дзяржаўнага дзеяча Міхася Мароза, выкладчыца, укладальніца дзіцячых беларускіх чытанак, сястра паэта Андрэя Александровіча так і не адказала ўзаемнасьцю на каханьне Міхася Кудзелькі, будучага «Міхася Вялікага», як звалі яго ўдзячныя чытачы, першага з маладых пралетарскіх паэтаў, легендарнага рэдактара «Савецкай Беларусі», драматурга і кінасцэнарыста Міхася Чарота.

Канчатковы іх разрыў адбыўся на Купальле: акторы БДТ-1 сьвяткавалі Купалу ў Весялоўцы (так звалася дуброва на беразе Сьвіслачы). Расклалі вогнішча, наладзілі сьвяточную вячэру, сьпявалі, скакалі цераз агонь, пускалі па Сьвіслачы вянкі. Як скакала цераз вогнішча Алеся, кінуўся за ёй наўздагон Міхась, дагнаў, схапіў у абдымкі, стаў патрабаваць належны яму паводле звычаю пацалунак — але жорстка адмовілася ягоная каханая, нягледзячы на сьвята, на звычай і на гарачыя словы абяцаньняў.

Думаецца, гэтая прыгожая і пакутная ноч, асабістая драма, у ёй перажытая, адразу ўзгадалася Чароту, калі Еўсьцігней Міровіч падзяліўся з паэтам задумаю стварыць сапраўды беларускі, нацыянальны спэктакль. У лістападзе яго паставілі ў Беларускім дзяржаўным тэатры: музычная драма «На Купальле», тэкст Міхася Чарота, музыка Ўладзімера Тэраўскага [3], першы беларускі м'юзыкал, зорны час для маладога беларускага тэатру і для маладой сьпявачкі Алесі Александровіч, для якой была напісана галоўная роля. «На Купальле» ставілася ў Менску і ў Маскве, мела шалёны посьпех, прынесла стваральнікам дзяржаўныя ўзнагароды і нечуваную любоў гледачоў.



Алеся Александровіч і яе муж Міхась Мароз

Міхась Чарот з братам Паўлам. 1914 г.



З 1937 году памяць пра спэктакль мэтадычна і акуратна выдалялася з даведнікаў, падручнікаў і зборнікаў, тэкст і партытура зьніклі. Жыла толькі «Купалінка» — народнай песьняй, сіратой. На пачатку 1960-х акторы Кузьма Кулакоў і Канстанцін Пуроўскі аднавілі з памяці тэкст драмы, і толькі ў 1982 г. ён быў апублікаваны Таісіяй Дабралюбавай (удавой Кулакова) [8, с. 115–143], сцэнаграфія ж і музыка страчаныя, відаць, назаўсёды.

Успамінаючы свае дзіцячыя гады й першыя вершаваныя спробы, Чарот апавядаў, як у даўгія хвіліны пастухоўства, прыглядаючы за каровай, ён шаптаў сам сабе словы песень ці вершаў і паступова замяняў чужыя словы сваімі — адно, другое, трэцяе, пакуль чужы верш не пераўтвараўся ў свой...

Міхась Сямёнавіч Кудзелька нарадзіўся ў Рудзенску 25 кастрычніка (7 лістапада новага стылю) 1896 году ў вялікай, шматдзетнай сялянскай сям'і.

У «Літаратурным сылюэце», надрукаваным ў 1928 годзе ў дадатку да «Савецкай Беларусі», паэт і фэльетаніст Анатоль Вольны будзе кпіць з абставінаў нараджэньня і зь дзяцінства свайго таварыша і сябра:

Міхась Чарот у юнацтве



«Ці радзіўся Чарот у хляве, ці не, гэта нарэшце нам дакладна невядома, але той факт, што ён напэўне радзіўся, я магу пацьвердзіць чэсным словам. І гэта я з ахвотай зраблю, бо ведаю, што чалавеку, які, раз даўшы слова, не зманіў, будуць верыць і ў далейшым.

Як толькі нарадзіўся Чарот, у Рудзенск наляцелі крытыкі. Падзівіліся, паглядзелі, а потым: „Палымянец! Ды яшчэ і крычыць!" А потым саркастычна: „І мы крычаць можам!" Малы Чарот слухаў словы крытыкаў, сасаў матчыну грудзь, зноў слухаў, а потым адарваўся ад грудзі, ды да маткі:

Крыжам бы іх каля плоту,
Ды — трах!
Які тут страх?

Потым гэтыя словы Чарот запісаў у паэму „Босыя на вогнішчы".

Калі Чароту быў ужо адзін год і восем месяцаў, прыехалі некаторыя культурныя дзеячы дапамагаць Чароту вызначыць ідэалягічны шлях. „Бачыце, — пачалі яны, — тут з аднаго боку ня трэба, але затое ж з другога боку трэба... А ў агуле, калі прыняць пад увагу..." Чарот слухаў, слухаў, а потым:

Ня ведаюць, якой яны веры,
Ат, халеры!

Культурныя дзеячы абразіліся і паехалі.

Потым пачалася літаратурная школа Міхася Чарота. Сядзе Міхась Чарот з алоўкам, а сьвіньні пільнуюць. А як пачне Чарот вершы пісаць — яны ў грады. Нахіліцца Чарот над паперкай, а сьвіньні лушчаць капусту, пахрукваюць. Кожны раз непасрэдна пасьля гэтага Чарот плакаў. Чаго плакаў, невядома, — мабыць, білі.

Потым плакала і маці Чарота, гледзячы на ісьпісаныя сынам кавалачкі паперы. Чарот кажа, што маці плакала таму, што за душу, кажа, хапала ад яго вершаў.

З гэтай жа прычыны, кажа, і сам ён плакаў. Толькі наўрад, каб маці Чарота плакала, чытаючы вершы сына, бо была яна непісьменная, а апрача таго, мабыць, плакала з тае прычыны, зь якой і прычытвала: „Ня будзе зь цябе, Міхась, добрага пастуха, — ня будзе!“» [1, с. 5].

Пастуха зь Міхася сапраўды ня выйшла: заўважыўшы, што сын расьце прагным да ведаў, бацька пастанавіў аддаць яго ў вучобу. Спачатку малы хадзіў па хатах, у якіх зь іншымі дзецьмі займаліся «дарэктары», потым у Рудзенску адкрылася школа. Закончыўшы яе, Кудзелька надумаў паступаць у Маладачанскую настаўніцкую сэмінарыю. Але ведаў, набытых у рудзенскай школцы, для паступленьня катастрафічна не хапала. Каб недзе здабыць кніжак, неабходных для падрыхтоўкі, Міхась зьвярнуўся да студэнта Петрачкова, што прыяжджаў на канікулы да бацькоў у Рудзенск. Гэты самы студэнт Петрачкоў (імя ягонага і далейшага лёсу мы пакуль ня ведаем) стаў тым чалавекам, які першым адкрыў і выправіў у сьвет паэтычны дар будучага творцы: пачуўшы вершы свайго малодшага таварыша, зразумеўшы ягоны талент, Петрачкоў два гады бясплатна займаўся з Кудзелькам, прывозіў яму свае кніжкі, заахвочваў вершаваць, падбадзёрваў і ставіў мэты.

У 1914 годзе Міхась Кудзелька паступае ў Маладачанскую сэмінарыю.

Відавочны талент сялянскага хлопца быў заўважаны і тут: настаўнік гісторыі Іван Іванавіч Рэйнскі ўважліва сачыў за посьпехамі вучня, хваліў вершаваныя спробы, даваў парады. Цікава, што празь некалькі гадоў гэты самы настаўнік пяройдзе з Маладачанскай сэмінарыі ў Нова-Вялейскую і там стане добрым сябрам для іншага таленавітага свайго вучня — Уладзімера Дубоўкі. І Чарот, і Дубоўка ў сваіх успамінах удзячным словам будуць згадваць Івана Рэйнскага [7, с. 29].

Вершы таленавітага аднакурсьніка перапісвалі ў студэнцкія сшыткі, чыталі на прыватных вечарынах, сьпявалі студэнцкай грамадой. Але да друку вершы не даходзілі: усе яны былі прасякнутыя сумам аб няшчаснай беларускай долі і прагай пераменаў.

Здаецца, у Міхася Кудзелькі не было іншай дарогі, акрамя як у рэвалюцыю: малады, гарачы, летуценны хлопец, з самых народных нізоў, зьведаўшы і горкі хлеб селяніна, і няпростае жыцьцё бедняка-студэнта сярод багацейшых аднакурсьнікаў. Пэўна, каб ацаніць небясьпеку таго шляху, які прапаноўвалі краіне бальшавікі, каб заўважыць пустэчу лёзунгаў і няшчырасьць абяцаньняў, трэба было мець зусім іншы жыцьцёвы і культурны досьвед, урэшце, іншы ўзрост. Але Кудзелька быў такім, якім быў, — і таму ўсім сэрцам, горача і жарсна прыняў і рэвалюцыю, і новую ўладу, і яе абяцаньні, і яе магчымасьці.

З 1917 году ён у рэвалюцыйным руху — спачатку ў салдацкім камітэце, бо з 1917 году змабілізаваны ў войска, потым, з 1920 — ужо ў партыі бальшавікоў. У 1919–1921 гадах Міхась Кудзелька — адзін з самых актыўных удзельнікаў антыпольскага падпольля ў Менску: адказвае за фармаваньне паўстанцкіх аддзелаў, за друкарню, за складаньне і пашырэньне лістовак. Адначасова



Міхась Чарот па сканчэньні Маладэчанскай гімназіі. 1917 г.

«Чутка аб тым, што Кудзелька займаецца „сачыніцельствам“, усё больш і больш распаўсюджвалася сярод студэнтаў і настаўніцтва. ... Сынок аднаго дзятлавіцкага лясьнічага Ларывонаў на перапынку ўскочыў на парту і ... прадэклямаваў:

Пишет бедный сочинитель,
Всех пороков обличитель.
Видит всяческий порок,
Сочиняет, учит впрок.
Одного я не пойму —
Дело то его ль уму?

...Кляса зарагатала. Усе паглядзелі ў той бок, дзе сядзеў ...Міхась. ... Ларывонаў саскочыў з парты і, падбегшы да Міхася, хацеў пакласьці перад ім памфлет. Але не пасьпеў аглянуцца, як атрымаў добрую аплявуху. Уся кляса зашумела».


(Хведаровіч М. Памятныя сустрэчы. Менск, 1977)

Кудзелька — у самым віры беларускага культурнага жыцця: бярэ ўдзел у працы клюбу «Беларуская хатка», далучаецца да вандровак тэатру Ўладыслава Галубка, сьпявае ў хоры Тэраўскага — мае абсалютны слых і прыгожы, заўважны нават у агульным сьпеве барытон.

І калі ў Беларусі ўсталёўваецца савецкая ўлада, Міхась Кудзелька — адзін з самых гарачых яе будаўнікоў. Паводле свайго ўнутранага пераканаьня ён быў з тых «нацыянал-камуністаў», якія шчыра віталі новую ўладу ня толькі таму, што яна несла абяцаньні вызваленьня простаму народу, але яшчэ і таму, што яна давала народам права на самавызначэньне, а значыць, абяцала волю і самастойнасьць занядбанай у імпэрыі Беларусі.

На пачатку дваццатых Міхась Чарот — найперш паэт. Ён ці ня самы чаканы госьць на паэтычных вечарынах, студэнцкіх зборах, літаратурных дыспутах. Яго нават запрашаюць у салёны — за маскоўскай і піцерскай модай менская заможная інтэлігенцыя таксама далучаецца да новай пралетарскай літаратуры. Сапраўды, менавіта Чарот становіцца завадатарам маладой плыні літаратурнага працэсу: у той час, калі старэйшыя пісьменьнікі, Янка Купала, Якуб Колас, Вацлаў Ластоўскі асьцярожна прыглядаюцца да новай улады, разважаюць над яе праўдамі й няпраўдамі, рэфлексуюць над супярэчнасьцямі нованароджанай эпохі, Чарот без аглядкі кідаецца ў рэвалюцыйны патас сучаснасьці. Зь ягонай шчырай і безагляднай упэўненасьці ў савецкай уладзе, зь ягонага гарачага паэтычнага патасу вырастуць і рамантыка барацьбы новай беларускай літаратуры, і напружанасьць яе дыскусій, і яе бурапена.

«Прыйшоў Чарот, за ім пяцьсот», — такім напаўжартаўлівым радком ацэняць сучасьнікі ролю Міхася Чарота ў нараджэньні так званай «пралетарскай» літаратуры. Сапраўды, менавіта за ім прыходзіць на старонкі пэрыядычнага друку «першы прызыў» паэтычнага літаратурнага маладняку: Алесь Дудар, Анатоль Вольны, Андрэй Александровіч, Язэп Пушча, Кандрат Крапіва, Паўлюк Трус, за імі — з розьніцай у год-два, але тады літаратурныя пакаленьні фармаваліся імкліва і наплывалі адно на адно несупыннымі хвалямі, — «другі прызыў»: Валеры Маракоў, Тодар Кляшторны, Максім Лужанін, Пятро Глебка, Зінаіда Бандарына, Яўгенія Пфляўмбаўм, Натальля Вішнеўская, Сяргей Дарожны (Серада), Юрка Лявонны, Сяргей Фамін, Уладзімер Хадыка, сьледам — «прызыў трэці»: амсьціслаўцы Аркадзь Куляшоў, Зьмітрок Астапенка і Юлі Таўбін. Паэты ў Беларусі ў той час нараджаліся шчодра, таленты выбухалі яскрава і зьзялі горача, але кожны ўсьведамляў асаблівую ролю Міхася Чарота і ў сваім паэтычным абуджэньні, і ва ўласным паэтычным усьведамленьні. У 1923 годзе Міхась Чарот становіцца на чале першай беларускай масавай літаратурнай арганізацыі — аб'яднаньня «Маладняк».



Вокладка кнігі Міхася Чарота «Босыя на вогнішчы». Менск: Адраджэньне, 1922 г. Мастак Міхась Філіповіч

З 1922 году Міхась Чарот — ці ня самы ўрадлівы беларускі літаратар: у яго выходзяць асобнымі кнігамі паэма «Босыя на вогнішчы» (1922), «Завіруха» (першае выданьне — 1922), «Выбраныя вершы» (1925), зборнік апавяданьняў «Веснаход», паэмы «Карчма», «Ленін», «Марына» (усе — 1926), у 1922 г. пераможным шэсьцем па тэатральных пляцоўках крочыць, сьпявае і танчыць «На Купальле», у 1926 годзе зьяўляецца першы беларускі фільм «Лясная быль», зьняты паводле Чаротавай аповесьці «Грышка-сьвінапас».

У 1925 годзе Міхась Чарот займае пасаду галоўнага рэдактара цэнтральнай газэты БССР — «Савецкая Беларусь».

Пэўна, з гэтага моманту пачынаецца зваротны адлік для Чарота-паэта: ён піша ўсё менш і менш, перастае сачыць за выданьнем і перавыданьнем уласных вершаў, і калі выдавецтва чарговы раз падступаецца да яго з просьбай даць вершаў для чарговага «Выбранага», махае рукой і дастае з рэдакцыйнай шуфляды стос колішніх выразак і спарахнелых чарнавікоў. Па-першае, для творчасьці нестае часу і адзіноты. Па-другое, Чарот выразна разумее тупіковасьць абранага ім шляху рамантызацыі барацьбы і ўхваленьня рэвалюцыйных пераменаў — час мінае, эпоха ўскладняецца, але адлюстраваць усе яе супярэчнасьці яго-ная паэзія ня ў стане. І ня толькі таму, што трэба кардынальна зьмяняць стылістыку верша, але яшчэ і таму, што цяпер член Бюро ЦК КПБ, старшыня «Маладняку», галоўны рэдактар «Савецкай Беларусі» папросту ня можа дазволіць сабе паэтычнай шчырасьці.

Гэтае шчодрае, таленавітае, харызматычнае пакаленьне беларускіх літаратараў у поўным складзе апынулася ў пастцы новай дзяржавы: сьпяваць так, як патрабаваў іх талент, яны ня мелі права, сьпяваць так, як патрабавала дзяржава, не маглі. Даўняя, фальклёрная шчэ мэтафара птушкі, якая не сьпявае ў клетцы, стала для кожнага зь іх асабістым выпрабаваньнем, асабістай трагедыяй. Кожны зь іх апынуўся перад выбарам: сьпяваць з чужога голасу ці маўчаць — сам-насам. І што было рабіць тым, хто, згодна зь пісьменьніцкай аксіёмай, ішоў у літаратуру, бо ня мог не пісаць? Не пісаць — немагчыма, і пісаць — немагчыма таксама.

Да гэтай творчай драмы дадавалася драма асабістая. Паміж жонкай Міхася Чарота актрысай Ганнай Савіч і ягоным сябрам і калегам паэтам Анатолем Вольным вогнішчам разгараўся ўсім відавочны раман. Паводле ўспамінаў Максіма Лужаніна, гэтае становішча стала цяжкім выпрабаваньнем для ўсіх удзельнікаў «трыкутніку»: летуценныя мары аб вольным каханьні ў грамадзтве будучыні абарочваліся сапраўднымі чалавечымі трагедыямі.

Пэўна, адзіны верш Міхася Чарота, які «прагучаў» пасьля 1926 году, — гэта прыкра вядомы «Суровы прыгавор падпісваю першым», у якім былы рэдактар «Савецкай Беларусі», на гэты момант ужо — апальны, далучаўся да кампаніі шальмаваньня высланых «нацдэмаў», былых калегаў Чарота ў «Маладняку» і «Полымі», супрацоўнікаў ягонай газэты Ўладзімера Дубоўкі, Адама Бабарэкі, Язэпа Пушчы ды іншых. У гэтым вершы, без сумневаў, было шмат разьліку: такі публічны выступ пэўны час бараніў свайго аўтара ад перасьледу ГПУ. Але ў выпадку зь Міхасём Чаротам ён мог быць і шчыра выказанай пазыцыяй: як бы там ні было, Міхась Чарот усё жыцьцё заставаўся адданым камуністам, верным колішнім ідэалам.

Гісторыкі яшчэ недастаткова вывучылі пытаньне аб нацыянал-камуністах, іхнай плятформе, іх сыстэмнай дзейнасьці дзеля ўсталяваньня нацыянальна арыентаванай савецкай улады ў «нацыянальных рэспубліках», таму мы ня можам пакуль пабачыць аб'ёмна, трохмерна і постаць Міхася Чарота, паэта і камуніста, дзяржаўнага дзеяча, будаўніка Савецкай Беларусі. Але з мэмуараў і дакумэнтаў ведаем пра ягоныя рэакцыі і ўчынкі, якія шмат пра што гавораць. Вядома, напрыклад, што Міхась Чарот так



Міхась Чарот. Шаржмастака Паўла Гуткоўскага, 1924 г.

выказваўся пра Беларускую сацыялістычную грамаду, якая дзейнічала ў Заходняй Беларусі: *«Покуль яны там працуюць, і нам тут лягчэй адстойваць сваё беларускае»*. Таксама вядома, што скандальны «контрарэвалюцыйны» «ліст трох», апублікаваны ў «Савецкай Беларусі», ліст, у якім Алесь Дудар, Міхась Зарэцкі й Андрэй Александровіч голасна пратэставалі супраць правалу палітыкі беларусізацыі, быў надрукаваны з дазволу Чарота, і на пытаньне партыйнага расьсьледаваньня «Чаму вы, камуніст, дазволілі гэта зрабіць?» Чарот адказаў: «Бо я хацеў, каб гэты ліст зьявіўся» [5, с. 139]. Вядома, што Чаротава «Савецкая Беларусь» стаяла на выразна прабеларускіх пазыцыях — у процівагу «Зьвязьдзе» на чале з рэдактарам Іванам Асьмовым [2, с. 411].

У 1929–1932 гадах Міхась Чарот актыўна працуе «на фронце калектывізацыі» — месяцамі ён у службовых выправах на вёсцы. Суправаджае ўпаўнаважаных, праводзіць напружаныя сустрэчы зь сялянствам, прапагандуе калгас як спосаб прынесьці палёгку спрадвечнай няпростай долі чалавека на зямлі. Я. Рамановіч успамінае ўзрушаны маналёг Чарота, зь якім разам ехалі зь вёскі ў вёску: «Лёжачы ў драбінах на саломе, мы абменьваліся ўражаньнямі аб тым, што бачылі, што чулі ў гэтыя дні. Чарот быў надта ўзрушаны: відаць, усё яго тут хвалявала і захапляла. Ён круціўся на саломе і злаваўся. „Сялянскую душу разумець трэба, адчуваць!" — крычаў ён у шырокае поле. — Ён бы ўсіх курэй, парасят, нават жонак абагульніў бы, наш старшыня. Зухаваты мужык. Яго ў шэнкелях трымаць трэба. А то — раз, два! Ёсьць дырэктыва, валяй, рабі камунію! І не гавары! Вось яго мэтода! Грандыёзная справа, сялянства прачынаецца. Толькі накіроўваць яго трэба, разумна і цярпліва. Жарты — рэвалюцыйны скачок...» [6, арк. 15].

Няшмат вядома сёньня, як жыў Міхась Чарот у сярэдзіне трыццатых. Як паэт ён не працаваў, як журналіст — таксама. У Белдзяржвыдавецтве выходзілі яшчэ тамы ягонага «Выбранага», зь якіх пакрысе выдалялася ўсё сапраўды паэтычнае, жывое, пярэстае, і заставалася толькі «правільнае», «без ухілаў». Ён жыў з другой жонкай, выхоўваў траіх яе дзяцей.



ЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ № 72 (2269) НЯДЗЕЛЯ, 25-га САКАВІКА 1928 г.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва.

Да дзесяцігодзьдзя літаратурнае дзейнасьці

МІХАСЯ ЧАРОТА

ВА ЎСІХ КНІГАРНЯХ БДВ ПРАДАЮЦЦА НАСТУПНЫЯ ТВОРЫ АЎТАРА:

„БОСЫЯ НА ВОГНІШЧЫ". 2 выд. 1925 г., 36 стар., цана 10 к.

„ВЕСНАХОД". Збор апавяданьняў, 2 выд. 1926 г., 178 стар., цана 1 руб. 10 кап.

„ЧЫРВОНАКРЫЛЫ ВЯШЧУН". Паэма. Цана 20 кап.

„БЕЛАРУСЬ ЛАПЦЮЖНАЯ". Паэма. Цана 20 кап.

„МАРЫНА". Паэма 1926 г., стар. 39, цана 20 кап.

„ВЫБРАНЫЯ ВЕРШЫ". ЦБ «Маладняка» 1925 г., цана 15 кап.

„ЛЕНІН". Паэма. ЦБ «Маладняка» 1927 г., цана 20 кап.

„КАРЧМА". Паэма. ЦБ «Маладняка» 1926 г., цана 20 кап.

З ВОДГУКАЎ ПРЭСЫ

— АБ ТВОРЧАСЬЦІ —

М. ЧАРОТА.

«Нераздзельнаю беларускія часопісі і журналы, пачынаючы з другой паловіны 1918 году, мы сустракаемся, ранейшрадка, потым усё часьцей і часьцей, з вельмі цікавым песьняром М. Чаротам. Свежасьць думкі і пачуцьця, наш камуністычны, пралетарска-сялянскі настрой і класавы сьветапогляд родняць песьняра з нашым трывожным, хутка бягучым рэвалюцыйным часам. Песьняр, апрот таго, вьяўляецца адраджэнцам беларускай культуры, як культуры пралетарыяту і сялян, падаўшыхся на барацьбу проці палітыка-сацыяльнага, а разам з тым і культурна-нацыянальнага ўціску. У вершах песьняра адчуваецца магутная сіла сучаснай жыцьцёвай творчасьці, каторая ідзе ўкола нас. Песьняр увесь увайшоў у гэтую творчасць жыцьця, і яго верш, верш рэвалюцыянера і камуністата, нашае нам зьявішча сучаснага ўсясьветнага руху, як ён вывіўся ў нас на Беларусі, бадрыць вашу думку, падымае настрой і кліча да барацьбы і працы».

Іншыя творы МІХАСЯ ЧАРОТА распрададзены.

РЫХТУЕЦЦА ДА ДРУКУ

другое дапоўненае выданьне зборніку вершаў „ЗАВІРУХА",

а таксама апавесьць „ГРЫШКА СЬВІНАПАС".

Рэкляма твораў Міхася Чарота ў «Савецкай Беларусі», 1928 год, № 72, 25 сакавіка. «Іншыя творы распрададзены»

Міхась Чарот. 1930-я гг.



Міхась Чарот быў арыштаваны 24 студзеня 1937 году. Разам зь Цішкам Гартным, Алесем Дударом і Міхасём Зарэцкім ён праходзіў у сфабрыкаванай справе «нацыянал-фашысцкай арганізацыі» як адзін зь яе кіраўнікоў. Прысудам «тройкі» асуджаны на «найвышэйшую меру пакараньня» і расстраляны 29 кастрычніка 1937 году разам зь іншымі 102 дзеячамі беларускай культуры й навукі.

Але гутарка пра паэта ня будзе скончанай безь яшчэ аднае гісторыі.

«У 1939 годзе я быў праведзены ў адзіночную камэру, — успамінае Мікола Хведаровіч. — Уважліва агледзеў сьцены, шукаючы надпісаў, і вось у кутку прачытаў тэкст верша, выкалупаны нечым вострым на сьцяне. Гэта была апошняя сустрэча з маім любімым паэтам і другам Міхасём Чаротам. Гадамі я захоўваў гэтыя яго словы ў сэрцы» [4, с. 86].

Я не чакаў
І не гадаў,

Бо жсыў з адкрытаю душою,
Што стрэне лютая бяда,
Падружсыць з допытам,
З турмою.
Прадажных здрайцаў ліхвяры
Мяне зациснулі за краты.
Я прысягаю вам, сябры,
Мае палі,
Мае бары, —
Кажсу вам — я не вінаваты!

Там, у камэры, спакутаваны і зьняверaны, Міхась Чарот зноў быў паэтам.

Літаратура і крыніцы

1. *Алёша* [Вольны А.]. Літаратурныя сілуэты. Міхась Чарот // Літаратурны дадатак да газэты «Савецкая Беларусь». 1928. № 6.

2. *Дудар А.* Паказанні па справе СВБ // Дудар А. Выбраныя творы. — Мн.: Лімарыус, 2017.

3. *Іўкін М.* Як аўтарская «Купалінка» стала народнай песняй? // Звязда. 2008. 11 ліп.

4. *Маракоў Л.* Ахвяры і карнікі. — Мн., 2007.

5. *Платонаў Р.* Ліст трох: партыйнае расследаванне // Платонаў Р. Палітыкі. Ідэі. Лёсы. — Мн.: БелНДІДАС, 1996.

6. *Рамановіч Я.* Сілуэт над вогнішчам (= Хлопец з Рудзенска; Паэт і час): Успаміны. Варыянты. Машынапіс з аўтарскай праўкай. Лістапад 1966 г. // БДАМЛМ. Ф. 243, воп. 1, адз. зах. 122.

7. *Уладзімір Дубоўка.* Ён і пра яго. — Мн.: Лімарыус, 2017.

8. *Чарот М.* На Купалле: Муз. драма ў 3 актах // Полымя. 1982. № 2.



Крыж з партрэтам Міхася Чарота ў Курапатах, дзе, магчыма, яго расстралялі. Фота Сяргея Будкіна

КАБ Я БЫЎ…

Каб я быў крылатай птушкай, —
Не ляцеў бы я у гай,
Пеў бы песню-весялушку
Там, дзе сьлёзы льле ратай.

Каб я быў бурлівай рэчкай, —
Мужыка паганы лёс
Не знайшлі б тады са сьвечкай,
Так далёка б я занёс.

Каб я быў прыгожай кветкай,
Расьцьвітаў бы кожны год
На няўродлівым палетку,
Дзе расьце палын, асот.

Каб я быў вясеньнім сонцам,
Што прыгожа так гарыць, —
Бедным людзям у ваконца
Першым стаў бы я сьвяціць.

Каб я быў на небе зоркай,
Што блішчыць, аж любата,
Я глядзеў бы на надворкі
Там, дзе вечна цемната.

Каб я быў ня тым, хто ёсьць я,
Каб я быў, кім быць мне сьлед,
Зруйнаваў бы усё са злосьці,
Збудаваў бы новы сьвет.

10-III-1921 г.

БУНТАР

Я шумлівы чарот, я мяцежны бунтар.
Я балота буджу гучным шумам.
У вадзе я жыву і абмыт дажджом хмар,
Але змоўкнуць ня дам сваім струнам.

Уздыму дух людзей, прабуджу іх ад сну, —
Славу, будучнасьць я ім прарочу…
Я, мяцежны бунтар, клічу жыцьця вясну,
Клічу к працы свабоднай і творчай.

Як ня счуюць мяне, я мацней загуду,
Дам гучнейшы акорд песьні новай...
А каб змыць зь зямлі бруд, скалыхну я ваду,
Што дажджом налілася сьвінцовым.

Чаму ж вы, песьняры, што будзілі людзей,
Чуць ня хочаце песьні чарота?
Нашы песьні — наш кліч, бо адных мы грудзей,
Край адзін наш — то наша балота.

Дык шумі, як шумеў, велікан-ясакар,
Шапаці, сьпелы колас, у полі...
А я песьню сваю буду пець — я бунтар!
Буду клікаць народ свой да Волі.

1922 г.

НАШЫ ДНІ

Эх, хлопцы, жыцьцё разьвясёлае,
Толькі сэрца вось ныe праклятае...
Гарады нашы, вёскі і сёлы...
Гуляй, пакуль галава ‘шчэ ня сьцятая.

Нам ня трэба ні срэбра, ні золата.
Вось на хвалях жыцьця пракаціцца,
Паказаць людзям сілушку волата,
А там — не журыцца!

Эх, як весела жыць: песьні, музыка...
Ну, гуляй, каму хочацца гуляў...
Цяпер воля пакрыўджаным вузьнікам...
Хто быў босы, таго мы абулі...

Скалыхнулі ваду мы стаячую...
Гэй, на чоўны — плывіце!
Каму жыцьцё абрыдла брадзячае —
Адпачніце.

Не багацьце мы любім — жыцьцё разудалае,
Любім праўду і песьню таварыша...
Хоць і сіла спаткае нямалая, —
Сіла ворага, — там нас пахваліш.



Вокладка кнігі Міхася Чарота «Веснаход». Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1926 г. Мастак Аляксандар Баранскі

Размахнуцца!.. папробаваць сілу
Мы гатовы!
Нашы хлопцы таго... не хілілі
Перад ворагам самі галовы.

Вось бяда, што балота наўкола сяла.
Селі б у чоўны... па хвалях — гайда!
Ўвесь бы сьвет аплылі, была не была.
Мо зусім бы прапала нуда!

22-І-1922 г.

ВЯСНУ ПЯЮ

Зямлю цалуе неба сінь
Сваім чырвоным сонцатварам,
І песьню ночы «ква-кум-бінь»
Пяюць мне сонныя выгары.

У высі зорак сенажаць
Вартуе месяц — дзед двурогі,
Ня хоча раніцу спаткаць
І лесам хмар ідзе бязногі.

Капліца белая, як здань,
Ў тумане плавае за вёскай,
І сонцам спужаная рань
Прысела зайцам за бярозкай.

Дзяньніцы зірк на небе стух,
Вясковых хат дымяць галовы,
У лапцях з пугаю пастух
Трубою плача на каровы.

Пяе у полі хор калёс,
Як старац зь ліраю разьбітай...
Загоны вузкія авёс
Убраў зялёным аксамітам.

Вясёлы птушак перазвон
Гудзе на воблачнай званіцы...
Бязмоўнай цішы гіне сон,
Як сонца выплыве крыніцай.

І сыпле промень вогнясталь,
К вачам схілю сярпом далонь я
І пазіраю моўчкі ў даль,
У шыр блакітнага бяздоньня.

14-V-1922 г.

* * *

Я зноў — дзе поле каласамі
Свайму паэту б'е паклон,
Дзе меж зялёных паясамі
Спавіты вузкі мой загон.

Я зноў — дзе вольхам і бярозам
Купае сонца галаву
І жменяй згорнутыя сьлёзы
Расою сыпле на траву.


Я зноў — дзе птушак пералівы
Зьвіняць, як струнаў перабор,
Дзе чорнай хмараю дажджлівай
Стаіць на ўзгорку шумны бор.

Я зноў — дзе рэчкі і выгары
Блішчаць люстэркай між балот
І новай глебе шэпча чары
Вясёлым громам небасход.

Гляджу ў заплаканыя вочы
Старых жабрачак — родных хат,
Дзе па-над стрэхаю рагоча,
Мяне спаткаўшы, вецер-хват.

Я зь ім па краі пранясуся
І прывітаю вольну шыр,
І песьняй ліры памалюся
На незасеяны пустыр.

На сенажаці паначую:
Там буду коней вартаваць...
Расклаўшы вогнішча, хачу я
Начлег мінулы ўспамінаць.



Завіруха. Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1929 г.

Дзіцячых год вярну я гульні,
Скакаць я буду праз агонь,
Пакуль ня спудзіцца вадгульлем
На небе месяц — белы конь.

Нясьпелым жытам сінявокім,
Як родны сын, а не чужы,
На мора траў пайду далёка
З касою вострай па мяжы.

Там ліры гук і посьвіст косаў
Злучу ў адзін нячутны хор.
І на балоце сьлед мой босы
Прыгожы вытапча узор.

Ад зморы соладка спачыну,
На сене сьвежым задрамлю,
Як неба ў чорную аўчыну
Зашыю сонную зямлю.

Калі ж у марах мне — паэту
Пашле натхненьні ціхі змрок,
Як з васількоў блакітных летам,
Спляту я з вобразаў вянок.

10-VI-1922 г.

БАЛОТАМ СЬНЕЖНЫМ ПРАЗ САСОНЬНІК

Балотам сьнежным праз сасоньнік,
Які смаловым пахам вабіць,
Прастор балот зімою соннай
Люблю санямі разухабіць.

Люблю, як кусьцік нізкаслы,
Калі з саней назад паглянеш,
Нібы адкінуўшы ён вёслы,
Плыве па белым акіяне.

Пукаты стог люблю аб'ехаць,
Сьляды наўкол зрабіць палозьзем
І сена, выскубнуўшы вехаць,
Люблю раскідаць па дарозе.

Люблю, як санкі мчацца з плачам,
Пісклявы гімн зіме заводзяць,
А конь, падкуты чортам, скача,
Нібы па шкле, па гладкім лёдзе.

Люблю закутацца кажухам,
Згайсаць ад меж да меж краіну
І крыкнуць гучна завірухам,
Што ў хвалях белых не загіну.
І зноў ляцець... Дуга хай звоніць,
Пакуль конь лейцы не аслабіць...
Прастор балот зімою соннай
Люблю санямі разухабіць...

25-XII-1922 г.

МАЛАДНЯК

Тут учора бура выла нам.
Вецер-чмут гайсаў з кутка ў куток,
Стары бор з карэньнем выламан,
Сумны шум яго навекі змоўк.

Заіскрыла сонца — вір агню...
Буралом спаліла з гольлямі...
Зьніклі хмары... і пад чырваньню
Ўсе прасторы сталі голымі.

А сягоньня — чутны водгукі:
— Нам расьці — дык мала дня!
Толькі тут узьняцца мог такі
Волат лес — наш Маладняк.

Стройны лес і горды выгляд,
Нібы раць, што мкнецца ў бой.
Яго шум — што голас: «Выедам
Пастаяць за праўду галавой».

Маладняк сваімі лісьцямі
Шапаціць нам казку-вольніцу...
Помнім, помнім, як калісьці мы
Чорных дзён стрымалі коньніцу.

Перастаў і сумны сьпеў гусьці,
Дні прыйшлі — ажно ня верыцца.
Хто ж адвагі знойдзе, сьмеласьці
Зь сілай моладзі памерацца?

24 сакавіка 1923 г.

ЗАРУНЕЛА, ЗАРУНЕЛА…

Зарунела, зарунела аксамітам…
Рэчкай срэбнай — сонцам залілося…
На палях здратованых, прыбітых,
Паглядзі… вясну радзіла восень.

Маладняк зялёны, бач, кудравіць,
Ахіляе край яскравым лісьцем…
Аб здабытай вольнасьці і славе
Маладняк шапоча ў песьні-сьвісьце.

Зарунела, зарунела аксамітам…
Рэчкай срэбнай — сонцам залілося…
Паглядзі… Над краем ужо зьвіты
Промені, жытнёвыя калосьсі.

Барацьбой гартованы, расправай…
На прастор, у сінь прыгожа выйсьці…
Аб здабытай вольнасьці і славе
Маладняк шапоча ў песьні-сьвісьце.

[1924]

ШЛЯХАМ ЗІМНІМ

Сенажацямі, лясамі
За санямі сані самі
Сьцелюць сьцежку.
Сьцелюць сьцілем.
У разгоне
Белы коні
Сівы грывы
Распусьцілі.

Заскрыпелі, зарыпелі
Палазы ў лазе, запелі...
Просты вёрсты
Шляхам зімнім...
А сялянам — ім ня зімна
У кажусе...
Коні трусяць
Ў завірусе,
Па замеценаму сьледу
Едуць, едуць, едуць...
Сіні сьнег
Сьцяжынкі сее,
Усхадзілася завея —
Вее, вее, вее...
І даліна
Ў белы іней —
Гіне, гіне, гіне...
І ня сьлізка...
Блізка, блізка
Стагі сена...
Чуць прыкметны
Багны, нетры
Ў мітусеньні...
Над стагамі
Жэрдзі-вежы...
А палозьзі гурбы рэжуць
Падкаванымі нагамі
І мінаюць гай за гаем...
Сівагрывых
Чутна ржаньне...
— Вы — эх! Вы — эх:
Стой!
Прыехалі!
Стажарні!

[1926]



Вокладка кнігі Міхася Чарота «Марына». Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1926 г. Мастак ня вызначаны


ВЯСНА І ДЗЯЎЧЫНА

Кожнай вясьне
Кожная дзяўчына рада,
Бо вясна сум дзяўчыне расьсее,
Не паслухае сэрца парады.


Знаю вясну,
Знаю адну дзяўчыну,
Калі сум ў яе сэрцы заснуў,
Як змораны хтось ў адпачынак.

Той вясною дзяўчына чакала,
Што з паходу каханак прыйдзе,
Вясну радасна так загукала,
А каханка... забіў якісь злыдзень.

Дзень вясновы жальбы не разьвее,
Пакуль ёсьць войнаў дзікіх пагрозы...
І пабачыў вясной на траве я
Не расу, а дзяўчыны той сьлёзы.



Вокладка кнігі Міхася Чарота «Ленін». Менск: Выданьне ЦБ «Маладняка», 1926 г. Мастак Анатоль Тычына



Вокладка кнігі Міхася Чарота «Беларусь лапцюжная». Менск: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1927 г. Мастак ня вызначаны

Ты ня плач, толькі помні аб гэтым...
Ты ня траць ні надзей, ні красы.
Час ідзе — я узрокам паэта
Сьлёз ня бачу, а каплі вясеньняй расы.

[1928]



Ганна Севярынец

сьвятло зялёнай зоркі



Алесь Дудар



Хто прайшоў — галаву павесіў.
(Міліёны пудоў у гадах.)
Ну, а я малады — мне весела
разагнацца ў мяцежную даль.

Чамусьці зоркі здаваліся яму зялёнымі. Менавіта такі эпітэт сустракаецца ў вершы «Заблудзіла зялёная зорка...», гэткія самыя зялёныя зоркі гараць «на сіняй эмалі неба» ў апавяданьні «Спатканьне». *«Толькі на Беларусі бываюць такія зоркі»*, — тлумачыць незвычайны колер нябеснага ліхтарыка лірычны герой твору.

Іншы раз цяжка зразумець, якія з падзеяў, характарыстык, дэталяў, што пакідае па сабе паэт, найважнейшыя. Даты нараджэньня і сьмерці? Атрыманыя прэміі? Выдадзеныя зборнікі? Гады вучобы ў БДУ? Ці колер зорак — такіх, якімі ён іх бачыў? Ці, можа, асаблівасьці аблічча? Алесь Дудар, прыкладам, часта і сутаргава міргаў — нэрвовая звычка, акуратна занатаваная сучасьнікамі ў мэмуарах. З гэтай звычкі ахвотна кпілі: «Шукайла так кройнуў па „Маладняку», што Дудар ажно моргаць перастаў», — піша Паўлюку Трусу на вёску справаздачу аб літаратурным дыспуце Максім Лужанін. У «Крывічах» Міхася Зарэцкага Алесь Дудар выведзены пад іменем Ліпіна — бо «лыпае», міргае. «І вочы ў яго моргаюць, як у старога», — раздражнёна характарызуе Дудара Якуб Колас.

Можа, зялёнымі падаваліся зоркі стомленым сутаргай вачам? Гранічная шчырасьць, засяроджанасьць на асабістым жыцьцёвым досьведзе, эмацыйная суб'ектыўнасьць ягонай лірыкі адзначаліся крытыкамі зь першых крокаў паэта ў літаратуры — спачатку як добрая, а потым як дрэнная характарыстыка.

Можа, хацелася надаць незвычайны колер нашым, беларускім зоркам — каб адрозьніваліся ад зорак іншага, чужога неба? Для паэта, які ўпарта адстойваў самабытнасьць Беларусі сярод народаў і культур сьвету, такое начыньне вобразу — цалкам натуральнае.

А можа, зялёная зорка — гэта шыфраванае пасланьне сябрам-эспэрантыстам, зь якімі паэт-паліглёт Дудар, перакладнік зь пяці эўрапейскіх моваў, добра сябраваў? Зялёная зорка — міжнародны сымбаль эспэранта, яе насілі ў выглядзе нагруднага знаку, ёй прысьвячалі вершы. Між іншым, вершы Алеся Дудара перакладзеныя на эспэранта аднымі зь першых у Беларусі.

Што ж да прэміяў, іх Алесь Дудар не атрымаў ніводнай. Яскравы прадстаўнік «першае хвалі» маладой беларускай літаратуры (першыя вершы ўбачылі сьвет у 1921 годзе — Алесю Дудару было шаснаццаць),



Алесь Дудар на адпачынку ў Крыме (меркавана 1927 г.)

адзін з заснавальнікаў «Маладняку», заснавальнік Віцебскай і Полацкай філіяў гэтай арганізацыі, суаўтар першага беларускага падлеткавага раману, першы перакладнік на беларускую пушкінскага «Яўгенія Анегіна», «Жаніцьбы Фігара» Бамаршэ, «Зімовай казкі» Гайнэ, «Фаўста» Гётэ, ён жыў у час, калі паэтычныя дасягненьні ганараваліся ня прэміямі, а арыштамі й высылкамі, і чым вышэйшыя былі тыя дасягненьні, тым больш маўкліва сустракала цябе памяць нашчадкаў.

Аляксандар Аляксандравіч Дайлідовіч, будучы паэт Алесь Дудар, нарадзіўся 23 сьнежня 1904 году ў вёсцы Навасёлкі на Мазыршчыне (сёньня Петрыкаўскі раён). Як апынуліся ў Навасёлках ягоныя бацькі, Аляксандар Станіслававіч, родам з Туміловічаў з-пад Барысава, і Вольга Іванаўна, народжаная ў Тальцы, сёньня ўжо невядома. Магчыма, спрабавалі асесьці на зямлі, займець такую-сякую гаспадарку, але, відаць, нічога добрага не атрымалася, і сям'я вандравала па Беларусі ў пошуках долі. Пабыўшы арандатарам у Навасёлках, Аляксандар Станіслававіч перавёз невялікую сваю сям'ю, жонку і сына, у вёску Таль (цяпер Любанскі раён), адтуль падаліся ў Мар'іну Горку, дзе бацька ўладкаваўся прадаўцом віннай манапалькі (між іншым, абы-каго на такую адказную пасаду ня бралі, гэта трэба было мець крыштальнае сумленьне і выключныя рэкамэндацыі), з Пухавічаў перабраліся ў Менск, дзе нарэшце Аляксандру Дайлідовічу-старэйшаму ўдалося атрымаць надзвычай добрае месца канторшчыка Маскоўска-Берасьцейскай чыгункі.

Чыгуначнікі, тагачасная працоўная эліта, жылі заможна. Дайлідовічы зьнялі добрую трохпакаёвую кватэру на вуліцы Правадной, што злучала рэйкі Лібава-Роменскай і Маскоўска-Берасьцейскай чыгунак (гэтая вуліца ішла паралельна сучаснай вуліцы Фабрыцыюса і цяпер не існуе). У 1914 годзе дзякуючы субсыдыі для працаўнікоў чыгункі аддалі сына вучыцца ў найдаражэйшую на той час у горадзе прыватную гімназію Фальковіча і Зубакіна.



Алесь Дудар (меркавана 1919 г.)

У адной клясе з Шуркам Дайлідовічам вучыліся сыны піўнога магната Лекерта і фабрыканта Годэра, нашчадкі знакамітых шляхоцкіх родаў Радзевічаў, Гудовічаў і Доўнараў-Запольскіх, сын заснавальніка гімназіі Іван Зубакін — і дзеці сялян і службоўцаў чыгункі Захарэвічаў, Юраноў і Міклашэўскіх [6]. У гімназію, згодна зь яе статутам, прымалі дзяцей усіх станаў і веравызнаньняў, таму побач з сынам селяніна, праваслаўным Алесем Дайлідовічам за партамі сядзелі магамэтане Канстанцін Мухля і Ібрагім Смольскі, каталікі Рышард Адынец і Ян Акуліч, юдэі Езэкііль Дворкінд і Ошэр Грынбэрг. Заснавальнікі гімназіі, выпускнік гістарычна-філялягічнага факультэту Санкт-Пецярбурскага ўнівэрсытэту Сяргей Пятровіч Зубакін і менскі фатограф Канстанцін Восіпавіч Фальковіч, які закончыў Віленскі настаўніцкі інстытут, імкнуліся захоўваць імідж найлепшай навучальнай установы ў Менску: асобны будынак у цэнтры гораду (цяпер у ім гістарычны факультэт БДУ), невыпадковыя настаўнікі, строгая дысцыпліна. На два гады вышэй за Шурку ў гэтай самай гімназіі вучыўся Анатоль Ажгірэй — будучы паэт, публіцыст, кінасцэнарыст Анатоль Вольны, надзейны Шуркаў сябар.

Але ў 1915 годзе гімназія зачыняецца праз набліжэньне фронту Першай усясьветнай. Сем'і чыгуначнікаў арганізавана эвакуюць углыб Расейскай імпэрыі, і Вольга Іванаўна разам з Шуркам і ягонай нованароджанай сястрычкай Жэняй распачынаюць цяжкі шлях бежанцаў. Тры гады яны пражывуць у нумары казлоўскай гасьцініцы «Трансвааль», аддадзенай пад прытулак для бежанцаў. Тры гады Алесь Дайлідовіч будзе вучыцца ў Казлоўскай клясычнай мужчынскай гімназіі. У сямейнай бібліятэцы Дайлідовічаў захавалася нямецкая хрэстаматыя, зь якой вучыўся чацьвертаклясьнік Шурка. На асабістым штампе (імі гімназісты пазначалі свае кніжкі) у прозьвішчы *Дойлидович* першае «о» ўпарта перапраўлена на «а». Як ні дзіўна, менавіта там, у Казлове (сёньня Мічурынск Тамбоўскай вобласьці) Алесь Дайлідовіч упершыню бачыць друкаванае па-беларуску слова: *«Найбольшае ўражаньне на мяне зрабіла газэта „Дзяньніца", якая выпадкова папала неяк у чытальню Казлоўскага гарсавету, дзе я быў штодзённым госьцем. Яна зрабіла на мяне ўражаньне непаўтарымае і з боку зьместу, і з боку формы (мовы) — гэта было для мяне нешта новае і адначасна даўно знаёмае і зразумелае. Гэты нумар газэты я па несьвядомасьці сваёй скраў з чытальні і ён у мяне захоўваўся некалькі гадоў»* [4, с. 438].

Алесь Дудар (меркавана 1923 г.)



Напачатку 1918 году сям'я вяртаецца ў Менск на Правадную.

Дакладна невядома, як жылі Дайлідовічы падчас польскай акупацыі. Відавочна, Аляксандар Станіслававіч працягваў працаваць на чыгунцы, Вольга Іванаўна займалася хатняй гаспадаркай, Шурка, здаецца, хадзіў у нейкую школу, праўда, ніякіх праўдападобных дакумэнтаў аб гэтым не захавалася і архіўныя росшукі ў тагачаснай школьнай дакумэнтацыі пакуль нічога не далі. Мо дрэнна захоўваліся архівы за польскім часам, а можа, ня надта ён туды і хадзіў — пасьля дзьвюх клясычных гімназіяў што магла даць цікаўнаму падлетку школа другой ступені? Здаецца, з 1918 году Алесь Дайлідовіч найперш спадзяецца на самаадукацыю — менавіта ў гэты час ён пачынае зьбіраць хатнюю бібліятэку, памеры якой і сёньня ўражваюць: тут расейская і сусьветная клясыка, французская і нямецкая бэлетрыстыка на мовах арыгіналу, кнігі з тэорыі літаратуры, слоўнікі, моўныя дапаможнікі, зборнікі архіўных дакумэнтаў і гістарычныя альманахі — пасьля ператрусаў трыццатых гадоў, маштабнай канфіскацыі ГПУ, вайны і пасьляваеннай галечы бібліятэка налічвае амаль тысячу тамоў ахайна падабранай і скамплектаванай літаратуры гуманітарнага кірунку [8].

У 1921 годзе ў газэце «Савецкая Беларусь» зьяўляюцца першыя вершы шаснаццацігадовага паэта, які бярэ сабе амбітны і гучны псэўданім Дудар: улетку і ўвосень апублікавана чатыры вершы. Але потым настае перапынак — малады паэт выпраўляецца ў вандроўку ажно на паўтара году.

Ягоны сусед па доме на вуліцы Правадной — дзьверы ў дзьверы, у Дайлідовічаў кватэра нумар два, у яго пад нумарам тры — былы чыгуначнік Лібава-Роменскай, а цяпер — кіраўнік невялічкай сямейнай тэатральнай трупы, якая вандруе па вёсках і дае спэктаклі... Так-так! Гэта ён, Уладыслаў Галубок! Як толькі перад маленькай трупай паўстае пытаньне пашырэньня, Галубок робіць Дудару прапанову далучыцца да тэатральных вандровак — вельмі прыдасца трупе прыгожы, начытаны, вясёлы юнак, асабліва нічым не заняты, які рос побач і вядомы Галубку ўва ўсіх сваіх вартасьцях і хібах. Да восені 1923 году Алесь Дудар — актор вандроўнага тэатру. Мы нічога ня ведаем, на жаль, пра пастаноўкі, у якіх удзельнічаў Алесь Дудар, пра ролі, якія ён, магчыма, граў, але ведаем адну гісторыю,

якая нарабіла шуму ў Менску, бо ўспамінае яе кожны, хто піша пра тэатар Галубка: аднойчы ў справах тэатру Дудар апынуўся ў Пухавічах і, ня маючы грошай на білет да Менску, вярнуўся пехатою — а гэта восемдзесят вёрстаў!

Анатоль Вольны напіша ў «Літаратурных сылюэтах»:

> *«Алесь Дудар нам, рэдакцыйным працаўніком, вядомы тым, што ён шмат ходзіць. Гэтай першапачатковай кваліфікацыі яго навучыў Галубок, у якога некаторы час працаваў Дудар, навучыў яго якасьці, неабходнай для вандроўнага артыста. Што і казаць, артыстам ад гэтага Дудар ня стаў, але праз тое ходзіць ён шмат і ходзіць старанна.*
>
> *Цяпер вось далі Дудару ўсе магчымасьці вучыцца. Што гэта значыць:*
>
> *— Працы, значыць, у цябе ніякай. Сядзі сабе, значыць, ды пасьвістывай.*
>
> *А Алесь Дудар ходзіць. Ходзіць, на хаду вершы піша. На хаду крытыкуе. На хаду залікі рыхтуе, на хаду хваробу пераходзіць. Каб ня гэтая кваліфікацыя, на другі год на кожным курсе засядзеўся б, а то неяк зноў жа пераходзіць»* [2].

Менавіта з гэтай вандроўкі Алесь Дудар вяртаецца сапраўды беларускім паэтам — загартаваным у сваёй упартай і бескампраміснай любові да роднай краіны, яе мовы й культуры, яе самабытнага шляху да будучыні.



Алесь Дудар. Шаржмастака Паўла Гуткоўскага. 1924 г.

Алесь Дудар (у цэнтры) падчас вайсковых зборaў студэнтаў БДУ. 1928 г.



У 1923 годзе Дудара запрашаюць у «Савецкую Беларусь» — спачатку пазаштатным аўтарам, потым — на пасаду літаратурнага супрацоўніка. Адначасова паэт паступае ў БДУ на этноляга-лінгвістычнае аддзяленьне — але, правучыўшыся першы курс і здаўшы «без хвастоў» дзьве сэсіі, ён папросту ня зьявіцца на далейшую вучобу: «не стае часу» — так ён патлумачыць самаўзяты акадэмічны адпачынак.

Часу яму сапраўды не стае. У лістападзе 1923 году шасьцёра маладых літаратараў — Алесь Дудар, Анатоль Вольны, Адам Бабарэка, Язэп Пушча, Міхась Чарот, Андрэй Александровіч — аб'яўляюць аб нараджэньні літаратурнай арганізацыі, якая з наступнага году пачне звацца Ўсебеларускім аб'яднаньнем паэтаў і пісьменьнікаў «Маладняк».

У сакавіку 1925-га на заданьне Цэнтральнага бюро Алесь Дудар выяжджае ў Віцебск і Полацак дзеля заснаваньня рэгіянальных філіяў і арганізацыі работы ў іх. Пакольк і «Маладняк» справа бясплатная, Дудара «прымацоўваюць» да рэдакцыі газэты «Полоцкий пахарь» — тут, на пасадзе тэхнічнага сакратара, малады й бескампрамісны паэт вядзе жорсткую барацьбу за беларусізацыю цалкам зрусіфікаванай полацкай прэсы. Нават па вяртаньні ў Менск ён яшчэ будзе друкаваць у «Савецкай Беларусі» зьедлівыя саркастычныя артыкулы пра «недабеларушчыну» «Полоцкого пахаря» [3, с. 6].

У 1925 г. нарэшце выходзяць адзін за адным зборнікі вершаў ужо знакамітага на той час паэта, жаданага госьця літаратурных вечарынаў і дыспутаў, гаспадара маладнякоўскіх чытаньняў Алеся Дудара. Зборнік «Беларусь бунтарская» амаль цалкам складзены зь вершаў грамадзянскай тэматыкі, якая і потым будзе адной з самых заўважных у творчасьці паэта, другі ж — «Сонечнымі сьцежкамі» — шчыра і шчодра адкрывае перад намі ўнутраны сьвет маладога, закаханага ў жыцьцё хлопца, усім сэрцам аддонага эпосе пераменаў, якія абавязкова — да лепшага.

І як жа хутка гэтая абсалютная ўпэўненасьць зьмяняецца ня тое каб расчараваньнем — але ж сумам, неразуменьнем, разгубленасьцю наступнага зборніка, які выходзіць у 1926 г. і адразу выклікае шквал крытыкі — якраз за гэтае, за сум і разгубленасьць.

Я ня знаю, што будзе заўтра:
Мне сягоньня — апошняй мяжой;
Дні стаяць сталёваю вартай
Паміж будучынай і мной [4, с. 55].

Рызыкоўна было прызнавацца ў гэтым пралетарскаму паэту, абавязанаму верыць у сьветлае «заўтра» і ўслаўляць ягоны прыход. «І залацісьцей, і сталёвей» — зборнік, у якім маладая «бурапена», юнацкая спроба сваёй паэтычнай моцы, першапачатковая гульня ў словы і вобразы саступае месца сапраўднай паэзіі — шчырай, эмацыйнай, па-мастацку вытрыманай. «Высокае парой харaство Дударовых вершаў», — адзавецца на гэты зборнік спагадлівым словам у Вільні Антон Луцкевіч [5, с. 233].

Уладзік!

Дасылаючы разам з гэтым афіцыйную справаздачу, зноў прашу цябе асабіста. Парадзься з Толькам і дайце мне адказ, што рабіць. Я прымаў самыя рашучыя меры для таго, каб падняць працу філіі. Думалася, што ў ранейшым заняпадзе былі вінны школьныя заняткі: і вучні (лестэхнікум), і настаўнікі заняты працай, ня могуць аддавацца маладняцкай працы. Цяпер, здаецца, усе свабодны, але вось табе факты: 6 чэрвеня мы праводзілі вечар Янкі Купалы, прайшоў вечар слабавата, бо ўжо перад вечарам ніяк ня мог склікаць сходу хаця б удзельнікаў вечару; не рабіў дакладу сам, а даў другім (каб больш уцягіваць сяброў у працу); ня прышоў ніхто з тых, хто павінен быў чытаць творы Купалы і свае... Пасьля вечару з 6 чэрвеня (!) мне ўдалося склікаць толькі адзін сход, і ўсе пытаньні, пастаўленыя мною, былі перанесены на чарговы сход. А чарговы я склікаю вось ужо месяц і, нягледзячы на тое, што кожнага бяру ў індывідуальную апрацоўку, цэлы тыдзень перад назначаным днём лаўлю і напамінаю — настане сход — ніводзін не прыходзіць. Лестэхнікумцы — самы актыўныя на словах (іх пяцёра), больш, як два месяцы жывуць на вёсцы і ніякіх вестак пра сябе не даюць, хаця пры выезьдзе я задаваў ім цэлы шэраг заданьняў. Паміж іншым, той адзіны сход, які мне ўдалося правесьці ў чэрвені, сабраўся толькі таму, што я дагаварыўся з Гурскім, каб пускалі маладнякоўцаў дармова ў тэатар, дык прышлі, каб атрымаць кантрамаркі. Зь літаратурай кепска. І мая, і прысланая з ЦБ літаратура расьцягнута, а адзіночкам я нічога ня маю даць. Сувязь з Камсамолам слабая. Я як сябра палітасьветкалегіі рабіў там інфармацыю аб працы філіі, атрымаў дырэктывы і вось ужо месяц не магу іх ажыцьцявіць, бо не магу сабраць сходу. З другога боку, у філіі няма камсамольцаў, апрача мяне. Анісаў заявіў аб выхадзе зь філіі, бо ён зусім ня бачыць, каб зь філіі што-небудзь вышла. Папраўдзе кажучы, я зусім зь ім згодзен. Філія фактычна распалася, і ў тым не мая віна, бо зь нічога ня зробіш нічога. Філія ўвесь час пералівала з пустога ў парожняе, гэта ўсказывае хаця бы тое, што мне неяк гвалтам удалося толькі адзін раз паставіць на разгляд літаратурны твор — рэшта пытаньняў былі выключна арганізацыйныя. Філія паступова паміралa і цяпер памерла зусім. Мне шкада толькі трох нашых адзіночак: Драгілева, Туліцына і Мікуцкага — здольныя хлопцы і прападуць без кіраўніцтва. Я пробаваў наладзіць тут журнал, магчымасьці знайшліся б, але маёй думкі не падтрымаў акругкам КСМ. Я нічога ня мог зрабіць. Цяпер я рашыў распусьціць стары склад філіі і арганізаваць новую па прынцыпу студыі. Але тут зноў ёсьць сур'ёзная перашкода: праз тыдзень я іду ў адпуск і выяжджаю ў Менск. Адмовіцца ад отпуску не магу, бо гэтыя паўгода, што я пратарчаў тут, уканец расхісталі маё здароўе. Частыя галадоўкі, вечныя лаянкі ў рэдакцыі на грунце беларусізацыі — усё гэта пакінула на мне глыбокі сьлед. А тут яшчэ сазнаньне свайго бясьсільля: я ў рэдакцыі выконваю толькі тэхнічную працу і не магу аказаць аніякага ўплыву на працэс беларусізацыі... Але гэта ўжо справа другая, аб гэтым можна будзе пагаварыць у Менску. Я хацеў бы перабрацца ў Слуцак альбо, у крайнім выпадку, у Воршу ці Віцебск, калі няможна ў Менск. У Віцебску, напрыклад, для працы ёсьць добрая глеба, ёсьць адпаведны склад. Толькі пасьля адпуску я ні за што не вярнуся ў Полацак, хаця бы мне прышлося кінуць усё. Я магу працаваць, хачу працаваць і буду працаваць. Толькі ня ў Полацку. Полацак мяне згнаіў і фізычна, і можа маральна. Ад вас я атрымаў толькі цыркуляры ды нявыказаныя абяцанкі. Дужа прыкра, што прыходзіцца вам аб гэтым пісаць, але гэта так. Дасягненьні я маю тут вялікія: калі раней я меў хоць кроплю здольнасьці, дык у Полацку я яе страціў. Я хлопец цярплівы, і калі некалькі разоў прасіў, каб мяне ўзялі з Полацку, дык, знача, на гэта была прычына. У вас, у маладнякоўцаў, не хапіла чуткасьці, каб зразумець, чаму я вырываюся адсюль. Нарэшце, будзе пра гэта. Я перакананы, што альбо не атрымаю ад вас ніякага адказу, альбо атрымаю прыблізна такі: «нічога ня зробіш, пацярпі, працуй і г. д.».

Канкрэтна: праз тыдзень я выяжджаю ў Менск. Пакуль што ў адпуск. Але пасьля адпуску ў Полацак я не вярнуся. Дзеля гэтага падумайце, каго прыслаць на маё месца. Мая парада — прыслаць сюды Пушчу — у яго можа што-небудзь і выйдзе: праца тут якраз па ім: стаўка ў рэдакцыі — 75 рублёў, к восені будзе можа ганарар. Жыцьцё дзяшовае і ўсякія там

Язэп Пушча, Алесь Дудар і Андрэй Александровіч. 1924–1925 гг.



усходнія асалоды таксама недарагія. Пры тым працы ў рэдакцыі мала, а больш яго тут ніхто нагружаць ня будзе. Ён здолее, таксама як я, рабіць выезды і г. д. Гэты ліст дойдзе да 20-га. Я думаю, што вы маглі б прыслаць мне намесьніка к таму часу. Я чакаю прыблізна да 23-га. Толькі прысылайце праз аддзел друку АПО, бо тут яго прыжмуць так, як прыжалі раней мяне.

Вось прыблізна і ўсё. Ага. Паведаміце мяне, ці ня можна куды ўклеіць маю паэму «Сонца ўстане» — аб барацьбе ў Кітаі і наогул на Ўсходзе, аб нацыянальным руху. Радкоў каля 500. Аб гэтым паведаміце тэрмінова. Вось пакуль што ўсё. Аб гэтым лісьце папрашу, каб не даводзілася да ведаму ўсяго ЦБ — гэта для цябе і Толькі. Пасьля прыезду ў Менск зраблю вусную больш падрабязную справаздачу.


З камсамольскім прывітаньнем Ал. Дудар.

14-VII-25 г.

Менавіта з 1926 году ў публічнай беларускай прасторы распачынаецца жорсткая літаратурная дыскусія, якая будзе доўжыцца ажно да 1929 году, пакуль кіроўная партыя ня спыніць увогуле ўсе магчымыя дыскусіі. Пасьля расколу «Маладняку» і ўтварэньня літаратурна-мастацкага згуртаваньня «Ўзвышша» барацьба паміж двума аб'яднаньнямі прымае часам недапушчальны характар: абодва бакі вінавацяць адзін аднаго ў адыходзе ад пралетарскай лініі, ва «ўхілах» і «нацдэмаўшчыне», пераходзяць на асобы, кпяць з магчымага і немагчымага, а часам наўпрост абражаюць удзельнікаў літаратурнага працэсу — усё гэта горача, жорстка, наўзмах, цалкам адпаведна характарам завадатараў «бойкі» Ўладзімера Дубоўкі і Алеся Дудара. Апошні ў гэтай дыскусіі выступае пад адмысловым псэўданімам, узятым дзеля працы ў крытычнай галіне, — так зьяўляецца адзін з самых палымяных і вострых крытыкаў міжваеннага часу Тодар Глыбоцкі. У 1928 годзе выходзіць нават зборнік крытычных артыкулаў Глыбоцкага пад агульнай назвай «Пра літаратурныя справы», першая такая спроба ў маладой беларускай крытыцы. Сярод абуральных і нават недапушчальных з этычнага боку артыкулаў, скіраваных супраць «Узвышша», у гэ-

тым зборніку знайшлі месца сапраўды сур'ёзныя крытычныя разборы паэзіі Паўлюка Труса, Тодара Кляшторнага, артыкулы, прысьвечаныя агульнаму становішчу маладой беларускай літаратуры, — і ў іх выразна відаць індывідуальны творчы почырк таленавітага крытыка, ягонае ўменьне апэраваць эстэтычнымі й літаратуразнаўчымі катэгорыямі, пільнае вока ўважлівага чытача і строгая сыстэма каштоўнасьцяў прыроджанага філёляга.

У 1927 годзе Алесь Дудар разам з Анатолем Вольным зьдзяйсьняюць сьмелую задуму: яны едуць у Сібір дзеля пошуку беларускіх вёсак, закладзеных на пачатку стагодзьдзя беларусамі-перасяленцамі. Найперш паэтаў хвалюе, ці ёсьць у тамтэйшых беларусаў магчымасьць чытаць і вучыць дзяцей па-беларуску. Ваколіцы Новасібірску і Іркуцку, Кругабайкальская чыгунка і аддаленыя пасёлкі вакол



Усебеларускае аб'яднаньне паэтаў і пісьменьнікаў
„МАЛАДНЯК"
ПОЛАЦКАЯ ФІЛІЯ.

Полацак, ... дня 192 году.

Уладзік!
[illegible] разам з [illegible]
[illegible] справаздачу, [illegible]
[illegible] табе асабіста. Парадзь
[illegible]кам і дайце мне
[illegible], што рабіць. Я прыма[illegible]
[illegible] рашучыя меры
[illegible], каб падняць
[illegible] філіі. Думаюся,
[illegible] рэнесінскім заняць
[illegible] быці вінна [illegible]
[illegible] занятках і вуліцы
([illegible] ахінуці) і настаўніцкі
[illegible] [illegible] працай, што ма-
[illegible] адаваць маладнякі-
[illegible]кай працы. Цяпер, здаецца,
[illegible] свабодны, але вось

Ліст А. Дудара да У. Дубоўкі, 14.07.1925

Байкалу — усё гэта пабачана на свае вочы і строга праінспэктавана ў пытаньнях беларусізацыі. Вынікам паездкі стануць беларускія бібліятэкі, скамплектаваныя сібірскімі беларусамі з кніг, прывезеных паэтамі, а таксама падрабязны ліст Дудара і Вольнага ў ЦК КПБ са справаздачай і прапановамі. Ліст гэты меў і адміністрацыйны вынік: спэцыяльнай пастановай ЦК быў зацьверджаны плян беларусізацыі адукацыі ў перасяленцкіх вёсках [1; 7].

У тым самым годзе Алесь Дудар, Анатоль Вольны і Андрэй Александровіч выдаюць першы беларускі падлеткавы прыгодніцкі раман — «Ваўчаняты». Ня надта складаны сюжэтам і ня вельмі апрацаваны памастацку, ён становіцца ўлюбёным чытвом беларускае дзятвы: за два гады «Ваўчаняты» вытрымліваюць пяць (!) перавыданьняў.

Здаецца, звонку жыцьцё ідзе сьветлым шляхам: Алесь Дудар аднаўляецца на другім курсе БДУ, уваходзіць у склад творчай групы «Полымя», выпускае зборнік вершаў «Вежа» і кнігу апавяданьняў «Марсэльеза», нарэшце прыводзіць у свой пакой на вуліцы Правадной маладую, даўно каханую, дзяўчыну: пасьля двух гадоў палымяных заляцаньняў пагаджаецца стаць ягонай жонкай прыгожая і таленавітая паэтка-«маладнякоўка» Натальля Вішнеўская.

Але ж у гэты самы час паглыбляецца ўнутраная супярэчнасьць. Паэт выразна адчувае, як павольна, але няўхільна згортваецца тая дзяржаўная палітыка, у якую ён верыў і дзеля якой быў гатовы трываць нязручнасьці паэтычнага існаваньня ў савецкай дзяржаве: Беларусь становіцца выразна небеларускай. На працягу 1927–1928 гадоў Алесь Дудар — зацяты барацьбіт за беларушчыну ў Беларусі: найвастрэйшыя публіцыстычныя выступы канца дваццатых — і «тэатральная дыскусія», падчас якой сьцьвярджалася права беларускага тэатру на свой, беларускі рэпэртуар, і «ліст трох», у якім пісьменьнікі-студэнты пратэставалі супраць фіктыўнай беларусізацыі БДУ, — маюць аўтарам найперш Алеся Дудара.

Менавіта ў 1928 годзе зьяўляюцца і тыя вершы, якія пісаліся сьвядома не для друку, бо відавочна не маглі быць надрукаванымі. Сучасьнікі Дудара ведалі іх з рукапісных копіяў, нашчадкі — з копіяў, зьнятых Уладзімерам Міхнюком у часова адкрытых архівах КДБ: «Цені блудзяць па твары...», «Я радзіўся за хатай пад плотам...» і легендарны «Пасеклі наш край папалам...» — наймацнейшыя ўзоры грамадзянскай лірыкі, нечуваныя і немагчымыя ў тагачаснай беларускай літаратуры.

Але і тое, што празь недагляд цэнзуры друкавалася, з галавой выдавала цяжкія разважаньні паэта над складанай, бязьлітаснай эпохай, у якую давялося жыць: вершы «Стары лясун» і «Зварот», апавяданьне «Вецер з Усходу» далі падставу крытыкам аб'явіць Дудара ці не галоўным ворагам рэвалюцыі і ўлады.

У сакавіку 1929 году Алеся Дудара першы раз арыштавалі, а 1 красавіка выслалі на тры гады ў Смаленск. Ягоны чарговы зборнік «Чырвоная сталіца», здадзены ўжо ў друкарню, літаральна зьнялі з машыны і зьнішчылі. Прозьвішча ягонае выкрэсьлівалі з вокладак часопісаў, кнігі — пакрысе зьнікалі зь бібліятэчных паліц. У 1930 годзе ў высылцы Алесь Дудар будзе арыштаваны паўторна і этапаваны ў менскую турму — разгортвалася сьледзтва ў сфабрыкаванай справе так званага «Саюзу вызваленьня Беларусі», па якой 108 беларускіх культурнікаў, сярод якіх Уладзімер Дубоўка, Адам Бабарэка, Язэп Пушча, Уладзімер Жылка ды іншыя, рушаць у высылку ў Сібір. Алеся Дудара прымусяць напісаць пакаянны ліст і «антынацдэмаўскі» верш — і адправяць дабываць высылку па першым прысудзе.

Па вяртаньні ў 1932 годзе Алесь Дудар апынуўся ўжо ў зусім іншай краіне. Былы завадатар і актыўны ўдзельнік літаратурнага працэсу, цяпер ён — парыя. Яго ня згадваюць ані ў водным сьпісе «таленавітых», «вядомых» ці «заўважных», не запрашаюць да ўдзелу ў гучных літаратурных праектах, зь цяжкасьцю, аглядаючыся, друкуюць. Дзіўным чынам удаецца яму апублікаваць у 1932 годзе ў «ЛіМе» вялікі верш «Экзотыка», прысьвечаны барацьбе малых скалянізаваных народаў за сваю незалежнасьць ад мэтраполіяў — апошні, напэўна, «эзопаў» выступ паэта супраць русіфікатараў. З 1933 году ён жыве найперш перакладамі.

Менавіта ў гэтыя гады ён напоўніцу рэалізуе назапашаны моўны скарб: французская і нямецкая, якія пачынаў вучыць у гімназіях і ўдасканальваў самавукам; польская і ўкраінская, якія ведаў як кожны лінгвістычна адораны беларус; вядома, расейская. У трыццатых Алесь Дудар — самы кваліфікаваны беларускі перакладнік; тыя, хто мог бы скласьці яму канкурэнцыю, — Уладзімер Дубоўка, Юрка Гаўрук, Юлі Таўбін — адбываюць выракі ў высылцы, колькасьцю ж вывучаных і выкарыстаных моваў Алесь Дудар і па сёньня — адзін з самых адукаваных нашых літаратараў. У ягоным перакладніцкім партфоліе знойдзецца нават пераклад «Атэла» Ўільяма Шэксьпіра, хоць ангельскай мовы Дудар акурат ня ведаў — і таму дзеля патрэбаў БДТ рабіў перастварэньне з расейскага перакладу Ганны Радловай. Маючы на ўтрыманьні старых бацькоў, якія ўжо не маглі працаваць, і сястру, якую трэба было вучыць, перакладнік бярэцца і за такую працу — дзеля ганарараў.

У 1936 годзе Беларусь разам зь іншымі савецкімі рэспублікамі рыхтуецца да ўгодкаў сьмерці Аляксандра Пушкіна: 1937 — сто гадоў сьмяротнай дуэлі. Камісія падрыхтоўкі юбілею прымае рашэньне выдаць у 1937 годзе ўсе значныя творы Пушкіна ў перакладзе на беларускую. Старшыня камісіі

Наталья Вішнеўская (меркавана 1925—1926 г.)



Янка Купала, разьмяркоўваючы сярод пісьменьнікаў творы клясыка, безумоўна, улічваў здольнасьці й магчымасьці кожнага. Пачэснае права стаць першым беларускім перакладнікам славутага «Анегіна» ён аддаў Алесю Дудару — літаратару выключнага густу, высокай паэтычнай культуры, багатага творчага і жыцьцёвага досьведу, чалавека, тэмпэрамэнтам і характарам шмат у чым падобнага да аўтара «Анегіна».

Пераклад быў скончаны ў кастрычніку 1936-га, а 1 лістапада гэтага ж году Алесь Дудар быў арыштаваны трэці раз. Ішла чарговая маштабная хваля арыштаў беларускіх літаратараў: сьледам за ім за краты пайшлі Міхась Зарэцкі, Тодар Кляшторны, Анатоль Вольны, Валеры Маракоў, Міхась Чарот, Платон Галавач, Мойшэ Кульбак, Ізі Харык, усе тыя, каго сёньня мы бачым у сталінскіх расстрэльных сьпісах. Пасьля году допытаў і катаваньняў, 29 кастрычніка 1937 году, трыццацідвухгадовы Алесь Дудар разам зь іншымі паэтамі, пісьменьнікамі, журналістамі, грамадзкімі дзеячамі быў расстраляны паводле выраку «тройкі».

Вольга Іванаўна Дайлідовіч, ягоная маці, пражыла доўгае жыцьцё: яна памерла ў 1962 годзе. Што сын яе памёр, даведалася ў 1954-м — ім выдалі фіктыўную даведку: маўляў, памёр у 1942 г. ад пнэўманіі. Да самай гэтай даведкі яна чакала сына дамоў жывым і падскоквала штораз, калі чула на двары крокі ці нехта грукаў у шыбу: «Шурка прыйшоў!».

Але ён вярнуўся пазьней: спачатку — двумя асьцярожнымі зборнікамі выбраных твораў, падрыхтаваных беларускімі дасьледнікамі С. Баркоўскім і М. Ярошам на пасьлярэабілітацыйнай хвалі, сёньня — томам «Выбраных твораў», у які ўвайшоў і «Анегін», захаваны ў сям'і паэта клопатам ягонай маці, а по-

Пісьменьнікі з «Маладняку» на ганку кінатэатра «Культура». Зьлева направа: Алесь Дудар, Васіль Каваль, Аркадзь Мардвілка, Ізраіль Плаўнік, Натальля Вішнеўская, Мікола Нікановіч, Ілары Барашка, Зінаіда Бандарына. Менск, восень 1928 г.



тым — пляменьніцы Лідзіі Малінінай. Вяртаньне Алеся Дудара, як і вяртаньне ягоных паплечнікаў па літаратуры і пакутах трыццаць сёмага — неабходнае і неадменнае, бо разам зь імі вяртаецца тое, што так мэтадычна і пасьпяхова ў нас адбіралі: мужнасьць барацьбы за сваё, упартасьць стварэньня свайго, шчырасьць і шчодрасьць у выказваньні свайго, усьведамленьне свайго права «людзьмі звацца». Урэшце, вяртаецца нашае неба — такое, якога ня ўбачыш нідзе болей, акрамя як у нас. Бо «толькі на Беларусі бываюць такія зялёныя зоркі».

Літаратура

1. *Васілевіч У., Карашчанка І.* Да землякоў, за 4000 кіламетраў... // ЛіМ. 1991. 11 студз.

2. *Вольны А.* Літаратурныя сілуэты. Алесь Дудар // Літаратурны дадатак да газэты «Савецкая Беларусь». 1928. № 10.

3. *Дудар А.* Аб беларусізацыі і «беларусізацыі» // Савецкая Беларусь. 1925. 29 кастр.

4. *Дудар А.* Выбраныя творы. — Мн.: Лімарыус, 2017.

5. *Луцкевіч А.* З усходніх загонаў: літаратурны агляд // Луцкевіч А. Выбраныя творы. — Мн.: Кнігазбор, 2006.

6. *Минская частная мужская гимназия С. П. Зубакина и К. О. Фальковича* // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 467, воп. 1, адз. зах. 77.

7. *Платонаў Р.* «Асноўнае пытанне беларусізацыі — пытанне аб роднай мове...» // ЛіМ. 2000. 18 лют.

8. *Севярынец Г.* Кнігазбор Алеся Дудара // Полымя. 2018. № 3.

Я МАЛАДЫ

Хто прайшоў — галаву павесіў.
(Міліёны пудоў у гадах.)
Ну, а я малады — мне весела
разагнацца ў мяцежную даль.

Мне жыццё — сусьветнае сьвята,
мне прапоны — большы разгон.
Я цяпер без багацьця багаты
на зары квітнеючых дзён.

Гэта кроў не баіцца сьмерці,
гэта сэрца распаліць лёд,
гэтых думак кіпучага сьмерчу
не абгоніць птушыны лёт.

Вось вышэй бы за ўсіх узьняцца,
я увесь — непакорны шквал.
Што ж рабіць, калі дух юнацкі
агарнуў ваяўнічы запал;

што ж рабіць, калі фарбы раніцы
у грудзёх завялі карагод;
што рабіць, калі кроў барабаніць —
заклікае ісьці у паход?

Хто прайшоў — галаву павесіў.
(Міліёны пудоў у гадах.)
Ну, а я малады — мне весела
разагнацца ў мяцежную даль.

[1924]



Алесь Дудар пасьля вяртаньня з высылкі, 1934 г.

ЦЕНІ

Ах, цені, цені... паляглі вы
усходняй казкай на асфальт...
Сплылі разьлівам він гульлівых
на думак адзьвінеўшы жаль.

І я, як вы, блудзіў па сьвеце,
туляўся ў выбаінах зор.
Мне ў вочы кідаў вецер сьмецьце
старых, забытых абразоў.

Цяпер ізноў спляліся цені
ў чароўны, казачны вузор,
а я ўжо зьдзейсьніў летуценьні
ў чырвоных выбаінах зор.

І песьняй сьветлаю спавіты,
і адзьвінеў, адплакаў жаль...
І цені казкаю блакітнай
ляглі на гарадзкі асфальт.

[1925]

* * *

За маім акном — абрывы,
А на дне іх — пыльны брук.
Ў дротах мечацца пужліва
Сонца — вогненны павук.

Ліжа жоўтыя каменьні
Ценяў шэрая кайма —
Звонка ляскае аб землю
Іскрай звонкаю трамвай...

Ах, я знаю!.. Звонкім гулам
Ўсьпеняць раніцу гудкі,
Загудзіць завод, як вулей,
Запыхцяць рухавікі...

Гэй, далёкія палеткі!..
Над ракой сутулы клён!..
Наш пасеў — жалезных кветак
Забуяніў над зямлёй...

Можа, заўтра паравозы
загудзяць паміж лясоў,
можа, зьвякне вербалозьзе
намі зробленай касой...

За маім акном — абрывы,
Пад бальконам скача цень...
Тут вясною гаварлівай
Сіні клён не расьцьвіце.

Не запеніць тут адценьняў
Жаўтатканая трава...
Звонка ляскае аб землю
Векам будучым трамвай.

[1925]

* * *

Заблудзіла зялёная зорка —
Атуманіў яе сусьвет...
У зарніц залатой паласе
Заблудзіла зялёная зорка.

І вандруе ў срыбрыстай расе
І шукае дарогі ў змроку...
Заблудзіла зялёная зорка —
Атуманіў яе сусьвет.

[1925]

* * *

І ў нязнанай цьмянай далі словаў новых мы шукалі,
Словаў новых мы шукалі і ня здолелі знайсьці,
А ў жытнёвым у прасторы рассыпалі песьні зоры,
Рассыпалі песьні зоры каля возера ў трысьці.
І ня думалі ніколі, што у нашай моцы доля,
Што у нашай моцы доля і ня вырвецца ад нас;
Не магло нам і прысьніцца — нашых думак калясьніца,
Нашых думак калясьніца — гэта сьвету апаяс.
Хто ж казаў, што ў цьмянай далі словаў новых мы шукалі,
Словаў новых мы шукалі і ня здолелі знайсьці?
Новы дзень не за гарамі. Наша доля будзе з намі,
Наша доля будзе з намі днямі новымі цьвісьці.

[1925]

ТРЫЮМФ

I

Я ня знаю, што будзе заўтра:
мне сягоньня — апошняй мяжой;
дні стаяць сталёваю вартай
паміж будучынай і мной.

Знаю толькі — будзе другое,
заквітнеюць другія дні...
Сёньняшняе ўсё і дарагое
непатрэбным стане другім.

Можа, заўтра будуць сьмяяцца,
можа, будуць сьмяяцца з паэта...
Зарастуць дарогі рутай-мятай,
зарастуць дарогі белым цьветам.

Гэтак кніга — адкрылі і закрылі,
прачыталі — дый зноў на паліцу...
Бачу Будучыну зь сінімі крыламі,
стану і буду ёй маліцца.

II

Гаварылі, сьмяяліся, плакалі,
гандлявалі душой і целам...
— Хто ня з намі — зацкаваць сабакамі,
не жыцьцё таму на сьвеце белым.

І ўзялі паяскі і лапці,
і кашулі надзелі зрэбныя...
— Нам цяпер сьмяяцца, ня плакаць,
нам нічога болей ня трэба.

І хадзілі другія ў смокінгах,
і курылі тытун заморскі:
а такія ня ўскінуць вокам
ня бязьлітаснасьць і на жорсткасьць.

Не хачу ў чужое ўбірацца,
Каб лякеркі блішчэлі на нагах.
Калі ж лапаць — адзнака нацыі,
дык і я тады — рэнэгат!..

III

Мне пляваць на сьвятых і на бога...
Знаю — цудаў нідзе не спаткаць.
Вось каб мне заснуць надоўга, –
сотні, тысячы год праспаць.

Я прачнуся у іншым сьвеце.
Што там будзе?.. Ня мне згадаць...
Можа, будзе адменены вецер
і вісецьме дзень на правадах.

Можа, кожны камень заіскрыцца.
Будуць дзеці ад мяне ўцякаць.
Завядуць мяне людзі ў зьвярынец
і напішуць: «РУКАМІ НЕ ЧАПАЦЬ!».

Буду я глядзець і дзівіцца,
як зьмянілася ўсё на сьвеце.
Можа, мне як-небудзь прысьніцца
наша поле, сонца і вецер.

[1924]

*** * ***

Маліліся пад крыжам,
Хісталіся ад зморы;
А я, як чарнакніжнік,
Лічу на небе зоры.

Шукаю я заўзята
Дарогі з родных вязяў —
Мкне сэрца азіята
У сінь таемных Азій.

Да казак сінявейных,
Няпісанае праўды...
Самкнуць такія зьвеньні,
Каб заіскрыла радасьць;

Спазнаць такія далі,
Знайсьці такія тропы,
Каб праўнукі ня зналі
Ні Азій, ні Эўропаў...

Ці будзе, ці ня будзе,
Імкненьне ёсьць і воля...
І прагнуць, прагнуць грудзі
Прасторaў і сваволі...

Студзень 1926 г.

* * *

Асыпае чэрвень белы сад.
Сок калінавы лугі апаясаў...
Глянь, як раніцы чырвонае віно
срэбраногія бярозкі заліло!

Разважалі — быць нам ці ня быць,
шмат зрабілі — трэба шмат яшчэ зрабіць...
Стаў на варце адзінокай сіні клён;
ўсім — і блізкім, і далёкім —
наш паклон.

Прывітаньне шчыра — ад душы...
Сіл няма такіх, каб нас перадушыць!
Мора пенай разаб'ецца аб граніт —
хай жа кажуць, што ні мэты, ні граніц.

Заплятайцеся, пралескі, у вянок —
плешча радасьці чырвонае віно.
Будзе вецер сівагрывы варажыць
пра свае і пра чужыя рубяжы.

Што нам пацеркі з старых рабін?
Можам самі сабе сьцежку церабіць;
хопіць сілы для чужых і для сваіх,
каб сабою перамогу засланіць.

Будзе праўда з тым, хто перамог,
пераможанаму — крыўда і ярмо...
Ой ты, клён сінегаловы, стройны клён,
па-над возерам празрыстым, быццам шкло!

Асыпае чэрвень белы сад.
Сок калінавы лугі апаясаў...
Нашай раніцы чырвонае віно
срэбраногія бярозкі заліло.

[1926]

КНІГА

Змора ня хіліць, ня вабіць яда
ад вобразаў, слоў і форм.
Паэта нарэшце скончыў і здаў,
і кніга пайшла ў набор.

Гарэла вітрына у сотні фарб.
Кніг столькі — глядзі ды глядзі!..
Паэта ж убачыў поўны чар
маленькі томік адзін.

За годам год — чарада прайшла.
Шмат кніг — вялікіх, малых...
Хто ўспомніць, канчаючы дальні шлях,
слупоў прыдарожных лік.

І там, на асфальце, пад шэрай сьцяной,
дзе кнігі расклаў букініст,
вялікі паэта штурхнуў нагой
забытага томіка ліст.

[1928]

ЗВАРОТ

Вецер вее з усходу — суровы такі.
Тонка стогнуць і гнуцца на дол хмызьнякі —
Я шагаю ў палоне ліпнёвай красы,
Пад маёю нагой верас суха шуршыць;
І ядловец, відаць, зацікавіўся мной,
Дык калючкамі шэпча: «спыніся, пастой!»
На балоце дзьве чаплі — іх дзюбы, як кроў;
Прывітаньне ім шлю я стамлёнай рукой:
Разгарнуліся крыльлі, ўзьляцелі ўдваіх,
Нечаканы прывет мой спужаў, мабыць, іх...
Вецер вее з усходу, ды з нашых расьлін
Пыльцу хмарай трасе, каб буйней парасьлі,
Каб і жыта гуло, і хістаўся ячмень,
Як вялося даўней — без паправак ды зьмен.
А за лесам красуе канаючы дзень —
Разам зь ветрам і вечар з усходу прыдзе.
Лёг туман у тры столкі на рэчку, на луг;
Чутна — ў вёску каровы зганяе пастух;
Чутна — недзе каса зазьвінела аб плот —
Гэта людзі ідуць зь сенажацяў, з балот,

Раніцою з сабой хлеба ў торбу ўзялі,
А назад прынясьлі на руках мазалі...
Заўтра раненька-рана пайду зь імі я...
Добры дзень, добры вечар, краіна мая!

Ліпень 1928

ХРУШЧЫ

Май за вокнамі гэтакі самы —
Поўны сонца, вясны і паэм...
Пераліўнымі галасамі
Кветка кветцы вясьнянкі пяе.

Шэры вечар ўстае па-над садам;
Рой хрушчоў каля сьлівы бубніць.
Ў іх гудзеньні ўчарайшая праўда,
Ў іх гудзеньні прайшоўшыя дні.

Так, здаецца, даўно ўжо мінула,
А ўспамінаў не перамагчы...
...Як хрушчы, там гудзелі кулі
І, як кулі, гудзелі хрушчы.

Гэткім самым вось змрокам малочным
Ад заставы яе прывялі.
Гнеў, нянавісьць і чорныя вочы —
І бязьлітаснасьць гэтых хвілін!..

Ды ня чорныя вочы, другія —
Як крыло маладога хрушча.
Толькі б глянуць у іх — дый загінуць
Ці жыцьцё па-другому пачаць...

А за вокнамі майская радасьць...
Абшукалі!.. Аб чым гаманіць...
Пазнаходзілі пляны, загады.
...Падцягнулі на стрэльбах рамні...

Павялі... Тыя дні — без малітвы,
У кіпеньні няспыннай хады:
Мы вялі паміж ямаў і рыцьвін
Рэвалюцыю ў тыя гады.

Я стаяў і напружана слухаў.
Сад чароўны трымцеў цішынёй...
Раптам хрушч прагудзеў над вухам
Ды, як куля, упаў на вакно.

Я глядзеў, дзівaваўся моўчкі;
Ён разгортываць крыльлі пачаў...
Выстрал... Крык... Дзесьці згасьлі вочы,
Як крыло маладога хрушча.

Зь перамогай прыйшла і слава,
Дык ці можна ахвяр шкадаваць?
Кожны з нас быў гатоў для справы
Сэрца ўласнае ахвяраваць.

Толькі вочы адны мільганулі —
Ў іх нянавісьці ручаі...
...Як хрушчы, там гудзелі кулі
І, як кулі, гудзелі хрушчы.

1928

*** * ***

Я радзіўся за хатай пад плотам,
Дзе з крапіваю шэпчацца вецер.
А мой край — лясы ды балоты —
Даражэй мне за ўсё на сьвеце.

Усё люблю я ў табе, край мілы —
Край мужычага хамскага роду,
Край, дзе з цэлага сьвету грамілы
Да багацьця шукалі дарогу.

Хто імя беларуса ня ганіў,
Хто ня сраў у мужычых хатах,
Хто людзей не таптаў пад нагамі —
Той заўсёды мне будзе братам.

Хто ж мой край асьмяяў, абняславіў,
Згвалтаваў беларускія мары —
Хай спытае паноў у Варшаве,
Хай спытае маскоўскіх жандараў.

Знае ўсяк, як лясная варта
Шанавала нязнаных гасьцей.
Было ўчора так, будзе заўтра.
Курганам не схаваць касьцей.

Беларус я — радзіўся пад плотам,
Дзе з крапіваю шэпчацца вецер.
Родны край мой — лясы і балоты —
Даражэй мне за ўсё на сьвеце.

[1928]

* * *

Пасеклі наш край папалам,
Каб панскай вытаргаваць ласкі.
Вось гэта — вам, а гэта — нам,
Няма сумленьня ў душах рабскіх.

І цягнем мы на новы строй
Старую песьню і чужую:
Цыгане шумнаю талпой
Па Бесарабіі качуюць...

За ўсходнім дэспатам-царком
Мы бегаем на задніх лапах,
Нью-Ёрку грозім кулаком
І Чэмбэрлена лаем трапна.

Засыплем шапкамі яго,
Ура, ура — патопім ў соплях.
А нас тым часам з году ў год
Тут прадаюць ўраздроб і оптам.

Мы не шкадуем мазалёў.
Мы за чужых — праклёны роім,
Але бяз торгу і бяз слоў
Мы аддаем сваіх герояў.

Ня сьмеем нават гаварыць
І думаць без крамлёўскай візы,
Бяз нас ўсё робяць махляры
Ды міжнародныя падлізы.

Распаўся б камень ад жальбы,
Калі б ён знаў, як торг над намі
Вядуць маскоўскія рабы
Зь вялікапольскімі панамі.

О, ганьба, ганьба! Ў нашы дні
Такі разлом, туга такая!
...І баюць байкі баюны
Северо-Западного края...

Плююць на сонца і на дзень.
О, дух наш вольны, дзе ты, дзе ты?
Ім мураўёўскі б гальштук ўзьдзець,
Нашчадкам мураўёўскім гэтым...

Але яшчэ глушыце кроў.
Гарыць душа, і час настане,
Калі з-за поля, з-за бароў
Па-беларуску сонца гляне.

Тады мы ў шэрагах сваіх,
Быць можа, шмат каго ня ўбачым.
З тугою ў сэрцы ўспомнім іх,
Але ніколі не заплачам.

А дзень чырвоны зацьвіце,
І мы гукнем яму: «Дабрыдзень».
Ці са шчытом, ці на шчыце
Ў краіну нашу зноў мы прыйдзем.

[25 траўня 1928 г.]

*** * ***

Цені блудзяць па твары,
Сэрца точыць нуда.
Сёньня лепшы таварыш
Можа цябе прадаць.

Сёньня ня верыць нікому,
Можа, я сам шпіён.
Сьціснуць рукамі скроні,
Няхай пагасьне агонь.

Многія маюць сховы
Ў шкліцах чырвоных маніст.
Скажы па-свойму слова —
Крыкнуць — ты шавініст.

Будзіць волатаў косьці,
Будзіць сафійскі звон.
Прышлі вы да нас у госьці
І нам надзелі ярмо.

[1928]

НА СТАНЦЫІ

Жыцьцё імчыцца ў даль за сэмафоры,
Дзе ціш палёў, дзе гулкія лясы,
Дзе сіньню разатканыя прасторы
Птушыныя калышуць галасы.

А тут, за вадакачкаю цыбатай,
Ў балотцы жабы стогнуць цэлы дзень,
Мычаць каровы, сьцежкі пахнуць мятай,
Ад ліп старых паўзе маўклівы цень.

Тут сонца колеру чырвонай медзі
На насыпах пад вечар зіхаціць;
Ля будкі барадатыя суседзі
Сышліся перад сном пагаманіць.

А на пэроне ўвечары дзяўчаты
Глядзяць прыветна ў вокны цягнікоў
І парамі вяртаюцца дахаты,
Да звыклых кветак і нязвыклых сноў.

Калі ж лугі агорнуцца ў туманы,
Маўклівасьць лес напоўніць давідна,
Дык будзе рэек сплёт адшліфаваны
Гудзець, нібы басовая струна.

І калі будуць шпаркія вагоны
Ля нас у даль бяскрайнюю імчаць, —
Мы ведаем: на нашыя загоны
Уважлівыя вочы іх глядзяць.

Але як скажа час і нам падняцца,
Дык, углядзеўшыся ў сьвятло ці ў змрок,
Мы ўбачым сотні гэткіх самых станцый
На дальняй трасе Менск—Уладзівасток.

І нам дзяўчаты яснымі вачыма
Са сьвежасьцю сямнаццаці гадоў
Перададуць ад Мурманску да Крыму
Прывет для незнаёмых сваякоў.


І мы памчымся зь весткаю шчасьлівай
Праз гулкі лес, праз жоўтыя палі...
Мы не адны на станцыі маўклівай,
На цёплай нашай, сонечнай зямлі.

[1936]




Вольф Рубінчык

я — прага быць...



Майсей Кульбак



Я — прага быць,
я — станаўленьня сьпеў,
Я — запавет
Таго, у кім старым віном кіпеў
Наш п’яны сьвет!

Майсей (Мойшэ, або, на мясцовых дыялектах ідышу, Мэйшэ, Мэйсэ) Кульбак быў шматграннай асобай: ня толькі паэтам і празаікам, але і перакладнікам, пэдагогам, драматургам, тэатральным рэжысэрам, філёзафам. Ён ня меў фармальнай філязофскай адукацыі, але з мудрасьцю ставіўся да літаратуры й жыцьця.

Па Кульбака прыйшлі 11 верасьня 1937 году. Адказнасьць за сьмерць паэта, расстралянага 29 кастрычніка таго самага году, нясуць: наркам унутраных справаў БССР Барыс Берман і яго маскоўскі шэф Мікалай Яжоў; члены палітбюро, пачынаючы ад Сталіна, якія далі санкцыю на суд; нейкі Фарбер (непасрэдна арыштоўваў паэта); Іван Матулевіч — начальнік выязной сэсіі вайсковай калегіі Вярхоўнага суду СССР, які разам зь іншымі членамі калегіі апэратыўна афармiў вырак Кульбаку дый многім беларускім літаратарам.

Дата расстрэлу доўгі час замоўчвалася нават пасьля афіцыйнай рэабілітацыі Майсея Саламонавіча Кульбака ў сьнежні 1956 г. У выданьнях другой паловы XX ст. за год яго сьмерці найчасьцей лічыўся 1940-ы.

Творы Кульбака перакладаліся зь ідышу, апрача беларускай і расейскай, на ангельскую, літоўскую, нямецкую, польскую, украінскую, французскую, іншыя мовы. Зразумела, і на іўрыт таксама — дарэчы, старажытнагабрэйскай мовай Кульбак добра валодаў, на ёй пачынаў пісаць вершы. У сярэдзіне 1910-х гадоў перайшоў на больш «народны» ідыш, як тое здаралася з многімі яўрэйскімі літаратарамі канца XIX — пачатку XX ст., напрыклад з Мэндэле Мойхер-Сфорымам.

Найбольш перакладалі ў сьвеце апошні раман Майсея Кульбака «Zelmenyaner» («Зэльманцы», або «Зэлмэнянцы», як прапанаваў Андрэй Дубінін [5]; другі варыянт быў прыняты і ў беларускамоўнай прэсе 1930-х гадоў). Аднак, напрыклад, у 2017 годзе ўбачылі сьвет як новая нямецкамоўная вэрсія «Зэльманцаў», так і пераклад на нямецкую больш раньняга, сьціслага кульбакаўскага раману «Панядзелак» (1926) [4; 8], французскамоўная вэрсія якога існуе ўжо даўно.


У позьнесавецкай Беларусі творчасьць Кульбака была культавай у коле рэстаўратараў-ідышыстаў, дзе рэй вёў Алег Хадыка; рэстаўратары шмат зрабілі для пашырэньня ведаў пра пісьменьніка і пасьля краху СССР. Нямала згадак пра Кульбака пакінуў паэт Гірш (Рыгор) Рэлес. Значна маладзейшы за Кульбака, ён ня раз сустракаў яго ў Менску сярэдзіны 1930-х гадоў.


Агулам, апошнія 5–10 гадоў цікавасьць да спадчыны Кульбака расьце. Так, у 2014 г. выйшаў музычны альбом гурту «Літвакус»; адна з кампазыцыяў уяўляе сабою песьню на словы Кульбака, дый увесь альбом названы «Райсн» («Беларусь») у гонар знакамітай кульбакаўскай паэмы. Гэты сюррэалістычны твор быў



Майсей Кульбак з жонкай Зэльдай і сынам Элем, 1930 г.

Розныя выданьні рамана «Зэльманцы».














напісаны ў Бэрліне, дзе Кульбак жыў у 1920–1923 гг., і прысьвечаны родзічам пісьменьніка — сельскім яўрэям з-пад Смаргоняў, абмаляваным ледзьве ня ў вобразе біблійных волатаў. У савецкі час паэма перакладалася на беларускую фрагмэнтарна; цяпер ідзе праца над новым, поўным яе пераставрэньнем.

У 2015 г. менскае выдавецтва «Папуры» перавыдала «галоўны» раман Кульбака «Зэльманцы» ў сэрыі «Мая беларуская кніга». На беларускую раман пераклаў Віталь Вольскі яшчэ ў канцы 1950-х гадоў, і кніга 1960 г. аказалася ў Беларусі першай пасьля рэабілітацыі пісьменьніка. На жаль, пераклад Вольскага (рэдактарам выступаў Алесь Кучар) у савецкі час зьведаў шматлікія цэнзурныя праўкі, тым ня менш яго перавыданьне ў XXI стагодзьдзі атрымала добрае водгульле ў прэсе. Беларускія крытыкі загаманілі пра новае адкрыцьцё Кульбака як празаіка [12].[1]

У 2016 годзе пасьля 46-гадовага перапынку ў Менску ўбачыў сьвет самвыдавецкі зборнік паэзіі Кульбака пад назовам «Eybik/Вечна».

У 2016–2017 гг. менскі мастак Андрэй Дубінін падрыхтаваў новы, бесцэнзурны пераклад «Зэльманцаў». Адначасова Сяргей Шупа займаўся перакладам на беларускую раманаў Кульбака «Панядзелак» і «Мэсія, сын Эфроіма» (выйшлі адпаведна ў 2018 г. і 2019 г. — *Рэд.*). У часопісе «Дзеяслоў»



Вокладка кнігі Майсея Кульбака «Выбранае». Мінск: Беларусь, 1970 г.

[1] Л. Рублеўская (як і А. Лявіцкі [4]) мяняе заснавальніка зэльманскага роду «рабінам», хоць з кнігі Кульбака гэта не вынікае. У ёй падкрэсьлена, што рэб Зэльман-Эля Хвост — «просты чалавек» з глыбінкі («рэб» — ветлы зварот да мужчыны).

Фота, якое лічылася галоўным здабыткам сям'і Кульбакаў. Шэсьць братоў Кульбакаў, зьлева направа: Лейбл (Л'юіс), Ільля, Ісер, Вольф (Уільям), Мойшэ (Майсей), Шлома (Чарльз)



выходзілі пераклады п'есы Кульбака «Бойтра» (№ 72, 2014; парупіўся Фэлікс Баторын) і апавяданьня «Муня-птушкавод і яго жонка Малкелэ» (№ 84, 2016; пераклаў аўтар гэтых радкоў).

Вершы й паэмы М. Кульбака ў савецкі час перакладалі на беларускую Сьцяпан Гаўрусёў, Хведар Жычка, Язэп Семяжон і многія іншыя, а ў новым стагодзьдзі — Лявон Баршчэўскі, Васіль Жуковіч, Андрэй Хадановіч, Сяргей Шупа, Ганна Янкута.

Папулярнасьць набыў пераклад жартоўнага верша «Гультай» (гл. тэкст ніжэй), зроблены А. Хадановічам і ўпершыню агучаны на 120-годзьдзе Кульбака ў сакавіку 2016 г. Твор паклаў на музыку Павел Аракелян для праекту «(Не)расстраляная паэзія»; прэм'ера песьні адбылася ў верасьні 2017 г.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што ў 2010-х гадах Кульбак канчаткова вярнуўся ў тутэйшы культурны кантэкст, дзе ён і знаходзіўся большую частку свайго кароткага жыцьця.

Зь імем пісьменьніка ў Беларусі зьвязаны ня толькі Менск, а і Смаргоні, дзе ён нарадзіўся ў сакавіку 1896 г., і Валожын, дзе Кульбак вучыўся ў ешыве з 13 гадоў. Вучыўся ён і ў Сьвянцянскай, а паводле некаторых зьвестак, таксама ў Мірскай ешыве.

Імаверна, прозьвішча Кульбака паходзіць ад «кульбы», г. зн. магло пачаткова быць дадзена кульгаваму або куксатаму. Але Андрэй Дубінін мяркуе, што «Кульбак» — перайначаны мясцовы варыянт назоў нямецкага гораду Кульмбах, што значыць «ручай зь верхавіны».

Далей прапаную 18 тэзісаў-сьцьвярджэньняў пра пісьменьніка, больш ці менш разгорнутых. Лік «18» у габрэйскай традыцыі значыць «жывы». Мне хацелася б паказаць жывога Кульбака, наколькі гэта магчыма праз больш чым 80 гадоў пасьля яго фізычнай сьмерці, і стварыць тут нешта кшталту «Кульбакіяды» (па аналёгіі з «Зэльманіядай», адным з найярчэйшых разьдзелаў раману).

1. Мойшэ Кульбак быў вельмі дасьціпным, з чым згаджаюцца ўсе мэмуарысты. Досьціпамі і самаіроніяй, а таксама чорным гумарам поўніцца ягоны «галоўны» раман «Зэльманцы». Гэтае «начыньне» — не адэскае і ня бабелеўскае, а мясцовае, літвацкае… Што праўда, з дамешкам сарказму, характэрнага для нямецкай паэзіі (у прыватнасьці, Гайнрыха Гайнэ), якую любіў і цаніў Кульбак.

Пара жартаў з мэмуараў Рэлеса — гэтыя жарты прагучалі і ў фільме Ільлі Бажко «Зьніклая паэзія» (2017), прысьвечаным Тодару Кляшторнаму, Мойшэ Кульбаку, Юлію Таўбіну, Ізі Харыку [3]:

На Кульбака насядаў малады паэт сьціплага таленту, але вялікіх амбіцыяў (паводле Рэлеса — Ліпа Г., які час ад часу друкаваўся ў часопісе «Штэрн»). Прынёс яму ў більярдную пры Доме пісьменьніка скрутак вершаў, спадзеючыся на станоўчы водгук. Кульбак разгарнуў, пачытаў, а тады сказаў, як у сук уляпіў: *«У Вас прыгожы почырк, малады чалавек!»*

У Кульбака былі напружаныя адносіны з маладзейшым цёзкам, Мойшэ Тэйфам, які таксама на многае прэтэндаваў у яўрэйскай паэзіі. Аднойчы «другі Майсей Саламонавіч» падышоў да калегаў у сквэры на вуліцы Энгельса, а Кульбак зазначыў пра яго: *«Мойшэ — як птушка»*. Тэйф не зразумеў, у чым падкоп: *«І што такога? Птушка лётае, сьпявае...»* Кульбак азваўся: *«Так, лётае, сьпявае... і гадзіць людзям на галовы!»*

Рэлес рэзюмаваў: *«Майсей Кульбак быў прынцыповы, ня надта шчодры на словы чалавек. Ён не саромеўся гаварыць людзям праўду ў вочы... Будучы вельмі патрабавальным да сваёй творчасьці, ён быў такім жа патрабавальным і да сваіх калегаў па пяры»* [14, с. 280]. І пазьней дадаў: *«Адным сказам ён мог выразіць тое, на што іншаму спатрэбілася б старонка... Калі б усе досьціпы Кульбака былі сабраныя, зь іх склалася б найцікавейшая кніга»*.

2. Кульбак меў дар адаптацыі ў розных абставінах; няблага пачуваўся і на сяле, і ў горадзе, і ў Беларусі, і за мяжой. Гэта знайшло адлюстраваньне ў ягонай творчасьці; што пра вёску і прыроду, што пра горад ён пісаў зь веданьнем справы. Магчыма, гэткая адаптыўнасьць тлумачыцца паходжаньнем яго бацькоў (бацька — прыказчык у лесагаспадарчым прадпрыемстве, маці — зь сялянаў, што працавалі ў яўрэйскай земляробчай калёніі «Карка» пад Смаргонямі).

У першай сваёй паэме «Горад» (1919) Кульбак, апісваючы вялікі і тлумны горад з жалеза і каменю, гаворыць пра самоту і тугу па палях і лясах; мабыць, нездарма пазьней у «Зэльманцах» дзядзька Юда сыходзіць з гораду ў калгас і прыжываецца тамака. Паэма «Беларусь» (1922) апісвае збольшага самадастатковы сьвет, у якім здавён жывуць яўрэі і беларусы па-за гарадзкой цывілізацыяй, але гэты сьвет ужо адзначаны прыкметамі распаду, як і жыцьцё герояў апавяданьня «Муня-птушкавод...» (1928; апавяданьне было своеасаблівым пралёгам да раману «Зэльманцы»).

Усё ж Кульбак, з пэўнымі заўвагамі, — пясьняр мадэрнасьці, экспэрымэнты са словамі ды рытмам яго цешылі, як і гарадзкія новабудоўлі. У асабістым жыцьці пасьля працяглых нягодаў (асабліва ў Бэрліне пачатку 1920-х, дзе часам галадаў) ён цаніў камфорт, пра што сьведчаць мэмуары Мішкет Лібэрман пра Менск пачатку 1930-х. Паводле М. Лібэрман, Кульбак намовіў яе памяняцца кватэрамі і атрымаў у сталіцы БССР прыстойнае жытло, у якім здолеў плённа працаваць [7].



Майсей Кульбак (стаіць другі зьлева) з бацькамі, жонкай, сынам, сястрой, братамі. 1929 г.

Майсей Кульбак з жонкай Зэльдай. 1924 г.



3. З аднаго боку, Кульбак любіў таварыства (у Менску 1930-х гадоў часта меў гутаркі з Зэлікам Аксэльродам, Айзікам Платнэрам, Якубам Коласам, Янкам Купалам, Кузьмом Чорным). Мікола Хведаровіч успамінаў у 1966 г. : *«Я часта сустракаўся з М. Кульбакам, любіў зь ім гаварыць. Ён быў вясёлым чалавекам, у якім жыла, як кажуць, „сьмяшынка-залацінка“, умеў цікава расказваць, і я ня раз бачыў, як Купала, Колас і Чорны сядзелі зь ім на канапе ў Доме пісьменьніка і ўважліва яго слухалі»* [18]. Гірш Рэлес пацьвярджае, што Кульбак *«любіў быць у цэнтры людзкой увагі»* [16, с. 34]. З другога боку, пісьменьнік мог быць даволі замкнёным чалавекам, прынамсі ў Вільні 1920-х *«ні з кім ня быў запанібрата»* (Шлома Бэліс) [1], дый пасьля атрыманьня новага жытла ў Менску на нейкі час *«замкнуўся зусім, пісаў»* (Мішкет Лібэрман) [7]. Рэлес бачыў Кульбака *«суворым, строгім і калючым»* [15, с. 241].

4. Доўга выношваў свае творы, але потым хутка іх запісваў. Рэлес: *«Здаралася, што Кульбак з ранку да позьняга вечара ляжаў на канапе ў асобным пакоі сваёй кватэры і курыў. Яго жонка Жэня нікога тады да яго не пускала, і нават дзеці не наважваліся забягаць да таты. Так ён тварыў… слова „пісаў“ тут не падыходзіць, Кульбак свае творы апрацоўваў у галаве і толькі потым запісваў. Кнігу „Зэльманцы“ Кульбак запісаў за тыдзень, але стварaў яе ня менш за паўгоду»*.

5. У маладосьці трапіў у рамантычную гісторыю; забраў сваю будучую жонку Зэльду (іначай — Яўгенію Эткіну; яны ажаніліся ў 1924 г.) ледзь не зь вясельля, якое яна мерылася ладзіць зь іншым. Пазьней, у 1930-х, Кульбак уставіў гэты эпізод, перапрацаваўшы яго, у п'есу «Бойтра».

Гэтую гісторыю пераказала Шуламіт Шаліт са словаў вучаніцы Кульбака Тамары Гардон: *«Калі Кульбак зьехаў у Нямеччыну, то на нейкі час перастаў пісаць лісты, у тым ліку і Жэні. У гэты час Жэня пазнаёмілася і пасябравала зь біёлягам Спэктарам, у іх пачаўся раман… Спэктар зрабіў Жэні прапанову, яна згадзілася. Быў прызначаны дзень вясельля. І тут зьяўляецца Кульбак. Пачуўшы навіну пра вясельле, ён адразу ж выправіўся да „чужой" нявесты. Прыйшоў і заявіў: „Мяне Спэктар не цікавіць. Хадзем да рабіна. Ты будзеш маёй жонкай". І згулялі вясельле»*. Т. Гардон апісвае Кульбака як надзвычай абаяльнага чалавека, высокага і зграбнага, з паходкай як у марака (г. зн. ён трохі гойдаўся) [19, с. 164–165].

6. За мяжой (у Нямеччыне) быў схільны пісаць пра Беларусь, у Беларусі пісаў пра Нямеччыну. Амэрыканскі дасьледнік Марк Каплан, які аналізаваў творы Кульбака зь беларускімі краявідамі



Майсей Кульбак з жонкай Зэльдай і сынам Элем. 1929 г.

Майсей Кульбак з жонкай Зэльдай, сынам Элем і дачкой Раяй. 1930-я гг.



«Беларусь» і «Мэсія, сын Эфроіма», тлумачыць гэта ў першым выпадку настальгіяй (ня толькі па прасторы, а і па «сваіх» людзях), усьвядомленай і эстэтызаванай. Лягічна дапусьціць, што і на выбар буржуазнага Бэрліну як месца дзеяньня апошняй паэмы Кульбака паўплывала настальгія па найлепшых праявах «эўрапейскасьці», тых, якіх ня мог даць аўтару Менск пачатку 1930-х гадоў.

7. У 1930-х гадах менаваў сябе *«пісьменьнікам-серадняком»* — магчыма, у такой самапрэзэнтацыі была пэўная хітрасьць, спроба адцягнуць ад сябе ўвагу ідэалягізаваных крытыкаў і «органаў». Папраўдзе Кульбак ведаў сабе цану. Яшчэ ў 1920-х гадах у Вільні ён жартаваў: *«Калі мне захочацца прачытаць добры верш — я прачытаю Кульбака»*.

8. Часта і ахвотна ўводзіў у свае творы беларускія матывы, фальклёр. Асабліва паказальная ў гэтым сэнсе «Дуда», «песьня-галашэньне па старой Беларусі», празь якую ўсьцяж праходзіць дзед Бялун, а дзеяньне адбываецца недзе каля Нарачы.

9. Нямала ў Кульбака і твораў з мэсіянскай афарбоўкай. Ня толькі раман пра Мэсію — сына Эфроіма і п'еса «Якаў Франк» (1923), але і, напрыклад, верш «Козачка», таксама напісаны ў пачатку 20-х гадоў. Ён адсылае як да народнай песенькі «Хад-ґад'я», якую набожныя яўрэі сьпяваюць дзецям на Пэйсах, так і да прароцтваў Ісаі пра будучыню, калі людзі ня будуць ваяваць, воўк будзе ляжаць побач з авечкай, барс — з казьлянём (гл. пераклад А. Хадановіча ніжэй).

Агулам, пісьменьнік цікавіўся містыкай, звышнатуральнымі сіламі — усё гэта ня рэдкасьць у ягоных творах і выводзіць творчасьць Кульбака далёка за рамкі бытапісу, уключае ў сусьветны кантэкст. Напрыклад, мышы, якія ў «Зэльманцах» жывяцца месяцовымі промнямі, маюць паралель з птушкай чакорай у індыйскай міталёгіі.

У чымсьці празаічныя творы Кульбака блізкія да гогалеўскіх і да булгакаўскіх; зь вядомых ідышамоўных пісьменьнікаў традыцыю «народнай дэманалёгіі», закладзеную Іцхакам-Лейбушам Перацам і падтрыманую Кульбакам, прадоўжыў будучы нобэлеўскі ляўрэат Іцхак Башэвіс-Зінгер. Супольнае ў Кульбака было з Ільлём Эрэнбургам (як мінімум іранічны погляд на рэаліі 1920-х гадоў), а таксама зь Ільфам ды Пятровым: так, выхад саматужнікаў на першамайскую дэманстрацыю ў горадзе Энску, г. зн. зэльманскім Менску, перагукаецца з карцінкамі аналягічнай дэманстрацыі ў «12 крэслах»). Бадай, нават у большай ступені Кульбак абапіраўся на спадчыну нямецкіх пісьменьнікаў XVIII–XIX ст., добра вядомую ў адукаваных колах беларускага яўрэйства пачатку XX ст.: Фрыдрыха Шылера (асабліва гэта прасочваецца ў п'есе «Бойтра»), Эрнста Тэадора Амадэя Гофмана, Гайнрыха Гайнэ... Усё ж сьпелы Кульбак нікога не імітаваў, а быў цалкам арыгінальным пісьменьнікам.

10. У прозе Кульбака шмат паэтычнага. Перакладнікі не заўсёды заўважалі «патаемныя» рыфмы, але Андрэй Дубінін іх прыкмеціў: «Істотная рыса пісьма Кульбака — завужэньне слоўнай палітры: калі цягам некалькіх старонак зьяўляецца акцэнтаванае сэнсам слова, то яно, як правіла, зьявіцца побач яшчэ раз»; «характэрны паэтычны прыём Кульбака — „распляценьне" слова на два вобразы, слова пачынае „дваіцца", зіхцець сэнсамі»; «сьлед рыфмаванасьці перасьледуе ўвесь час, зноў перакідваючыся амаль вершам у самых важных месцах. Прывяду такую „вершаванку"-няўгледку: „ — Bere, na dir bejgl afn veg... Un Bere iz avek. (— *Бэрэ, на табе абаранкаў у шлях... / І Бэрэ счэзнуў на вачах.*)"» [2]. Ён жа ўважае раман «Зэльманцы» за паэму, настойваючы на тым, што «форма ў Кульбака і ёсьць зьместам яго паэмы» [5].

11. Кульбак захапляўся філязофіяй (прынамсі ў маладыя гады), чытаў Арыстотэля і Лао Цзы, Ібн Гвіроля і Сьпінозу, што, безумоўна, зрабіла станоўчы ўплыў на яго творчасьць. Але ж для «яўрэйскай пралетарскай літаратуры», што дамінавала ў СССР на рубяжы 1920–1930-х гадоў, усё гэта не магло мець практычнага значэньня. Хацкель Дунец сьцьвярджаў у газэце «Літаратура і мастацтва» (08.10.1932), што Кульбак прыехаў у СССР, нагружаны «ня нашай спадчынай», што сваю інтэлектуальную культуру ён чэрпаў «галоўным чынам зь яўрэйскай кабалістычнай філязофіі, зь яўрэйскай містыкі і схаластыкі, а таксама з расейскага і яўрэйскага сымбалізму... Нават у тых творах, дзе няма мэсіянскага ідэалу вызваленьня („Беларусь"), таксама ёсьць рысы буржуазнай рамантыкі...». У паэме «Буня і Бэра на шляху» (1927) Кульбак нібыта «паказаў анархісцка-пэсымістычныя і кплівыя адносіны да рэвалюцыі... „Зэльманцы" — пераломны твор, спроба вызваліцца ад буржуазнай містычнай спадчыны, але гэтая спроба не зусім удалая». Якаў Бранштэйн лічыў, што, хоць ад «Панядзелка» да «Зэльманцаў» «пройдзены вялікі шлях», Кульбак яшчэ толькі «намацвае новы падыход». Справядліва гучыць выснова з «Кароткай яўрэйскай энцыкляпэдыі»: «Кульбак зь яго высокаінтэлектуальнай культурай, якая ўвабрала ў сябе разам зь філязофіяй кабалы, габрэйскім містыцызмам і фальклёрам — найноўшыя павевы заходнеэўрапейскай філязофіі і літаратуры, зь яго мовай, рафінаванай, але зьнітаванай з народнаю гаворкаю, так і ня здолеў арганічна ўвайсьці ў савецкую літаратуру» [6].

12. Кульбак сьвядома імкнуўся ўзбагаціць мову ідыш, «навесьці масты» паміж яўрэйскай культурай і сусьветнай. Сваю праграму «міжкультурнага дыялёгу» ён выклаў яшчэ ў канцы 1910-х, напісаўшы ў адным зь лістоў, што яўрэйскай літаратуры патрэбныя свае Тургенеў і Бальмонт. У 1920-х вучням Кульбака запомнілася, што іхны настаўнік мог «з аркуша» перакласьці ўпадабаны верш з польскай на ідыш.

13. Пісьменьнік цягнуўся да тэатру. Уласна, у Бэрліне напачатку 1920-х гадоў ён і працаваў суфлёрам у тэатры, а потым у Вільні з дапамогай сваіх вучняў ставіў спэктаклі паводле клясыкі (Гамэр, Шэксьпір, Іцхак-Лейбуш Перац), якія відавочцы зь цеплынёй успаміналі нават празь дзесяцігодзьдзі. І пасьля пераезду ў Менск пісьменьнік супрацоўнічаў з тэатрамі, але ўжо зь дзяржаўнымі — Беларускім яўрэйскім, маскоўскім, бірабіджанскім... Ня выключана, што вышэйзгаданы верш «Ikh bin a bokher a hultaj...» (у перакладзе Андрэя Хадановіча — «Гультая відаць здаля...») і быў першапачаткова напісаны для нейкай тэатральнай пастаноўкі.

Апошні твор Кульбака — п'еса «Біньямін Магідаў» пра юнака, які ўдзельнічае ў супраціве польскім акупантам і геаічна гіне — была пастаўленая ў бірабіджанскім яўрэйскім тэатры ў 1937 г., але тэкст яе зьнік бясьсьледна.


14. У вольны час гуляў у шахматы (пра партыю Кульбака з артыстам менскага яўрэйскага тэатру Хаімам-Ноахам Вінагурам са словаў артыста расказваў Гірш Рэлес). Раман «Зэльманцы» можна трактаваць як шахматную партыю, у якой «фігуры»-пэрсанажы перасоўваюцца і ахвяруюцца дзеля «перамогі» над старым ладам, а пешкі праходзяць у гетманы.

15. Гадаваў птушак і ў жыццьці, і ў творах («Зэльманцы», «Муня-птушкавод»...). У некаторых месцах выглядае, што птушкі для Кульбака — героі, раўнапраўныя зь людзьмі. Знакаміты эпізод грамадзянскай вайны з раману «Зэльманцы»: *«Побач стаяла курыца і філязофствавала»*. З курыцай параўноўваецца і, напрыклад, старэнькая баба Бася, якая ўсё ніяк не памрэ (але ў канцы раману ўсё ж памірае).

Айзік Платнэр пра Кульбака: «У мяне склалася ўражаньне, што ён ненавідзеў сам працэс пісаньня, больш любіў калоць дровы, гадаваць птушак (на куплю птушак, выраб клетак і на корм Кульбак мог аддаць апошнія грошы) і трусоў».

16. Карыстаўся вялікай любоўю ў чытачоў Вільні 1920-х гадоў, але ня ўмеў «канвэртаваць» яе ў матэрыяльны дабрабыт. Выбраны ў 1927 г. кіраўніком сусьветнага ідышысцкага ПЭН-цэнтру, казаў, што літаратурная атмасфэра ў Польшчы яго не задавальняе. Гэтая малапрымальная атмасфэра была адной з прычынаў вяртаньня Кульбака ў савецкі Менск увосень 1928 г.: другой прычынай сталася, хутчэй за ўсё, жаданьне ўзьяднацца з родзічамі ў БССР. «На разьвітальны вечар прыйшло столькі народу, што давялося выклікаць конную паліцыю», — пісала Шуламіт Шаліт. Яна ж цытуе газэту на ідышы «Vilner tog» 1928 г. : «Вільня губляе паэта... пуста стане ў Вільні. Як мы запоўнім гэты прабел?».

17. Напачатку 1930-х гадоў працаваў у Акадэміі навук БССР на сьціплай пасадзе стыльрэдактара ў яўрэйскім сэктары, пра што застаўся невялікі ўспамін мовазнаўцы Шпрынцы (Соф'і) Рохкінд: «Калі Кульбак заходзіў да нас у кабінэт, то адразу рабілася весела. Але я ад яго нацярпелася — ён дражніў мяне „рабінскай дачкой", „рабініхай". (С. Рохкінд няблага ведала юдэйскія крыніцы, у тым ліку і з той прычыны, што мусіла весьці антырэлігійную прапаганду. — *В. Р.*) Гэта было небясьпечна: калі б такія жарты пачуў нядобразычлівец, мяне маглі б выгнаць з Акадэміі» [9]. Браўся за справы, якія наўрад ці адпавядалі ягонаму ўзроўню, ці то каб падзарабіць (аклад у АН быў невялікі), ці то каб давесьці сваю ляяльнасьць уладам; напрыклад, уклаў зборнік «Рэвалюцыйныя навэлы» (пераклады на ідыш малавядомых аўтараў, 1931; супольна з З. Вітэнзонам). Зрэшты, у СССР аж да 1937 г. даволі актыўна выдаваліся і арыгінальныя творы Кульбака, і выкананыя ім пераклады: напрыклад, гогалеўскі «Рэвізор» на ідышы зьявіўся ў менскім часопісе «Штэрн», №№ 2 і 3 за 1937 г.



Фота паказвае, як «весела» жылося М. Кульбаку ў той час. Здымак з газэты «Літаратура і мастацтва»: на ім Кульбаку 40 гадоў, але выглядае ён значна старэйшым

18. Паддаўся бальшавізацыі (прыклады: публікацыя нарысу пра Якуба Коласа ў менскім часопісе «Штэрн», № 10, 1936, дзе ўсхваляецца сталінская палітыка; матэрыял пра недахоп пільнасьці ў газэце «Літаратура і мастацтва» 10.09.1936, дзе Кульбак абвінавачваў у шкодніцтве ўжо арыштаванага да таго часу крытыка Хацкеля Дунца). Перад гэтым ён разам зь сямнацацьцю іншымі літаратарамі ў жніўні 1936 г. «ад імя Саюзу савецкіх пісьменьнікаў БССР» падпісаў зварот да «роднага, любімага Іосіфа Вісарыёнавіча», патрабуючы «сьмерці бандыцкім вылюдкам» з «трацкісцказіноўеўскай фашысцкай хеўры» (крыху больш падрабязна гл. тут: [10; 11]). «Перавыхоўвацца» Кульбака прымушалі фактычна з самага ягонага прыезду ў Менск, і к 1933 г. ён «надламіўся», пачаў выступаць з заклікамі накшталт «Разаблачаць яўрэйскіх нацдэмаў» («ЛіМ», 25.12.1933).

Усё ж свой шэдэўр, «Зэльманцаў», Кульбак не сапсаваў канчаткова. Так, на другой кнізе, выдадзенай у 1935 годзе (першая, запісаная ў 1930 г. і тады ж надрукаваная ў часопісе «Штэрн», выйшла асобным выданьнем у 1931 г.), асабліва на яе апошніх разьдзелах, ляжыць адбітак прыстасаванства, але нельга сказаць, што яна бездапаможная. У мастацкім пляне Кульбак выявіўся меншым апартуністам, чым той жа Зьмітрок Бядуля (першы том Бядулевага раману «Язэп Крушынскі» зусім чытэльны, а другі — «агітка» на мяжы палітычнага даносу).

* * *

Наапошку — два прыватныя, але досыць важныя пытаньні.

Дзе Кульбак пасяліўся ў Менску 1930-х гадоў? Нават у некаторых аўтарытэтных крыніцах выказваліся меркаваньні, што на «Апанскім», г. зн. імя Апанскага, або на «Акопным» завулку. Аднак Гірш Рэлес успамінаў, што сям'я Кульбака жыла на Омскім завулку (цяперашняя вуліца Румянцава). Паэтэса, шанавальніца і перакладніца Кульбака Рахіль Баўмволь, якая ў 1930-х таксама жыла ў Менску, сьведчыць, што Кульбак атабарыўся ля Камароўкі. «Апанскі» завулак у такім выпадку не падыходзіць, бо ён ад Камароўкі значна далей. Апошнюю кропку паставіла Ганна Севярынец, якая натрапіла ў маскоўскім архіве на перапіску з Кульбакам расейскага літаратуразнаўцы Яўгена Трапоўскага наконт перакладу на расейскую раману «Зэльманцы» (вялася ў 1937 г.). Пазначаны адрас атрымальніка: Омскі зав., д. 4а, кв. 1 [17]. Добра было б лякалізаваць гэты даўно разбураны драўляны дом на карце сучаснага Менску ды пазначыць месца, дзе ён стаяў, памятнай табліцай. На доме, дзе Кульбак жыў у Вільні (цяпер вул. Кармэліту, 5), такая табліца вісіць з 2004 году.

Дзе жылі самыя вядомыя героі Кульбака — зэльманцы? У канцы аднайменнага раману гаворыцца, што на месцы іхнага двара будуюць цукеркавую фабрыку («Камунарку», якая і цяпер на вуліцы Аранскай). Здавалася б, усё ясна, але апошнім часам нярэдка гучала вэрсія пра тое, што меўся на ўвазе бісквітны цэх «Камунаркі» ў лукавіне Сьвіслачы недалёка ад сучаснай гасьцініцы «Беларусь», г. зн. у раёне Старажоўкі [13]. Нейкія намёкі на Старажоўку сапраўды можна вычытаць у рамане (так, дзядзька Юда выходзіць з хаты і «плыве» па засьнежаных вулачках проста да Даўгінаўскага тракту...), але час дзеяньня ў ім не супадае з адкрыцьцём бісквітнага цэху ўвесну 1929 г. хаця б таму, што распавядаецца пра пуск трамвая, які адбыўся ўвосень 1929 г. З тэксту вынікае, што «цукеркавую фабрыку» пачалі будаваць у канцы лета 1930 г. Такім чынам, нават праз доказ ад процілеглага можна вывесьці, што зэльманцы жылі ўсё ж у раёне Аранскай, паблізу Ляхаўкі.

Літаратура

1. *Белис Ш.* Песни — тоска о земном. Заметки к 43-летию со дня смерти Моисея Кульбака // Belisrael: Незалежны ізраільскі сайт [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belisrael.info/?p=7656.

2. *Дубінін А.* Іван Бабель і Мойшэ Кульбак // Belisrael: Незалежны ізраільскі сайт [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belisrael.info/?p=12237.

3. *Зніклая паэзія*: Дак. фільм. Рэж. І. Бажко. Белсат TV, 2017 // YouTube [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?time_continue=951&v=Vz-TePPV08E.

4. *Лявіцкі А.* Вяселле тэксту і чытача: Кульбак выходзіць па-нямецку (2018) // Наша Ніва: Першая беларуская газета [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://nn.by/?c=ar&i=203017.

5. *Кульбак М.* Зэлмэнянцы: Урыўкі з першай кнігі / пер. з ідыша А. Дубініна // Belisrael: Незалежны ізраільскі сайт [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belisrael.info/?p=11336.

6. *Кульбак Моше* [артыкул 1988 г.] // Электронная еврейская энциклопедия [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: www.eleven.co.il/?mode=article&id=12258&query=Кульбак.

7. *Либерман М.* Из берлинского гетто — в новый мир // ЛитЛайф — литературный клуб [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://litlife.club/br/?b=62560&p=31.

8. *Памяць пра спадчыну габрэйскай культуры* [2017] // pARTisan: Альманах сучаснае беларускае культуры [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://partisanmag.by/?p=16715.

9. *Рохкинд Ш. (С.).* Три города в моей жизни // Belisrael: Незалежны ізраільскі сайт [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belisrael.info/?p=7959.

10. *Рубінчык В.* Катлеты і мухі (12) // Belisrael: Незалежны ізраільскі сайт [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://belisrael.info/?p=6513.

11. *Рубінчык В.* Некалькі слоў пра Якава Бранштэйна: Да 120-годдзя з дня яго нараджэння // Belisrael: Незалежны ізраільскі сайт [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://belisrael.info/?p=13231.

12. *Рублевская Л.* Ностальгия по канарейкам [2017] // Портал «Беларусь сегодня» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/nostalgiya-po-kanareykam.html.

13. *Рудак А.* Дзе шукаць Зельманцаў? // ЛіМ. 2015. 9 кастр. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: www.main.lim.by/wp-content/uploads/2015/10/40-2015.pdf.

14. *Рэлес Р.* Майсей Кульбак у Мінску // Полымя. 1996. № 4.

15. *Рэлес Р.* Праз скрыжаваны агонь // Полымя. 1995. № 8.

16. *Рэлес Г.* Яўрэйскія савецкія пісьменнікі Беларусі: Мемуары. — Мн.: Логвінаў, 2004 / ідыш.

17. *Северинец А.* Не получаю от вас ни денег, ни ответа... // Мишпоха. 2017. № 36 [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.mishpoha.org/o-zhurnale/zhurnal-mishpoha-n36-2017/208-anna-severinets-ne-poluchayu-ot-vas-ni-deneg-ni-otveta.

18. *Хведаровіч М.* Шчыры сябра, самабытны пісьменнік // ЛіМ. 1966. 22 сак.; Belisrael: Незалежны ізраільскі сайт [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://belisrael.info/?p=8066.

19. *Шалит Ш.* На круги свои... — Иерусалим, 2005.

ЗОРАЧКА

Зорачка, зорачка, добры мой весьнічак,
Ты прыляці да старых нашых весьнічак.

Там, у мястэчку, ёсьць вузкая вуліца,
Ўбогая хата на вуліцы туліцца.

Там ля акна мая жоначка бедная
Плача... Суцеш яе, зорка ўсяведная.

Ты ёй шапні, што наладзяцца справы,
Ўсё будзе добра, бо Госпад ласкавы.

Слоўца — пра Янкеле, Леечку, Рывачку.
Хай мне напішуць яшчэ, хоць па ўрывачку,

Ліст пацалую, а ты мне — яшчэ дары!
Янкеле хай не лянуецца ў хедары,

Вывучыць кадыш, бо лёс — не забавы.
Можа... хто ведае... Госпад ласкавы.

1916
Пераклад Андрэя Хадановіча

ЦІ МАЕШ ТЫ ХЛЕБ?..

— Ці маеш ты хлеб, скажы? —
Спытаў у суседа сусед.
— Калісьці някепска я жыў,
І быў на стале маім хлеб.

Да хлеба была і капуста,
І морквы, і рэдзькі многа,
І нават курыца тлустая,
Цяпер жа — няма нічога.

— А вопратку ці ты маеш?
Маўчаньне. Журбота-сум.
— Ат, што ты, браток, пытаеш?
Вось латаць камзэльку нясу.

Калі мне патрэбна ў госьці,
Мястэчка ўсё абыду,
Пакуль на дзянёк у кагосьці
Штаны, чаравікі знайду.

— Ну, а жыльлё ты маеш,
Маеш ты свой начлег?..
— Ой, што ты ў мяне пытаеш,
З тваіх пытаньняў аж сьмех.

Начую я дзе давядзецца,
То ў стозе, то пад сасной.
Зімою ж я сплю ў чужых сенцах
З паленам пад галавой.

1920
Пераклад Віктара Шымука

СУСЬВЕТ

За невядомасьці парог,
Прыняўшы тысячы абліччаў,
Іду я безьліччу дарог
І — гэтым дух свой узьвялічыў.

Хачу абняць цябе, мой брат!
Я —
гэта ты!
І з гордым клічам
Сягну за кожны далягляд,
Што покуль недаступным лічым.

Хачу абняць твой дужы стан
З расьлін,
Праменьняў,
Мінэралаў,
Бо незнаёмы акіян
Ярчэй алмазаў і каралаў.

Сусьвет —
Надзей спрадвечных скарб,
Што затаіўся ў змрок глыбокі.
І ў яркім зіхаценьні фарб
Прадвызначэньня чую крокі.

Як непатрэбнае рызьзё,
Зь сябе будзённасьць я скідаю.
Ты — гэта я!
Аддам усё,
Але намер свой апраўдаю.

Твой бляск ня згасьне і ў вяках,
А разгарыцца. Я — за тое,
Што можа і ў старых мяхах
Віно іскрыцца маладое.

Аркестар непазнаных зор
Хвалюе сэрца асалодай,
І ў неабжытасьці прастор
Суладзьдзе панясу мэлёдый.

Вылузвацца са скуры я
Для мэты буду, усясільны,
Хоць траса зорная мая
І стане помнікам магільным.

1920
Пераклад Сьцяпана Гаўрусёва

МЕСЯЧНАЯ НОЧ

Праз ноч царыца Саўская плыве
І працінае неба позірк Боскі
Ў халодным харастве.

Бы прывіднае сяйва з вышыні
Спускаецца ў маленечкія вёскі,
Што сьпяць у цішыні.

Яе вачэй бяссоннае бяздоньне
Глядзіць згары
На курачку ў двары,
Пільнуе верхаводку ў срэбнай тоні,
Любуецца ягняткам у хляве...

Праз ноч царыца Саўская плыве
На зорным троне ў залатой кароне.

[1920]
Пераклад Андрэя Хадановіча

* * *

Хто блукае па садзе? Мой дзень кінуў цень...
Не знаходжу пра сад слоў чароўных якіх,
І ня бачу я поруч мне блізкай рукі.
Наступае ціхмень.
Ты праточвайся зь лесу, о ноч, праз акно,
Тут мая галава і душа адпачне.
Сьвет затоеных лямантаў мучыць мяне
Зь мешанінаю песьняў, дакучных даўно.

Сад мой моліцца і акрапляе расой,
Чорным, сінім трымціць і зьвініць колер-гук.
Супыніць не магу зь ціхім сьпевам тугу,
Што з заходняга краю ліецца ракой.

[1920]
Пераклад Васіля Жуковіча

ГУЛЬТАЙ

Гультая відаць здаля —
З палачкай заўсёды
Шпацыруе, тра-ля-ля,
Ў пошуках прыгоды.

Падыходжу да карчмы,
Грукаю з павагай:
— Адчыняйце, гэта мы,
Я з маёю смагай.

— Смага зранку? Не дурэй!
Ты гарэзьнік, хлопча!
Бла-бла-бла... А я далей —
Пыл «гарэзьнік» топча.

У крыніцы шмат вады —
Ой, пап'ю цяпер я!
І, як певень малады,
Атрасаю пер'е.

Мужычок вядзе казу:
— Што чуваць на сьвеце?
Абы-што яму вярзу:
— Сьвеце-беце-меце...

Гультая відаць здаля —
З палачкай заўсёды
Шпацырую, тра-ля-ля,
Ў пошуках прыгоды.

[1922]
Пераклад Андрэя Хадановіча

ВЕЧНА, ВЕЧНА

Вечна, вечна ткуцца гукі, ткуцца колеры і хвілі…
Тут жыцьцё і сьмерць сьпяваюць хорам,
Там — сьвяціць далёкім, вечным зорам.

Дзе людзі спадзяваліся й любілі,
Па хвілі чарапы ляжаць у пыле:
Бог — вечны, мы — хвіліну зь ім гаворым!

Ды нашае надзеі цёплы подых
Падымецца да зораў, як па сходах,
Сатканых зь вечных колераў нябёсных.

І сьветлай весялосьцю
Зямля і неба сустракаюць госьцю —
Людзкую мрою на сусьветных кроснах.

Вечна, вечна ткуцца гукі, ткуцца колеры і хвілі:
Тут жыцьцё і сьмерць сьпяваюць хорам,
Там — сьвяціць далёкім, вечным зорам.

[1922]
Пераклад Андрэя Хадановіча

КОЗАЧКА

Ганю на пашу беленькую козачку,
Дзе мурава і кветкі,
Адзіную, што маю, сам набыў яе
За дзьве манэткі,
За дзьве манэткі.

Ды ўсё хутчэй, хутчэй па лузе козачка,
Я — наўздагон,
Брыду ў густых лясах, пустых палях за ёй
Шэсьць доўгіх дзён,
Шэсьць доўгіх дзён.

На сёмы дзень, у пятніцу, спынілася,
Бо мы прыйшлі.
Нябеснае праменьне атуліла ўсе
Канцы зямлі,
Канцы зямлі.

Зямлі,
Дзе лані пасьвяцца свабодныя,
Дзе зубр і вол кладуцца спаць удвух,
Зямлі,
Такое крохкае й лагоднае,
Аж боязна разьбіць, зрабіўшы рух.

Мінае дзень. Бяглячка ацалелая,
А нашы дні сыходзяць, нават гэткі...
Пайду, усьлед за козачкаю белаю
За дзьве манэткі,
За дзьве манэткі.

[1922]
Пераклад Андрэя Хадановіча

ВІНО СТАРОЕ БРОДЗІЦЬ УВА МНЕ

Віно старое бродзіць ува мне,
І з глыбіні віна
Крыніца сьветлай радасьці імкне
І б'е са дна, і п'е мяне да дна.

Я сонца, я раса, я вір надзей,
Шчасьлівы, як
Вячысты дуб, што неўспадзеў надзеў
Юначы фрак.

Я — прага быць, я — станаўленьня сьпеў,
Я — запавет
Таго, у кім старым віном кіпеў
Наш п'яны сьвет!

[пачатак 1920-х]
Пераклад Андрэя Хадановіча

* * *

Навошта мне знаёміцца з тугой,
Калі цьвіценьне скрозь, у кожнай зёлцы,
Калі прырода дзеліцца са мной?!

Ідзе ў жыцьці няспынная абнова.
І дождж і сонца — ў зіхаткой вясёлцы,
І плач і сьмех — усё адначасова.

[пачатак 1920-х]
Пераклад Уладзімера Паўлава

* * *

Ах, песьня, песьня, сьветлая душа,
Знайшоў цябе — памаладзець пасьпеў.
Няхай пакуль ты усяго напеў
Шаўковай ніткі, звону ледзяша.

Ды ўжо крынічка ціхенька бруіць,
І ў лёгкім смутку я сябе лаўлю,
Каб не сказаў адной табе: — Люблю! —
На белым сьвеце я ці змог бы жыць?

[пачатак 1920-х]
Пераклад Уладзімера Паўлава

* * *

Сьнягі. Сьнягі. Сьвятло ад зоркі вострае, як крык.
Месяц жоўклы.
За трыдзевяць зямель кладзе дзіця на журавік
Мая жонка.


Рыдае скрыпка сіняя і сьнежная віялянчэль.
Які вецер!
Мяне мой сын прысьніў за трыдзевяць зямель
І ў сьне сьмяецца.

[1920-я]
Пераклад Васіля Макарэвіча

Васіль Дранько-Майсюк

эмацыйная інтэлектуальнасьць прозы Міхася Зарэцкага





Белы дзень чаду ня любіць. Белы дзень жорстка зрывае пялёнкі з вачэй, паказвае сьвет, як ён ёсьць... Раніцой — прапітае, прагарэлае сэрца абдаецца золкай цьвярозасьцю і сьціскаецца ў холадзе белым. І тады мокра садніць нутро.

Міхась Зарэцкі (у цэнтры) зь сябрамі, меркавана 1917 г.



Міхась Зарэцкі стаў пісьменьнікам дзякуючы сну.


У аўтабіяграфіі згадваў, што, будучы чырвонаармейцам, ён «...убачыў... яркі і незвычайны сон, уражаньне ад якога не пакідала... на працягу цэлага месяца. Мне захацелася занатаваць гэтае ўражаньне, і я стаў пісаць» [7, с. 216].

Жаданьне апісаць прозай свае сны, аднак, не зрабіла з нашага героя пісьменьніка-сюррэаліста, прыхільніка «плыні сьвядомасьці», для якога галоўнае не сюжэт, а ўласныя часам да канца не вытлумачальныя пачуцьці і думкі. Словам, гэта не прымусіла Зарэцкага пайсьці шляхам Кузьмы Чорнага, хутчэй наадварот.

Творы Зарэцкага ўражваюць графічнай вастрынёй, у іх няма анічога размытага, марфэйна-туманнага. Кожны пэрсанаж і асяродак, які яго атачае, зьдзіўляюць сваёй падкрэсьленай гіпэртрафавана-гратэскавай канкрэтыкай.

Любоў да падобнага звышрэалістычнага экспрэсіянізму прымушае прыгадаць творчасьць Янкі Купалы часоў Першай усясьветнай вайны, асобныя гарадзкія п'есы Францішка Аляхновіча, але найбольш выклікаюць пачуцьцё эстэтычнай блізкасьці з палотнамі Георга Гроса, Макса Бэкмана, Ота Дыкса ды іншых нямецкіх і аўстрыйскіх геніяў, прадстаўнікоў мастацкага кірунку 1920-х гг. «новая рэчаіснасьць».

У Міхася Зарэцкага жорсткі, амаль цынічны погляд на сучаснасьць. Чалавек, які прайшоў грамадзянскую вайну, зьведаў голад, нястачы, неаднойчы рызыкаваў жыцьцём, бачыў чалавечую праяву ўва ўсёй сваёй пачварнай выразнасьці, ён ня верыць у маральнае пераражэньне чалавека. У ягоных апавяданьнях вы ніколі ня знойдзеце пэрсанажа, які мог бы перамяніцца на лепшае, «перавыхавацца».



Вокладка кнігі Міхася Зарэцкага «На чыгунцы». Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1928 г. Мастак ня вызначаны

Хутчэй наадварот.

Міхась Зарэцкі любіў паказваць вонкава (фізычна і маральна) моцных мужчын, энэргічных жанчын-лідэраў, якія ў канцы твора амаль заўсёды псыхалагічна, а часцей фізычна гінуць.

Нашая рэальнасьць, паводле аўтара, не спрыяе нараджэньню героя, яна — пачварная і падступна калечыць усякага вартага павагі чалавека.

Героі Зарэцкага — пакутнікі. Іх душа амаль фізычна баліць, і боль гэты разрывае іх на кавалкі знутры.

Адна гераіня, бязьлітасная чэкістка, ня можа дараваць сабе, што аддала пад расстрэл былую радню з шляхты.

Іншы пэрсанаж, стомлены ад буркатлівай жонкі, гіне праз фатальнае каханьне да юнай камсамолкі, якая, бы тая жанчына-вамп, выпівае зь яго ўсе сокі.



Міхась Зарэцкі. 1925 г.

Героі страляюцца на двубоях, кідаюцца пад цягнікі, жыўцом замярзаюць у сьнезе.

Фактычна яны ўсё робяць, каб як найхутчэй разьвітацца з гэтым страшным сьветам і адысьці ў такі спакойны і лагодны (як ім здаецца) нябыт.

Зарэцкі — першы зь беларускіх савецкіх пісьменьнікаў, хто паказаў савецкую рэчаіснасьць з такой выразнай інфэрнальнай непрывабнасьцю.

Кожны герой Зарэцкага мае якую-небудзь страшную тайну.

Асабліва гэта тычыцца жанчын.

У апавяданьні «Мар'я» чырвонаармеец Ляксандар Мішчанка ў захапленьні ад простай сялянкі (яе імем і названы твор). Для хлопца гэтая кабета ня менш загадкавая, прыгожая і таямнічая, чым якая-небудзь Грэта Гарба. Яе муж зьяжджае ў справах. У нашых герояў ноч каханьня, падчас якой Мар'я прызнаецца, што задушыла сваё першае дзіця. Што б вы адчулі, каб вашая каханка расказала вам нешта падобнае? Наўрад ці захацелася б далей зь ёй мець супольную радасьць. Ляксандар жа пакахаў гэтую забойцу зь яшчэ большай сілай.

Гераіня твору «Кветка пажоўклая», былая чэкістка і, безумоўна, прыгажуня, працуе ў дзіцячым доме. Яе таксама прыгнятае нейкая таямніца.

Яна прызнаецца каханаму, што паходзіла з панскага роду і, калі перайшла на бок бальшавікоў, ледзьве не ўласнаручна расстраляла сваю сям'ю.

Герой, як таго і патрабуе эстэтыка твораў Зарэцкага, пранікаецца яшчэ большай пяшчотай і хоча, каб гэтая жанчына стала ягонай жонкай.

Зарэцкі любіў выяўляць парадаксальныя ўчынкі і рэакцыі сваіх пэрсанажаў. Можна сказаць і сьмялей: Зарэцкі — першы вялікі майстар парадоксу ў нашай літаратуры.

Калі ты зрабіў страшнае злачынства, цябе пачынаюць кахаць яшчэ больш, калі твая жонка цяжка хворая, то каханка ўгаворвае ехаць да хворай, а заканчвае фразай: «Нікуды цябе не адпушчу!» («Ой, ляцелі гусі...»), калі ты жанчына і выступаеш за тое, каб дзеці выхоўваліся ў інтэрнатах, то сама таемна прыходзіш наведваць сваё дзіця і пакутуеш ад таго, што яно не з табой («Дзіўная»), калі ты жартам прапаноўваеш паланёнаму ворагу партыю ў шашкі, то пад канец гульні, прайграўшы, страляеш у яго («Адна партыя ў шашкі»).

Нягледзячы на тое, што амаль усе ягоныя творы мелі трагедыйнае гучаньне, яны карысталіся вялікай папулярнасьцю ў чытачоў 1920–1930-х гадоў.

Зарэцкім зачытваліся камсамольцы і камсамолкі, паэты і празаікі, кнігі кралі зь бібліятэк.

Адкуль такая любоў?

Бо пісьменьнік умеў зачароўваць ня толькі сваімі змрочнымі думкамі, але і гнуткім, захапляльным, пакінэматаграфічнаму выразным мэлядраматычным сюжэтам.

У ягоных творах адкрыта кахаліся і здраджвалі, стралялі, забівалі, падманвалі, пакутавалі ад спапяляльнай жарсьці.

Ён першым увёў у беларускую літаратуру вобраз жанчыны-вампа, прывабна паказваў сучаснага мэфістофэля і донжуана (галоўныя героі ў аповесьці «Голы зьвер» і апавяданьні «Ой, ляцелі гусі...»).

Міхась Зарэцкі сярод сяброў літаб'яднаньня «Полымя», 1928 г.

Сядзяць (зьлева направа): Якуб Колас (дапытвалі ў ДПУ), Цішка Гартны (арыштаваны ў 1936 г., памёр альбо забіў сябе ў 1937 г.), Янка Купала (дапытвалі ў ДПУ, спрабаваў забіць сябе ў 1930 г.), Міхась Чарот (арыштаваны і расстраляны ў 1937 г.), Васіль Сташэўскі (арыштаваны і расстраляны ў 1937 г.);

стаяць (зьлева направа): Алесь Ляжневіч (арыштаваны ў 1930 г., высланы на 5 гадоў, арыштаваны і расстраляны ў 1937 г.), Міхайла Грамыка (арыштаваны ў 1930 г., высланы на 5 гадоў), Уладзіслаў Галубок (арыштаваны і расстраляны ў 1937 г.), Міхась Зарэцкі (арыштаваны ў 1936 г., расстраляны ў 1937 г.), Анатоль Вольны (арыштаваны ў 1936 г., расстраляны ў 1937 г.), Алесь Дудар (арыштаваны ў 1929 г., высланы на 3 гады, арыштаваны ў 1930 г., арыштаваны ў 1936 г., расстраляны ў 1937 г.), Алесь Гурло (арыштаваны ў 1930 г., высланы на 5 гадоў, памёр ад сухотаў у 1938 г.)




Ягоныя творы так уражвалі ўнутранай свабодай, непрыхаваным непрыманьнем тагачаснай рэчаіснасьці, зьдзіўляльнай сьмеласьцю, эратычным напорам, што няма дзіва — многія калегі вучыліся ў Зарэцкага, пераймалі яго стыль.

Гэтую пераемнасьць можна знайсьці ў празаічных рэчах Алеся Дудара (Тодара Глыбоцкага), Міхася Лынькова (асабліва ў апавяданьні «Баян»), Платона Галавача.

Зарэцкі захапляў таксама і сваімі публіцыстычнымі артыкуламі.

У часы вонкава пасьпяховай беларусізацыі яго раздражняла, што беларускія дзяўчаты сьпяваюць маскальскія песьні: «..Зь якой тупой стараннасьцю выводзілі яны „Накину плащ", „Ах, зачем эта ночь" і іншую дрэнь. <...> Я падумаў: дакуль мы будзем жыць гэтым пазадзьдзем чужой культуры, якое з тупым салдацкім самадавольствам „преподносили" нам нашы суседзі і якое мы прымалі як чыстае збожжа? Дакуль мы будзем зьбіраць з чужога стала ўбогія брудныя аб'едкі, аддаючы сваё дабро на агульную пагарду і зругу?» [3, с. 88–89].

Айчынны тэатар Міхась Зарэцкі лічыў больш прымітыўным за ўкраінскі. У 1929 г. пісаў: «Тэатар Франка ўкраінскія таварышы... раўнуюць з БДТ-1. Гэта параўнаньне мае пад сабой пэўную падставу, масавасьць, блізасьць да запатрабаваньняў сучаснага жыцьця, адсутнасьць асаблівага захапленьня „акадэмізмам" —



Вокладка кнігі Міхася Зарэцкага «Голы зьвер». Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1929 г. Мастак Мікола Гусеў



Вокладка кнігі Міхася Зарэцкага «У віры жыцьця». Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1929 г. Мастак ня вызначаны

усё гэта ўласьціва для абодвух... калектываў. Але гэтае падабенства непрыемна парушае тая дэградацыя ў бок клюбна-агітацыйнага прымітыву, якая яскрава вызначаецца ў працы БДТ-1 за апошні час. Кіеўскі тэатар Франка цьвёрдымі крокамі ідзе наперад і далёкі ад якой бы ні было дэградацыі» [3, с. 353].

Абураўся, калі ягоныя творы (як яму здавалася) няўдала перакладалі на расейскую мову. Лічыў, што яго знарок кепска перакладалі, каб скампрамэтаваць:

> *«...Я даў згоду на друкаваньне ў газэце „Рабочий" у скарочаным выглядзе майго раману „Сьцежкі-дарожкі". Зь першых жа дзён друкаваньня я зьвярнуў увагу рэдакцыі на некаторыя недахваты ў якасьці перакладу, і рэдакцыя... згадзілася. Пасьля таго мне давялося паехаць на паўтара месяца ў Заходнюю Эўропу, і я ня меў магчымасьці сачыць за далейшым перакладам. Прачытаўшы цяпер зьмешчаныя... часткі раману, я ўбачыў, што як скарачэньне, так і пераклад зроблены страшэнна нядбала і няўмела, у выніку чаго раман страціў свой сапраўдны выгляд. Гэта калечаньне майго твору... <...> Дасягнута... дзікая бяссэнсіца... <...> Я лічу, што падобныя апэрацыі... накіраваны да кампрамэтацыі мяне як беларускага пісьменьніка ў колах расейскіх чытачоў, і рашуча... пратэстую»* [4, с. 3].


Адкрыта пісаў, што беларускія кінэматаграфісты хацелі «згвалціць» Якуба Коласа:

> *«[Работнікі беларускага кіно] памкнуліся згвалціць (я хацеў сказаць — уцягнуць) Якуба Коласа. Я сам чуў, як гэты надзвычайна лагодны чалавек лаяўся самымі жорсткімі словамі, калі зь яго мастацкай прыгожай аповесьці [«На прасторах жыцьця».* — В. Д.-М.*] зрабілі нейкую вымачаную і высушаную агідку [фільм «Песьня вясны» Ўладзімера Гардзіна, 1929 г.* — В. Д.-М.*]»* [4, с. 3].

Анатоль Вольны захапляўся ўменьнем Міхася Зарэцкага не зважаць на кусьлівую крытыку і пісаў зь відавочнай зайздрасьцю: «...Крытыкі клапоцяцца аб Зарэцкім... Паходзяць, паходзяць навокал пісьменьніка, а потым як крытыкнуць разок-другі... <...> „А, так ты зноў пішаш... Не пасьпелі, — кажуць, — цябе ўгробіць, дык ты яшчэ і за раман узяўся". <...> Так прыблізна крытыкавалі крытыкі і Міхася Зарэцкага. Другі б слабейшы можа б і паддаўся. Але гэты ўпарты беларус не паддаецца і з кожным годам піша ўсё новае і новае для Беларусі» [1, с. 7].

Так, Зарэцкі быў па-добраму ўпарты. Калі яму што не падабалася, то адкрыта пра гэта выказваўся. Ведаў сабе цану і стараўся, наколькі было магчыма, ня быць прыстасаванцам, імкнуўся ўсімі сіламі не паўтарыць лёсу сваіх няшчасных герояў — выстаяць, не загінуць. І да пэўнага часу яму гэта ўдавалася.

Расьпіска Міхася Зарэцкага аб атрыманьні ў пазыку ад Язэпа Пушчы 10 рублёў. 1925 г.



Пісьменьнік меў магчымасьць ня толькі падарожнічаць па суседніх савецкіх рэспубліках, але і выяжджаў у 1928 годзе разам са Зьмітром Жылуновічам і Міхасём Чаротам у эўрапейскія краіны.

Жылуновіч пакінуў цікавыя ўспаміны пра тую паездку. Там Міхась Зарэцкі захапляўся брутальнай неприбранасьцю Люксэмбурскага саду і быў абыякавы, калі бачыў гладзенька-вылізаную Вэнэру Мілёскую. Яму падабаўся вясёлы і экстравагантны канкан, а ня нудныя Вагнэравы опэры. Ува ўсіх праявах жыцьця і мастацтва ён любіў гратэскавую выразнасьць.

Калі надышлі 1930-я гады і многія сябры-літаратары апынуліся за кратамі, то Зарэцкі зноў жа, стараючыся не пераступаць мяжы маральнай прыстойнасьці (хоць часам у артыкулах стандартна, як і многія, лаючы нацдэмаў, Луцкевіча і Астроўскага), імкнуўся захаваць сваё творчае аблічча, ня быць ператвораным у трафарэтнага, безаблічнага пралетарскага пісьменьніка.

Ягоныя раман «Вязьмо», шыкоўная іранічная «Навэла пра каханьне» — яскрае сьведчаньне гэтаму.

Блізкі яму духам ды творчай манерай быў згаданы Платон Галавач, які свае раманы і аповесьці пісаў пад заўважным уплывам Зарэцкага, а ў вусных і пісьмовых выступленьнях (дзе лаяў і сацрэалізм, абараняў маладога Масея Сяднёва, пратэставаў супраць рэпрэсіяў пачатку 1930-х гадоў) нагадваў бескампрамісна сьмелага аўтара «Голага зьвера». Галавач падзяліў з калегам па пяры і ягоны трагічны лёс.

Міхась Зарэцкі быў арыштаваны 3 лістапада 1936 году ў Менску пад адрасам: вуліца Абутковая, д. 23, кв. 3.



Міхась Зарэцкі. 1930 г.

З пратаколу ператрусу:

«Взято для доставления в НКВД Белоруссии следующее:

Паспорт.

Заграничный паспорт.

Удостоверение СП № 1543.

Другие документы:

писем — 44 штуки, открытки — 13 шт., адресов телеф. и телег. — 10 штук, телеграмм — 3 шт., 9 пакетов с выписками из контрреволюционной троцкистской литературы, 19 записных книжек, 20 тетрадей с разными записями, фотокарточек — 20 шт., групповых фото — 50 шт., написанных общих тетрадей — 2 шт.

Рукопись на 3129 листах. Разная переписка на 953 листах...

Книг с автографами — 83 шт., книг разных авторов и изданий — 80 шт., Зарецкий — сочинения — 36 шт.» [6, с. 51–52].



Вокладка кнігі Міхася Зарэцкага «Ракавыя жаронцы». Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1930 г. Мастак ня вызначаны

Пісьменьніка асудзілі 28 кастрычніка 1937 году як «актыўнага члена нацыянал-фашысцкай тэрарыстычнай арганізацыі» да найвышэйшай меры пакараньня з канфіскацыяй маёмасьці.

Яго расстралялі, але духоўна ня зьнішчылі.

Творамі пісьменьніка працягвалі зачытвацца. Цяжка ўявіць, ці была б напісаная шэдэўральная проза Міхася Стральцова «Сьвет Іванавіч, былы донжуан...», калі б гэты пісьменьнік не вывучаў Зарэцкага.

Уплыў ягоны прасочваецца і ў асобных празаічных творах Івана Шамякіна, Івана Чыгрынава, нават Уладзімера Някляева.


Сёньня Міхась Зарэцкі такі ж папулярны і любімы многімі аўтар. Хтосьці з нашых сучасьнікаў кажа, што адкрыў для сябе беларускую літаратуру менавіта праз вывучэньне прозы Зарэцкага; хтосьці мог ня чуць пра Тодара Кляшторнага альбо Васіля Каваля (што, вядома, шкада), але з захапленьнем прызнаецца, што перачытвае і «Кветку пажоўклую», і «Бель», і многія іншыя творы выдатнага пісьменьніка.

Каб шчыра і без аніякай прынукі палюбіць беларускую літаратуру, трэба пачынаць з найбольш вонкава выразных, энэргетычна-захапляльных аўтараў.

Многія адкрываюць харство літаратуры, знаёмячыся з прозай Уладзімера Караткевіча. Але пачынаць можна ня толькі з гэтага майстра гістарычна-дэтэктыўнага жанру.

Пачынаць можна і зь пісьменьніка, які першым вывеў на старонках айчыннай прозы фатальную жанчыну.

Першым не пабаяўся паказаць камуністычную рэчаіснасьць пеклам, дзе няма ніякага шанцу нармальным людзям выжыць.



Форма № 30

Военная Коллегия
Верховного Суда
Союза ССР

"14" декабря 195 7 г.

№ 4н-09225/57

Москва, ул. Воровского, д. 15.

СПРАВКА

Дело по обвинению КОСЯНКОВА-ЗАРЕЦКОГО Михаила Ефимовича, до ареста - 3 ноября 1936г. - зав.отд.литературы и искусства Белорусской Академии Наук, пересмотрено Военной коллегией Верховного Суда СССР 7 декабря 1957г.

Приговор Военной коллегии от 28-го октября 1937г. в отношении КОСЯНКОВА-ЗАРЕЦКОГО Михаила Ефимовича по вновь открывшимся обстоятельствам отменен и дело прекращено за отсутствием состава преступления.

КОСЯНКОВ-ЗАРЕЦКИЙ М.Е. реабилитирован посмертно.

ЗАМ.ПРЕДСЕДАТЕЛЯ ВОЕННОЙ КОЛЛЕГИИ
ВЕРХОВНОГО СУДА СОЮЗА ССР
ПОЛКОВНИК ЮСТИЦИИ
/П.ЛИХАЧЕВ/

ак

Даведка аб рэабілітацыі М. Я. Касянкова-Зарэцкага. 14.12.1957 г.

Першым (задоўга да Васіля Быкава), хто здолеў падаць цяжкія, экзыстэнцыйна-важныя тэмы ў займальна-мэлядраматычнай форме і таму аб'яднаў сярод сваіх прыхільнікаў як эстэтаў, так і простую публіку. А гэта мала каму ўдавалася сярод беларускіх літаратараў.

Сёньня, калі пачуццьцё пэўнай і палітычнай, і мастацкай беспрасьветнасьці ўсё больш напята даецца ў знакі, проза Зарэцкага падаецца як ніколі сугучнай нашаму дыскурсу. Перачытваючы яго творы, адчуваеш, накольки тое, пра што ён піша, сучасна, а прачытаўшы, вельмі хочаш убачыць увасабленьне на сцэнах і на экране.

Новае тэатральна-кінэматаграфічнае адраджэньне Зарэцкага не за гарамі.

Прынамсі нашая рэчаіснасьць гэтаму вельмі спрыяе.

Літаратура

1. *Алёша.* Літаратурныя сілуэты: Міхась Зарэцкі // Літ. дадатак да газэты «Савецкая Беларусь». 1928. № 11.

2. *Васіль Дэ Эм* (Дранько-Майсюк Васіль). Расстраляныя літаратары. Міхась Зарэцкі, творамі якога энкавэдысты спачатку зачытваліся, а потым катавалі і забілі яго // [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.svaboda.org/a/28775562.html.

3. *Зарэцкі М.* Збор твораў у 4 т. — Мн.: Маст. літ., 1992. Т. 4. Проза, п'есы, крытыка, публіцыстыка, кароткі летапіс жыцця і творчасці.

4. *Зарэцкі М.* Ліст у рэдакцыю // Савецкая Беларусь. 1927. 26 кастр.

5. *Зарэцкі М.* Чым пагражае нам Белдзяржкіно // Савецкая Беларусь. 1928. 2 ліст.

6. *Маракоў Л.* Толькі адна ноч. — Мн.: Зміцер Колас, 2006.

7. Пяцьдзесят чатыры дарогі: Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. — Мн.: Маст. літ., 1963.

ПЕЛА ВЯСНА

Шумам шырокім шугала ў абшары. Песьню ліла непазбыўна-жывучую, сьмелую, гордую песьню.

Пела вясна...

У шоламе гучным разьюшаных павадак гімнам расла, расьцьвітала магутная сьвежая сіла.

Расла, расьцьвітала. Гарнула цудоўным размахам пудліва-слухмянае сэрца, імкнула ў прасторы, віхурыла ўзьлётам шалёным.

Парыванньем дзівосным хмяліла душу, крамяніла волю сталёвым запалам.

Пела вясна...

Так сьмела і горда. Так радасна, шчыра.

Пералівала песьню ў дражліва-гарэзьлівы рогат. Сьмяялася звонка, задорна.

Над старым, струхнелым сьмяялася.

Над тым, што гарбаціцца, корчыцца, кручыцца.

Над тым, што гнілой дзеразой засьцілае асьліглую глебу.

Над тым, што баіцца зірнуць у агністы прасьцяг, што сонца баіцца гарачага, палкага.

Над тым, што нязграбна карожыцца ў брудзе брусьнелым...

Ой, як вясна пасьмяхалася! Як пагардліва сыпалі дробным сьмяшком галузы-цурочкі бліскучыя!

Аж захадзіліся, аж захліпаліся.

І, хітра міргаючы, у сонца кідалі вясёла-прыжмураны погляд мільёнаў іскрачак-вочак...

А сонца плыло, расплывалася ў мора — душнае, палкае мора.

І абымала ўсё чыста шчыраю цеплю.

І цалавала ўсё чыста салодка-пякучым праменьнем.

Сонца плыло. А ў сонцы — у душным распаленым моры — зьвінелі цурочкамі срэбнымі ядрана-звонкія песьні птушыныя.

Птушкамі пела вясна. Пела шоламам гучным разьюшаных павадак, дробным сьмяшком дуроных цурочкаў.

Радасна пела вясна.

[1925]

ДЗІЎНАЯ

1

Узімку гэта было. Пасьля дзянной сумятні Блонскі сядзеў у сваім габінэце, атулены шэра-ваўнянымі згусткамі змроку. Вольна раскінуўся ў старасьвецкім крэсьле, погляд акунуў у аксамітную мякаць цёмнага кутка і з асалодай адчуваў ціхую нерухомасьць.

Лёгка, не турбуючы, варушыліся думкі, гарэзна спляталіся ў зыбучую чараду. Было прыемна, вальготна. Адпачывала цела, адпачывала змардаваная галава. Так сядзеў нерухома, слухаў, як маятнік на сцяне ўпарта таўхае марудныя хвіліны.

У сумежным пакоі глуха раздаліся крокі, вывелі Блонскага з адзервяненьня. У габінэт, не папытаўшыся, увайшла жанчына. Ля парогу спынілася, азірнула ўважна пакой. Угледзела Блонскага і падышла да яго рэзкім крокам.

— Вы старшыня выканкому? Добры вечар!..

На стол бесцырымонна партфэль кінула, села насупраць. Блонскі не зьмяніў выгаднай позы.

— Я... Добры вечар!..

— Да вас прыехала, толькі што з чыгункі. Дзе прытуліцца?

Блонскаму не падабалася. Надакучылі гэткія. Мітусяцца, ламаюцца, быццам хочуць зьдзівіць.

— Чаго прыехалі?

— Камандыравана на працу сярод жанчын... Ды што вы ў цемры? Сьвету няма?

— Ёсьць. Там на сьцяне выключацель.

Яна памацала, адкруціла. Балюча ўдарыў па вачох яркі сьвет электрычнасьці, вымеў за акно мяккія цені змроку.

Блонскі зірнуў на жанчыну. Убачыў перш за ўсё вочы — яркія, вострыя, з шчырым вясёлым агеньчыкам. У іх — сьмелая, дапытлівая цікавасьць. Упадабаліся. Міжвольна ўсьміхнуўся, як спаткаліся поглядамі.

«Нішто», — падумаў.

Яна азірнула пакой.

— Вы заўсёды тут седзіцё?

— Не, часам не сяджу. Зараз пасяджэньне будзе, чакаю.

Глядзеў на яе зь лёгкай усьмешкай, чакаў, што далей.

— Я надта змарылася... Я працаваць люблю... ведаеце, так, з захапленьнем, з запалам. Але я фізычна слабая і не магу вытрымаць. Дрэнна. Завідую вось гэткім, як вы...

Апошнія словы яна працягнула задуменна. Спыніла ўважны, сур'ёзны погляд на яго фігуры. Ён таксама зірнуў на свае дужыя члены. Быццам сам задзівіўся сіле сваёй дубовай, быццам засаромеўся за яе.

— Так. Я нішто сабе... так.

Яна раптам рассыпалася задорным іскрыстым сьмехам:

— Ха-ха-ха! Які вы сьмешны... вялікі які... Ха-ха!

І ўраз праглынула сьмех, затурбавалася.

— Добра. Як жа мне быць? Дзе пакуль што прытуліцца? Я да вас заўтра прыйду. Вы, здаецца, і сакратар укому? Я заўтра зранку, пагаворым аб усім. А цяпер... я сапраўды ня ведаю, дзе прытуліцца. Парайце.

Блонскі расказаў, дзе гасьцініца. Як выходзіла, чамусьці сказаў:

— Ня зранку заўтра, а гадзіны ў чатыры зайдзіцеся. Тады вальней будзе пагутарыць.

— Добра! — кінула яна зь дзьвярэй.

Як выйшла, Блонскаму пуста стала ў пакоі. Заныла цягуча-едкая ціш старога каменнага дому, балюча напяла мазгі.

Нецярпліва чакаў, калі зноў пачуюцца крокі, на пасяджэньне пачнуць прыходзіць.

А ў галаве думкі тачыліся: старожкія, пудлівыя, як цішыня навокал пустога вялізнага дому. Думаў аб гэтай жанчыне. Хацеў уявіць яе ў сваіх думках, ды чамусьці не ўдавалася. Вобраз неяк пляміўся і разьвейваўся. Толькі вочы яскрава ўцяліся ў памяць. Здаровыя, ясныя, з шчырым агоньчыкам.

Назаўтрага Блонскаму мінуты здаваліся за гадзіны, а гадзіны за вечнасьць. Чакаў чатырох. Не хацеў сам сабе ў гэтым прызнацца, не хацеў пагадзіцца з гэтым. Ахапляла дасада, злосьць на самога сябе.

А як падышло да чатырох, зусім узбурыўся. Хадзіў з кутка ў куток, поўны прыкрай нецярплівасьці. Часам спыняўся, аглядаў сам сябе, дзіваваўся:

«Што ж гэта такое? Нэрвы ці што?.. Вось дык гісторыя».

Злаваў, абураўся і зноў хадзіў узад і ўперад.

Урэшце яна прыйшла. Пасьпешна прывіталася, села каля стала.

— Ну, давайце пагутарым, як тут у вас... З чаго пачынаць?..

Пачала гаварыць аб справе. Блонскі глядзеў на яе і дзівіўся яе сьціслай сур'ёзнасьці. Зусім ня так, як учора. Ніводнага старонняга слова, быццам, апрача справы, нічога няма ва ўсім сьвеце. Нават аганькі ў вачах — сталёвыя нейкія, цьвёрдыя.

Доўга гутарылі. Змрок разьліў па пакоі безуважна-шэрую муць, згрудзіў у калматую масу прадметы. Электрычнасьці не палілі, сядзелі ўпацёмку. І тады Блонскі неяк асабліва моцна, напружна стаў адчуваць гэту жанчыну. Затушаваная цьмяным валакном змроку, яна здавалася нейкай хваравіта-назойлівай плямай, якая ўпарта цягнула да сябе ўвагу. Ён пільна прыслухаўся да гуку яе голасу, напружна стараўся знайсьці ў ім нешта, злавіць. Здавалася, што пад гэтым сухім, троху мітынговым тонам ёсьць нешта схаванае, палахліва затоенае. Адчуваўся нейкі ледзь прыкметны фальш у гэтых цьвёрдых, энэргічных словах аб вызваленьні жанчыны, аб змаганьні з іржавымі путамі сям'і, аб рэвалюцыі быту і г. д. А часам Блонскі выяўна чуў у яе голасе мімалётныя ноткі няпэўнасьці, нейкага сумнага неўразуменьня. Гэтыя ноткі чамусьці выклікалі сымпатыю да яе, спачуваньне.

Блонскаму ўрэшце надакучыла гаварыць аб сур'ёзным. Ён раптам перапыніў яе:

— Слухайце... Я ж дасюль ня ведаю вашага прозьвішча... Зусім з думкі сышло.

Яна засьмяялася.

— Бяда вялікая, падумаеш... прозьвішча... Але ж і сапраўды, трэба як-небудзь зваць... Шумава — маё прозьвішча... А ваша я ведаю, бо вы ж тут вядомы на ўвесь павет...

Нейкі час маўчалі. Цішыня раджала напружаную вострую блізкасьць. Гэта цяжарыла. Здавалася, што даўно-даўно знаёмы і ўжо надакучылі адзін аднаму.

Блонскі ўстаў, запаліў электрычнасьць. Зірнуў на яе. Яна сядзела ў задуменьні. Аб нечым цяжкім думала, бо вочы атуліліся цьмянай, сталёвай глыбінёй. Потым яна нецярпліва траханула галавой, узьнялася. Усьміхнулася — ні то зморанай, ні то сумнай усьмешкай.

Блонскі агарнуў яе ўсю ўважным поглядам. Залюбаваўся міжвольна. Яна вельмі прыгожай здалася яму.

Шумава быццам заўважыла гэта. Задорна кінула яму насустрач адкрыты вясёлы погляд. У вачах аганькі заблішчэлі, зайскрыліся. Загаварылі жвава, пасьпешна.

— Заседзелася я... Гадзін дзевяць, пэўна, ужо ёсьць... Трэба ісьці ў свой палац... Ну і ўдружылі вы мне, таварыш Блонскі! Высока-высока і брудна. Адзін толькі й быў вольны нумар. Сёньня ўсю ноч ваявала з мышамі... Надта злосны вораг... Ну, я пайшла. Бывайце!

— Я таксама пайду. Пойдзем разам.

Дарогай яна лапатала аб розных драбніцах. Блонскі маўчаў, не хацелася гаварыць. Думкі цяжэрна, грузка перавальваліся, давілі мазгі.

На рагу вуліцы разьвіталіся.

2

З таго часу яны сустракаліся часта. Блонскі любіў глядзець, як працуе Шумава. Захапляў запал яе, упартасьць у драбніцах, у будзённых, марудных справах, упартасьць, якая пераходзіла ў азарт, ап'яненьне. Гэтая ўпартасьць часам хваравітай здавалася, але заўсёды захапляла, зараджала, абуджала і ў Блонскага нейкі вострый апэтыт да работы.

Праз два тыдні Шумава склікала зьезд жанчын-дэлегатак. На зьезьдзе Блонскі сядзеў у прэзыдыюме. Глядзеў на белыя, чырвоныя, чорныя хусьцінкі, на задуменныя, застыглыя ў глыбокай сур'ёзнасьці твары. І адчуваў, як усе гэтыя твары — маладыя й старыя, прыгожыя й непрыгожыя — зьліваюцца для яго ў адзін твар жанчыны-работніцы: зморaны, сумны.

Шумава рабіла даклад. Яна была ўзрушана, гарэла жарам шчырасьці, веры ў тое, аб чым гаворыць. Яе словы зычэлі той непасрэднай, простай праўдзівасьцю, якая бывае звычайна ў тых, хто ня толькі ведае справу, але адчувае яе, хто зьвязаны зь ёю арганічна, кроўна. Яе слухалі так, як рэдка калі дакладчыкаў слухаюць. Уся зала дыхала напружанай, глухой цішынёй.

А як скончыла, разгарэліся гарачыя, упартыя спрэчкі. Раскрыліся заледзянелыя ў горы грудзі жанчыны-работніцы, бурнымі павадкамі завіхрыліся, пырснулі крывавай пенай адвечнай пакуты.

Усё правільна Шумава выказала, толькі ў адным перабавіла, у нутро жаночае балюча ўрэзалася. Выступіла супроць ядынай уцехі, шчасьця жаночага: сказала, што ня трэба матцы дзяцей сваіх гадаваць, што зло ў гэтым нейкае ёсьць. Прапанавала: адбіраць ад матак іхных дзяцей і дамы выхаваньня наладжваць. Каб матка ня знала сына свайго, а сын маткі, каб агульныя, усіхныя дзеці былі. Проці гэтага жанчыны-маткі агнём загарэліся. Казалі: жорстка гэта і крыўдна.

А Шумава на сваім стаяла, сваю думку з запалам адстойвала.

Потым, як пасьля пасяджэньня вярнуліся з Блонскім у двор, усё яшчэ гаварыла, узрушаная:

— Гэта злачынства... так, злачынства. Гэта псаваньне дзяцей... І сабе нахаба... Слухайце, гэта ж ясна, як дзень. Нам трэба тварыць новых людзей, людзей калектыву, у якіх няма матак, бацькоў, у якіх бацькі — усё чалавецтва. Да гэтага трэба ісьці. І гэта магчыма... у невялічкай мерцы, але і цяпер ужо магчыма... Ці ж няпраўда?..

Блонскі любаваўся яе захапленьнем. Спрачацца не хацеў. Ды навошта? Лепей вось так слухаць і адчуваць моўчкі яе сьвежае сакавітае парываньне, чыстату яе думкі — простай і шчырай.

А яна далей гаварыла:

— Мы псуем іх. Мы зь дзяцінства навальваем на іх лішнія прыхільнасьці, прывычкі, якія шкодны, якія шмат для каго путамі будуць. Гэта ж несправядліва. За гэта яны клясьці нас будуць.

Яна доўга яшчэ гаварыла, даводзіла, пакуль не заўважыла, што Блонскі маўчыць, адданы сваім думкам. Тады змоўкла.

Падышлі да таго месца, дзе трэба было разьвітацца, пайсьці ў розныя бакі. Яна спынілася.

— Ну, бывайце!..

Але Блонскаму не хацелася ў двор. Ён наўмысьля марудзіў. Часінку стаялі на рагу пад жорсткімі ўзьмётамі сьцюдзёнага ветру.

— А мо да мяне зойдземся? У мяне цёпла на новай кватэры.

Блонскі згадзіўся з ахвотай:

— Пойдзем.

Была завіруха. Вецер з шалёным выцьцём віўся па вуліцах. Падцікаўся з-за рогу і ўраз налятаў, шкуматаў, сьцёбаў па твары жменямі калючага сьнегу. Хацелася барджэй перабегчы і схавацца ў цёмным прытульным пакоі.

Блонскі і Шумава ішлі шыбка-шыбка, часам застраваючы да кален у сумётах, спатыкаючыся. Хісталіся, быццам п'яныя, штурхалі адзін аднаго. Горача стала і весела.

Шумава сьмяялася звонка, раскаціста. Сьмех дзіўна, нязграбна сплятаўся з злосна-трывожнымі ўзвывамі ветру. Здаваўся дзікім, недарэчным.

Спыніліся на рагу адной з акрайных вуліц. Шумава паляпала ў акно, узьбегла, тупаючы, на скрыпучы, адубелы ад марозу ганак.

Адчыніла нейкая бабулька. Усьміхнулася ветла. На кухні густа агарнула цяплынь. Загарэліся шчокі з марозу.

У пакоі Шумавай Блонскі зьдзеў паліто, з асалодай сеў на канапу.

— Добра ў вас. Проста, але прытульна. Падабаецца мне...

— Глупства. Гэта — што цёпла, дык прыемна з марозу...

Яна стала поплеч. Уздыхнула глыбока-глыбока, адкінулася на сьпінку канапы.

— Замарылася. Не магу многа працаваць. А калі-небудзь зусім надарвуся. Дужа баюся гэтага. Тады ж пуста стане, жыцьцё будзе бясьцьветнае, нуднае, як змрок.

Яна задумалася. Блонскі ўсьміхнуўся.

— Але ж гэта няўхільна. Прыйдзе старасьць калі-небудзь...

— Старасьць? Я чамусьці ня думаю аб ёй. Гэта далёка... Дый навогул — ну яго к ліху!.. Хопіць нас... Сіл шкадаваць ня варта. Пакуль ёсьць — будзем жыць, будзем браць жыцьцё, усё, цалкам. Галоўнае — шырэй, глыбей, як мага глыбей. Ці праўда?..

Яна раптам зьмянілася. Згінула змора, загарэліся вочы бадзёрасьцю, палкай энэргіяй. Нешта бурлівае, сьмелае сьвяцілася ў іх. Цягнула магутнай магнэсавай сілай, як цягне да сябе бурнапеністае бяздоньне глыбокае.

У Блонскага ў сэрцы нешта новае зарадзілася, нешта вострае, салодка-пякучае. Прыемна было глядзець у пераліўчаста-сьветлыя вочы, акунацца ў іх прамяністую чароўную глыбіню.

Гаварыць не хацелася: словы драўлянымі, карузлымі нейкімі здаваліся. Былі ўсе агідныя, брыдкія.

А яна дражніла гарэзнай, задорнай усьмешкай, казытала нэрвы абураючым поглядам. Нахілілася да яго, абдала жаркім дыханьнем.

— Мы будзем жыць... Праўда? Мы ж маладыя, вольныя... Жыцьцё наша... усё наша. Мы будзем працаваць і цешыцца жыцьцём... Акунацца глыбока ў яго, браць яго... усё, да дна... Праўда?..

Ён мармытаў нешта ў адказ. Адчуваў, як шумнай хваляй кроў к галаве прылівае, парыўчата б'е кляўцом у віскі. Уваччу спакусьліва акругліліся мяккія абрысы жаночага цела, абяцалі палкую ўцеху. Салодкім туманам муць разьлілася. Яшчэ момант — і схапіў яе, гарачую, слухмяную, сьціснуў у моцных абдымках...

А пасьля — сорамна чамусьці было і непрыемна. У галаве агідна скаўзанулася прыкрая думка:

«Як з прастытуткай...»

Адвярнуўся, не глядзеў на яе, баяўся глядзець. А калі скоса зірнуў, убачыў, што плача. У вачох рэзка мятнулася аголенае плячо, якое сударгава здрыганулася. Моцна застрала ў мазгах, прыкавала. Часінку толькі і бачыў, як дзівосна трасецца гэта назольліва-белае плячо.

Потым раптам нешта растала ўсярэдзіне, разьлілося цёплым, добрым такім. Шкада стала. Такой любай, дарагой здалася яна. Захацелася прыгалубіць, суцешыць. Падышоў да яе, сеў поплеч. Хацеў сказаць нешта, многа сказаць — ласкавага, прыветнага, але слоў такіх не было; ня знаў ці забыўся на гэту часіну. Зьлёгку прыткнуўся к яе галаве, пагладзіў пяшчотна, як дзіцё.

— Нашто ты, слухай... Ну, кінь... ня трэба...

Яна схапянулася, узьняла галаву. Зірнулі на Блонскага распаленыя вочы з іскрыстымі расінкамі сьлёз, у самую душу праніклі. У іх — разам з глыбокай журбой ціхая дзіцячая радасьць. Яна скрозь сьлёзы ўсьміхнулася.

— Любы, ты ня думай... мне добра... Ты не зважай... гэта глупства... Бывае часам ні з таго ні зь сяго... Я такая... дзіўная, недарэчная... Ты не глядзі...

Яна сударгава прытулілася да яго, схавала галаву ў яго на грудзях... Ён чуў, што плача яшчэ, і ня знаў, што рабіць. Раптам яна зноў ажывілася, загаварыла парыўчата, горача.

— Любы! Як добра так... як добра! Мы вольныя, нічым не зьвязаныя... Шчасьця як многа — глыбокага, поўнага, нічым-нічым не абмежаванага! Ты адчуваеш, як гэта проста, натуральна... як гэта моцна!.. Ты згодзен, так? Ну, скажы, любы... добра так? Ты таксама шчасьлівы?

Блонскі не разумеў яе хваравітага, бурнага захапленьня. Глядзеў на яе з ласкавым неўразуменьнем, моўчкі абдымаў яшчэ ахінутыя нэрвовай дрыготаю плечы.

Так сышліся яны. З таго часу ў Блонскага было шмат вечароў гарачай уцехі, шмат бяссонных начэй, шмат гадзін глыбокай развагі. Ён усёй істотай аддаўся каханьню, упіваўся ім. І каханьне яго асьвяжыла, зрабіла маладым, уліло ў кроў моцнае бушаваньне, аквяціла жыцьцё.

К Шумавай ён прывязаўся, прывык. Бачыў у ёй жанчыну і таварыша. Але не разумеў яе. Дзівілі яе раптоўныя ўзбурэньні, рэзкія пераходы ад незразумелай журбы да парыўчата-бурнага захапленьня. Чулася ў гэтым загадка, і многа гадзін Блонскі ламаў галаву над яе разьвязаньнем.

Аднаго разу ён засьпеў Шумаву ў глыбокай развазе. Ён колькі дзён перад гэтым ня бачыўся зь ёй, і за гэты час яна страшэнна зьмянілася. Блонскі падумаў адразу, што хворая: схудзела, змарнела, вочы глыбока-глыбока схаваліся, хваравіта завастрыліся.

Як убачыла яго, усьміхнулася нейкай пакутнай нэрвовай усьмешкай.

— Я якраз аб табе думала. І аб сабе... Я паехаць надумала. Хутка, можа, заўтра...

— Зусім?

— Так, зусім.

— Чаму?

— Гэта трэба. Я растлумачу табе... Я моцна, глыбока к табе прывязалася... Ты ведаеш гэта. Больш, чымся трэба... І вось — я баюся... Сама сябе баюся... Ува мне можа абудзіцца жанчына... Не навогул жанчына, а такая... ну, слабая, адданая, бязвольная... Жанчына-раба, такая, якой не павінна быць, якая — зьнявага для чалавека... Я спалохалася гэтага і пастанавіла паехаць.

Блонскі маўчаў. А яна адвярнулася і гаварыла далей нейкім вінаватым прыдушаным голасам:

— А потым... Яшчэ ёсьць прычына... Але гэтага не скажу, не магу... Ты даруй мне... Я не хачу, каб ты знаў... Я хацела б і сама ня знаць гэтага, бо гэта маё слабае месца, ахілесава пята...

Блонскі няўцямна зірнуў на яе. Пастанова Шумавай не зьдзівіла яго. Чамусьці здавалася гэта простым, звычайным. Але што ж гэта яшчэ за прычына? Што за загадка?..

Хацеў спытацца, дабіцца адказу. Але стрымаўся. Сказаў проста, спакойна:

— Ну, што ж, едзь сабе...

Назаўтрага Шумава паехала.

3

Усьміхнулася вясна гульліва, сонечна. Так усьміхнулася, што сівавалосая бабулька-зямля зусім растала, захлібнулася з радасьці. Недалужна засьлязілася цурочкамі спрытнымі, кроплямі звонкімі сьлюнява хліпнула. Зашамкала вуснамі старчымі, голасам шопатным, ціхім.

А потым зарумзала. Ды так зарумзала, так загаласіла, што ўвесь горад шумам напоўніла, патокай сьлёз заліла. А як наплакалася даволі, салодка ўсьміхнулася мокрымі, бляскам аблітымі вуліцамі, пачала выцірацца шаўковымі коскамі сонейка.

І пачулася тады, што зямля не такая ўжо бабулька старая. Толькі гэткай прыкінулася, а сапраўды — вунь яна: сьмяецца задорна, молада, зьвініць птушкамі шустрымі, пярэстай, гаварлівай грамадой людзей разьліваецца. Зусім маладуха!

У гэту пару Блонскі адчуваў бурлівае трапятаньне ў грудзёх. Вясна бунтоўна распаліла кроў неспакойнымі жаданьнямі. Чакалася нешта — турботна, настойліва: нечага хацелася — яскравага, моцнага. Душа рвалася некуды, разгарнуцца хацела.

У гэту пару Блонскі Шумаву ўспомніў. Ды так ярка, выразна, быццам — во яна, перад вачмі. Варухнулася ў сэрцы знаёмае, салодкае, агарнула душным жаданьнем. Засумаваў Блонскі. Ня то што засумаваў, а адчуваў заўсёды назойліва-абураючую патрэбу, ня мог пазбыцца яе. Тыдні два змагаўся з сабой, а потым ня вытрымаў — пабачыцца ўздумаў.

Знаў, што Шумава ў N. Скарыстаўшы вольны час, паехаў туды.

Вясна ўжо зусім разгарнулася. Пукалі почкі на дрэвах, у сьвежым арамаце нараджалася першая зеляніна.

Дарогай, у цягніку, Блонскі не адрываўся ад акна. Смагла глядзеў, як парыцца ў сонцы тлустае поле, як лес кучаравіцца кволым, празрыстым лісьцем.

А ў N прыехаў — акунуўся ў сумятлівы рух, у ліхаманку напружанага жыцьця. Ішоў сярод гурмы шумлівай і адчуваў, як у грудзёх расьце непакой нейкі, турбота. Паўставала пытаньне:

— Нашто?

Хацелася вярнуцца, паехаць назад. Але ішоў, бо нязмога была пакідаць сабой.

Шумава спаткала радасна. Моцна, па-прыяцельску руку паціснула.

— На доўгі час прыехаў?

— Дні на два.

— Толькі?.. Ну, як жывеш, як там у вас? Што нашы робяць?

Блонскі безуважна адказваў. Упарта разглядаў яе, шукаў у ёй зьмены. Але яна была такая, як і тады, паўгоду назад. Толькі загарэць ужо справілася. Стала ад гэтага прасьцей і прыгажэй. Ён зазначыў з усьмешкай:

— Ты на цыганку стала падобна.

— О, куды там!.. Я цяпер — маладзец... Моцная такая, здаровая...

— Працуеш, як і раней?

— Больш. Я ж люблю працаваць. А часам трэба яшчэ, каб забыцца, забавіцца. Вось тады... як ад вас паехала... тады цяжка было, многа нутраной барацьбы...

— А цяпер?

— Цяпер добра. Вымелася ўсё. Час памагае... Вось толькі цябе я зусім не чакала. Мо гэта дрэнна, што ты прыехаў?..

Яны выйшлі на вуліцу, пайшлі па тлуста-бліскучай ад сонца панэлі. Паветра абдавала тамлівай сьпякотай, было душна, млява. Твар у Шумавай разгарэўся, зардзеўся гарачай чырваньню.

Блонскі глядзеў на яе, адчуваў яе сьвежасьць, здароўе і захапляўся. Чамусьці не падабаліся, цяжэрнымі былі яе бадзёрыя, простыя словы. Хацелася нечага іншага, хацелася інтымнасьці.

А яна з запалам апавядала аб жыцьці сваім, рабоце, аб новых плянах, задачах. Упарта ўнікала таго, што магло напамянуць аб мінулым.

Яны прайшлі колькі шумлівых кварталаў і потым неўзаметку для саміх сябе збочылі ў бязьлюдную ціхую вуліцу. Там яны стрэлі купку дзяцей, якія весела гулялі на панэлі. Як падышлі да іх, Блонскі заўважыў, што раптам па твары Шумавай прасьлізнула нэрвовая бледнасьць. Вочы сумятліва забегалі па бакох, працятыя непакоем. Яна загаварыла шыбка-шыбка, у відавочным замяшаньні:

— Гэта дзіцячы дом наш, самым лепшым лічыцца. Гуляюць зараз... на сонейку...

Блонскі зірнуў на дзяцей. Сьвежыя, чысьценькія. Жвава пераклікаюцца вясёлымі галасамі-званочкамі.

А з Шумавай тварылася нешта незразумелае. Яна пасьпешна прыбавіла ходу, быццам хацела хутчэй уцячы ад дзяцей. Потым раптам спынілася, вярнулася назад і парыўчата схапіла аднаго з хлопчыкаў — беленькага, з блакітнымі вочкамі-зорачкамі. Дзяцёнак трапятаўся, нецярпліва адмахваўся, як ад дакучнае мухі, з усіх сіл вырываўся. Злаваў, што яго адарвалі ад цікавай гульні. А яна горача песьціла яго, цалавала.

Блонскі глядзеў, нічога не разумеючы. Потым кінуўся ў вочы твар Шумавай: на ім адбітак глыбокай агнёвай мукі, журбы. Маланкай бліснула думка:

«Дык вось дзе разгадка! Вось тое „слабае месца"!»

Як пайшлі далей, Шумава маўчала. Блонскі асьцярожна спытаўся:

— Што гэта значыць?

Яна паглядзела дапытліва на яго.

— Ты дагадаўся. Ты знаеш ужо...

— Гэта твой дзяцёнак?

— Так. Толькі не кажы нічога, ня трэба. Так павінна быць, я знаю.

Яна зноў замоўкла. У Блонскага гарэла, прасілася на язык пытаньне. Ён не стрымаў.

— А ён ведае сваю матку?

— Не, ня ведае. Забыўся ўжо, адвык. Ён не павінен знаць, яму ня трэба гэта. Нашто? Ён павінен вырасьці чалавекам вольным. Нашто зьвязваць яго лішнімі прывязанасьцямі? Не патрэбна гэта, шкодна.

— Але ж табе як? Цяжка гэта, ты ж ламаеш сябе.

Яна нібы раззлавалася.

— Не, няпраўда, ня цяжка мне! Часамі толькі. Гэта мінуты слабасьці. Але кінем аб гэтым, ня будзем гаварыць... я прашу цябе. Гэта расстройвае толькі, раскалупвае рану. І потым... ведаеш, Блонскі, едзь ты лепей. Мне цяжка з табой. Ты расслабляеш мяне. У мяне родзяцца нядобрыя пачуцьці. Я не хачу быць жанчынай, толькі жанчынай. Я хачу быць чалавекам.

. . . . . .

На другі дзень Блонскі вярнуўся ў двор. Пад аднамернае калыханьне вагона ў галаве бесканцовай чарадой перавальваліся думкі. То цяклі плаўна, спакойна, то раптам спляталіся ў грамоздны клубок, сьціскалі мазгі цяжкім неўразуменьнем.

Ён думаў:

«Што ж гэта, нарэшце? Фанатызм, вар'яцтва? А мо сапраўды так лепей? Мо гэта натуральна, мо так і павінна быць? Мо гэта адзіны правільны шлях?»

Яму ўспомніўся беленькі сьвежы тварык дзяцёнка, які зь нецярплівасьцю вырываўся з матчыных абдымкаў — незнаёмых, непатрэбных. І поплеч — другі твар, поўны вострай мукі, матчынай тугі.

Успомнілася і тое, што было даўней у першы вечар іхняга зьбліжэньня. Успомніўся той дзівосны настрой яе, тыя незразумелыя сьлёзы.

«Дзіўная яна... Усё-такі дзіўная».

[1925]

ПАЭМА ПРА ЧОРНЫЯ ВОЧЫ

Сем гадоў я шукаў цябе ў сумятлівым моры жыцьця, каб скончыць недапетую песьню нашае дзівосна яскравае дружбы.

Я не сумаваў па табе, я не ўздыхаў і ня плакаў. Я толькі часамі бачыў цябе, калі ў маім уяўленьні спакусьліва разгортваліся шырокія палотны мінулага і сталёва сьвежая шыр (помніш нашы паходы?) дражніла сваёй непазбыўнай рамантыкай. Я бачыў цябе зусім выяўна — тонкую, гнуткую постаць тваю ў вайсковым адзеньні, антычны твой твар, твае вострыя чорныя вочы. І вось тады мне чамусьці здавалася, што я павінен знайсьці цябе, што павінны мы скончыць перарваную песьню нашае дружбы.

І, нарэшце, я цябе знайшоў. Я выпадкова пачуў, што ты тут, і пайшоў да цябе, поўны смутнай трывогі і радасьці.

У гэтым ружовым пакоі зь мяккай канапай, з дыванамі па сьценах мне чамусьці цяжка, няёмка. Я ня ведаю, як з табой гаварыць, я адчуваю, што ты шкадуеш мяне, мне страшна за нашую песьню, за нашую дружбу. Чаму не сустрэліся мы дзе-небудзь на вятраных берагах сьцюдзёнай Дзьвіны, чаму я не ў чаравіках дзіравых з абмоткамі, чаму ты ня ў тоўстай салдацкай шынэлі, якая сьціпла хавае твае дзявоцкія формы, у якой ты мне — дарагі, любы таварыш!..

Я гляджу на твой твар і з трывогай бачу ў ім нешта новае, нешта цяжкое, гладкае. Твае вочы сталі вузкія ад пачуцьця дабрабыту, усьмешка твая вязьне ў цягучай марудлівай млосьці. Я хачу не глядзець і не магу адвесьці вачэй... Мне шкода, шкода цябе — майго дарагога, любага таварыша, мне шкода мінулага нашага.

Пастой... Я напомню табе аб гэтым мінулым, я кваціста-яскравымі вобразамі сатру з твайго твару гэтую мляваю гладзь, твае чорныя вочы зноў загарацца вострым агнём, ты станеш такая, якая была ў тыя бурлівыя дні.

. . . . . .

Нашы патомкі складуць шмат прыгожых легенд аб днях, у якія гарэла сьвятая нянавісьць і морам лілася кіпучая кроў. Аб іх будуць расказваць старыя дзяды блакітнавокім унукам, і ўнукі будуць загарацца запалам гэтых вялікіх дней.

Калісьці ты прыйшла да нас, поўная такога запалу. Я адразу тады зразумеў, што тваё сэрца кіпіць, што ты прагнеш барацьбы, хочаш аддацца ёй, хочаш загінуць. Ты адразу сказала мне, востра бліснуўшы вачмі:

— Таварыш камісар! Я вазьму вінтоўку і пайду ў роту.

Я пакінуў цябе пры штабе. Мне нялёгка далося ўгаварыць цябе, што і тут можна быць карысным, што небясьпека тут ня меншая, што і тут людзі патрэбны.

І вось пачало нешта расьці паміж нас. Я назваў гэта дружбай, а што гэта было сапраўды — я ня знаю. Ты памагала мне.

У цябе ў той час была сіла. Помніш твой жарт наконт «мокрай прытульнасьці»?

О, гэта была цяжкая, страшэнная ноч. Калі я ўспамінаю аб ёй, я адчуваю фізычны холад, я здрыгаюся, быццам мяне абдаюць жорсткай, сьцюдзёнай зольлю. І ты, слабая дзяўчына, суцяшала мяне, выдумляючы нейкае глупства аб тым, што, седзячы пад халодным, ледзяным дажджом і не шаволячыся, можна адчуць асаблівую прыемнасьць і цяплынь. Толькі каб ані-ні не зварухнуцца, каб аддацца цалкам дажджу і старацца ўявіць, што дождж цёплы, што ён не халодзіць, а грэе. Ты назвала гэта — «стварыць мокрую прытульнасьць». Я, помню, прабаваў гэтак рабіць, і сапраўды было цёпла, і весела было, і я потым хадзіў да чырвонаармейцаў дзяліцца зь імі сваёй бадзёрасьцю...

. . . . . .

Не, я цябе не кахаў. Я ня бачыў цябе як жанчыну. Можа, гэта таму, што повен быў у той час другім, больш пільным і важным, таксама, як і ты, як і ўсе, хто з намі быў. Мне ўспамінаецца той вечар у маёнтку... Гэта выйшла неяк зусім няўрымсьля і нечакана. Я не хацеў гэтага, не імкнуўся да гэтага. Мне потым было непрыемна. Я помню (аб гэтым сьмешна казаць, але — хай сабе), калі я цябе неяк узяў за руку, дык адразу мне дзікім здалося, што рука такая малая і мяккая, што яна неяк квола, падатна засталася ў маёй і чамусьці дрыжэла... І ўсё, што потым было, прайшло зусім несуразна і дзіка...

Не, я цябе не кахаў...

. . . . . .

Яшчэ вось што... Калі па лясах і палях пасьцілаецца жоўтай празрыстасьцю восень і глыбачэюць крыштальныя далі, калі сеецца ў полі журавінавы пах пажоўклай травы, я ўспамінаю нашы паходы. Я рассыплю прад тваімі вачмі абрыўкі тых пекных малюнкаў, ты пачуеш непазбыўна-знаёмае, вольнае...

Ахутаныя старожкім шолахам калёны...

Рэдкі — упаўголаса — гоман...

Глухі, уціскліві тупат стрымленых коней...

Нехта мармыча ледзь чутна нейкую песьню...

Нейчы спудзіўся конь, лапатнуў з усіх ног ад куста...

Нехта каманду прапеў упаўголаса: — Пад но-о-г-і...

І маўчыць цёмны санлівы лес, лезе з бакоў у самыя вочы абвіслай сваёй барадой — і сьліна цячэ з барады, мажа твар прыкрым макроцьцем...

Пахне коньмі, пахне цішынёй насьцярожанай, пахне шынэлямі і людзьмі...

Нечым пахне — дружным, як хвалі, моцным, як сталь, і напорным, як бура...

Або так...

...Лёгкае восеньскае сонца...

Стары бярозавы шлях — дзіравая жоўтая стужка...

Мерны, бадзёры поступ пяхоты...

Пыл здаецца сталёвым налётам, здаецца, што ўсё ў сталі...

Песьня...

Песьні былі рдзяныя, як усход, звонкія, як восеньскі холад, імклівыя, як прастор...

Ты ішла разам з усімі. Ты пела так: закідала назад галаву, жмурылася, нібы глядзела на сонца, і крычала. Помніш, як цёпла сьмяяліся хлопцы, калі ты сьпявала?..

. . . . . .

Слухай, я раскажу яшчэ апошняе. Я напомню табе наш апошні дзень. Мне таксама быў ён цяжкі. А табе была мука, я ведаю. Толькі ня каюся я ні ў чым, не шкадую нічога...

Ты помніш, які гэта быў страшэнны, напружаны бой? Помніш, у якой сумятні быў наш штаб, якая была сумятня наўкола? Музыка гэтага бою жыве ва мне да гэтага часу! Яна зраслася ў адзін грымучы акорд, у якім пераблытаны ўздыхі гармат з траскатнёй кулямётаў і стрэльбаў, з адчайным рыпеньнем абозаў, зь недалужным стогнам параненых, зь мітусьлівым гвалтам асалапелых ад страху.

Наш полк біўся адважна. Але сіла была не на нашым боку. З кожнай мінутай у штаб прыляталі трывожныя весткі. Нам трудна было ўжо трымаць сувязь з часьцямі, мы разагналі ўсіх веставых, і шмат зь іх не вярнулася. Штаб пасьпешна рыхтаваўся адступаць.

Тады прыйшоў загад зьняць полк з пазыцыі. З батальёнамі сувязі ўжо не было, пры штабе не было ніводнага ардынарца, не было каго паслаць з загадам.

Я не зьбіраўся цябе пасылаць, у мяне не было і думкі аб гэтым. Але ты стаяла паблізу, і я няўмысьля зірнуў на цябе. Тады ўжо я ня мог не паслаць...

Ты была незвычайная. Я добра помню, якая была ў той міг. Ты стаяла нерухома, падаўшыся троху наперад, твар твой быў белы як сьнег, і зь яго зрываліся вострыя чорныя вочы — ня вочы, а чорны агонь — жывы і пякучы.

Ты ўся была — парыванне і воля.

Ты ўся была — адно імкненьне.

Я тады ўвесь загарэўся магутнай радасьцю, я, можа, нават кахаў цябе ў тую хвіліну. Я ледзь стрымаўся тады, каб ня кінуцца да цябе, каб не абняць цябе — любага майго таварыша, героя. Гэта ж наўмысьля я цябе так суха паклікаў тады, нават назваў па прозьвішчу. Гэта ж наўмысьля я не сказаў ані слова, апрача сухога ляканічнага загаду...

Я з захапленьнем сачыў за табой, я ня зводзіў вачэй, любаваўся, як ты адважна схапіла стрэльбу, спрытна ўскочыла на каня і паляцела птушкай па полю насустрэчу сьмерці.

Ты была прыгожая тады. Ты такой і засталася ў маім уяўленьні, такою я бачыў цябе ўсе сем год, такую шукаў.

Потым я сустрэў цябе на дарозе, за вёскай. Мы ехалі насустрэчу нашым часьцям, прабіваліся скрозь затоку павозак, конных і пешых людзей, скрозь гармідар адступленьня. Цябе везьлі на тэлефоннай двухколцы нашы армейцы. Убачыўшы мяне, яны спыніліся і дапытліва зірнулі, чакаючы загаду.

Ты глядзела на мяне ціхімі пагасшымі вачмі, у якіх скрозь маўклівыя сьлёзы сьвяціўся стрымлены боль. Я знаю, ты хацела астацца са мной, ты хацела тады ласкі блізкага, хацела добрага спагаднага слова. Я ня ведаю, можа, я зрабіў вельмі жорстка, можа, іначай трэба было. Але я ня каюся, я не шкадую. Я рабіў па закону барацьбы. Помніш? Я сказаў толькі два словы:

— Адправіць у шпіталь...

Пакуль вы ад'ехалі, я яшчэ раз сустрэўся з табой вачмі. Мне здалося, што ты ўсьміхнулася мне. Але гэта, пэўна, толькі здалося, бо я хацеў гэтага, я напружана чакаў гэтае ўсьмешкі.

. . . . . .

Вось і ўсё. З таго часу сем год я шукаў цябе, каб скончыць недапетую песьню нашае дзівосна яскравае дружбы.

І вось я знайшоў. Вось сяджу прад табой, зьбянтэжаны гэтым ружовым пакоем зь мяккай канапай, з дыванамі па сьценах, зьбянтэжаны нечакана-новым выразам твайго антычнага твару.

Не, я цябе не знайшоў, я шукаю яшчэ. Я пільна азіраю тваю прыгожую, пышную постаць, выразна акрэсьленую складкамі шоўку, я з балючым напружаньнем углядаюся ў твар твой, я хачу працяць сваім гарачым поглядам гэтую млявую гладзь, гэты агідны ўзор дабрабыту. Я хачу ўбачыць цябе — майго дарагога, любага таварыша, героя.

Я шукаю цябе — чуеш? — і не знаходжу.

Я гляджу з болем і страхам на тваю прыгожую постаць, яна чужая, агідная.

Ты ўсьміхаесься? Кінь гэту ўсьмешку — у ёй плыве давольнасьць жывёлы. Ня трэба сьмяяцца...

Твае вочы глухія, як пустата. Няма чорнага агню, няма вострых вачэй майго героя...

Ага... Я разумею... Я цяпер зразумеў. Я шукаў не цябе... Не, ты мне ня трэба. У сумятні пярэстай жыцьця я шукаў сталёва сьвежай шыры, я шукаў непазбыўнай рамантыкі.

Я пайду ад цябе. Я цябе не знайшоў, не засьпеў.

Я пайду ў сумятлівае мора жыцьця. Сярод блытаніны драбніц, у віры гарачай будзённасьці, у брудным пыле вугальля, цэмэнту і вапны, у шаломным грукаце дзён — я буду шукаць яе, свайго дарагога, любага таварыша.

Я знайду яе, я ўбачу магутны, чорны агонь яе прыгожых вачэй, яе запал абаўе мяне жыватворчаю сілай.

Я пайду. Я знайду яе, дармо ты сьмяесься...

Ня сьмейся! Сьмех твой агідны мне, прыкры.

Ня жмур сваіх чорных глухіх вачэй, каб ня бачыў я ў іх пачуцьця дабрабыту, каб не сьвяцілася ў іх давольнасьць жывёлы...

Ня сьмейся!

Я пайду шукаць...

Я знайду...

[1927]



Віктар Жыбуль, Антон Рудак

душу я выпяю да дна...



Валеры Маракоў



Прымай, дарагая краіна,
Прымай свайго сына ізноў!
І месячным сьветам —
Крывёю рабіны,
І сумам начэй, і трывогаю сноў...

Сям'я

Валеры Маракоў нарадзіўся 14 (27) сакавіка 1909 году ў Менску. Бацька паэта, Дзьмітры Маракоў, этнічны расеец родам з Пскоўскай губэрні, вярнуўшыся з расейска-японскай вайны 1904–1905 гадоў, збудаваў дом у чыгуначным пасёлку Козыраве каля Лібава-Роменскай чыгункі і ажаніўся зь мясцовай дзяўчынай Вольгай з Майсіевічаў. Паводле сямейнага паданьня, вуліца, на якой жылі Мараковы, называлася спачатку Марская, потым — Вялікая Марская і ўрэшце Велікаморская, ад прозьвішча Маракова, які першым пабудаваў тут дом. Падчас Першай усясьветнай вайны Валеры Маракоў разам зь сям'ёй жыў у Мцэнску і Рамнах, і толькі ўвосень 1920 году сям'я вярнулася ў Менск [9, с. 7].

З маленства В. Маракоў быў надзвычай прывязаны да бацькоўскай хаты. Крытыкі адзначалі, што ён «у поўнай меры не селянін і не рабочы» (А. Кучар), «ня любіць гораду і імкнецца да вёскі» (А. Адамовіч), і гэта, безумоўна, уплывала на ягоную творчасьць. Так, напрыклад, у вершы «Песьні, песьні юнацкага слова...» (1925) Валеры Маракоў прызнаваўся: *«І цяпер, калі горад шумлівы / Ўскалыхнуў у грудзях гул машын, / Усё роўна пяю я пра нівы, / Пра вясковыя рысы душы...»* [8, с. 31]. У вершы ж «Зь вёскі», напісаным у тым самым годзе, усё наадварот: *«Я схіліўся над белым пяньком, / Песьні слухаў і думаў пра горад. / Там, дзе вуліц шырокі пракос / Прада мною ляжаў, шумны, горды» [8, с. 36]. А ў першай і фінальнай строфах верша «Гадавала нас вёска і горад...»* гэтыя два полюсы паэтычнага сьветаўспрыманьня В. Маракова нібыта яднаюцца: і горад, і вёска вабілі паэта сваімі сацыяльнымі і культурнымі ўзрушэньнямі, і адтуль і адгэтуль выходзіла моладзь «у жыцьцё на мяцежныя хвалі» [8, с. 35–36].

Адукацыя

У Рамнах Маракоў паступіў у рэальнае вучылішча, а ў 1924 г. скончыў менскую 4-ю ўзорную школу. Амаль да канца 1925 г. разам з бацькам працаваў печнікоў. Пра гэтую старонку паэтавага жыцьця згадваў ягоны сябар Алесь Звонак — таксама печнікоў сын: «Бацькі ў абодвух па прафэсіі муляры, а ў вузкім профілі — майстры па складаньні сялянскіх печаў і нават галяндзкіх грубак. А сыны іх — памочнікі, чаляднікі, вучні вялікага творча-будавальнага чараўніцтва, якім валодалі іх бацькі, што марылі перадаць усё сваё ўмельства і штукарства, як творчую спадчыну, сваім сынам, ня ведаючы, што ў вольную часіну тыя патаемна займаліся слоўным чараўніцтвам, ператвараючы свае далёка не ружовыя мары ў далёка не дасканалыя паэтычныя радкі...» [8, с. 393].



Валеры Маракоў, Янка Туміловіч і Яўгенія Пфляўмбаўм гартаюць «Кніжніцу „Маладняку“». Менск, 1925 г.

Зьлева направа: 1-ы шэраг — Валеры Маракоў, Васіль Залуцкі (загадчык Дому пісьменьніка), Пятро Глебка, Язэп Пушча; 2-гі шэраг — Мікола Нікановіч, Васіль Каваль, Максім Лужанін, Натальля Вішнеўская, Алесь Звонак, Кузьма Чорны. Лістапад 1929 г.



Нягледзячы на тое, што бацька быў актыўным прыхаджанінам і царкоўным старастам, Маракоў пісаў пазьней: *«Мне былі далёкімі й незразумелымі тыя мастацкія рэчы, якія былі зьвязаны з жыцьцём і сьмерцю Хрыста. Я самы маладзейшы з маіх падарожнікаў, вучыўся толькі ў савецкай школе і ніякіх „боскіх запаветаў“ не вывучаў…»* [8, с. 326]. І ў вершах В. Маракова лірычны герой падкрэсьліваў свой нерэлігійны, але пры гэтым гуманістычны сьветапогляд: *«О, што яму — ён сёньня верыць ў Бога, / Я ж веру толькі ў шчасьце і людзей»* («Дзяўчыне», 1926) [8, с. 52].

Пачатак

Першыя вершы Маракоў зьмяшчаў яшчэ ў школьнай насьценнай газэце ў веку 12 гадоў, а ў друку ягоныя творы пачалі зьяўляцца ў чэрвені 1925 г. (часопісы «Чырвоны сьцяг» і «Малады араты»). У сьнежні таго ж году пастановаю Цэнтральнага бюро юных піянэраў Маракоў прызначаны сакратаром рэдакцыі часопісу «Беларускі піонэр», у пачатку 1926-га прыняты ў літаратурнае аб'яднаньне «Маладняк», пэўны час працаваў у Полацку, у рэдакцыі газэты «Чырвоная Полаччына». З Полацку В. Маракоў і А. Звонак напісалі ў Цэнтральнае бюро «Маладняку» ліст (датаваны 10 лістапада 1926 г.), поўны гумару і веры ў будучыню:

> *«Дарагія таварышы! Шлём вам усім па самым нізкім паклону… і жадаем вам жыць „многія лета“…*
>
> *Па-першае, сьпяшаемся сказаць, што Маракоў ужо не гаворыць — „загіну“, а кажа „будзем жыць да самай сьмерці, а там х… памрэм“. Гэта адзін плюс. Прыстроіўся Маракоў падхадзяшча, дзякуючы добраму націску па ўсіх інстанцыях. <…> Жывём у адной хаце калектывам цэлым, цэлым „стойлам Пэгаса“, сьпяваем песьні і пасылаем усіх русацяпаў к е… м… Рыхтуемся да вечару, рыхтуем літ. дадатак да газэты і г. д. Пішам вершы. Між іншым, у абодвух самы лепшы настрой, і Маракоў ня каецца, што паехаў у град Полацак, думае жаніцца разам са мной на ўмовах агульнага карыстаньня, чаго і вам жадаем…»* [11, арк. 5].

Першыя зборнікі

У 1926 г. выйшаў зборнік «Пялёсткі», але яшчэ да яго В. Маракоў падрыхтаваў кнігу «На залатым пакосе», што зьявілася толькі ўвосень 1927 г. Кніга адкрываецца вершам «Зь ценямі думкі, а з думкамі цені...», які адлюстроўвае маладое захапленьне сьветам і ў пэўным сэнсе задае тон зборніку:

Зь ценямі думкі, а з думкамі цені
Ўдаль па шпалерах бягуць.
Нехта стаіць прад зарой на каленях,
Выпіўшы сэрца разгул.

Месяц чырвонцам скаціўся у травы,
Ціш, хоць душу вынімай, —
Сёньня мне песьняў, пачуццяў і славы,
Тых, што ў нікога няма! [8, с. 87]

Лірычны герой Валерыя Маракова — чалавек, які адчуваў перавагу духоўнага перад матэрыяльным, адстойваў каштоўнасьць чалавечых адносінаў, імкнуўся падзяліцца з суразмоўцам самімі глыбіннымі пачуццямі і гэтым выклікаў давер у чытача:



Вокладка зборніку Валерыя Маракова «Пялёсткі». Менск: Выданьне ЦБ «Маладняка», 1926 г. Мастак ня вызначаны



Вокладка зборніку Валерыя Маракова «На залатым пакосе». Менск: Маладняк, 1927 г. Мастак ня вызначаны

Мне хочацца любіць, задумацца і верыць.
Душу з другімі душамі зьліваць.
Хай не адчыняць мне ў прыгожым доме дзьверы,
Дармо! І ў полі можна начаваць [8, с. 66].

Славуты празаік і крытык Максім Гарэцкі пісаў: *«Найбольш асабістае лірыкі ў Маракова... Маракоў вызначаецца лірычнасьцю, эмацыянальнай напружанасьцю, гучальнасьцю сваіх вершаў. У яго шмат пачуцьця, ён любіць яскравыя фарбы і гучаньне...»* У сваю чаргу крытык-пачатковец Антон Адамовіч

у рэцэнзіі «А дзе ж грамадзкасьць?» («Чырвоны сейбіт», 1926, № 4) адгукаўся аб творчасьці Маракова наступным чынам: *«Так званае ўпадніцтва, або дэкаданс, пачынае, нажаль, расьцьвітаць у нашай новай паэзіі. Ёсьць гэта і ў „Пялёстках“. Трывожныя ноткі пачынаюць гучэць у В. Маракова („і ня чую сьвісту, вострага, як нож, што другіх бяз жалю ўжо скасіў даўно“), далей настрой усё панураецца і зборнік канчаецца вершам, пасьля каторага, разважаючы лягічна і прымаючы пад увагу шчырасьць, на якую Маракоў напірае ў шмат якіх месцах зборнічку, яму застаецца... самагубства. <...> На змаганьне ў яго дужа прымітыўны погляд: ён хоча, каб „змагацца было сьвятлей і ярчэй“, а штодзённае змаганьне, змаганьне ў поце твару ня прымае. Ня любіць Маракоў гораду і імкнецца да вёскі... <...> Аўтар, як відаць, адарваны ад жыцьця»* [1, с. 19–21].

Што ж гэта за фінальны верш зборніку «Пялёсткі», які выклікаў такое непрыманьне ў Антона Адамовіча?

І так, усё... ўсё праляцела,
Чым сэрца некалі жыло;
І над далінай гэтай белай
Іду, як мёртвы, за сяло!..

Даволі сэрца маладое
Душылі вы ў маіх грудзёх.
Прайшло ў жыцьці ўсё залатое,
Прайшло і зьнікла у трысьцё.

І я пайшоў, дзе ветры ў нівах
Журбу асеньнюю мятуць,
Каб пад напевам палахлівым
Забыць усё і адпачнуць!

А мо, дзе сьцелюцца туманы,
З асінай бруднай падружсыць,
Каб не пачуць перад сьвітаньнем,
Аб чым пяюць штодня крыжы...

І так, усё... ўсё праляцела,
Чым я тут жыў і чым гарэў.
Хлапцы, бывайце!.. Вы сагрэлі
Вячэрнім сьпевам сініх дрэў [8, с. 63].

Падобныя вершы, прасякнутыя настальгічна-мінорным настроем, матывамі смутку і тугі, сымболікай паміраньня і нябыту, тады, у другой палове 1920-х, лёгка маглі наклікаць на аўтара абвінавачаньні ва «ўпадніцтве», «ясеніншчыне», «адрыве ад грамадзкага жыцьця». Аднак Тодар Глыбоцкі (яшчэ адзін псэўданім Алеся Дудара) у 1927 г. у артыкуле «На ідэалягічным фронце» з цыклю «Пра літаратурныя справы» паспрабаваў заступіцца за маладзейшага калегу: «...Маракова гэткі разбойны напад на першых жа кроках яго творчасьці аглушыў і яшчэ далей загнаў у тыя ж нетры, зь якіх яго думалі выгнаць сваімі крыкамі „крытыкі“» [3, с. 92]. Меліся на ўвазе, відавочна, Антон Адамовіч, а таксама аўтар іншай непрыхільнай рэцэнзіі Юрка Лявонны, які (магчыма, з творчай зайздрасьці) напісаў, нібыта ад кнігі «Пялёсткі» патыхае «поўным бясьсільлем», а з боку формы яе ўзровень «невысокі» [7, с. 3].

Белпэдтэхнікум, кантакты і вандроўкі

У 1927 г. Валерыя Маракова накіравалі на вучобу ў менскі Белпэдтэхнікум, але пасьля двух курсаў адклікалі і прызначылі загадчыкам літаратурнага аддзелу газэты «Савецкая Беларусь», дзе ён зь невялікім перапынкам працаваў да канца 1930 г. У ліпені 1929 г., скарыстаўшыся нагодай выехаць на Асінбуд для азнаямленьня з «сацыялістычным будаўніцтвам», Валеры Маракоў таемна завітаў і ў Смаленск, каб су-

стрэцца з сасланым за «контрарэвалюцыйны» верш Алесем Дударом. Той пазьней пісаў: «У пачатку ліпеня 1929 году... да мяне раптоўна прыехаў Валеры Маракоў, былы маладняковец, які быў сакратаром часопісі „Маладняк“, калі я яе рэдагаваў. У літаратурных адносінах Маракоў зьяўляецца маім выхаванцам: я калісьці правіў яго першы зборнік... Да маёй жа палітычнай дзейнасьці ён ня меў ніякага дачыненьня і ня мог мець, бо я лічыў яго занадта маладым і бесталковым для таго, каб уводзіць яго ў круг сваіх поглядаў і справаў» [4, с. 430].

Увосень 1930 г. выйшаў зборнік «Вяршыні жаданьняў». Нягледзячы на спробы аўтара і выдавецкага рэдактара падагнаць зьмест пад тагачасныя ідэалягічныя патрабаваньні (уставіць паэтычную публіцыстыку сацыяльна-клясавай скіраванасьці, падправіць асобныя радкі і назвы ранейшых вершаў), у кнізе ўсё адно захоўвалася ўласьцівае В. Маракову рамантычнае сьветаадчуваньне, гучалі суб'ектыўна-лірычныя спавядальныя інтанацыі. І нават сама назва зборніка запазычаная зусім ня з твору пра сацыялістычнае будаўніцтва, а акурат з узору інтымнай лірыкі — верша «Ах, сьпявай, дарагая, сьпявай...»:

Мы імкнемся туды,
Дзе вясной
Расьцьвітаюць вяршыні жаданьняў,
Дзе забыты з табой мы даўно
Непагодамі бур
І туманаў.



Валеры Маракоў, Натальля Вішнеўская, Васіль Залуцкі, Мікола Нікановіч, Васіль Каваль, сядзяць — Максім Лужанін і Алесь Звонак, Дом пісьменьніка, лістапад 1929 г.

Алесь Дудар (зьлева), Валеры Маракоў (у цэнтры), Мікола Ніканавіч



Твая песьня цьвіце,
Як вясна,
І твой голас п'яней за Купальле.
Дык сьпявай жа,
Сьпявай давідна
Ты пра шчасьце,
Прыносяць што хвалі [8, с. 186–187].

І менавіта ў гэтым зборніку выйшаў верш «Адышоўшым» (пакладзены на музыку гуртам «Naka» для праекту «(Не)расстраляныя») — адначасова рэквіем і тастамэнт, які ўражвае трагізмам паэтавага адчуваньня гістарычнай пэрспэктывы, трывожнымі прадбачаньнямі: *«А можа быць, так жа праз слоту нядолі / Мы пойдзем, памром і ня вернемся зноў. / Хтось будзе на нашых магілах вясной / Сьпяваць з захапленьнем пра шчасьце і волю!»* [8, с. 189].

Кніга дала адным крытыкам падставы казаць пра сугучнасьць вершаў В. Маракова «клясавым пачуцьцям пралетарыяту» (М. Лужанін), імкненьне паэта «адмежавацца ад таго „балота", якое ён славіць пачынаў» (Э. Галубок), іншыя ж былі па-ранейшаму незадаволеныя і бачылі «псыхічны разлад паэта з рэчаіснасьцю», «налёт пэсымізму, апаэтызаваньне суму» (У. Сядура).

У 1931–1934 гадах Маракоў вучыўся ў Менскім вышэйшым пэдагагічным інстытуце, адначасова працуючы ў часопісе «Чырвоная Беларусь» ды іншых выданьнях. Маракоў быў таксама старшынём літаратурнага гуртка ў МВПІ і рэдактарам студэнцкага часопісу «Крыніца»[1]. Малады крытык Алесь (Айзік) Кучар у сваім тэксьце «Літаратурны партрэт Валерыя Маракова» апісваў паэта так:

> *«Часамі ён прыбягае на заняткі ў аўдыторыю страшэнна знэрваваны, хутка кідае на стол кніжкі і крычыць:*
>
> *— Аловак, дайце хутчэй аловак! — хапае ў каго-небудзь з стала агрызак алоўка і хутка піша. Рука яго дрыжыць. Ён усё паскарае і паскарае пісаньне. <...> Увесь архіў ён хавае ў кішэнях. Вершы ў большасьці замусоленыя, абарваныя. Кожны дзень ён частку іх губляе, але ўсе свае вершы памятае на памяць і, здаецца, ніколі іх не забудзе. <...> Ён прапускае большасьць лекцый. На тых жа, што прысутнічае, — піша... <...> Амаль увесь год ён не здае залікаў. Толькі ў канцы году пачынае здаваць. Тады кідае „вершапісаньне" і бярэцца*

[1] Да нас дайшоў толькі адзін нумар часопісу (1929, № 4), экзэмпляр якога захаваўся ў асабістым архіве ўжо згаданага Антона Адамовіча і быў факсымільна рэпублікаваны ў часопісе «Запісы БІНіМ» (2004, № 27).

Валеры Маракоў разам з Рыгорам Мурашкам, 1931 г.



за вучобу... <...> Тое, што іншыя студэнты здаюць у працягу году, Валеры здае за некалькі тыдняў. <...> Адносна сучаснага літаратурнага жыцьця і пралетарскае літаратуры яго абурае тое, што некаторыя людзі ўзводзяць у фэтыш машыну. Другія ж нават думаюць пісаць вершы машынам... „Я ж, — кажа Валеры, — буду пісаць свае вершы не для машын, а для людзей, што кіруюць гэтымі машынамі“» [6, с. 79, 88–89].

ТАВІЗ

Празаік Юрка Віцьбіч на эміграцыі ў 1951 г. пісаў Антону Адамовічу, што ў міжваенным Менску існавала нефармальная суполка літаратараў пад абрэвіятурай ТАВІЗ («Таварыства аматараў выпіць і закусіць»), куды ўваходзілі Тодар Кляшторны, Уладзімер Хадыка, Васіль Каваль, Алесь Дудар, Міхась Багун, Валеры Маракоў, Эдуард Самуйлёнак, Сяргей Дарожны ды іншыя. «Зьбіраліся звычайна або ў каго-небудзь на кватэры (пераважна ў Багуна), або ў 2-й гасьцініцы, калі я прыязджаў зь Віцебску, або ў шашлычнай на вул. Камсамольскай, або ў маленькай піўнушцы — уніз па вул. Савецкай, або (у крайнім выпадку) у сутарэньні Дому пісьменьніка, дзе меўся пэўны час рэстаран» [2, с. 141]. І далей: «У мяне тут ёсьць фатакартка Валерыя Маракова, дзе ён сядзіць у шашлычнай за кухлем піва і перагортвае свае добрыя вершы» [2, с. 146].

Неафіцыйны, багемны «статус» суполкі дазваляў яе ўдзельнікам зьбірацца вузкім колам ды пачувацца самімі сабой і вольнымі ад цэнзуры: на сходках ТАВІЗу чыталі творы не для друку. Адзін зь не апублікаваных пры жыцьці гумарыстычных вершаў Валерыя Маракова з гэтага пэрыяду захаваўся ў асабістым архіве адыёзнага крытыка Лукаша Бэндэ. Але спачатку зьвернемся да перадгісторыі, якую расказаў ва ўспамінах паэт Сяргей Грахоўскі: *«У дні выплаты стыпэндыі часам каля касы Маракова чакалі Кляшторны або Багун, спадзеючыся пазычыць нейкую дробязь. Выдавецтва ганарары па 30 капеек за радок цыркала нерэгулярна. На калідоры каля кабінэта намесьніка дырэктара Івана Адамавіча Бучукаса на дзіравай цыратавай канапе часта чакалі фінансавай ласкі паэты і празаікі. Аднойчы тут жа Маракоў склаў „сьлязьніцу“: „Бучукас, Бучукас, пашкадуй ты нас, дай адзін рубляс на куфляс півас“. Яна стала папулярнаю сярод пісьменьнікаў, дайшла і да Бучукаса. Ён звычайна, падпісваючы паперку ў бухгальтэрыю, казаў: „Вось табе на куфляс півас“»* [8, с. 408–409]. А вось і поўны тэкст верша-эпіграмы, у якой мы сустракаем знаёмыя прозьвішчы вядомых літаратараў:

НОВЫ ОЙЧА НАШ

Дзядзька Бучукас,
Пашкадуй ты нас,
У гэты страшны час
Пашкадуй хоць раз, —
Дай хоць паўрубляс
На адзін куфляс.

Сядзеў і гікаў
Ўладзімер Хадыка;
Скардзіўся крэпка
Пятрусь Глебка.

Стукаў кулаком
Валеры Маракоў.
Каб мог, вас зьмяў бы
Юлька Таўбін.

Хаваўся за зброю
Мікола Хведаровіч.
Бразгаў нажамі
Максім Лужанін.

А іншы народ
Стаяў каля варот,
Скрыгаў зубамі на нас,
Дзядзька Бучукас.

3/X – 1933 г. [5, с. 122]

Дзяўчаты

Паводле паказаньняў В. Маракова на першым сьледзтве ў 1935 г., празаік Мікола Нікановіч жартам называў яго Распуціным за тое, што ён нібыта «много возился с девчонками». Пра павышаны эратызм некаторых твораў В. Маракова пісаў дасьледнік яго творчасьці Алесь Бельскі: «...У вершах тыпу „Зь белых начэй“ выяўляюцца, як і ў „кабацкай“ паэзіі С. Ясеніна, нястрымныя маладыя жаданьні, памкненьні, імпэтны „разгул“ душы. І ўсё ж паэзія каханьня В. Маракова — „пачуцьцяў дзіўны сад“, вясновая краіна салодкіх летуценьняў» [8, с. 454]. Тут маецца на ўвазе найперш выразны настраёвы пачатак у лірыцы В. Маракова, яго здольнасьць перадаць шматфарбавыя чалавечыя пачуцьці.

«Я абняў, каб пакахаць і верыць! / Вусны так палілі, як агонь! / Чуў я стук сваёй крыві і сэрца, / Ды спыніць ня ў сілах быў яго» [8, с. 52], — прызнаваўся лірычны герой каханай у вершы «Помніш ты, быў ціхі-ціхі вечар...» (1926). Яскравыя ўзоры лірыкі каханьня В. Маракова — таксама вершы «Дзяўчыне», «Нашто глядзіш мне так у вочы...», «Я прыйду», «Адказ», «Я не кахаў», «Добры дзень, дарагая...», «Ты гаворыш, што сэрца прыстала...» ды інш.

Паэт Павел Прудзнікаў прыгадваў: «Ня толькі вершы, але і сама постаць гэтага паэта прыцягвала да сябе юных чытачоў-слухачоў, а калі дакладней — чытачак. Апошнія хадзілі за ім чародкамі. Мне неаднойчы даводзілася быць зь ім на такіх сустрэчах і на свае вочы бачыць такія сцэны. Кожнай чытачцы-слухачцы хацелася як можна бліжэй пазнаёміцца з такім эмацыянальным і прыгожым паэтам» [8, с. 420–421].

Крытык Алесь Кучар спрабаваў зьвесьці і ажаніць Маракова з буфэтчыцай Дому пісьменьніка Фаінай Пушкарэвіч. Але паэт не паддаўся. Жаніцца ён не сьпяшаўся. Калі сябры жартам нагадвалі яму пра гэта,

ён адказваў, што пад вянец яму яшчэ рана, трэба трошкі пачакаць: *«Што вы, хлопцы?! Хочаце зьвязаць мяне па руках і нагах? Хочаце, каб я з паэта ператварыўся ў няньку? Не, сябры, на гэтую вуду вы мяне ня возьмеце. Мне яшчэ трэба шмат чаго напісаць»* [8, с. 422]. Відаць, для Валерыя Маракова творчасьць была куды важнейшай за сямейны дабрабыт.

А Фаіна Пушкарэвіч, зноў жа не без удзелу А. Кучара, выйшла замуж за іншага вядомага паэта — Уладзімера Хадыку.

Права на зброю

Увосень 1933 г. з другой спробы, пасьля правак цэнзуры, выйшаў з друку зборнік «Права на зброю».

Як дадзена новым
нам права на зброю
шчырага слова
і звонкіх цягліц,
права на слаўную назву
герояў —
ўзьнімем яго ж —
хай жыве і грыміць! [8, с. 237] —

пісаў Валеры Маракоў у вершы «Ліст да паэты Петруся Броўкі».



Валеры Маракоў у «Шашлычнай» на вуліцы Камсамольскай. Менск, 1930-я

Валеры Маракоў. Шарж мастака Цфаніі Кіпніса. 1932 г.



Паэтычнае слова ў гэтым зборніку сапраўды «грыміць». Сюды ўвайшлі творы таго пэрыяду, калі пісьменнік, кажучы словамі Вячаслава Рагойшы, «насуперак сваёй творчай натуры крок за крокам адступаў ад лірыкі спавядальнай у бок вузка сацыяльнай і вершаванага эпасу» [8, с. 26]. Вершы публіцыстычныя, рэпартажна-нарысавыя, пра што сьведчаць самі назвы: «Дарогаю да чырвонай сталіцы», «За тысячы новых тваіх Асінбудаў», «Рахунак паэта, пададзены да аплаты», «Першы дзень на запалкавай фабрыцы», «Ілжэўдарнік Абрамаў з фабрыкі „Дзьвіна“» і г. д. Радкі графічна разьбітыя «лесьвічкай Маякоўскага»[2] і нярэдка напоўненыя рытарычнай лёзунгавасьцю кшталту:


Наш спорт не гульня,
і наш спорт не забава,
за пабітыя зубы
ня клічам мы тройчы на біс.
На пабітых зубох
не будуем мы славы, —
наша слава —
Сацыялізм!

(«Адна партыя ў валейбол») [8, с. 294].


[2] У найбольш грунтоўным выданьні твораў В. Маракова «Рабінавая ноч» (2003) праз тэхнічны збой «лесьвічка» не захаваная. Вершаваныя радкі ў цытатах графічна разьбітыя паводле арыгінальнага выданьня: Маракоў В. Права на зброю. Мн.: ДВБ ЛіМ, 1933. *(Заўв. укладальніка.)*

Некаторыя творы вызначаюцца непадробленай эмацыйнай напружанасьцю і сапраўдным драматызмам. Верш «Рахунак паэта, пададзены да аплаты» (1932) напісаны паводле рэальнай жыцьцёвай гісторыі, пераказанай у эпіграфе: *«Камсамолка Каця Крычэня скончыла жыцьцё самагубствам, уключыўшы сябе ў лінію электрычнага току... Прычына самагубства — няправільнае зьняцьце з работы і прыпісваньне ёй шкодніцтва, якое ўтварыў рабочы; з гэтым рабочым Крычэня жыла некаторы час»* [8, с. 217]. Валеры Маракоў абрынае гнеў на чэрствых і абмежаваных бюракратаў, якія «расьцяць у грудзёх канцылярыі» і «ў партфэлях пачуцьці носяць», і адстойвае (хоць, зноў жа, не без уплыву У. Маякоўскага) каштоўнасьць кожнай чалавечай асобы зь яе правам на жыцьцё:

Чалавек —
гэта вам ня мумія, —
ўзяў са склепу
і выштурхнуў вон,



Вокладка кнігі Валерыя Маракова «Вяршыні жаданьняў». Менск: Белдзяржвыдавецтва, 1930 г.



Асобнік кнігі «Вяршыні жаданьняў», якую аўтар падпісаў для крытыка Лукаша Бэндэ

чалавек —
гэта сад
з залатымі думамі,
дзе па жсылах праходзіць
блакітны агонь [8, с. 218].

На агульным фоне публіцыстычнага патасу вылучаецца цыкль вершаў «...І вуснамі кранаўся кветак...», у якім выразна дамінуе лірычны пачатак, а замест грымотных лёзунгаў — асабістыя прызнаньні, адно зь якіх выглядае амаль як разьвітаньне ў трывожным прадчуваньні трагічнай разьвязкі:

Бывай, вясна мая,
бывай.
Агнём любві тваёй
сагрэты,
не адцьвіту я
пустацьветам,
перада мною ж
не дрыгва,
мае сябры,
мае паэты [8, с. 243].

А 12 студзеня 1934 г. у «ЛіМе» зьявілася рэцэнзія тагачаснага старшыні аргкамітэту Саюзу пісьменьнікаў БССР Міхася Клімковіча «Пра кніжку В. Маракова „Права на зброю“»: «Некаторая частка вершаў носіць яскрава выражаны варожы характар нашай сапраўднасьці... Асноўныя памылкі...: прапаганда буржуазнай тэорыі надклясавасьці мастацтва... Сьцьверджаньне „права“ паэта стаяць убаку ад практыкі сацыялістычнага будаўніцтва... Няправільнае, скажонае адлюстраваньне нашай рэчаіснасьці, няправільныя рэцэпты выпраўленьня недахопаў... Пасіўная роля наглядальніка прыводзіць паэта да хворага пэсымізму...» [9, с. 100–101].

У 1934 годзе адбыўся першы выпуск літаратурна-творчага аддзяленьня МВПІ — прафэсійных літаратараў. Маракоў адразу ж зрабіўся яшчэ і сябрам Саюзу пісьменьнікаў СССР. У пачатку 1935 г. паэт паехаў у творчую выправу на лесараспрацоўкі ў мястэчка Чэрнеўка Барысаўскага раёну. Там ён працаваў да 1 сакавіка 1935 г., а потым вярнуўся ў Менск, дзе пачаў пісаць п'есу і раман «Вечная крыніца». Але апублікаваць іх яму ўжо не было наканавана...

Першы арышт

21 сакавіка 1935 г. В. Маракова арыштавалі першы раз. Падставай былі названыя паказаньні М. Нікановіча, арыштаванага ў справе г. зв. «Беларускага нацыянальнага цэнтру» ў 1933 г. Падчас арышту Маракоў працаваў загадчыкам літаддзелу газэты «Літаратура і мастацтва». Паводле анкеты арыштаванага, меў хваробу сэрца. Тады ж быў арыштаваны і бацька паэта. У 1933–1935 гадах Дзьмітры Маракоў быў адным з арганізатараў рэлігійнай антысавецкай суполкі ў Козыраве. У гэтую арганізацыю трапіў правакатар. Усе яе ўдзельнікі былі арыштаваныя і прызнаныя вінаватымі ў тым, што «ў Козыраўскай царкве пачалі групавацца рэлігійныя, кулацкія і іншыя антысавецкія элемэнты, якія паставілі сабе за мэту, пад прыкрыцьцём царквы і выкананьня рэлігійных абрадаў, настройваць у антысавецкім духу насельніцтва гораду і бліжэйшых раёнаў... Толькі пасьля арышту гэтай контрарэвалюцыйнай групы сьвятароў прыпынілася распаўсюджваньне правакацыйных чутак і пачаўся масавы прыліў людзей у калгасы» [10, с. 87]. Дзьмітры Маракоў быў асуджаны на 5 гадоў канцлягераў. У 1940 г. вызвалены, але ў сувязі з забаронай уезду ў Беларусь дадому вярнуўся толькі ў 1945 г. Ён ані разу не атрымаў пэнсіі, бо ня меў дакумэнтаў: іх згубіў НКВД. Памёр у 1968 годзе.

У траўні 1935 г. НКВД запатрабаваў ад Саюзу пісьменьнікаў БССР характарыстыку на Валерыя Маракова, якую старшыня саюзу М. Клімковіч даручыў даць А. Кучару: «Моряков является наиболее ярким представителем богемско-упаднического отряда буржуазного национализма в белорусской литера-

туре. <...> Советская действительность ему чужда, враждебна. <...> ...Всюду пьяный разухабистый и безнадежный пессимизм... <...> Чего же тоскует и мечется Моряков? Видите ли, он недоволен существующим положением дел в Советской Белоруссии (он хотел бы ее видеть буржуазно-националистической республикой), недоволен классовой борьбой, которую ведет пролетариат против белорусской буржуазии. <...> В сборнике „Пялёсткі" он слово „айчына" пишет всюду с большой буквы, как и подобает националисту» [9, с. 116–117].

Новы арышт

Падчас следства НКВД цікавіўся кантактамі В. Маракова з раней асуджанымі літаратарамі-нацдэмамі. Тым ня менш 7 ліпеня 1935 г. справу Маракова спынілі. Але 3 лістапада быў выпісаны новы ордэр на арышт № 703: «Начальник 3-го отдела НКВД БССР Шлифенсон нашел, что лит. работники Моряков В. Д., Зарецкий М. Е., Вольный-Ажгирей А. У., Барановых С. Я. являются акт. участниками контрнацдем. организации, а посему постановил: арестовать этих литературных работников...» Маракоў выкладаў у той час у школе ў Бабруйску, энкавэдысты чакалі яго адначасова і там, і ў Менску ў бацькоўскай хаце, праводзілі пратрус, вывозілі кнігі й іншыя рэчы. 6 лістапада 1936 году проста на менскім чыгуначным вакзале паэта арыштавалі паўторна. Арышт правёў опэрупаўнаважаны Авербух згодна з ордэрам № 700, выдадзеным 3 лістапада 1936 г. і сапраўдным адны суткі. Паводле словаў Тодара Кляшторнага, сказаных у верасьні 1936 г. у Доме пісьменьніка М. Багуну і П. Хатулёву, «Маракоў, калі ад'яжджаў зь Менску на раён, узяў з сабой наган і казаў, што будзе са зброяй у руках бараніць сябе...» [9, с. 125].



Турэмны здымак, 1936 г.

Сьледзтва

У НКВД вызначылі, што Маракоў «является членом к/р нацдемовской организации, ставившей своей задачей активную борьбу с Советской властью за создание Белорусской Народной Республики» [9, с. 124]. Разам з В. Мараковым у справе праходзілі: С. Левін, С. Мурзо, Ю. Лявонны, П. Хатулёў, С. Шушкевіч, В. Каваль, С. Кучынскі, М. Багун, М. Чарот, А. Звонак, З. Бірала, З. Півавараў, П. Шастакоў, Т. Кляшторны, А. Дудар. Паэт быў арыштаваны ў адзін дзень з М. Зарэцкім, С. Баранавых і А. Вольным. Пасьля году допытаў і катаваньняў 28 кастрычніка 1937 г. у 19.15 адбылося паседжаньне выязной сэсіі вайсковай калегіі Вярхоўнага суду СССР. На папярэднім сьледзтве Маракоў прызнаў сябе вінаватым ва ўдзеле ў контрарэвалюцыйнай арганізацыі, але цяпер адмовіўся ад ранейшых паказаньняў. Тым ня менш яму вынесьлі найвышэйшую меру пакараньня — расстрэл з канфіскацыяй маёмасьці. Сваякам пазьней паведамілі, што ён памёр у зьняволеньні ў студзені 1940 году.

Памяць

Рэабілітавалі Валерыя Маракова праз дваццаць гадоў пасьля арышту, у 1956 г. Праз тры гады выйшаў зборнік «Лірыка», а ў 1989 г. — «Вяршыні жаданьняў». Але сапраўднае ягонае вяртаньне да шырокай аўдыторыі адбылося, калі ў 1999 г. выйшла кніга «Валеры Маракоў. Лёс. Хроніка. Кантэкст», а ў 2003 — амаль поўны збор твораў В. Маракова «Рабінавая ноч». Аўтарам і ўкладальнікам гэтых кніг быў пляменьнік паэта — Леанід Уладзімеравіч Маракоў. Зацікавіўшыся гісторыяй сваёй сям'і ды дасьледаваньнем тэмы рэпрэсіяў у даволі сталым узросьце, ён тым ня менш пасьпеў падрыхтаваць і выдаць дзясяткі тамоў са зьвесткамі пра рэпрэсаваных грамадзкіх ды культурных дзеячоў Беларусі. Памёр Леанід Маракоў 17 сьнежня 2016 году.

Літаратура

1. *Адамовіч А.* Да гісторыі беларускае літаратуры. — Мн.: Зьміцер Колас, 2005.

2. *Віцьбіч Ю.* Лшоно Габоо Бійрушалайм: Даваенная проза. — Мн.: Кнігазбор, 2011.

3. *Глыбоцкі Т.* Пра нашы літаратурныя справы: Крытычныя нарысы. — Мн.: БДВ, 1928.

4. *Дудар А.* Выбраныя творы. — Мн.: Лімарыус, 2017.

5. *Жыбуль В.* ТАВІЗ: па слядах легендарнага літаб'яднання // Полымя. 2017. № 12.

6. *Кучар А.* Літаратурныя портрэты: 1. Валеры Маракоў // Маладняк. 1929. № 7.

7. *Лявонны Ю.* Валеры Маракоў. «Пялёсткі» // Савецкая Беларусь. 1926. 25 сьнеж.

8. *Маракоў В.* Рабінавая ноч: Вершы, паэмы, проза, публіцыстыка, пераклады. — Мн., 2003.

9. *Маракоў Л.* Валеры Маракоў. Лёс. Хроніка. Кантэкст. — Мн.: Бел. кнігазбор, 1999.

10. *Маракоў Л.* Толькі адна ноч. — Мн.: Зміцер Колас, 2006.

11. Пратаколы агульных сходаў і пасяджэнняў бюро, план работы, спісак членаў, анкеты, перапіска з Цэнтральным бюро і інш. дакументы Полацкага філіяла // БДАМЛМ. Ф. 225, воп. 1, адз. зах. 13.

ЗЬ ВЁСКІ

Эх, прастор сінякудрых палёў, —
Срэбралітая рэчка ў даліне,
А над рэчкай фальварак разьлёг
І купаецца сонца у сіні.

А над рэчкай бярозавы сьмех
Віхрамётнай праносіцца хваляй:
То ускочыць на золата стрэх,
То ў калосьсях шнуроў закрышталіць.

Я схіліўся над белым пяньком,
Песьні слухаў і думаў пра горад.
Там, дзе вуліц шырокі пракос
Прада мною ляжаў, шумны, горды;

Там, дзе гулкі машынны удар
Мяне клікаў на новыя хвалі —
Я на хвалях тых сонца аддаў
За напевы віхрастыя сталі.

Ну, дык што ж! Ў буйным сэрцы ізноў
Устае безупынна жаданьне —
Каб пачуць зноў акорды станкоў
І згубіцца ў сталёвым тумане...

А над рэчкай бярозавы сьмех
Віхрамётнай праносіцца хваляй:
То ускочыць на золата стрэх,
То ў калосьсях шнуроў закрышталіць.

1925

* * *

Сьціскаецца сэрца не таму, што восень
І землю высьцілае залацісты ліст,
Ня згіне ад марозаў жытні росьсеў,
Што разаслаўся аксамітам па зямлі!

Дыван хай насьцілае залацісты ліст, —
Зіма пакрые белым пакрывалам:
Ня восень цісьне, не з-за восені душа баліць,
Душа, што многае стрывала!

Зіма пакрые белым пакрывалам
Палі, прастор адзене ў сьнежна-ватны пух.
І толькі для яе марозаў моцы мала,
Каб у грудзях стрымаць імпэту дух.

Палі, прастор адзене ў сьнежна-вольны пух,
А захад будзе галасіць, як і галосіць,
І будзе на нагах змардованых зьвінець ланцуг,
Пакуль народ пакуту зносіць!

А захад будзе галасіць, як і галосіць,
Дубы і тыя будуць шапацець лісьцём інакш.
Калі ж, калі вось гэту восень
Заменіць маладая санцарусая вясна?!

1925

*** * ***

Над сінім лесам, шэрым полем
Задорны сьмех ліе вясна.
Такой парой па-над раздольлем
Душу я выпяю да дна.

Такой парой ў жыцьцёвым моры
Б'е радасьць сьвежых галасоў.
Я выйду ў поле, на прасторы,
Абліты сонцам і расой.

Хай ў нівах льлюцца яшчэ сьлёзы
Адцьвіўшай ў холадзе зімы,
Ўжо кучаравяцца бярозы.
Няма ні холаду, ні цьмы.

І над узгоркам, над далінай
Вясна-красуня зацьвіла.
Я прыгарну, нібы дзяўчыну,
Ўсю гэту шыр, ўсю гэту даль.

Я, сын вясны пад яркім сьветам,
Люблю жыцьця прастор і шыр,
Затым, што сонца б'е паэту
Паклоны новых слоў душы;

Затым, што ў даль над шэрым полем
Задорны сьмех ліе вясна...
Такой парой па-над раздольлем
Душу я выпяю да дна!

1926

* * *

Эх ты, поле! Шырокае поле
Звоніць песьняй вясновых надзей.
Маё сэрца пад ветры прывольля
Парываецца з палкіх грудзей.

Зноў лясы, сенажаці, дубровы!
Так, здаецца, пусьціўся б у скок.
Тут калісьці пад сонцам вясновым
Расквітала жыцьцё васільком.

Тут калісьці дзяўчаты і нівы
Мае грудзі паілі агнём...
І ня знаў я, што ў травах тужлівых
Ёсьць і хмель, і разгул, і віно!

А цяпер ўсё так проста, ўсё ясна,
Толькі сілы ранейшай няма.
І дзяўчаты з гадамі пагасьлі,
Як пад восень жыцьцёвы размах.

І цяпер так хачу я да болю
Хоць зямлю каля рэчкі абняць.
Гэй ты, поле, шырокае поле...
Сыпле кветкі на грудзі вясна.

1926

* * *

Тут так хораша, сьвету так многа...
Срэбны месяц прылёг на кусты.
Я іду сваёй роднай дарогай,
Зноў вясёлы і зноў малады.

Даль маўчыць і цяпер не падкажа,
Што рабіць і куды мне ісьці.
Толькі знаю, што шлях мой праляжа
Там, за вёскай ў жытах і ў трысьці.

Сёньня ўсё — гэты хвойнік і Сьвіслач —
Да сябе заклікаюць пажыць.
Колькі ўпартых бяроз панавісла
Над вадой і на грудзі мяжы.

Гэта межы спыталі у сэрца:
— Ці ж ня ты хочаш піць гэту ціш? —
Ўсё маўчыць, не дыхне, як пры сьмерці,
Ну а ты?.. Ты таксама маўчыш!

Ну і што ж, калі сьвету так многа,
Срэбны месяц каханьнем гарыць.
К чорту песьні, разгул і трывогі,
Хоць хвіліну адну так пажыць!

1926

*** * ***

Пеў пякучыя песьні свае салавей,
Кучаравая ліпа драмала;
На прасторы палёў і жытнёвых завей,
Там, дзе песьня да шчасьця і волі заве,
Маладая дзяўчына сьпявала.

Слухаў я, і ў грудзях векапомнай струной
Пела сэрца пра сьветлую волю.
І хацелася шчасьця й каханьня ізноў,
Каб у гэтым прасторы сівых ячмянёў
Патануць ў цішыні з галавою.

Хай тады яна прыйдзе і скажа: «Кахай
Маладую дзяўчыну прывольля.
Будзе песьні нам пець зачараваны гай,
Будзе слухаць іх месяц і радасны край,
А мы будзем кахацца на полі...»

І рукой белай, белай, як лебедзь, рукой
Абдымаць мяне ў шчырасьці будзе.
Хай тады белы месяц над сіняй ракой
Упадзе на ваду залатым васільком, —
Ён запал нашых слоў не астудзіць!

Хай тады усю ноч, ўсё жыцьцё салавей
Свае песьні пяе пра каханьне.
На прасторы палёў і жытнёвых завей,
Там, дзе песьня да шчасьця і волі заве,
Ўсё жыцьцё — залатое світаньне!

1926

ЖАДАНЬНЕ

Адыходзь, трывога, й забірай з сабой
Плач і крыўду хлопца з чулаю душой.

Ты адна сягоньня мне свая між ніў,
Быццам я згараю ў песенным агні.

Быццам я далёка, ў вочы б'е туман,
І нічога сьветлага больш ў жыцьці няма.

Ах, мой край каханы, залаты мой край!
Не хачу так рана ў песьнях дагараць.

Я йшчэ жыў так мала і так мала пеў.
Ну дык дайце ж, братцы, мне пажыць цяпер.

Дайце на прывольлі сэрца зь сіньню зьліць,
Каб з другімі марыць і другіх любіць.

1927

* * *

Па радках прачытаюць дзеці,
Як жылі іх бацькі і дзяды.

Міхась Чарот

Там,
Дзесьці там, ў стапох жаданьняў,
Пад ветру сьвіст
І завываньне
Стаяла вольха на кургане
З прабітай сонцам галавой...

А навакол,
Як кінуць вокам,
Сінела поле,
Сьніўся гай,
І ўсім нязнаны,
Ўсім далёкі
Ён плыў і плыў за небакрай...

Крычалі качкі недзе ў лузе.
Ах, як даўно я тут ня быў.
Ці гэта
Дальні сон ілюзій,
Ці гэта, можа, толькі быль?

Мне ўсё адно...
Я толькі рады,
Што зноў пабачыў
Сінь нябёс,
Падгніўшы дом... А з домам разам
Забыты рой юнацкіх кроз.

Што любы край вясной вялікай,
Увесь, як май, як песьня,
Край,
Пад граньне тысячы
Музыкаў
Зламаў навек адзеньне крат.

Што дзесьці там,
Ў стапох жаданьняў,
Пад ветру сьвіст
І завываньне
Губляюць людзі па курганах
Адвечны боль і смутак раньні...
І што ня дальні сон
Ілюзій,
А долі новай сьніцца
Быль...
І што стаяў, што марыў ў лузе,
І гэты луг я не забыў...

1930

* * *

Пракрычалі пеўні ўночы,
Месяц зноў, як твар каханай...
Хто мне сёньня напрарочыў
Пра журбу і пра туманы?

Я пішу ў сваім пакоі...
Ноч, як сьнежная русалка...
Сьніцца мне зусім другое,
Што жадаю гэтак палка.

Сьніцца сон далінных кветак,
Родны край ў вянках змаганьня.
І, наіўны сам падлетак,
Спатыкаю ў полі раньне...

1930

* * *

Пазнаў і я, што ёсьць прырода
Ня толькі
Ў дагараньні зор,
Што ёсьць у мудрага народа
Ў грудзях і сонца
Сьвет,
І золь...

І я пазнаў трывожным сэрцам
Прыроды рух,
Яе любоў,
Яе закон няўхільнай сьмерці,
Яе жыцьцё, імкненьні, боль.

Пазнаў гіпотэзы,
Законы...
І мудрасьць тысячы вякоў
Нясу ў мазгох сваіх сягоньня
Для тых, хто сэрцам не памёр...

1930

АДЫШОЎШЫМ

На вашых магілах мы справім вясельле
І душы зальлем старадаўнім віном.
Успомнім, як дні нашы ў нетры ляцелі,
Каб больш не вярнуцца ніколі ізноў.

Мы ў майскія ночы паплачам над вамі,
Раскажам вам вашы пачуцьці і сны,
Як сэрца квітнее зарой і агнямі,
Як граюць жаданьні на струнах вясны.

А ў доўгія ночы зімовых ігрышчаў,
Пад дальнія скрыпкі начных палазоў
Раскажам, як вецер бязьлітасна сьвішча,
Цярушачы ў полі зьмярцьвелы свой боль...

Там хвойка упала з надломаным крыкам.
Там сьвежай крывёй пралілася зара.
На захад узьняў хтось марозныя пікі
І кліча у бойку узбураны край.

Мы вучымся жыць. Мы ствараем законы.
Мы марым аб дальняй нязнанай красе.
У бойку ідзём, паміраем з праклёнам,
І сьмерць нам вянкі на магілы нясе.

А можа быць, такжа праз слоту нядолі
Мы пойдзем, памром і ня вернемся зноў.
Хтось будзе на нашых магілах вясной
Сьпяваць з захапленьнем пра шчасьце і волю!

1930

ЗАЯЦ

Заяц упаў на сьнег,
Стрэл быў сухі і кароткі...
І, задуменнаму, мне
Сьніцца ў крыві бародка.

Круціцца дым ад крыві,
Сэрца кранулася
Й стала...
«Быццам і жыў і ня жыў»,
Глуха зямля запытала.

Выйшаў стралок да яго,
Узяў і закінуў
За плечы.
Веяла поле тугой...
У полі і вецер,
І вечар...

У сінюю скрынку душы
Раптам ударыла сьнегам,
Заяц для смажаньня
Жыў,
Толькі для шчасьця бегаў.

Зьнік той стралок,
Не відаць.
Што я стаю ў задуменьні?
Можа быць,
Зайца шкада,
Можа, сваіх летуценьняў...

1930

* * *

Я помню, — яблыні цьвілі,
І вецер заліваўся сьмехам
Ў расой апырсканай далі.
Пад месяцам гарэлі стрэхі
Халодным колерам сваім.
Палала ноч, і вёска спала,
Сьпявалі ціха паплавы,
А мне чагосьці не ставала.

Я абыходзіў сад вакол
І вуснамі кранаўся кветак,
Якія колісь рваў рукой
Другі, асьмеяны паэта.

Усё праходзіць чарадой,
І ўсім даецца сум і радасьць,
І ўсе спазналі горыч здрады,
Калі стыкаліся зь бядой.

Я ведаў ўсё. Ўсяму цану
Спазнаў за словамі чужымі,
І я нікога не кляну,
Не называю й дарагімі.

Шляхі вялі мяне ў туман,
А я імкнуўся да сузор'яў.
Таму мо й хцівасьці няма
Ў маіх нявыказаных творах.

Прайшлі жалезныя гады
І ўзварухнулі ў сэрцы нешта,
І я сягоньня, як заўжды,
Сябе выказваю дарэшты.


Інакшы сад цьвіце кругом,
І нашы песьні іншым складам
Вядуць да новых берагоў
Свае ударныя брыгады.

Які далёкі, грозны шлях,
А колькі ж вёснаў адпалала!
І мне чагось (ну проста жах!)
Ўсё не стае, як не ставала...

1931

Андрэй Хадановіч

на ледзяной гітары



Тодар Кляшторны



Я адзін... Мо за гэтым і горна,
Але што?! Хіба сьвет у акне?!
Не журыся, таварыш Кляшторны,
Не рыдай аб далёкай вясьне. Не рыдай!..

Беларускі паэт Тодар Кляшторны ніколі ня бегаў навыперадкі ні з Эўропай, ні з Амэрыкай, але адной-чы ледзь не апярэдзіў англа-амэрыканскіх мадэрністаў. Стварыўшы геніяльную паэму і намацаўшы ў ёй псыхалягічную зьяву, якая толькі пачынала рабіцца тэмаю сусьветнае літаратуры.

Пры канцы 1926 году ў Амэрыцы (а трохі пазьней, у 1927-м, у Лёндане) выйшаў знакаміты раман Эрнэста Гэмінгўэя «The Sun Also Rises (Fiesta)», што ў перакладзе Юркі Гаўрука гучыць як «І ўзыходзіць сонца (Фэст)». Раман, у якім ёсьць словы Гертруды Стайн: *«Усе вы — страчанае пакаленьне»*. Пісьменьніца, што называецца, падслухала, як гаспадар аўтамайстэрні лаяў свайго мэханіка і ўжыў гэтае словазлучэнне: *«Усе вы — génération perdue!»*. Гертруда Стайн пачула — і пераадрасавала словы Хэму: *«Гэта пра вас! І ўсе вы такія — моладзь, што пабывала на вайне»*. Словы зрабіліся крылатымі, увайшлі ў шырокі культурны ўжытак, пазначаючы цэлае пакаленьне маладых людзей, якія зусім яшчэ юнакамі перажылі Першую ўсясьветную вайну. Якія фізычна выжылі, але нешта ў іх «зламалася», якія не змаглі ўжо быць ранейшымі, так і ня здолеўшы адаптавацца да мірнага часу, выявіліся непатрэбнымі яму.

Хэм паставіў гэты выраз эпіграфам да раману, — а адначасова, у 1927 і ў 1928 гадах, у часопісе «Ўзвышша» часткамі друкавалася паэма Кляшторнага «Калі асядае муць». Паэма, што абсалютна паралельна з гэмінгўэеўскім «Фэстам» ставіць тыя ж праблемы і вырашае іх у тым самым ключы. Падабенствы аж кідаюцца ў вочы. У кожным з твораў ёсьць гераіня, фатальная жанчына, зьвязаная цэлым клубком няпростых адносінаў з адразу некалькімі закаханымі ў яе мужчынамі. (Гераіні маюць сваіх прататыпаў. З лэдзі Даф Твісдэн і яе каханкамі Гэмінгўэй езьдзіў у Гішпанію на карыду; што да гераіні Кляшторнага, то дачка паэта Тадзіяна ўспамінае так: *«Сваёй каханай Ніне напісаў верш... Калі Тодар паехаў вучыцца ў Менск, то яна не дачакалася яго і выйшла замуж за другога»*. Запомнім гэты сюжэт, а таксама імя дзяўчыны.) Што да мужчынаў, то адзін зь іх у абодвух творах — герой-апавядальнік, а іншыя — яго сябры і супернікі ў каханьні. Кожны зь іх шукае (і не знаходзіць) ратунку ў алькаголі, які толькі абвастрае непрыемныя пытаньні. Кожны бавіць час у размовах, спрэчках, дыскусіях, дзе нявыслаўленага болей, чым прамоўленага. Дзе шмат мужчынскай рэўнасьці, але яшчэ болей — разгубленасьці, адчуваньня, што ўсё ранейшае страціла сэнс і ўжо невядома, як жыць далей:



Тодар Кляшторны сярод сяброў літаратурнага аб'яднаньня «Ўзвышша». Зьлева направа: 1 шэраг — Я. Пушча, А. Бабарэка, У. Дубоўка, К. Чорны, З. Бядуля, К. Крапіва; 2 шэраг — М. Лужанін, С. Дарожны, А. Адамовіч, Т. Кляшторны, У. Жылка, В. Шашалевіч, П. Глебка. [1927–1928 гг.]

На пераломе нашых дзён
Ужыўся неяк студзень з маем...
Праз трупы ворагаў ідзём
І з трупаў вопратку здымаем.

У Кляшторнага няма культавых кавярняў на бульвары Монпарнас, няма загарэлых барадатых баскаў ды мужных матадораў на фэсьце ў Памплёне. Але ёсьць тры героі, кожны зь якіх вельмі па-свойму (і ўсе ў нечым аднолькава) перажывае трагедыю «страчанага пакаленьня». Адзін зь іх, Яська, абпалены грамадзянскай вайной, ужо ня можа забыць пра час, калі трэба было забіваць ці быць забітым: *«Перажыў я / Крывавую бойку, / І сябе, як відаць, перажыў...»* Другі, паэт Тодар, выказваецца пра вайну меней, але чытач можа ўзяць да ўвагі біяграфію і творчасьць самога Кляшторнага. «Сярод аршанскіх рабфакаўцаў, — згадваў С. Шушкевіч, — ён быў бадай самы высокі. На ім неяк сьмешна тапырыўся вынашаны салдацкі шынель з кароткімі рукавамі, а з-пад шапкі-будзёнаўкі зьвісаў цёмна-русы чуб. Вялікія вочы, здавалася, рэдка былі радасныя... З-за пазухі вытыркаўся ражок кнігі, зь якой чалавек рэдка разлучаўся... Гэты юнак многае ўжо бачыў, яго шынель патыхаў вятрамі баявых паходаў і нягод, дымам партызанскіх вогнішчаў. *«Пад воплескі асеньнія / вось там, у тыя дні / мяне па той аселіцы / расстрэліваць вялі. / Вялі п'яныя ворагі... / Вакол вароні баль... / Каму ж жыцьцё ня дорага? / Кляшторны, стаў на банк! / Бяжы!.. А лес рубінавы / табе падасьць руку / пад рогат гільяцінавы, / пад сьвісты дзікіх куль»*.

У трэцім пэрсанажы, Андрэю, на апісаную вышэй трагедыю накладаецца яшчэ адна: балючы адрыў ад роднай вёскі і не да канца пасьпяховыя спробы зрабіцца сваім у вялікім горадзе:

Быў спачатку дзіўны ён часамі,
Неяк дзіка ўсё успрынімаў,
Ў Цэнтрасьпірт хадзіў за селядцамі,
У кнігарні яблыкі пытаў.

Шмат здароўя ў горадзе патраціў...
І чаго, чаго зь ім не было!..
Круціць, круціць часам выключацель,
Каб паменшыць электрасьвятло.

Часта піў гарбату зь селядцамі,
Неяк дзіўна часам выглядаў...
Браў катлету голымі рукамі,
На відэльцах яблыкі трымаў.

Далей — болей, вырас непрыкметна,
Не пазнаеш, ён ці мо ня ён, —
Мае выгляд звышінтэлігентны,
І на ім ангельскі палітон.

На «ангельскім палітоне» дасьведчаны чытач спыніцца, маўляў, гэта «выкапаны Ясенін», — і будзе мець рацыю. Ясенінскіх уплываў беларускі паэт ніколі й не хаваў. Пачынаючы ад непасрэдных цытат у паэме «Калі асядае муць», проста на расейскай мове: *«Кто любил, уж тот любить не может, / Кто сгорел, того не подожжешь»* або: *«Ставил я на пиковую даму, / А сыграл бубнового туза»*. Для спакутаваных герояў Кляшторнага вершы Ясеніна ёсьць пэўным кодам, найкарацейшай дарогай узаемапаразуменьня, гатовай формулай, што ашчаджае час і словы, бо нашто паўтарацца, калі ўсё ўжо дакладна сфармулявана?

Яшчэ цікавейшымі выглядаюць паэтычныя паралелі, рытмічныя парафразы, далікатныя алюзіі на Ясеніна, прычым на працягу ўсёй творчасьці Кляшторнага: *«Мне не шкада, што сэрца пакалечыў — / Узьбіў душу на стынучую квець...»* — параўнайце: «Не жаль мне лет, растраченных напрасно, / Не жаль души сиреневую цветь». Яшчэ прыклад: *«Ўсё праходзіць, / Як дым у даліне...»* (Кляшторны) — і «Все

пройдет, как с белых яблонь дым...» (Ясенін). Або яшчэ: *«Гатоў скакаць вясёлым піянэрам / Пад залатыя гусьлі салаўёў»* (Кляшторны) — і «Знать, оттого так хочется и мне, / Задрав штаны, / Бежать за комсомолом» (Ясенін). А вось з разгляданай паэмы: *«Раскажы мне што-небудзь такое, / Раскажы аб мінулым жсыцьці»*, што адсылае наўпрост да: «Гитара милая, / Звени, звени! / Сыграй, цыганка, что-нибудь такое...» (вобраз цыганкі, увага, яшчэ адгукнецца ў паэме «Калі асядае муць»). Нарэшце, у вершы Кляшторнага «Зазімак» чытаем:

Тоўпы зор сьнегавым пералівам
Разматалі ў палёх павады.
Быццам коні з намыленай грывай —
У пацёмках застылі сады.

Параўнайце з «Чорным чалавекам» Ясеніна:

Ночь морозная...
Тих покой перекрестка.
Я один у окошка,
Ни гостя, ни друга не жду.
Вся равнина покрыта
Сыпучей и мягкой известкой,
И деревья, как всадники,
Съехались в нашем саду.



Тодар Кляшторны. 1925 г.

Паэты ніколі не сустракаліся. Самагубства расейскага творцы супадае па часе з паэтычным дэбютам беларускага аўтара. Першая публікацыя Кляшторнага адбылася ў 1925 годзе ў часопісе «Аршанскі маладняк». Некаторыя кажуць, што Кляшторны ня ведаў вучнёўства — і адразу выявіўся сталым паэтам. Ці так гэта? У першай публікацыі два вершы. Адзін на сьмерць тав. Фрунзэ — тут усё ясна, нічога прыкметнага. А вось другі зьвяртае на сябе ўвагу. «Блындае вецер» — вядома ж, у пэўным сэнсе вучнёўскі верш. Некаторыя крытыкі разгрымілі яго. Некаторыя, нават спачувальна пішучы, як Ірына Багдановіч, адзначалі, што ён — на мяжы з дрэнным густам: «Тут мы можам заўважыць хутчэй мадэрнавую сумесь імажынізму і імпрэсіянізму, жаданьне спэцыяльна ўразіць нечаканай і дзёрзкай асацыятыўнасьцю, якая амаль мяжуе зь безгустоўнасьцю... Бо, як вядома, у імажынізьме быў спэцыяльны прыём: спалучэньне „пары чыстай і пары нячыстай“ (гэта значыць зьявы ўзвышанай, прыгожай — з чымсьці ня вельмі прыстойным), і вынаходніцтва ў гэтай сфэры ня ведала межаў... Усё гэта выклікае перад вачамі фантасмагарычную і адначасова парадыйна-камічную карціну, уражвае недарэчнасьцю і, пэўна ж, шакуе чытача. Але шок ад вобразу, як вядома, — галоўная задача таго ж імажыніста!».

Так ці іначай, трывожная атмасфэра, адчуваньне жудасьці, што раз-пораз будзе зьяўляцца ў найлепшых творах паэта, — тут ужо ёсьць. Як і скразная тэма вясковага чалавека, які так і ня здолеў адаптавацца да гораду — і цярпіць жыцьцёвую катастрофу. Янка і Марыйка, яны ж Іван-ды-Мар'я. Ідылічнае вясковае каханьне, што абрываецца яго сыходам у войска і яе паездкай у горад — туды, «дзе станкі». А потым Мар'я сутыкаецца ці то з рабаўніком, ці то з гвалтаўніком — і пазнае ў крымінальніку былое каханьне:

Блындае вецер па вуліцы,
Скача ў пацёмках балет,
П'яным брадзягаю туліцца
К вуснам кабет.
<...>
Блукае вецер бяздомнікам,
Ліпкая цемень маўчыць —
Мар'я ў палоне рабоўніка
Ціха крычыць...

Сьведчаньні сучасьнікаў пра Кляшторнага — яго выгляд, спосаб трымацца і манеру чытаць вершы — збольшага супадаюць: «Беларускага паэту Тодара Кляшторнага, — згадвае Вольга Таполя, — я ведала ў дні свайго раньняга юнацтва. Высокі, хударлявы, з капной густых, саламяна-сьветлых валасоў на галаве, з блакітнымі, пад колер блёклых васількоў, вачыма, ён быў заўсёды неяк па-асабліваму сумны, нейкім смуткам веяла ад яго. Каля ягоных тонкіх бледных губ рана леглі складкі горычы. Ён рэдка сьмяяўся, і ягоная ўсьмешка таксама была заўсёды сумнай. І яшчэ быў ён ціхі, спакойны, ураўнаважаны, ніхто ніколі ня чуў і ня бачыў, каб ён злаваўся... Увогуле Кляшторны быў вельмі чулы. Калі хто-небудзь зь ягоных калегаў чытаў свой моцны верш, які праймаў да сэрца, у Кляшторнага на вачох набягалі сьлёзы...».

> *«У 1931 годзе,* — успамінае Сяргей Грахоўскі, — *упершыню ўбачыў яго ў Доме пісьменьнікаў. Высокі, танклявы, з рудаватымі хвалістымі валасамі, а выраз вачэй па-дзіцячаму зьбянтэжаны й разгублены. Ён быў неверагодна сьціплы й далікатны. Амаль у кожным сказе само па сабе праскоквала „прабачце“ і „калі ласка“. Ён кожнаму саступаў дарогу, асабліва губляўся перад жанчынамі, чырванеў, міргаў калматымі, як чмялі, вейкамі і гаварыў заўсёды толькі самае прыемнае».*

А вось згадкі Паўла Пруднікава: «Тодар Кляшторны быў ціхі, спакойны й выключна ветлівы чалавек. Ён заўсёды і ўсюды стараўся быць непрыкметным. Многа ведаў, слухаў іншых, але сам гаварыў мала. З выгляду ён быў прыгожы, высакарослы, крыху сутулаваты, як быццам гнуўся знарок, саромеючыся свайго росту, сінявокі, з добрай чупрынай непаслухмяных валасоў каштанавага колеру. Апрануты звычайна не па модзе. Як на вопратку, так і на абутак асаблівай увагі не зьвяртаў. Усе яго думкі й клопаты былі сканцэнтраваныя на адным — паэзіі, якой ён самааддана служыў зь дзіцячых гадоў свайго жыцьця... Вершы свае Тодар Кляшторны чытаў ціха, больш унутраным голасам, характэрным толькі для паэтаў. Ні жэстаў, ні мімікі не прымяняў. І, нягледзячы на ўсё гэта, слухачы яго вельмі добра прымалі. Асабліва тады, калі ён чытаў вершы на тэму каханьня...».

І, вядома ж, было што прымаць. Рэагуючы на створанае Ясеніным ды іншымі імажыністамі (у тым ліку беларускім імажыністам Язэпам Пушчам), на паэтычныя адкрыцьці Ўладзімера Дубоўкі, у трох сваіх найлепшых кнігах паэзіі «Кляновыя завеі» (1927), «Сьветацені» (1928) і «Ветразі» (1929) Тодар Кляшторны малюе непаўторны вобразны сьвет, густа перасыпаны сьмелымі мэтафарамі, якія немагчыма пераблытаць ні з чым і ні з кім у нашай літаратуры: *«Зацьвілі сярэбраныя росы / У кілішках выцьвілых лістоў, / Запалілі зоры папяросы / Над буланай грывай туманоў»*. Або такое: *«Ці гэта ноч і месяц пад гіпнозам? / Ці я пад хмелем мудрасьці жсыцьця?»*. Магчыма, самым знакамітым, самым распазнавальным мадэрнісцкім вобразам Кляшторнага стала «ледзяная гітара»:

Зь вішнёвых хмар на ледзяной гітары
Заплакала зара па сонечнай вясьне,
І быццам зь вёснамі разьвеяныя мары
На успамін застылі на вакне.

Тут вам і разьняволеная багемнасьць, і чыста вэрленаўскі імпрэсіянізм з «музыкай перадусім», і амаль песенныя рэфрэны, што паўтараюцца, гіпнатызуючы чытача, і наўмыснае сутыкненьне «высокага» і «нізкага». І «фірмовае» для Кляшторнага спалучэньне зімовых, сьнегавых, ледзяных вобразаў — з алькагольнымі:

Цяпер сьнягі...
Вячэрняю зарою
З пунсовай шклянкі белая зіма
Частуе Менск наліўкай ледзяною...
...Цябе ж няма...

Вось толькі некалькі характэрных вобразаў з кнігі «Кляновыя завеі»: *«Як сумна, любая, дакоры / З твайго кілішка дапіваць»; «Хачу сьпяваць, / Хачу маліцца / Над чаркай выпітых гадоў»; «Ў шыпучы кубак сонечнай вясны»; «Ня выпіць змрок кілішкамі зарніц»; «Гадзіны чаркамі вычэрпываюць веч-*

На Тодара Кляшторнага любілі маляваць сяброўскія шаржы і карыкатуры.


Карыкатура ў часопісе «Маладняк», 1930, № 3





Шаржж мастачкі Галіны Дакальскай. 1934 г.


Шаржс мастака Цфаніі Кіпніса. 1932 г.



насьць». З кнігі «Сьветацені»: *«Дагарэлі там п'яныя ночы... / Дурнап'яны мінулых гадоў»; «На п'яных струнах салаўёў»; «Стары карчмар нас разьлічыцца просіць / За п'янае юнацкае віно»*. З кнігі «Ветразі»: *«Пакахаў, / каб туманáмі кроз, / як віном, упіцца на хвіліну»; «У бары́ пахмельле безь віна»; «Мары — дым, каханьне — алькаголь»; «Не віном залечываюць раны, / А душу атручваюць віном»; «Тут цяпер / за п'янымі сталамі / прапіваюць нейчае жыцьцё»; «Неяк дзіка чокаюць бакалы»*. І нават такое: *«Не віна нап'юся — палітуры»*.

Крытычная рэакцыя не прымусіла сябе доўга чакаць — ад яшчэ нязлоснай мянушкі «ледзянога гітарыста» да агрэсіўнага цкаваньня савецкімі вульгарнымі ідэолягамі ад літаратуры, якое толькі ўзмацнілася пасьля выхаду паэмы «Калі асядае муць». «Усе кілішкі, келіхі й чаркі, якія мы бачылі ў першых кнігах Кляшторнага, — пісаў адзін з крытыкаў, — перавандравалі ў паэму», якая «ўся заліта віном». «Т. Кляшторны ўдарыўся ў нейкі своеасаблівы, я б сказаў, эстэтычны алькагалізм. Але не ў адным алькаголі справа. Паэма... — упадніцкі, пэсымістычны, шкодны твор, а сам яе аўтар дайшоў, як кажуць, «до точкі». «Гэтая п'яная, падгітарная лірыка зьяўляецца выражэньнем настрояў падонкаў сучаснага грамадзтва», — нанізваў склоны іншы літаратурны дзяяч.

Мяркую, што асабліва крыўднай была рэакцыя калегаў-паэтаў, часам вельмі таленавітых. Вось што пад псэўданімам Тодар Глыбоцкі пісаў пра Кляшторнага Алесь Дудар: «Расійская група імажыністаў разглядала вобраз як мэту, і з гэтага выходзілі сябры групы пры будаваньні сваіх твораў. Але пры гэтым яны ўсё ж такі трымаліся нейкіх правіл; кожны вобраз у іх павінен быў быць апраўданым агульнай кампазыцыяй і другімі вобразамі. Нашы маладыя паэты пайшлі далей. У іх часамі вобраз ня толькі нічым не



Вокладка кнігі Тодара Кляшторнага «Кляновыя завеі». Менск: Выданне ЦБ «Маладняка», 1927 г. Мастак Анатоль Тычына



Вокладка кнігі Тодара Кляшторнага «Сьветацені». Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1928 г.

апраўданы, але зусім ня мае ніякага сэнсу і будуецца ці толькі па фанэтычнаму прынцыпу, ці па прынцыпу „Піліпа з канапель". Возьмем некалькі мясьцін зь вершаў Кляшторнага:

Не падняць нам зь сьмяротнай пасьцелі
Ў сінярунь адгітарыўшых *дзён.*

Здорава? Але зразумець нельга...

Ці можа зразумець чытач, што разумее аўтар у вобразе «Ледзяная гітара», створаным гэтым самым Кляшторным? Гэта гвалт над сэнсам, гвалт, зроблены для гучнасьці (а па праўдзе і гучнасьці тут няма). У нас ня вельмі лічацца з сэнсам і праўдзівасьцю. Туман можна зрабіць „буланым", можна раўняць яго з „залатой пражай" — як толькі ня зьдзекаваліся ў нас над гэтым няшчасным туманам... Усе гэтыя вобразы прыйшлі да нас здалёку, з маскоўскіх „пэгасавых стойлаў", з тае плыні, якая выклікала вялікую трывогу расійскай грамадзкай думкі. Гэта ясеніншчына, якая праз свае звонкія формы ўлівае ў творчасьць маладзейшых паэтаў атруту заняпаду і разлажэньня». Пакуль была крытыка мэтафараў — няхай сабе (хоць тут і дзіўнаватая для здольнага паэта эстэтычная сьлепата), але апошнія сказы ўжо нагадвалі данос...

Савецкая ўлада, рызыкну сьцьвердзіць, забіла паэта Кляшторнага тройчы. Першы раз — агрэсіўнай, зьнішчальнай крытыкай, да якой паэт, на жаль, ня мог не прыслухвацца. Кляшторны стварае шматлікія вершы-агіткі, збольшага сабраныя ў кніжцы «Праз шторм на штурм» (які кантраст з папярэднімі кнігамі ўжо ў назьве), піша ідэалягічна вывераную паэму «Палі загаманілі», дзе — увага! — стварае вобразы „ворагаў народу". Вобразы выйшлі хадульнымі, а вось сам настрой трывогі, неспакою і чаканьня бяды — характэрны для тагачасных твораў паэта.

Уважлівы чытач знойдзе ў вершах і паэмах Кляшторнага шматлікія матывы віны й раскаяньня, злачынства і пакараньня, неспакойнага сумленьня і ўцёкаў ад сябе. Літаратар выстаўляе напаказ маральныя хібы свайго лірычнага героя (верш «Сямейны прымус» — націск на першым складзе, але прачытваецца і іншая магчымасьць), сумняецца ва ўласным рамястве, разважаючы, ці ён не «дармаед» («Ці варта сёньня быць паэтам?»). «Седзячы на канапе ў Доме пісьменьніка, ён абвёў прысутных сваім зыркім позіркам і спытаў: — Скажыце, хлопцы, якая роля паэта ў жыцьці народу? <...> Сяляне нас кормяць хлебам, рабочыя здабываюць вугаль, вырабляюць машыны, будаўнікі будуюць прадпрыемствы, дамы, а мы якую карысьць прыносім? Ядзім хлеб і забаўляемся рыфмаплётвам. Трутні...» (з успамінаў Паўла Пруднікава).

Часам ствараецца ўражаньне, што аўтар сам сьпяшаецца вынесьці сабе прысуд, каб апярэдзіць кару, што мусіць прыйсьці звонку. Вельмі характэрны верш «Растратчык» з трэцяй кнігі паэта, фрагмэнт зь якога выбраў гурт «TonqiXod», стварыўшы зь яго песьню для праекту «(Не)расстраляная паэзія». Бухгальтар (вораг народу, а як жа!) крадзе грошы і спрабуе ўцячы зь імі на цягніку. Але ад сябе самога не ўцячэш —

і наш антыгерой кідаецца зь цягніка, канчаючы жыцьцё самагубствам. Лірычны сюжэт напяты штучна, а вось само апісаньне дакораў хворага сумленьня выйшла больш чым пераканаўчым:

Пад мерны лязгат,
Мерны стук,
Пад перазвоны рэек звонкіх
Яму здалося:
Пара рук
Да шыбы шкла прыстала звонку.

Ён адхіснуўся ад акна,
А потым доўга хмурыў бровы,
Што ўласных пальцаў не пазнаў
На шкле таемны адлюстровак...

Хоць ноч халодная маўчыць,
А ўсё ж дрыжаць яго калені.
Няўжо няможна уцячы
Ад чорных думак і сумленьня?!



Уладзімер Хадыка, Барыс Жылка (брат Уладзімера Жылкі), Тодар Кляшторны і Максім Лужанін. Дом пісьменьніка, 1932 год. З фондаў музэю гісторыі беларускай літаратуры. Да 1988 г. захоўваўся ў Н. Прушынскай.

Тодар Кляшторны чытае рукапіс. 1930 г.



Шляхоў для ўцёкаў у зацкаванага літаратара было вельмі няшмат. Заставалася дзіцячая літаратура, дзе ідэалягічны прэс быў не такі моцны. І паэт піша вершаваную дзіцячую кніжку «Пра зайца, ваўка і мядзьведзя». Але дзіўнай атрымліваецца гэтая «дзіцячая літаратура»: атмасфэра трывогі й страху і тут прасякае ўсю кніжку. Загнанаму зайку няма ратунку. Адзінае збавеньне за хвілю да немінучай гібелі — калі пачвару, што перасьледуе цябе, задзярэ іншая, яшчэ большая пачвара:

Воўк і зубы не ашчэрыў,
Як мядзьведзь
Падабраў яго пад чэраў —
Воўку сьмерць!

Зайка ж — скок! Тады зь бярлогі —
Лататы.
У яго адны дарогі —
У кусты.

Чым не характарыстыка эпохі?

Заставаўся як варыянт таксама мастацкі пераклад, якім Кляшторны займаецца, калі толькі выпадае. Варта згадаць вельмі добрае беларускае перастварэньне ўступу да паэмы «На ўвесь голас» Уладзіміра Маякоўскага. Перастварэньне і сэнсава слушнае, і паэтычна моцнае, практычна без «адсябеціны» (а калі яна ўсё-такі ёсьць, то абгрунтаваная). Калі зьяўляюцца непазьбежныя страты, паэт-перакладнік імкнецца іх годна кампэнсаваць. Так, «з тэхнічных прычын» у перакладзе не ўдалося захаваць прыгожую рыфму «водовоз — садоводств», затое зьяўляецца чыста беларускі вобраз:

Я асэнізатар
і **мэліяратар** *вякоў.*
Рэвалюцыя
дае мне загады
і візы.
Я на фронт
ад панскіх садоўніцтваў адышоў
паэзіі —
бабы капрызнай.

У «Хроніцы» часопісу «Полымя рэвалюцыі» (№ 8 за 1936 г.) чытаем: «Тодар Кляшторны — выдае зборнік вершаў „Песьні пачуцьцяў“, здаў у друк зборнік „Выбраныя вершы“. Закончыў пераклад паэмы Пушкіна „Каменны госьць“. Працуе над перакладам другой паэмы Пушкіна „Скупой рыцарь“». Пакінем на сумленьні рэдактара гэтае «паэма», нам важна ўсьведамляць іншае: ні «Песьні пачуцьцяў», ні «Выбраныя вершы», ні пераклады з Пушкіна ў Кляшторнага ўжо ня выйдуць. Бо 3 лістапада 1936 году ў кватэры нумар сем на вуліцы Фабрычнай, д. 10/4, паэта арыштавалі.



Перавыданьне кнігі «Пра зайца, ваўка і мядзведзя». Мінск: выдавецтва «Беларусь», 1964 г. Мастак Валянцін Ціхановіч

Але спачатку была яшчэ адна ілюзія ўратаваньня. Трэцім магчымым шляхам уцёкаў ад сталінскага ідэалягічнага прыгнёту Тодар Кляшторны карыстаўся найчасьцей. Алькаголь зрабіўся своеасабліваю формаю ўнутранай эміграцыі паэта. За некалькі гадоў ён пабываў сябрам шэрагу творчых аб'яднаньняў — «Маладняку», «Узвышша», БелАППу, але, мабыць, найбольш утульна пачуваўся ў згуртаваньні ТАВІЗ — Таварыства Аматараў Выпіць і Закусіць.

«Тодара Кляшторнага, — пісаў у 1932 годзе ў літаратурным шаржы Анатоль Вольны, — я добра ведаю, — настолькі добра, што аднаго погляду яго вачэй для мяне досыць, каб беспамылкова вызначыць, у якую піўную мы пойдзем выпіць зь ім па куфлю піва». І ў гэтым жа шаржы, як на мяне, занадта злаcьліва: «Некаторыя кажуць, што быццам па сваёй раскіданасьці Тодар пры пераезьдзе з аднэй кватэры на другую згубіў сваю дачку. У гэтым сэнсе, нават абвестка вісела некаторы час у доме пісьменьніка. Але гэта мана. Дачку Тодар не згубіў...».

А Сымон Шаўцоў у сваёй кнізе «Мая адысэя» згадвае: «Кляшторны быў маім суседам па кватэры на пасёлку „Камінтэрн“. Разам ішлі неяк з Дому пісьменьнікаў па прагнілых дошках ходніку на Ляхаўцы. Тодар у абдрыпаных нагавіцах: адна калашына закасаная вышэй калена, другая — спушчаная на падраны чаравік. Нёс на руках сваё малое дзіця, а за ім дробненька тупала ягоная малая, шчуплая жонка. За жончыну спадніцу трымалася малая дачушка. „Тодарка, родненькі, не ўпусьці дзіцятка!“ — паўтарала жонка. Тодарка быў крыху падпіты». І тамсама: «Кляшторны часта насіў з сабою ў клетцы канарэйку, якую вучыў размаўляць. Рабочыя-муляры ведалі, што ён — паэт. З рыштаваньняў забачаць яго й гавораць: „Вунь ідзе пралетарскі паэт!“ Пыталіся: „Як сьпявае канарэйка?“ — „Не сьпявае, а плачыць у клетцы канарэйка“, — адказваў Тодар».

«І алькаголь, і паўвар'яцкі выгляд, нават неахайнасьць у адзеньні, і незлаблівасьць, — казаў Сяргей Дубавец, — гэта ўсё спосабы абароны ад рэчаіснасьці, спосабы захаваць сваю асобу і свой паэтычны та-

Тодар Кляшторны (наперадзе) з жонкай Янінай, дачкой Тадзіянай і бацькамі. 1932 г.



лент, агарадзіць сябе ад палітычнай рэальнасьці таталітарнага грамадзтва. Сапраўды, такога не запросяць у прэзыдыюм, але супраць такога і паказальнага судовага працэсу ня зладзіш. Таварыства аматараў выпіць і закусіць — гэта вам не Саюз вызваленьня Беларусі. Такога нават крытыкаваць сур'ёзна за „палітычныя памылкі" — не выпадае. Выглядае, што Кляшторны і сьведама, і змушана рабіў сабе вобраз, у якім яго можна было толькі... расстраляць — без асаблівага перад тым вымазваньня ў друку. Уявіце, каб ён і сапраўды быў правільным камсамольцам: непазьбежна ўцягнулі б у нейкія прэзыдыюмы, тройкі, прымусілі б загубіць уласных таварышаў, пасьля ўчынілі абліваньне брудам, паказальны працэс і — у выніку — расстрэл. Кляшторны не пацягнуў за сабой гэткага бруднага шлейфу. Ён проста загінуў, як бажаволак, ведаючы, што ў гэтым сьвеце ні ад каго яму ня варта чакаць паратунку. Бо такія правілы гэтага жыцьця, а іншага ён, бадай, і ня ведаў».

Другое забойства Кляшторнага было зьдзейсьненае 1 жніўня 1937 году. «На вялікім вогнішчы ў „амэрыканцы", — піша Леанід Маракоў у кнізе „Ахвяры і карнікі", — энкавэдысты Сакалоў (намесьнік начальніка Менскай унутранай турмы НКВД), Абрамчык, Гарбацэвіч вынішчылі — спалілі — некалькі дзясяткаў тысяч (!) рукапісаў беларускіх літаратараў. Гарэлі творы, якія не праскочылі цэнзуру або пісаліся ў стол для нас, нашчадкаў. Гарэлі рукапісы М. Багуна, С. Баранавых, А. Вольнага, П. Галавача, У. Галубка, Ц. Гартнага, С. Дарожнага, А. Дзеркача, А. Дудара, Х. Дунца, М. Зарэцкага, С. Знаёмага, В. Каваля, Т. Кляшторнага, М. Кульбака, Ю. Лявоннага, В. Маракова, С. Мурзо, Я. Нёманскага, З. Півоварава, С. Ракіты, А. Розны, В. Сташэўскага, Б. Тарашкевіча, Ю. Таўбіна, У. Хадыкі, І. Харыка, М. Чарота, В. Шашалевіча, А. Юдэльсона і многіх іншых».

Трэцяе, фізычнае, забойства паэта адбылося ў фатальную для нашай культуры ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 году. Разам зь дзясяткамі іншых творцаў Кляшторны быў расстраляны і закапаны, найхутчэй, у Курапатах, хоць ня выключаны і парк Чалюскінцаў. А 28 лістапада па тым самым менскім

адрасе — вул. Фабрычная, д. 10/4, кв. 7 — была арыштаваная і жонка паэта Яніна Германовіч, маці траіх дзяцей. Яніну разам з 4-месячнай Маяй Кляшторнай этапавалі ў так званы «Алжыр» — «Акмолинский лагерь жён изменников Родины». Яніну Германовіч вызвалілі й рэабілітавалі толькі ў 1955 годзе. Дачка Мая пяць гадоў правяла ў Акмолінскім лягеры, яшчэ шэсьць — у дзіцячым спэцпрыёмніку НКВД і яшчэ сем гадоў — разам з маці ў высылцы ў Сібіру.



Тодар Кляшторны. Турэмнае фота

Злавеснае прароцтва з паэмы «Калі асядае муць»: *«Ходзім мы пад месяцам высокім, / А яшчэ — пад Д. П. У.»*, — спраўдзілася цалкам. І працягвае спраўджвацца дагэтуль. Бо ніхто так і не пакаяўся ў масавых злачынствах, ніхто так і не папрасіў за іх прабачэньня. Бо нават пасьля рэабілітацыі паэтаў іхная творчасьць замоўчваецца і цэнзуруецца. Бо чыноўнікі цынічна хлусяць, толькі каб не ўключаць гэтых творцаў у школьную праграму. Бо Курапаты як патрабавалі, так і патрабуюць сёньня абароны. Ад тых, хто апаганьвае крыжы ахвярам, будуе на костках дарогі, адчыняе побач з магіламі рэстараны, як бы доўжачы, пераносячы «застольлі падчас чумы» з радкоў Кляшторнага — проста ў нашыя дні.



Дзеці «Алжира» («Акмолинского лагеря жён изменников родины»). Апошняя справа — дачка паэта Мая Кляшторная. 1941 г.

Літаратура

Кляшторны Т. Кляновыя завеі. — Мн.: БДВ, 1927.

Кляшторны Т. Сьветацені. — Мн.: БДВ, 1928.

Кляшторны Т. Калі асядае муць // Узвышша. 1927. № 6; 1928. № 2, 3.

Кляшторны Т. Ветразі. — Мн.: БДВ, 1929.

Кляшторны Т. Палі загаманілі. — Мн.: БДВ, 1930.

Кляшторны Т. Праз шторм — на штурм. — Мн.: ДВБ ЛіМ, 1934.

Кляшторны Т. Залатое вязьмо. — Мн.: Дзярж. выд-ва БССР, 1960.

Кляшторны Т. Выбраныя вершы. — Мн.: Беларусь, 1970.

Кляшторны Т. Сляды дарог. — Мн.: Беллітфонд, 2003.

Алёша [Вольны А.]. Тодар Кляшторны. Літаратурны сілуэт: Гумарэска // Чырвоная Беларусь. 1932. № 2.

Багдановіч І. Матыў скокаў у творчасці Тодара Кляшторнага і эстэтычныя асаблівасці беларускага дэкадансу // Пра час «Узвышша»: Матэрыялы Узвышаўскіх чытанняў (Мінск, 2003–2004); уклад.: Г. В. Запартыка, Т. В. Кекелева, Я. М. Кісялёва. — Мн.: РІВШ, 2005.

Грахоўскі С. Лірык нашага рання // Кляшторны Т. Выбраныя вершы. — Мн.: Беларусь, 1970.

Дубавец С. Вострая Брама: беларускі культурны кантэкст на мяжы стагодзьдзяў. Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2005.

Жыбуль В. «Адну ён паэзію сэрцам высвечваў...»: Пра Тодара Кляшторнага ва ўспамінах сучаснікаў і нядаўную архіўную знаходку // Роднае слова. 2013. № 3.

Кляшторная Т. Мае дзіцячыя ўспаміны пра бацьку // Пра час «Узвышша»: матэрыялы Узвышаўскіх чытанняў (Мінск, 2003–2004). — Мн.: РІВШ, 2005.

Лужанін М. Наш рух — калодзеж непачаты... / М. Лужанін // ЛіМ. 1988. 1 крас.

Мішчанчук М.І. «Цалуем сонца мілыя ўсмешкі і молімся над кожным васільком...» Пра творчасць Тодара Кляшторнага // Як жыць — дык жыць для Беларусі... — Мн.: Народная асвета, 1995.

Пашкевіч А. Вернік паэзіі // Кляшторны Т. Сляды дарог. Выбранае. — Мн.: Беллітфонд, 2003.

Прудніка ў П. Далёкае, але не забытае: Успаміны. — Мн.: Маст. літ., 1988.

Шаўцоў С. Мая адысея. — Вільня: Выдавецтва Беларусаў Літвы «Рунь», 1999.

Юрэвіч Л. Тавізаўцы: Пра лёсы ўдзельнікаў аднаго літаратурнага аб'яднання // Роднае слова. 1997. № 11.

ЗЬ НІЗКІ «КЛЯНОВЫЯ ЗАВЕІ»

III

Як сумна, любая, дакоры
З твайго кілішка дапіваць,
Калі так сьвецяць,
Сьвецяць зоры,
Калі так зоры зіхацяць.

Пайсьці б у ноч,
Пайсьці б далінай,
Пайсьці чорт ведама куды...
Ня ўсе пратоптаны пуціны,
Ня ўсе стаптаны гарады.

Пайсьці, дзе ветры на азёрах
Зь лістоты выткалі абрус...
Люблю я шыр,
Люблю я поле,
Люблю я маці Беларусь.

Тут кожны куст пяе каханьне,
Тут рэчка казкаю журчыць,
Аповесьць доўгую змаганьня
Тут навявае кожны крыж.


Дарогай ў далечы пайду я,
Пайду часамі без дарог,
І кожны кусьцік расцалую
На уміраючых палёх.

Калі над цінаю імшараў
Засьвішча волат гарадоў,
Я разаб'ю пустую чарку
На полі выпітых гадоў.

Ня стану, любая, дакоры
З твайго кілішка дапіваць,
Калі над шляхам будуць зоры
Сталёвай раніцай зіяць.

1926

Т.Кляшторны. «Дзе гулялі буруны». Верш. Аўтограф. 1933 г.



Дзе гулялі буруны 1

Па нашаму —
Ялта,
па рускі —
таксама,
на мове башкірскай —
Чаляба.
Ад тых
Вось — чалябы
паходзіць і слова —
Чалябінск.
Хто быў на хрэсцінах
галоўнейшым куме —
не ведаю...
і так не памятаюся, мабыць,
скажуць:
„Чалябінскам горад
назвалі таму,
што быў для каланіі
ён толькі чалябай!"
Прыгожай самай ладзіцца
там грозна вісеў
над тучамі дзіцяці
над кайданным стогам...
Муды і дарогі прытойтаная ўся
Кантынент расійскай каланіі.

НА ЛЕДЗЯНОЙ ГІТАРЫ

А. Віньнікавай

Зь вішнёвых хмар на ледзяной гітары
Заплакала зара па сонечнай вясьне,
І быццам зь вёснамі разьвеяныя мары
На успамін застылі на вакне.

Куды пайшло, куды ўсё паляцела,
Чаму загінула, ня кінуўшы сьлядоў,
Чаму застыла ўсё — заледзянела
Ў туманнай шэрані засьнежаных палёў?

Так у жыцьці — разьвеяныя вёсны
Туману крыюцца ў завеях залатых,
І замярзаюць сонечныя вёслы
На паўпуці ў кара́лях ледзяных...

Ты гаварыла,
Ты мне гаварыла:
— Наш просты шлях ня зьвяжуць туманы —
Што ты душу і сэрца падарыла
Ў шыпучы кубак сонечнай вясны.

Чаму ж так неба вычарніла хмары,
Чаму згарэла сонечная сінь,
Чаму, любімая, на ледзяной гітары
Ты адпяваеш сонечныя дні?

Чаму замёрзьлі сонечныя вёслы
На паўпуці ў каралях ледзяных,
Чаму руковыя разьветрыліся вёсны
І нашы сьцежкі вяжуць туманы?...

Зь вішнёвых хмар на ледзяной гітары
Заплакала зара па сонечнай вясьне,
І быццам зь вёснамі разьвеяныя мары
На успамін застылі на вакне.

1926

* * *

Белыя паляны, белыя гаі...
Пчолы ледзяныя кружацца ў гальлі,

Кружацца раямі, сыплюцца на дол,
Апушылі хвоек срэбраны прыпол.

А з-за лесу-гаю скача па лугах
Хтосьці незнаёмы ў ледзяных санях.

Зь сіняватых даляў, зь сіняватай цьмы
Хтосьці напявае залатыя сны.

Месяц кучаравы між сівых завей
Блудзіць над барамі, блудзіць, як зладзей.

Хай галосяць ветры ў цемені начной;
Сядзем, дарагая, пасядзім з табой.

Раскажы мне шчыра, праўду раскажы, —
Хто ў чароўных вочах зоры патушыў?!

Хто замёў сьнягамі у душы вясну?
Сэрца хто параніў, — вымеў цеплыню?!

Хто расьпяў з каханьнем сэрца на крыжы, —
Раскажы мне праўду, любая, скажы?!

І маўчаць пацёмкі... любая маўчыць....
Ледзянеюць словы, і душа баліць...

Белыя паляны, белыя гаі,
Пчолы ледзяныя кружацца ў гальлі.

І мярцьвеюць змрокі між сівых завей,
Прытуліся бліжай, сэрца абагрэй...

1927

ЛІСТ У СІБІР

Зіне Бандарынай

Засыпан Менск халоднымі сьнягамі,
Пад палазамі гойсае зіма...
Астрыжан клён асеньнімі сярпамі —
Лістоў няма...
А помніш ростань,
Помніш, дарагая,
Як дагарала восеньская медзь...
Так і душа ў шуканьнях дагарае,
Каб не гарэць...
Тады плылі,
Плылі на поўдзень гусі,
Будзіў лясы
Асеньні сьвіст і гуд...
А ты мяняла поле Беларусі
На дальнюю тайгу...

Цяпер зіма скрыпіць пад палазамі,
Заледзянела дарагая шыр...
І часта, часта
Думаю начамі
Я пра Сібір.
За тою хмураю
Таемнаю тайгою
Шукае золата
І ненец і тунгус...
Здружыўся з лыжамі
І цёплаю дахою
Там беларус.
Хачу да сьлёз расквечанай вясною
Паезьдзіць там
І ўдоўж і папярок,
Дзе між сібірскіх зёлак галавою
Ківае васілёк.
Цяпер сьнягі...
Вячэрняю зарою
З пунсовай шклянкі белая зіма
Частуе Менск наліўкай ледзяною...
...Цябе ж няма...

1927

ХОЧУ ЖЫЦЬ

Хочу жыць,
Захлынацца і верыць.
Піць каханьня нязьведаны боль...
Дай руку мне,
Дай вусны, дай сэрца,
Дай мне воч тваіх чад-алькаголь.

Сёньня п'яны вячэрнія далі,
Сёньня п'яна вішнёвая бель...
Прамінайце, юнацкія хвалі,
Прамінайце жыцьцёвую мель.

Прамінайце, жыцьцёвыя стыні.
Хай заранкамі дні зіхацяць...
...Прамінайце!..
А ў гэтых прамінах
Ёсьць адвечная існасьць жыцьця:

Маладосьць —
Гэта дзіўная казка,
Непаўторная ў нашым жыцьці...
...Ападаюць
Чароўныя краскі,
Ападаюць,
Каб больш не цьвісьці...

Дай руку мне,
Дай сэрца надломы,
На калені прысядзь, абнімі;
Прасьпявай пад вячэрнія бомы
Пра затлеўшыя ў сэрцы агні.

Ападуць залатыя лілеі.
І каханьне чароўным віном
Вечна чулае сэрца ня грэе,
Вечна душы ня паліць агнём.

Хай сягоньня ў туманнай дуброве
Захлынаюцца шчасьцем вятры.
Мабыць, заўтра
Ня мне, а другому
Будзеш дзіўную ружу дарыць.

Мабыць, я,
Каб любоў дарагую
Ад цябе і сябе захаваць,
Не кахаючы, буду другую,
Як асеньні «піон», цалаваць.

А сягоньня
Мне хочацца верыць...
Піць каханьня нязьведаны боль.
Дай руку мне,
Дай вусны, дай сэрца,
Дай мне воч тваіх чад-алькаголь.

Менск, 1927 г.

* * *

Плачуць асеньнія клёны...
Месяц лісты палічыў...
Нехта знайшоў міліёны,
Нехта душу загубіў...

Нам вось нічога ня трэба,
Наша пры нас заўсягды...
Дальш ад цнатлівага неба,
Дальш ад сьмяртэльнай бяды.

Сядзь, дарагая Галіна,
Годзе, аб чым сумаваць...
Шчасьце заўсёды — хвіліна,
Шчасьце няможна губляць.

Нам не патрэбна багацьце,
Клець і чужая павець...
Будзем над горам сьмяяцца,
Праўдзе у вочы глядзець.

Чуеш, у восеньскіх шатах
Клёны гавораць: «кахай!»
Хай я сто тысяч — жанаты,
Ты не зважай, не зважай.

Прыйдуць другія варункі,
Будзеш далёка — ня плач...
Я і ў лістах пацалункі
Буду табе пасылаць...

1927

ЗАЗІМАК

Мёрзлы месяц з-за гор васількамі
Перасыпаў азёрную сінь.
Стыне ўсё...
Ледзянымі сярпамі
Выйшла восень рабіну касіць.

Тоўпы зор сьнегавым пералівам
Разматалі ў палёх павады.
Быццам коні з намыленай грывай —
У пацёмках застылі сады.

Хтосьці там, у шырокім прывольлі,
Дзе узьмежкі гараць серабром,
Засьпяваў пра шырокае поле,
Засьвістаў ледзяным салаўём...

Эх, як рвецца душа у прасторы,
Штосьці хочацца вечна кахаць,
І дзіцячае радасьці зоры
Ў ледзяных перазвонах зьбіраць.

Мёрзлы месяц з-за гор васількамі
Перасыпаў азёрную сінь.
Стыне ўсё...
Ледзянымі сярпамі
Выйшла восень рабіну касіць.

1927

МАЯ ЛЮБІМАЯ

Сумна тут у мурах да адчаю,
Здэцца, просіцца сэрца ў палі,
Дзе вясна залатымі ключамі
Адмыкае таемнасьць зямлі.
Эх, вясна!.. Жартаўлівая казка...
Што папішаш?! Вядома, вясна...
Нават камень,
Засыпаны камень,
Зварухнуцца прымусіць яна.
Дайце рады!..
На гэтай кватэры
Кот-мурлыка ў зямлю паглядаў,
А сягоньня такім кавалерам
Выглядае,
Ну проста бяда!..
Сьвецкім тонам гарэзьлівым дамам
Спазаранку сьпявае амаль:
«Ваши лапки пахнут ладаном,
А в ресницах спит печаль».
Сумна тут у мурах да адчаю,
Здэцца, сэрца — ня сэрца, а лёд.
Колькі тут сінявымі начамі
Напаткаеш шчасьлівых істот...
Я адзін...
Мо за гэтым і горна,
Але што?! Хіба сьвет у акне?!
Не журыся, таварыш Кляшторны,
Не рыдай аб далёкай вясьне.
Не рыдай!..

Там пад месяцам недзе,
Дзе склікаецца тайна начэй,
У гаі беларускую лэдзі
Аклікае паэт-салавей.
І яна — векавая бяроза —
Лепш умее каханьне дарыць...
Ты прыпомні юнацкія крозы,
Ты прыпомні далёкія дні.
Помніш тую?!
Калісьці, калісьці
(Мабыць, горна аб тым памінаць)
Вы ля гэтай бярозы кляліся, —
Абяцаліся вечна кахаць.
А пасьля?!
. . . . . .
Вы пайшлі... Разышліся... Чужыя...
Ты рыдаў,
Безнадзейна рыдаў...
Дзеўку сваталі людзі чужыя,
Сівы конь на канюшні іржаў.
Галасілі вятры да адчаю,
Сумавала асеньняя даль...
Дарагую з другім заручалі, —
Ты радзіму сваю пакідаў.
Без радзімы,
Пад небам чужацкім,
За гадамі ляцелі гады,
І гарэзьлівасьць гордай казачкай
Уступала шляхі маладым.
Шмат нязвыклага блудзіць па сьвету,
Шмат зьяўляецца новых імён...
Ты прыехаў на вёску паэтам,
Апрануўшы другі палітон.
І сябе не пазнаў і зьдзівіўся:
Кожны жук ад цябе уцякаў,
Кожны шпак зь перапуду маліўся,
Кожны певень з пуці саступаў,
Не сьмяяліся дальнія мілі,
Не схіляла вярба галавы...
Прывіталася мілая зь мілым
Афіцыйна, далёка, на «вы»...
А калісьці яна шкадавала...
Безнадзейна рыдала бяз слоў...
Праклінала,
Сябе праклінала,
І жыцьцё, і няўдалых сватоў.

Муж — гультай,
І на ніве, і ў клеці
Пустата... недарод... неўмалот...
«З-пад чужое рэдакцыі дзеці»
У яе прыбывалі штогод.
Што за проза?!
І сьлёзна, і горна...
І міжвольна заплакаць гатоў...
Але што?!
Не журыся, Кляшторны,
На закаце юнацкіх гадоў.

<...>

1927

У ВЁСЦЫ

Я зноў у вёсцы...
Ружай пунсавее
На захадзе марозная зара.
На тысячу ладоў вясёлыя завеі
Зьвіняць над стрэхамі астыглага двара.

У хаце пыл...
У хаце многа лому...
Скрыпіць мароз у сьлесакох дзьвярэй...
Малоціць певень цёртую салому
І корміць зернямі прысадзістых курэй.

У сэрцы сум...
І слодыч успамінаў...
Люблю драмаць пад шум верацяна...
Люблю, як чэшуць голую асіну
Марозныя вятры ля цёмнага акна.

Але любіць,
Любіць з такім запалам
Ўсё тое, што любіў, я болей не магу...
. . . . . .
Зара пунсовай стужкай дагарае
На мармурова-срэбрыстым сьнягу.

Гусьцее змрок...
Прывабна на загнеце
Карчы сасновыя, палаючы, гараць...
Бяру у рукі новую газэту
І пачынаю голасна чытаць...

А мой сусед
Зяўнуў сабе паволі
І кажа так
(Скрозь драмату і сон):
— Скажы, браток, ці скора нам
Дазволяць
Свабодна ціснуць з брагі самагон.

А без таго
І сьвята, бач, ня сьвята...
Дзяўбнеш паўчарачкі —
Сьвятлей на сьвеце жыць...
Хоць і жывем мы, братка, небагата,
А ўсё прыемна горла прамачыць...

А ў хаце пыл...
А ў хаце многа лому...
Скрыпіць мароз у сьлесакох дзьвярэй...
Малоціць певень цёртую салому
І топча па чарзе прысадзістых курэй...

<...>

Вёска Парэчча. Студзень 1927 г.

КАЛІ АСЯДАЕ МУЦЬ

(Фрагмэнты з паэмы)

Дальнія-блізкія, блізкія-дальнія
Бомы бягуць, заміраюць, бягуць...
Шубы, манто, галіфэ саматкальныя
Ўдоўж па Савецкай снуюць.

А ля касьцёлу жахліва і дзіка
Палі над чашай атручаных кроз
Мёртвыя цені жывой Афрадыты
І мармуровы Хрыстос.

— Хто вы?!
— Абломкі далёкага дальняга,
Госьці аджытых вякоў,
Мы — алькаголь.
Мы — жальба пахавальная,
Мы — гэта сьмерць і любоў.

— Доўга над цемрай сусьвету пануючы,
Шмат нарабіў я крывавых падзей.
Я — гэта Бог,
Я — Хрыстос неіснуючы,
Створаны ў муках людзей.

Я — гэта мара пакорных плебэяў, —
Куплены потым каронай цароў,
Каб захаваць пад сьвятым маўзалеем
Праўду, сумленьне, любоў.

Я — гэта Рым.
Я — антычная Грэцыя.
Я — гэта зброя сьляпога жраца,
Я — ракавая пячаць індульгенцыі,
Я — і нявольнік і цар.

Доўга над цемрай сусьвету пануючы,
Шмат нарабіў я крывавых падзей...
Я — і слуга, і гасподзь неіснуючы,
Праўда і крыўда людзей.

— Я — Афрадыта, багіня каханьня,
Фэйвэрк жывога агня...
Дзе нарадзілася першая тайна,
Там нарадзілася я.

Я не хадзіла к царам на паклоны,
Я не прасіла кароны цароў...
Ў царстве маім не існуе законаў,
Вольнаму птаху няма берагоў.

Там, у антычных аддалях сталецьцяў,
Дзе каранован Хрыстос,
Я напаткала магутныя сеці
З чашай атручаных кроз.

Там, дзе ад раньня туманам кадзілі,
Славячы імя Хрыста,
Я на панэль прадаваць выхадзіла
Цела прыгожых дзяўчат...

Гэй, пры партфэлі, з антычнаю лысінай,
Маеш чырвонцы ці не?!
Бачыш, на вуснах сьцюдзёных напісана:
«Грошы, каханьне і сьмерць».

Дальнія-блізкія, блізкія-дальнія
Бомы бягуць, замiраюць, бягуць...
Шубы, манто, галіфэ саматкальныя
Ўдоўж па Савецкай снуюць.

Гэта абломкі, далёкая спадчына,
Сэрцу бадай не да іх.
Грудзі хвалююць імкненьні гарачыя,
Палкі агонь маладых.

Хтось адыходзіць... Прыходзяць другія
З палкім імкненьнем вясны...
Сьняцца аджытаму сны залатыя,
Толькі дарэмныя сны...

Хто з намі сілу сягоньня памерыць?..
Спыніць хто рух маладых?..
Хай не раўня мы Эўропам, Амэрыкам, —
Заўтра дагонім і іх.

<...>

Пі, цыганка,
Мілая цыганка!

Гэй, буфэтчык, дайце «кюрасо»!..
Прамяняў любімую на шклянку...
Дапівай, цыганка, «крэм д'оранж»!..

Шчасьце сон!..

Дапівай, бяздомная каханка,
Мо гуляем прадапошні раз...

За цыганку,
Сьцёпка, за цыганку

Дапіваем «крэм д'оранж»...
За жыцьцё, за палкія гарэзы,
Каб ярчэй пад сонцам дагарэць...
...А учора чатырох зарэзаў...

Грэх!

— Не зважай, любімы, чарнавокі,
Хай рыхтуюць молайцу пятлю...
Ходзім мы пад месяцам высокім,
А яшчэ пад Д. П. У.

— Так, цыганка,
Шкадаваць аб некім,
Так!..
За пятак зарэзаў чалавека,
За пятак...

Пазаўчора маці каля будкі
З залатым Ісусам на грудзёх
Адвяла сястру у прастытуткі...
...жыцьцё!..

Падымайце куфлі за гарэзы
І за новы труп...
Сёньня маці родную зарэжу
І сястру...

Будзе менш пад месяцам халодным
Жабракоў...
У мяне ні блізкіх, ані родных,
Ні бацькоў...

Пі, цыганка,
мілая цыганка!

Налівайце «Северны лікёр»!..
Войстры нож і трэснутая шклянка —
Наш партнёр. —

Гэта цені вулічнага шчасьця
І турэмных крат.
Кожны горка плакаў і сьмяяўся,
Гледзячы назад.

У душы у кожнага пацёмкі,
Нож і крыж...
Гэта ўсё далёкага абломкі, —
Дальні крык...
(...)

1928

РАСТРАТЧЫК

Скрозь электрычныя агні
Цягнік на поўдзень мераў мілі...
А восень прала туманы
Ды ткала жоўтыя тканіны.

Агульнай ростані імпэт
Пераганяў начныя цені...
Праз вокны кожнага купэ
Глядзелі розныя імкненьні.

Адзін пакінуў дзесьці грым,
Другі — сямейныя клапоты,
А трэці вёз у дальні Крым
Свае няшчасныя сухоты.

Яму так дораг наш пэйзаж
І колер восеньскіх настурцый...
...Сухоты здаў бы у багаж,
Каб да кагосьці зноў вярнуцца.

І нават сонныя агні
Яго тугою затужылі...
Аб розных дзівах на зямлі
Тут разважалі пасажыры.

У кожным русе гаманіў
Грамадзкай думкі горды выраз:
— Няма на сьвеце лепшых дзіў,
Як наша творчая імклівасьць.

Па рэйках стомлены імпэт
Пераганяў уласны стукат...
І толькі нейкае купэ
Хавала нейчы чорны смутак.

Забыўшы нават слодыч сна,
Там нехта хмуры, як магіла,
Стаяў ля чорнага акна
З тугой і дзікаю агідай.

Пад мерны лязгат,
Мерны стук,
Пад перазвоны рэек звонкіх
Яму здалося:
Пара рук
Да шыбы шкла прыстала звонку.

Ён адхіснуўся ад акна,
А потым доўга хмурыў бровы,
Што ўласных пальцаў не пазнаў
На шкле таемны адлюстровак...

Хоць ноч халодная маўчыць,
А ўсё ж дрыжаць яго калені.
— Няўжо няможна уцячы
Ад чорных думак і сумленьня?!

І нават пальцаў тонкі рух
Зрабіўся страшны,
Нібы краты...
Вось імі толькі што глаўбух
Зрабіў заклятую растрату.

А навакола гаманіў
У кожным русе горды выраз:
— Няма на сьвеце лепшых дзіў,
Як наша творчая імкліваць!

А за акном,
А за акном,
Дзе ноч туманы карагодзіць,
Народ крывавым мазалём
Шляхі пракладываў стагодзьдзям.

Радзелі пушчы і лясы,
Між дзікіх сёл,
Між дзікіх шатаў —
Расьлі да неба карпусы —
Асілкі сонечнага заўтра...
. . . . . .

Вагона цёмнае акно
Ён адчыніў кароткім рухам...
І вырваўся магільны стогн
З грудзей растратчыка-глаўбуха.

— Няхай шукаюць там сьляды,
Сьляды зладзейскае растраты...
Я сам сябе для грамады,
Назаўсягды,
Таксама страціў.

Імчы, цягнік,
Імчы хутчэй,
Прымі, зямля, свае дарункі!..
...Крывавы сноп жывых касьцей
На рэйках хруснуў чорным клункам...

А за акном,
А за акном,
Дзе ноч туманы карагодзіць,
Народ крывавым мазалём
Шляхі пракладываў стагодзьдзям.

9-IX-1929 г.



Вольф Рубінчык

і скамарох, і грэшнік

Ізі Харык



Мой курс пракладзены здаўна,
я з карабля сачу прасторы:
няма ні берагу, ні дна,
і я вітаньні шлю праз моры
у далеч, дзе смугі сьцяна,
на сум, па чалавеку хворы.

Ізі Харык і Майсей Кульбак жылі ў адзін час і нават нарадзіліся ў адзін месяц, пісалі на адных і тых мовах (ідыш, часам беларуская), хадзілі па адных і тых вуліцах Менску, працавалі ў адных і тых установах і загінулі адначасова, аднак гэта былі шмат у чым розныя людзі й літаратары, і кожны цікавы па-свойму.




Ізі Харык, 1930-ыя гг.

У 1992 г. літаратар, пэдагог Гірш Рэлес пісаў у нарысе «Лёс кагорты», што першым сярод яўрэйскіх паэтаў БССР 1930-х гадоў велічынёю і талентам ішоў Ізі Харык (неафіцыйна лічыўся «народным»), Майсей Кульбак — другім, Зэлік Аксэльрод — трэцім [7, с. 315–317]. У наш час Харык, выглядае, не такі папулярны, як Кульбак, аднак яго найлепшыя творы дагэтуль запатрабаваныя ў Беларусі, дый у сьвеце.

Ордэр на арышт Харыка 11 верасьня 1937 году падпісаў тагачасны наркам унутраных справаў БССР Барыс Берман, непасрэдна выконваў загад малодшы лейтэнант Шэйнкман, паказаньні выбівалі той самы Шэйнкман і сяржант Іван Кунцэвіч. Заказ на сьмяротную кару ішоў з Масквы, ад наркама Яжова і яго начальнікаў: Сталіна, Молатава і іншых. Судзіла Харыка вайсковая калегія Вярхоўнага суду СССР: Матулевіч, Міляноўскі, Заранаў, Кудраўцаў. Пасяджэньне ўвечары 28 кастрычніка 1937 г. доўжылася 15 хвілін; пасьля такіх абвінавачаньняў, як «удзел у контрарэвалюцыйнай тэрарыстычнай дзейнасьці», вынік быў прадказальны. Як ні дзіўна, вядомыя прозьвішчы амаль усіх тых, хто прыклаў руку да сьмерці паэта. Вядома і тое, што ў менскай турме Харык пасьля катаваньняў страціў адчуваньне рэальнасьці, біўся галавой у дзьверы і гукаў на ідышы *«Far vos?»* — «За што?». Тое чуў паэт Станіслаў Пятровіч Шушкевіч, які сядзеў у суседняй камэры.

Сёньня ў Беларусі жыве хіба толькі адзін чалавек, які бачыў Ізі Харыка і можа падзяліцца ўражаньнямі ад сустрэчаў зь ім, — сын Зьмітрака Бядулі Яфім Плаўнік (1934 г. нар.), які ў маленстве гуляў з сынам паэта, сваім аднагодкам: «Памятаю, як высокваў сам Ізі Харык і гучным голасам нас разганяў, бо мы перашкаджалі...» [13, с. 5]. А вось 20–25 гадоў таму ў Менску яшчэ многія памяталі жывога Ізі Харыка. Маю на ўвазе перадусім яго ўдаву Дзіну (1913?–2003) і Гірша Рэлеса (1913–2004). Першая загадвала бібліятэкай у Менскім аб'яднаньні яўрэйскай культуры (МОЕК) імя Ізі Харыка, другі вёў у гэтай суполцы курсы ідышу. Яны часта апавядалі пра паэта, а ўспаміны Дзіны Звулаўны пад назвай «Яго сьветлы вобраз» не аднойчы публікаваліся (найпаўнейшы варыянт, запісаны яшчэ ў 1980-х гадах пры дапамозе Рэлеса, — у віцебскім часопісе «Мишпоха»).



Форма № 30

Военная Коллегия
Верховного Суда
Союза ССР

9 августа 1956 г.
№ 4н-07584/56

Москва, ул. Воровского, д. 13.

СПРАВКА

Дело по обвинению ХАРИКА Исаака Давидовича пересмотрено Военной Коллегией Верховного Суда СССР 13 июня 1956 года.

Приговор Военной Коллегии от 28-го октября 1937 года в отношении ХАРИКА И.Д. по вновь открывшимся обстоятельствам отменен и дело за отсутствием состава преступления прекращено.

ХАРИК И.Д. реабилитирован посмертно.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬСТВУЮЩИЙ СУДЕБНОГО СОСТАВА
ВОЕННОЙ КОЛЛЕГИИ ВЕРХОВНОГО СУДА СССР
ПОДПОВНИК ЮСТИЦИИ
/ЛИХАЧЕВ/

ак

Даведка аб рэабілітацыі Ізі Харыка. 1956 г.

Пасьля рэабілітацыі паэта ў чэрвені 1956 году імя і творчасьць Харыка даволі хутка вярнуліся ў культурную прастору БССР. Ужо ў 1958 г. выйшла кніжачка яго вершаў у перакладах на беларускую («Выбраныя творы»), а ў 1969 г. — другая, пад рэдакцыяй Рыгора Барадуліна («Выбранае»).

Пра творчасьць Харыка нямала ведалі і ў незалежнай Беларусі — яго юбілеі адзначаліся ў МОЕК і ў Доме літаратара. Да меркаванага яго 100-годзьдзя ў 1998 г. дзяржаўная пошта выпусьціла канвэрт, зьявіўся зборнік вершаў і паэмаў Харыка ў перакладах на расейскую мову («Отсель кричу в грядущие года...»). У 2008 годзе незалежная выдавецкая суполка «Шах-плюс» выпусьціла невялікі зборнік-білінгву на ідышы й беларускай «In benkshaft nokh a mentshn / Туга па чалавеку», куды, апрача вершаў, увайшоў і мой пераклад нарысу Харыка «Лэйзар Шэйнман — бадхен зь Зембіна» (1926), дзе паэт абмаляваў свайго дзеда.

У мінулым стагодзьдзі Ізі Харыка перакладалі на беларускую вядомыя асобы (пералічу толькі народных паэтаў: Рыгор Барадулін, Пятрусь Броўка, Аркадзь Куляшоў, Максім Танк). У нашым стагодзьдзі да перакладу вершаў Харыка пасьпяхова зьвярталіся Андрэй Хадановіч і Ганна Янкута.

Імя Ізі — памяншальная форма ад Іцхак. Паводле пашпарту Харык быў Ісак Давыдавіч. Прозьвішча Харык — або ад імя Харытон, што малаверагодна, бо яўрэяў так амаль не называлі, або скарачэньне ад «Хатан рабі Ёсэф-Калман», г. зн. зяць рабіна Ёсэфа-Калмана. Харыкаў было многа на Барысаўшчыне — у прыватнасьці, у Зембіне, родным мястэчку паэта.

У многіх савецкіх і постсавецкіх крыніцах пазначана, што Ізі Харык нарадзіўся ў 1898 годзе, і сам ён называў гэтую дату, напрыклад, у 1936-м, калі запаўняў прафсаюзны білет.

Аднак матэрыялы НКВД сьведчаць пра іншае: Харык нарадзіўся на два гады раней, у 1896-м. Тыя матэрыялы бачыў краязнавец-юрыст Аляксандар Розэнблюм, чалавек уедлівы, якому давяраю. Рэлес таксама спасылаўся на пастанову НКВД, дзе згаданы 1896 год нараджэньня [9, с. 26].

Разыходжаньне можа тлумачыцца тым, што Ізі Харык у 1932 г. пазнаёміўся, а ў 1933 г. ажаніўся зь Дзінай Матлінай, значна маладзейшай ад яго, і хацеў «падмаладзіцца». Ва ўспамінах Дзіны Харык ёсьць згадкі пра тое, што паэт сьпярша крыху саромеўся ісьці зь ёю побач: *«Для бацькі я, бадай, замалады, а для мужа быццам бы стары»* [10, с. 56].

Ізі Харык паходзіў зь незаможнай сям'і, бацька працаваў шаўцом, а пазьней, імаверна, сталяром. Гэтак адзначыў сам Харык у анкеце 1923 году, калі вучыўся ў Маскве [12, с. 78].

Пра заняткі Харыка да рэвалюцыі 1917 году ў даведніках гаворыцца, што ён вучыўся ў хедары, потым у расейскай народнай школе Зембіна. Працаваў рабочым на фабрыках і заводах Менску, Барысава, Гомля. Калі больш канкрэтна, то вядома, што Харык пёк хлеб. Як сьведчыць той самы Аляксандар Розэнблюм са словаў сваёй маці, Харык вучыўся ў Харкаве на фармацэўта, а потым працаваў аптэкарам ці нават загадчыкам аптэкі ў Барысаве (на самым пачатку 1920-х гадоў), але тое цягнулася нядоўга [6].


ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫ САЮЗ РАБОТНІКАЎ ВЫДАВЕЦТВАЎ
«профессиональный союз работников издательств

ЧЛЕНСКІ БІЛЕТ
ЧЛЕНСКИЙ БИЛЕТ

№048644

ПРОЗВІШЧА Харык
ФАМИЛИЯ

ІМЯ, ПА-БАЦЬКУ Давідавіч
ИМЯ, ОТЧЕСТВО

ГОД НАРАДЖЭННЯ 1898 г.
ГОД РОЖДЕНИЯ

ПРАФЕСІЯ пісьменнік
ПРОФЕССИЯ

ВЫТВОРЧЫ СТАЖ 1914 г.
ПРОИЗВОДСТВЕННЫЙ СТАЖ

ГОД УСТУПЛЕННЯ Ў САЮЗ 1917 г.
ГОД ВСТУПЛЕНИЯ В СОЮЗ

ГОД УСТУПЛЕННЯ Ў ДАНЫ САЮЗ 1934 г.
ГОД ВСТУПЛЕНИЯ В ДАННЫЙ СОЮЗ

ПОДПІС ЧЛЕНА САЮЗА
ПОДПИСЬ ЧЛЕНА СОЮЗА

НАЗВА ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ Цэнтрком
НАИМЕНОВАНИЕ ПРОФОРГАНИЗАЦИИ пісьменнікаў Б.С.С.Р.

ДАТА 10 жн Жніўня 1936 г.
ДАТА

Членскі білет Прафэсіянальнага саюзу работнікаў выдавецтваў на імя Ізі Харыка. 10 жніўня 1936 г.

Дом у Зембіне (зьнесены ў 2001 г.), дзе нарадзіўся і вырас І. Харык. Справа стаіць Дзіна Харык. Фота 1960-х гг.



У 1917 г. Харык пасяліўся ў Менску і адразу ўключыўся ў грамадзкае жыцьцё. Быў прафсаюзным актывістам, бібліятэкарам, настаўнікам; на нейкі час далучыўся да сіяністаў. Аднак у 1919 годзе добраахвотна запісаўся ў Чырвоную армію, дзе тры месяцы служыў санітарам у час польскай кампаніі. Адгэтуль ён паводзіўся ўжо як ляяльны савецкі чалавек, і ў 1920 годзе першыя яго вершы публікуюцца ў маскоўскім ідышамоўным часопісе з характэрнай назвай — «Dy komunistishe velt» («Камуністычны сьвет»). Гэта рытарычныя, ідэалягічна вытрыманыя практыкаваньні на тэму «Мы і яны». Вось падрадкоўнік першага куплету аднаго з тых вершаў: *«Агонь і дым, дым і агонь! / Цэлыя моры агню. / Бух і бах, яшчэ ўдар — / Куйся, новае жыцьцё»*. Зьмест іх тыповы для таго часу — шмат падобных твораў спарадзіў, напрыклад, вядомы расейскі паэт Аляксандар Безыменскі.

На самаразьвіцьцё Ізі Харыку было адпушчана 17 гадоў. Многа ці мала? Як паглядзець. У тую эпоху ўсё мянялася хутка, людзі былі дынамічныя... Гады творчасьці Харыка ўмоўна падзялю на тры пэрыяды:

I. Падрыхтоўка да ўздыму (1920–1924).

II. Уздым (1924–1930).

III. Стагнацыя (1930–1937).

I. Першы пэрыяд — самы цьмяны, мала асьветлены ў літаратуры. Праўда, крытыкі заўсёды згадваюць першую кніжку Харыка «Tsyter», што ў перакладзе зь ідышу значыць «Трапятаньне». Але зьмест яе сур'ёзна не аналізавалі, дый сам аўтар пазьней не перавыдаваў вершы зь яе. Часам даводзіцца чытаць, што Харык падпісаў першы зборнік псэўданімам «Ізі Зембін». Але насамрэч жа ў 1922 годзе Харык ужо не саромеўся сваёй творчасьці, на вокладцы стаіць яго сапраўднае прозьвішча.

У кніжачцы, што выйшла ў Менску пад эгідай «Культур-лігі», усяго 32 старонкі, 19 твораў. Рыгор Бярозкін называў вершы, зьмешчаныя ў ёй, то эстэцка-безыдэйнымі, то нежыцьцёва пераймальнымі, «як ня з гэтага сьвету». На мой погляд, яны, магчыма, наіўныя, але шчырыя, у іх няма хадульнай рыторыкі.

У тым самым 1922 годзе выйшла першая кніжачка Зэліка Аксэльрода. Яны настолькі сябравалі з Харыкам, што і назва была падобная: «Tsapl» (таксама «Трымценьне», «Трапятаньне»). Харык адзін верш прысьвяціў Аксэльроду, а Аксэльрод — Харыку, такое ў іх было «перакрыжаванае апыленьне». Абодва яны ў той час былі вучнямі Элі Савікоўскага, беларускага яўрэйскага паэта, які заявіў пра сябе яшчэ да

рэвалюцыі, але актывізаваўся ў канцы 1910-х — пачатку 1920-х. У яго паэзіі было шмат футурыстычных матываў, захапляўся ён і сымбалізмам.

Савікоўскі працаваў у менскай ідышамоўнай газэце «Der veker» і падбадзёрваў моладзь, каб яна вучылася далей. Магчыма, зь яго лёгкай рукі Харык і Аксэльрод паехалі ў Маскву, у Вышэйшы літаратурна-мастацкі інстытут. Але спачатку Ізі Харык спрабаваў вучыцца ў БДУ на мэдычным факультэце. У 1921-м паступіў, у 1922 г. кінуў; відаць, адчуў, што мэдыцына — гэта не яго шлях.

Харыка дэлегаваў у Маскву народны камісарыят асьветы ССРБ, дзе ён тады працаваў. Але дзіўна, што стыпэндыі студэнт зь Беларусі ня меў, а толькі 31 рубель за працу ў Яўрэйскай цэнтральнай бібліятэцы, што мала нават на тыя часы. Можа, таму няма вершаў за 1923 год, прынамсі, я ня бачыў. Затое з 1924 г. пачынаецца хуткі ўздым Ізі Харыка як літаратара...

II. Невялікае адступленьне. У першыя гады савецкай улады вызвалілася мноства пасадаў і зьявіліся новыя. Пасьля грамадзянскай вайны моладзь масава кінулася вучыцца... Брыгадзіры, начальнікі вытворчасьці, дырэктары школ, рэдактары газэт і часопісаў, сакратары райкамаў, загадчыкі палітаддзелаў — усё гэта было даступна для тых, хто паходзіў з рабочых, ва ўсякім разе «небуржуазных», сем'яў. Голасам той яўрэйскай моладзі, якая зьдзейсьніла рывок па сацыяльнай лесьвіцы, і стаў Ізі Харык. Мала каго ў той час хвалявала крыважэрнасьць новай улады і тое, што ў СССР ужо дзейнічалі канцлягеры. Тыя ж Салаўкі, як тады лічылася, былі часовай установай для «закаранелых ворагаў».

У 1930-х гадах «новая эліта», вылучэнцы 1920-х (незалежна ад паходжаньня — яўрэі, беларусы, расейцы...), сама трапіць пад рэпрэсіі, якія ігнаравала раней. Харык ня ведаў пра чорную будучыню, але быццам бы адчуваў, што яго пакаленьне — пад пагрозай, што яно, як той маўр, зробіць сваю справу і сыдзе. У яго вершы 1925 г. ёсьць трывожныя радкі: *«Мы першыя цагліны закладалі, / і кожны ў мур цаглінай лёг жывой»* (пераклад Аркадзя Куляшова), і заклік да нашчадкаў: *«Крылатыя, не карануйце нас!»*. Або ў іншым вершы: *«Век настане такі: ўсім на зайздрасьць вякам, / Ані я, ані ты — будуць іншыя там... / Мы жылі у нянавісьці, у барацьбе. / Ой ты, шчасьце маё, я ня варты цябе»* (пераклад Рыгора Бярозкіна).

Матываў клясавай барацьбы ў Харыка, нават у зорны час яго творчасьці, не бракавала. Яны дамінуюць, напрыклад, у першай яго паэме «Менскія балоты» (1924), дзе Піня-страхар, які вырас на ўскраіне Менску ў галечы, ненавідзіць буржуяў з цэнтру гораду... Процістаўленьне «мы» і «яны» праводзіцца таксама ў паэме «Катрынка» (1925). Там рабочы хлопец зьвяртаецца да дзяўчыны, якая «зьмяшчанілася»: *«Мовай*



Ізі Харык (справа) зь сябрам. Канец 1910-х гг.

грэбуеш нашай, няйначай, / Называй хоць жаргонам яе, / Ты астыла да песень гарачых, / Ад якіх навакольле пяе... / Ад Ахматавай сэрцам збалела / І ніяк не забудзеш радкі: / „Я на правую руку надела / Перчатку с левой руки“» (пераклад Генадзя Кляўко). Герой дае зразумець, што каханьня з такой дзяўчынай у яго ня выйдзе. Цікава, што пасьля рэабілітацыі Харыка якраз Анна Ахматава, сярод іншых, перакладала яго на расейскую мову.

У іншых творах сярэдзіны 1920-х гадоў Харык зычыць старому мястэчку зьнікнуць. Ён шчыра верыць, што сапраўднае жыцьцё — у калгасах або ў буйных гарадах, апявае трамвай, кіно, дабраслаўляе час, калі ўпершыню спаткаўся з горадам... Вершы гэтыя вельмі аптымістычныя, скрозь і ўсюды відаць, што аўтару хочацца жыць напоўніцу. У 1926 г. Харык пісаў: *«Я адчуваю горад аж да сьлёз, / Да трапяткога, палкага дыханьня»* (пераклад Пятра Глебкі).

А ў адной з найлепшых паэмаў Харыка «Адданасьць» (1927 г.; у арыгінале «Mit lajb un lebn», г. зн. «Душой і целам») маладая настаўніца змагаецца з адсталасьцю мястэчка і ўрэшце памірае ад хваробы, аднак аўтар дае зразумець, што праца не пайшла ў глум, што наступнай настаўніцы будзе ўжо лягчэй. Урыўкі з гэтай паэмы пераклаў Рыгор Барадулін і ўключыў іх у сваю кнігу 2011 г. «Толькі б яўрэі былі!..».

У 1920-я гады Харык напісаў нямала «апалітычных» вершаў. Некаторыя пераплеценыя зь біблійнай традыцыяй, мо нават больш, чым ён сам усьведамляў. Напрыклад, верш пра сад... Гэта адзін з улюбёных вобразаў яўрэйскіх паэтаў, падобныя творы ёсьць у Хаіма Нахмана Бяліка, Майсея Кульбака. Харык жа ў лютым 1926 г. намаляваў уласную ўтопію (*гл. пераклад Ганны Янкуты*).



Ізі Харык, 1920 г.

Юрка Гаўрук слушна адзначаў, што Ізі Харык быў вельмі чулы да паэтычнай формы. Нягледзячы на патас — часам дарэчны, а бывала, збыткоўны — вершы і паэмы Харыка амаль заўсёды музыкальныя, што вылучала яго з масы іншых вершатворцаў таго часу. Агулам, калі Майсей Кульбак меў асаблівы нахіл да тэатру, то Ізі Харык — да музыкі. Можа быць, гэты нахіл меў карані ў дзяцінстве — так ці іначай, вершы і ўрыўкі з паэмаў Харыка лёгка ператвараліся ў песьні. Прыкладам могуць быць «Песьня сялян» і «Калыханка» з паэмы «Brojt» («Хлеб») 1925 г., пакладзеныя на музыку Самуілам Палонскім — яны выконваліся па ўсім Савецкім Саюзе, дый за яго межамі.

Паэма «Хлеб» створаная на беларускім матэрыяле. Калі Харык прыехаў на радзіму з Масквы ў час вакацыяў, ён наведаў яўрэйскі калгас у Скупліне пад Зембінам. У 1920-х і пачатку 1930-х тэма перасяленьня яўрэяў у сельскую мясцовасьць была надзвычай актуальная, і паказаў яе Харык жыва, рэалістычна. Вось маці зьвяртаецца да малога: *«Наша ніва не пасьпела, / Родны хлопчык мой. / Ды ваюе бацька сьмела / З чорствай цаліной. / Цяжка ён ідзе за плугам, / Крыва сьцеле сьлед. / Табе ж праца стане другам, / Домам — гэты сьвет»* (пераклад Сьцяпана Гаўрусёва).

Аднакурсьніца Харыка ў Маскоўскім літаратурным інстытуце Соф'я Рохкінд (1903–2000) апавядала мне ў 1997 г., што Харык з Аксэльродам глядзелі на інстытут як на прахадны двор, вучыліся абы з рук, часам задавалі выкладчыкам пытаньні зусім не па тэме лекцыяў. Мяркую, рэч была не ў ляноце, а ў тым, што Харык быў ужо ўвесь захоплены паэзіяй. У 1926 годзе выйшла яго другая кніга «Af der erd» — «На (гэтай) зямлі».

Пасьля гэтага ён стаў выдавацца даволі часта, ледзь не штогод па кнізе. Ягоныя творы друкавалі ў хрэстаматыях, уключалі ў падручнікі (перадусім дзяржаўных яўрэйскіх школаў). Сучасьнікі сьведчаць, што вучні ахвотна вучылі ўрыўкі на памяць.


У тыя ж гады Харык пачаў перакладаць зь беларускай на ідыш. Першым буйным творам стала паэма Міхася Чарота «Карчма» (пераклад зьявіўся ў менскім часопісе «Штэрн» у 1926 г.). Паэмы «Карчма» і «Хлеб» сюжэтна блізкія, у іх ідзецца аб заахвочваньні «старарэжымных» яўрэяў (гандляроў і карчмароў) да працы на зямлі, дый у біяграфіях Чарота і Харыка, якія былі сярод першых «пралетарскіх» паэтаў савецкай Беларусі, нямала супольнага. І пазьней, як паведамляла Дзіна Харык, «яму імпанавала паэзія Міхася Чарота, Уладзімера Хадыкі, Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Юлія Таўбіна і інш.» [10, с. 62].

У 1928 годзе Харык вярнуўся ў Менск, пачаў працаваць сакратаром у рэдакцыі ідышамоўнага часопісу «Штэрн»... І сутыкнуўся з жыльлёвай праблемай, якая стаяла тут, магчыма, вастрэй, чым у Маскве. Спачатку Харык (зь цяжкасьцямі) атрымаў кватэру, але потым, калі паехаў службова ў Бабруйск, апынуўся ледзь не на вуліцы празь нейкага судзьдзю Рыўкіна... У студзені 1929 г. адказны сакратар Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў Янка Ліманоўскі заступіўся за свайго непрактычнага калегу. Ён пісаў у «Зьвязду»: «Рыўкін узарваў дзьверы кватэры т. Харыка і ўвабраўся туды» (05.01.1929). Было нават дзьве публікацыі пра «жыльлёвае пытаньне», другая (16.01.1929) называлася «Яшчэ пра зьдзекі з тав. Харыка».

Пракуратура спачатку палічыла, што фармальна судзьдзя меў рацыю. Але ў рэшце рэшт усё наладзілася, Харык здабыў жытло недзе ля Нямігі, а ў сярэдзіне 1930-х гг. усяліўся з жонкай у новы, элітны Дом спэцыялістаў (вул. Савецкая, 148, кв. 52 — цяпер на гэтым месцы будынак, дзе месьціцца рэдакцыя «Вечернего Минска»). Аднак пражылі яны там нядоўга.

Менскі пэрыяд у жыцьці Харыка быў плённы ў тым сэнсе, што ён стварыў сям'ю. У канцы жніўня 1932 г. ён пазнаёміўся зь юнай выхавальніцай дзіцячага садка Дзінай Матлінай, у 1933 г. яны ажаніліся. У 1934 г. нарадзіўся першы сын Юлік, у 1936-м — Давід. Ізі Харык вельмі любіў сваіх дзяцей. Ніхто тады ня ведаў, што бацькоў арыштуюць увосень 1937 г., а сыны трапяць у дзіцячы дом НКВД і зьнікнуць у вайну. Хутчэй за ўсё, яны загінулі. Пасьля вяртаньня ў Менск і рэабілітацыі Дзіна Харык так іх і не дачакалася.

У творчым жа пляне найбольш плённым выявіўся менавіта маскоўскі пэрыяд — і, бадай, першыя пару гадоў менскага. Тады, у 1928–1929 гг., Харыка віталі ва ўсіх мястэчках, куды ён прыяжджаў з чытаньнем сваіх твораў — ён быў папулярны ў Беларусі, не раўнуючы як Яўген Еўтушэнка ў СССР 1960-х. Напрыклад, Юрка Гаўрук успамінаў: «Мне давялося прымаць удзел у адным з такіх вечароў. Гэта было ў Горках у 1928 годзе. Ізі Харыка запрасілі выступіць у яўрэйскай школе. Там яго сустрэлі як дарагога госьця. Ніколі не забуду той атмасфэры давер'я, любові й пашаны, якая адразу ж устанавілася паміж паэтам і яго слухачамі. Ізі Харык чытаў многа, зь вялікім уздымам. Яго гучны, выразны голас зь явучай інтанацыяй, яго запал, аптымізм, публіцыстычная вастрыня вершаў літаральна зачаравалі слухачоў. Ізі Харык быў як у роднай сям'і...» [2].



Вокладка кнігі Ізі Харыка. «Вершы і паэмы». Менск, 1934.

З другога боку, паэт яшчэ быў не абцяжараны адказнымі пасадамі, больш-менш вольны ў выбары тэмаў. Праўда, і ў пэрыяд уздыму Харыку выпадала пісаць «каньюнктурныя» вершы — напрыклад, панэгірык органам палітычнага вышуку ў 1927 годзе [11].

Культуролаг мянчанка Інэса Ганкіна трапна зазначыла: «Скразная тэма паэзіі Харыка 20-х гадоў можа быць абазначана як антытэза „старое — новае" або „мястэчка — горад". Пры беглым знаёмстве з тэкстамі ствараецца ўражаньне аб тым, што лірычны герой безумоўна аддае перавагу апошняму перад першым. Але ўсё ня так проста. У цыкле „Ў тваіх хацінках" (1925) настрой аўтара пастаянна мяняецца ў дыяпазоне ад нянавісьці да любові. Мястэчка зь яго вуліцамі і хатамі, водарам яблыкаў і мядовай сьвечкі — аб'ект амбівалентных эмацыйных перажываньняў» [4]. На згаданыя вершы раней зьвярнуў увагу і расейскі літаратуразнавец Леанід Кацыс: «І ўсё ж, як ні спрабаваў паэт сысьці ад самога сябе, туга па старым мястэчку праточвалася ў настальгічных вершах. Часткова па-сьвятлоўску, часткова паясенінску, ён зноў і зноў шкадуе яго ў цыкле „Ў тваіх хацінках"» [5].

III. Пра пэрыяд стагнацыі, які пачаўся прыкладна ў 1930-м. У 1930-я гады Харык стварыў нямала добрых вершаў, яго па-ранейшаму горача сустракалі чытачы ў мястэчках. Але кідаецца ў вочы і таптаньне на месцы ў выбары паэтычных сродкаў, і занадта ўжо імпэтнае выкананьне сацыяльнага заказу (што таксама зьбліжае Харыка з Чаротам, дый тым жа Безыменскім).

У 1929-м Сталін даціснуў апазыцыю ў палітбюро, згарнуў НЭП і пачаў масавую калектывізацыю, г. зн. у грамадзтве зьнішчаліся нават кволыя парасткі аўтаноміі. 1930-ы — першы год махровага сталінізму. У Беларусі НКВД раскруціў справу «Саюзу вызваленьня Беларусі», па якой арыштавалі звыш 100 чалавек, у тым ліку многіх беларускіх літаратараў.

Кніга Ізі Харыка «Вершы і паэмы» з партрэтам аўтара. Менск, 1934



Для Харыка той год пачаўся з артыкула пад красамоўнай назвай: «Неделя Советской Белоруссии наносит сокрушительный удар великодержавным шовинистам и контрреволюционным нацдемам» (газэта «Рабочий», 07.01.1930). У наступныя гады ён напіша — або падпіша — яшчэ не адзін падобны артыкул.

У 1930-м годзе Харык пачынае паэму «Kajlekhdyke vokhn», вядомую ў беларускім перакладзе як «Круглыя тыдні». Гэта гімн сацыялістычнаму ператварэньню Палесься, камуністам і ГПУ. Фігуруюць у паэме, што выйшла асобнай кніжкай у 1932 г., і шкоднікі. Янка Купала створыць аналягічную агітпаэму («Над ракой Арэсай») толькі ў 1933-м. Мажліва, рэч у тым, што менавіта ў 1930-м Харык становіцца членам бальшавіцкай партыі, адказным рэдактарам часопісу «Штэрн», і лічыць сябе абавязаным ісьці ў нагу з часам, а то і бегчы папярод цягніка.

У 1933–1934 гадах зьяўляецца новая паэма Ізі Харыка — дзіцячая «Fun polus tsu polus» («Ад полюсу да полюсу»). У ёй піянэрам даверлівым тонам апавядаецца пра будаўніцтва Беламорканалу, перакоўку былых злодзеяў, ролю таварыша Сталіна і таварыша Фірына (аднаго з начальнікаў каналу). Аўтар зноў усхваляе карныя органы, якія нібыта «перавыхоўваюць» вязьняў, — зрэшты, ня ён адзін быў такі, сярод беларускіх пісьменнікаў аналягічны твор ёсьць у Міхася Лынькова (апавяданьне «Баян»). Паэма была выдадзена асобнай кніжкай з ілюстрацыямі Марка Жытніцкага і атрымала прэмію на ўсебеларускім конкурсе дзіцячай кнігі.

У 1931 г. Ізі Харыка прызначаюць чальцом Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР, г. зн. квазіпарлямэнту. У 1934-м ён узначальвае яўрэйскую сэкцыю навастворанага Саюзу пісьменьнікаў БССР, уваходзіць у прэзыдыюм Саюзаў пісьменьнікаў БССР і СССР. Здавалася б, пасьпяховая кар'ера... Але апетыя ім органы ня дрэмлюць і перад зьездам 1934 г. пішуць даведку: «У вузкім коле выказвае незадаволенасьць партыяй». Харык, дарма што ня жыў на Захадзе і яму не было з чым параўноўваць савецкія варункі, пэўна, адчуваў, што адраджэньне ідышамоўнай культуры ў СССР — у вялікай ступені фікцыя. Пагатоў ён усё ж не жадаў цалкам выракацца сваіх каранёў: як казала мне Дзіна Харык у 2000 г., на Пэйсах паэт прыносіў дахаты мацу.

Тым ня менш у сярэдзіне 1930-х Харык адгукаецца на ўсё, што партыя лічыць важным. Калі ствараецца яўрэйская аўтаномія ў Бірабіджане, ён едзе туды і піша нізку вершаў (някепскіх), уратаваліся палярнікі-чалюскінцы — вітае палярнікаў, у 1936 г. пачалася вайна ў Гішпаніі — у яго гатовы верш і на гэтую тэму, са згадкай гішпанскага прэм'ер-міністра Лярга Кабальлера... З той так званай публіцыстычнай лірыкі дажыла да нашых дзён прыгожая замалёўка «Ноч у Бірабіджане», дзе Далёкі Ўсход параўноўваецца зь белым мядзьведзем (яе перакладалі на беларускую Пятрусь Броўка і Ганна Янкута).

У 1935-м пышна сьвяткуецца 15-гадовы юбілей творчай дзейнасьці Харыка, у 1936-м ён становіцца членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР. Але к таму часу ён ужо надломлены маральна — відаць, яшчэ больш, чым Майсей Кульбак. Харык выракаецца сваіх таварышаў у яўрэйскай сэкцыі СП БССР, якіх арыштавалі перад ім (Хацкель Дунец, Арон Юдэльсон). Рэдагаваны ім часопіс «Штэрн» поўніцца заклікамі да бальшавіцкай пільнасьці й выкрыцьця ворагаў.

У той жа час Харык, паводле ўспамінаў Яўгена Ганкіна і Гірша Рэлеса, дужа клапаціўся пра маладых паэтаў, дапамагаў ім як мог. Рэлесу, напрыклад, дапамог утрымацца ў Менскім пэдагагічным інстытуце, калі ў сярэдзіне 1930-х (хутчэй за ўсё, у 1934 г.) на студэнта быў напісаны данос аб тым, што яго бацька — былы настаўнік у хедары, «лішэнец» (пазбаўлены выбарчых правоў праз «клясавае паходжаньне»). Апрача таго, «Ізі Харык заўсёды заступаўся за Аксэльрода і ня раз выручаў яго зь бяды» [8, с. 242].



Тытульны аркуш кнігі Харыка «На чужым балі». Менск, 1936 г. Мастак Цфанія Кіпніс

Лебядзінай песьняй Харыка робіцца паэма «Af a fremder khasene» («На чужым балі» або «На чужым вясельлі») пра трагічны лёс бадхена, вясельнага маршалка, якога выганяюць зь вясельля за праўду, цкуюць у мястэчку, ён блукае па вёсках, лясах з катрынкай і ўрэшце замярзае ў сьнезе. Час дзеяньня — першая палова XIX стагодзьдзя, калі жывы быў легендарны ў Менскай губэрні разбойнік Бойтра, якому бадхен са сваімі музыкамі яўна спачуваюць, бо ён рабуе багацеяў... Галоўнага героя завуць Лэйзар, як і дзеда Ізі Харыка. Праўда, лёс дзеда быў не такі трагічны, яго нават выбіралі ў Зембіне мяшчанскім старастам, дый дажыў ён да 1903 г., але некаторыя рысы падабенства ў героя і ягонага прататыпа відавочныя (любоў да дзяцей, схільнасьць да выпіўкі).

Некаторыя нашыя сучасьнікі ўбачылі ў паэме эзопаву мову: маўляў, Харык імкнуўся паказаць ня дзедава, а сваё паднявольнае становішча ў сярэдзіне 1930-х гадоў. Але, на маю думку, аўтар



Ізі Харык з Саламонам Міхоэлсам (крайні справа). Масква, 1935 г.



Партрэт Ізі Харыка на помніку ахвярам сталінскіх рэпрэсіяў ад беларускіх габрэяў у Курапатах, дзе, магчыма, паэт пахаваны. Фота Сяргея Будкіна

«проста» выкрываў цяжкі лёс творчай асобы ў даўнія часы — сьледам за Янкам Купалам («Курган»), Якубам Коласам («Сымон-музыка»), Зьмітраком Бядулем («Салавей»). Калі ў падсавецкім «Салаўі» (1927) і ёсьць «дуля ў кішэні», то яна глыбока схаваная; ня бачу прычын трактаваць «На чужым балі» іначай.

Як бы ні было, паэма «На чужым балі» — твор каштоўны, шкада, што не перакладзены цалкам на беларускую. Ён паліфанічны, цудоўна апісаныя краявіды, местачковыя характары. Багата ў паэме і гумару, асабліва ў дыялёгах бадхена з жонкай Цыпай. Нямала ў творы беларусізмаў: напрыклад, *«asilek»*, *«ranitse»*, *«valatsuhe»*, *«huliake»*. Гэтыя словы для нарматыўнага ідышу не былі характэрныя. Тэкст выдатна дапаўнялі «мінімалістычныя» малюнкі Цфаніі Кіпніса.

Рыгор Барадулін казаў у пачатку 1990-х: «Паэт Ізі Харык блізкі і свайму яўрэйскаму чытачу, якога ён чаруе непаўторным гучаньнем ідыш, і беларускаму, які бачыць сваю Беларусь вачыма яўрэйскага паэта» [1, с. 19], маючы на ўвазе найперш гэтую паэму.

У перадапошні год жыцьця Харык прыклаў руку да вершаванага ліста «Вялікаму Сталіну ад беларускага народу» (лета 1936 г.). Ён быў адным з шасьці аўтараў, побач з Андрэем Александровічам, Петрусём Броўкам, Пятром Глебкам, Якубам Коласам, Янкам Купалам. Але ж гэты сэрвільны твор не ўратаваў Харыка, гэтаксама як сяброўства з Купалам (той, паводле Дзіны Харык, называў яго «Ізік» і запрашаў да сябе на чарку).

* * *

Харык быў няпросты паэт і чалавек, які доўга жывіўся ілюзіямі... Усё ж многія яго творы цікавыя дасёньня. Вядома, ён заслугоўвае нашай памяці, і ня толькі праз сваю жудасную і дачасную сьмерць. Справядліва, што ў Зембіне адна з вуліц у 1998 г. была названа яго імем. На жаль, дому ў цэнтры мястэчка, дзе нарадзіўся паэт, ужо няма; ён зьнесены ў верасьні 2001 г., нягледзячы на хадайніцтвы жыхароў Беларусі і Ізраілю.

Даволі нечакана Харык «усплыў» у мастацкім творы 2005 г. Уладзіслава Ахроменкі й Максіма Клімковіча «Янкі, або Апошні наезд на Літве». Адзін з пэрсанажаў «кінараману-фарсу» кажа: «Нешта ты сёньня занадта патасны!». Другі падтаквае: «Як малады Ізя Харык на вечарыне ўласнай паэзіі!». Гэткае забаўнае параўнаньне чарговы раз даказвае, што паэт не забыты.

Варта было б Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі да 125-годзьдзя Майсея Кульбака і Ізі Харыка (сакавік 2021 г.) правесьці канфэрэнцыю, прысьвечаную гэтым паэтам ды іх атачэньню. А на менскай вуліцы Рэвалюцыйнай, 2, дзе ў 1930–1941 гг. знаходзілася рэдакцыя часопісу «Штэрн», добра было б павесіць памятную шыльду, каб там былі пазначаны і Кульбак, і Харык, і Зэлік Аксэльрод, арыштаваны і расстраляны органамі НКВД ужо ў 1941-м. Ініцыятыва ўшанаваньня была ўвесну 2018 г. падтрыманая Беларускім фондам культуры [3].[1]

[1] Аднак Менгарвыканкам 28 чэрвеня 2018 г. (рашэньне № 2188) зацьвердзіў наступны тэкст: «У гэтым будынку ў 1930–1941 гг. знаходзілася рэдакцыя беларускага яўрэйскага часопіса «Shtern» («Зорка»), з якім супрацоўнічалі вядомыя пісьменнікі».

Літаратура

1. *Барадулін Р.* Толькі б яўрэі былі!..: Кніга павагі і сяброўства. — Мн.: Кнігазбор, 2011.

2. *Гаўрук Ю.* Сэрца, раскрытае насцеж: Да 70-годдзя Ізі Харыка // ЛіМ. 1968. 15 сак.; The History of Belarussian Jewry [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.beljews.info/kharik_bel.html.

3. *Дубінін А., Рубінчык В.* Часопіс «Штэрн» // Беларускі Фонд Культуры. Краязнаўчая газета [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://bfk.by/?p=6225.

4. *И. Ганкина о еврейской литературе межвоенного времени* (1) (2018) // Belisrael: Незалежны ізраільскі сайт: [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belisrael.info/?p=15150.

5. *Кацис Л.* Изи Харик // Лехаим. 2007. № 3. [Электронны рэсурс]. Режым доступу: https://lechaim.ru/ARHIV/179/ozhslovo.htm.

6. *Рубинчик В.* Лекция об Изи Харике (2017) // Belisrael: Незалежны ізраільскі сайт: [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://belisrael.info/?p=12721.

7. *Релес Г.* В краю светлых берез. — Мн.: Изд. Э. С. Гальперин, 1997.

8. *Рэлес Р.* Праз скрыжаваны агонь // Полымя. 1995. № 8.

9. *Рэлес Г.* Яўрэйскія савецкія пісьменнікі Беларусі: Мемуары. — Мн.: Логвінаў, 2004 / ідыш.

10. *Харик Д.* Его светлый образ // Мишпоха. 2000. № 7.

11. *Харык І.* ГПУ: [Верш] // Акцябер. 1927. 5 жн. / ідыш.

12. *Харык І.* Туга па чалавеку: Вершы. — Мн.: Шах-плюс, 2008 / ідыш, бел.

13. *Яфім Плаўнік:* «Вызначыцца з мовай Змітраку Бядулю дапамог Якуб Колас» // Маладосць. 2016. № 4.

* * *

Сын з горам вярнуўся, о Божа!..
У сына зрасьліся бровы.
І маці пазнаць ня можа
Вачэй яго сумных, суровых...

Калісьці быў сын дурасьлівым,
Падобным да жарабяці,
Цяпер жа глядзіць тужліва,
Ня знае, што думаць, маці.

Ёй вельмі балюча стала,
Што зараз нічога ня зьменіць.
Чаму ён чужы і сталы,
Чаму яму бліжай усіх Ленін?

І будзе ўглядацца старая
У сынавы вочы штохвілі,
Як студня замшэлая тая,
Ў якой усе вёдры ўтапілі.

1924
Пераклад Яўгена Шабана

* * *

Ня трацьце сябе ў паняверцы,
Ні сілы, ні веры на шчасьце.
Здаецца, ня зможаш памерці,
Калі маеш добрае сэрца
Для вылету з вокнамі насьцеж.

Я радасьць сваю параўнаю
Хіба што з крыніцай бруістай.
Ня дам яе выветрыць маю,
Закідаць асеньняму лісту.

Яе не ўтаптаць у траву.
Разьбіце мне лепш галаву,
Чым вокны у сэрцы агністым.

Маёй сівізны халады
Спыніць мяне будуць ня ў стане.
Прайду праз жыццё маладым!
Ты чуеш, зямля, маладым,
Пакуль маё сэрца ня стане!

1925
Пераклад Уладзімера Паўлава

* * *

Век настане такі:
ўсім на зайздрасьць вякам,
Ані я, ані ты — будуць іншыя там...

Мне ўсё роўна:
ён знойдзе, мой сын, альбо не —
Акрываўлены камень у чыстай сьцяне.

Мы жылі у нянавісьці, у барацьбе.
Ой ты, шчасьце маё, я ня варты цябе.

Ноч за ноччу мінае, дні ідуць чарадой.
Калі што застанецца, дык наш непакой.

Калі што застанецца, дык вецер, які
Нас узносіў у будучыя вякі.

1925
Пераклад Рыгора Бярозкіна

* * *

Мы валім лес, вясёлыя сябры,
Пілуем дрэвы і на плашкі колем.
І што разгневан намі бор стары —
Аб гэтым мы ня думаем ніколі.

Мы валім лес, і наша праца ў нас —
Як бохан добра сьпечанага хлеба.
Ня можам мы бяздумна бавіць час,
Бо ў росквіце стварыць жыццё нам трэба.

Мы валім лес і чуем дужасьць рук,
Штодня мацней, штодня гучней іх сіла.
Падняў тапор — і гойкнуў цьвёрды сук,
І дуб ляціць, як скошаны асілак.

Падняў тапор — і крыкнуў нема бор,
Дубовы крык, сасновы крык і гоман...
А нам — усё шырэй, шырэй прастор,
А мы — як быццам і ня чуем стомы.

1926
Пераклад Кастуся Кірэенкі

* * *

У нашым садзе не сустрэць нікога,
каго завабяць прывіды нуды,
каго заманіць ціша і зьнямога —
у нашым садзе зелені аблога,
а ў зелені хаваюцца плады.

Шуміць тут вецер, і жывыя сокі,
і дрэвы, што на радасьць прарасьлі.
Што ні камель — то вымахаў высокі,
і што ні крона — то ўрасла ў аблокі,
і погляды губляюцца ў гальлі.

І дзікі сад дзівосна прамяніцца,
яго не падразалі ўжо гады.
Тут водары смалы і навальніцы,
і трэск кары, і кропелькі жывіцы,
і важкія сасьпелыя плады.

1926
Пераклад Ганны Янкуты

У ШЭРЫМ ЗМРОКУ

У шэрым змроку дзень растаў,
у шэрым змроку гаснуць вочы.
Маё юнацтва — звон актаў,
маё юнацтва чэзьне ў ночы,
бы колас, што зь зямлі паўстаў,
каб у зямлі заснуць аднойчы.

Мой курс пракладзены здаўна,
я з карабля сачу прасторы:
няма ні берагу, ні дна,
і я вітаньні шлю праз моры
у далеч, дзе смугі сьцяна,
на сум па чалавеку хворы.

1926
Пераклад Ганны Янкуты

* * *

Сьпявала ноч пяшчотнаю гітарай,
мая самота — ночы пераліў,
ні клопат не цьвяліў,
ні смутак не паліў —
сінела ноч, зрабіўшыся гітарай,
гучаў яе пяшчотны пераліў.

І ад зямных палёў да ціхіх зораў
дрыготка ўзносіўся за зыкам зык,
і прамяністы ліўся красавік,
і прагавіта вёў я гукам лік.
Вясна квітнела ў трапятаньні зораў,
душа мая лілася ў красавік.

Паветра саладзела, і вясной
цяплом густым сагрэлася зямля.
Зрабіўся я шчасьлівым спакваля,
прыняўшы цішыню майго жыльля,
імкнуў у даль, захоплены вясной,
і любай мне была мая зямля.

1926
Пераклад Ганны Янкуты

ЦЬВІЦЕ ЖЫТА

Іду праз палі, а навокал
Красуюць жытнёвыя нівы,
А цёплы вятрыска здалёку
Пагладжвае іх палахліва.
Па хвалях густых пахаджае,
І пахне зямля ураджаем.

Іду я па ўзьмежках і чую,
Як поіць зямля буйны колас;
Нібы акіянам вяслую,
І птушкі вітаюць мой голас;
Мяне на палосах жытнёвых
Цалуюць калосься галовы.

1927
Пераклад Міколы Хведаровіча

* * *

Іцыку Фэфэру

Я прачнуся і ўстану на досьвітку, рана,
Зачарпну прамяністае шчодрасьці неба,
Як ніколі, прасьветленым, ясным я стану, —
Для жыцьця мне так шмат гэтай яснасьці трэба!

Я напеўныя вершы на момант пакіну, —
Стане раптам на сэрцы і пуста і лёгка.
Мне няймецца на месцы, завуць далячыні,
Цягнікі, гарады, сінь прасторaў далёкіх.

Вечары на эстрадах, шматлюдныя сходы.
Я чытаю, чытаю да зморы, зьнямогі,
Сьвята песьні сваёй аддаю я народу,
Сьвята працы, шуканьняў, надзей, перамогі.

Гучна воплескі льлюцца — мне ж гэтага мала,
Гучна воплескі льлюцца — мне ж сумна так стала.
Урачыстасьць, сьвятло разьлілося агнямі,
Я ж ад сораму твар засланяю рукамі.

1928
Пераклад Алеся Звонака

З ПАЭМЫ «НА ЧУЖЫМ ВЯСЕЛЬЛІ»

Я знаю цябе, Беларусь, як пальцы свае і далоні,
Апоўначы нават змагу пазнаць твае сьцежкі крывыя.
І мяккі, пявучы заход, палаюча-смольны сасоньнік,
Бярозы у сьнежнай імжы, і рэкі, і тракты сівыя.
Я помню вясковы твой сум, што плыў па начах выцьцём воўчым,
Самоту-жаўтуху, тугу мястэчак гарбатых, кульгавых.
Такой ты была, Беларусь!
І варта заплюшчыць мне вочы,
Успомню я могільнік скрозь, гнілыя крыжы і курганы.
Багатай была Беларусь... Ня зьлічыш багацьцяў краіны...
[А] Боханы сітніцы ў нас зьяўляліся толькі у марах...
Багатай была Беларусь...
Пра гэта хай скажуць батрачыя сьпіны
Ды зьбіты у панскіх стадолах, навекі скалечаны карак.
Завея і цемра. І едуць дзьве буды дзірава-самотных.
Шукаюць мястэчка. Няма.
Толькі ветры тут выюць-шалеюць.
Нябёсы і долы гайдаюцца ў золкіх шыротах.
Няма ні карчмы, ні мястэчка. Нікога. Нічога. Завея.

1935
Пераклад Ізраіля Плаўніка



Васіль Дранько-Майсюк


Зьміцер Жылуновіч і яго крыўда

Цішка Гартны



Люблю сачыць, як дзень пагодлівы канае
І шэрасьць лёгкая над горадам шумлівым
Памерна ў вуліцы глыбокія спадае,
А над мурамі вісьне дымам сівым.

Паштоўка Цішкі Гартнага ў рэдакцыю газэты «Наша Ніва». 14 лютага 1909 г.



Зьміцер Жылуновіч (ён жа — Цішка Гартны) і сапраўды быў вельмі крыўдлівы.

Лічыў, што яго ня цэняць.

Па-дзіцячаму востра перажываў, калі чытаў пра сябе эпіграмы, пародыі, не пераносіў нават самай лёгкай крытыкі.

Калі ўзначальваў Дзяржаўнае выдавецтва БССР, мог аднаго пісьменьніка надрукаваць праз тыдзень, а другога (напрыклад, Уладзімера Дубоўку) унесьці ў «чорны сьпіс».

У шматлікіх газэтных і часопісных артыкулах быў шчодры на маляўнічае выяўленьне сваіх «крыўднікаў».

Напрыклад, яго вельмі абразіў бацька беларускага адраджэньня і анёл-ахоўнік маладога Янкі Купалы Вацлаў Іваноўскі.

Жылуновіч згадваў, як наймаўся ў 1909 г. парабкам да Іваноўскага. Колькі чыста падлеткавай злапомнасьці ў гэтых радках:

> *«Да прыходу цягніка з маёнтку прыехалі дзьве падводы — адна панская каламажка на спружынах, запрэжаная ў пару добрых стаенных коней, а другая — просты аднаконны дваровы нарадзік. Тройца [псэўданім Іваноўскага. — В. Д.-М.] з жонкаю ўсеўся ў першы, мяне ж, зразумела, даручыў фурману другое. <...>*
>
> *Заехаўшы... накіраваў мяне ў парабкаўскую кватэрку, а сам, спатканы роднымі, пайшоў у пакоі. „Вы пачакайце крыху, зараз прыдуць і дадуць вам есьці", — суцешыў ён мяне з ганку пакояў. <...>*
>
> *Мінула гадзіна часу — мінула больш — я ўсё чакаў, маючы справу з мухамі. Раптам у пакоях Іваноўскіх зайграла музыка. Пачуліся тэнаровыя засьпевы. Музыка і песьні стройнаю мэлёдыяй выліваліся ў адчыненыя вокны пакояў. Ад іх нясло панскім задавальненьнем, бясьпекаю і асалодаю жыцьця. ...На мяне ж... музыка нагнала злосьць і роспач. Я ня мог яе слухаць спакойна, тут жа ўзмоцнена пачаўшы думаць, як быць. Было ясна, што дзядзька Тройца пра мяне забыў. <...> Што аставалася рабіць? Чакаць? Чаго? У момант перада мною вызначылася выразная рашучасьць — кінуць Лябёдку і дзядзьку Тройцу. <...> З карзінкаю за плячыма я выйшаў з двара фальварку і пад зыкі музыкі пайшоў на станцыю»* [13].

Напачатку 20-х гг. Зьміцер Жылуновіч крыўдзіўся на старэйшае пакаленьне пісьменьнікаў, бо яны сваімі творамі не падтрымалі Кастрычніцкую рэвалюцыю: *«Для беларускіх пісьменьнікаў незразумелым было тое гераічнае, першае сьвядомае змаганьне працоўных грамадаў за сваю Сацыялістычную радзіму, Беларусь. Кроў і ахвяру тых беларускіх сялян і рабочых, чые мукі раней натхнявалі беларускіх парнасцаў, цяпер ня краталі зьдзеравянелых сэрцаў запуджаных песьняроў. Яны або маўчалі, або*

ўпотайку, як шашаль у дзераве, рыпелі тонамі будзённых днёў, тонамі васеньніх скрыпак, тонамі нуды, безнадзейнасьці» [7].

Але ж разам з тым, акрамя «парнасцаў», што рыпелі бы той «шашаль», яго, пралетарскага пісьменьніка, абуралі і «працоўныя грамады Менску», зь якімі ня мог знайсьці агульную мову: *«Усе на падбор яны былі несьвядомымі, малапісьменнымі, распуснымі. Зьмест іх гутарак не выходзіў з вузкага кола абгавору плянаў выпівак і залётаў за дзяўчатамі. Здарэньні, якія вынікалі з гэтага, смакаваліся, выклікалі рогат, рашучасьць на працяг у далейшым. Мяне дзівіла, каб у Менску можна было стрэць гэтак адсталых у сьвядомасьці і разьвіцьці рабочых...»* [4].

Безумоўна, былі прэтэнзіі ў Жылуновіча і да паэтаў-«маладнякоўцаў», якія прыйшлі на ўсё гатовае і не хацелі выкарыстоўваць тыя вялікія магчымасьці, якія ім шчодра дала савецкая ўлада: *«Савецкая ўлада... адчыніла шырокі шлях да культурнай творчасьці, неасяжныя магчымасьці перад кожным... Не патураць на гэта, глядзець у гэты бок зь нядбайствам — праступак у адносінах да сябе, да свайго і разам да агульнага дабрабыту. Да шкоды, сярод беларускіх маладых пісьменьнікаў наглядаецца гэта ў вельмі выразнай форме. Прычын гэтаму многа. Найважнейшая зь іх — гэта параўнаўчая лёгкасьць, зь якой можна зьявіцца ў сьвет. Усякая друкаваная рэч, зразумела, надае яе аўтару гордасьці, задзёру і самалюбства... самаўпэўненасьць... <...> Праца над самаадукацыяй адпіхаецца навамодным пісьменьнікам далей ад сябе, і ён застаецца на ўсё жыцьцё з тым, з чым пачаў пісаць»* [8].

Сярод беларускіх маладых паэтаў 20-х асабістым ворагам лічыў Уладзімера Дубоўку, які ў сваёй паэме «І пупуровых ветразей узьвівы» так «па-хуліганску» апісаў героя нашага артыкула:




Цішка Гартны зь сёстрамі Лізаветай і Кацярынай. 1911 г.

Вось ідзе адкрыты чэрап,
ён мазгі нясе ў партфэлі.
Свае іклы злосна шчэрыць,
каб яму «асанну» пелі...



Цішка Гартны

Паводле Ўладзімера Дубоўкі, гэтая варажнеча пачалася наступным чынам: «Расейскія паэты запрасілі беларусаў выступіць у іхным клюбе, фактычна — першы раз за ўвесь час [другая палова 1922 г. — *В. Д.-М.*]. Здавалася б, самым разумным было б арганізаваць прыезд у Маскву Я. Купалы, Я. Коласа, М. Чарота... Прыехаў жа адзін Ц. Гартны. <...> Нейкім гнусавым, замагільным голасам ён робіць „даклад“ аб беларускай літаратуры. Вялікае месца вылучае сабе. <...> ... Абвяшчае: — Цяпер я пачытаю вам свае творы... Цяжка ўявіць сабе, што гэта было за чытаньне. <...> І тут раптам, абсалютна нечакана для мяне, Ц. Гартны гаворыць: „Зараз пачытае свае вершы пачынаючы паэ-



Цішка Гартны. Шарж мастака Цфанії Кіпніса. 1932 г.


та Ўладзімер Дубоўка"... <...> Добра, што я ведаў нямала сваіх твораў на памяць. <...> Прачытаў гучна, выразна, так, як было прынята ў Маскве. ... Узнялася цэлая хваля воплескаў. <...> Я прачытаў другі верш... <...> Аўдыторыя зааплядзіравала яшчэ гучней. Пачуліся галасы: „Дубоўка! Давай яшчэ!" <...> Пасьля вечару... <...> Ц. Гартны зь вялікай злосьцю сказаў: „Г...о! Абракадабра нейкая! Яны, дурні, нічога не зразумелі, вось і аплядзіруюць!"» [14, с. 65–66].

Але, як бы ні закрануў такі нечаканы посьпех Дубоўкі самалюбства героя нашага артыкула, можна ўсумніцца, што Жылуновіч пачаў адчуваць да маладога паэта такую ўжо «вялікую злосьць».

Бо роўна праз год Зьміцер Хведаравіч (пра што вымушаны быў згадаць і той жа Ўладзімер Мікалаевіч) напісаў «самую першую рэцэнзію на мой [Дубоўкі. — *В. Д.-М.*] першы зборнік „Строма" і надрукаваў яе ў „Полымі", рэдактарам якога быў доўгі час» (Уладзімер Дубоўка. Сустрэчы) [15]. А свой зборнік «Трэскі на хвалях», паводле Дубоўкі, «ён падарыў... з надпісам: „Уладзіку Дубоўку — маладому песьняру — здольнаму і шчыраму беларусу-таварышу ад Цішкі Гартнага. Менск, 13/X.24"» [15].

А што «шчыры беларус-таварыш»?

Ён у адказ называе свайго шляхотнага рэцэнзэнта «грубым, малакультурным, сябелюбівым». І калі ў рэцэнзіі на «Строму» Жылуновіч пісаў, што «верш Уладзімера Дубоўкі, апроч музычнасьці, варо-



3

Сяброўскі шарж на Цішку Гартнага
мастака В. Волкава

Выйшла кніжка—
Скрозь перапуды:
Аўтар — Цішка,
Назва—«Перагуды».

**
*

На двух старонках
Спаў я тры разы
І бачыў сон
Прыемнейшы, ей права:
Што Цішку
Крышку
Усыпалі лазы—
Ото-ж было карысна
І цікава.

Міхась БАГУН.

Сяброўскі шарж на Цішку Гартнага. Мастак Валянцін Волкаў. Газэта «Літаратура і мастацтва», 16 траўня 1936 г.

жыць яшчэ й сваёю сочнасьцю, багацьцем прыгожых вобразаў, нібы зложаных з рознамульнага галёну (бісэр)» [16], дык яго малады калега адназначна называе рыфмаваныя творы Жылуновіча «няўмелымі, шурпатымі».

«Мае радкі шурпатыя?» — мог справядліва зьдзівіцца наш герой. А што тады можна сказаць пра Дубоўкавы «пэрлы»?

Нашы крозы, наша хваравітасьць
і, часінай, дробныя сусьцігі, —
ці раўня зь якім цыянамідам
будуць там, дзе плуг заменіць цяглі?

А як звычайны чытач зможа патлумачыць радок з паэмы «Там, дзе кіпарысы»: «Хто дайлідзіць духу трыкліні?»

Калі ж казаць пра выступленьні самога Дубоўкі, то вось дастаткова бязьлітасныя ўспаміны Алеся Дудара (апавяданьне «Вецер з усходу»), дзе паэт выведзены пад прозьвішчам Паляскоўскі: «Уся заля, асабліва дзяўчаты, аж заходзілася, плешчучы. Паляскоўскі ўстаў і аказаўся высачэнным хлопцам з грубымі рысамі твару. Балянсуючы і размахваючы рукамі, ён пачаў чытаць нарасьпеў. <...> Паляскоўскі не выгаворваў літары „р“ і таму ўсю сваю ўвагу накіроўваў на мэлядычнасьць дэклямацыі. Перад апошняю страфою на твары яго зьявілася пагардліва-гіранічная ўсьмешка. <...> Да Паляскоўскага падыходзілі, нешта яму гаварылі, а ён толькі пагардліва махаў рукамі...» [6, с. 164].

Але, безумоўна, найбольш нашаму герою было крыўдна ад іншага. Ані Дубоўка, ані яго атачэньне зусім не цанілі таго, што менавіта дзякуючы Зьмітру Жылуновічу была створана беларуская савецкая дзяржава ССРБ.

Яны забылі, што ў артыкуле «Як жа зь Беларусьсю?» («Дзяньніца» № 38, 19 лістапада 1918 г.) Жылуновіч меў сьмеласьць папракнуць Сталіна (які на той час быў камісарам у справах нацыянальнасьцяў) за няўвагу да Беларусі: *«Весь час, са дню расейскай рэвалюцыі, беларускае пытаньне нядбайна прапушчаецца між пальцаў. Нашы таварышы, трымаючыя ўладу, павінны кінуць сваю нядбаласьць да цэлага народу і ясна паставіць пытаньне аб долі Беларусі»* [1].

Менавіта гэты артыкул паспрыяў утварэньню савецкай беларускай дзяржавы на чале са Зьмітром Жылуновічам. Відавочна ж, апошні заслужыў на пашану і добрую памяць. Але замест таго Жылуновіч чытае паэму Дубоўкі «Ўрачыстая дата», дзе стваральнік беларускай савецкай дзяржавы зьдзекліва выведзены ў вобразе «зайкі»:

Прышоў і зайка, просіць пайку.
Якую пайку? — Сам ня знае!
Ня то ён войкаў, гэты зайка,
калі была пара ліхая.
Ня то ён бегаў у алешнік
і тым рэспубліку уславіў.
Адно вядома — што канешне
павінна мейсца быць на лаве.
Яго вазілі, даглядалі,
зрабіўся тлусьценькім наш зайка.
І вось пракокуе у далі,
узяўшы ў рукі сваю пайку. —
«Усё, што зроблена ў краіне,
свой ад мяне вядзе рыштунак.
І як памру — за мною хлыне
на той сьвет мне у падарунак»...

Акрамя падобных нападаў, Жылуновіч засмучаўся таксама, што ўвогуле дата 1 студзеня (калі была створана Беларуская савецкая рэспубліка) пачала забывацца нават і на дзяржаўным узроўні. Пра

Цішка Гартны з сынам Алегам. 1932 г.



што зь непакоем пісаў на пачатку 1920-х: «...Апошнія гады ў гісторыі [беларускага народу. — *В. Д.-М.*] прынясьлі яму адно вялікае надзвычайнае здарэньне, якое палажыла нязгладныя сьляды ў яго жыцьці і якое дало новы кірунак яго разьвіцьцю. Гэта здарэньне — абвяшчэньне Вольнай Незалежнай Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі. Яно адбылося першага студзеня новага стылю 1919 году, даўшы краю дзяржаўныя формы жыцьця, а зь няведанага, спагарджанага народу — зрабіўшы пэўнага гаспадара свае краіны. І таму першага студзеня павінна... быць сьвятам Беларускай рэспублікі. Тры мінулых гады прайшлі зусім незаўважна к гэтаму дню. Зь бегам часу ён адыходзіць усё далей і далей ад нас. <...> Гэта можна казаць аб нашых безуважных адносінах да тых гістарычных дзей, якіх мы былі сучасьнікамі і якія зьвязаны з нашым лёсам. Гэта гатова сьведчыць аб нашым раўнадушшы да нашай гісторыі — а значa і да нас саміх...» [10].

Крыўды й несправядлівасьць маглі чыніць нават тыя газэты й часопісы, што ставіліся да Жылуновіча з вонкавай паважлівасьцю.

Ну які можа быць, да прыкладу, творча-сьвяточны настрой, калі чытаеш зацемку, дзе чэскія крытыкі лічаць аўтарам першага беларускага раману... Міхася Зарэцкага: «„Сокі цаліны“ [эпапэя Цішкі Гартнага. — *В. Д.-М.*] павінны былі б зьявіцца першым беларускім раманам. <...> Аднак ён застаецца няскончаным — і гонар напісаньня першага беларускага раману выпаў на долю Міхася Зарэцкага („Сьцежкі-дарожкі“...). Зарэцкі здабыў сабе... пачэснае месца» [12].

Крыўдлівасьць Жылуновіча многім кідалася ў вочы.

Калі яна яго апаноўвала, ён рабіўся па-дзіцячаму безабаронны.

Менавіта гэта меў на ўвазе былы «ўзвышэнец» і апанэнт Максім Лужанін, калі пісаў: «Па сягоньняшніх уяўленьнях пра Цішку Гартнага ёсьць ня дужа прыемны налёт, які пакінулі групавыя адносіны ў літаратуры 20-х гадоў. Маладнякоўцы, абвясьціўшы паход „у рожкі са старымі“... вымушаны былі неўзабаве схіліць свае слабенькія рожкі перад Купалам, які як быццам не заўважыў дзёрзкіх нападаў, перад Коласам, які аплявушыў, і даволі адчувальна, задзірак. Бядуля ўратаваўся ад нападаў, уступіўшы ў „Маладняк“, тую арганізацыю, якая нападала на яго, а Цішка Гартны адбіваўся, удала і няўдала, і яму ўлятала найбольш з усіх бакоў. Калі з „Маладняку“ выйшла „Ўзвышша“, Цішка Гартны ня быў прыхільнікам гэтай падзеі і сустрэў яшчэ адно кола асоб, што не саромелася ў выстаўленьні рожкаў» (Максім Лужанін. «Крыху пра Ц. Гартнага») [15].

Цішка Гартны з жонкай Надзеяй. 1916 г.



Ён вельмі хацеў быць папулярным, значным, любімым, усімі паважаным. І, вядома, цалкам заслугоўваў, каб да яго ставіліся падобным чынам. Але — як тады, так і сёньня — аматары беларускай літаратуры з большай ахвотай чыталі і чытаюць свабодалюбіва-іранічную паэзію неаднаразова згаданага тут Уладзімера Дубоўкі альбо Тодара Кляшторнага, Валерыя Маракова і Язэпа Пушчы. Захапляюцца нэрвовым эратызмам прозы Міхася Зарэцкага. Фанацеюць ад эстэцкай творчасьці раньняга Кузьмы Чорнага і Ўладзімера Хадыкі... Многія сёньняшнія літаратуразнаўцы салідарныя з «узвышэнскім» крытыкам К. Кундзішам, які па-пракурорску безапэляцыйна пісаў: «Ня толькі выдатнага, але нават хоць бы колькі-небудзь прыкметнага месца ў беларускай літаратуры ён [Зьміцер Жылуновіч. — *В. Д.-М.*] не займаў і не займае. Выцерабіцца на буйны літаратурны шлях у сілу свайго нязначнага таленту ён ня здолеў, тым больш ня здолеў ён стаць на ровень з такімі паэтамі, як Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч. У адносінах да хору гэтых трох выдатных паэтаў Ц. Гартнаму даводзілася быць толькі падпявалам, толькі быць падгалоскам зь вельмі слабенькаю паэтычнаю тэхнікаю ды вельмі вузенькім кругавідам» [11].

Некаторыя сучасныя дасьледнікі беларускай літаратуры захоўваюць такі ж самы скепсіс.

Дзьмітры Давідоўскі, напрыклад, пры ўсякай згадцы пра аўтара «Сокаў цаліны» любіць цытаваць вядомую эпіграму 20-х гадоў, прысьвечаную нашаму герою:

Сядзіць дзядзя лысы
ля дзяржаўнай місы.
Капялюш бэрлінскі,
а характар сьвінскі.

Віктар Жыбуль ня можа дараваць гэтаму «дзядзю», што ён эстэтычна ды ідэалягічна не прымаў авангардных плыняў беларускай паэзіі.

Але ці сапраўды Зьміцер Жылуновіч меў такі ўжо «сьвінскі» характар, а ў творчасьці быў усяго толькі «падпявалам»?


Як вядома, калі пачнеш вывучаць глыбей, то ўсякая зьява не выглядае такой ужо банальна-аднамернай.

Зьміцер Жылуновіч умеў натхняць.

Напрыклад, усімі любімы геній экзатычна-прыгодніцкіх фантазіяў Янка Маўр знайшоў сваю творчую адметнасьць дзякуючы спрыяньню менавіта Жылуновіча: «...Мяне паклікаў у выдавецтва Цішка Гартны і кажа, што беларусы ня маюць свайго Майн Рыда і што мне трэба напісаць прыгодніцкую кніжку. „Як жа яе напісаць?“ — пытаюся. „А ты паглядзі ўважліва карту“, — гаворыць Гартны. Прыйшоў я дамоў. Вось жа задача: глянь карту паўшар'яў і вывудзі што-небудзь прыгодніцкае. Узяўся я за астравы, на якіх бываў Міклуха-Маклай. Пачаў капацца, варушыцца — і зьявілася аповесьць „У краіне райскай птушкі“» [2].


У маладосьці ярка складзеным вершам-экспромтам падымаў настрой якой-хаця сумнай кампаніі: «Прыходзячы на вячоркі, Цішка Гартны заўсёды ўмеў падняць настрой моладзі. Зойдзе, напрыклад, у хату, а там сумуюць. Ён адразу сачыніць верш. Глядзіш — і ўсе ўсьміхаюцца» (Юлія Чарнушэвіч. «Нашы вячоркі») [15].

Любіў зь неназольнай разнастайнасьцю дапамагаць студэнтам, землякам, проста гасьцям: «...то пакладзе наведвальніку грошы ў кішэню паліто, то купіць што-небудзь яго дзецям. Старэйшыя пісьменьнікі да-



Цішка Гартны з дачкой Галінай і сынам Алегам. 1930 г.

Старонка рукапісу раману Цішкі Гартнага «Сокі цаліны» (Частка першая. «Бацькава воля». Главы I–IV). 1921 г.



VII. 1
1921


Цішка Гартны.

Бацькава воля.

Раман ў дзевух палавінах
і васьмінах.

Першая палавіна.

Главы I – IV



1-
3

Першая часьціна.

I

Это зусім звычайна, калі Зося прывяла с пашы каня. На вуліцы было ~~шмат~~ зусім цёмнавата, але жыцьцё йшло дужма, замірацьці: на прыбаі там і сям азвалі мужчыны і бабы ўсялякімі апранасе і цэлымі міг сабою рэзвую гутарку, ў якой часта прабіваўся вясёлы і бязклапотны рогат, жарты і выгукі. Пасярод вуліцы доўгім цугам плялісь с пашы аўцы, дробныя і пакурныя каровы; стрэлам ішчаліся таліят тонкія, заморанныя свінні; збіўшыся гуртам і спалохна азіраючыся, дрыгалі ўлюцканы, пастрыжоныя гавечкі, і пыл стаяў слупом. Рык кароў, рогатаньне свінней і мяканьне гавечак, а таксама няспыннаны крык дзяцей, якія ня менш, як гавечкі, таўкліся на вуліцы, запыленыя і замурзаныя, ганяючыся адно за другім, — усё гэта ясьнела свядчыла аб тым, што, ня гледзячы на звычарак, жыцьцё ў мястэчку Сівуху было кіпучае.

Завідзіўшы каня на прыгумень, Зося бародзай пабегла ўрату, каб чаго перакусіць, вымерлаушыся за дзень; і вось, толькіяна пераступіла парог, як раптоўна ~~на~~ стрэлу ей кінулася ў маладшая сястрычка,

сюль згадваюць, як шчодра плаціў... ганарар пачынаючым аўтарам, будучы дырэктарам Дзяржвыдавецтва. Рабіў ён і такое: дапаможа ўладкавацца на працу або вучобу і доўга потым сочыць за справамі свайго „хрэсьніка“» (Галіна Жылуновіч. «Мой бацька») [15].

Паводле Заіра Азгура, умеў бязь ценю дыдактыкі незаўважна адукоўваць, узбагачаць ведамі свайго юнага суразмоўцу: «...Зьміцер Хведаравіч незаўважна ўводзіў мяне, маладога мастака, у кола інтарэсаў, якімі жыла тады ўся наша творчая інтэлігенцыя. Энэргетыка Савецкай Беларусі і друкарская справа, распрацоўка тарфяных залежаў і ліквідацыя непісьменнасьці вясковага насельніцтва, значэньне Акадэміі навук БССР... — усё гэта закраналася ім у гаворках неяк неўзаметку» (Заір Азгур. «Такім я помню Цішку Гартнага») [15].

А што ў творчасьці?

Ці можна, скажам, паверыць Максіму Гарэцкаму, што проза Жылуновіча, яго апавяданьні й раманы маюць вялікія заганы, бо «... іхняя расьцягненасьць, цяжкі стыль, няправільныя беларускія зва-

роты мовы і агульная панурасьць тону — робяць свайму чытаньніку немалую пакуту»? А хіба мэдытацыйная проза раньняга Кузьмы Чорнага не вызначалася «агульнай панурасьцю» (асабліва апавяданьне «Парфір Кіяцкі») і «расьцягненасьцю» (раманы «Сястра» і «Зямля»)? Хіба многія творы гэтак любімых Гарэцкім «узвышэнцаў» не вызначаліся «цяжкім стылем» і не рабілі масаваму чытачу «немалую пакуту»?

Паглядзім, як пачынае Зьміцер Жылуновіч сваю эпапэю «Сокі цаліны»: «Ужо зусім зьвечарэла, калі Зося прывяла з пашы каня... На вуліцы было цемнавата, але жыцьцё і ня думала заміраць: на прызбах там і сям сядзелі мужчыны і бабы, ведучы рэзвую гутарку, у якой часта прабіваўся вясёлы і бесклапотны сьмех, жарты і выгукі. Сярэдзінай вуліцы доўгім цугам пляліся з пашы худыя, дробныя і панурыя кароўкі; хутка мчаліся мізэрныя, тонкія, замораныя сьвіньні; зьбіўшыся гуртам і спалохана азіраючыся, падскаквалі галабокія стрыжаныя авечкі. Вуліца курэла ад пылу. Рык кароў, рохканьне сьвіней і мэканьне авечак і тут жа несьціханы крык дзяцей, якія ня лепш як авечкі таўкліся па вуліцы, запыленыя і мурзатыя, ганяючыся адно за другім, — усё гэта яскрава сьведчыла аб рэзвым, віруючым жыцьці ў закінутым у глуш мястэчку Сілцах» [3, с. 53].

Перад намі ня проста традыцыйна-пабытовы пачатак сялянскага раману (якіх было сотні ў нашай літаратуры), як можа падацца на першы погляд. Уважлівы чытач, які не бярэ на легкаважную веру ўсё тое, што піша строгі крытык Максім Гарэцкі, чытач, адкрыты для нечаканых і разам з тым эмацыйна-праўдзівых эстэтычных паралеляў, убачыць, зразумее, адчуе, што пачатак «Сокаў цаліны» мае выразна опэрнае гучаньне.

Вядомы факт, што Зьміцер Жылуновіч вельмі любіў опэру. У Менску, Бэрліне, Парыжы стараўся не прапускаць ніводнай прэм'еры, а калі пісаў сваю эпапею, то ставіў кружэлку з запісам опэры «Галька» Станіслава Манюшкі. Зьдзіўляе музычна-рытмічная, настраёвая еднасьць працытаванай намі «ўвэртуры» Жылуновіча і самага пачатку «Гальки», калі ўсё пачынаецца зь мернай, нават крыху гультаявата-стомленай нясьпешнасьцю, а затым нарастаюць гукі, самыя розныя нэрвова-імпэтныя зыкі, паскараецца рух і пачынаецца само дзеяньне.

Жылуновіч, калі пісаў «Сокі цаліны», быў першым сярод беларускіх творцаў, хто мысьліў менавіта як опэрны кампазытар. На жаль, ні тагачасная, ні сёньняшняя крытыка не зьвярнулі ўвагі на гэтую відавочнасьць.

Але ня толькі опэра мела эстэтычны ўплыў на пісьменьніка.

Калі ён падарожнічаў разам зь Міхасём Чаротам і Міхасём Зарэцкім у 1928 годзе па Заходняй Эўропе, то быў у захапленьні ад жарсных спэктакляў у Фалі-Бэржэр: «*...эстэтычны бок, надворны выгляд даведзены да віртуознасьці. Пры гэтым, у дадатак да багатай раскошнай маляўнічасьці, у кожным прыстаўленьні-рэвю маецца надзвычайна многа дынамікі. Несупынны рух сотняў удзельнікаў спэктаклю, выключна дзяўчат, падабраных і з боку адмысловага здароўя і з боку дасканалай эстэтычнасьці фігуры, частая перамена вопратак і вобразаў самога прыстаўленьня, надаюць уражаньне несупыннага цёку, міганьня, трапятаньня ўсяе сцэны. Ніводзін спэктакль ня вольны ад эратычнага налёту. Наадварот, эратызмам у згушчаным выглядзе прасякнуты ўсе часьцінкі прыстаўленьня... адзеньне гірлс, зусім адкрытыя жэсты і сказы, асобныя сцэнкі, малюнкі заслонаў і дэкарацый. <...> Пастаноўка Фалібэржэ-рэвю зрабіла вялікае ўражаньне*» [9]. А за чатыры гады да гэтага ён складае поўны харэаграфічнай разьняволенасьці верш «Каля бору сонца ходзіць», які сваёй лёгкасьцю не саступае танцавальным цудам Фалі-Бэржэр.

У згаданым творы чаруюць сваімі танцамі «*Німфы-ведзьмы, фэі-панны», якія жарсна клічуць «На гулянку, на вясельле!.. <...> Ў вербалозах, ў пухкім моху / Завіліся карагоды; / Вадзянік адставіў лёху / У крыніцы спадысподу. // Вір віруе / І шнуруе / Градкай лёгкай, / Лентай вохкай / Грэбень хваль. / Плецень-валь / Дымкай шарай / Туліць твары / Фэй-русалак, / Што ў прагалак // Між кустамі над крыніцай / Распусьцілі бросьні-косы; / З хітрай мінаю глядзіцца / Ў іх лясун доўгавалосы*» [3, с. 49].

Чытаеш гэты — не, нават ня верш, а дзівосны сцэнар для новага нечуванага танцу — і ўяўляеш, што дзесьці недалёка «за кадрам» хаваюцца Эдгар Дэга разам з Анры дэ Тулюз-Лятрэкам, якія, натхніўшыся ўбачаным, у самазабыцьці ствараюць свае жывапісныя шэдэўры.

А вось, калі ласка, іншы верш, чыя ляканічна-рэзкая музычнасьць надае яму еднасьці з экспрэсіўна-імпэтнай джазавай музыкай: «*Як ідзе — / Шнур кладзе / Лёгкае хады. / Роўны стан / Увабран / Стужкаю ўсягды. / Сьвежы жар / Крые твар — / Сьвеціцца пагляд. / Валасы / Ў дзьве касы / Спушчаны назад. / Паглядзіць — / Адарыць, / Сэрца ўскалыхне. / Падысьці / Ў пачуцьці / Да яе кожны мкне. / <...> Хто маляр / Яе чар, / Строю, пекнаты? / Край зь вякоў / Ніў, лясоў, / Беларусь — то ты!*» (верш «Беларуска», Капыль, 16.06.1923) [3, с. 47–48].

Я нездарма згадаў пра джаз.

Цішка Гартны з жонкай Надзеяй, дачкой Галінай і сынам Алегам. 1929 г.



Калі велічная манумэнтальнасьць опэрнага мастацтва настройвала Зьмітра Жылуновіча на стварэньне адпаведнай у сваёй эстэтычнай магутнасьці бязьмежна-раманнай позы, то гарэзьлівы канкан і джазавая музыка спрыялі зьяўленьню паэзіі.

Дарэчы, Жылуновіч быў ці ня першы беларускі пісьменнік, які зь нестрыманым захапленьнем пісаў пра «музыку чорных», і самі гэтыя ягоныя артыкулы дзякуючы сваёй вялікай энэргетыцы радасьці й шчасьця сёньня ўспрымаюцца цудоўнай мастацкай самадастатковай прозай: *«А сама музыка? На першы раз прывыкшаму да камэрнай музыкі вуху робіцца незразумелым і як быццам бы хаосным, безмэлядыйным разухабісты, урачыствуючы экспансіўны гул джаз-банда. Дзясяткі рэзкіх (якія пачаста пераходзяць у сочныя нежныя) зыкаў, што адбіваюць галасы і шолах трапічнага лесу, плёскат мора, шэлест трасьніку паўдзённа-амэрыканскіх стэпаў — зьмяняюцца камбінаваным сугалосьсем гамы жывёльных зыкаў. Іх пераймае неабмежны бушуючы сьвіст ветру. І ўсё гэта як быццам бы наэлектрызавана, ляціць, імчыцца ў нейкай завірусе, у шалелым палёце. Слухач хутка захапляецца тэмпам і багацьцем музыкі, міжвольна паддаецца настрою і цалкам плыве па яе хвалях. Дысгарманічнасьць гіне, і паўстаюць сапраўды цікавыя, заварожаныя акорды нечуваных, адкульсьці вылоўленых і нанізаных у маніста дзіўнай мэлёдыі тонаў, піскаў, гукаў, струнаў. Скрыпка, флейта, віялянчэль і інш., што прамілгалася ўваччу, — здаюцца нечым міззрным, сумлівым і ў кожным разе не адказаваючым тэмпу сучаснага жсыцьця, яго поўнасьці, набрынянасьці кветавым пахам, сонцам, раздольлем. І вось у моры гэтых зыкаў, якія зусім не бязмоцны перад тым, каб перадаць Лёэнгрына, — пагоджана зь імі ідуць балетныя ды акрабатычныя нумары чорных артыстых. <...> І ня дзіва, што посьпех нэграў — надзвычайны. <...> Значныя воплескі праводзяць кожны нумар джаз-банда»* [5].

Пад вечар у Жылуновіча звычайна наступае супакойна-балядны настрой, поўны лагоднага сузіраньня і амаль будысцкай нясьпешнасьці, як у вершы «Адвячоркам» (1924):

Люблю сачыць, як дзень пагодлівы канае
І шэрасьць лёгкая над горадам шумлівым
Памерна ў вуліцы глыбокія спадае,
А над мурамі вісьне дымам сівым.

<...>

Драты, што сеткамі крыжуюць вулкі, пляцы, —
Губляюць нітkі доўгія ў прысьценных ценях,
І пэнт нядаўны цяжкай творчай дзённай працы
Прымоўкне, стуліцца ў каменных цесных сьценах...

Гэтая паэзія перагукваецца з такой жа дзівоснай паэзіяй, але напісанай у прозе (апавяданьне «Сьцены») Кузьмы Чорнага: «Перад змрокам ціхі і густы туман лёг над горадам. Глуха гулі ў ім вячэрнія вуліцы, і сьвет ад белых лямп падаў на вільготны камень. У гэты час дню пералом у безупыннай клапатлівасьці сутак; пачынаюцца новыя выяўленьні людзкіх патрэб і жаданьняў... <...> Яшчэ рана. Не астыгла яшчэ пара ў чыгунных трубах, і толькі кагадзе прыціхла жалеза. Дым зьмяшаўся з туманам і растаў. І туман вее прасторамі...» [17].

Уявіце, дзесьці ў Менску 20-х сядзяць сабе ў розных кавярнях Зьміцер Жылуновіч і Кузьма Чорны. Вонкава два ідэйныя ворагі, якія быццам бы знаходзяцца на ідэалягічна розных пазыцыях, друкуюцца ў варожых адзін аднаму часопісах і разам з тым *аднолькава-тонка*, *аднолькава-музычна* адчуваюць гэты заўсёдна гіпнатычны пераход дня ў вечар, і ў гэты момант эмоцыі й настрой заслужанага пралетарскага пісьменьніка і далёкага ад патрэбаў простага народу ўпадніцкага празаіка-«ўзвышэнца» ўтвараюць адно гарманічнае, непарушнае цэлае, пра што, аднак, ні Зьміцер Жылуновіч, ні Кузьма Чорны, як вядома, не здагадваюцца.

Сучаснікі не заўважалі ў творчасьці героя нашага артыкула яго незвычайнай музычнасьці, тонкага эстэцтва, лёгкасьці і нават прытоенай эротыкі.

Дзіцячае самалюбства пісьменьніка, яго не заўсёды карэктныя (але бліскуча напісаныя і драматургічна-вострыя) артыкулы, накіраваныя супраць літаратараў суполак «Узвышша» і «Маладняк», супраць Кнорына і беларускага тэатру, непрыкрытае жаданьне падабацца і празьмернае імкненьне ўсюды, дзе магчыма, друкаваць сваё, яго рыфмаваныя дрындушкі, прысьвечаныя рэвалюцыі, хавалі ад большасьці сапраўдага Жылуновіча, які сваёй творчай адметнасьцю не саступаў у таленце ні Янку Купалу зь Якубам Коласам, ні, тым болей, Уладзімеру Дубоўку і Кузьму Чорнаму.

Для многіх сёньняшніх павярхоўных аматараў беларускай літаратуры 20-х Зьміцер Жылуновіч занадта «рэвалюцыйны», «патасна-ідэалягізаваны», «хваласьпеўна-сацрэалістычны».



Цішка Гартны з маці Яўгеніяй Антонаўнай і дачкой Галінай. 1929 г.

Думаю, гэтыя аматары не чыталі яго незвычайнага і выразна антысавецкага сваім зьместам апавяданьня «Больш за ўсіх» (1923).

Там расказваецца пра вясковага актывіста-бальшавіка Платона, чыя фанатычная адданасьць ідэям рэвалюцыі прывяла да сьмерці бацькі (герой адправіў яго ў абоз, і той памёр у дарозе ад тыфусу), падкасіла здароўе маці, якую, хворую, з болямі ў жываце, Платон кідае сярод ночы, бо партыя даручыла яму новае заданьне.

Страшнымі гучаць словы нямоглай адзінокай маці: *«Хай бы ты, сынок, хоць часіну аддаў для мяне... <...> А табе як чужому няма ні мацеры, ні дому. Гэта ж трэба так моцна ўесьціся ў сваё бальшавіцтва. То ж сьвет мо ня бачыў такіх шчырых і заўзятых служакаў, як ты. Няўжо табе трэба больш, як усім. Няўжо цябе царом зробяць, калі ты так будзеш старацца...»*

Праз прывідныя ідэі і бяздумнае служэньне партыі, якая сям'і Платона анічым не дапамагла, у сутнасьці гіне і сям'я, і — маральна — ён сам. Жах татальнага фанатызму, які незаўважна для мужнага, фізычна моцнага героя ператварае яго ў бязвольнага раба, паводле Зьмітра Жылуновіча ёсьць горшым ворагам, чым умоўныя белапалякі ці кайзэраўскія немцы. Тое, пра што пазьней з усёй экзыстэнцыйнай выразнасьцю пісаў Васіль Быкаў (і зрабіў асноваю ўласнай творчасьці), упершыню так яўна і сьмела прагучала не ў вальналюбнага Дубоўкі і ягоных лібэральна настроеных сяброў, а ў пралетарскага, партыйнага пісьменьніка, палітыка і чыноўніка Зьмітра Жылуновіча — баяцца трэба ня вонкавых ворагаў, а сваіх таварышаў, уласнай празьмернай адданасьці роднай партыі, якая прывядзе цябе, кажучы словамі Якуба Коласа, «у тупік», дзе «ні цэню спогадзі жывой», а пануе адно толькі маральны і фізычны нябыт.

Калі ў 1937 годзе Зьмітра Жылуновіча катавалі ў сталінскай турме, рабілі зь яго вар'ята, ці ўспамінаў ён гэтае сваё такое страшнае і прарочае апавяданьне?

У пачатку артыкула я з пэўнай доляй іроніі пісаў, што Жылуновіч быў вельмі крыўдлівы, бо лічыў, што яго ня цэняць належным чынам. Цяпер, прачытаўшы многае зь яго сапраўды незвычайнай паэзіі, прозы, публіцыстыкі, магу прызнаць: ён меў права на сваю крыўду.

Бо па-сапраўднаму пісьменьнік Зьміцер Жылуновіч ня быў прачытаны ні пры ягоным жыцьці, ні цяпер.

Сучасьнікі й нашчадкі, рэагуючы на вонкавае, ленаваліся заглыбіцца ў яго дзівоснае мастацтва, давяраючы перадузятым крытычным выказваньням Максіма Гарэцкага ці Ўладзімера Дубоўкі.

Беларусы вельмі паслухмяныя.

Яны вераць крытыкам, асабліва калі тыя каго-небудзь лаюць.

Ці варта заставацца такімі ж даверлівымі?

Літаратура

1. *Беларус камуніст* [Жылуновіч З.] Як жа з Беларусьсю? // Дзяньніца. 1918. 19 ліст.

2. *Гардзіцкі А.* Жартам і сур'ёзна // Маладосць. 1970. № 11.

3. *Гартны Ц.* Выбраныя творы. — Мн.: Бел. кнігазбор, 2011.

4. *Гартны Ц.* Дваццаць гадоў назад: Успаміны з мінулага // Полымя. 1929. № 5.

5. *Гартны Ц.* Мастацтва чорных // Савецкая Беларусь. 1926. 9 мая.

6. *Дудар А.* Выбраныя творы. — Мн.: Лімарыус, 2017.

7. *Жылуновіч З.* Беларускі Парнас у новай вопратцы: Абегла-крытычны нарыс // Полымя. 1923. № 2.

8. *Жылуновіч З.* Купчастыя руні: Крытычны нарыс пра П. Труса і А. Моркаўку // Полымя. 1926. № 2.

9. *Жылуновіч З.* Па чатырох краінах: Рэў'ю // Савецкая Беларусь. 1928. 18 студз.

10. *Жылуновіч З.* 1 студзеня мусіць быць сьвятам // Савецкая Беларусь. 1922. 12 ліст.

11. *Кундзіш К.* Sine ira et studio: Агляд поэзіі Цішкі Гартнага // Узвышша. 1927. № 3.

12. *Новая беларуская літаратура:* Перадрук з артыкулу чэскага выданьня «Prager presse». 1927, № 346, 17 сьнежня // Літаратурны дадатак да газэты «Савецкая Беларусь». 1928. № 2.

13. *Туронак Ю.* Мадэрная гісторыя Беларусі. — Вільня: Ін-т беларусістыкі, 2006.

14. *Уладзімір Дубоўка.* Ён і пра яго. — Мн.: Лімарыус, 2017.

15. Успаміны пра Цішку Гартнага. — Мн.: Маст. літ., 1984.

16. *Ц. Г.* Уладзімер Дубоўка. Строма // Полымя. 1923. № 3-4.

17. *Чорны К.* Сьцены: Апавяданьне // Узвышша. 1927. № 1.

ВОСЕНЬ

І сумна, і нудна, і вецер пяе —
Асеньняя песьня жудой аддае...
Прыбрана у полі, і пуста вакруг,
Адзежаю смутна апрануты луг.

Расьліны жывое нідзе не відаць,
Ні голасу птушак нідзе не чуваць.
Толькі і ўбачыш па чорнай ральлі
Сямейку сяўцоў невясёлых калі.

Ды мучаюць вуха ўсё крыкі варон,
Зьлятаючых ў кучу з усенькіх старон.
Ды вока яшчэ хіба можна спыніць
На нівах адзетых, дзе рунь зеляніць.

І сумна, і нудна! Пад вечар і з раньня
Бялеюць усюды густыя туманы.
І хмаркі, як дзеці заклятай нуды,
Пярэсьцяць і смуцяць там неба ўсягды.

І сумна, і нудна! І жаль так бярэ,
Што восень ізноў зажыла на дварэ,
Што так неўспадзеўкі ў нягаданы час
Цяпло і прывольле пакінула нас.

[1909]

З ЦЫКЛЮ «ГОРАД»

І. АДВЯЧОРКАМ

Люблю сачыць, як дзень пагодлівы канае
І шэрасьць лёгкая над горадам шумлівым
Памерна ў вуліцы глыбокія спадае,
А над мурамі вісьне дымам сівым.
Паветра ціхае паволі рэдне, стыне,
Выразьней рэха гулкае ўтуруе;
Гудок фабрычны сьвіст зацяжны строма кіне,
Й працоўных натаўп рэзва, шумна зашнуруе.
Драты, што сеткамі крыжуюць вулкі, пляцы,
Губляюць ніткі доўгія ў прысьценных ценях,
І пэнт нядаўны цяжкай творчай дзённай працы
Прымоўкне, стуліцца ў каменных цесных сьценах.

Настрэчу ж месяцу блядому й зорак кучы
Агні электрыкі вакол з вакон, зь ліхтарань
Паднімуць ўверх прамень сярэбраны, бліскучы,
І зыкі выцісьне дзяўчына на гітары…
Крыху пазьней — і скрозь жыцьцё, як дым, зьнікае,
Адно з куткоў пачуеш парак шэпт шчасьлівы.
Люблю сачыць, як дзень над горадам канае,
Летучы ціха к небу дымам лёгкім, сівым!

1-1-24

II. НОЧЧУ

І тут, і там, здалёк і зблізку,
Як ў цёмным полі — воўка вочы,
Ў раскідзе доўгай гнуткай нізкі
Агні па гораду бліскочуць.
Трапеча лёгкае праменьне
І змрок гусьціць ўвысі ды ўнізе —
На зірк ваччу кладзе адценьне
І зьяў жыцьця да здані блізіць.
Хто іх разьліў, зь якой патрэбы —
Пытаеш — мрыюць над дамамі,
Як сьвечкі тыя над трунамі
Ў цалуне чорным, зьвісшым зь неба?
І, здэцца, сумам мусіла б павейваць
І ўзрокі цьмяніцца ў прышчурра,
А то-та ж будзяць ясную надзейнасьць
І позыў — бегчы к ім настрэчу — бураць.

Менск, 12-III-24

«БОЛЬШ ЗА ЎСІХ»

Апавяданьне

І

Калі Платон пераступіў парог хаты, то пачуў такую гутарку бацькоў:

— Дыхнуць вольна немагчыма. Што тут чаўпецца — сам чорт нагу зломіць… Толькі збавіліся ад адных, як — на табе, другія, — паціскаючы плячыма ды ківаючы галавою, недаволіўся Юрка, Платонаў бацька.

Юзя, маці Платона і гаспадыня ў хаце, крышыла ў запечку зельле і раз-поразу падмацоўвала словы мужа:

— Але, але! Дай жа ты рады! Баламуціца нейкая, а не жыцьцё. Дыхнуць не даюць.

І Юрка, і Юзя так удаліся ў гутарку, што і не заўважылі сына; нават не паглядзелі ў дзьверы, калі Платон увайшоў і стаў каля вушака.

— Гэта ж проста хоць гвалт крычы. Падумаць, жартачкі! Кінь-рынь хату, гаспадарку і едзь немаведама куды... На ліха нам здалася тая Варшава! Хай бы яна згарэла там з панамі разам! Блізкі сьвет! Папробуй даехаць. Касьцей ня вернеш! Каб гэта яшчэ Платон быў вольны, то паслаў бы яго, а то і ён жа прывязаны тут...

Юрка міжвольна адвярнуўся на дзверы і нібы жахнуўся, угледзеўшы Платона:

— А-а-а... І ты ў хаце? Якім жа чынам увайшоў, што мы і ня чулі? — запытаў ён сына. — Хіба ты, Юзя, яго прымеціла, ды мне нічога не сказала? — абярнуўся Юрка да жонкі.

— Н-не-э, я і сама не заўважыла. Чула, як бы нехта стукнуў, але, думаю сабе, мала што, мо вецер дзьвярыма... Цьфу, прымха нейкая! — зьдзівілася Юзя.

Платон, пасьмейваючыся, падышоў да стала і прысеў на ўслоне.

— У чым гэта рэч? Гэтак загаварыліся, што і мяне не заўважылі? — абярнуўся ён з запытаньнем да бацькоў.

— Х-ха-і... — у адзін голас памкнуліся казаць абое з бацькоў, але Юрка спыніўся і пераняў жонку:

— Ты маўчы, Юзя, дай мне сказаць.

— Чаму мне маўчаць? Я таксама пакуль магу казаць... Яшчэ язык не адсох, — вырачылася Юзя на мужа.

— Не адсох, не адсох... Залапатала-а!.. — засердзіўся Юрка. — Высахне, калі ня высах. Уся ссохнеш... Абое пасохнем... Не адсох, не адсох.

— Ша-ша, бацька, не сварыцеся! — пераняў бацькоў Платон. — Кажыце, у чым справа?..

— У чым справа! Ды ты, пэўна, ведаеш і сам. Чуў, нябось, сынок? Га?

— Што-о, што-о?

— Ліха ведае што! — Вунь толечкі што прыходзіў Майсей і вялеў заўтра ж зьбірацца ў падводы... З гэтым вось палком... На Варшаву, кажа. Ці чуў тое? Гэта ж ліха ведама навошта здалося... Маеш бітку, дык мусіш і яе страціць.

— Можа б ты, Платонка, што-кольвечы зрабіў. Табе ж, мабыць, хлопцы гэтыя з Чырвонае арміі знаёмыя? Такі-та ж ты лічысься іхнім камуністам, праз увесь час столькі папацярпеў, папахаваўся... Няўжо б нельга было б бацькам якое-колечы льготы зрабіць...

Платон якую хвіліну памаўчаў, як бы дабіраючы словы да гутаркі, пасьля ўстаў з заслона і паважна замовіў:

— Ведаеце што, бацькі? Я можа б і меў бы магчымасьць што-кольвек зрабіць, але — я не хачу... Едуць усе — трэба і нам ехаць. Хто можа чым-кольвек пасабіць — мусіць гэта зрабіць. Тут справа не чыя чужая, а свая. Наша сялянская, кроўная справа... Ды нельга, каб які-кольвечы Грышка ці Павал паказвалі пальцам увесь час ды казалі: «А чаму Гічка не паехаў? Чым ён лепшы нас?». Ехаць трэба ўсім. Толькі грамадою мы адаб'ём ворага. Паны гэта ведаюць і трымаюцца дружна. Вы не паедзеце, другія не паедуць, дык як жа тады быць? Пакінуць войска без абозу?.. Няможна. Гэта значыць — праз тыдзень вярнуць палякаў... Гэта значыць — праз тыдзень пачуць іх крык і пугу, праз тыдзень папасьці пад іх прыгон. Трэба ехаць, тата! Едзьце! — ні слова... Хай не паказваюць на нас пальцам... Прыйдзецца пацярпець — пацерпім, як і ўсе. Нам не прывыкаць... Цярпелі для другіх, трэба і для сябе.

Юрка ўважліва слухаў сына. Перш нездавальняюча ківаў галавою і разводзіў рукамі, а пасьля супакоіўся, удумаўся ў кожнае слова Платона і, відаць было па твары, пераканаўся ў праўдзе Платонавых слоў. Затое Юзя ніяк не хацела згадзіцца з сынам і нэрвова, пакуль Платон казаў, пазірала на мужа, крывілася і памыкалася перабіць сына, і толькі Платон змоўк, як Юзя накінулася на яго:

— Ах, які ты ўжо шчыры стаў! Так і рымсьціць, так і трасецца, каб не сысьці са сьцяжынкі. Падумаеш, дзякуй вялікі маеш за свае стараньні... Цалюткі год хаваўся, на валаску ад сьмерці ліпеў, а тут капейкі ў хаце не было; бацьку даводзілася за пяцьдзясят вёрст у дарогу езьдзіць, каб якую капейку зарабіць. А хіба хто ўвагу зьвярнуў ды памог? Дастанеш! А гэта вось зноў: падышло жніво, трэба сабраць сёе-тое з поля — дык бяры і едзь немаведама куды... А тут — перасьпявай на коласе; гінь, прападай... Каб ужо ды сам ты хаця быў пры хаце, а то ў кожную хвілю мусіш пакінуць нас. Падумай, гэта лёгка сказаць, а паспрабуй... Ды што казаць! Ты ўжо ў нас гэткі праведнік!.. Увесь век, толькі стаў на ногі, як усё за гэтым удараеш. Усё на кагосьці стараесься, бегаеш, езьдзіш, як бы ў цябе нічога і нікога няма. Вось жа і Тамаш Яўсігнееў лічыцца сацыялістам, а паглядзі ты: і за палякамі спакойна жыў, і цяпер... устроіць так, што ні ў абоз не паедзе, ні, крый чаго, з Маргоў не ўцячэ. Бо, вядома, дбайны...

Раззлаваўшыся як сьлед, Юзя не магла далей казаць і, абарваўшы гутарку, павярнулася да свае работы.

Юрка маўчаў і пазіраў у акно.

— Не гарачыцеся толькі, мама, — тым жа роўным, спакойлівым голасам, падышоўшы да печы, пачаў Платон, — вы мне празь дзесяць, калі ня болей, гадоў даяце свае рады. І прыпомніце, ці хоць бы раз яны падыходзілі да ладу. Так і цяпер. Нельга так разважаць, кажу я. Не паказвайце на другіх. Тамаш Яўсігнееў тут ні пры чым. Ён адно — а я другое. Хай сабе ён робіць па-свойму.

Бачачы настойлівасьць сына, Юзя захацела спагнаць злосьць на мужу.

— То ты ж чаго маўчыш? — абярнулася яна да Юркі. — Пэўна, ужо і гатоў ехаць? Угаварыўся...

Юрка адвярнуўся ад акна, сур'ёзным поглядам абвёў жонку і цьвёрда выказаў:

— Так. Такі я мушу ехаць... Калі трэба — то трэба. Платон праўду кажа. Не паеду я, не паедзе другі — дык што тады? Наша павіннасьць памагчы ім. Можа не памагчы Ігнась ці Саўка — ім паны лепш, а нам гэта кроўная справа.

Юрка паказаў пальцамі на Платона:

— Яны, глядзі, ня толькі для сябе робяць, а і для нас... Пан — вораг іх і вораг наш.

— Падумаеш! Дабра табе нарабілі! Вось паскубаюць, толькі ў гэтым іх дабро.

— Ша-а, Юзя, маўчы, — пераняў Юрка жонку. — Ужо, сапраўды, ты вельмі вырасьціла свой язык. Раз трэба ехаць — то трэба. Панам езьдзілі, чаму ж нашым адмаўляцца! Усё ж выбавілі нас. Мала мы панацярпелі? Колькі ты сама паплакала!

— Выбавяць... Выбавяць... Так выбавяць, што ворагам закажам.

— Кіньце, маці, — усур'ёз пераняў мацеру Платон, — ці ня брыдка плявузгаць ліха ведае што!

Юзя змоўкла і нэрвова зачасьціла стукаць сечкаю па лаве. Юрка, не зважаючы на злосьць жонкі, падышоў да Платона і пачаў радзіцца наконт таго, як і што заўтра зьбірацца ў дарогу.

— Я думаю, сынок, нас далёка не пагоняць. Немагчыма ж, каб я, стары, да Варшавы ехаў. Вось мо толькі да Вільні правядом і вернемся. Дык, я думаю, вазьму гэтыя старэнькія калёсы з нарадам, палажу палукашак — і добра будзе... Як ты кажаш?

— Ды ўжо, вядома, як-кольвечы, як магчыма!.. Хто ведае, як там будзе, — адказаў Платон, — можа, праведзяцё да Вільні, мо і таго бліжэй. Толькі раз выходзіцца, то трэба...

Платон не даказаў: падышоўшы да акна, Піліп Хрэн пераняў яго воклікам:

— Ці ты дома, Платон? А я ўжо каторы раз наведваю і ўсё не застаю цябе ў хаце.

— Чаго ён ужо пляцецца сюды? — сказала нездаволена Юзя. — Пэўна, да цябе, Платон. Прыяцель вялікі знайшоўся... Ты адно, сынок, не зважай на яго. Паддобрывацца будзе.

— Гледзячы што будзе казаць!

— Хоць бы што, — буркнула Юзя...

Піліп увайшоў у хату. Яго шырокі, аброслы барадою і бакамі твар, з вузкім вострым носам і сінімі вачыма, насупярэч заўсюдашняму вясёламу погляду, быў спакойна, нават крыху сур'ёзна настроены. Агледзеўшы хату і прывітаўшыся, ён адразу ня мог перайсьці да гутаркі і хвіліны са дзьве прастаяў моўчкі. Але ад гэтага стала яму няёмка, бо і Платон, і Юрка, і нават Юзя зьдзіўлена глядзелі на яго, чакаючы, што будзе казаць.

— Я, ведаеце, суседзі, да Платона прыйшоў, — пачаў Піліп, стоячы на адным месцы, — справа гэткая, што хоцькі ты тапіся...

— Ідзі прысядзь, Піліп... А то стаў у парозе, як які незнаёмы, і стаіць, — пазваў Юрка.

— Дзякую, — адказаў Піліп і прысеў на лаўцы ў мыцельніку.

— Я прыйшоў, ведаеце, прасіць Платона, ці ня мог бы ён як-кольвечы памагчы мне, — нерашуча замовіў Піліп.

— У чым? — запытаў Платон.

— Ай, у чым... — Піліп пачухаў бараду. — Ды ўсё ў гэтым абозе. Падумаў, браток, забяруць коней, а тут і сена прападзе, і збожжа некаму з поля сабраць, як з хлопцам паеду... Дома — адна хворая жонка з двума малымі. Што ж яна магчыме зрабіць? Проста бяда! Як сказалі мне, каб назаўтра зьбіраўся, дык праз цэлы дзень рукі не падымаюцца... Вось давай, думаю, забягу да Платона, няўжо ж такі ён не пасобіць мне. Такі-та ж ён у начальстве. Га, Платон? — лісьлівым голасам запытаў Піліп.

Платон засьмяяўся.

— Што сьмяесься? Пэўна, зьдзівіўся, што да цябе зьвярнуўся з просьбаю. Мабыць, успомніў нашу сварку пры немцах? Забудзь, братка. Мала што тады было. Дурасьць нейкая была запала ў голаў... А каб гэта я за што іншае — павер, што не! Я ніколі на сацыялістаў не даносіў знарок і цяпер бальшавікоў шаную... Гэта ж куды лепей за паганых паноў. Свае... Ты, Тамаш Яўгеневіч, Хаімаў хлопец — усё ж свае. Век зьвекавалі ў суседзях...

Юрка закурыў люльку і паважна смактаў яе, пускаючы дым як з коміна. Спакойная міна яго, здавалася, адбівала сабою гэткі ж спакой у яго нутры. Тое, што ў вуснах Піліпа лічылася суседзтвам, калісьці добра давалася ў знак Юрку. Го-о, каб то на другога — ён бы ў хату не пусьціў Піліпа. Юрка ж быў чалавекам мяккім і дабрадушным. Калі хто яго крыўдзіў, то ён ня больш гадзіны трымаў у сабе злосьць на крыўдзіцеля, а пасьля зразу дараваў крыўду і адыходзіў сэрцам. А калі прасіў прабачэньня, то таму Юрка ня толькі дараваў, нават і шкадаваў яго. Піліп мала таго што не перапрашаў за частыя крыўды Юрку, а як бы знарок час ад часу аднаўляў іх. Але варта было стрэцца Юрку зь Піліпам на другі дзень пасьля ўцёку палякаў і пачуць ад яго мяккае слова, як Юрка напалову дараваў яму сваю крыўду. Цяпер жа вось, калі Піліп зайшоў у хату і гэткім пакорліва-лісьлівым голасам пачаў сваю гутарку, Юрка сядзеў і думаў: «Усё ж Піліп — чалавек як чалавек. Мала што калі здуру зрабіў! Ці ж варта злаваць на яго». І Юрку захацелася, каб сын не адказаў у просьбе Піліпу. Што ён багаты, што паехаць у фурманку для Піліпа нічога ня ўтратна, бо і жонка яго ня так ужо хворая, і малыя дзеці ня так ужо малыя, — гэта ўсё было дарма і незаўважна для Юркі. Так пакорліва ўжо просіць Піліп! Юрка зь цікавасьцю аглянуўся на сына, чакаючы, што ён адкажа Піліпу.

Юрку лісьціла за Платона, за яго становішча, і хацелася бачыць, наколькі ён мае вагу зрабіць ці не зрабіць тое ці іншае. Паказаць Піліпу дабрату — то б сьведчыла, што ён залежыць ад Платона. Калісьці, гадоў пяць назад, Платон быў у Піліпа самым зьненавісным чалавекам. Дзе сьлед, а дзе ня сьлед, Піліп яго лаяў, выдаваў, паскудзіў і абяцаў розныя кары. Хай жа цяпер пераканаецца, як апасьліва бывае займаздароў, бяз дай прычыны ганьбіць чалавека.

— Не, дзядзька, я вам нічога не пасоблю, — адазваўся Платон, калі Піліп кончыў. — Я, па-першае, мушу выпаўняць прыказ старшага вайсковага начальства, а па-другое, я вось і роднага бацьку выпраўляю. Я гляджу так: калі вы мусілі, а не — то і вольна памагалі палякам, то не павінны адказвацца рабіць дапамогу і нашым, тым болей што вы гэта можаце зрабіць: маеце пару коней, маеце сына...

Юрку як бы стала няёмка, што сын так проста і адкрыта выказаўся перад Піліпам, і ён адвярнуўся ў акно.

— Няўжо-такі ты напраўду не паможаш нічога бацьку? — хітра падышоў Піліп. — Мне ўсё ж такі думаецца, што ты бацьку выбавіш... Вунь я бачу Мікіту Брушку, той мне хваліўся, што яго сын Паўлусь, бач, зрабіў так, што не паедзе ні ён, ні яго брат. Паўлусь прыпісаў іх да рэўкому і так затрымаў. Пэўна, і ты бацьку выбавіш... Што б табе заадно і мяне! Га, Платон? Я б за гэта табе аддзякаваў удвойчы. Хоць бы аднаго каня заставіць...

— Ды што ты, Піліп, — азвалася дасюль маўчаўшая Юзя, — ён у нас да таго верны служака, што і на ногаць ня хоча ў свой бок перадаць. Навошта дарэмна казаць. Другія, глядзі, вунь... зямлі набяруць, і кароў, і ўсякая ўсячына.

— Вось ты хаця маўчы, — пераняў жонку Юрка. — Мала хто як вядзе сябе. У Платона сваё разуменне. Ужо б, пэўна, ён зрабіў бы што-небудзь Піліпу, а бачыш, нельга, значыць...

Піліп ліхамысна скрывіў міну, пачасаў патыліцу і адказаў:

— Тут, мабыць, ня што іншае, як аддзяка мне за ранейшае. Што ж, нечага рабіць — выбачайце! — Піліп падняўся. — Гэткі ўжо сьвет цяпер: хто дужшы — той прутшы. Прыйшлі бальшавікі — ваш верх. Але яшчэ невядома, чым кончыцца...

— Прашу не абражаць Савецкае ўлады, — перабіў раззлавана Платон, — яна прыйшла не прыгнятаць, а вызваляць бедных людзей і іх краіну. І лаяць яе я не дазволю... — Платон зьнізіў голас. — Трэба вам, дзядзька, зразумець, што тут ня гандаль які вядзецца, а аддаецца павіннасьць агульнай справе. Чаго ж ухіляцца ад гэтае павіннасьці...

— Н-ну-у-у, як разумееш!

Піліп выйшаў з хаты. За ім усьлед — Юрка.

— Вось бачыш, ніякага сораму нямае, — адазвалася Юзя, — здавалася б, і ў вочы брыдка паказацца, а то-та ж — прыйшоў, як нібыта той. Пасоб, памажы...

— У тым-то і рэч. Астанься бацька ўдому, дык тады пальцамі затыкаюць. І цяпер вось што гавораць. Думае, што я помшчуся, калі не раблю таго, чаго яму хочацца, а бацьку застаўлю дома... Хітрыя, кулаччо!..

Юзя змоўкла. Платон задуменна прайшоў некалькі разоў па хаце і пасьля выйшаў на двор.

На вуліцы стаяў гоман і беганіна. Каля суседняй хаты сабралася грамадка мяшчан, якія пільна і клапатліва разважалі пытаньне з фурманкамі. Раптоўнасьць гэтае прыгоды вельмі занепакоіла ўсіх.

Кожны выказваў свае погляды на трапленае і намячаў выйсьце. Угледзеўшы Платона, некалькі чалавек з грамадкі зьвярнуліся да яго з запытаньнем:

— Платон, ці нельга было б прасіць у цябе заступніцтва?

— Не, мужчынкі, тут я ўжо вам не пасаблю нічога. Прыйдзецца ехаць. Пасобце Чырвонай арміі. Гэта ваша павіннасьць для саміх сябе...

— Гэ, яго бацька астаецца, яму няма чаго непакоіцца, — упікнуў адзін з грамадкі.

Некалькі чалавек падмацавала яго голасным «Але, але! Што ж дзіўнага!».

Платон нездаволена махнуў рукою і вярнуўся ў хату.

II

Назаўтра Гічкава сям'я прачнулася раньняй раніцаю. Юрка пачаў зьбірацца ў дарогу. Платон яму пасабляў. Юзя ўвіхалася каля печы, каб згатаваць сьнеданьне. Праз ноч яна адышла ад злосьці і прымірылася з пастановаю мужа і сына — не адпрошвацца ад падводы. Не прыходзілі ў голаў думкі, каб яшчэ паспрабаваць угаварыць сына заставіць Юрку дома. Юзя ведала нораў аднаго і другога і лічыла дарэмным пачынаць усякую гутарку: «насталі — то зробяць».

Юзю непакоіла адно — не застацца б ёй і без Платона. Яна, як і большасьць мяшчан, ня верыла ў цьвёрдасьць становішча. Што ж будзе, калі яна застанецца адна? Юзі хацелася абгаварыць гэта пытаньне пры мужу і пры сыне. Ходзячы каля печы і гатуючы сьнеданьне, яна раз-поразу пазірала ў акно, каб упэўніцца, ці ў двары мужчыны. На вуліцы чуўся крык і суятня. Хаця б не пагналі раптоўна, ня даўшы якраз сабрацца? Каб гэтага ня здарылася, Юзя рашыла мужчын зазваць у хату.

— Юрка, Платон, дакуль вы там ня ўходзіцеся? Ідзеце ў хату, зараз сьнеданьне будзе, — пагукала яна.

Мужчыны ўвайшлі.

— Вось што, родныя мае, — абярнулася да іх Юзя, — час ідзе, а мы ж яшчэ не парадзіліся нават, як будзе хата? Адзін едзе зараз, а другі — у кожную хвіліну таксама можа пакінуць мяне. Дайце абгаворым, што прыйдзецца мне рабіць?

Юрка прысеў каля стала і, падумаўшы, адказаў:

— Што ж я! — я нічога! Няхай Платон кажа. Калі я паеду — пэўна, ён тут магчыме застацца... Чуеш, сынок? Дагледзіш ты хаты і мацеры?

Платон упэўнена адказаў:

— Трэба будзе.

— Ну, а калі самога пагоняць куды? — запыталася Юзя.

— Нічога. Тады рэўком пасобіць... не бядуйце.

— Ой, глядзі, Платонка. Ты дарэмна так запэўняеш, — сумелася Юзя. — Паедзеш куды, а мне — пропадам прападай.

— Ня бойцеся, маці, я ня дам прапасьці... Ну, давайце сьнедаць, ды трэба бацьку ехаць, — каб не зацягваць каразьлівае гутаркі, папрасіў Платон.

Юзя паслухна падала на стол сьнеданьне, а сама задуменна выйшла ў сені. Юрка з Платонам пачалі есьці.

III

Пасьнедаўшы, Платон з бацькам паехалі да рэўкому. На вуліцы і на рынку пакуль не відаць было ніводнае фурманкі. Яны пад'ехалі да будынка рэўкому і прыпыніліся. Юрка застаўся на возе, а Платон пайшоў у канцылярыю.

У канцылярыі рэўкому было ўжо некалькі чалавек з рэўкомцаў, у тым ліку Тамаш Яўгеневіч, Сіман Хаімаў ды іншыя. Угледзеўшы Платона, Тамаш запытаў яго:

— Ну, як з фурманкамі? Зьбіраюцца?

— Пакуль не відаць... Толькі вунь мой бацька стаіць.

Яны прайшлі ў асобны пакой і паселі каля стала.

— Стараесься ты, Платон, як я бачу, — іранічна выказаў Тамаш.

— Чаму? — зьдзівіўся насур'ёз Платон.

— А вось бацьку першым выпраўляеш. Пэўна, хочаш паказаць гэтым, што...

— Выбачай, браце... Я гляджу так, што тут не павінна быць ніякіх льготаў. Ня пусьціш ты свайго бацькі, не пушчу я — тады што выйдзе? Кожны будзе пальцам паказваць на нас, кажучы: «Вось табе раўнапраўе і свабода». Не, брат, нам патрэбна другім прыклад даваць. А то вось ужо ўчора да мяне прыходзіў адзін сусед і прасіў, каб я пасобіў яму застацца і не паехаць. І калі я сказаў, што я і бацьку выпраўлю, дык ён, думаеш, паверыў? Хай жа бачыць, што я ў абавязках да справы не знаходжу розьніцы між бацькам і чужым.

— А ты думаеш, што гэта пасобіць? Нічога! Усё роўна будуць казаць усякія плёткі. Кулаччо — ласьне яно паверыць у тваю шчырасьць? Ня думай, — адказаў Тамаш. — Куды табе раўняцца? Твой бацька стары, маці старая... Я б, ведаеш, ня радзіў бы справаджаць бацьку ў фурманку. Мала што можа трапіцца ў дарозе, а ад гэтага...

Платон крыху задумаўся і памаўчаў.

— Ведаеш, Тамуля, я ўсё-ткі не магу гэтага зрабіць, — адказаў ён, — трэба пасабляць чым мага. Ідэю трэба ажыцьцяўляць і, ажыцьцяўляючы, даваць прыклады другім... Вось паглядзі ты...

Платон спыніўся, ня ведаючы, выказаць ці не перад таварышам чутае аб ім. «Скажу, што ж дрэнна ў тым», — парашыў ён. Але пасьпеў адчыніць рот, як Тамаш яго папярэдзіў, улавіўшы Платонаў намер:

— Ну, ну, кажы. Што ты спыніўся?

— Ды тут, бач, нічога такога няма. Я хацеў толькі сказаць, што... ужо ходзяць чуткі, нібыта Паўлусь Брушка вызваліў ад фурманкі ня толькі бацьку, а і дзядзьку.

— Чу-ткі-ы? Ласьне гэта на карысць справе? Чорт яго ведае, гэтага Паўлуся. Як ён ня можа нічога цішком зрабіць. Ды, галоўнае, і дзядзьку! Вядома, што так нельга. Гэта ж сапраўдны кулак, — занедаволіўся Тамаш.

— Ну вось бачыш...

Платон не даказаў. Стук у дзьверы каморкі, дзе ён сядзеў з Тамашом, перабіў іх гутарку. Платон ускочыў зь месца і адчыніў дзверы. За дзьвярыма стаяў яго бацька.

— Што ж ты так засядзеўся тут, — дакорліва сказаў Юрка, — я чакаю-чакаю, а цябе няма. Трэ было б яшчэ парадзіцца аб сім аб тым перад ад'ездам, а ты тут увесь час прасядзеў...

— Дык давайце, — згадзіўся Платон.

— Куды там давайце. Ужо людзі паехалі. Я забег сказаць, што і я еду...

Яны ўдваіх, пакінуўшы Тамаша, выйшлі з рэўкому на пляц. На пляцы ўжо стаяў цэлы кірмаш фурманак. Грамадкамі між вазоў, паадзяватыя ў дарогу, з клумкамі стаялі мяшчане. У напрамку павятовага шляху адмячаўся руплівы рух. З-за мястэчка з боку таго ж самага шляху даносіўся заціхаючы сьпеў войска.

— Бацька, — абярнуўся Платон да бацькі, — ты далёка ня едзь. Правядзі да Слоніма і варочайся. Адпрасіся — ты ж стары...

— Ды ўжо там убачым. Буду старацца празь дзён пяць вярнуцца. А вось ты тут... Не пакінь, нябожа, мацеры; яна адна прападзе ў выпадку чаго. Не пакідай яе... Наймеце якіх пару жанцоў і сажнеце жыта, пакуль я вярнуся, — парадзіў Юрка.

Ён хацеў яшчэ дапамяноуць нешта наконт гумна, але ззаду падалі крык:

— Займай чаргу, стары!

Юрка ўзяў каня пад аброць і ўехаў у агульную чаргу.

Платон стаў на ўзгорку збоку і глядзеў усьцяж шляху, па якім, мо на дзьве вярсты працягам, шэраю вужакаю віліся падводы. Густы слуп пылу, каламуцячы паветра, паднімаўся ўгару.

IV

Першыя два дні пасьля ад'езду бацькі Платон настолькі быў захоплены работаю ў рэўкоме, што дахаты паказваўся ня больш як на дзесяць хвілін, каб перакусіць, і зноў зараз жа варочаўся ў рэўком.

Юзя гневалася на яго, злавала, што ён зусім пакінуў гаспадарку і забыў пра яе, сьвету ня бачыць за рэўкомам.

— Хай бы ты, сынок, хоць часіну аддаў для мяне: трэба ж парадзіцца, трэба агледзецца. Ты ж мусіш за гаспадара ў хаце быць — бацькі няма. А табе, як чужому, няма ні мацеры, ні дому. Гэта ж трэба так моцна ўесьціся ў сваё гэта бальшавіцтва. То ж сьвет мо ня бачыў такіх шчырых і заўзятых служакаў, як ты. Няўжо табе трэба больш, як усім. Няўжо цябе царом зробяць, калі ты так будзеш старацца...

— Маці, маўчы, — на хаду закідаў Платон, — мне трэба ня больш, як усім. Мне нават зусім нічога ня трэба. Я мушу аддаць, што магу, той думцы, якая арудуе мною ўсё жыцьцё.

— Ах, які ты ўпарты, сынок! — пускала Юзя ўдагон Платону.

Але Платон ужо ня слухаў. Трэ было пасьпяшаць у рэўком і абгаварыць там пытаньне аб арганізацыі ўлады па ўсяму раёну.

Чырвоная армія праз кожную гадзіну аслабаняла ўсё новыя абшары краю. У кожную вёску трэ было пасылаць хоць па два чалавекі. А іх было так мала. Шмат выдзяляла работнікаў Чырвоная армія, але трэба было кожнага намеціць, куды пасылаць, на якое месца назначыць, каб ён адпавядаў яму.

Да позьняе ночы цягнуліся пасяджэньні, натужныя, нэрвовыя. Платон слабеў, таміўся і, вярнуўшыся ўночы, хутка еў і кідаўся ў пасьцель.

Толькі на чацьвёрты дзень як быццам бы гарачка крыху спала, і Платон, пасядзеўшы ў рэўкоме да абеду, пайшоў дахаты. Ён ужо ня думаў вярнуцца ў рэўком, а рашыў другую палову дня застацца ў доме, адпачыць і разам абгаварыць з мацераю дамашнія справы. «Ды, к гэтаму, — думаў ён ідучы, — павінен бацька хутка вярнуцца. Ня мусіць жа ён ехаць бясконца... Падвязе вярстоў за сто, а там ужо зьменяць другія. Яно б хай бы сабе ехаў і далей, толькі стары замучыцца ў доўгай дарозе. А тут яшчэ гэта жнітво... Сапраўды, што ж маці зробіць, калі мне прыйдзецца куды выехаць!»

Прыйшоўшы дадому, Платон мацеры не застаў: яна незадоўга перад абедам пайшла ў жытні палетак паглядзець, у якім становішчы жыта. Платон сам знайшоў яду, паабедаў і сабраўся прылегчы. Але толькі ён пасьпеў разуцца, як знадворку пачуў гутарку. Ён барджэй назад усьцягнуў боты на ногі і пабег да акна. У сенцы якраз уходзіла маці і стораж рэўкому, Яўхім.

— Навошта ён вам? Дайце хаця паабедаць вольна, — казала рассерджаным голасам Юзя.

— Я ня ведаю нічога. Мяне паслалі, і я прыйшоў. Пільна патрабуюць, — адказаў Яўхім.

«Што за ліха! Навошта я ім? — падумаў Платон, абярнуўшыся да дзьвярэй і чакаючы ўваходу Яўхіма. — Нядаўна нікога не было, а гэта вось насьпела: дыхнуць ня могуць безь мяне. Галава трашчыць — а і гадзіны нельга супачыць...»

— На, вось ты мо даўно ня бачыўся, дык маеш, — пераступаючы парог і паказваючы на Яўхіма, які ішоў сьледам, злосна выказала Юзя. — Чаго такі табе так пільна патрэбна там быць? Ласьне ты даўно ўжо ўдому?

— Чакайце-э... толькі, маці...

Платон узяў ад Яўхіма запіску, прачытаў і ўголас выказаў:

— Што за прымха! Надало яму прыехаць. Тут ужо нечым пахне. Пэўна, якое-кольвечы экстранае здарэньне. Ну, ідзіце, дзядзька, скажыце, што я зараз прыйду, — прамовіў ён да Яўхіма.

Яўхім павярнуўся і выйшаў з хаты.

— Што гэта там? Якая такая справа, што ажно падаслалі? — пацікавілася Юзя і, пакруціўшы незадаволена галавою, дадала: — Вунь людзі ўжо жнуць. І наша жыта ажно шамціць — сьпелае. Трэба жаць, а то колькі яго ёсьць і тое гатова прапасьці.

Яна з хвіліну памаўчала.

— А ў мяне, на бяду, штосьці так пачало калоць у баку, што сагнуцца нельга... Платонка, няхай бы ты як-кольвечы выпрасіўся на дзень ды справіўся з жанцамі... Няўжо там не абыдуцца і дня безь цябе. Га?.. Ты ж і так...

— Добра, добра... Я гэта пастараюся зрабіць... можа, заўтра ўранку...

— Заўтра?! Чаму ж ты так кажаш? Чаму заўтра? Жанцоў сягоньня трэба заладзіць, каб заўтра ўжо ўпэўненым быць... А то яшчэ дзень-другі — і жыта перастаіць, паломіцца, асыплецца... Ты зайдзі вось зараз да Міхаліны і да Алены і папрасі іх...

— Не, не. Цяпер я не магу. Я вечарам толькі вярнуся з рэўкому.

— З рэўкому... Ай, гэты мне твой рэўком омегам вылазіць, — чуць ня ў крык вымавіла Юзя і хутка кінулася ў сені, сярдзіта стукнуўшы дзьвярыма. — Ты і бацьку выправіў, як у пекла... Паўлусь, нябось, хоць таксама рэўкомец, а глядзі, вунь бацьку дома затрымаў... Тамаш таксама! — крычала яна ў сенцах.

Платон моўчкі абышоў мацерын крык і пасьпешна панёсься ў рэўком.

V

— Таварыш Гічка, вы няшчыра адносіцеся да справы, дазвольце вам сказаць, — сустрэў Платона прыежджы з павету таварыш. — Мы ўжо вас чакаем болей паўгадзіны. Ведаеце, што справы не чакаюць.

Платон ускіпеў ад злосьці і перш хацеў падаць адпаведную спрэчку за незаслужаную вымову, але ў рашучую хвіліну стрымаўся і змаўчаў.

— Ужо ўсе? — запытаў у Тамаша той жа таварыш з павету. — Можа, можна пачынаць?

— Яшчэ няма Паўлуся Брушкі, — адказаў Тамаш, — але ён павінен скора прыйсьці, так што чакаць далей ня варта.

Усе — было каля дзесяці чалавек — перамясьціліся да стала, пацісьнуліся шчыльна адзін к другому і настаражыліся слухаць, што скажа прыежджы таварыш. Платон, абражаны раней, сеў з краю і штосьці думаў асабістае.

— Таварышы! — пачаў прыежджы таварыш. — Мяне прыслалі з павету да вас, каб я тут зрабіў мабілізацыю таварышаў. У вас на мястэчка многа сілаў не патрабуецца, між тым вакол вялікая патрэба ў людзях. Не хватае людзей у павятовыя рэўкомы і рэўкомы многіх мястэчак і гарадкоў. З цэнтру націскаюць, каб давалі людзей... Вось на пасяджэньні павятовага камітэту і рашано забраць ад вас хоць бы двух чалавек. Ну, што вы скажаце на гэта?

Нейкі час ніхто не адазваўся. Толькі падазрона адзін на другога паглядзелі. Пасьля, каб згладзіць няёмкасьць, Тамаш спакойлівым голасам падаў:

— Калі, то аднаго таварыша, дваіх ніяк няможна. У нас таксама шмат работы.

— У вас жа вось цэлая капэля людзей! — выказаўся прыежджы таварыш. — Што вам тут усім рабіць? Вы забываеце, таварыш, што Беларусь ня месьціцца ў адным вашым мястэчку. Тут вы трымаеце столькі лішніх людзей, што трэба дзіву давацца, ды яшчэ супярэчыце мабілізацыі двух таварышаў. І гутаркі не павінна быць — двух таварышаў я мушу ўзяць з сабою абавязкова.

Рашучасьць, зь якою казаў прыежджы таварыш, ясна сьведчыла, што рашэньне ўзяць зь мястэчка Маргі двух чалавек было цьвёрдым. Было дарэмна адгаварвацца і супярэчыць. Тут ішла рэч аб пастанове камітэту, аб справах рэвалюцыі. Гэта адчулі ўсе як адзін і моўчкі выказвалі згоду адпусьціць дваіх. Але каго? Прапанаваць другога, таго ці іншага, ніводзін не хацеў. Усе чакалі прапазыцыі з боку прыежджага таварыша...

— Дык вось, таварышы! — не дачакаўшыся адказу, выказаў павятовы таварыш. — Нам сёньнека патрэбна выехаць. Каб ня траціць часу, намячайце кандыдатаў. Пакуль яшчэ яны зьбяруцца... Хто ў вас менш заняты і без каго можна было б абысьціся пакуль што?

Рэўкомаўцы пераглянуліся і зноў ня ведалі, што сказаць.

— Вы ж павінны ведаць, таварыш, — абярнуўся прыежджы таварыш да Тамаша.

Тамаш сумеўся і, каб мінуць нерашучасьць, сказаў:

— Платон Гічка і Лукаш Цяўе, бадай што, лепш другіх падходзяць.

Тамаш пытальным поглядам кінуў у вочы супроціў яго сядзячаму таварышу Аўсею. Той пацісьнуў плячыма і змаўчаў.

— Чаму няйначай Платону? — раптам запытаў Платон. — Ласьне я менш заняты за цябе? Хай скажуць таварышы. Ды да гэтага яшчэ — маё дамашняе становішча, як табе ведама... Бацька адправіўся ў абоз, а дома адна старая маці... Жніво падасьпела...

Прыежджы таварыш чэрства паглядзеў на Платона, кіўнуў галавою і сказаў:

— Таварыш! Нам няма чаго чапляцца за розныя прычыны. Сям'я, дамашняе становішча — гэта буржуйныя забабоны, зь якімі нам не належыць лічыцца. Рэвалюцыя вышэй усяго. Калі вы шчыры рэвалюцыянэр, вы не павінны былі б...

— Так, я шчыры рэвалюцыянэр! — узнятым ад крыўды голасам выгукнуў Платон, перарваўшы дакорлівы маналёг прыежджага таварыша. — Маю шчырасьць можа кожны з таварышаў засьведчыць. Я цэлы год працаваў падпольна, соткі разоў быў на валаску ад сьмерці. А ў гэты час бацькі бяз хлеба сядзелі. І сам я ня меў каліва дапамогі. А другія ў той час лаўнікамі служылі ў палякаў... Вы абмыляецеся, таварыш, калі кажаце так...

Ніхто нічога ня мог адказаць Платону на яго словы. «Другія лаўнікамі служылі» — то адносілася да Тамаша, які пачырванеў на твары ад Платонавых слоў. А прыежджы таварыш бачыў на мінах многіх, што яны хоць маўчаць, але спагадаюць Платону. За свой няўтрыманы выказ ён адчуваў нейкую няёмкасьць. Яму ўжо хацелася выкупіць сваю віну адказам мабілізаваць Платона, замяніўшы яго другім. І ён задумаўся, як ямчэй зрабіць адыход ад сваіх слоў.

— Ды ўжо, калі гэтак, я гатоў, — пасьля некаторай маўчанкі праказаў Платон, перабіўшы думку прыежджага таварыша. — Я ніколі ня здраджваў той справе, якой больш дзесяці гадоў шчыра служу, і ня здра-а-джу-у. Патрэбен ёй — бярыце. І думаць нават нікому не дазволю гэтага. Я згодзен ехаць! Думаю, што і Лукаш Цяўе зробіць тое самае.

Каб зьмякчыць настрой, таварыш з павету сказаў:

— Таварыш Гічка! Пэўна, калі ваша гэткае становішча, безумоўна, вам трэба застацца на месцы. Вас могуць замяніць другія. Я тут мала знаю ваша становішча.

— Нне-э! Ужо няма чаго далей зацягваць: я еду! Вось пайду зьбяруся і прыйду.

Дэманстрацыя Платона перабіла далейшыя гутаркі. Так ужо склалася становішча, што нельга было ні пярэчыць рашэньню Платона, ні адмяняць мабілізацыю. Трэ было спыніцца на тым, што ёсць, — і нарада на тым спынілася.

Платон з Лукашом пакінулі рэўком і пасьпяшылі дахаты.

На вуліцы цямнела.

VI

Платон не заўважыў, як апынуўся каля хаты. Аб тым, што абяцаў мацеры заладзіць на заўтра жанцоў, ён забыў суйздром. Яго непакоіла за мацеру. «А што, калі бацька прабудзе там яшчэ тыдняў са два? А што, калі, крый чаго, ды няшчасьце якое здарыцца? — разважаў Платон, міжвольна прыпыніўшыся ў сваім двары. — Добра б было, каб мне скора вярнуцца. А то ўсяк можа быць. Увойдзеш у працу — і ніяк нельга будзе яе кінуць... Не паехаць бы? Не — гэтага нельга даводзіць. Немажліва пакінуць бязьлюдным месца, дзе патрэбна замацоўваць уладу. Сапраўды, нас тут досыць і пяці чалавек. Адчыняюцца новыя абшары, сьвежыя, якія патрабуюць многа сіл і працы. Не паехалі б знарок за людзьмі, каб ня экстраная патрэбнасьць у іх. Так! Трэба ехаць! Я мушу ехаць! Не паеду я, другі — як жа тады быць?»

Платон рашуча ўвайшоў у хату. Маці ляжала на палку ў запечку і паціху стагнала. На прыпечку сьвірэла газьнічка.

— Што з вамі, маці? — палахліва запытаў Платон.

Юзя енкнула мацней і зацяжным, перарыўным голасам адказала:

— О-ох, сынок! Вельмі моцна ў баку закалола. Якраз на змроку пачула, перш ціха, зьлёгку, а пасьля ўсё горай і горай, а зараз — слова сказаць трудна... Скажы-ы, Платонка, — перайшла яна на другое, — ты ня стрэўся з Макарам Плеўкаю? То-о-лечкі выйшаў. Ізноў прыходзіў па справе з агародамі... Прасіў перадаць табе, што ён аддзякуе, калі толькі ты зробіш што-кольвечы, каб ён мог яго напалову зжаць...

— Ах, як ён мне надаеў, гэты Макар! — злосна вылаяўся Платон. — Што ён думае, пэўна, што я гандлюю савецкім правам! Бессаромны-ы! Лайдак! Абабраў беднага чалавека і думае, што па галоўцы яго буду гладзіць...

— Казаў, ведаеш, Макар, бач, — асьведамляла Юзя сына, енчачы, — што ён ужо перагаварваў з Ладымерам Цэўкаю... Той, кажа, згадзіўся...

— Усе-э яны гэткія... Цэўкі, Брушкі-ы... Назола. Момантам карыстаюцца — ня болей! А яшчэ дым пускаюць у вочы аб сваёй рэвалюцыйнасьці...

Платон падышоў да акна, паглядзеў на двор, памаўчаўшы крыху, пасьля спакойлівым голасам зьвярнуўся да мацеры:

— Матка. Ведаеце што? Я мушу сёньня ехаць у павет. Няйначай. Пастаноўлена. Вы ўжо тут як-небудзь дайце знаць гэтым жанкам, каб прыйшлі жаць, хоць пазаўтра. А я буду прасіць Тамаша — хай пасобіць зьвязьці. Ён павінен гэта зрабіць... Ды, я думаю, бацька прыедзе хутка...

Выслухаўшы сына, Юзя разгорнілася, завойкала часьцей і пачала наракаць на Платона:

— Як табе ня сорамна, сынок... пакідаць мяне адну ды хворую... Што ты сабе думаеш... Няўжо б ты ня вытрываў на гэты раз?.. Няхай бы цябе абмінулі... А каб то не было цябе, што б тады рабілі? Эх, Платонка, і ня сорам табе рабіць так? Гэта ж людзям на пасьмешышча будзе. Скажуць: мацеру адну пакінуў уміраць, а сам усё з гэтай рэвалюцыяй... Адумайся, апамятайся...

Апошнія словы Юзі перайшлі ў балючы зацяжны енк. Платон, слухаючы яе, ня меў мажлівасьці ўсядзець на месцы і пачаў тупаць па хаце. Ён ня ведаў, чым суцешыць маці, чым даць ёй зразумець пераважнасьць спраў рэвалюцыі над справамі сям'і. Побач з гэтым перад ім мігнула думка, ці не ўзваліць віну на ўвесь рэўком, які не прыняў на ўвагу яго сямейнае становішча, але тут Платон баяўся сысьці з рэвалюцыйнага разуменьня пытаньняў. Яму здавалася, што рэвалюцыянэр не павінен мець жаднае спагады. Усё, што побач рэвалюцыі, то, безумоўна, ніжэй яе па значнасьці. Так Платон думаў праз доўгі час свайго сьвядомага жыцьця. Дзеля рэвалюцыі ён ахвяраваў пачуцьцём кахання, пакінуўшы без адказу просьбу каханай дзяўчыны не выяжджаць на падпольную працу пры немцах. Дзеля ідэі рэвалюцыі ён забываў бацькоў, ня ведаючы, як і што яны жывуць, як іх становішча пад палякамі. З гэткім жа пачуцьцём Платон падаў сваё рашэньне ў рэўкоме ехаць яму першаму. Але цяпер, калі прыйшоў дамоў, каб сабрацца ў дарогу, і застаў хворую маці адну-адзінюткую ў хаце; цяпер, калі ў муках болю старая застаецца безь нікога, хто б правёў яе, можа, на сьмерць, — цяпер Платон мусіў крануцца ў непарушнасьці сваіх думак. Набягалі навеі сумненьня, зьявілася хаценьне знайсьці тую ці іншую аслабнасьць у пазывах свайго рашэньня ехаць. «А мо і назаўтра застацца? Няўжо нельга прапусьціць і адной ночы? Часта ж бывае, што пры зборах трацяцца цэлыя дні. А ўсё ж становішча вытрымоўвае, як бы чакае. Ніхто ня кажа, што так добра; гэта вада, гэта недастача. Але бяз гэтага не мінае. Ну, дазволіць, што я загадзя адзнаў гэта і не павінен быў папускаць сьвядома. Ды бываюць увагі на ўсё. Бываюць сур'ёзныя ўвагі. Вось гэткая ўвага стала і перада мною. Хто можа сказаць, што мною кіруюць буржуйныя забабоны? Хто асьмеліцца западозрыць мяне ў няшчырай адданасьці справе рэвалюцыі?»

Усё гусьцей і гусьцей апляталі Платона гэткія думкі. Зацягвалі ў сябе, як дрыгва, зачынялі яснасьць сазнаньня.

Маці не сьціхала балюча, а ўсё зацяжней ды зацяжней войкаць і ўздыхаць; штосьці неразборна выказвала да яго, а Платон ня чуў. Яго сьвідравала пытаньне: што сказаць мацеры, чым яе суцешыць і як апраўдаць свой ад'езд.

— Платон-он! — раптам пачуў ён у дваровым акне.

То быў Лукаш Цяўе...

Платон раптам азірнуўся да акна і, забыўшыся аба ўсім, што думаў, адказаў:

— Я! Іду вось!

І тут жа адзеўся ды намерыўся ісьці. Але, зрабіўшы колькі крокаў да дзьвярэй, Платон вярнуўся, падышоў да мацеры, зазірнуў ёй у твар і, бачачы, што яна нібы суцешылася крыху, падумаў: «Авось, можа, ды ёй лягчэй стане. Заскочу да Глытваў і папрашу каго-кольвечы зайсьці пераначаваць». Падумаў так і выйшаў з хаты. Газьніцу аставіў гарэць.

— Лукаш, — пазваў ён таварыша.

— Я тут! — азваўся Лукаш.

— Пачакай толькі крыху, я яшчэ... — папрасіў Платон і, стаўшы на прызьбе, прытуліўся вухам да акна.

— Чаго ты прыслухоўваесься? — запытаў Платона Лукаш.

— Маці, брат, мая моцна занядужала; я вось слухаю, ці...

— Як! Калі? — пацікавіўся Лукаш.

— Сёньнека... Я прыйшоў з рэўкому і застаў яе лежачы... А тут яшчэ бацькі няма ўдому, і я ня ведаю...

— Дык чаму ж ты так настайваў, каб ехаць? Як жа ты кінеш мацеру адну? Ці ж бы Тамаш, або Паўлусь, або Бэрка не паехалі?

Платон памаўчаў, стоячы на месцы: штосьці трымала яго ў двары, як прыкаваўшы да зямлі.

— Я і сам ня ведаю, што рабіць, — спусьціўшы колькі часу, сказаў Платон. — Не паехаць — здрадзіш рэвалюцыі, нарушыш дысцыпліну і... бачыш, як думаюць другія. А паехаць — можаш мацеру пахаваць... Каб то ведаў, што ня так сьпешна — пераначаваў бы і заўтра...

— А мо ёсьць каго папрасіць, каб пасядзелі каля мацеры? — спагадаў далей Лукаш Платону.

— Няма такіх... Вось хіба адны Глытвы; я ўжо думаў зайсьці да іх... Хадзем...

Яны выйшлі з двара і павярнулі направа. На вуліцы было ціха. Толькі ў рэдкіх хатах сьвірэў агеньчык; большасьць мяшчан спалі, каб заўтра з раніцы ісьці на жнітво. Дзесь у канцы вуліцы бразчэла варта і сьвістаў сьвісьцёл патруля.

Платон з Лукашом моўчкі прайшлі невялікі кусок, мінуўшы хат са тры.

— Чакай, Лукаш, я зайду да Глытваў: яшчэ ня сьпяць, — папрасіў Платон таварыша, супыніўшыся ля чацьвёртае хаты.

Лукаш прысеў на прызьбе, а Платон пайшоў у двор.

— Я скора, — падаў з двара Платон і стукнуў дзьвярыма.

Лукаш падняўся з прызбы і адышоў на вуліцу. «Цікавы ўсё ж гэты Платон, — разважаў ён, уваходзячы ў становішча таварыша. — Гэткае заблытанае становішча ў хаце, а рвецца, першым пражэцца адгукнуцца на прызыў. Вось дык натура! Пашукаць! Не раўня гэтым... Каб гэткіх ды больш! Го... Тады б можна было сьвет перавярнуць. Столькі пэнту, адвагі! Мне — дык проста пазавідаваць...»

Лукаш прайшоў некалькі разоў каля хаты Глытваў і зноў намерыўся прысесьці на прызьбе, як раптам пачуў:

— Лукаш?

— Я! — адгукнуўся Лукаш, рушыўся ісьці.

— Дык едзем, брат. Прузына Глытвіха згадзілася дагледзець мацеру, — заспакоеным тонам выказаў Платон. — Добрыя, ведаеш, людзі, гэтыя Глытвы. Ніякія сваякі — а заўсёды адгукнуцца, калі трэба.

Яны сьпешным крокам пайшлі ўздоўж вуліцы. Якраз каля рэўкому Платон з Лукашом спаткалі Яўхіма. У цемнаце ночы ён пазнаў іх і абазваў:

— Таварыш Платон! Таварыш Лукаш! Гэта вы?

— Мы, — адказаў Лукаш, — а ў чым справа?

— Я сьпяшу па вас. Ужо прачакаліся. З паўгадзіны, як коні гатовы...

— Прачакаліся-а! Пасьпеюць, — адказаў Платон.

Усе ўтрох пайшлі ў рэўком. Слабое сьвятло ў вокнах быўшай мяшчанскай управы, а цяпер рэвалюцыйнага кутка мястэчка, клала сьвятляны нарыс акна на паламаныя платы гародчыка. Раз-поразу мігалася між акна чалавечая цень.

— Падводчык ужо нарыхтаваўся якраз, — выказаўся Яўхім, калі яны падышлі да рэўкому, — і ў канцылярыю ня хоча зайсьці; неадступна стаіць ля каня ды вас чакае.

Яны прайшлі між невысокага росту, у зімовай шапцы і паўшубку, з пугаю ў руках чалавека, які штосьці парадкаваў на возе.

— Ці ня вы паедзеце са мною? — запытаў ён, калі яны прайшлі ў двор і сталі паднімацца на ганак.

— Зараз, зараз, — адазваўся Яўхім і прачыніў у рэўком дзьверы.

У рэўкоме Платон з Лукашом засталі толькі прыежджага таварыша з Тамашом. Прыежджы сядзеў пры стале на зэдліку, а Тамаш тупаў па хаце. Чутно было знадворку, як яны вялі аб нечым гарачую гутарку, але перарвалі яе ў тую хвілю, калі прачыніліся дзьверы.

— Ну, вось і гатова. Зараз можна ехаць, — сустрэў увайшоўшых Платона, Лукаша і Яўхіма Тамаш. — А мы ўжо тут прачакаліся, думалі, што вы ня прыйдзеце, — дадаў ён.

— Дарэмна думалі, — адказаў Платон.

— Ды не бяз рацыі, — уставіў Лукаш. — Платону зусім нельга ехаць.

— Чаму? — зацікавіўся прыежджы таварыш.

— А таму, што яго маці зусім хворая. На добры лад яго трэ было б замяніць другім. Я ня ведаю, чаму гэта ён так упарта...

— Выбачай, Лукаш, — пераняў Лукаша Платон, — раз ужо ўсё вырашана — значыць, годзе. Рэвалюцыя не павінна цярпець ад таго, што ў мяне баліць што або ў сям'і якое няшчасьце; мы мусім аддавацца ёй да апошняй мажлівасьці.

— Я ведаю, толькі... у нас можна абысьціся. Каб то які раптоўны выпадак, калі ўсім трэба станавіцца пад ружжо, тады, я разумею, не павінна быць ніякіх адгаворак... А ў нас справа ідзе ўсяго аб двух таварышах, каторых якраз ёсьць мажлівасьць выбраць, апрача цябе...

— Не, годзе, Лукаш, — настойчыва прамовіў Платон, — ты не разумееш становішча. Тут патрэбны людзі, ня як людзі, а найболей сталыя, цьвёрдыя і шчырыя рэвалюцыянэры. Хто ня можа расстац-

ца з самотным жыццём, зь яго патрэбамі, той не патрэбен на адказным месцы. Кожны момант ён можа здрадзіць, і ад гэтага пацерпіць агульная справа. Вось што, таварышы! — абярнуўся Платон да ўсіх. — Я толькі аднаго прашу: няхай рэўком дапаможа маёй мацеры, калі зь ёю будзе кепска. Хоць пакуль бацька вернецца з абозу.

— Тамаш, гэта я даручаю табе! — абярнуўся прыежджы таварыш да Тамаша. — Рэўком павінен узяць апеку над мацераю таварыша Гічкі. Таксама павінны пасобіць і бацькам таварыша Лукаша. На тваю, Тамаш, адпаведнасьць... А цяпер — пойдзем, хлопцы. Ужо позна, а нам трэба раніцаю быць у павеце.

Усе разам рушылі ў дзьверы.

VII

У павеце Платон дастаў назначэньне ў Горадню. Некалькі разоў камітэт партыі абгаварваў яго кандыдатуру, то мерачыся даць працу ў валасным размаху, то ў павятовым. Перш пастанавіў паслаць Платона ў Слонім, разам з Лукашом, а пасьля гэта перарашыў і спыніўся на Горадні. Недастача работнікаў і вялікая патрэба ў іх заставілі камітэт пашкадаваць Платона для павету. Ды к гэтаму яшчэ прывёзшы яго таварыш даў пахвальны водзыў аб Платоне як разумным чалавеку і, галоўнае, як шчырым рэвалюцыянэру, адданым камунізму таварышу.

Атрымаўшы гэта назначэньне на другі дзень па прыезьдзе ў павет, Платон быў вельмі палішчаны гэтым высокім давер'ем да сябе з боку вышэйшае ўстановы партыі. Думкі і клопат аб хворай мацеры, зь якімі ён выяжджаў і аб чым несупынна паведваў ехаўшым зь ім таварышам, разрэдзіліся, аслабелі ў сваёй натужнасьці і пачалі згладжвацца. Платону сталі малявацца розныя пляны яго наступнай работы, зарадзіліся вялікія казачныя самазаданьні. Горадня з губэранскім размахам работы, новая, амаль не пачатая глеба для рэвалюцыйнага будаўніцтва, самы характар яго ў гарадзкіх абставінах узьнімалі Платона да натхненьня. Ужо не было ніякага сумненьня ў сваіх сілах і здольнасьці. Шырокае поле абяцала выявіцца ўсёй яго шчырасьці, усяму пэнту і гарачнасьці, для якіх малы быў разьмер местачковае працы. Платон з усёй палкасьцю хапіўся за сваё назначэньне, цешыўся і разам баяўся, каб якія-колечы стараньнія выпадкі не паперашкодзілі яму яго ажыцьцявіць.

З гэтае прычыны Платон на другі дзень пасьля пастановы камітэту ня дбаў ні аб чым, толькі б хутчэй выбраць усе належныя паперы і рушыцца ў дарогу. Ня сьнедаўшы, пасьля маласоннай, патрачанай на разважаньне і плянаваньне прадстаячае працы, але памятнай для яго ночы, Платон пабег у камітэт за мандатам. Каля дзьвюх гадзін прамарудзіў там, пакуль сабраў патрэбныя подпісы. Пасьля з мандатам пайшоў за харчамі і грашыма на дарогу. Дзеля гэтага таксама змарнаваў каля трох гадзін. Утаміўся, аслаб, пазлаваў на многіх і з многімі паагрызаўся.

Пасьля свайго назначэньня Платон яшчэ шчырэй пачаў глядзець на абавязкі рэвалюцыянэра і каразьлівей адносіцца да іх. Калі раніцай ён і мог дапусьціць некаторую нясьпешнасьць, то цяпер яму кожная хвіліна, кожны міг важыліся на кошт золата. Чакаючы подпісу мандату ў канцылярыі камітэту ці просячы харчоў, гневаўся на кожнага таварыша, хто не па-ягонаму варушыўся за работаю. Дынамічнасьць, рухавасьць, якія даходзілі ў яго да нэрвовасьці, Платон хацеў бы перадаць кожнаму, з кім даводзілася яму мець справу. Ён разьлічваў ноччу, што яму прыйдзецца патраціць на выбарку дакумэнтаў і ўсяго іншага для камандзіроўкі ну гадзіны дзьве — ня болей. А тут аказалася страта цэлага дня! Гэта вельмі яго абурыла. Платон не хацеў супакоіцца і казаў сам сабе: «Ну, я ня так наладжу работу ў сябе! Яна пойдзе ў маім ведамстве як машына. Дзе што намерыцца мітрэнжыць яе ход — тое выпеку агнём. Тут мусіць быць рэвалюцыйная рашучасьць...».

Гэту сваю самаўцеху Платон пераліў у настойную рашучасьць, калі выведаў на станцыі чыгункі, што прапусьціў цягнік, зь якім меўся ехаць. Ён адышоў з эшалёнам чырвонаармейцаў якраз у той час, калі Платон тырчэў за харчамі. «Навошта яны мне былі, — наракнуў Платон сам на сябе. — Гэта ж — ах! — шкурніцтвам пахне! Нельга мне гэтага... дараваць... Сказаць соромна! Там кожная хвіліна дзясяткі жыццяў каштуе, а я тут за кавалак хлеба і фунт цукру дні трачу. Навошта ўсё гэта? Нашто тая валакіта? Два дні чакаць! Два дні — гэта ж вечнасьць... Ці ж магчыма іх так карысна ўжыць, як то б я зрабіў у Горадні?»

Ад ахапіўшай яго зласьлівасьці Платон ня мог крануцца зь месца і з гадзіну стаяў на станцыі. Глядзеў то ў адзін, то ў другі канец чыгункі, кідаў узрокі за лес, за горы, зьмяраў запасныя пуці — усё шукаючы цягніка ці хоць бы дыму, які б сьведчыў, што гэты цягнік дзе-кольвечы гатуецца да адыходу. Некалькі разоў дапаўняўся ў камэнданта станцыі, ці праўда, што чародны выйдзе толькі празь дзень. Зьмяраў у думках адлегласьць да Горадні, думаючы пра коні... У гэткім неспакойлівым,

парушаючым настроі Платон адышоў ад усяго на сьвеце: як бы ўвесь сьвет жыў для яго ў Горадні — ня той, бач, што была на соткі вёрст ад яго, а ў той, дзе будзе ён наладжваць сваю рэвалюцыйную працу. Каб у гэты момант хто асьмеліўся сказаць Платону, што адна асоба наогул мала пасобіць у справе супольнай творчасьці, то ён знарок, насупроціў філязофіі марксізму, крычаў бы настойна, што яго асоба як шчырага рэвалюцыянэра ня роўна другім. Сказаў бы і падмацаваў гэта многімі прыкладамі з свайго багатага жыцьця...

К вечару, спусьціўшы гадзіны тры пасьля звароту са станцыі, Платон патрошку супакоіўся. Усё роўна яго абурэньні траціліся задарма, як гаснуць іскры ў паветры. Колькі ні злуй, колькі ні нэрвуй — цягнік пойдзе толькі на другі дзень. «Як жа быць з гэтым часам?» — выявіў сабе Платон пасьпелую ўнутры, падбіваўшую яго на абурэньне, думку. І толькі кранууся таго, як яму будзе правесьці вольным да ад'езду час, як раптам, быццам хтось жывасілам яму паднёс гэта, Платон ахапіўся ўспамінамі аб хворай мацеры. Ён здрыгануўся ад гэтае балючае раптоўнасьці, хапіўся рукамі за голаў і чуць ня ўскрыкнуў — ні то ад сполаху за лёс мацеры, ні то ад радасьці, што ў яго асталося столькі вольнага часу, каб можна было і наведаць яе. Як і што сталася з мацераю за гэтыя два дні? Ці выздаравела яна, ці яшчэ ляжыць хвораю? Калі ляжыць, то як там са жнівом? Пэўна, жыта перасьпела, паклалася ды травіцца гавядаю? Каб жа бацька вярнуўся, то яшчэ б паўбяды, а то, можа, і яго няма. Што ж тады яна будзе рабіць? Ні астаавацца ўдому, ні ехаць?

Гэтыя трывожныя пытаньні вострымі мячамі праразалі Платонаву душу, як расплаўленае жалеза, капелькамі падалі ў яго сэрца. Хвіля ад хвілі ён трапятаўся ўсёй істотаю ад нейкага балючага ўздрыгу, натужваў думкі, кідаючы іх праз дваццаціпяцівярстовую адлегласьць у сваё мястэчка і ловячы выабражэньнем выгляд вобразу свае мацеры. А поруч з гэтым настойная, неўкантактоўная прага як найхутчэй апынуцца каля яе гнала яго ў дарогу. Платону не ішло ў голаў ні аб ядзе, ні аб некаторых яшчэ ня вырашаных справах, зьвязаных зь яго назначэньнем. Пасьпяшаючы, як перад трывогаю якою, ён аднёс паёк, атрыманы на дарогу, да Лукаша і, ня хочучы пытаць падводы, пехам пусьціўся дахаты.

VIII

Платон не ішоў, а бег усю дарогу. Не аглядаўся назад, не лічыў слупоў ад тэлеграфу. Уваходзіў у ляскі і пералескі, не прымячаў ні ценю, ні дрэўцаў. Спатыкаў фурманкі ці пешаходаў, бадай іх не заўважаў. Вёскі, якія стаялі пры гасьцінцы, не прыкмячаліся яму. Праз увесь час, пачынаючы з павету, Платон бачыў перад сабою жоўты пясочак ці засохшую гліну гасьцінца. Апусьціўшы вочы, ён выбіраў гладчэйшыя мясьціны і, як заведзены калаўротак, мянціў нагамі. Тулавам падаваўся ўперад і матаў праваю рукою, як бы разганяючы паветра, каб лягчэй было ісьці, каб скараціць дарогу. Часта дыхаў, але ўсё яшчэ недаволіўся скорасьцю хады. Платон глядзеў на час, і яму кожная хвіліна здавалася днём, а то і больш.

Прайшоўшы палову дарогі, ён страціў каля дзьвюх гадзін, а яму здавалася, што дарога адняла ў яго больш за паўдня. А чым бліжэй падыходзіў да свайго мястэчка, тым час здаваўся даўжэйшым, і руплівасьць узмацоўвалася. Пачало паколваць у баку і тысячамі іголак парола ў пяткі ног, па скронях твару беглі рагі поту, убіраючы ў сябе пыл і робячы брудныя пасачкі на шчоках. Але Платон не зважаў, ды ня мог ён зважаць, бо ўсе думкі прыбрала да сябе хада, і ім не было мажлівасьці адвярнуцца на другое. Уперадзе яго, як маглі захапіць апушчаныя пад простым кутам вочы, стаяў вобраз мацеры, цёмны, невыразны, які бег ад яго, уцякаў і, уцякаючы, цягнуў яго за сабою.

Толькі на краі свайго мястэчка, пры карчме Місэля, а шэрай гадзіне Платон адняў ад зямлі вочы і агледзеўся, дзе і што ён. Тое, што нарэшце ён быў дома, зусім недалёчка ад хаты, усё ж не завесяліла яго і не спыніла ў разгоне. Платон сьпяшыў роўным тэмпам, дзівячы стрэчных мяшчан.

У пяць хвілін ён перайшоў Прадоўжную вуліцу і апынуўся каля хаты. Павярнуў у двор, акінуў яго поглядам, шукаючы адзнакаў бацькавага прыезду, і, не знайшоўшы іх, зразу ж спусьціў гэта з думак і кінуўся ў дзьверы.

Ужо ў сенцах Платон пачуў ажыўленую гутарку ў хаце. Яго сэрца забілася мацней і балючай; ахапіў жар, зараіліся страшныя мысьлі. «Ці не якое няшчасьце з мацерай?» — мігам устала перад ім вострае жудаснае запытаньне. Ён ня чуў, як адчыніў дзьверы ў хату і пераступіў парог.

— Вось і Платон! Якраз у пору! — сустрэў яго голас Кандрата Плота. — А маці ўжо думала, што ты і не наведаеш.

Некалькі жаночых галасоў падмацавалі яго словы.

— Чаму, што? — запытаў Платон, шукаючы вачыма маці.

Юзя, якая сядзела на палку ў запечку, раптам загаласіла наўзрыд.

— Мама, мама, чаго вы? У чым рэч? Вам цяжка? Вы... Даруйце, што не застаўся, я мусіў ехаць, я павінен быў ехаць... — кінуўся яе суцяшаць Платон.

— Платонка-а мой, сынок мой. Мне мо і нічога, я буду жыва... Але... На-ашага бацькі-ы няма ўжо-о. Памёр пад Ваўкавыскам ад тыфусу... Вось Кандрат сам бачыў... Што ж я цяпер буду адна рабіць?.. Хоць ты ня едзь, хоць ты... Нашто табе больш за ўсіх...

Юзя не магла выгаварыць і апусьцілася на пол, стукнуўшыся моцна локцем аб печ.

Платон ня мог падтрымаць яе. Цяжкая жаласьць раптам спаралізавала ўсе яго сілы. Ён апусьціў моўчкі голаў і спагадліва праказаў:

— Вось табе і раз!

1923



Віктар Жыбуль


...у рамашкавым полі



Сяргей Фамін

На чорта мне «гітары ледзяныя»?
Я жыць хачу, як хлопец ў 20 год!

Сябры мае, таварышы!
Вясны я,
Вясны хачу!
І сьпеваў дарагой!




Паэт Сяргей Фамін ніколі не ўжываў слова «рамонак», хоць гэтая кветка была для яго знакавая і займала заўважнае месца ў вобразнай сыстэме ягоных вершаў. Фамін пісаў толькі і выключна «рамашка»: *«...а у белых палях-далінах / пасьцілаюць рамашкі пасьцель»* [11, с. 19], *«І было у рамашкавым полі, / У рамашкавым полі вясной... / Не забыць мне цябе аніколі, / Хоць здаецца мінулае сном»* [11, с. 27], *«І вось паехалі на сонечныя плёсы, / Дзе першыя рамашкі расьцьвілі»* [11, с. 116], а ўрэшце мог выдаць і такое: *«Пакажыся, трактар, сьпеў матора кінь, / Заарэм рамашкі — будуць васількі»* [11, с. 17]. Чаму «рамашкі»? Адказ просты: так звычайна казалі на беларуска-расейскім памежжы, дзе ў вёсцы Пепелеўка Амсьціслаўскага павету Магілёўскай губэрні 29 красавіка (12 траўня) 1906 году і нарадзіўся паэт. Пасьля Кастрычніцкага пераварота частка былога Амсьціслаўскага павету адышла да Расейскай Фэдэрацыі і Пепелеўка ўвогуле апынулася ў Манастыршчынскім раёне Смаленскай вобласьці РСФСР.

Сяргееў бацька, Уладзімер Георгіевіч Фамін (1878–1936), прыкладна з 1898 г. і да канца жыцьця працаваў загадчыкам і настаўнікам пепелеўскай школы, напачатку — царкоўна-прыходзкай. Маці, Алена Нічыпараўна Нікіфарава (1881–1951), была сялянкай той самай вёскі.



Сяргей Фамін з бацькамі. 1915 г.

Аўтабіяграфічная «Характарыстыка»
Сяргея Фаміна. 7 траўня 1926 г.




Акрамя Сяргея і малодшай за яго на 14 гадоў Раі, у сям'і былі яшчэ трое дзяцей, але яны памерлі ў юным веку ад «гішпанкі» й шкарлятыны: гэта браты Іван і Ягор (у сям'і звалі Жоржыкам) і сястра Вольга.

Вось як потым пісаў пра сваіх бацькоў паэт:

Майго бацькі ўпартасьць і мяцежнасьць
Ад маленства на мне, як граніт.
А ад маці — пяшчотнасьць і ўсьмешка
На губах у ружовым агні.
Мо таму я здаюся дзіўным
І ў песьнях — і зоры, і змрок,
І бывае такім пераліўным
Маіх слоў маладых серабро [11, с. 54].
(«Агні зараніц», 1928)

Можна сказаць, што і сам паэтычны талент, любоў да слова Сяргей Фамін успадкаваў ад бацькоў. Як сьведчыла паэтава сястра Раіса Барысава, «маці была вельмі паэтычнай натурай, гаворка яе стракацела прыказкамі й прымаўкамі на ўсе выпадкі жыцьця. Любіла сьпяваць, мела добры голас»

Паштоўка Сяргея Фаміна ў Цэнтральнае бюро «Маладняку». 17 кастрычніка 1926 г.



[3, арк. 1]. А бацька пісаў вершы, падаўшы добры прыклад сыну, які ў 9 гадоў таксама ўзяўся за пяро [8, арк. 80].

Яшчэ вучнем Амсьціслаўскай сямігодкі (1918–1921) Сяргей дасылаў карэспандэнцыі ў мясцовыя газэты. Але публікаваць вершы пачаў пазьней, калі ўжо вучыўся ў Магілёўскім пэдтэхнікуме. 7 лістапада 1924 г. у магілёўскай газэце «Соха и молот» убачылі сьвет расейскамоўныя вершы С. Фаміна «Седьмой Октябрь» і «Заключенным братьям». Неўзабаве малады паэт перайшоў на беларускую мову, выступіўшы ў газэце «Магілёўскі селянін» зь вершам «Вясновае». 20 лютага 1925 г. ён быў прыняты ў Магілёўскую філію «Маладняку» [8, арк. 15]. Аўтабіяграфічная «Характарыстыка» С. Фаміна сьведчыць, што ўступаў у літаратурнае згуртаваньне ён, будучы дасьведчаным калі ня аўтарам, дык прынамсі чытачом:

> *«Добра знаём з расейскай літаратурай, беларускай, ангельскай, нямецкай, французскай.*
>
> *Мовы ведаю: расейскую, беларускую, украінскую (слаба) і нямецкую (таксама слаба)»* [8, арк. 80].

Пасьля заканчэньня Магілёўскага пэдтэхнікуму (1925) Сяргей Фамін два гады працаваў настаўнікам на Барысаўшчыне. Адпаведна ён перавёўся ў Барысаўскую філію «Маладняку», якой кіраваў крытык Мікола Аляхновіч. 25–29 лістапада 1925 г. С. Фамін удзельнічаў у 1-м Усебеларускім зьезьдзе «Маладняку» як дэлегат з «рашучым» голасам. Захавалася паштоўка паэта ў Цэнтральнае бюро гэтай літаратурнай арганізацыі, датаваная 17 кастрычніка 1926 г. Вынікае, што жыў ён у ня надта добрых матэрыяльных умовах:

> *«Хлопцы! Чаму Вы нічога ня пішаце? Прышліце абавязкова грошы 50 рублёў, бо прападаю зусім.*
>
> *Адрас мой: п./ад. Лошніца, Барысаўскі вокруг, в. Ратуцічы, Сяргею Фаміну. Ну бывайце! С. Ул. Ф[амін]»* [7, арк. 44 адв.].

У 1927 г. паэт пераехаў у Менск і паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленьне пэдагагічнага факультэту Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. У той час у яго пачаліся праблемы са здароўем. Уладзімер Дубоўка ў сваім артыкуле «На Багдановічавай магілцы» працытаваў ліст ад «маладога, здольнага паэта», атрыманы акурат тады:

> *«...Сам я працую ўвесь час, і дні, і ночы, здаецца, іду ў гору, хоць малымі, але цьвёрдымі крокамі...*

...Зараз канчаю вывучэньне нямецкай мовы...

...Здароўе зусім кепскае — сухоты. Адчуваю сябе зусім кепска і ледзь трымаюся...

...Усё абрыдла, бо адчуваю сам, што хутка будзе „пачатак канца". А хацелася б паўчыцца, хоць Універсытэт скончыць, але бачна, не дацягну. Зусім слабы. А Крым — не для мяне...» [5, с. 83].

Прозьвішча свайго карэспандэнта У. Дубоўка ня згадвае, але азначэньне «баян Мсьціслаўскі», а таксама згадкі пра ўнівэрсытэт і вывучэньне нямецкай мовы намякаюць, што маецца на ўвазе Сяргей Фамін.

Аднак паэтава роспач была дарэмнай: ён здолеў перамагчы хваробу і весьці паўнавартаснае жыцьцё. Жыцьцё імпэтнае і насычанае, як гэта зазвычай і бывае ў студэнтаў.

«Вершы гэтага паэта ў друку паяўляліся ня вельмі часта, — згадваў тагачаснага Сяргея Фаміна пісьменьнік Ян Скрыган, які таксама вучыўся ў БДУ. — *Сярод студэнтаў універсытэту яго фігура вылучалася нейкай мілаю дваістасьцю. З аднаго боку, кідалася ў вочы паэтычная прыналежнасьць яго: доўгія валасы; тоненькі гальштук на кужэльнай, здавалася, вельмі памятай кашулі; хада такая, што як бы не яна слухалася гаспадара, а гаспадар ішоў туды, куды вялі яго ногі. З другога — нейкая яшчэ ня страчаная вясковасьць. Думалася, што яму цяжка быць сярод людзей.*



Сяргей Фамін

Але гэтак выглядаў Сяргей Фамін да таго часу, пакуль маўчаў. Варта ж яму было загаварыць, як вам пачынала здавацца, што вы гэтага чалавека ведаеце ўсё жыцьцё. І голас, і таварыскасьць, і раптам весела ажывелы твар, і яшчэ невядома якія няўлоўныя рухі чалавечай душы вас забіралі пад свой уплыў адразу.

Словам, Сяргей Фамін ня ўкладваўся ў рамкі будзённай прывычнасьці» [10, с. 198].

Ва ўнівэрсытэце паэт знайшоў і сваё каханьне — Марыю Вашчылку, якая неўзабаве стала ягонай жонкай. У іх нарадзіліся дочкі Іна (1928), Аліна (1931) і сын Аляксандар (1934).

Вершы Сяргея Фаміна публікаваліся ў часопісах «Маладняк», «Маладняк Барысаўшчыны», «Малады араты», «Шлях студэнцтва», «Працаўнік асьветы», «Паляўнічы Беларусі», «Чырвоны сейбіт», «Беларусь калгасная», газэтах «Савецкая Беларусь», «Чырвоная зьмена», «Зьвязда», «Магілёўскі селянін». Акрамя ўласных твораў, друкаваў і пераклады з блізкага яму духам украінскага паэта Ўладзіміра Сасюры. На нейкі час С. Фамін пакінуў «Маладняк»: яго прывабіла новая арганізацыя пад назвай «Пробліск» — «Пралетарска-сялянская беларуская літаратурная суполка». Аднак яна праіснавала нядоўга, і пасьля яе самаліквідацыі (28.01.1928) паэт вярнуўся ў «Маладняк».

Найбольш грунтоўную на той час ацэнку творчасьці Сяргея Фаміна даў вядомы празаік і крытык Максім Гарэцкі: «Вершы ў яго — плаўныя, мілагучныя, у апошніх вершах — адшліфаваныя. У яго вершах — выразны ўхіл у навізну, у мадэрнізацыю старых клясычных форм. <...> Шмат было ў Фаміна агульнай маладнякоўскай паэтычнай бутафорыі зь першага пэрыяду ў творчасьці Маладняка („сінь", „пунсавела раньне" і г. д.). Цяпер [у 1928 г. — *В. Ж.*] ён узыходзіць на самабытны шлях. У першых вершах шмат было ў яго расіянізмаў і некаторых няправільнасьцяў наогул. Цяпер ён — адзін з тых маладнякоўцаў, што зьвярнулі сур'ёзную ўвагу на культуру мовы» [4, с. 112–113].

Чытаючы вершы Сяргея Фаміна, разумеем, што меў на ўвазе М. Гарэцкі пад «паэтычнай бутафорыяй». Паэт схіляўся да наватвораў-аказіяналізмаў, яркіх калярыстычных эпітэтаў: *«электравокая эра», «лілёва-сонечная вясна», «іду ў санцавейнай пагодзе», «сьветластрунныя маторы», «танкаструнь»...*

Сяргей Фамін з будучай жонкай Марыяй Вашчылкай (зьлева) і яе сяброўкамі. 1927 г.



Ужо ў канцы XX ст. дасьледнікі літаратуры адзначалі ў вершах С. Фаміна «бадзёрыя жыцьцесьцьвярджальныя рытмы, бурныя пачуцьці, шчырае прыняцьце і вітаньне новых рэалій жыцьця, новых ідэалаў і адначасова тонкае адчуваньне прыроды, юнакоўскую летуценнасьць, закаханасьць» [2, с. 136].

Сваю жыцьцёвую, а адначасова і творчую, пазыцыю Сяргей Фамін найбольш яскрава адлюстраваў у вершы «Ў душы маёвыя агні і навальніцы...» (1927), дзе выступіў як выразны антаганіст Тодара Кляшторнага:

На чорта мне «гітары ледзяныя»?
Я жыць хачу, як хлопец ў 20 год!
Сябры мае, таварышы!
Вясны я,
Вясны хачу!
І сьпеваў дарагой!

Разам з тым у згаданым вершы можна сустрэць нават «алькагольную вобразнасьць», да якой акурат быў схільны Т. Кляшторны: *«Ірдзеюць радасьцю малінавыя шклянкі / Усходніх воблакаў зь вішнёвага віна»*. Але С. Фамін дае зразумець, што, у адрозьненьне ад свайго апанэнта, у творчасьці ён аддае перавагу мажорным, бадзёрым і радасным настроям, жыцьцесьцьвярджальнаму патасу:

Мой сьвецел шлях,
І проста мая мэта!
Ніякія шляхі з дарогі не зьвядуць!
Жыцьцём і мной са сьцежак шлях разьмецен,
І я з жыцьцём аберуч ўдаль пайду. [11, с. 36]

Згаданымі ў вершы радасьцю, маладосьцю, «юнацкім размашшам» прасякнутыя і іншыя творы Сяргея Фаміна. І, вядома ж, маладая паэзія рэдка абыходзіцца бяз тэмы каханьня. У Сяргея Фаміна яна

прадстаўленая пераважна вершамі, якім можна было б даць азначэньне «камсамольска-студэнцкая лірыка». Акрамя ўзьнёслых пачуццяў, гэтыя вершы напоўненыя жыццёвай канкрэтыкай, побытавымі дэталямі: паміж рамантычнымі спатканьнямі закаханыя «праглядаюць да залікаў Маркса», наведваюць сходы ячэйкі, выступаюць у клюбах з дакладамі... Або — распачынаюць новую для сябе прафэсійную дзейнасьць:

Сьветлай радасьцю
сьмех у нас ўзьнікаў.
Буйнай ружай шчака зацьвіла.
Я прыехаў на працу настаўнікам,
ты — настаўніцай разам была [11, с. 63].

Ці:

Будуць клікаць цябе аграномам,
Ўвечар ў хату зьбярэш з паўсяла... [11, с. 62]

Такім чынам, лірычны герой Сяргея Фаміна — ня проста абстрактны юнак, а сын свайго часу — студэнт і камсамолец, блізкі ці нават тоесны аўтару. Паказальна, што паэт не хавае ў творах свайго імя і называе сябе Сяргеем або Сярожам, а ў адным зь вершаў згадвае імя будучай жонкі:

Не была б ты такой прыгожай,
Хіба ж стаў бы ў нараньні зграць! —
Цалаваў Марылю Сярожа
Ў дымных жытах апошні раз [11, с. 44].

Такая адкрытасьць прымушае чытача прасякнуцца да аўтара нейкім асаблівым даверам, успрымаць яго вершы як шчырыя сяброўскія споведзі, верыць, напрыклад, што калі ў паэтавым жыцьці сапраўды была Марыля, то, значыцца, некалі была і Наста-дэлегатка, якая перадавала Сярожу цыдулкі з дапамогаю пухнатага пасланца — ката Ваські. Менавіта ён, Васька, і зьяўляецца адрасатам верша «Прыяцель», напісанага не без уплыву Сяргея Ясеніна:

І з ружовай стужкай асьцярожна
Ты мяне так часта тады зваў,
Цалаваў ад любай ты, як можаш,
Пацалункі любай аддаваў.

Сьмешна, Васька, надзвычайна сьмешна
Ўспамінаць мінулае ізноў,
І маю юнацкую бязьмежнасьць,
І тваю каціную любоў! [11, с. 67]

Праўда, сучаснага чытача ў вершах Сяргея Фаміна можа сёе-тое і зьбянтэжыць — напрыклад, імкненьне лірычнага героя дзе толькі можна падкрэсьліць сваю прыналежнасьць да камсамольскай арганізацыі, а ў 1920-х сярод моладзі гэта сапраўды часта было прадметам гонару. Нават у, здавалася б, інтымна-камэрным вершы «Ноч» (1926), прысьвечаным сястры Раі, слова «камсамол» і аднакарэнныя ўжываюцца чатыры разы:

...Чуеш? песьня задорыста-сьмела
З камсамольскага чутна двара.

Не сумуй! раніцой ў камсамоле
Зробіш добра надзіва даклад.
...Аб вясновым рамашкавым полі
Камсамольцаў сям'я завяла...

Ой, глядзі, месяц так залаціцца.
Хіба ж можна цяпера заснуць?
Засыпяваем жа дружна, сястрыца,
Камсамольскую нашу вясну! [11, с. 11]

Дадамо, што паэтавай сястры на той момант было ўсяго 6 гадоў, таму гэтыя радкі (асабліва пра «даклад») пісаліся ўсё ж зь лёгкай іроніяй. І ўжо зусім сур'ёзна ўсклікае паэт у вершы «Ростань» (1927):

Спаткаемся.
Ў душы загіне кволасьць.
Прыхілімся
і скажам проста так:
— Вітай, Сяргей!
Я стала — камсамолкай!
І я скажу,
што камсамольцам стаў [11, с. 42–43].

Лірычнага героя С. Фаміна прываблівае дзяўчына, у якой «на грудзях аж калышацца „КІМ“» [11, с. 18], яго галава зьвініць «рабочым стальным камсамольлем» [11, с. 21]. Ён цешыцца, што «пад сырэны машын у калгас адыходзіць за вёскаю вёска» [11, с. 80], а ў вершы «Хадок» (1928) усхваляе старога Савелія, які ўпэўнена крочыць у горад, каб расказаць Чарвякову, што «кулакі заселі ў сельсавет» [11, с. 48]. З гледзішча дня сённяшняга Савелі выглядае банальным даносчыкам, але для тагачаснага савецкага кантэксту ён быў героем, бо змагаўся з праціўнікамі новага ладу... Так, Сяргей Фамін на той момант шчыра верыў у ідэалы, якія яму трансьлявала новая савецкая рэчаіснасьць, і ганарыўся тым, што і сам можа неяк паўдзельнічаць у глябальным абнаўленчым працэсе.



Вокладка кнігі Сяргея Фаміна «Балота». Мастак Анатоль Тычына. Менск, 1927 г.

Пры гэтым у Сяргея Фаміна ёсьць творы, дзе няма намёкаў на камсамол і ўвогуле на якія-кольвечы прыкметы, уласьцівыя той эпосе. Напрыклад, вершы «Я бачыў вас даўно. І многа праляцела...» і «Калыхнулася месяца сінь...», напісаныя ў 1926 г. Гэта вершы пра каханьне — але не камсамольскае, а, так бы мовіць, «унівэрсальнае». Яны вылучаюцца мэлядычнасьцю радка, рамансавымі інтанацыямі з амаль клясычнай архітэктонікай — і ня дзіва, што адзін зь іх нядаўна паклаў на музыку гурт «Whiskey Way».

У 1927 г. асобнай кніжкай выйшла паэма Сяргея Фаміна «Балота». Толькі вось назваць яе творчым посьпехам паэта, на жаль, нельга. Аўтар хацеў паказаць перайначаньне побыту беларускай вёскі на сацыялістычны лад, а што з гэтага атрымалася — вельмі красамоўна сьведчыць неапублікаваная рэцэнзія Адама Бабарэкі, якую цяжка чытаць без усьмешкі. Рэцэнзія ўтрымлівае ў сабе і кароткі, канспэктыўны пераказ паэмы:

«У Беларусі многа балот: і старых, і новых. Пра старыя народ, што жыве каля іх, злажыў шмат глыбокіх па думцы і прыгожых па форме казак. Пра новыя ж, асушаныя (народам з дапамогай савецкай улады), песень яшчэ няма.

З прычыны апошняга С. Фамін узяўся злажыць пра балота „песню праўды голай". І нельга сказаць, каб ён гэтага не зрабіў. Адным балотам на Беларусі стала больш. Яго „голая праўда" такая.

Раніцою... серабрыцца на балоце торф. На ім пах пшаніцы тонкі і грае Маем сталь. „А было: ...ні праехаць, ні прайсьці па гаці". Голад быў, сьлёз з вачэй пралілася рака (як у чаротаўскага Мікіты) і „толькі з гонарам сьмяялася званіца". А цяпер яна сьмяецца падругому. Угары начамі сьвеціць Ленін (гэта на званіцы, якраз, як у Чарота[вага] Мікіты на сьценцы). Вечарамі разьвясёлы гоман і пераз-вон антэны. Гэта ўсё на балоце. І таму аўтар з прычыны таго выказвае сваё „эх" і „объясняется в любви" яму.

Пасьля такога ўступу з 10 страфы аўтар у парадку паясьненьня, а мо ў парадку разьвіваньня пададзенага ў папярэдніх строфах палажэньня падае маніс-ту з 6 строф агульных фраз пад агульным знакам: „Так было". З Масквы прышоў Мікола... Адчыніў школу. Звалі яго камуніст. Шанав[алі] бедн[які]. Пазір[алі] скоса кулакі. А пасьля зьбіралі на радыё. Праз два месяцы ў чытальню йшоў народ. З Масквы гав[арыў] Сталін. У выніку ў царкву зарос шлях. А пасьля — званіц[а] бяз крыжа, на палёх жняяркай сталі жаць. А калі сьнег церушыў, „камуніста прыхадз[ілі] слухаць, як... балота асушыць". Вясною „йшоў народ на аселіцу, а праз год — балота не спазнаць". Раўчукі віліся лукав[інай]. „Мурзатыя даліны", „аксам[ітная] сінь". Вось і ўсё, і ўсё. Вельмі проста.

Далей, каб давесьці напэўна, што і першая асоба, ад якой вядзецца гутарка, не апошняя сьпіца ў гэтай калясьніцы „так было", аўтар выклікае ў сьведкі „Маладую Ганну" і зноў у парадку пералічэньня таго, што было, нагадвае ёй: першае — „Ці ня помніш, Маладая Ганна: 1) на балоце цябе бачыў я", 2) Краскі ты зьбірала, 3) віла вяноч[кі], 4) пела і 5) несла іх у царкву. Другое: 1) „А ці помніш, калі везьлі з балота торф", 2) пасьля Мікола і г. д.

Ганна нічога на гэта не адказвае. Тады аўтар, кідаючы яе, варочаецца назад і, канстатаваўшы, што „восень зноў", паведамляе аб месцы знаходжаньня ў сучасны момант герояў паэмы. 1) Я ў пахучы[м] сене, 2) Ганна — дэлегатка і бязбожніца — ходзіць на заняткі, 3) а балота... шапоча казкі. Невядома засталося толькі, дзе Мікола. Але пасьля заключэньня, што дні гараць сав[ецкай] пазалотай, аўтар успомніў і пра Міколу і закончыў сваю песьн[ю] паведамлен[ьнем] яго адрасу: „У Беларусі тысячы Мікол[аў], прозьв[ішча] іх проста К. П. Б.". Вось і ўся „праўда голая"» [1, с. 447].

Адам Бабарэка падрабязна даводзіць, што і Мікола, і Маладая Ганна, і той, ад імя каго напісана паэма, — не паўнавартасныя героі, а ўсяго толькі літаратурныя штампы, перанятыя С. Фаміным ад старэйшых маладнякоўцаў, у прыватнасьці, ад Міхася Чарота. Крытык безапэляцыйна называе паэму «дрэнным творам», «сумным зьявішчам сацыяльнага парадку», «шкілетам, адлюстраваным цьмяна і недакладна» і папракае аўтара ў творчай несамастойнасьці. «Калі выкінуць усе строфы — паэма ад гэтага ня страціць анічога» [1, с. 451], — зьедліва кпіць крытык.

Больш стрымана пра паэму напісаў ужо згаданы Максім Гарэцкі, сярод хібаў адзначыўшы толькі няўдала ўплеценую лінію каханьня («бо мала зьвязана зь першым ходам дзеяньня ў паэме») і неадпаведнасьць «мадэрнізаванай» графічнай расстаноўкі радкоў іх рэальнай «клясычнай» рытміцы [4, с. 112–113].

Паэма стваралася ў той час, калі яшчэ мала хто задумваўся пра нэгатыўны бок асушэньня балотаў. Не задумваўся і Сяргей Фамін. Аднак іншыя, больш відавочныя на той час, экалягічныя праблемы не пакідалі яго абыякавым — і ён адгукаўся шчымлівым, эмацыйна напоўненым вершам. Паэт ня мог глядзець без душэўнага болю на тое, як высякаюць лес:

Сіняй ноччу ў месячную замець,
Дзе гараць ваўчыныя агні, —
Дуб самотны замахаў рукамі,
Глянуўшы на зрэзаныя пні.

І стагнаў, і галасіў ад гора...
А пасьля, як замець адцьвіла, —
Нема ехаў высечаным борам,
І жалобна плакала піла [11, с. 47].

Увогуле пэйзажная лірыка паэту ўдавалася — згадаем вершы «Вясна адыходзіла садам...» (1926) або «Пагубляла рубіны рабіна...» (1928), адметныя яркай вобразнасьцю, кранальнымі мэтафарамі: *«А ўчора яшчэ я прымеціў, / Як зусім непрыкметнай рукой / Парасчосваў яблыні вецер, / Разьмяцеліў ў садах малаком* [11, с. 23]; *«Пагубляла рубіны рабіна / і ад страты ў прастор загула... / Ў танкаструнь залатой павучыны / агарнулася жніўная гладзь»* [11, с. 65].

У 1929 г. Сяргей Фамін падрыхтаваў і здаў у выдавецтва кнігу вершаў «Дымнае жыта». І, магчыма, яна ўвабрала б у сябе ўсё сапраўды найлепшае, на што быў здольны паэт. Але выйшла кніга пад такой назвай толькі ў 1991 г. — праз шмат гадоў пасьля сьмерці аўтара. Укладальнікам жа выступіў вядомы мовазнавец і пісьменьнік-парадыст Георгі Юрчанка.

З 1930 г., пасьля заканчэньня ўнівэрсытэту, Сяргей Фамін жыў у Горках, выкладаў беларускую і расейскую мовы й літаратуры на рабфаку і ў сельскагаспадарчым інстытуце, адначасова вучыўся ў аэрафотатапаграфічным тэхнікуме. Ён кіраваў інстытуцкім літаратурным гуртком і плённа працягваў



Сяргей Фамін. Шаржс мастака Цфаніі Кіпніса. 1932 г.

Сяргей Фамін. Лягерны фатаздымак. На адвароце пазначана: «Приговор приведен в исполнение 4 декабря 1941 года в 01 час. 06 минут (л. д. 416)»



пісаць сам. У студзені 1931 г. С. Фамін разам зь іншымі паэтамі ўдзельнічаў у «Тыдні савецкай Беларусі», што праходзіў у Маскве. Толькі вось ужо амаль не публікаваўся: апрача вершаў «Менск», «Наш крок» (абодва — 1932) і «Красавік» (1934), болей нічога ягонага ў друку не зьявілася. Менскія сябры рэдка атрымлівалі ад С. Фаміна якую-небудзь вестку. Яны былі прыемна ўзрадаваныя, калі ўвосень 1934 г. паэт на некалькі дзён завітаў у беларускую сталіцу. Завітаў, каб... разьвітацца. Успамін пра гэтую сустрэчу апублікавала ў 1948 г. у бюлетэні «Апошнія весткі» (г. Браўншвайг, Нямеччына) літаратарка-эмігрантка, якая схавалася за крыптанімам Л. Б.:

«На вузенькай ускрайнай вулачцы ў чырвоным маленькім доміку сабраліся сябры — паэты, настаўнікі, студэнты. Фамін чытаў свае вершы. Ён прачытаў прыгожы ўзьнёслы верш пра цудоўную дзяўчыну ў жыце з васількамі, і чароўны каханы вобраз гэтае дзяўчыны быў сымбалем каханае Беларусі. Чулы сэрцам паэт Кляшторны прасьлязіўся... Астатнія слухалі, затоіўшы дыханьне...

— Браты мае! — сказаў С. Фамін. — Вось гэты верш — ён апошні... Я не напішу больш нічога... І астатні раз бачу я Менск. Гэта апошняе разьвітаньне маё зь ім... Прадчуваю — вось заўтра ці пазаўтра, ці мо празь якія пяць-дзесяць дзён схопіць мяне „чорны воран". І — бывай назаўсёды! І — скончана ўсё... Я чакаю яго кожную ноч.

Ён памаўчаў хвіліну, пасьля горда ўзьняў галаву, энэргічна трасянуў сваёю густою русай чупрынай і цьвёрда ды ўпэўнена прамовіў:

— Але — дарма! Усё дарма, браткі! Хай зьнішчаць яны нас вось усіх, якія сядзяць тут. І яшчэ сотні, тысячы. Ды ня зьнішчыць ім беларускага народу! Не, ніколі!

Адзін з прысутных настаўнікаў раптам нясьмела загаварыў.

— І што ты, Сяргей, што ты нейкую дрэдзь на сябе напушчаеш? Ну навошта яны цябе будуць нішчыць! Хіба ты злачынец які палітычны ці што? Ці можа ты

запраўды ў чым вінаваты, замешаны? Тады я ня знаю... Я, прынамсі, ведаю, што я — палітычна чысты, дык і ніякі „чорны воран" мяне ня схопіць.

Сяргей Фамін сумна ўсьміхнуўся.

— Эх ты, Валодзя, наіўны ты чалавек! Мая віна толькі ў тым, што я люблю сваю краіну... Вось і ўсё. Тым ня менш... Эт, ды што гаварыць з табой, нясьведамым чалавекам...

У хуткім часе Фаміна ня стала. Ён запраўды быў схоплены „чорным воранам". Прадчуваньне не падманіла яго. І — зьнік бязь сьледу. Больш ніхто нічога ня чуў пра яго...

Але — дзіўная рэч! Празь некаторы час ня стала і таго настаўніка, Уладзімера В. Нягледзячы на ўсю ягоную ўпэўненасьць у сваёй палітычнай чысьціні, у вадну зь цёмных восеньскіх ночаў „чорны воран" прыехаў і па яго...» [6, с. 4].

Калі ж і куды «зьнік» Сяргей Фамін?

...На пачатку 1935 г. паэт быў арыштаваны, абвінавачаны ў антысавецкай агітацыі і 28 красавіка «тройкай» НКВД асуджаны да 8 (паводле іншых зьвестак — 10) гадоў папраўча-працоўных лагераў. Можна прачытаць і такую вэрсію падзеяў: спачатку С. Фамін быў асуджаны на расстрэл, але пасьля абвяшчэньня прысуду ўстаў і засьпяваў «Інтэрнацыянал» [9, с. 282], чым, напэўна, зусім агаломшыў спэцкалегію Вярхоўнага суду. У кожным разе, замест расстрэлу паэт быў накіраваны ў Ухтпечлаг (Ухцінска-Пячорскі лягер) НКВД у Комі АССР. Сям'я Сяргея Фаміна аказалася ў вельмі незайздросным становішчы: «Бяз сродкаў існаваньня засталіся жонка і трое дзяцей. Нявестку і ўнукаў прытуліў бацька паэта. Але і ў Пепелеўцы нялёгка даводзілася сям'і асуджанага. Заўважаліся косыя позіркі, чуліся зьневажальныя словы» [11, с. 7], — пісаў Г. Юрчанка.

У месцы зьняволеньня Сяргей Фамін працаваў у тапаграфічнай партыі. Нягледзячы на цяжкія ўмовы, ён стараўся займацца самаадукацыяй: вывучаў там італьянскую мову, завучваў на памяць вершы Дантэ. Працягваў пісаць і сам: адны вершы ствараў для насьценгазэты, іншыя занатоўваў у лістах да родных. І хоць у тых лістах ён усяляк падбадзёрваў маці, жонку і дзяцей, пісаў, што ў яго нібыта ўсё добра, адчувалася, што вярнуцца дадому ён ужо не спадзяваўся.

Я грежу именем твоим, твоей тоской,
Как музыкой, как лугом, поцелуем.
Мария! песня встреч... и вот с такой
Мечтой, наверное, умру я [11, с. 8], —

напісаў паэт жонцы на адной з паштовак.

І сапраўды, у лягеры паэт быў арыштаваны паўторна. 29 верасьня — 2 кастрычніка 1941 г. над ім адбыўся другі суд. Сяргея Фаміна вінавацілі ў контрарэвалюцыйнай прапагандзе і агітацыі, удзеле ў контрарэвалюцыйнай арганізацыі і рыхтаваньні ўзброенага паўстаньня ў месцах зьняволеньня. Праз два месяцы, 4 сьнежня 1941 г., паэта расстралялі ў горадзе Ярэга (Комі АССР).

Літаратура і крыніцы

1. *Бабарэка А.* Збор твораў у 2 т. — Вільня: Ін-т беларусістыкі — Беласток: Бел. гіст. т-ва, 2011. Т. 1. Літаратурна-крытычныя працы.

2. *Багдановіч І. Э., Юрчанка Г. Ф.* Фамін Сяргей // Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўнік: У 6 т. — Мн.: БелЭн, 1995. Т. 6.

3. *Борисова Р. В.* Биография Сергея Владимировича Фомина // БДАМЛМ. Ф. 55, воп. 1, адз. зах. 255.

4. *Гарэцкі М.* «Маладняк» за пяць гадоў: 1923–1928. — Мн.: БДВ, 1928.

5. *Дубоўка У.* Збор твораў у 2 т. — Мн.: Лімарыус, 2017. Т. 2. Драматызаванае апавяданне. Артыкулы. Дакументы. Лісты.

6. *Л. Б.* Разьвітаньне з Менскам // Апошнія весткі: Інф. бюлетэнь (г. Браўншвайг). 1948. № 13 (25 лют.).

7. *Перапіска Цэнтральнага бюро «Маладняку»* з Інбелкультам, ЦК ЛКСМБ, філіямі па творчых пытаннях і інш. // БДАМЛМ. Ф. 225, воп. 1, адз. зах. 2.

8. *Пратаколы пасяджэнняў, анкеты, заявы членаў і іншыя дакументы Барысаўскай філіі «Маладняку»* // БДАМЛМ. Ф. 225, воп. 1, адз. зах. 14.

9. *Скобла М.* Саркафагі страху. — Мн.: Кнігазбор, 2016.

10. *Скрыган Я.* Выбраныя творы. — Мн.: Бел. кнігазбор, 2005.

11. *Фамін С.* Дымнае жыта: Вершы, паэмы, пераклады. — Мн.: Маст. літ., 1991.

* * *

Я бачыў вас даўно. І многа праляцела
З тых пор лятункаў агнявых.
Былі тады дзяўчынкаю нясьмелай.
Прайшло...
Мяне забылі вы.

Вам не спазнаць мяне... Ды мне й ня дзіва.
Дарэмна зірк я ваш лаўлю.
А помніце,
калі ў сувеі сьліваў
Сказалі ціха мне «люблю»?

Мы бачылісь даўно. Мяне вы — не спазналі.
Кранулі зь сьмехам вы касой...
Блішчэлі сёньня ў вас занізкамі каралі
Апошняй разьвітальнаю сьлязой.

1926

* * *

Калыхнулася месяца сінь.
На дварэ па-асеньняму вецер.
Па-асеньняму хочацца сьніць,
Па-асеньняму зоры сьвецяць.
Вецер шэпча каханьне гальлю...
— Ты заходзь, мая любая, сьмела!
Пацалункамі вытку «люблю»
Па канве тваіх шчок загарэлых.
Ў гэту ноч я ня буду спаць.
Ты зайдзі, распляці свае косы!
Я у сэрца люблю насыпаць
Тваіх слоў залацістае проса.
Сёньня восень гуляе садам.
Дарагая! Ня бойся! Зірні!
Ты прыйдзі да мяне, мая радасьць,
Запалі ў маім сэрцы агні!

1926

* * *

Восень зноў.
А вечар сягоньня —
Як вясной...
Сіні месяц плыве...
Мне зьнянацку, нібы спрасоньня,
Скаргай здалась лісьцё на траве.

Да мяне не прыйшла.
Крыху сумна...
Ў гэту ноч аднаму цяжалей.
Хіба выйсьці на поле за гумны,
Будзе мо весялей.

Да мяне не прыйшла.
Дзе ты, казка?
...Вецер лісьце зьмятае ля ўгла...
Я чытаю табе дзеда Маркса,
Ты на ўлоньне ка мне прылягла...

...Затуманіўся сіні вечар,
Вецер сьцежкі лістотай заўяў.
Як хацелася б зараз пабегчы
Да цябе...
Дарагая мая!..

1926

* * *

За вакном задыхаецца вецер,
Месяц мары ў пакой прынёс...
...Многа радасьці ёсьць на сьвеце,
Многа ёсьць недарэчлівых сьлёз.

Былі дні —
я за працай вясёлай
Нешта сьветлае ў далі сьвістаў.
Былі дні —
я тугу і назолу
Пражай тонкай на сэрца матаў,

І ў пахучы званец касагораў
Я хадзіў за палі працаваць,
І маю залатую махорку
Я цягнуў, нібы сьпеў — без канца...

А цяпер вось... Ці ўчора, ці сёньня
Сам сябе не магу я спазнаць —
Сьветлай радасьці ў сэрцы — прадоньне,
У жыцьці навальніцай вясна...

Да канца развучыўся я хныкаць —
Сам я ў вочы ўбіваў асьцё...
А цяпера уздымным крыкам
Я вітаю другое жыцьцё.

За сьцяною гармонікам вецер
Нечуваную моц прынёс...
Многа радасьці ёсьць на сьвеце
І дзіцячых,
і сьмешных сьлёз.

1927

ЗЬ НІЗКІ ВЕРШАЎ «ДЫМНАЕ ЖЫТА»

Што такое, куды гэта гожа? —
Разышліся шляхі... Ураз...
...Цалавала Марыля Сярожу
Ў дымных жытах апошні раз.

На шляхах дагарэлі бярозы,
І зь зялёнага полымя — дым...
Можа, шлях той травою зарос,
Мо пажар затушылі гады.

Не была б ты такой прыгожай,
Хіба ж стаў бы ў нараньні згараць! —
Цалаваў Марылю Сярожа
Ў дымных жытах апошні раз.
. . . . . .

Адыходзіў у далі поезд,
Праплываў за вагонам вагон...
...Ўсё, што меў, я сваё дарагое
Правадзіў пад руку на пэрон.

І была так сьцюдзёна ноч,
І такая шумела зіма...
І да раньня ня ведаўся з сном,
Не чытаўся адчынены Маркс.

Ціха плакаў раяль за сьцяною,
Мары несьліся ціха ўздагон...
...Ўсё, што меў, я сваё дарагое
Правадзіў пад руку на пэрон.

1927

ВЯСНА

Травою сыпала ў палёх,
Ў мільёны скрыпак дзесьці грала;
Шумела шэрае гальлё,
А ты сьмяялася й сьпявала.

Ўсю ноч гарэлі агані,
Ўсю ноч цьвілі ружова зоры;
Ты адышла пад звон крыніц
У невядомыя прасторы.

Ў пакоі старым на акне
Застаўся водар ад жасьмінаў...
І была гэтак смутна мне
Гарэць агнямі успамінаў.

Пайшла...
Каб дзесьці у глушы
За кнігамі правесьці лета,
А восеньню блакіт і шыр
Пакінуць для ўнівэрсытэта.

1927

* * *

Сіняй ноччу ў месячную замець,
Дзе гараць ваўчыныя агні, —
Дуб самотны замахаў рукамі,
Глянуўшы на зрэзаныя пні.

І стагнаў, і галасіў ад гора...
А пасьля, як замець адцьвіла, —
Нема ехаў высечаным борам,
І жалобна плакала піла.

Маладзік пагнуўся кветкай бэзу,
Паглядзеў, стуманіўся і зьнік...
А пад дубам плакала жалеза,
І маўчалі зрэзаныя пні...

І калі ад скрыпнуўшых саней
Конь стары прыгнуўся смутнай мордай,
Заваліўся волат-дуб у сьнег
Урачыста, ўзбурана і горда...

Рэху ў пнях — нядоўга пагалёкаць:
І замоўк разбуджаны прастор.
Быў пахож на могільнік далёкі
Адшумелы высечаны бор...

1928

* * *

Пад звон сярпоў — нямала пяражыта,
Нямала сьпеваў кінута ў прастор.
Дзяўчына зноў сьпявае мне пра жыта,
Пра харaство жыцьця і срэбра зор.
Сьпявае ціха...
Ціха ноч зьлятае...
Ваўком за вокнамі асеньні выe вецер.
Імжа...
Сьнег выпаў
І растаяў.
І хіліцца,
і хіліцца дадолу вецьце...
...Сьпявай, дзяўчына!
Ну...
Хоць аб балотах,
Дзе чароты сьняць аб Беларусі.
Аб соснах мне паслухаць бы ахвота,
Сьпявай!
Ды шчыра так!
А слухаць я — бяруся!
А мо ты мне раскажаш ціха казку,
Што маці пела мне:
«Шуміць уноч гальлё...»
Мо ведаеш? —
Дык ўспомні, калі ласка!
Таксама там аб ніўных ёсьць палёх!

Як раніцай пастух,
Качаўся па расе я,
У васільковых меж зацягваў хамут.
...Хоць і люблю цябе я, вольная Расея,
А Беларусь — ляпей!
Ня ведаю чаму!

Ці мо затым —
Пяяла маці сыну:
«А ў траўні з гаем зеляненькім
Зрадніўся, любы, ты, з табою разам я».
Старонка...
Вольная...
Ты ведаеш, дзяўчына? —
Ўсё гэта —
Беларусь,
Блакітная,
Мая!..

1928

* * *

Пагубляла рубіны рабіна
і ад страты ў прастор загула...
Ў танкаструнь залатой павучыны
агарнулася жніўная гладзь.
Па ярах, па сівых пералесках
так выразны бярозы і пні.
Пад нагою ламаюцца трэскі...
Восень.
Ціха. Празрыстыя дні.
На забытай званіцы — варона.
Вечарэе.
А ў далях — туман.
Непрыкметна ў нашу старонку
едзе ціха на іртах зіма.
пахне гостра яшчэ канаплянік,
пахне полем і вільгацьцю ліп.
Зьвечарэла.
У шызым тумане
шолах шэрых зайцоў на палі...
Ноч.
Самотна, чуць чутна асіна
прашаптала, мяжу замяла...
Пагубляла рубіны рабіна
і ад страты ў прастор загула...

1928

ПРЫЯЦЕЛЬ

Ён прыйшоў нячутнаю хадою
Адпачыць і лёг на ўлоньне мне.
Нахіліўся ціха галавою
І заблытаў казку ува сьне.

Кот стары. І погляд яго шызы,
Бы туманы ў месячную ноч.
Сьняцца коту чорныя карнізы,
Па якіх ня лазіць яму зноў.

І з такою ж палкаю ахвотай,
Як ганяў калісьці галубоў, —
Аддае мне смутныя пяшчоты
І сваю каціную любоў.

І пяшчотна, і прыгожа ласка.
Любы друг! даўно ты мне знаём!
А вось хутка і памрэш ты, Васька,
І пакінеш сіратою дом.

І пад кволай, старанькай павецьцю
Новы кот прыдушыць вераб'я...
Не цалуй! Я ведаю — на сьвеце
У цябе каханы самы — я...

Любы Васька! памятаеш лета —
Ты з палёў пісульку мне прынёс.
І «Сярожы» зь сіняга канвэрта
Ўсхвалявала радасьцю да сьлёз.

І з ружовай стужкай асьцярожна
Ты мяне так часта тады зваў,
Цалаваў ад любай ты, як можаш,
Пацалункі любай аддаваў.

Сьмешна, Васька, надзвычайна сьмешна
Ўспамінаць мінулае ізноў,
І маю юнацкую бязьмежнасьць,
І тваю каціную любоў!

Не цалуй і не глядзі так горда,
Дарагі мой стары інвалід,
Чуў я сёньня, што яна з завода
Прыяжджала паглядзець палі.

Ды цяпер ня тое, Васька,
Баста!
І пісулькі ўсе ў мінулай далі...
Дэлегаткай называюць Насту,
Што калісь паненкай называлі.

Перадала Наста без паперы,
Што завод у іх пайшоў на лад,
І прасіла, каб у вечар шэры
Дапамог зрабіць ёй судаклад.

...Патухае погляд Ваські шызы,
І у сьне ён шчэрыць бель зубоў...
...Сьняцца Ваську чорныя карнізы
І мая забытая любоў.

Ну, пара, Васюк, табе на печку,
Мне туды пара — ўнівэрсытэт...
Прыхадзі ў наступны вольны вечар —
Раніца апавіла сусьвет.

1928



Віктар Жыбуль

дыхтоўны пошчак творчай стромы



Сяргей Астрэйка



Больш ніколі ня ўбачым трывожнай зары,
Палахлівых кастроў прыгуменнай рабіны.
Наш апошні, з грудзей анямелых, узрыд
Па жыцьці засумуе і ў далях загіне.

...Пражыўшы ўсяго 25 гадоў, Сяргей Астрэйка пасьпеў выявіць сябе як таленавіты і самабытны творца з адказным і неардынарным падыходам да паэтычнай мовы, а ягоныя паэмы «Змарагды кроз» і «Бэнгалія» мелі вялікі розгалас сярод сучасьнікаў, нават ня будучы надрукаванымі.

Сяргей Адамавіч Астрэйка нарадзіўся 26 чэрвеня 1912 г. (іншая дата — 25 ліпеня 1913 г. — зьявілася з прычыны памылкі ў сьледчай справе) у вёсцы Каласоўшчына Слуцкага павету Менскай губэрні (цяпер Капыльскі р-н Менскай вобл.) у сялянскай сям'і. Вучыўся ў Капыльскай сямігодцы, дзе і пачаў пісаць вершы, якія зьмяшчалі ў школьнай насьценгазэце. Аднойчы, чарговы раз наведаўшы роднае мястэчка, насьценгазэту пабачыў Цішка Гартны. Сяргеевы вершы спадабаліся вядомаму пісьменьніку: ён сустрэўся з маладым паэтам, даў яму парады і адабраў некалькі, на ягоную думку, найбольш удалых твораў, якія можна было б апублікаваць. І празь некалькі месяцаў, 26 жніўня 1928 г., у газэце «Чырвоная зьмена» зьявіўся верш С. Астрэйкі «Вясна... і сінія завеі...». У гэты час малады паэт — таксама на параду Ц. Гартнага — паступіў у Менскі беларускі пэдагагічны тэхнікум, які славіўся сваім творчым асяродкам. Гэтую ўстанову ў розны час закончылі Паўлюк Трус, Максім Лужанін, Пятро Глебка, Сяргей Дарожны, Віктар Казлоўскі, Валеры Маракоў... Адначасова зь Сяргеем Астрэйкам там вучыліся Ўладзімер Сядура (Глыбінны), Франц Гінтаўт, Сяргей Русаковіч, Сяргей Гайка, але найбольшае сяброўства зьвязала яго з таленавітым празаікам Лукашом Калюгам.

У час вучобы С. Астрэйка працягваў друкаваць вершы ў «Чырвонай зьмене», а пазьней — і ў часопісах «Полымя» і «Чырвоная Беларусь». Пачынаў ён з пэйзажнай лірыкі. Яго раньнія (1928–1929) вершы адметныя яркімі прыроднымі малюнкамі, узмоцненымі вялікай колькасьцю — амаль нагрувашчваньнем — калярыстычных эпітэтаў, якія ўжываюцца дзе ў прамым, а дзе ў пераносным (абстрактна-сымбалічным) сэнсе: *«Вясна... І сінія завеі / Ў прасторах жытніх — веснавых... / Сягоньня нівы пунсавеюць / Агнём вішнёвае зары. / Шумяць асмуглыя каліны, / Гавораць тайну над ракой. / Мая блакітная краіна / Іскрыцца сінім васільком»* [2, с. 3]. Такое мноства яркіх колераў было неабходнае паэту, каб адлюстраваць суб'ектыўныя перажываньні лірычнага героя, перадаць яго настрой. Падобна, што аўтару было ўласьцівае імпрэсіяністычнае бачаньне сьвету, якое спалучалася зь вітаньнем новага ладу і жаданьнем выказаць «кіпучую радасьць» з прычыны пераўтварэньняў у краіне [12, с. 16].

Сацыяльнай тэматыцы паэт зь цягам часу пачаў аддаваць болей увагі, зьвяртаючыся да актуальных праблемаў свайго часу — напрыклад, да тэмы калектывізацыі. Так, у адным зь вершаў («Батрачцы») лірычны герой суцяшае заплаканую батрачку, запэўніваючы, што, уступіўшы ў калгас, яна «забудзе ліхія нягоды», у іншым («У Каласоўшчыне») пра сваё (і яшчэ пяцёх аднавяскоўцаў) рашэньне ўступіць у калгас апавядае паэтаў бацька. Ідэалізаванаму шчасьліваму жыцьцю ў калгасе супрацьпастаўлялася паднявольная праца сялян і рабочых Заходняй Беларусі — «Усходніх крэсаў»; напрыклад, у вершы «Далёка пяюць асначы» апісваецца праца панскіх парабкаў на Налібацкіх лесасеках. Аднак, нягледзячы на сацыяльную скіраванасьць, вершы С. Астрэйкі ня трацілі лірычнай асновы — у іх па-ранейшаму былі маляўнічаэкспрэсіўныя карціны прыроды, яркія калярыстычныя вобразы: *«На палеткі прышоў / Златаструністы дзень — / Пад іскрыстыя бляскі / пажараў»* [5, с. 64]. Усё болей увагі паэт аддаваў мове свайго паэтычнага стылю: яго лексыкон, асабліва ў творах 1930-х гг., вызначаецца незвычайным моўным багацьцем, з агульнаўжывальнымі словамі суседзяць рэдкія і дыялектныя. Дзякуючы прыроднаму моўнаму чуцьцю аўтара радкі гучаць натуральна і вытанчана.

Спрабаваў сябе Сяргей Астрэйка і ў мастацкім перакладзе з расейскай мовы. У біябібліяграфічным слоўніку «Беларускія пісьменнікі» зафіксаваны толькі адзін апублікаваны пераклад С. Астрэйкі — кніга «Як дзеці навучыліся кіраваць аўтамабілем» (1932) А. Назарава. Аднак паэту належыць таксама перастварэньне вядомай «Песьні пра Буравесьніка» Максіма Горкага, якое ад іншых беларускіх перакладаў гэтага твору (У. Хадыкі, П. Глебкі, В. Віткі, А. Зарыцкага і М. Машары) розьніцца ўжо нават лексычна. С. Гайка сярод іншых перакладніцкіх захапленьняў Астрэйкі назваў і творы Аляксандра Пушкіна, Уладзіміра Маякоўскага [7, арк. 4], а таксама Ісака Бабеля. Няма сумневу, што паэт займаўся перакладамі сыстэматычна, бо каб узяцца пазьней за «Яўгенія Анегіна», патрэбныя былі сур'ёзныя навыкі.

Сярод сяброў і аднакурсьнікаў С. Астрэйка вылучаўся выдатным валоданьнем жывой роднай мовай: нездарма пасьля заканчэньня ў 1930 г. Белпэдтэхнікуму ён стаў літаратурным рэдактарам выданьняў Беларускага навукова-дасьледчага інстытуту прамысловасьці, а ў 1932 г. быў прызначаны навуковым супрацоўнікам Інстытуту мовазнаўства БАН, працаваў у слоўнікавай камісіі.

Праблеме чысьціні мовы С. Астрэйка прысьвяціў артыкул «Нядбайліцы і бракаробы на моўным фронце», апублікаваны 10 ліпеня 1932 г. у тыднёвіку «Літаратура і мастацтва». На прыкладзе некалькіх перакладных кніг аўтар уздымаў праблему непісьменнасьці, «сапсутасьці беларускай мовы», што назіралася тады ў кніжнай прадукцыі Беларускага дзяржаўнага выдавецтва і Дзяржаўнага навуковатэхнічнага выдавецтва Беларусі. Аўтар крытыкаваў неапраўданае ўжыванне русізмаў (кшталту *адрыцаньні*, *пасьледзтва*, *ушчэрб*, *стараньнікі*) замест беларускіх адпаведнікаў (*адмаўленьне*, *вынік*, *урон*, *прыхільнікі*), не ўхваляў ужыванння няўдалых граматычных формаў, сынтаксычных ка́лек,

Лукаш Калюга, Франц Гінтаўт і Сяргей Астрэйка — студэнты Менскага белпэдтэхнікуму. 1929 г.




якія часам скажалі сэнс арыгінальнага тэксту, набываючы небясьпечную для таго часу ідэалягічную двухсэнсоўнасьць кшталту «Усе гэтыя **безабразьзі** выцякаюць... з-за адсутнасьці **дбаласьці да клясавага ворага і шкодніка**» або «**Мы накіраваліся** наперад — у **паход за абразамі**» (вылучэньні С. Астрэйкі) [4, с. 37].

Баронячы чысьціню беларускае мовы напярэдадні сумнавядомай русіфікатарскай рэформы правапісу 1933 г., Сяргей Астрэйка выкарыстоўваў фармулёўкі ды ідэалягічныя штампы, уласьцівыя савецкай публіцыстыцы 1930-х гг. Згодна зь імі «моўныя бракаробы», напрыклад, ператвараліся не інакш як у «агентаў клясавага ворага». Толькі вось гэтым клясавым ворагам, паводле С. Астрэйкі, былі зусім не «нацыянал-дэмакраты» (як тое імкнулася падаць савецкая прапаганда), а «вялікадзяржаўныя шавіністы», да якіх паэт залічваў прыхільнікаў увядзеньня ў мову русізмаў. Такія перабольшаньні, асабліва на сёньняшні погляд, успрымаюцца як занадта ваяўнічыя. Ёсьць там і спасылкі на партыйных аўтарытэтаў, безь якіх такі артыкул проста ня мог быць апублікаваны. Дый права народаў СССР на нацыянальнае самавызначэньне, дэкляраванае спачатку Леніным і Сталіным, вабіла С. Астрэйку ў савецкай палітыцы яшчэ да таго, як масавыя рэпрэсіі набылі шырокі размах. Згаданая публікацыя сьведчыць пра дэзарыентаванасьць Інстытуту мовазнаўства (у якім працаваў паэт) навязаным яму клясавым падыходам да мовы, а таксама пра негатоўнасьць прадстаўнікоў навукі і культуры хутка прыняць наказы партыйнага кіраўніцтва [13, с. 158]. Можна сказаць, што артыкул «Нядбайліцы і бракаробы на моўным фронце» і паэтычныя творы С. Астрэйкі пачатку 1930-х гг. маніфэстуюць аўтарскае бачаньне беларускай літаратурнай мовы з двух розных бакоў.

У ліпені 1931 г. Сяргей Астрэйка скончыў працу над адным з сваіх галоўных твораў — паэмай «Змарагды кроз», рукапіс якой захаваўся ў Беларускім дзяржаўным архіве-музэі літаратуры і мастацтва (фонд Л. Бэндэ) і быў апублікаваны ў 1990 г. у альманаху «Шляхам гадоў» літаратуразнаўцай Ірынай Багдановіч і дзяячкай культуры Аленай Шарахоўскай [6].

У сутнасьці, паэма ўяўляе зь сябе *камбайн* (ад анг. *to combine* — суладжваць, спалучаць, зьмешваць) — так вызначыў гэтую жанравую форму Ўладзімер Дубоўка, які і ўвёў яе ў беларускую літаратуру. Камбайн — паэтычны твор буйнога аб'ёму са шматкампанэнтнай структурай. Яго форма прадугледжвае спалучэньне лірычнага, эпічнага і драматычнага пачаткаў, наяўнасьць вершаваных камэнтароў у зносках, уставак аўтаномных тэкстаў розных жанраў (з самастойнымі сюжэтамі), у тым ліку перакладаў твораў

Першая старонка машынапісу паэмы «Змарагды кроз» з аўтарскімі праўкамі і рэлактарскай рэзалюцыяй. 1931 г.



Сяргей Астрэйка 1.

ЗМАРАГДЫ КРОЗ

Настаўніку -
Лукашу Грынюку,
што гэтай вясною
знайшоў на Случчыне
паклады жалезнае руды,-
прысьвячаю.

На рамамэнце

Імклівасьць напорная нэрваў трывалых,
Узмахі спружынныя строшчаных рук.
Красой аздабляюць бязьмежны прагалак,
Парог за парогам у Прышласьць бяруць.

Праца імпэтная ўкрыла краіну.
Пачак нястрымны навокал ідзе.
Цені былога, агорклага, гінуць,
Руні ўзрастаюць збытэчных надзей.

Гучна нашчадкі вар"юцца ў нутрах;
Час іх ускіне на поверх зямлі.
Подых фабрычны плыве ў паветры,
Нівы ўрадлівыя шум узьнялі.

Вочы іскрыстыя ў далеч праменьце,-
Прышласьць агністая на рамамэнце. х)

х) Тое, што от-от мае быць.

іншых аўтараў. [У С. Астрэйкі часткі паэмы маюць загалоўкі: «На рамамэнце», «Чаму каганцы дагарэлі (Містэрыя сну)», «Канцы дарог (Вятрачы плач)» і інш.]

Драматычная частка камбайну можа ўтрымліваць тыповыя для п'ес дыялёгі, маналёгі, аўтарскія рэмаркі, трымацца на канфлікце пэрсанажаў-антаганістаў: узгадайма Дубоўкавых Лірыка і Матэматыка з паэмы «І пурпуровых ветразей узьвівы...», Пасажыра і Кандуктара з «Штурмуйце будучыны аванпосты!». У С. Астрэйкі ж выступаюць пэрсанажы з «гаваркімі» прозьвішчамі Зьнябыціч і Прышлевіч (першы ўвасабляе аджылае мінулае, «Зьнябыт», другі — прагрэсіўную сучаснасьць, «Прышласьць»). Адпаведна маналёгі Зьнябыціча прасякнутыя трывогай за стары лад жыцьця, замілаваньнем роднаю прыродаю, якая вось-вось можа пацярпець ад занадта імклівага размаху індустрыялізацыі. Прышлевіч спрабуе пераканаць апанэнта ў састарэласьці і заганнасьці ягоных поглядаў і заклікае пазбыцца «благіх настрояў», «літаньняў і скрухі», а замест гэтага — «шырэй думкаю кінуць» і далучыцца да агульнага пераўтварэньня краіны. На старонцы машынапісу паэмы насупраць адной з рэплік Прышлевіча яшчэ рукой Л. Бэндэ пазначана: «Матэм[атык] Дубоўкі» [3, арк. 2]. Аднак не «матэматычны» практыцызм супрацьпастаўлены тут «лірычным» хваляваньням Зьнябыціча. Прышлевіч выглядае яшчэ большым рамантыкам і летуценьнікам, толькі ягоны рамантызм скіраваны ў будучыню, а яго мары натхнёныя тагачаснай навуковай гіпотэзай пра радовішчы мінэралаў у Беларусі. Фінальны маналёг пэрсанажа дапоўнены паэтычнымі фрагмэнтамі «Зырчэюць яркія агні» і «Дэпэшы з прышласьці». У апошнім зь іх (між іншым, ён публікаваўся і як сама-

стойны твор, гл.: «Чырвоная Беларусь», 1931, № 11–12) паўстае карціна будучыні — такой, якой бачыў яе Прышлевіч. Беларусь паказаная надзіва багатай на карысныя выкапні: пад Лідай — лігніт і каменны вугаль, ля ўскраяў Лысае гары — «манганныя паклады», на Случчыне — «процьма жалеза ў нетрах», у Вокаўскім лесе — «волава глыбы зьвіняць», на Слуцкім Палесьсі — «крывёй іскрыўся аскабалак медзі». І ўсё гэта дзякуючы разьвіццю тэхнічнага прагрэсу актыўна здабываецца і перапрацоўваецца рукамі савецкіх рабочых. Відаць, што Сяргея Астрэйку і самога вельмі вабіла такая рамантыка будучых вялікіх зьдзяйсьненьняў, але ён востра адчуваў іх супярэчлівы характар, разумеў, што інтэнсіўнае будаўніцтва новага ладу нэгатыўна адаб'ецца на духоўнай спадчыне мінулага, яе амаль містычнай некранутасьці.

Жанр камбайну дазволіў паэту выказаць тое, чаго ён ня змог бы ў той час адлюстраваць у звычайным вершы ці паэме: «кансэрватыўныя», а магчыма, і «контрарэвалюцыйныя» (як маглі напісаць тады крытыкі-вульгарызатары) думкі й настроі Зьнябыціча тут аспрэчваюцца «прагрэсіўным» Прышлевічам, а таму да аўтара нібыта няма за што і дачапіцца (і ўсё адно ж — знойдуць!). Так, апошняе слова ў паэме застаецца за Прышлевічам. Аднак паэт даў магчымасьць выказацца і Зьнябыцічу, маналёгі якога займаюць вялікую частку паэмы. Зьнябыціч бачыць і кранальныя сваёй фантасмагарычнасьцю відзежы: струхлелыя ветракі нібы здані ходзяць па ягоным двары, завітаюць у хату і аплакваюць свой незайздросны лёс. Ветракі тут — ня проста млыны, яны ўвасабляюць цэлы лад жыцьця, якому наканавана адысьці ў нябыт. Менавіта той «Вятрачы плач» і абраў гурт «Zanzibar», каб пакласьці на музыку. І менавіта Зьнябыціч — пэрсанаж з багатым унутраным сьветам і носьбіт традыцыяналісцкіх поглядаў — здольны выклікаць сымпатыю беларускага чытача сёньня, калі руйнуюцца гістарычныя помнікі, старыя могілкі апынаюцца пад каўшамі бульдозэраў, а побач зь месцамі масавых расстрэлаў будуюцца рэстараны.



Галіна-Ядвіга Гайлевіч (Самко), якая захавала частку паэмы «Бэнгалія» Сяргея Астрэйкі

Сяргей Астрэйка быў, бадай, найбольш таленавітым і да таго ж сьмелым пасьлядоўнікам Уладзімера Дубоўкі. Ён не пабаяўся зьвярнуцца да жанру камбайну, ведаючы, што паэт, які яго вынайшаў, асуджаны як «нацдэм» і адбывае пакараньне.

Уяўленьне пра паэму «Бэнгалія» (1932) і яе мастацкі ўзровень да нядаўняга часу можна было скласьці толькі з шматлікіх ухвальных водгукаў сяброў і сучасьнікаў. Была вядомая і гісторыя стварэньня паэмы. У студэнцкія гады (1928–1930) Сяргей Астрэйка вельмі зацікавіўся гісторыяй Бэнгаліі, вызваленчым рухам яе жыхароў у часы каляніяльнай залежнасьці. А падштурхнуў да гэтага ўпадабаны маладым паэтам верш Язэпа Пушчы «Рабіндранату Тагору», напісаны з нагоды чаканага прыезду выдатнага індыйскага пісьменьніка ў Менск у верасьні 1926 г. [9, с. 32–34, 123]. Тады Р. Тагор прыехаць ня здолеў, але наведаў СССР пазьней — роўна праз чатыры гады.

Тэма нацыянальна-вызваленчай барацьбы аказалася блізкай паэту яшчэ і таму, што лёс Бэнгаліі нагадаў яму лёс тагачаснай Заходняй Беларусі, жыхары якой супраціўляліся ўціску польскіх уладаў. Гэтае параўнаньне таксама знайшло месца ў паэме: нават верш «Далёка пяюць асначы» і невялікі фрагмэнт з паэмы «Змарагды кроз» уваходзілі таксама і ў тэкст «Бэнгаліі» [6, с. 124]. Аднак некаторыя міжволі ўгледзелі ў творы паралелі з тагачаснай савецкай Беларусьсю — Антон Адамовіч і праз два дзясяткі гадоў пісаў, што С. Астрэйка ў паэме «паказаў Беларусь як савецкую калёнію», карыстаючыся прыёмам мастацкага «пераапрананьня» [1, с. 736]. Ці аўтар ад пачатку меў на мэце напоўніць твор прыхаваным сэнсам, ці ўжо пазьней пагадзіўся наконт магчымасьці і такой трактоўкі — тут думкі сучасьнікаў разыходзяцца [11, с. 190–192].

Сам тэкст «Бэнгаліі» доўгі час лічылі цалкам страчаным, пакуль урывак яго не адшукаўся нядаўна ў сямейным архіве перакладніцы і паэткі Галіны Гайлевіч (1912–1987). Калі меркаваць па гэтым машынапісе, паэма «Бэнгалія», як і «Змарагды кроз», хутчэй за ўсё, таксама ўяўляла зь сябе *камбайн*. Багацьце дыялектызмаў у сукупнасьці з ускладненай мэтафарыстыкай робіць паэму не заўсёды лёгкай для ўспрыманьня, асабліва калі ўлічваць, што гэта толькі «кавалак другое часткі», а першай, якая многае патлумачыла б, мы ня ведаем. Але пра агульны дух, настрой твору, а таксама яго ключавыя вобразы й матывы яна дае яскравае ўяўленьне.

Урывак складаецца зь пяці фрагмэнтаў, аб'яднаных вобразам Сузарыты, накіданым досыць пункцірна, дробнымі штрыхамі, але пры гэтым скразным. Падобна, што Сузарыта — зьнясіленая ад голаду і біцьця

маці кагосьці з паўстанцаў і пэрсаніфікаванае ўвасабленьне няскоранага народнага духу бэнгальцаў. Яе адчайна-трывожны, надломаны і, здавалася б, безнадзейны крык час ад часу ўстрывожвае навакольле, будзіць супраціў у таварышах па няшчасьці, а ворагаў прымушае здрыгануцца, і ўрэшце перарастае ва «ўзьнёслы гоман занядбаных». Крык Сузарыты будзе абавязкова пачуты — у адрозьненьне ад твораў нейкага паэта, чый партрэт выведзены ў фрагмэнце «Азызлыя вылюдкі земнае галы»: вершатворца бачыць навокал прыгнёт і несправядлівасьць, але пагарджае вострасацыяльнай тэматыкай («кідае зьняважліва ў цень») і пераўтварае свае бунтоўныя пачуцьці ў «лірычныя песьні», пазбаўленыя надзённай актуальнасьці. Магчыма, такім чынам у паэме С. Астрэйкі адбілася водгульле літаратурных дыскусіяў пачатку 1930-х гг.

Трэці фрагмэнт «Ашчапак ночы» ўяўляе зь сябе драматызаваны дыялёг пэрсанажаў з імёнамі Даржагон і Кароту. З асобных рэплік можна меркаваць, што гэта людзі розных сацыяльных групаў (ці, зважаючы на бэнгальскія рэаліі, — кастаў) і, такім чынам, неабходныя для жанру камбайну антаганісты. Даржагон — чалавек заможны, прадстаўнік арыстакратыі, ён меў ва ўласнасьці палац і гуту, прычым пражыў паўстаньне сваіх падначаленых, што адбылося на хвалі агульнага неспакою (*«…апантанага лёкая подых / Каля гутаў плыве і дрыжыць мой палац у зьнямозе. / Рабаўніцкія рукі! Чужое уласнасьці прагнуць?..»*). Кароту належыць да яўна ніжэйшага стану: у адным месцы ён намагаецца зьвярнуцца да Даржагона *«Трэба выпіць, пано…»* («паночку»?), у іншым — ня стрымліваецца і кідае таму дакор як капіталісту-эксплюататару: *«Гэта ты, / Гэта ты, / Гэта ж ты супакой іхны выпіў, / Не твая мо рука да шмаціны усё абакрала?»*. Як можна зразумець, Кароту валачэ параненага Даржагона на карабель, каб удваіх зь ім пакінуць занятую брытанскімі войскамі Бэнгалію (*«Варта з палубы кінуць апошні Бэнгаліі позірк»*) і плыць туды, дзе «жыцьцё прастарнейшае гляне». Такая трактоўка фрагмэнту паэмы мае гістарычнае тлумачэньне: у часы нацыянальна-вызваленчага руху многія індыйскія рэвалюцыянэры, ратуючыся ад перасьледу з боку каляніяльных уладаў, пакідалі радзіму і адплывалі ў эміграцыю. (Падрабязьней пра паэму гл.: [11, с. 196–198].)

Падкрэсьлім, што сам Сяргей Астрэйка ніколі ў жыцьці ня быў у Бэнгаліі і, натуральна, ня быў сьведкам гістарычных падзеяў, што там адбываліся. Таму ў паэме аўтарскія ўмоўнасьці пераважаюць над канкрэтнымі дэталямі. Паэт засяроджаны найперш на перадачы настрояў, адчуваньняў; яго твор мае вялікі эмацыйны складнік. Аўтар малюе хмурную, бязрадасную, напружаную атмасфэру начнога бэнгальскага гораду, пакуты зьняволеных у астрогу, выкарыстоўваючы элемэнты імажынісцкай і экспрэсіянісцкай паэтыкі. З дапамогай складаных мэтафараў ён паказвае гукі, рухі, а таксама чалавечыя думкі, пачуцьці й настроі ў «рэчыўным», матэрыялізаваным выглядзе: *«Выбіванка трывогі заўсёды замосьціць / Праварыны згурашчаных, збэшчаных дум», «Мітусьня у крыві сваё крыльле намочыць», «Ператрухлелі думак парэнчы», «У лагодным сьвятле убярэ кіпцюры неспагада», «Нехлямяжа паўзьці будуць думы бяз рук і бяз ног», «Жадункі скурчанай паставы / Варушаць пошчак храбусьні»* і інш.

І, напэўна, няма нічога дзіўнага, што яшчэ сучасьнікі ўспрымалі «Бэнгалію» як твор ня толькі пра Бэнгалію. Гэта паэма пра спрадвечную мару аб свабодзе, пра імкненьне паняволеных народаў вызваліцца ад прыгнёту. На тое ён і талент, каб стварыць універсальныя мастацкія абагульненьні, — і, магчыма, кожны ўбачыў у паэме тое, што хацеў убачыць.

Праўдападобна, што ўрывак з «Бэнгаліі» рыхтаваўся да публікацыі ў часопісе «Чырвоная Беларусь» або «Полымя», але абставіны склаліся так, што ўбачыць сьвет не давялося нават урыўку. Усё адбылося амаль адначасова: 23 лютага 1933 г. Сяргей Астрэйка быў арыштаваны, у сакавіку часопіс «Чырвоная Беларусь» спыніў існаваньне, а ў жніўні — дадамо — была праведзена тая самая рэформа беларускага правапісу, адметная сваім русіфікатарскім ухілам. «Вялікадзяржаўны шавінізм», ад якога нядаўна перасьцерагаў паэт, перамог.

Сяргея Астрэйку абвінавацілі ў прыналежнасьці да мітычнай «Беларускай Народнай Грамады», і разам з Лукашом Калюгам ён быў высланы ў горад Ірбіт Сьвярдлоўскай вобласьці. Там быў вымушаны працаваць бухгальтарам на падшыпнікавым заводзе, але не забываўся і на паэзію. У 1935 г. ён скончыў перакладаць раман «Яўгеній Анегін» Аляксандра Пушкіна [6, с. 125]. На жаль, са створанага С. Астрэйкам у высылцы да нас дайшоў толькі верш «На жоўты мох упала шышка…», прысьвечаны сястры Ніне.

Калі паэту заставаўся яшчэ год да заканчэньня тэрміну, 14 жніўня 1937 г. яго арыштавалі зноў. 13 верасьня 1937 г. вынесьлі сьмяротны прысуд, а на наступны дзень Сяргея Астрэйку расстралялі. Рэабілітавалі яго ў 1956 г. Архіў паэта загінуў у час вайны [6, с. 125–126], а ўяўленьне пра яго творчасьць складаюць вершы, якія ён пасьпеў апублікаваць у пэрыёдыцы, і дзьве паэмы.

Якім быў Сяргей Астрэйка ў жыцьці? Сябрам ён запомніўся як «чалавек з устойлівымі, сфармаванымі густамі й творчымі прынцыпамі. Ён рана сасьпеў духоўна, рана пачаў глядзець на жыцьцё па-даросламу, быццам прадчуваў, што яму наканавана мала часу. Магчыма, галоўным зь яго этычных і эстэтычных прынцыпаў была высокая патрабавальнасьць да сябе і да іншых. Ён быў скупы на пахвалу — не ад

Сяргей Астрэйка ў высылцы. Ірбіт, 1935 г.



душэўнай чэрствасьці, а хутчэй ад вымогчывасьці майстра, які рады высока ацаніць тваю працу, але ў той самы час чакае ад цябе яшчэ большага» [7, арк. 3], — успамінаў Сяргей Гайка.

Астрэйкаву манеру чытаньня прыгадваў Уладзімер Глыбінны (Сядура): «Сяргей, чытаючы вершы, меў звычку падтрымліваць рукою правую сківіцу, каб прыхаваць дэфэкт свайго асобнага, губнога вымаўленьня цяжкага для яго гуку ‘л’. Тады на дапамогу прыходзіў я, і мы ўдвох сугалосна і як мага галасьней, каб яшчэ больш пужаць тубыльцаў менскае ўскраіны, калацілі прастору ціхае ранічнае вуліцы, драўлянымі ходнікамі якое мы доўга любілі спацыраваць улетку і чытаць... чытаць вершы нашых улюбёных паэтаў» [9, с. 80]. «Смуглявы, з чорным хвалістым чубам і вялікімі вачыма, задумёны і ня вельмі гаваркі Сяргей Астрэйка адпавядаў вобразу паэта» [8, с. 99], — зазначыў Франц Гінтаўт, які называў яго «вялікім летуценьнікам з Каласоўшчыны».

Вестка пра трагічны лёс маладога таленавітага творцы балюча скаланула сэрцы ягоных сяброў. Адзін зь іх, Уладзімер Дудзіцкі, у вершы «На папялішчы руж» (1937), прысьвечаным памяці Сяргея Астрэйкі, напісаў: *«Пачаў ды хутка змоўк. / І сэрцу прыкра гэтак. / Палескіх песьняў шоўк — / пялёсткі першых кветак — / крывёю тлум затоўк, / і песьня не дапета»* [10, с. 57].

Літаратура

1. *Адамовіч А.* Да гісторыі беларускае літаратуры. — Мн.: Зьміцер Колас, 2005.
2. *Астрэйка С.* «Вясна... І сінія завеі...»: [Верш] // Чырвоная зьмена. 1928. 26 жн.
3. *Астрэйка С.* Змарагды кроз: [Паэма] // БДАМЛМ. Ф. 66, воп. 1, адз. зах. 1254.
4. *Астрэйка С.* Нядбайліцы і бракаробы на моўным фронце // Кніга — масам. 1932. № 4–5 .

5. *Астрэйка С.* Я стаяў ля дарог...: [Верш] // Полымя. 1930. № 3.

6. *Багдановіч І., Шарахоўская А.* Узнёслых гадоў наструнованы верш: Пра С. Астрэйку і яго паэму // Шляхам гадоў: Гіст.-літ. зб. — Мн.: Маст. літ., 1990.

7. *Гайко С.* Памяти Сергея Астрейки // БДАМЛМ. Ф. 55, воп. 1, адз. зах. 12.

8. *Гінтаўт Ф.* Па слядах дзвюх знічак // Гінтаўт Ф. З картатэкі памяці. Гродна: ГрДУ, 2000.

9. *Глыбінны У.* Паэта з Божай ласкі. Успаміны й роздум пра Язэпа Пушчу. Нью-Ёрк, 1979.

10. *Дудзіцкі У.* Выбраныя творы. — Мн.: Лімарыус, 2010.

11. *Жыбуль В.* Вяртанне «Бенгаліі» // Дзеяслоў. 2018. № 5 (96).

12. *Жыбуль В.* «Пачаў ды хутка змоўк...»: Жыццё і творчасць Сяргея Астрэйкі // Роднае слова. 2012. № 7.

13. *Запрудскі С.* Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918–1941). — Мн.: БДУ, 2015.

* * *

Вясна... І сінія завеі
Ў прасторах жытніх — веснавых...
Сягоньня нівы пунсавеюць
Агнём вішнёвае зары.
Шумяць асмуглыя каліны,
Гавораць тайну над ракой.
Мая блакітная краіна
Іскрыцца сінім васільком.
Які прастор! Цьвітуць паляны,
Маўчаць за рэчкаю лугі.
І вёска ў наквеці вясьнянай
Кіпучай радасьцю бурліць!..
Бурліць яна: сьмяюцца стрэхі
У пырсках сонечнай красы...
А конь жалезны будзіць рэхам
Ў палёх сягоньня каласы.
Таму сягоньня зьнікла гора
Ў прасторах жытніх, дарагіх.
Эх вы, грачнёвыя прасторы
І аксамітныя лугі!

[1928]

* * *

Я іду дарогай... Навакол загоны.
Сумна выглядаюць шэрыя палі,
Важна спацыруюць чорныя вароны,
Дзе яшчэ нядаўна ячмяні расьлі.
Апранула хустку жоўтую бяроза,
Валасы зьвісаюць на пяшчотны дол.
А з палёў туманных людзі бульбу
звозяць,
І скрыпяць калёсы жалем і тугой.
Качкамі сівымі пазірае сёньня
На шырокім лузе шэрае куп'ё.
І сумуюць ціха вараныя коні —
Ўспамінаюць, можа, грэчку і авёс!..
Толькі адзінока ў кашміровым полі
Дзіцянём сьмяецца маладая рунь...
Хочацца кусточкі цалаваць да болю
Пад акорды ціхіх, жаласьлівых струн.
Я іду дарогай... Завывае вецер,
Шапаціць на межах сонны ўжо быльнёг.

Але не загіне назаўсёды лета,
Каласіцца будзе радасьцю ў палёх.

[1928]

ГЛУХАЯ НОЧ

Глухая ноч,
А на рацэ лілеі
З зыбучай шэрані
Глядзяць у вышыню...
Ў маіх грудзёх
Так сэрца паланее —
Вітае радасна
Кіпучую вясну.

Люблю я ноч,
Калі іскрацца росы,
Іскрацца золатам
На мяккіх дыванох,
І з вышыні бяроза
Зьвесіць косы —
Шапоча лісьцямі
І стукае ў вакно;

Калі ў садку
Зьвісаюцца павольна
Маністы белыя,
Купчастыя, як дым, —
Тады я тут
Стаю каля таполі,
Стаю, і думаю,
І цераблю лісты.

Стаю я тут
І босымі нагамі
Тапчу расістую,
Мурожную траву.
Пайду я ў даль,
Пайду я паплавамі
І там я абніму
Квяцістую вясну.

Глухая ноч,
А на рацэ лілеі
З зыбучай шэрані
Глядзяць у вышыню...
Ў маіх грудзёх
Так сэрца паланее —
Вітае радасна
Кіпучую вясну!

[1928–1929]

НА РАСЬЦЯРОБЕ

Асмолкі зары на далёкім кургане.
Бялеюць абрысы Птушыных Дарог.
Туману адбрэнгалі пудкія здані,
І сонца угору ўзьнялося на корх.

Ў гушчарах туляецца навалач змроку,
Цьвірчыць пасьля ночы трухлявы шыльнік.
І рэха сланяецца лесам далёка:
Мажныя зрываюцца з кораня пні.

Сухія наўкола ляцяць аскабалкі,
Дашчэнту пастрэмлена імі зямля.
Дрыжыць загамованым шумам прагалак,
І хвоі высокія гольлем смыляць.

Руплівая праца брыгад дрывасекаў
Краіне рыхтуе дрывяны сырэц.
Смалы надарылі хваіны на лекі,
Піла іх зубамі за ногі бярэ.

Гібляюцца рукі навошчаных елак,
Падацца наперад наровяць яны.
Ўспадае на гольле патрушчаны нелад,
Ўядаюцца ў землю глыбока ражны.

Ім рукі абсекаюць вострай сякерай,
Сьцінаюць галовы, зьдзіраюць кару...
Бягуць працяробы ў барвовую шэрасьць,
Сьвіціцца здалёку асмуглены рум.

Ўтуліўшы галовы ў мурашнікі лесу,
Ашчэрылі зубы збуцьвелыя пні.
Выростаюць гурмы шліпёраў, ачэсу.
Бярвеньне, як крохкая шклянка, зьвініць.

Пазырыўшы змору на дробныя шматы,
Сякуць дрывасекі, ня чуючы рук.
Агортвае ў лесе іх вечар крылаты,
А раніцай неба праводзіць зару...

Па рэчцы ідуць параходы няспынна.
Як вокам акінуць — зіяюць плыты:
Адвозяць бярвеньне заводам краіны;
Плывуць і плывуць паўз алешнік густы.

Нязломныя сілы у працы дазваньня
Фабрычнай краіне ня шкода аддаць...
Сякеры у лесе зьвіняць ад сьвітаньня,
За логам цьвіце кашміровая даль.

29/V–31 г.

ПРОШВЫ ПЭЎНАСЬЦІ

Таму даюць пакункі кпінаў,
Хто без турбот, улегцы едзе...
Трэ сілу й гарт аддаць краіне,
Каб не губляць дарэмна недзе.
Работы нам прыпала многа —
Хто агінацца будзе ласы?!.
Здушы насьмерць вужаку змогі —
Адпачываць няма нам часу!
Пагарды нашай зыркай варты
Усякі, хто сцураўся мэты.
Наш пэўны крок імкне упарта,
Агнём жаданьняў мы сагрэты.
Урваць, скрышыць наровіць творы
Варожы сквіл, зайздросны гоман.
Штораз гучней, званчэй гаворыць
Дыхтоўны пошчак творчай стромы.
Прывабна хваляў пругкасьць кроіць
(Ня нам плысьці вадою плыткай!).
На ручніках агністых строяў
Дасэні кроз патрэбна выткаць.
Разгону рук няма упыну,
Прасторных дум растуць узьлёты...
Аддайма ўсё на гмах краіны —
Адпачываць мы будзем потым!

1932 г.

З ПАЭМЫ «ЗМАРАГДЫ КРОЗ»

Чаму каганцы дагарэлі

(Містэрыя сну)

Чаму дагарэлі тады каганцы,
Як змрочных дарогаў сышліся канцы?..

Крадзецца у сэрца трывогі вястун,
Уцеху патрушчыў упыл, на жарству.

У грудзях зьнябытых азглелая мгла,
І роспач тупая нахрапна ўвайшла.

Маё бажавольле, што песьціў гадамі,
Ўхапілі вятры разьбіваць па аддалях.

У вочах туман, мітусьлівісты іней,
Праходзяць сьмяротныя мерна хвіліны.

Ўганяюць у сэрца асінавы кол,
І туліцца цемра ў пагрозе наўкол.

Адштырыць хачу звар'яваныя здані.
На сьмерць захлынаецца ў горле рыданьне.

Ачэрнены клён пазірае ў вакно,
А болей нічога нідзе не відно.

Даўно ж дагарэлі усе каганцы!..
Па хаце вандруюць надзеяў жанцы.

Прыдушаны сьмех і зякратыя вочы.
Жыўцом дарагое глынуць, мусіць, хочуць.

Нічым іх, агідных, няможна суняць...
Пудліва праз хату бяжыць цішыня.

Жыцьцёвыя, пэўна, прыходзяць канцы.
Даўно ўжо пагасьлі усе каганцы...

———

Пашастаны шолах цьвілога радна,
І нешта знаёмае каля вакна.

Дваром перайходзяць зьнябытыя цені.
На дол распасьцерлася ніцма шасьценьне.

Ўглядаюся пільна вачыма ў вакно:
Блуканьнікі выйшлі усе на відно.

Збуцьвелыя строі і зглоданы твар,
Агорнены спрэс у імшануюю твань.

Адбітак пагрозны наклалі вякі...
Нясьмела ідуць паўз вакно ветракі.

Заходзяць у хату, мінаюць парог
Вандроўнікі змрочна-туманных дарог.

Ранейшага ў постаці ўжо не пазнаць,
Старэчасьці друхлай ацьвілены знак.

Ўкрыжованы смутак на крыльле залёг,
Як вострая роспач тупых мазалёў.

І вытырклі косьці ўчарнелых рабрын,
Яны дагарэлі на вуглях зары.

Яны адшумелі ў імжаку і стынь,
Разьвеялі сілу у ветрах густых.

Чуць толькі ліпяць на узгорках сухіх.
Напоўнена цела шматамі трухі.

Іх страх агартае на родных палёх:
Мо вораг пад кожным усхілам залёг?

Таму вось і нанач прыйшлі да мяне.
Іх звонкая ціша з узгоркаў жане.

Для іх нешта значыць і шум баравы.
Загасла імкненьне узьняцца у высь.

Ім грудзі пакроіў адточаны сум...
Няўжо ж іх вятры па палёх разьнясуць?

Узьнімуць з усхонаў, у прорву шпурнуць...
Уклешчыцца ў цела сьмяротная жудзь...

Агорне іх чэмер, і смутак, і жаль,
Ў канвульсіях скону апрыкрае даль.

І месяц, і поле, й туман над ракой,
І прыйдзе халодны, ўгасальны спакой.

Збуцьвелыя косьці абмыюць вятры,
Заплачу я з болю сьлязамі наўзрыд.

Ламаць буду рукі, ірваць валасы,
І будзе надрыўная даль галасіць...

———

Туман адплывае... Ўглядаюцца вочы:
За вокнамі полаг асьветленай ночы.

За вокнамі стужка люстранай ракі.
У хаце прасторнай туга й ветракі.

Ўглядаюцца нешта нясьмела яны —
Апошнія госьці мінулай вясны.

Саструганы грудзі вятрамі на тло.
Зь іх крыльляў сьцякае на землю сьвятло.

Прабіты дажджамі на сіта страі,
У смутку надрыўным тулюся да іх:

— Мне страшна за вас, дарагія сябры,
За вокнамі веюць ліхія вятры!

Пабудзьце у хаце да самай зары —
За вокнамі веюць ліхія вятры!

Здушыце у сэрцы тужлівы узрыд:
За вокнамі веюць ліхія вятры!..

———

Туман адплывае... Маўчыць цішыня.
Вятрачыя словы у хаце зьвіняць:

Канцы дарог

(Вятрачы плач)

Перайшоў нейкі шорах праз поле й кусты.
Дзындра гукаў ня моўкне, надрыўна шасьціць.
Шмат каму давялося ў стагодзьдзях застыць,
Не дайшоўшы туды, куды клікаў сусьціг.

Перайшоў нейкі шорах праз поле й кусты.
З пуду ў далеч пабег звар'яваны спакой.
Нехта нашых надзеяў паворсіў прасты
І саміх нас крануўся магутнай рукой.

Наплывае адчай, і зыбаецца сум
Павуціннаю кволасьцю баб'яга лета.
Нас халодныя ветры латошаць, трасуць.
У тумане прапалі імклівыя мэты.

Наплывае адчай, і зыбаецца сум.
Крыльляў порсткіх ніяк не узьняць. Парахня
Пераела нутро, збузавала красу.
Не адходзіць ад нас ні на крок цішыня.

Нашым дзеям сьмяротны прышоў рачанец,
Дзіды часу навылет пратнулі нутро.
Воблік наш гартаваны ў гадох учарнеў
Ад туманнай імжакі і зыркіх вятроў.

Нашым дзеям сьмяротны прышоў рачанец.
Нас адкінулі шуфлем у згоніны веку,
Як сьвятлом каганцовым жыцьцё мільгане,
Прыляціць мо рыданьне аднекуль?

Больш ніколі ня ўбачым трывожнай зары,
Палахлівых кастроў прыгуменнай рабіны.
Наш апошні, з грудзей анямелых, узрыд
Па жыцьці засумуе і ў далях загіне.

Больш ніколі ня ўбачым трывожнай зары
(Нас, пахілых, нядэшлых, зямлёй занясе).
І бяз нас будуць зь ветрам аўсы гаварыць,
І начамі купацца ў квяцістай расе.

Шмат гадоў перажыта, загашана дум,
Няўпынёных узьлётаў разьвеяна ў полі.
Так напісана, мусіць, было на раду...
То спрунжынавы росхін трагічнае долі...

Шмат гадоў перажыта, загашана дум...
Ўсё бліжэюць магілы халоднай абрысы.
Разьвітаньне усім, што за намі ідуць,
Чые сэрцы гараць, як разьдзьмуханы прысак!

———

Туман адплывае... Вачэй не узьняць...
Па хаце вандруе, як сьмерць, цішыня...

1931

З ПАЭМЫ «БЭНГАЛІЯ»

Надломаны крык Сузарыты

Нахапіўся от вечар ды шорхне самота,
Пазалатваны змрокам адчаю сьляды.
У паветры дайходзіць абскубаны лотаць.
І кабета ідзе з гладышамі вады.

Ўсе дашчэнту павеці надзей параскрыты,
І развагу дратуе блуканьняў суток.
Можа лепей было б, каб цяпер Сузарыта
Не кранала хадою састояны змрок.

А калі б спадцішка дзе і бразнулі косьці,
Дык заенчыла б ноч, увабраўшы жуду.
Выбіванка трывогі заўсёды замосьціць
Праварыны згурашчаных, збэшчаных дум.

Пэўна, матчына сэрца зайшлося б дазваньня,
Атрусаючы ўсьцяж спадзяваньняў ірдзень.
Павыросталі б дзіды жуды на майдане
Абязьвечаных кроз, зругаваных надзей.

Але жах неўспадзеўкі ўядаецца ў вочы,
Галавою шпурляе ў нязрушаны мур...
Мітусьня у крыві сваё крыльле намочыць,
Покуль прыйдзе спакой утаймованых бур.

Як падсечаны клён, як страла бліскавіцы,
Як пранізаны сконам апошні усхліп,
Звар'яваўшыся, маці зрынаецца ніцам
На змарагды крыві, што на бруку засхлі.

Апярэшчаны крык устрасае паветра,
Б'ецца водгульле дзіка аб сьцены, слупы.
Гладышы й цішыня пашчапаны упэтрах,
Ды глытае ваду раскатурханы пыл.

Пакрамсаныя рукі ўзнімаюць гарліва
Падаткой галавы аскабалак і цень.
Пратрушчанай музыкай крохкіх узьвіваў
Адгукаецца жмук абыякіх касьцей.

(З аднэй пары вачэй прагавітым пажарам
Вугалёў на падпалку напэўна было б.)
Круганы, пралятаючы, струджана мараць,
Як застроміць дзюбы пад суцішаны лоб.

Калывалася ноч… Анідзе супакою
Не было цішыні, валачылася ўсьцяж.
Перасыпаўшы вуліцы чорнай лускою,
Альбіёнцы прыйшлі па апошні касьцяк.

Перамогаю гардыя, матку шпурнулі…
Аказалася нема… (Гусьцела імгла.)
Узьнялася… На стыку абветраных вуліц
Аднаму яшчэ плюнуць у вочы змагла.

А тады, зьнепрытомнеўшы, ўпала ля плоту…
Мо яшчэ і узьнімецца рукі крывіць…
У паветры дайходзіў абскубаны лотаць,
Перасыпаны пахам азглелай крыві.

Нелад

Надвячоркамі кліча гады адзінота.
Засынае ў гнязьдзе задаволены шэршань.
Разьвінаецца боль. Папялее балота.
Надвячоркамі пішуць паэты вершы.

Паабапал надзей асталёўвацца можна,
Калі толькі сьляды не сякуць і ня страшаць.
Але мусім сьпяшаць на падворак вастрожны —
Там якраз пачынаецца шаст мурашак.

Сашчыльнее трывожны навокала вэрлах,
Цішыню скалане і руплівa паточыць.
Ўтаймаваньне цягліц аблягло і памерла,
Адзічэла засоўгалі, стыгнуць вочы.

Узьнімаецца ніжай разважная згуба.
Шабуршыць і паўзе з паразьзяўленых шчылін.
Сузарыта ўсьцішае дрыготкія зубы
(Іх дагэтуль даволі ужо лушчылі).

Безупынна люструе чаканьне падлога,
Адбывае хвіліны уздрыгваньнем важкім...
Шкумацьцё зругаванага цела людзкога
Разгайданай хадою трасуць мурашкі.

Агаляюцца жахі заструпелых ранаў,
Адраджаецца кроў, што учора шчыльнела.
На падлозе, ля сьцен, у вачах звар'яваных
Мітусіцца халодны, зацяты нелад.

Засячэце ж хутчэй... (Сузарыта галосіць.)
Тра-та-та-тра-та-та-та... (Высьпеўвае варта.)
Занядбалыя парыі паляць ачосьсе
Нехлямяжай пакоры. Дужэе упартасьць.

Закажанее голас, няспрытна закружыць
І абсунецца боль. І тады на скалы
Асыпаецца ноч, як сасьпелая ружа,
Захлынаецца смутны усхліп шакалаў.

Народжаны голас

Не раструшаць увагі кемнай
Вучыла ноч. Пасхлі вагні.
Паўзуць сьляды, і ўзмах ярэмны —
Зьнібелы енк да рук прыгні.

На шорх ускінь трывогі посьцень.
Дрыготкіх пальцаў гук сатні.
Аблудных сноў разьвеяць косьці
Вучыла ноч. Пасхлі вагні.

Калі успалі крокі ніцам —
Не забіраць жа іх назад!
Узмахам нэрваў трэ жывіцца,
Дарог акрайкі уразаць.

Не адцінай сьлядоў ад мэты —
Няхай трапечацца ў крыві.
На шлях ніхто ня кідаў кветак —
Дарма іх зіркам не лаві!

Пакінуць там тугу ў аблозе,
Дзе зельле хціва узрасло.
Гадуюць рупна мужны позірк
І сьпічакі зацятых слоў.

А хто абмацаў добра змогу
Ды калываецца наўзьдзіў —
Не затарноўвай лепш дарогі —
Ўдваіх зь сяброўкаю сыдзі.

Паворсіш стройнасьць неспакою
І атаймовак знойдзеш мо.
Усякі добры недабоек
Якраз вяртаўся так дамоў.

Ўпіваўшы хрумст «жалезнай ночы»,
Дрыжачку ўцехі песьціў Глан.
Прайсьці нам трэ іржу латочын,
Дзе ўсюды сьцішнасьць залягла.

Скрозь бамбукі рыпяць трывожна
І, пэўна, вока дзе цьвірчыць.
Ўзрываць наповерх трэба, можна
Падзей разгойданых карчы.

Калі ж наважыць хто учваліць
Няўпынных думак трапны гон,
Шпурні слатой з узьнёслых паляў
Усякай нэндзы наўздагон.

І от, як будзе хцівы вораг
Сквілець, упяўшы вочы ўніз,
Яго прылашчы так, каб шорах
Ані узрухнуў цішыні.

Набраклы подых неспагады
Каму удасца уламаць?
Дарма ўзгадоўвае прынаду
Заўзяты Гандзі Магатма.

Гадамі здолеў атрухлявець
Маны узорнае касьнік...
Жадункі скурчанай паставы
Варушаць пошчак храбусьні.

Сьпяваюць шыбіны шантанаў,
Люструюць струджана і ў час
Узьнёслы гоман занядбаных,
Што ўсьцяж вучыліся маўчаць.

За аскабалкі кроз і костак,
За спрыт ярма вякоў спакон
Зьдзірайце гідкія наросты,
На ногі дбайны неспакой!


[1932]



Язэп Янушкевіч

неадменны сакратар Адраджэньня

Вацлаў Ластоўскі



Як брат няволіць брата,
як раб багоміць ката,
пра стогн душы
пішы!
Ня словамі,
ня чорнаю сьлязой
чарнільнаю,
а нэрвамі, крывёй,
узрыгамі душы
пішы!

«З крыжоў здымаем тысячы расьпятых…»

* * *

Чым угнявіла ты Бога? І чым раззлавала,
Што над табою, яшчэ не апетай і сотняю строф,
Маятнік часу упаў, і касьцельная цемра настала,
Цемра прабітых далоняў і тысяч няправых галгоф? —

вырвалася адчайнае пытаньне з вуснаў галоўнага героя, маладога князя Алеся Загорскага ў эпілёгу недапісанага гістарычнага раману Ўладзімера Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім».

Падзеі раману разгортваюцца ў сярэдзіне XIX стагодзьдзя, перад самым пачаткам нацыянальна-вызвольнага паўстаньня 1863–1864 гадоў. Але ягоным крывавым здушэньнем ня скончылася панаваньне над Беларусьсю «цемры прабітых далоняў». Сёньня, акідаючы вокам яшчэ адзін прамільгнулы ў пакутах век, на пытаньне, які пэрыяд стаўся найбольш трагічным для XX стагодзьдзя, з сумнай пэўнасьцю можам канстатаваць: 1920-я — пачатак 1950-х гадоў.

Гэта быў праклятый час жорсткага здушэньня нацыянальнага руху не адных беларусаў. Здушэньня, расьцягнутага не на адно дзесяцігодзьдзе, аплачанага беларускім і суседнімі зь ім народамі мільёнамі «няправых Галгоф». Найчасьцей безыменных, нібы ў эру першых хрысьціянаў.



Крыж з выявай Вацлава Ластоўскага ў Курапатах. Фота Сяргея Будкіна


На адну зь іх мужна ўзышоў сын беларускай зямлі, шчодра надзелены ад прыроды талентам, — Вацлаў Ластоўскі, дзяржаўны дзяяч, адзін з ідэолягаў утварэньня незалежнай Беларусі, выдатны пісьменьнік, гісторык, публіцыст, філёляг, выдавец, перакладнік, бібліёграф… Несправядлівасьць учыненага над ім раніць сэрца ня толькі фактам нялюдзка абарванага жыцьця творцы, перад тым выкінутага з роднай зямлі, скалечанага ленінска-сталінскімі лёзунгамі, — але і доўгім, несправядліва доўгім замоўчваньнем ягонай «веры» — глыбокіх ведаў з гісторыі роднай Беларусі-Крывіі.

Пасьля расьпяцьця Хрыста сын Божы пакінуў 12 апосталаў. Акадэміка Вацлава Ластоўскага, расстралянага бальшавікамі (гэтымі цэнтурыёнамі-легіянэрамі апошняй найвялікшай імпэрыі), пазбавілі годных вучняў і наступнікаў. Ягоная «Біблія» — капітальная «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» — ляжала ў савецкіх спэцсховішчах да самых апошніх 80-х гадоў, калі ўжо на ўсю моц шумелі «галоснасьць» зь «перабудоваю».

Постаці, роўныя Вацлаву Ластоўскаму, засталіся дзесь у эпосе першага Адраджэньня, у часы Скарыны і Гусоўскага. Мо дзеля неабсяжнай велічы зробленага ім у розных галінах айчыннай культуры і не маглі так доўга адважыцца на поўную рэабілітацыю вучонага Піляты XX стагодзьдзя, цудоўна разумеючы, што тым самым давядзецца расьпісацца ў краху ўсіх догмаў, панагароджаных у беларускай гуманітарнай навуцы цягам апошняга паўстагодзьдзя. «Ці прызнайце дрэва добрым, і плод ягоны добрым; ці прызнайце дрэва марным і плод ягоны марным; бо дрэва пазнаецца па плодзе» (Мацей; 12, 33).

Але Вацлаў Ластоўскі выйшаў з роду волатаў духу. Гэта значыць, быў народжаны для несьмяротнасьці, бо ўсё жыцьцё рупіўся пра скарбы, якія моль не паточыць, іржа ня зьесьць. Гартаваў

Надпіс на адвароце фатаздымка, падоранага Вацлавам Ластоўскім артыстцы Паўліне Мядзёлцы. 1920-я гг.



дух нацыі, упарта аднаўляючы памяць пра мінуўшчыну, пабітую нанесенымі праз чужынцаў камянямі няведаньня.

Глухой восеньню 1883 году, 27 кастрычніка паводле старога стылю, а паводле новага 8 лістапада, у засьценку Калесьнікава[1], што на Дзісеншчыне, у сям'і Юстына і Ганны Ластоўскіх нарадзіўся сын. Хрысьцілі яго ўжо па Калядзе, 26 сьнежня, у Задароскім касьцёле ля мястэчка Дзісны. Тамтэйшы сьвятар ксёндз Антон Аўдыцкі даў яму пры хросьце адно імя: Вацлаў. У хроснай мэтрыцы бацькі немаўляці названыя мяшчанамі. Гэта значыць, хутчэй за ўсё, паходзілі зь безьзямельнай шляхты.

Праўда, меркаваньне пра радавод Ластоўскіх як спаконвечную шляхту бачыцца дужа няпэўным у сьвятле выказваньня: *«Мой бацька земляроб, дзед — каваль, а прадзед — бортнік»*. Так крылата акрэсьліў сямейную генэалёгію Вацлаў Ластоўскі, сам ужо будучы на выгнаньні ў далёкім Сарататве.

Бортнік і шляхоцкі радавод — рэчы ў прафэсійным, тым болей у сацыяльным статусе XIX стагодзьдзя недапасаваныя. Затое не выклікае сумневу вольнае і трохі галаднаватае маленства сына безьзямельных шляхцічаў-арандатараў у адным з найпрыгажэйшых куткоў Беларусі — на Полаччыне. У родным для Вацлава Калесьнікаве ў 1866 годзе стаяла ўсяго адна хата і жылі 14 душ. Паводле веравызнаньня — усе каталікі.

Жылі ў асноўным з ральлі. Пазьней ва «ўспамінах зь нядаўняй мінуўшчыны» пра вёску Стары Пагост ён прыгадае: *«Агульна беручы, крыўская вёска жыла вельмі бедна, асабліва ж бедна жылі жыхары вялікіх вёсак, дзе пры малазямельлі і шнуравой гаспадарцы зямля выкарыствалася толькі напалавіну. Прыкладам, у гэтым самым Старым Пагосьце на звыш 60 гаспадароў толькі 3–4 гаспадары мелі хлеб на стале ад новага да новага; палавіна ж вёскі ад вясны да жніва хлеба ня бачыла»* [7, с. 181–182].

Акром хлеба, сям'ю Ластоўскіх падкормлівалі Дзісна-Дзісёнка і бліжэйшыя азёры. У азёрных глыбінях, месцамі да 20 мэтраў, брохалі серабрыстыя з залацістым адлівам ляшчы й «падлешчыкі», цяжкія шчупакі, гуляла порсткая плотка і жвавыя акункі, у цёплых старыцах задуменна грэліся тоўстыя ліны й язі, у халоднай крынічнай вадзе ці ў норах пад карчамі стаялі аліўкава-зялёныя ментузы.

Доўгімі восеньскімі вечарамі не зацугляныя ляснымі верхавінамі вольныя вятры гайдалі бяссонныя азёрныя і рачныя хвалі, а ў хаціне пад чаратоваю страхою патрэсквала лучына, сьпявала верацяно ці гудзеў калаўрот, і разам з доўгаю кудзеляю цягнуліся бясконцыя казкі азёрнага краю. Ці не ў бацькоўскай хаціне заслухаецца ўпершыню малы Вацік паданьнямі пра волатаў, зь якіх пачне пазьней свой славуты, а цяпер зусім забыты «Беларускі радавод»?

Чары сівой даўніны і адначасова дзівосны чын нараджэньня з чорных казюрак-літарак новага цуду — зразумелых (і не зусім) слоў — агарнулі ў маленстве дапытлівага лабатага падлетка. Першую навуку чытаць-складаць хлопчык лёгка адолеў дома, і бацькі аддалі сына ў найбліжэйшае мястэчка Пагост. Пасьля заканчэньня парафіяльнай школкі ў 1894 годзе здольны падлетак спрабаваў, паводле няпэўных зьвестак, атрымаць адукацыю ў Дзісенскай павятовай навучальні. Ці скончыў яе — невядома. Але, пэўна, так яно і адбылося, інакш у сталыя гады чалавек ніколі б не паўтараў: «Маё роднае мястэчка Дзісна».

[1] Да апошняга часу ўсе айчынныя і замежныя энцыкляпэдычныя даведнікі падавалі аднолькава недакладную дату нараджэньня — 20 кастрычніка / 1 лістапада 1883 г., — і месца нараджэньня: засьценак Калесьнікі ў сучасным Мёрскім раёне. Цяпер дакумэнтальна даведзена, што родны кут Ластоўскага — былы засьценак Калесьнікава (цяпер у Пліскім сельсавеце Глыбоцкага раёну).

Нягледзячы на немалыя і калярытныя школьныя ўспаміны, пакінутыя Вацлавам Ластоўскім, юнацтва будучага прэм'ер-міністра ўраду Беларускае Народнае Рэспублікі, на жаль, пакуль праглядаецца пункцірна і непасьлядоўна: хлопчык на паслугах у адной зь віленскіх вінных крамак, дзе атрутным смогам вісеў цыгарэтны й сьпірытусавы чад, у якім плавалі разнамоўныя мацюкі падпітых кліентаў; канцылярыст нейкай казённай установы ў Шаўлях... Але да ўсяго гэтага душа аніяк не гарнулася. Па-ранейшаму вабіла навука. Юнак дапяў ажно ў Пецярбург — найбуйнейшы культурны асяродак Расейскай імпэрыі пачатку XX стагодзьдзя, дзе ўдала ўладкаваўся бібліятэкарам нейкай прыватнай студэнцкай бібліятэкі, адначасова крадком зазіраючы ў аўдыторыі тамтэйшага ўнівэрсытэту паслухаць лекцыі славутых прафэсараў. Наведваўся «зайцам», бо належнай капейчыны, каб плаціць за ўнівэрсытэцкую адукацыю, ня меў.

Пэўнымі застаюцца два факты: у 1902 годзе дзевятнаццацігадовы юнак стаў сябрам Польскай сацыялістычнай партыі Літвы і Беларусі, а налета, у 1903 годзе, Вацлаў узяў шлюб з Марыяй Іваноўскай (Іванаўскайце), пазьней вядомай літоўскай пісьменьніцай пад агульным са старэйшай сястрой Зосяй псэўданімам Лазьдзіну Пяледа. Нейкі час маладыя жылі на жончынай радзіме ў двары Парагяй (поўнач Літвы). Пажыў Вацлаў і ў Рызе. Менавіта з Рыгі Ластоўскі даслаў першую вядомую публікацыю ў «Нашу ніву».



Перавыданьне кнігі Вацлава Ластоўскага «Кароткая гісторыя Беларусі» (Менск, 1993 г.)

Зрэшты, у маладыя гады адбылася яшчэ адна, на першы погляд малапрыкметная, падзея ў лёсе няўрымсьлівага маладзёна. Як нараджаецца паэт, мастак ці музыка?

Народзіны духоўнага шмат у чым застаюцца таямніцаю, калі на няўлоўны нябесны покліч адгукаецца людзкая душа. Таямніцаю засталося нараджэньне Ластоўскага-філёляга. Мо яно паўстала ад безнадзейнасьці прабіцца да ўнівэрсытэцкай крыніцы ведаў, каб наталіць імі прагную душу? Душу, якая з-па-над халоднай Нявы ды пецярбурскіх камяніц памаладому ўтрапёна крыляла ў думках на азёрную, рачную, сапраўды сінявокую радзіму... «Ад 1902 году» Вацлаў пачынае занатоўваць «цікавыя» словы. Напачатку запісвае іх для сябе самога, бо вельмі ж «асабіста цікава было слова само па сабе».

Гэткім навукова-паэтычным тастамэнтам прагучыць пачатак «Прадмовы» да складзенага пазьней мовазнаўцам «Падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка». А тады, у юнацтве, улюбёнасьць у роднае слова паспрыяе пераходу Ластоўскага з Польскай сацыялістычнай партыі Літвы і Беларусі ў Беларускую сацыялістычную грамаду.

Сакратар «Нашае Нівы»

Сяброўства ў БСГ вызначыла ўвесь далейшы лёс Ластоўскага. Ян і Антон Луцкевічы, сузаснавальнікі Грамады, адначасова ўдзельнічалі ў рэдагаваньні «Нашай Нівы». Афіцыйным выдаўцом быў віленскі мешчанін Аляксандар Уласаў. Магчыма, апошні і запрасіў Вацлава працаваць у рэдакцыі.

Аднак запросіны выглядалі хутчэй авансам. Бо што ўяўляў зь сябе канторшчык таварнай станцыі ў Рызе, калі сонечным сакавіцкім днём 1909 году кіраваўся ў Вільню? Паводле ўласнага прызнаньня, *«акром некалькіх, даволі няскладных, пісьменьніцкіх сваіх спроб і хаатычных імкненьняў, ня меў яшчэ тады за сабою нічога»*.

Больш за паўгода сплыло, перш чым на старонках «Нашай Нівы» мільганула публікацыя за подпісам *«Власт»* — першым вядомым псэўданімам Вацлава Ластоўскага, пастаўленым пад артыкулам у рэдактарскай калёнцы «З нашага жыцьця». Малады сакратар «Нашай Нівы» распачаў уласны артыкул здалёк: *«Прошлага месяца верасьня бургамістар сталічнага чэскага гораду Прагі выдаў адозву да чэскага грамадзянства, у каторай кажа, што праз гэты месяц на чэскія нацыянальныя школы трэба злажыць паўмільёну рублёў. І чэхі зложацъ!»* [7, с. 231].

Рост Власта ішоў шпарка. Нібы казачны Пакацігарошак узрастаў малады літаратар з кожным днём-месяцам. Першага студзеня 1910 году ў навагоднім нумары «Наша Ніва» пачала друкаваць ягоную «Кароткую гісторыю Беларусі». Падзагаловак «Па Кіркору» ў асобаў недасьведчаных нараджаў

Вацлаў Ластоўскі ў працоўным кабінэце. 1913–1914 гг.



меркаваньне пра яе як рэч кампіляцыйную. Узапраўды было далёка ня так. Проста 27-гадовы гісторык сьціпла вызначыў сабе ролю звычайнага рэгістратара вядомых фактаў і падзеяў, знойдзеных у працах знаных папярэднікаў. У ліку іх, бачым, пачэснае месца адводзілася Адаму Кіркору.

У тым самым годзе, калі Янка Купала на кватэры прафэсара Браніслава Эпімаха-Шыпілы пісаў несьмяротны «Курган» і выдаў другі паэтычны зборнік «Гусьляр», нашаніўская «Кароткая гісторыя Беларусі» ўбачыла сьвет асобным выданьнем у слаўнай друкарні Марціна Кухты. *«Гісторыя — гэта фундамэнт, на каторым будуецца жыцьцё народу. І нам, каб адбудаваць сваё жыцьцё, трэба пачаць з фундамэнту, каб будынак быў моцны. А фундамэнт у нас важны, гісторыя наша багата…»* [7, с. 241] — сьцьвярджаў у прадмове да кнігі В. Ластоўскі, сьціпла адзначаючы свой уклад: *«Беручыся пісаць кароткі гэты нарыс гісторыі нашай, ня меў я змогі даць навучны твор, плод доўгіх навуковых досьледаў, — даў тое, на што было маёй змогі: сабраў з расейскіх, польскіх ды ўкраінскіх гісторыкаў тое, што мне вядома было аб гісторыі нашага краю і народу…»* [4, с. 5].

Выхадам «Кароткай гісторыі…» Власта беларуская літаратура нашаніўскай пары набыла так патрэбныя ёй пэўныя арыенціры, каб упэўнена крочыць у будучыню. Гэтай цьвёрдай пэўнасьці не ставала тады многім, нават сьвядомым беларусам, гатовым самаахвярна служыць ідэі нацыянальнага адраджэньня. Без Вацлава Ластоўскага, безь ягонай «Кароткай гісторыі Беларусі» з «40 рысункамі» шмат каму з сучасьнікаў давялося б доўга, пакутліва доўга аднаўляць гістарычную памяць.

Наколькі ж сам Ластоўскі жыў гісторыяй, мысьліў яе катэгорыямі і валодаў найбагацейшай факталёгіяй, сьведчыць прызнаньне аднаго з сучасьнікаў:

> *«Трапіў я ў рэдакцыю «Наша ніва». Сталі мы гаварыць аб беларускай справе. Я высказаў фразу: „…але, на жаль, мы, беларусы, маем бедную гісторыю". Раптам скуль узяўся чалавек лысы, абросшы, няголены з круглым чалом і, ідучы яшчэ, паднятым голасам стаў гаварыць: „Як, мы ня маем Гісторыі? Скажыце, калі ласка, хто мае багацейшую*

гісторыю, чым мы, беларусы?" і г. д. Зразу ён мне насыпаў так шмат, што перавярнуў усю маю гістарычную веду дагары нагамі, і я павінен быў прызнацца, што гісторыі я ня ведаю. Гэта быў В. Ластоўскі» [2, арк. 40].

У грымотах палітычных навальніц

У 1914 годзе ўся Эўропа сьмяротна захварэла на ліхаманку Першай усясьветнай вайны. Драматычныя зьмены адбыліся і ў асабістым лёсе былога сакратара «Нашай Нівы». На той час фактычна распаўся шлюб Вацлава і Марыі. Хоць бацькоўскі абавязак і чулае сэрца па-ранейшаму прыводзілі Вацлава да дзьвюх мілых шчабятух — старэйшай Ганкі і малодшанькай Стаські-Стасюце.

А пакуль у «Нашай Ніве» рэй вёў новы рэдактар-выдавец Луцэвіч-Купала. Ластоўскі ж становіцца фактычным уладальнікам «Беларускай кнігарні», кантралюючы выданьне школьных падручнікаў і чытанак. Дый ён ня толькі кантраляваў, але і сам удзельнічаў у іх стварэньні: склаў «Першую чытанку» [11], «кніжку для школьнага чытаньня» «Родныя зярняты» [12], «першую пасьля ламантара чытанку» «Незабудка» [10].

Аўтарытэт колішняга сакратара «Нашай Нівы» трымаўся высока, хоць ягоная літаратурна-кніжная чыннасьць адышла на далейшы плян. Калі была ўтворана БНР (сакавік 1918) — дык праз год прэм'ер-міністрам становіцца Вацлаў Ластоўскі. Аднак 17 сьнежня 1919 году частка ўраду БНР разам з новым прэм'ерам зьмяніла міністэрскія крэслы на турэмныя камэры. Учарашні паднявольны паляк выявіў дзіўную здольнасьць прыдушыць таго, хто апынуўся ў ягоным становішчы.



Вацлаў Ластоўскі. 1918 г.

Пасьля больш чым месячнага зьняволеньня ў менскім «замачку» прэм'ера выпускаюць на волю, а яшчэ празь нейкі час дэпартуюць за межы Беларусі. Вацлаў чамусьці падаўся ў горад сваёй маладосьці, у Рыгу. Дый там яго дастае «гнеў Варшавы». Польскі ўрад, прыгразіўшы дыпляматычным дэмаршам, ультыматыўна запатрабаваў ад маладой Латвіі пратурыць Ластоўскага як *«persona non grata»*. Латвія паслухмяна выканала прыхамаць Варшавы.

Ластоўскі спыніўся ў Коўне (Каўнасе), дзе яго даўно чакалі міністры ўраду. Палітычныя жарсьці з маланкамі й перунамі паступова ўваходзілі ў свае берагі — прызнаньне тэрытарыяльных межаў. 12 ліпеня 1920 году сувэрэнная Літва падпісала мірнае пагадненьне з Савецкай Расеяй. Не міргнуўшы вокам, апошняя аддае літоўцам «расейскую тэрыторыю» зь Вільняй, Горадняй, Лідай, Браславам, Паставамі... Дзяржаўная мяжа на картах палітыкаў пракладваецца ля Валожына і Маладэчна. Масква вылучала адзінае патрабаваньне: усё літоўскае войска (зь дзьвюх дывізіяў) павінна ўдзельнічаць разам з Чырвонай арміяй у вайне супраць палякаў. Ластоўскі пацьвярджае права Літвы на заходнія землі Беларусі, зазначыўшы разам з тым, што канчаткова гэтае пытаньне вырашыцца шляхам мясцовага плебісцыту.

У чым дасягнуў відавочных посьпехаў эміграцыйны ўрад БНР — пра Беларусь загаварылі ў Эўропе. А сам Власт у гэтыя гады зьвярнуўся да... паэзіі. І ў ёй працягваў сьцьвярджаць ідэю змаганьня за незалежную Беларусь. Такая яна — новая, мо і ня дужа зыркая, грань таленту былога сакратара «Нашай Нівы». Ластоўскі-паэт дэбютаваў напачатку 1922-га, у першым нумары часопіса «Беларускі сьцяг»:

Наперад, змагарна наперад!
Да волі цярэбячы троп,
Штодзённа ўскіпаем мы гневам
І помсту шлюбуем па гроб!

Нахрапнаю крыўдай ня ўзьдзержыць
Вам вольны ў кайданах прастор:
З дум горкіх, з сэрц нашых гартоўны
Скуем мы з праклёнам тапор.

Праметну заборчасьць, падзелы,
І зьдзекі, і крыўды, і пот,
Бярэсьце і Рыгу ў дзень судны,
Ў дзень помсты спамяне народ!

Наездчык — крыўдзіцель-грабіцель,
Спакойны стурбуем твой сон:
Пасокаю чорнай тваёю
Наш родны угноім загон! [7, с. 199]

Яшчэ больш, чым Варшаве і Маскве, урад БНР муляў блізкаму Менску. Двум сонцам на небе ня зьзяць. І найлепшае разьвязаньне праблемы бальшавікі бачылі ў тым, каб на палітычным небасхіле патухла зорка прэм'ера Вацлава Ластоўскага. Потым і ўрад БНР расьцерушыць будзе прасьцей. Таму гэтак дружна 17 сакавіка 1923 году падчас перамоваў паміж прадстаўнікамі беларускіх сацыялістычных партыяў, што ўваходзілі ў склад ураду Ластоўскага, і ўрадавымі коламі БССР прагучаў у Менску дакор, нібыта бяздарны прэм'ер скампрамэтаваў беларускі рух у вачах усяго сьвету і ўвогуле зрабіўся «непапулярны ў дыпляматычных сфэрах Заходняй Эўропы». Менск (ці ня згодна з крамлёўскім сцэнаром) дае наказ: Вацлаў Ластоўскі павінен вызваліць пасаду прэм'ер-міністра БНР.

Празь месяц, 20 красавіка, «стары беларускі дзяяч» афіцыйна папрасіў адстаўку ў старшыні Рады БНР Пётры Крачэўскага.

Публікуючы пазьней уласную заяву, Ластоўскі не ўстрымаецца ад постскрыптуму: *«Маршалкам Прэзыдыюму Рады БНР гр. П. Крэчэўскім назначан выпаўняць абавязкі Старшыні Рады Міністраў грам. Аляксандар Цьвікевіч, які за кароткі час свайго ўрадаваньня здолеў давесьці справу ледзь не да разрыву зь Літоўскім Урадам, а цяпер, паводле слоў яго, зьбіраецца „хараніць Ластоўскага по первому разряду“»*.


Ня першы й не апошні раз беларуса задушылі рукамі беларусаў.

Сышоўшы з палітычнай авансцэны пераможаным, Вацлаў Ластоўскі вярнуўся на пакінуты ім аблог, вялікі й шчодры, дзе верыш толькі сабе, сваім ведам і таленту.

«Коштам Беларускага Цэнтру ў Літве»

«Чала я не хіліў прад сілай», — паэтычным радком прызнаецца экс-прэм'ер Беларускай Народнай Рэспублікі (у тым ліку, рэч ясная, і перад сілай абставін) і з усім імпэтам няўрымсьлівай натуры аберуч возьмецца за выданьне «месячніка літаратуры, культуры і грамадзкага жыцьця» пад незацяганаю, а таму трошачкі нечаканаю ды роднаю назваю «Крывіч». Часопіс нібыта засноўваўся ня гэтак на патрэбы беларускае культуры, як пад вымаганьні неардынарнай натуры Власта. Вымогі ў яго паўставалі значныя, як відаць хоць бы з заплянаваных для часопісу разьдзелаў: 1) літаратурнага, дзе меліся друкавацца ня толькі айчынныя, але і «лепшыя творы ўсясьветнага пісьменства», дзеля чаго «Крывіч» не шкадуе сваіх старонак на пераклады (найчасьцей, праўда, адаптаваныя) з ангельскай, дацкай, «індыйскай», ісьляндзкай, польскай, расейскай, фінскай, эстонскай моваў; 2) навукова-крытычнага, які ахопліваў «зарысы і манаграфіі па беларусаведаньню» ад антрапалёгіі да філязофскіх і этнаграфічных досьледаў; 3) запісак, дзе падбіралася «рознае» аб беларусах і беларускай гісторыі; урэшце, інфармацыйны разьдзел з водгукамі-рэцэнзіямі на выдадзеныя ў Беларусі і пра Беларусь кнігі.

Чарнавік выступленьня Вацлава Ластоўскага на V Асамблеі Лігі Нацый. Жэнэва, верасень 1924 г.




І як даўні пачынальнік Францішак Скарына прыхаваў сваё імя ў адмысловых акравершах «Писал доктор Скоринич Францискус», «Делал доктор Скоринич Францискоус», так цяпер Вацлаў Ластоўскі зашыфроўваў уласныя імя і прозьвішча крыптанімамі, зацьвярджаючы тым ня менш асабістае аўтарства шматлікіх матэрыялаў.

Возьмем наўздагад які-хаця нумар, напрыклад, „Крывіч" № 11 (1), 1926 год. У разьдзеле «Запіскі» чытаем загалоўкі й подпісы пад артыкуламі. «Беларускія „крыўскія" друкі ў Тыльзіце» — *В. Ластоўскі*. Усьлед за ім, як бурштынавыя пацеркі, нанізваюцца запар літары, што складуцца ў слаўныя каралі імя ды прозьвішча. Сачыце! «Дойлід» — **Л. А.**; «Эпітэт сьмерці Кастуся» — **С. Т.**; «Навязі і кудмяні» — **О. У.**; «Праф. М. К. Любавскі і акад. С. Ф. Платонов аб Крывічох» — **С. К.**; «Дзіцячы слоўнік» — **І. В.**; «Аб напісаньні пачатковага ўроку ў крыўскай мове» — **А. Цл.**; «Карэнь „гал" і выводныя ад яго словы і паняцьці ў крыўскай мове» — **Л. А.**; «Карэнь „корс", „корх", выводныя ад яго словы і паняцьці ў крыўскай мове» — **У. Л.**; «Аб слове мурава» — **А. С.**; «Сонечнае калясо» — **Т. О.**

І так круг за кругам уздымаліся, перакочваліся паўз ковенскі тын сьвятло і слава «Крывіча». Зьявай, якую прыглушыла больш чым паўстагодзьдзя маўчаньня, сталася і аповесьць Власта «Лябірынты», апублікаваная на старонках «Крывіча» (1923, №№ 2, 3, 6). Твор, насычаны нястрымнай гістарычнай фантазіяй — бясспрэчная вяршыня творчасьці Ластоўскага-празаіка. Чытаеш і разумееш: фэномэн Уладзімера Караткевіча для беларускай літаратуры быў запраграмаваны. І празь дзесяцігодзьдзі ўвасобіўся.

У 1924 годзе ў Коўне ў друкарні А. Бака выйшаў «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» памерам блізу 17 тысяч слоўнікавых артыкулаў. Некаторыя зь іх мелі ня толькі перакладны, але і этымалягічны і энцыкляпэдычны характар. *«Домовой (...) дух, які апякуецца домам і сям'ёй; Дамавік, Дамавы, эпітэты: Дзедка, Гаспадар, Сам. Жыве ў кожным доме; мейсца яго аселасьці печ, запечак. Калі Дамавы здаволены — усё ручыць гаспадару, калі загневаны чаго — сыплюцца розныя няшчасьці і напасьці. Уквеленага Дамавіка можна ўласкавіць зарэзаўшы над гальнём чорнага пеўня і вымеўшы тым гальнём хату. Дамавік штогод гуляе сваё вясельле, 30 сакавіка ад золаку да поўначы, тады ён можа з шалу вясёласьці нарабіць шкоды...»*. І далей утрая даўжэйшае апісаньне паводзін і вонкавага выгляду Дамавіка-Дзедкі.



Вокладка працы Вацлава Ластоўскага «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі». Коўна, 1926 г.

Ластоўскі-фальклярыст, Ластоўскі-этнограф ці не заўсёды меў перавагу над Ластоўскім-моваznаўцам.

Ці не з адчайнага непрыманьня жахлівай неадпаведнасьці паміж гістарычнай праўдай і тагачаснай афіцыёзнай навукай (у кожную эпоху ў нечым дагаджальнай да прадажнасьці) паўставала «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі: Спроба паясьніцельнай кнігопісі ад канца X да пачатку XIX стагодзьдзя»?

«Няма больш занядбанай дзедзіны ў сьветавой пісьменнасьці як гісторыя паняволеных народаў, — зусім не зь „літаратурнага“ боку пачынаў прадмову складальнік. — *Вышэйсказанае асабліва кідаецца ў вочы калі ўзяць якую-колечы галіну нашай, крыўскай, гісторыі. То знача гісторыі народу, каторы, ня так яшчэ даўно, жыў сваім самаістым палітычным і культурным жыцьцём. Супярэчнасьць між сьведчаньнем гістарычных помнікаў і асьвятленьнем іх сучаснай пісьменнасьцю — проста паражаючая. Беручы ў рукі гістарычную кнігу часовых нашых пераможцаў, ня ведама чаму больш дзівіцца, ці іх бескрытычнасьці, ці паражаючай умеласьці тэндэнцыйна выкарыстываць аб'ектыўныя сьведчаньні гісторыі»* [7, с. 416].

Ад шчырай узрушанасьці на мяжы з эсэістычнасьцю, ад палемічнасьці таўшчэзны фаліянт у 776 «балон» адно выйграе, успрымаецца цэльна, чытаецца не па-навуковаму суха, а цяплей, жывей.

Трагічная памылка

«Зьдзяйсьненьне сапраўднае сувэрэннасьці нашага народу, сапраўднае незалежнасьці адбудзецца толькі ў Вільні, ці... нідзе. Менск — этап у разьвіцьці і поступе нашае ідэі», — напіша Антону Луцкевічу з Прагі ў пераднавагоднюю ноч, 29 сьнежня 1925 году, малады Ўладзімер Жылка. «Максымалізм» гэтага выказваньня тлумачыцца найперш уражаньнем паэта ад Луцкевічавага артыкула «Вільня ў беларускай літаратуры». У сваю чаргу Жылкавы «Вершы аб Вільні» з дыямэнтавым радком «О Вільня, крывіцкая Мэка!» натхнілі Луцкевіча на згаданы артыкул. Ня менш слушным у Жылкавым лісьце падаецца сьцьверджаньне (таксама прыватнага характару) з нагоды магчымага адкрыцьця літаратурнага аддзелу ў «Беларускай ніве», друкаванай трыбуне Беларускай сялянска-работніцкай грамады: «Адной палітыкай далёка ня ўгонім». У паэтавым уяўленьні палітыка ўсяго «надстройка», а народу «трэба будова».

Да сярэдзіны 1920-х гадоў большыня беларусаў на эміграцыі спакваля прыходзіла да высновы: адбудова беларускай дзяржаўнасьці найбольш рэальная ў Савецкай Беларусі. Прызнаньне Менску адзіным

цэнтрам нацыянальнага адраджэньня адбылося на так званай II Усебеларускай палітычнай канфэрэнцыі ў Бэрліне 12–16 кастрычніка 1925 году, наладжанай Аляксандрам Цьвікевічам зь відавочнай мэтай: роспуск ураду БНР на карысьць БССР. Задуманае бальшавіцкімі спэцслужбамі атрымалася, хоць зь юрыдычнага боку акт ня меў законнай моцы: ураду Цьвікевіча Прэзыдыюм Рады БНР не зацьвярджаў. Аб'яўленая міністрамі Пракулевічам, Зайцам і іншымі адстаўка — факт іхнай уласнай біяграфіі. «Навошта вы гэта зрабілі?» — настойліва дапытваўся ў Цьвікевіча рэзкім голасам Міхась Чарот, ідучы зь ім па Фрыдрыхштрасэ, даводзячы ці ня словамі Аркадзя Смоліча: «Гэта памылка! Пакуль вы былі тут, за мяжой, нам лягчэй было там весьці нацыянальную палітыку...».

Трохі раней, у жніўні 1923 году, Жылка ў лістах да Антона Луцкевіча не па-маладому трапна заўважыць: «Камуністы ў грунце варожы беларускай сялянскай стыхіі і нашай нацыянальнай ідэі. Усё, што робіцца ў Менску (а ня столькі той работы, як галасу), ёсьць ня ласка, а ўступка з бою. Жаданьне бел[арускіх] камуністаў манапалізаваць беларускі рух — тактычны крок...».


Магчымым тактычным крокам пракамуністычнай Беларусі сталася ладжаная ўвосень 1926 году Інбелкультам навуковая канфэрэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі. На яе запрасілі вучоных зь некалькіх краін Эўропы, у тым ліку і суайчыннікаў. Ад праскіх беларусаў прыехаў Уладзімер Жылка, ад латвійскіх — Кастусь Езавітаў, ад літоўскіх — Вацлаў Ластоўскі. З Заходняй Беларусі прарваўся неяк адзін Францішак Аляхновіч. Ні Антону Луцкевічу, ні Браніславу Тарашкевічу, ні Ігнату Дварчаніну польскія ўлады візаў на выезд не далі.

На Акадэмічнай канфэрэнцыі Ластоўскі выступіў катэгарычным прыхільнікам кірылічнага шрыфту. У напісаных неўзабаве «Ўражаньнях з паездкі ў Беларускую Радавую Сацыялістычную Рэспубліку» рэдактар «Крывіча» спыніцца на ўбачаным ім «савецкім ладзе жыцьця» больш дэталёва, чым на



Вацлаў Ластоўскі ў прэзыдыюме Каардынацыйнага цэнтру беларускіх арганізацый. Справа ў ніжнім шэрагу — Антон Луцкевіч. Вільня, 25–28 студзеня 1918 г. Фрагмэнт фатаздымка

Кастусь Езавітаў і Вацлаў Ластоўскі. 1920-я гг.



мовазнаўчых праблемах. Ад канфэрэнцыі ў памяці трывала засталася «ўсякая адсутнасьць духу партыйнасьці»[2], калі выносілі бюст Леніна з залі паседжаньняў, уквечанай бела-чырвонымі стужкамі. У асабістых паперах госьць канфэрэнцыі вёз у Коўна пісульку Цішкі Гартнага: «Дзядзька Ластоўскі! Трэба ў Вашым выступленьні падкрэсьліць патрэбу рэформы правапісу, абвергнуўшы словы Некрашэвіча „ня варт разгляду з боку канфэрэнцыі“» [6, арк. 66]. Грэла сэрца пашанотнай увагаю і запіска ад Якуба Коласа: «Ці чыталі „Сымона-Музыку“? Якая Ваша аб ім думка?» [6, арк. 67]. Яшчэ ў сакавіку 1912 году паэт абяцаў сакратару «Нашай Нівы» скончыць паэму «гэтым летам»[3]. Выкананьне абяцаньня доўжылася больш за дзесяцігодзьдзе. Так што кароценькая запіска перадавалася невыпадкова. Гэтаксама як і запрашальны білет з нагоды 20-гадовай літаратурнай дзейнасьці Я. Коласа на «таварыскі банкет», зладжаны 26 лістапада 1926 году «ў памяшканьні сталоўкі № 6 (Ленінская вул.) а 10 гадзіне ўвечары». Якуб Колас па-ранейшаму цаніў крытычны і мастацкі густ колішняга сакратара «Нашай Нівы», у тым сумневу не застаецца.

Не засталося і ў Вацлава Ластоўскага сумневу наконт будучага пасьпяховага разьвіцьця беларускай культуры «пад Саветамі». Так канчаткова высьпеў намер пераехаць. Бо тут можна зрабіць больш. Аднак, выяжджаючы з Коўна 22 сакавіка 1927 году, ён яшчэ ня ведаў, што пакідае сваю «друкарскую Прагу» назаўсёды. Спыніў жа выданьне «Крывіча» прымусова, бо літоўцы «перасталі лічыць уздым беларускай справы як спрыяльны Літве палітычны фактар».

У Менску Ластоўскаму прапанавалі пасаду дырэктара Беларускага дзяржаўнага музэю і загадчыка катэдры этнаграфіі пры Інстытуце беларускае культуры[4].

Ён працуе і ў Правапіснай камісіі побач зь Язэпам Лёсікам, Янкам Купалам, Янкам Бялькевічам, Пятром Бузуком, Уладзіславам Чаржынскім (старшыня камісіі — Сьцяпан Некрашэвіч, сакратар — Анатоль Багдановіч). Плянуе падрыхтаваць у друк альбом беларускага народнага арнамэнту. Працуе шмат і плённа. Вось некалькі скупых штрыхоў з «Хронікі беларускае культуры», якую вёў часопіс «Полымя»: «В. Ластоўскім перададзены ў тэатральны музэй ІБК архіў тэатру Буйніцкага (1910–1911), які складаецца з 13 афіш, 17 праграм і інш.» (1927, № 4); «В. Ластоўскі піша новую вялікую працу аб Беларусі — „Матэрыяльная культура Беларусі“. Праца ахоплівае пэрыяд ад XVI да XX сталецьця» (1927, № 8); «Калегія Нар. Кам. Асьветы зацьвердзіла камісію па ахове помнікаў старасьвеччыны ў БССР. У склад гэтай камісіі ўваходзяць: т.т. — Некрашэвіч, Ластоўскі, праф. Федзюшын, Ляўданскі і праф. Сэрбаў» (1928, № 2);

[2] Так ацэніць рыскі «Голас беларуса».

[3] 16 сьнежня 1912 году Якуб Колас пісаў зь Пінску: «Даражэнькі Пане Вацлаве! Атрымаў я Ваш ліст. Быць у Вільні цяпер не давядзецца — трэба пільна быць дома. Напісаць раней я ня мог — усё німа таго часу. І гэты час так марна ідзе, што і ня бачыш яго. Некалі навет напісаць ліст. Нічога я тут не зрабіў, а гэта рэжа мяне ўсё роўна, як нож. Шкода мне, што мой Сымон Музыка пакінен пасярод дарогі» [9, арк. 1].

[4] Апошнюю — на палову штатнай адзінкі, у сумяшчэньні з правадзейным сяброўствам у ІБК.

«Інбелкультам утворана камісія пад старшынством В. Ластоўскага для падрыхтоўкі да выданьня першага польска-беларускага і беларуска-польскага слоўніка» (1928, № 4).

І ў Савецкай Беларусі Ластоўскі працягваў працаваць гэтак жа самааддана і тытанічна, як у Коўне. «У наступную восень ў памяшканьні БДМ будзе наладжана выстаўка ўсіх гэтых рэчаў», — такім абяцаньнем, відавочна, са словаў дырэктара БДМ, закончыла «Полымя» сваё паведамленьне. Ці хто ведаў тады, што «ў наступную восень» Ластоўскага чакае звальненьне з дырэктарскай пасады. І ня толькі з дырэктарскай.

Увосень 1928 году адбылося «сьвята ўсіх беларусаў». Так назаве Ластоўскі ў адным з інтэрвію доўгачаканы акт утварэньня Беларускай акадэміі навук. *«...І ў вянку культурных здабыч, дасягнутых у апошнія гады народамі СССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, прыбудзе яшчэ адна яркая зорка. Яна будзе сьведчыць усім і назаўсёды, што ў саюзе працоўных усяго сьвету — найлепшая запарука свабод і правоў усіх народаў. Працоўныя жс масы Заходняе Беларусі, беларусы Латвіі, Літвы, рассыпаныя па Эўропе і Амэрыцы, годна прымуць гэты гістарычны акт ураду БССР, маючы яшчэ адзін цьвёрды доказ, што духоўны цэнтар усіх працоўных беларусаў — Менск»* [8].

У імя Беларусі і дзеля будучыні айчыны Вацлаў Ластоўскі ішоў на супрацоўніцтва з усімі партыямі ды ўрадамі.



Вацлаў Ластоўскі

Як калісь у часы прэм'ерства і плённай працы ў Коўне, калі атрыманыя за «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» (10 000 літаў) і за «Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі» (5000 літаў) ганарары дазвалялі яму падтрымліваць беларускае студэнцтва ў Празе (дый ня толькі ў Празе), так і цяпер на пасадзе неадменнага сакратара акадэмік Вацлаў Ластоўскі імкнецца матэрыяльна дапамагаць заходнебеларускай інтэлігенцыі. Калі ў пратаколах Прэзыдыюму БАН сустракаюцца пастановы адлічыць 50 даляраў Язэпу Драздовічу за надасланы матэрыял або заплаціць Рыгору Шырму 200 рублёў з разьліку па 2 рублі за кожную запісаную фальклярыстам песьню, мне бачыцца ў тым клопат і неадменнага сакратара Беларускай акадэміі навук.

Тым часам у краіне, у тым ліку і ў храме навукі, заводзіліся новыя парадкі...

Зь першага жніўня да першага верасьня 1929 году Ластоўскаму выпаў апошні на волі казённы адпачынак. З 18 да 26 верасьня ён выбраўся разам са Сьцяпанам Некрашэвічам у ваколіцы Слуцку, Семежава, Краснай Слабады і Старобіна «для вывучэньня гэтых раёнаў з боку этнаграфіі і мовы». Фактычна яны праходзяць гераічнымі сьцежкамі Слуцкага паўстаньня, узьнятага іхнімі паплечнікамі-эсэрамі 27 лістапада 1920 году супраць бальшавікоў. Жалоба ляжала на сэрцы і ў тых, хто часова наведаўся ў Семежава, і ў тых, хто заставаўся жыць ля жвіровых магіл бацькоў і братоў.

Па іроніі лёсу, вярнуўшыся са слуцкай вандроўкі, акадэмік Ластоўскі атрымаў неардынарнае даручэньне: разам з геолягам Міхайлам Грамыкам («прыцягнуўшы прадстаўніка ад Белдзяржбуду») яны мусяць «знайсьці 4–6 камянёў для Маўзалея Леніну». І не абы сабе так, а памерам і якасьцю «як меншы са знойдзеных раней камянёў». Тэрмін — казачны: ня доўгі, але і не кароткі — да сьнежня месяца.

Што месяцы?! Тут невядома, як дзень да вечара ператрываць у здранцьвелай ад жаху сталінскай імпэрыі...

Ці не энкавэдысцкай трагікамэдыяй з элемэнтамі дэтэктыву быў разыграны арышт Вацлава Ластоўскага і Сьцяпана Некрашэвіча 21 ліпеня 1930 году на Обі, на параходзе «Тобольск», якім накіроўваліся вучоныя дасьледаваць побыт землякоў у далёкім Сібіры? Хіба ня ведаў пра месцазнаходжаньне ахвяры старшы ўпаўнаважаны сакрэтна-апэратыўнага аддзелу ОГПУ Беларусі т. Сікорскі, выдаючы 18 ліпеня пастанову: «Гр-на Ластоўскага Вацлава Юстынавіча, які жыве ў г. Менску на пл. Свабоды ў д. 15, кв. 8 а ці які знаходзіцца ў навуковай камандзіроўцы ў Сібіры, неадкладна арыштаваць...»?

Праз доўгія і пакутныя 10 месяцаў зьняволеньня, допытаў, голаду, бяссоньня, маральных зьдзекаў у турмах Масквы і Менску іх адправяць зноўку, ужо этапам, у той «пугающий простор», што ляжыць за Масквой і які ў нашым народзе адвеку атаясамліваецца з адным словам-кленічам, што дранцьвее на языку — «Сібір», без падзелу на Прыўральле ці Заўральле, Паволжа, казаскія стэпы, маўклівую тундру,


тайшэцкую тайгу, без адрозьненьня Далёкага Ўсходу ад Чукоткі, Магадана ад Калымы і нават Салавецкіх астравоў ад астравоў Шпіцбэргену.

Гэтаксама як на захад ад нас жыхары Эўропы атаясамлівалі 1/6 частку плянэты адным ёмкім, «кандовым», бо ня імі прыдуманым, словам — ГУЛАГ.

На шляху да Праўды няма сьмерці

Ластоўскаму на 5 гадоў дасталася амаль сталіца — Саратаў. Ён уладкаваўся на пасаду загадчыка адзелу рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі Саратаўскага ўнівэрсытэту. Пацяклі дні, месяцы, гады працы ў гаючай для сэрца і душы бібліятэчнай цішыні, сярод самых верных і мудрых сяброў — кніг. О, пры належных варунках, людзкіх адносінах ад тых 90 асуджаных на вечнае пілігрымства сыноў Беларусі маглі б застацца чалавецтву не 29 тамоў паранаічных пытаньняў з выбітымі ў адказ на іх адпаведнымі «прызнаньнямі» (бо ведама, якое пытаньне — такое адпавяданьне) у недаступных і сёньня архівах, а 29 „monumenta ære perenniora". Велічных, як вяршынная ў лёсе аднаго зь іх «Гісторыя крыўскай кнігі».

Да нядаўняга часу дзень сьмерці Вацлава Ластоўскага заставаўся невядомым. У лічаных энцыкляпэдычных нататках, шматлікіх эмігранцкіх юбілейных артыкулах дата канца ягоных зямных пакутаў пазначалася проста «1938». Схільныя да прынцыповай дакладнасьці навукоўцы, кшталтам дасьледніка-архівіста Генадзя Кісялёва, у адсылках няпэўна пазначалі «1938» (?).



Вацлаў Ластоўскі. Здымак у сьледчай справе

Нятленны архіў ГПУ-ДПУ-НКВД-НКУС-КГБ-КДБ... літасьціва даў магчымасьць паставіць урэшце, здаецца, кропку.

Паўторна арыштаваны 20 жніўня 1937 году ўпраўленьнем НКВД Саратаўскай вобласьці Вацлаў Ластоўскі праз 5 месяцаў катаваньняў, 23 студзеня 1938 году як «агент польскай разьведкі і ўдзельнік нацыянал-фашысцкай арганізацыі» рашэньнем вайсковай калегіі Вярхоўнага суду Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік («Сібір» у кубічным вымярэньні) быў асуджаны да найвышэйшай меры пакараньня.


23 студзеня 1938 году прысуд сыну Юстына і Ганны Ластоўскіх, былому сакратару «Нашай Нівы», былому прэм'ер-міністру Беларускай Народнай Рэспублікі, неадменнаму сакратару ІБК, былому акадэміку і неадменнаму сакратару БАН выканалі ў Сарататве — горадзе, дзе нарадзіўся і пахаваны Мікалай Чарнышэўскі. Расстралялі.

Адзін з апошніх дакумэнтаў-аўтографаў — заява «следователю гражд. Корнееву заключенного Ластовского В. У.»:

> *«В состоянии маразма после 38-часового конвеерного допроса я под угрозой ареста моей жены согласился дать показания жертвуя собой, чтобы спасти жену. Вследствии моего заявления был составлен протокол следствия, на основе моих ложных показаний. Я добивался карандаша и бумаги на другой же день, но получил бумагу только сегодня. Спешу сообщить гражданин следователь, что мои ложные показания сводят следствие на ложный путь. Я живу между двумя ужасами: ареста жены и ужаса ложного показания. Прошу следствие понять, что я мог дать такие показания только в состоянии психоза, выседев 38 часов на стуле, при угрозе ареста друга моей жизни, инвалида жены»* [7, с. 448].

Падпісваючы яго, вязень нібы заставаўся ў жахлівым самнамбулічным сьне, што доўжыўся пакутліва доўга. Ластоўскі напісаў дату «1 октября 1931 года» — замест 1937.

За ўвесь пасьляваенны час мастацкая спадчына Вацлава Ластоўскага перавыдавалася толькі аднойчы, у эміграцыі [5]. Нарэшце ў 1997 г. у кніжнай сэрыі «Беларускі кнігазбор» убачылі сьвет яго «Выбраныя творы» і ў Менску [7].



Выбраныя творы Вацлава Ластоўскага ў сэрыі «Беларускі кнігазбор». Укладаньне, прадмова і камэнтары Язэпа Янушкевіча, 1997 г.

Сёньня мы абавязаныя прамовіць слова падзякі тым, хто самаахвярна, пачынаючы ад першага, хай сабе і заўчаснага, але прарочага нэкралёгу, і да ўрачыстай сэсіі, наладжанай у Лёндане ў гонар стагодзьдзя з дня нараджэньня Ластоўскага [3], захоўваў памяць пра таленавітага ідэоляга нашага адраджэньня. Нязводнай крыніцай для суайчыньнікаў паўставала пераканаьне, што, адкрываючы гістарычнае мінулае Радзімы, Ластоўскі служыў Праўдзе.

А на шляху да праўды няма забыцьця. Яшчэ падчас першай вядомай урачыстасьці, праведзенай у Менску да 60-годзьдзя з дня нараджэньня выдатнага дзеяча сябрамі Беларускай Самапомачы, успамінамі пра юбіляра падзяліўся Вацлаў Іваноўскі. Паводле сьведчаньняў апошняга, з-пад рукі Ластоўскага выйшлі ня толькі манаграфіі, апавяданьні, вершы, але і адметныя малюнкі, а таксама «собскія спробы ў скульптуры». Адна зь іх — драўляная фігура Хрыста, які пакутліва «ўглядаецца, што зь ягонай верай сталася» [1].

Угледзьмася і мы ў наш шлях апошняга стагодзьдзя. Несьмяротная «вера» Вацлава Ластоўскага — Беларусь-Крывія — прайшла праз Слуцкі збройны чын, Курапаты, Хатынь, Чарнобыль і ня згінула.

Тым самым даючы надзею на ўваскрашэньне з паняверкі.

Літаратура і крыніцы

1. *Акадэмія на чэсьць В. Ластоўскага* // Беларуская газэта (Менск). 1943. 27 кастр.

2. *Артыкулы, даклады, лісты, чарнавыя нататкі К. Дуж-Душэўскага.* 1918–1935 гг. // Беларускі дзяржаўны архіў-музэй літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). Ф. 3, воп. 1, адз. зах. 241.

3. *Баршчэўскі А.* Навуковы семінар, прысвечаны стагоддзю з дня нараджэння Вацлава Ластоўскага ў Лондане // Ніва (Беласток). 1983. 27 ліст.

4. *Власт.* Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня, 1910. С. 5.

5. *Власт* (Вацлаў Ластоўскі). Творы. Мюнхэн, 1956.

6. *Дакумэнты Акадэмічнай канфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі* з удзелам В. Ю. Ластоўскага. Менск, 14–21 лістапада 1926 г. // БДАМЛМ. Ф. 3, воп. 1, адз. зах. 359.

7. *Ластоўскі В.* Выбраныя творы. — Мн.: Бел. кнігазбор, 1997.

8. *Ластоўскі В.* Утварэньне Акадэміі Навук — сьвята ўсіх беларусаў // Савецкая Беларусь. 1928. 16 кастр.

9. *Лісты Я. Коласа да В. Ластоўскага*. 1911–1918 гг. // БДАМЛМ. Ф. 3, воп. 1, адз. зах. 223.

10. *Niezabudka:* Pieršaja paśla lemantara čytanka / Złažyŭ i wydaŭ W. Łastoŭski. Wilnia, 1918.

11. *Pieršaja čytanka:* Knižyca dla biełaruskich dzietak dziela nawuki čytańnia. Złažyŭ W. Łast. Wilnia, 1916.

12. *Rodnyje Ziarniaty:* Knižyca dla školnaha čytańnia / Złaž. W. Łastoŭski. Wilnia, 1916.

ДУМА НА ПОЛАЦКІМ ЗАМЧЫШЧЫ

Цьмы-цьмоў і процьмы лет
на гэтым копішчы канодным
складалі Дзеве чэсьць.
Дзевін зваўся грод,
і Дзевіна рака у стоп яго ручэла,
бажніца Дзеве ў чэсьць
на сонцы дахам сьнела,
здобячы сабой накоп.
У бажніцы ж, перад Дзевы стодам,
хадзілі Дзевы карагодам
ў кудзебны тан.
Сьвятарны хор пявежнай мовай
магутаў племені ўслаўляў.
Зьбіраліся старцы тут
на раду й суд.
І быў нябесны ход
людзкім законам,
змацованым Правечным Конам...
Весь гэты лад пітомы
разбурыў крыжа знак...
Хай так,
а ўсё ж — на попеле
старэтных стодаў,
пад засьцю ценяў іх —
у почце грэчаскіх сьвятых
засела Софас,
мясцовую сабой
зьмяняючы Паляду.

[1923]

* * *

Формаў трупехлых я вораг дасконны,
сьцежак стаптаных ня зношу тварэньні;
новым імкненьням даць новыя формы,
новыя словы і дум выражэньня
стаўлю я мэтай.

[1923]

РЭЙНСКІ ВАДАПАД

Як вар,
укруг скалы,
што высіцца сярод ракі,
кіпіць-рычыць валва
і пеніцца, як вепр дзікі,
калі яго ў княі аступіць смыч.
Пс... во, ў голкаце чыйсь кліч,
чыйсь плак цяжкі чуваць!
То зборанай валвы апошні рык
распачны!
Ня ўздымецца яна ўжо зноў
ў напружаньні змагарным:
ў ручве ціхім і марным,
у забудзі ёй суджана сплываць.
Змаганьне, гон, сталока...
Ці ж толькі для таго ўся гэта склока,
каб грываю трахнуць
адзіны міг?!

. . . . . .

У гроце камяннай,
па-над шалёнаю кіпежай,
стаялі мы з табой, Іване,
ўслухаючысь ў змагарны гуд;
і ты сказаў з задумаю ў вачах:
«Во так шуміць нязмоўчна бор
у нас і дождж аб дах
ў бяссонлівых начах...»
І ты хацеў, каб бор гудзеў
табе пад вечны сон...
Адзін стаю я зноў
над сьпененай валвой;
спаміны ціснуцца навалай...
Тутніць у жылах кроў...
І я дрыжачаю рукой,
зь сьвятарнаю пашанай,
пасьцерты ўжо дажджом
твой надпіс паднавіў.
І мне здалось,
што быў ты зноў са мной...
І быў-ткі, мусі,
як дух змаганьня
Беларусі.

[1923]

КЁЛЬНСКІ САБОР

Пачвар брыдкіх збароўшы роты,
наўзвыш рвануў пабедны дух!
Ткі ўздойм пачулі готы
ў сваёй душы, скрышыўшы Рым.
Пазбыт ланцуг!!!
І Богу ў чэсьць кудзьбіт старэтны
зьмяняў скалу у хвальны сьпеў,
шыбаў да зор, хоць апраметну
глыбежу знаў, ды шчасьця міг
багоміць ўмеў...
Кудзебных кроз, хацьбы магутнай,
агідных мар — у гэты мур —
ўклято бязьмер! З-пад сьнедзі бруднай
яшчэ цяпер лучаць гудзьбы
змагарных бур!

[1923]

У АЛЬПАХ

Кругом
правечна бель сьнягоў,
ня топтаных людзкой ступой...
Ў вышы сінеюць льды
дамаскай стальлю,
і небазвод ўражае дальлю
панадлівых нябёс паўдзённых.
Як надзен іх блакіт чароўны
з краіны вечных сьцюж!
А глянеш ўніз, з гары, —
пабачыш там муры
дамоў, сьвятынь,
малых ў нізіннай далі.
І горнага арла
на скале,
што з годнасьцю спакойнай,
паміж забаў ў стыхіі вольнай,
аднехаця цікуе зайчы троп.
За намі шэры строп
нябёс паўночных,
абшар, дзе лютуе зіма,
дзе белым саянам сьнягоў
засьцелена зямля.

Тут, на рубяжы двох сьветаў,
двох культур,
дзесь зь вершадзі высокай
глядзя на рымскіх замкаў звалы,
тваёй мінуўшай славы,
што ўжо ня дасьць натхненьня,
я не завідую табе,
Італьская зямля!
Лепш наша бедная калыска,
жыцьцём напоўнена у шчэрць,
як ваш трупехлы гроб,
зь якога зеціць сьмерць.

[1923]

ЧЫТАЮЧЫ ГАМЭРА

Магутаў быт навекі прамінуў,
кідаючы адно
патомным на ўспамін
прасьнёны сон паэты.
Чаруе ў ім
ня чынаў рытм, і не высілак той
паўпастыраў-князёў пры сьценах Троі,
і не Ахілес-асілак,
а думаў бег, што геній роіў
між елачы жыцьця.
Адзіна ён,
патужны дух Гамэра,
стварыў старэтную Гэляду;
яе сыноў нясьмертнымі ўчыніў,
прыгожасьцю абдарыў!

[1923]

ЗОРНІК

Ў цемры копішча панурай,
на пасадзе ў сем цяблін,
засядаў маўклівы божыч,
праўд і мудрасьці пачын.

Ў намаганьні ўцелаісьціць
у фігуру ідэал, —
мастака рука няўдольна
надала чалу авал
і застыглы, бы зьдзіўлёны,
погляд выпуклым вачам,
а на вуснах палажыла
напаўўсьмешкі жостры шрам...
.....
Ў ночны першы кураклік
прад фігураю зьнянацна
зь цемры вынырнуў старык...
Спазірнуўшы ў знакі небны,
прасьпяваў ён гімн малебны:
«Доўгім постам і малітвай
змацаваны,
падыму мой зрок к зэніту
спрацаваны!
Ты ж, Правечны, дух мой кволы
сьвят прасьвядаю натхні
і празначаньня тайніцы
хоць рубочак адхіні!
Я ж, нягодны, не жадаю
знаць усіх Тваіх дарог:
час і кон ў Тваей абладзе...
Ўчуй, малю Цябе, Сварог!»
І натхнёнаю экстазай
старца верай зрок пылаў,
як пакорна ў под цагляны
ён паклоны адбіваў.
Так маліўся доўга старац,
дух малітвай мацаваў...
Мякла сэрца... зрок любоўна
на фігуры спачываў.
Ўрэшце выйшаў на узгорак
панадрэчны...
Ў той жа момант Кон Правечны
блакіт-кнігу ў высях неба
разгарнуў...
і агністыя пісьмёны
атамкнуў...
Доўга зеціў зорнік ўгору,
цікаваў за неба часткай,
дзе гарэў міглівы поблеск
зоркі крывічанскай...

[1923]

НА ЎЗЬМЕЖЫ

Былых астой душы людзкой
Няшчадна йдзе ламежа;
Паміж руін ждом новых дзён
З старога мы узьмежа...

За намі цьмень, пад намі жах:
Кругом зьмятні люцежа;
Ў нязьмежных дзён сутонны час
Ўсплыла наверх буцьвежа.

Гразой забіт народ маўчыць,
Як бойная скацежа:
Кады ж канец і дзе той троп,
Каб выйсьці ўжо з суцьмежа?..

[1923]

ПІШЫ...

Пішы
пра болесьці,
жыцьця пышы,
пра глум і зьдзек —
ярэмнае мадзеньне,
пра трутны хлеб,
пра слоў каменьні...
Як брат няволіць брата,
як раб багоміць ката,
пра стогн душы
пішы!
Ня словамі,
ня чорнаю сьлязой
чарнільнаю,
а нэрвамі, крывёй,
узрыгамі душы
пішы!
Сябе распні
на крыжу мук,
надзеі спапялі,
ачысьці сэрца
у агні
цярпеньня;
усіх багоў і стодаў,
кром міласьці к народу,
ты пакрышы!

Й пішы:
журбой сіротнаю,
смагой гаротнаю,
самотай ўдоваю,
пакрыўдай братняю,
тульбой бясхатняю,
сардэчнаю тугой,
мілуючай душой;
зямлі апарамі
і чарамі
мінуўшчыны
свой твор вяршы,
сьлязьмі душы
пішы!

[1924]

У ЧАС АБЛОГІ

На грудзе, акружаным глыбокаю вадой, я горад збудаваў.
Змацаваў яго дубоваю сьцяной, байніцамі, на зводах мост уздоймны палажыў.
У клеці зьвёз усякага дабра, — калі б на грод лягла аблога...
І вояў здрадных, лжывых я разьлічыў, каб зь вернаю дружынай толькі дзяліць мой белы й чорны дзень...
І от нахлынуў вораг многі.
Ударыў я у звон трывожны. Дзынеў патужна цяжкі сьпіж...
Аднак на клік мой зоўны ніхто ка мне не пасьпяшыў:
У горадзе маім — такім мацоўным — адзін я быў!..

[1926–1927]




Віктар Жыбуль

...як з ускрытай вены



Сяргей Мурзо



Што маўчыш, скажы, дарога?
Рытмам рваным пульсуеш мне кроў.
Бачыш жыцьця, агнёў многа
Сярод сьнегам засланых двароў.

Сярод беларускіх паэтаў, расстраляных у ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 г., Сяргей Мурзо выглядае, напэўна, найбольш загадкавай і, магчыма, найбольш трагічнай постацьцю. За адведзеныя лёсам 25 гадоў ён не пасьпеў выдаць аніводнай кніжкі, а ягоныя публікацыі ў друку можна палічыць на пальцах. Тым ня менш у 1990-х яго паэзія прыцягнула ўвагу, напрыклад, вядомай літаратуразнаўцы Ірыны Багдановіч [2, с. 344], а Леанід Маракоў паспрабаваў сабраць усе магчымыя на той час зьвесткі пра паэта, якія мы зараз дапоўнім і некаторымі новымі.

Сяргей Мікітавіч Мурзо нарадзіўся ў 1912 г. (дакладная дата невядомая) у Віцебску ў сям'і рабочага. Бацька будучага паэта Мікіта Дзьмітравіч паходзіў з Украіны, меў прозьвішча Мурзенка, але з прычыны памылкі ў царкоўнай кнізе яно трансфармавалася ў Мурзо. Маці, Варвара Емяльянаўна Рыбакова, была руская, нарадзілася ў Маскве. Акрамя Сяргея, у сям'і былі дочкі Любоў і Сафія.

У Віцебску Сяргей Мурзо закончыў школу павышанага тыпу [11, с. 297], пасьля якой у 16 гадоў уладкаваўся токарам на Віцебскі станкабудаўнічы завод «Камінтэрн», дзе працаваў майстрам і ягоны бацька. Прыкладна ў той час юнак пачаў заяўляць пра сябе як паэт: ён яшчэ не друкаваўся, але ўжо спрычыніўся да віцебскага літаратурнага асяродку, браў удзел у творчых вечарынах мясцовай філіі Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў (БелАПП). Вось што пісаў пра адну з такіх імпрэзаў журналіст, які схаваўся пад псэўданімам *Радий Майский*: «Отдельно нужно отметить выступление тов. Мурзо — не члена секции. Есенинские настроения довлеют в его стихах, [не? – *В. Ж.*] говоря уже о форме.

Выступающие товарищи отметили целый ряд положительных и отрицательных сторон, отдельно останавливались на выступлении т. Мурзо, указывали на беспредметность его стихов, никчемность настроений» [7, с. 3]. Побач у газэце зьмешчаны верш віцебскага паэта Браніслава Люгоўскага «Ясенінцу» — ня выключана, што прысьвечаны ён акурат С. Мурзо, якога старэйшыя таварышы спрабавалі ідэйна перавыхаваць:

Ты сказаў сягоньня,
Што жыцьцё — крыжы,
Што з душою чулай
Больш ня можна жыць.

Ты сказаў: «Над гаем
Адцьвіла зара,
Не шуршыць больш радасьць
У прасторы траў,

Бо гальлё высокіх
Старасьвецкіх ліп
З болем і трывогай
Нікне да зямлі;

Бо над кожнай хаткай
Вёскі дарагой
Вісьне дым заводаў
Чорнаю пятлёй...»

Годзе, супакойся,
Бо твой гола-сьпеў —
У гаі вясёлым —
Рып трухлявых дрэў.

Дзіўна, што ня бачыш,
Як гніюць крыжы,
Што ў прасторы родным
Можна пець і жыць.

Нават жыць нанова
І квітнець зарой,
Зваць к камуне-шчасьцю
Песьняй дарагой [5, с. 3].

Зазначым, што ісьці ў літаратуру ў 1929 г. зь «ясенінскімі настроямі» і «беспрадметнымі» вершамі — пасьля таго, як ужо не адзін паэт зьведаў жорсткае крытычнае цкаваньне за «ясеніншчыну» і «фармалізм» — было з боку С. Мурзо надта сьмелым, у чымсьці нонканфармісцкім крокам.

На той час паэт пісаў па-расейску. Ягоны літаратурны дэбют адбыўся 14 ліпеня 1929 г. у газэце «Заря Запада»:

СВОЕЙ ДЕРЕВНЕ

Там вдали в синеве васильков
Песня милой, там шелесты ржи...
Среди грохота, гула станков,
В звонах молота начал я жить.
Помнит милая радости встреч,
Помнит озера синюю гладь...
Только прежних мне чувств не сберечь,
Вот что хочется мне разгадать:
Отчего меж кустов, у дорог
Ветер глухо, уныло поет?
Старый клен пожелтел весь, иссох,
Шлет привет, машет шапкой, зовет...
Не зови. Я ушел с деревень
К черным трубам, дымящим вдали,
Мне не памятен сада плетень,
Не заманит душистость лип.
Поле, поле, зеленая даль,
Я такой тебя видеть хочу,
Чтоб от солнца искрилася сталь,
С этой мыслью куда-то я мчусь.
На заводе я весел, здоров,
Улыбаюсь под ритмы поршней.
Стадо белых ягнят и коров
Не пасти, не бродить средь полей!..
Мой станок, как и я, тоже рад.
У ремней состязанье в бегах,
А шестерок, смотри какой ряд,
И в руках меток молота взмах.
А когда языком лизнет
Посиневшие окна закат,
В шуме улиц пойду, а завод
Долго будет еще грохотать.
Там вдали, в синеве васильков
Песни милой, там шелесты ржи...

Среди грохота, гула станков
В звонах молота начал я жить [12, с. 3].

Лірычны герой гэтага верша не ва ўсім адпавядае асобе аўтара. Так, сапраўды, Сяргей Мурзо на той час быў заводзкім рабочым і на ўласныя вушы чуў грукат і гул станкоў, а часам і звон молата. Але прыйшоў ён на прадпрыемства зусім ня зь вёсак і палёў: як сьведчаць сваякі паэта, у 1920-х гг. сям'я жыла ў Віцебску пад адрасам вуліца Арлоўская, 32. Крыху пазьней тая вуліца перастала існаваць, ператварыўшыся ў тэрыторыю заводу, на якім акурат працавалі Сяргей і яго бацька… Так што верш, магчыма, трэба ўспрымаць як аўтарскую стылізацыю на распаўсюджаную ў тыя часы тэму «вяскоўца ў горадзе», прычым ужо без адчайных выказваньняў пра дым заводаў, які «чорнаю пятлёй» (як напісаў Б. Люгоўскі) душыць родныя вёскі. І, напэўна, менавіта заводзкая тэматыка стала тым струмянём, дзякуючы якому С. Мурзо здолеў, хай на кароткі час, але ўліцца ў беларускую літаратуру: у адрозьненьне ад «беспрадметных» вершаў, творы пра рабочых і варштаты выданьні ахвотна друкавалі. Гэтак і кіраўнік Віцебскай філіі БелАПП Язэп Мазуркевіч пісаў пра Сяргея Мурзо як пра маладога паэта, які «пачынае патроху знаходзіць пралетарскую тэматыку і родзіць надзею» [6, с. 3]. У якасьці яшчэ аднаго прыкладу яго «заводзкай» паэзіі прывядзем верш «Весна в литейной» (1929), дзе перададзена ўсеагульная радасьць ад працоўнага працэсу, якую імкнуцца падзяліць з рабочымі і сонца, і месяц, і дрэвы, і птушкі:

Воздух полон гарью, сильным жаром.
Солнце брызжет в окна. Со двора
Голубым цветистым сарафаном
Выглядает у берез кора.
Хором жаб наполнилися стены:
Здесь вагранка, там ручей-шалун.
Словно кровью, как из вскрытой вены,
Льется в формы вниз густой чугун.
В литнике чугун похож на месяц,
На кипящий жгучий солнца ком.
Как не крикнуть тут: «Свети и лейся,
Разрисуй все красным языком».
Разбрелися синие толстовки…
Сколько их. Как в поле васильки…
Каждый шаг устойчивый и ловкий.
На груди смеется мишкин (? — В. Ж.) КИМ.
А чугун все льется, льется, льется…
Духота… Эй, окна открывай!
Песен птиц мелодия несется.
Здравствуй, май кудрявый! Здравствуй, май!
Заработались, вспотело солнце,
Скоро сменит месяц-дирижер.
Облаков снесутся ветром кольца.
Буду слушать звездный шепот-хор.
Тополя оделися в костюмы,
Зазвенят, зашелестят в тиши,
Будут вечером зеленым, лунным
Песни петь про блузы у машин [10, с. 3].

Мову раньніх вершаў Сяргея Мурзо нельга назваць чыстай: кідаюцца ў вочы словаформы кшталту *выглядает*, *наполнилися*, *разбрелися*, *оделися*. Але ня будзем забываць, што пісаў гэта 17-гадовы юнак, напалову расеец, напалову ўкраінец, узгадаваны ў Віцебску ў часы беларусізацыі. І перайсьці неўзабаве на беларускую мову — магчыма, з парады сяброў-літаратараў — яму было, напэўна, нескладана. Пачаў ён

зь перакладу згаданага ўласнага верша [11, с. 301], які па-беларуску загучаў больш узьнёсла, лірычна і па-сьвежаму. Зь яго зьніклі «гарь», «сильный жар», не зусім дарэчны «хор жаб» і нават цэлая страфа пра ўскіпелы чыгун з чырвоным языком, некаторыя даволі грувасткія радкі (*«Здравствуй, май кудрявый! Здравствуй, май!»*) зьмяніліся на больш мэлядычныя (*«Гэй, здарова, кучаравы май!»*), а іншыя, наадварот, «пацяжэлі»: *«Здесь вагранка, там ручей-шалун»* ператварылася ў *«Ўсё гурчыць матор, рамень ў бягу»*. Калі ў расейскамоўным варыянце верша сустракаліся нібыта беларусізмы, то ў беларускамоўным — зьявіліся русізмы: *раскідалісь*, *тапалі*, *ціш*... А вось амаль імажынісцкія вобразы — успацелае сонца, месяц-дырыжор, бярозы ў сарафанах, таполі ў гарнітурах і «кроў з ускрытай вены» — засталіся.

У цэлым пераклад сьведчыў пра пэўны творчы рост маладога паэта. Ён быў ужо афіцыйна прыняты ў Віцебскую філію БелаПП, друкаваў (праўда, зрэдку) вершы на старонках газэты «Віцебскі пралетары». Адзін зь іх («Увечар») напісаны ад імя навучэнца рабфаку, які сядае за канспэкты, але вучоба ня йдзе, бо на дварэ — звонкая, вясёлая вясна з сонцам, кветкамі й «пацалункамі ветру» [13, с. 3]. Падобна, што гэтым разам Сяргей Мурзо пісаў акурат пра сябе: тады ён вучыўся на Віцебскім вячэрнім рабфаку, дзе, дарэчы, выкладаў кіраўнік філіі БелАПП Язэп Мазуркевіч — як бачым, настаўнікам ён быў для Сяргея ня толькі літаратурным.

Сьціплая бібліяграфія С. Мурзо сьведчыць, што спрабаваў ён сябе і ў крытыцы: 23 жніўня 1930 г. у газэце «Віцебскі пралетары» выйшла яго рэцэнзія на паэму «Цені на сонцы» Андрэя Александровіча [2, с. 344]. На жаль, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі гэтага нумару няма.

У тым самым 1930 годзе філія падрыхтавала да друку калектыўны зборнік «Рытмы будаваньня», куды ўвайшлі творы Андрэя Бязьмежнага (Ушакова), Насты Шутко, Браніслава Люгоўскага, Язэпа Мазуркевіча, Зьмітра Жыткевіча, Паўлюка Ананьнева, Леаніда Лукашэнкі (Лірніцкага) і Сяргея Мурзо, аднаго з найманладзейшых аўтараў кнігі.

Вось як характарызуе С. Мурзо і яго паэзію літаратуразнаўца Ірына Багдановіч: «Па тыпу творчасьці належаў да так званых паэтаў-ударнікаў, асноўнай тэмай якіх было ўслаўленьне працы рабочага, а галоўнымі паэтычнымі рэаліямі станавіліся завод, варштат, элемэнты вытворчага працэсу (верш „Ля сталёвых бліскучых станін“). У вершы „Вясна ў ліцейнай“ і інш. імкнуўся спалучаць лірычнае сьветаўспрыманьне з „машыннай тэматыкай“» [2, с. 344].

Пра вёску паэт ужо не пісаў — зьвяртаўся да больш арганічнай для яго гарадзкой тэматыкі: *«Сінь над горадам, / Даль ў аганькох. / Сьветавыя рэклямы / Рагочуць... / На асфальце бягуць сотні ног...»* [11, с. 299]. Гэта радкі зь верша «Ля сталёвых бліскучых станін», створанага ў ліпені 1930 г. у Маскве. У ім паэт апісаў канкрэтнае месца — друкарню «Красный маяк» на вуліцы Цьвярской, 48, дзе выдавалася газэта «Правда». У зборніку «Рытмы будаваньня» быў апублікаваны і верш з цыклю «Дарога», які, пакладзены нядаўна на музыку Верай Бурлак, загучаў у рытме танга.

Сам матыў дарогі быў у 1930-м вельмі актуальны для паэта. Сяргей Мурзо адвучыўся на рабфаку, разьвітаўся з такарным варштатам і выправіўся ў Менск, каб паступіць на літаратурны факультэт Менскага вышэйшага пэдагагічнага інстытуту. Рэкамэндацыю яму як пэрспэктыўнаму маладому паэту даў Платон Галавач. Юнак ехаў у беларускую сталіцу поўны сьветлых спадзяваньняў, яшчэ зусім не ўяўляючы, што чакае яго наперадзе.



Сяргей Мурзо. 1930 г.


Спачатку ўсё складвалася быццам бы добра. Сяргей Мурзо трапіў у дружны творчы асяродак. Многія яго аднакурсьнікі зарэкамэндавалі сябе ўжо вядомымі літаратарамі. Паэтка Эдзі Агняцьвет, успамінаючы студэнцкія гады, сярод іншага апісала і так званы брыгадны мэтад навучаньня, «мэханічна перанесены з прадпрыемства ў інстытут»: «За вучэбнымі сталамі былі асобныя брыгады: за нашым сталом — вельмі здольная пісьменьніца Г. Раманоўская (будучая жонка С. Шушкевіча, якая пісала па-польску), Г. Гайлевіч — перакладніца, будучыя пэдагогі П. Рэвут, Н. Гурыновіч, Н. Карабейка і адзіны мужчына С. Шушкевіч. Разам з Валерыем Мараковым, як помніцца, „засядалі“ за адным сталом паэты Ю. Лявонны, З. Піваварaў, крытыкі П. Хатулёў і С. Левін і пэдагог Р. Скаліна. Быў яшчэ адзін стол — паэты З. Бірала (Бульбянік), С. Мурзо, празаік Я. Казека [відаць, абдрукоўка: маецца на ўвазе Язэп

Зазека. — *В. Ж.*] і некалькі пэдагогаў. Выкладалі нам цікавыя, глыбока-адукаваныя людзі, дактары навук Я. Барычэўскі, І. Замоцін, М. Піятуховіч, П. Бузук, С. Аруцюнянц» [1, с. 10].

Разам са сваімі новымі сябрамі Сяргей Мурзо ўдзельнічаў у літаратурных выступленьнях на фабрыках і заводах, што зафіксавана, напрыклад, у хроніцы часопісу «Маладняк»: «З 10 лютага па 10 сакавіка [1932 г. — *В. Ж.*] на Рэчыцкай запалкавай фабрыцы „10-ы Кастрычнік" працавала ў парадку праходжэньня практыкі група студэнтаў літфаку пэдынстытуту. У групу ўваходзілі таксама пісьменьнікі — члены БелАППа. На вялікіх літаратурных вечарах з чыткай сваіх твораў выступалі тт. Я. Зазека, Ю. Лявонны, В. Маракоў, С. Шушкевіч, Ю. Бітус, С. Мурзо. Праф. Піятуховіч зрабіў даклады. Напярэдадні ад'езду брыгада падрыхтавала літаратурную старонку для раённай газэты „Рэчыцкая праўда". У старонцы друкуюцца новыя вершы Юркі Лявоннага, Валерыя Маракова, Станіслава Шушкевіча, Юркі Бітуса. А таксама артыкул з кароткай характарыстыкай творчасьці пісьменьнікаў, што працавалі на фабрыцы» [4, с. 122].

Аднак хутка Сяргею Мурзо давялося зазнаць увесь адваротны бок жыцьця ў сталіцы БССР. Навучаньне давалася цяжка, грошай заўсёды не хапала, паэт жыў у голадзе і матэрыяльнай нястачы. «...Часам даводзілася гадзінамі стаяць у чэргах па хлеб ці місачку супу ў сталоўцы, — успамінаў Захар Бірала (Бульбянік). — Мой аднакурсьнік Сяргей Мурзо ў чарзе страціў прытомнасьць. Апамятаўшыся, ледзь дайшоў да інтэрнату» [3, с. 198].

«За неуплату членских взносов» у 1932 г. С. Мурзо быў выключаны з камсамолу, чальцом якога зьяўляўся з 1924 г. Потым у камсамоле яго аднавілі, але ненадоўга. Як на бяду, менскія выданьні адмаўляліся друкаваць ягоныя вершы. Вось што запісана ў пратаколе допыту Валерыя Маракова ў 1936 г.: «Мурзо приносил стихи, но я их не принял. Чарот стихи также забраковал. Известно, что Мурзо пессимистически настроен, писал стихотворения, в которых высказывал мысли о том, что тяжело учиться, и он покончит жизнь самоубийством... Во время учебы в Пединституте я одновременно работал по вечерам (в свободное от учебы время днем) секретарем редакции „Чырвоная Беларусь", и помню такой случай, когда Мурзо приносил стихи, написанные им для помещения в журнал, но я после просмотра вернул последние ему и для напечатания их не принял. Мурзо с моей оценкой стихов не согласился и начал апеллировать к редактору, Чароту. Чарот стихи также забраковал как не подходящие для печатания...» [8, с. 117].



Вокладка зборніка Віцебскай філіі БелАПП «Рытмы будаваньня». 1930 г.


Аднак калі ад яго нешта магло залежаць, Валеры Маракоў з гатоўнасьцю заступаўся за сваіх сяброў — як і падчас наступнага здарэньня зь Сяргеем Мурзо. Паводле ўспамінаў Станіслава Шушкевіча, у 1933 г. «дэкан інстытуту знайшоў пад падушкай студэнта — былога віцебскага рабочага [гэта і быў С. Мурзо. — *В. Ж.*] — два тамы твораў С. Ясеніна і патрабаваў выключыць з інстытуту чытача „кулацкіх упадніцкіх твораў". На агульным студэнцкім сходзе выступіў В. Маракоў. Ён нагадаў зборнік С. Ясеніна „Русь Савецкая", „Паэму пра 26", даказаў, што яго сябар ведае, як адрозьніць станоўчае і патрэбнае ад шкоднага і слабага. Студэнт скончыў інстытут разам з усімі таварышамі крытыка-творчага аддзяленьня» [14, с. 193]. Як бачым, былы віцебскі белаппавец працягваў захапляцца «ідэалягічна шкоднай» паэзіяй С. Ясеніна. Уласныя ж «суіцыдальныя» творы С. Мурзо не захаваліся, як і ўвесь ягоны архіў. Аднак успомнім яскравы вобраз зь яго ранейшага віцебскага верша: *«Быццам кроўю, як з ускрытай вены, / Льлецца ў формы ўніз густы чыгун»*...

Вядома ж, пазбаўлены магчымасьці друкавацца малады паэт яшчэ больш расчароўваўся ў жыцьці. У падпісаных ім паказаньнях пад арыштам сьцьвярджаецца, што ён пачаў задумвацца пра ўцёкі з СССР, абмяркоўваў свае пляны зь сябрамі: *«Я, Гвоздев и Гинзбург высказали намерения уйти в Польшу, причем для этой цели я с Гвоздевым летом 1934 года ездили в Дзержинский район к родственникам Гвоздева, проживающим около самой границы. О наших настроениях знал Хатулев, который также ездил к родственникам Гвоздева. Весной 1934 г. я, Гвоздев и Гинзбург высказали необходимость связаться с польским консулом, с тем, чтобы через него связаться с заграничными белогвардейскими организациями, для совместной борьбы с Советской властью»* [9]. Лёс згаданага тут Гінзбурга невядомы, в вось Гвоздев, ён жа малады паэт Мікола Гваздоў, у 1936-м быў арыштаваны і пазьней загінуў у лягеры дзесьці ў Комі АССР...

Нягледзячы на ўсе цяжкасьці й перашкоды, Сяргей Мурзо здолеў у 1934 г. пасьпяхова закончыць пэдынстытут. Паводле разьмеркаваньня ён паехаў на Магілёўшчыну, у гарадзкі пасёлак Краснапольле, дзе пачаў працаваць настаўнікам сярэдняй школы. Тут яго і арыштавалі 3 лістапада 1936 году. Паэта даставілі ў Менск, бо разам з шэрагам іншых літаратараў абвінавачвалі ў адным злачынстве — прыналежнасьці да «антысавецкай тэрарыстычнай шпіёнска-дывэрсійнай арганізацыі» [9]. Як засьведчыў Захар Бірала, нагодай для арышту быў верш, у якім С. Мурзо пісаў пра змрочную абстаноўку 1930-х і «...выкрываў гэткі зьдзек зь людзей, апяваў час, калі знойдуць вінаватых у гэтым. Нехта данёс пра гэты твор у НКВД, і Сяргей Мурзо трапіў у турму» [3, с. 198].

14 лістапада быў арыштаваны і сам З. Бірала. «Праз тыдзень прывялі сьведку, — успамінаў ён. — Ім аказаўся мой былы аднакурсьнік Сяргей Мурзо. Яго завялі ў суседні кабінэт. Я яго ня бачу, а ён мяне. Празь сьцяну даносілася лаянка, крык Сяргея, яго, напэўна, білі. Але ж патрэбных для сьледзтва паказаньняў Мурзо ня даў. Вочная стаўка не адбылася. Далейшы лёс сябра застаўся для мяне загадкай і па сёньняшні дзень...» [3, с. 199].

Сёньня лёс Сяргея Мурзо ўжо не загадка. Пасьля амаль году турэмных катаваньняў, 28 кастрычніка 1937 г., ён быў асуджаны тройкай НКВД на найвышэйшую меру пакараньня. Наступнае начы Сяргея Мурзо расстралялі разам зь ягонымі аднакурсьнікамі Саламонам Левіным, Юркам Лявонным, Валерыем



КОПИЯ

СВИДЕТЕЛЬСТВО О СМЕРТИ № 032489

Гр. Мурзо Сергей Никитич

умер 4 января 1959 года тысяча девятьсот пятьдесят девятого года

Причина смерти ня указана

о чем в книге записей актов гражданского состояния о смерти 1957 г. 26 числа января месяца, произведена соответствующая запись за № 78

Место смерти г. Витебск

Место регистрации Зам

Дата выдачи "26" января 1957 г.

Заведующий бюро записей актов гражданского состояния (подпись)

Гербовая печать ЗАГСа.

1957 года января 27 дня. Я, государственный нотариус первой Витебской нотариальной конторы Светлов К у. с удостоверяю, что настоящая копия с подлинника свидетельства о смерти выдана правильно. По реестру № 2313. НОТАРИУС (подпись)


(м. п.)

1957 года января 27 дня. Я, государственный нотариус первой Витебской нотариальной конторы Светлов К у. с удостоверяю, что настоящая копия с подлинника свидетельства о смерти выдана правильно. По реестру № 1536. НОТАРИУС (подпись)

(м. п.)

Даведка аб сьмерці Сяргея Мурзо, выдадзеная сваякам паэта

Даведка аб рэабілітацыі Сяргея Мурзо, выдадзеная сваякам паэта



Форма № 30

Военная Коллегия
Верховного Суда
Союза ССР

30 ноября 1956 г.
№ 4н-01597б/56
Москва, ул. Воровского, д. 13.

СПРАВКА

Дело по обвинению МУРЗО Сергея Никитича пересмотрено Военной Коллегией Верховного Суда СССР 10 ноября 1956 года.

Приговор Военной Коллегии от 28 октября 1937 года в отношении МУРЗО С.Н. по вновь открывшимся обстоятельствам отменен и дело за отсутствием состава преступления прекращено.

МУРЗО С.Н. реабилитирован посмертно.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬСТВУЮЩИЙ СУДЕБНОГО СОСТАВА
ВОЕННОЙ КОЛЛЕГИИ ВЕРХОВНОГО СУДА СССР
ПОЛКОВНИК ЮСТИЦИИ /П.ЛИХАЧЕВ/

дс

Мараковым, Зямам Піваваравым, Пятром Хатулёвым і яшчэ многімі прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі. Рэабілітавалі С. Мурзо быў 10 лістапада 1956 г. — пасьля таго, як справу спынілі «за отсутствием преступления» [9]. Сям'я ж у 1957 г. атрымала даведку, дзе сьцьвярджалася, быццам ён памёр 4 студзеня 1939 г., прычына сьмерці — «не указана»...

А вось што сапраўды застаецца таямніцай Сяргея Мурзо — гэта яго паэзія. Ягоны архіў не захаваўся, а як пра творчую асобу пра яго можна меркаваць толькі зь некалькіх публікацыяў раньняга, віцебскага, пэрыяду творчасьці. Яны трохі адкрываюць нам толькі адну грань творчасьці Сяргея Мурзо — паэта, які апяваў «грукат станкоў», «бег шасьцярон» і «рукі рабочых-ударнікаў». Гэта была тая «дазволеная» грань, якой творчая асоба Сяргея Мурзо ўкладалася ў пракрустаў ложак савецкага літаратурнага кантэксту. А быў жа яшчэ і «недазволены» Сяргей Мурзо — той, які пісаў «беспрадметныя», пэсымістычныя і выкрывальніцкія вершы, якіх мы ня можам і, магчыма, на жаль, ужо ніколі ня зможам прачытаць. Паэт, творчы партрэт якога ніколі ня будзе поўны, а так і застанецца размытым і няпэўным абрысам...

Літаратура

1. *Агняцвет Э.* Пад гэты боль нястрымны... // Культура. 1998. 26 чэрв.

2. *Багдановіч І. Э., Барташэвіч М. П.* Мурзо Сяргей // Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўнік: У 6 т. — Мн.: БелЭн, 1994. Т. 4.

3. *Бірала З.* З мінулага // Полымя. 1992. № 5.

4. *Брыгада БелАПП на пэрыфэрыі* // Маладняк. 1932. № 4.

5. *Люгоўскі Б.* Ясенінцу: [Верш] // Заря Запада (г. Витебск). 1929. 31 марта.

6. *Мазуркевіч Я.* Нашы літаратурныя старонкі // Заря Запада. 1929. 25 авг.

7. *Майский Р.* Встреча (Впечатление о литературном вечере БелАПП в клубе «Субботник» // Заря Запада (г. Витебск). 1929. 31 марта.

8. *Маракоў Л.* Валеры Маракоў: Лёс. Хроніка. Кантэкст. — Мн.: Бел. кнігазбор, 1999.

9. *Маракоў Л.* Мікола Гваздоў // Маракоў Л. Біяграфіі [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://kamunikat.org/usie_knihi.html?pubid=25492.

10. *Мурзо С.* Весна в литейной: [Верш] // Заря Запада. 1929. 25 авг.

11. *Мурзо С.* Ля сталёвых бліскучых станін; Вясна ў ліцейнай; З цыклю «Дарога»; Вечар: [Вершы] // Рытмы будаваньня: Трэці літаратурна-мастацкі зборнік Віцебскай філіі Беларускай Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменьнікаў. — Віцебск: Выданьне Віцебскай філіі «БелАПП», 1930.

12. *Мурзо С.* Своей деревне: [Верш] // Заря Запада. 1929. 14 июля.

13. *Мурзо С.* Увечар: [Верш] // Віцебскі пралетары. 1930. 21 крас.

14. *Шушкевіч С.* Успаміны пра Валерыя Маракова // Роднае слова. 1998. № 11.

ВЯСНА Ў ЛІЦЕЙНАЙ

Цэлы дзень ад ранку нестрыманым
Сьветам сонца пырскае з двара.
Паркалёвым белым «сарафанам»
Выглядае у бяроз кара.

Сьпевамі напоўніліся сьцены,
Ўсё гурчыць матор, рамень ў бягу,
Быццам кроўю, як з ускрытай вены,
Льецца ў формы ўніз густы чыгун.

Раскідаліс сінія талстоўкі,
Колькі іх!.. як ў полі васількі.
Спрытныя, устойлівыя крокі,
Ў кожным маладым сьмяецца «КІМ».

А чыгун ўсё льецца, льецца, льецца...
Духата... Эй, вокны адчыняй!
Птушак звонкі сьпеў ў высі нясецца.
Гэй, здарова, кучаравы май!

Спрацавалася, спацела сонца,
Хутка зьменіць месяц-дырыжор,
Згоніць вецер воблачныя колцы,
Зорачны пачую звонкі хор.

Тапалі надзелі гарнітуры,
Зазьвіняць, зашапацяць ў цішы.
Цёплым вечарам зялёнакудрым
Запяюць пра блюзы ля машын.

[1929]

УВЕЧАР

Дзень спаўзе за цёмныя дамы,
Заіскрыцца горад зноў агнямі...
Электрычнасьць вокны будзе мыць.
Раскідаюсь ўвечар пачуцьцямі.
Сяду на рабфаку за канспэкты,
Па сшытку забегае аловак.
Кучаравае лісьцё на кветках
Ў галаве ня зьвяжа думкі, словы.

Кінь сядзець, чытаць — дышы паветрам, —
Скажа звонкая вясна,
Як пад пацалункам ветру
Радасьць у жыцьці не пазнаць!
Зашапоча, зашапоча хтосьці,
У прасторы сінім доўгі вечар —
Не стрымаць вясновай весялосьці
Клёнаў маладых шыракаплечых.

[1930]

ЛЯ СТАЛЁВЫХ БЛІСКУЧЫХ СТАНІН

Сінь над горадам,
Даль ў аганькох.
Сьветавыя рэклямы
Рагочуць...
На асфальце бягуць сотні ног,
Шапацяць, як дубы
Ціхай ноччу.

Ў шматпаверхавым доме агні,
Сьпевы ў салі вялікай друкарні,
Ля сталёвых бліскучых станін
Рукі рабочых
Ударнікаў.

Льлецца холад ліпнёвай ночы,
Ў сьценах водыр
Блакітнага неба.
Колцы воблакаў вецер хоча
Расчасаць на ніткі грэбнем.

Ціха... Мерна кладуцца лісты,
Не стамілася выкідваць машына,
І газэтнай паперы пласты
Разрастаюцца, шырацца,
Шырацца...
. . . . . .

Заўтра хуткі цягнік паімчыць
Ў гарады газэты ўсе рана,
І газэтчык ізноў пракрычыць:
— Вось, каму сьвежы нумар
«Правды»?

Масква. Ліпень 1930 г.

З ЦЫКЛЮ «ДАРОГА»

З высі сыплецца мяккі сьнег,
Фурман сонны ускрыкнуў ліха,
Бомаў звонкіх разьнёсься сьмех,
Даль устрывожыў і... ціха, ціха...

Што маўчыш, скажы, дарога?
Рытмам рваным пульсуеш мне кроў.
Бачыш жыцьця, агнёў многа
Сярод сьнегам засланых двароў.

Там у далі курацца трубы,
Белы дым гоніць ўвысь, гоніць вон.
Я іду... усьміхаецца люба
Даль чырвоным сьветам вакон.

Сьпявай, вецер, пра хор ля машын,
Пра вясёлы разьбег шасьцярон,
Ў вечар сіні, ў такой цішы
На дарозе бы нешта сьцярог.

Што маўчыш, скажы, дарога?
Кроў ня стыне — кіпіць ў жылах кроў!
Глянь!.. жыцьця, агнёў многа
Сярод сьнегам засланых двароў!

[1930]

ВЕЧАР

Хутка вечар... Хутка сіні вечар
Будзе зоркі ў возера кідаць.
Сылюэты дрэў шыракаплечых
Спусьціць ў дно халодная вада.

Выйдуць хлопцы, зазьвініць гармонік...
Пра ячэйку стануць разважаць.
Раніцою сосны прагамоняць:
«Слова меў кавалерыст-важак».

[1930]

Ганна Кавалёва, Аляксей Стрэльнікаў

выйсьці зь ценю: Васіль Шашалевіч і яго драматургія





«П а д а р о ж н і к. Забіваю людзей, што прадалі рэвалюцыю, і буду забіваць, пакуль жыву.

С м о л ь с к а я. Мне жудасна на цябе глядзець! Ты такі самы страшны, як і мой муж.

П а д а р о ж н і к. А хто твой муж?

С м о л ь с к а я. Той, хто падпісвае расстрэлы!»

Васіль Антонавіч Шашалевіч нарадзіўся 9 студзеня 1897 г. у вёсцы Мхінічы Чэрыкаўскага павету (цяпер гэта Краснапольскі раён) Магілёўскай вобласці. Бацька, Антон Дзяменцевіч, памёр, калі Васілю было ўсяго 5 гадоў, і пакінуў вельмі дзіўны тастамэнт: «Ведаючы шырокую натуру сваёй жонкі, ён паставіў умову: распараджацца пэўнай зямлёй, якая належала яму, яна зможа толькі тады, калі малодшай дачцэ споўніцца сямнаццаць гадоў. Вось і давялося сям'і жыць амаль у галечы» [3]. Нягледзячы на цяжкасьці, маці ўдалося даць сваім дзецям адукацыю: Васіль вучыўся ў школе ў вёсцы Палуж, потым скончыў духоўную вучэльню ў Воршы, 4 гады аддаў Магілёўскай духоўнай сэмінарыі і год — Яраслаўскаму юрыдычнаму ліцэю. Пісьменны і таленавіты, Васіль Шашалевіч быў гатовы да самастойнага творчага жыцьця.

Творчая сям'я

Калі ўзгадваюць прозьвішча Шашалевіч, то часьцей у сувязі з Андрэем, больш вядомым пад псэўданімам А. Мрый. Але таленавітымі былі ўсе пяцёра дзяцей у сям'і: тры сястры і двое братоў. У Краснапольлі яны арганізавалі тэатар, хор з аркестрам народных інструмэнтаў, літаратурны і драматычны гурткі. Шашалевічы наладзілі чытаньне лекцыяў на навукова-палітычныя тэмы і нават выдавалі рукапісны часопіс «Пралеска». Сяргей Грахоўскі пісаў у мэмуарах: «Браты Шашалевічы ў першыя пасьлярэвалюцыйныя гады сталі цэнтрам усяго культурнага жыцьця Краснапольля, своеасаблівым маленькім міністэрствам культуры раёну» [5].



Васіль Шашалевіч — сэмінарыст


Драматург па натуры

У сярэдзіне 1920-х гг. Шашалевіч ужо ў Менску. У нешматлікіх успамінах, якія датычаць ягонай асобы, ён выглядае глыбока засяроджаным на сваёй справе — як і на самой ідэі прыгожага і мастацкага.

Вось ён шпацыруе зь сябрамі па Менску і разважае пра мастацтва, вось грае на віялянчэлі ці скрыпцы для сваіх гасьцей [11, с. 7]. Увогуле, музыка была яго жарсьцю, ён ня мысьліў тэатру бяз музыкі, яна будзе практычна ў кожнай ягонай п'есе, а для «Сымфоніі гневу» музычныя нумары ён прыдумае сам.

Васіль Шашалевіч пачаў пісаць п'есы яшчэ ў краснапольскі пэрыяд свайго жыцьця. Спачатку гэта былі простыя аднаактоўкі для іхнага «сямейнага» тэатру. А там ужо сасьпела першая сур'ёзная п'еса «Апраметная», якая дала Васілю Шашалевічу магчымасьць імклівага творчага старту.

Масква на той момант успрымалася савецкімі грамадзянамі як сталіца яшчэ і тэатральная. Беларускія студыйцы, якіх выправілі туды на навучаньне, ставіліся вельмі пераборліва да матэрыялу


Выдаткі на пакупку ліры.
1. На праезд цягніком да в. Койданава 2р. (два)
2. Вазчыку Шаблюўскаму туд. да в. Стоньковa 5р. (пяць)
3. За ліру Койданоўскаму пасрэдніку Сымону 8р. (восем)
Усяго 15 руб.
Атрымаў „Маладнякоўскія грошы" 30 руб.
Застаецца ў мяне 15 руб. (пятнаццаць)
24 красавіка 26 г.
В. Шашалевіч

Справаздача Васіля Шашалевіча аб пакупцы ліры. 1926 г.

для пастаноўкі. Казка-фэерыя маладога драматурга стала ці ня першай пастаноўкай беларускае п'есы ў Маскве.

«Апраметная» была ўкладзеная паводле клясычнага казачнага сюжэту: ліхі вядзьмак заварожвае Аленку, ператварае дзетак у сабак, пакуль не прыходзяць Янка і трое віцязяў і не разбураюць ягоныя чары. Наіўны, просты казачны сюжэт моцна зьнітаваны з жыцьцём. Кожны з маладнякоўцаў ці ўзвышэнцаў, здаецца, усьведамляў сябе такім волатам-асілкам, які змагаецца са злым вядзьмарствам. Праблема ў тым, што вядзьмарства выявілася значна мацнейшым, чым здавалася на першы погляд.

Зачараваны Гайнрыхам Гайнэ

Васіль Шашалевіч да глыбіні душы быў захоплены творчасьцю Гайнэ. Нават сына свайго ён пазьней назаве Генрых. Дык вось, «Апраметная» — як бы даніна павагі гэтаму захапленьню: яна напісана якраз у рэчышчы рамантызму.

П'еса была пастаўленая ўсяго некалькі разоў, але атрымала станоўчыя водгукі [1, с. 15], і толькі ў 1927 годзе, падчас кампаніі супраць нацыянальнага рэпэртуару, тон крытыкаў істотна зьмяніўся. Міхась Модэль адзначаў: «„Апраметная" была разьлічана на задавальненьне ідэйных запатрабаваньняў і рэакцыйных густаў нацыяналістычных колаў беларускай інтэлігенцыі; п'еса дарэшты прасякнута містыкай і яскрава выражанай нацдэмаўскай ідэалёгіяй» [9, с. 7–8]. Ці вось яшчэ з тагачасных рэцэнзіяў: «...Сучасная сацыялістычная беларуская культура, літаратура і мастацтва не павінны карыстацца буржуазнай і нават фэадальнай старажытнасьцю, разьвівацца на кулацкіх „Апраметных", на легендах і казках Афрасіній Полацкіх і Кліментаў» [6, с. 32].



Васіль Шашалевіч. [1927-1928]

Пры канцы 1920-х ужо афіцыйна замацавалася ідэя, што Беларусь не мае ніякай гісторыі да Кастрычніцкай рэвалюцыі, таму зварот да мінуўшчыны і яе рамантызацыя як нечага самабытнага былі цалкам недапушчальныя. Мастацтва занявольвалася ў абцугах сацрэалізму.


Вось таму «Апраметная» і не прыйшлася да кампаніі.

У 1927 годзе п'есу зьнялі з рэпэртуару. Створаная на золку беларускага прафэсійнага тэатру, п'еса стала антыпрыкладам і перасьцярогай для драматургаў, таму цікавалі яе яшчэ доўга пасьля забароны. Вось што пісаў пра «Апраметную» прафэсар Аляксандар Вазьнясенскі: «...Дэталі яе падмененыя балетнымі інтэрмэдыямі, іх вельмі шмат, і яны слаба матываваны і мала зьвязаны з агульным ходам дзеяньня. П'еса ня мае яскравага тэматычнага запаўненьня. Яна пустая, абмежавана перадачаю толькі шаблённага казачнага матыву, таму і гледачом успрымаецца без зацікаўленасьці і напружаньня» [2, с. 101].

Яму ўторыў Віталь Вольскі: «Прагучэўшыя ў далейшых пастаноўках БДТ-2 ноткі беспрадметнага містыцызму („Эрос і Псыха" Жулаўскага), афарбаванага да таго ж і ў нацыянал-дэмакратычныя колеры („Апраметная" Шашалевіча), якія прагучэлі ў яго далейшых пастаноўках, сыгналізавалі аб пэўнай небясьпецы для тэатру ў сэнсе „поўнага адрыву ад працоўнага гледача"» [4, с. 73].

Ад гэтага моманту драматургія Шашалевіча больш ня будзе казачнай, аўтар рушыць ад сюжэту да пэрсанажа: у ягоных пазьнейшых п'есах («Змрок», «Рой», «Воўчыя ночы») заўважна паболее экзыстэнцыйнасьці і псыхалягізму, якія дасягнуць апагею ў «Сымфоніі гневу».

П'еса Васіля Шашалевіча «Змрок». Машынапіс з аўтарскімі праўкамі. Тытульны аркуш. 1926 г. Паставіў БДТ-1 у Менску 30.01.1927



Шашалевіч-паэт

У 1927 годзе ва «Ўзвышшы» выйдзе адзіны вядомы нам верш Васіля Шашалевіча «Сож»:

Імкнецца ў даль, гарыць, як жар,
Бяжсыць вада ля параходу.
У ружовым полымі заходу
Гарыць вада, блішчыць, як жар.
Глядзім на вадзяны пажар
І ў хвалях едзем шпаркім ходам.
Імкнецца ў даль, гарыць, як жар,
Бяжсыць вада ля параходу... [15, с. 52]

Цяжка сказаць, чым было абумоўлена зьяўленьне гэтага верша — спробай зьбегчы ў лірычныя «акварэлі» ці выпрабаваньнем сваіх магчымасьцяў на паэтычным полі. Так ці інакш, але надалей Васіль Шашалевіч слушна засяродзіцца на драматургіі і яго лірыка, прынамсі ў друку, больш зьяўляцца ня будзе.

Нікаяньнікі і глыбаеды

П'еса «Воўчыя ночы» была напісаная ў самым канцы 1920-х гг., а расказвае пра антысавецкі супраціў у пачатку дзесяцігодзьдзя. Так бы мы сказалі сёньня, а ў савецкі час зьяву гэтую называлі «бандытызм». Фабула п'есы нескладаная: на Магілёўшчыне ў 20-я гг. арудуе банда пад кіраўніцтвам няўлоўнага і жорсткага Чырвонца, а на яго палюе адважны камуніст Расамаха з таварышамі. Апошнія, натуральна, перамагаюць.

Як зазначаў сам аўтар, ягоны пэрсанаж ня мае нічога агульнага з сапраўдным Чырвонцам, які дзейнічаў на Магілёўшчыне і быў застрэлены ў 1924 годзе. П'еса добра адлюстроўвае сытуацыю 1920-х: савецкая ўлада сапраўды цяжка прыжывалася, людзі супраціўляліся ёй. Шашалевіч у той час рыхтык жыў і выкладаў у Краснапольлі і цалкам мог быць сьведкам падзеяў, апісваных ў «Воўчых начах».

Мог бы атрымацца ўзорны прапагандысцкі твор. Аднак уся соль гэтай п'есы ў дыялёгах:

> «А г а т а : Што ты пагражаеш нам? Думаеш, мы баімся. Крывапійцы вы! Мала вы насмакталіся, як павукі, нашай крыві? За каго ж нашы сыны на фронце паляглі капамі снапоў?» [16, с. 104].

Гэтак сялянка рэагуе на зьяўленьне Расамахі.

А вось такі дыялёг адбываецца паміж Чырвонцам (галоўным ліхадзеем) і вясковай настаўніцай:

> «П а д а р о ж н і к . Так, забіваю людзей, што прадалі рэвалюцыю, і буду забіваць, пакуль жыву.
>
> С м о л ь с к а я . Мне жудасна на цябе глядзець! Ты такі самы страшны, як і мой муж.
>
> П а д а р о ж н і к . А хто твой муж?
>
> С м о л ь с к а я . Той, хто падпісвае расстрэлы!
>
> П а д а р о ж н і к : Чэкіст?
>
> С м о л ь с к а я . Ён ловіць бандытаў.
>
> П а д а р о ж н і к . Расамаха!
>
> С м о л ь с к а я . Але. Мой муж!
>
> П а д а р о ж н і к (*падхапіўшыся, стаў хутка апранаца*). Ты жонка гэтага крывавага чалавека!
>
> С м о л ь с к а я . Ну што ж, ён не злачынца, ні ад кога не хаваецца! Ён шчыра йдзе...
>
> П а д а р о ж н і к . Так. А я злодзей, бандыт! Хаваюся па цёмных куткох!» [12, с. 57]

Такім чынам драматург укладае ў вусны сваіх пэрсанажаў зусім нечаканыя рэплікі: камуніст выглядае крыважэрным нелюдзем, ягоная жонка ўвогуле гуманістка, не гатовая аддаць усе сілы і думкі барацьбе за рэвалюцыю; галоўны ліхадзей, аказваецца, змагаецца за рэвалюцыйныя ідэалы, а сяляне дык увогуле ставяць пытаньне рубам: а навошта ўсё гэта было, за што сыны паляглі «капамі снапоў»? Суцэльная контрарэвалюцыя атрымліваецца.

Так Шашалевіч ускладняе свой твор, ягоныя пэрсанажы набываюць аб'ём, глыбіню і надзяляюцца супярэчнасьцямі. Атрымалася вельмі жывая псыхалягічная драма, дзе героі робяць вельмі складаны выбар, штораз апынаючыся паміж здрадай і вернасьцю сваім ідэалам, пачуцьцям і чалавечнасьці.

Напісана п'еса вельмі жывой мовай, асабліва калярытнымі словамі размаўляюць сяляне (*„нікаяньнікі"*, *„глыбаеды"* ды інш.). Гармонію п'есы драматург разрывае толькі двойчы: калі Расамаха зачытвае мандат аб наданьні яму надзвычайных паўнамоцтваў і калі судзьдзя абвяшчае прысуд ягонай жонцы. Гэтыя кавалкі доўгія і нудныя, як перадавіца «Праўды».

Рэчаіснасьць у «Воўчых начах» аказалася такой неадназначнай, пярэстай — зусім не гераічнай чорна-белай карцінкай, якую хацелі бачыць саветы. І гэта яшчэ адгукнецца Шашалевічу.

У сямейным коле. Зьлева направа: Андрэй Шашалевіч (Мрый, брат), Соф'я Шашалевіч (братавая), Генрых Шашалевіч (сын), Васіль Шашалевіч, Вера Шашалевіч (жонка). 1930-я гг.



Першы арышт: «Камуніст — ня з хутарам. Камуніст з калектывам...»

Першы раз Шашалевіча арыштавалі ў ліпені 1930 году ў справе «Саюзу вызваленьня Беларусі». Пад сьледзтвам ён праседзеў да лютага 1931 году, а ўжо ў верасьні ва «Ўзвышшы» была надрукаваная п'еса «Рой», галоўны пасыл якой — услаўленьне калектыўнай гаспадаркі і крытыка «прышчэпаўшчыны»[1]. Што магло падштурхнуць рамантыка Шашалевіча на напісаньне прапагандысцкага твору? Адкажа на гэтае пытаньне сам Васіль некалькімі гадамі пазьней у размове зь сябрам пасьля чарговых арыштаў: *«Хлопцы з тае ўстановы з каго захочуць зробяць двухгорбага вярблюда і прымусяць паверыць сябе самога»* [5, с. 149].

Ідэалягічныя путы не перашкодзілі Шашалевічу ў сваім «Раі» экспэрымэнтаваць з рознымі формамі тэатральнай пастаноўкі. У п'есе гучыць багата беларускіх песьняў, а часам аповед увогуле набывае рысы карнавальнасьці:

> «(*...І тут раптам у адчыненыя дзьверы ўбег белагаловы хлапчук Паўлючок і сваім дзіцячым крыкам перакрычаў усіх*):
>
> П а ў л ю ч о к . «Дзядзька Гарчак! Рой ляціць! Рой! Рой! Рой!!
>
> (*Ён проста як бы звар'яцеў — круціцца на месцы, падскокваючы, махаючы рукамі: Рой! Рой! Рой!!.*») [13, с. 65].

Акрамя музычных нумароў, драматург уставіў у п'есу і элемэнты кіно:

[1] Зьміцер Прышчэпаў з 1924 да 1929 г. займаў пасаду наркама земляробства БССР, прасоўваў палітыку хутарызацыі сялянства. У ліпені 1930 г. арыштаваны як адзін з кіраўнікоў «Саюзу вызваленьня Беларусі», засуджаны на 10 гадоў лягераў, вызваліўся ў чэрвені 1937-га, у жніўні паўторна арыштаваны, у 1939 г. асуджаны на расстрэл. Памёр у менскай турэмнай лякарні 31 студзеня 1940 г. ад сардэчнага прыступу. Рэабілітаваны пасьмяротна [7].

«Перад вамі тыповая хутарская гаспадарка, якая атрымала ўзнагароду і прэмію ад Наркамзему БССР. Славуты хутар „Фатыга“. А вось і яго гаспадар.

(*На экране зьяўляецца шыракаплечы мужчына. Шырокая сівая барада лапатай. Заплыўшымі вочкамі, мігаючы, глядзіць.*)

Г а л а с ы . Дык гэта ж кулак, ліха на яго...


... Бач, гад, каму ты вачыма лыпаеш?» [13, с. 54]

Сымфонія гневу: «Мой вораг — эпоха!»

У 1933 годзе Шашалевіч напіша сваю апошнюю вялікую п'есу. Сяргей Грахоўскі ўзгадваў: «Шашалевіча трывожыла імклівае распаўзаньне ў Германіі карычневай пошасьці фашызму... <...> Напружаны драматызм, афарыстычнасьць мовы, паэтычнасьць маналёгаў былі блізкія трагедыям Шэксьпіра» [5, с. 147].

Нельга занадта літаральна ўспрымаць «аўтабіяграфічнасьць» драматычных пэрсанажаў, але да кампазытара Салька ўвесь час цягнуцца людзі. Гэтаксама як і да Шашалевіча, які заставаўся незаўважнай постацьцю, але пры гэтым вабіў да сябе маладых літаратараў, і ў сьпісах на арышты ён быў сярод першых (такі сумны знак якасьці), і ў камэрах і лягерах да яго гэтаксама гарнуліся арыштанты. Дый цярплівая Яўгеня рыхтык Шашалевічава жонка — сьціплая і рахманая Вера, якую таксама чакае няпросты трагічны лёс.

Васіль Шашалевіч цалкам паглыбіўся ў працу над спэктаклем, увесь час быў у БДТ-1, гутарыў з рэжысэрамі Паўлам Данілавым, Львом Літвінавым ды Ўладзімерам Уладамірскім, будучым народным артыстам БССР, які выконваў ролю Салька.



Рэцэнзія Васіля Шашалевіча на п'есу «Сонечны ўдар» Віктара Галаўчынера. Аўтограф. Фрагмэнт. 11 сакавіка 1929 г.

Драматург быў зусім шчасьлівы, вір тэатральнага жыцьця яму яўна падабаўся. Нарэшце дзьве ягоныя жарсьці — музыка і тэатар — злучыліся ў адно: Шашалевіч жа нават музычныя замалёўкі для Салька пісаў сам.

Пастаноўка мела вялікі посьпех, але, нягледзячы на гэта, усё адно трапіла пад кампанію «барацьбы з фармалізмам»: «На судзілішчы ў ССП БССР Васіль Шашалевіч апраўдваўся: рэжысэры „выставілі катэгарычнае патрабаваньне вывесьці двух-трох камуністаў", пры гэтым яны „павінны гаварыць ня больш пяці-васьмі мінут", „пры такім агранічэньні вельмі цяжка тварыць жывых людзей". Нядобразычліўцаў асабліва абурыла, што аўтар надумаўся абараняць свой твор» [10].

Гэты час быў для Шашалевіча асаблівы ня толькі як для драматурга: уладкавалася і яго прыватнае жыцьцё. У былым халасьцяцкім пакойчыку зьявілася Вера Сямёнаўна, а потым нарадзіўся сын Генрых. Падавалася, што ўсё будзе добра...

Аднак улады адчувалі ў Шашалевічу небясьпеку. Бадай, ня так істотна высьвятляць, каторы менавіта фашысцкі рэжым апісаны ў п'есе — польскі, нямецкі ці нават савецкі. Міжваенная Эўропа — узбуджаная, незадаволеная, абяздоленая — раптам, не зважаючы на межы, аказалася блізкаю і падобнаю менавіта вось гэтай цынічнай, злой агрэсіяй. Паўсюль улады перавышалі свае паўнамоцтвы, паўсюль бясьсільле бедных пластоў насельніцтва, і менавіта ад іхнага імя піша Васіль Шашалевіч. У неразьвязаных канфліктах антаганістаў п'есы можна пабачыць прадчуваньне бязьлітаснай Другой усясьветнай вайны. Пра гэта апошнія радкі п'есы: «Вы яшчэ пачуеце яе [сымфоніі] фінал! Яго пачуе ўся Эўропа!..» [14]. Але нават калі Шашалевіч не трымаў дулю ў кішэні і ня меў на ўвазе Савецкага Саюзу пад фашысцкім рэжымам, апісаным у «Сымфоніі гневу», міжволі ў яго атрымалася выдатна.

Напісаная паміж двума арыштамі п'еса мае своеасаблівы фрагмэнт, зьяўленьне якога можна патлумачыць хіба толькі ўласным досьведам. Гэта апісаньне «мераў інтэнсіўнага допыту», ад якога па скуры ідуць дрыжыкі: *«Шаноўныя панове! Да ведама ўсяго сьвету, законы нашай краіны сурова забараняюць катаваньне жывёлы і людзей... Што такое „меры інтэнсіўнага допыту"? Гэтак мы называем у адрозьненьне ад звычайных такія катаваньні, якія пры найбольшай эфэктыўнасьці не пакідаюць на целе чалавека ніякіх сьлядоў. Зразумела, гэта ня значыць, што чалавек застаецца такім самым здаровым пасьля „інтэнсіўнага допыту", як быў раней. Нябачныя псыхічныя траўмы ў выглядзе назойлівых ідэй, галюцынацый, гістэрыі могуць застацца на ўсё жыцьцё»* [14, с. 26].

Другі арышт. Апошні

28 кастрычніка 1936 году Васіль Шашалевіч быў арыштаваны другі раз як кіраўнік нацыяналістычнай групы.

Посьпех п'есы «Сымфонія гневу» нечакана ўдарыў па аўтару. Сяргей Грахоўскі узгадваў размову з Шашалевічам у менскай турме пасьля вынясеньня прысуду. Васіль Антонавіч расказваў, што неяк падчас допыту сьледчы пачаў нахвальваць якуюсьці п'есу за яе палітычную вастрыню і антыфашысцкі патас, а галоўным пэрсанажам у ёй — надзвычай сумленны кампазытар: «Вось як трэба пісаць. А вы там навыдумлялі нейкія „Воўчыя ночы" і паклёпнічалі на нашу рэчаіснасьць». Праўда, назву сьледчы памятаў цьмяна — «нейкая сымфонія», і тады Шашалевіч сказаў: «Спэктакль называецца „Сымфонія гневу", а аўтар... ваш пакорны слуга Васіль Шашалевіч» [5, с. 151].

Драматурга асудзілі на 10 гадоў лягераў. У Шашалевіча была добрая кампанія ў камэры: Хадыка, Баранавых, Знаёмы, Астапенка, Звонак, Мікуліч, Багун, Скрыган, Дарожны, Пальчэўскі, Розна, Мяжэвіч, Грахоўскі...

Пасьля менскай турмы агаладалых вязьняў этапавалі ў Магілёў. Сярод арыштантаў, патрапаных новымі абставінамі, вылучаўся «заўсёды элегантны Васіль Шашалевіч. На ім самы просты касьцюм выглядаў прыгожа, ён умеў насіць рэчы з асаблівым артыстызмам» [5, с. 152].

У турме Шашалевіч часта падсаджваўся да цікавых людзей і падрабязна апытваў іх, слухаў гісторыі жыцьця, быццам шукаючы новыя вобразы для сваіх будучых п'есаў: цярпліва выслухоўваў непісьменнага селяніна, абвінавачанага ў трацкізьме, альбо далікатна распытваў пра пачуцьці і перажываньні памілаванага сьмяротніка.

А вечарамі ў камэры былі канцэрты.

«Шашалевіч ціха пачынаў сваім прыгожым тэнарам:

Спускается солнце за степи,
Вдали золотится ковыль,
Колодников звонкие цепи
Взметают дорожную пыль.

А прыпеў: „Динь-бом, динь-бом, слышен звон кандальный, динь-бом, динь-бом, путь сибирский дальний" падхоплівала ўся камэра».

Зьняволеньне далося драматургу ў знакі: абвастрыліся даўнія сухоты, таму ў лягеры ён быў прызнаны непрацаздольным і прызначаны на папяровую працу. Аднак не займацца творчасьцю Шашалевіч ня мог і пісаў то прыпеўкі, то маленькія п'ескі. Пастаноўка адной з гэтых п'есаў у лягернай сталоўцы вырашыла лёс драматурга: прысьвечаная тэме лягернага жыцьця, яна вельмі не спадабалася кіраўніцтву. Нягледзячы на хваробу, Шашалевіча адправілі на лесапавал весьці ўлік сьпілаванай драўніны. Лес валілі далёка ад складу, але нехта адмыслова падпілаваў бярозу побач і апусьціў яе на Шашалевіча. Пачуўся страшэнны крык: драматурга прыціснула магутным дрэвам да вогнішча. Людзі нават ня здолелі сьцягнуць зь яго гэтую бярозу — толькі расьпілаваць: «выцягнулі з-пад яе абгарэлага, пераламанага, з выцекшымі вачыма ўчотчыка. Толькі пад вечар яго яшчэ жывога прывезьлі ў зону. Урач, мэдсястра і санітаркі плакалі, не саромеючыся сьлёз. Калі, дзе і з кім яго пахавалі, ніхто ня ведае і не дазнаецца ніколі. Там цяпер шуміць паўвекавы лес» [5, с. 158]. Леанід Маракоў прывёў дакладную дату сьмерці Васіля Шашалевіча — 23.10.1941 [8].

Бяда не прыходзіць адна

Жонка Васіля Шашалевіча Вера Сямёнаўна здолела выжыць і выратаваць іх адзінага сына Генрыха. Яна нічога ня ведала пра лёс свайго мужа, адно толькі, што быў пасьмяротна рэабілітаваны. Ёй мусілі выплаціць кампэнсацыю за незаконна рэпрэсаванага сваяка — 6000 рублёў — шалёныя грошы для канца 1950-х. Пра Верына багацьце хутка даведаліся ўсе аднавяскоўцы (каб пракарміцца, яна даўно зьехала з гораду ў вёску), а п'яніца Міхась Крыловіч, у якога яна здымала кватэру, загарэўся асаблівай прагай да нажывы. Ён засек жанчыну, а калі пабачыў, што нарабіў, — павесіўся ў пуні. Грошай, дарэчы, ён так і не знайшоў: у касе Літфонду не апынулася такой сумы, і кампэнсацыю мусілі неўзабаве выслаць на пошту.

Генрых Шашалевіч зьехаў да сваякоў у Менск, зьмяніў імя на Генадзя, працаваў кіроўцам тралейбуса, потым электрыкам. «Жыве ён адзін і нават ня мае бацькавага здымка» [5, с. 160], — пісаў Грахоўскі. Загінуў Генрых Шашалевіч у 1993 г. ад бандыцкага нажа.

Ці можа так скончыцца гісторыя Васіля Шашалевіча? Вядома — не. Ягоная творчасьць мусіць быць вернутая і асэнсаваная. А ягоны лёс — пільна дасьледаваны. Яшчэ не прагучала сымфонія Васіля Шашалевіча, толькі ня гневу, а ягонага таленту.

Літаратура

1. *Азгур З.* Гаварыў ён шчыра...: Згадка пра Васіля Шашалевіча ў ягонае 90-годдзе // ЛіМ. 1987. 9 студз.

2. *Вазьнясенскі А., праф.* Другі беларускі дзяржаўны тэатр // Узвышша. 1929. № 6.

3. *Васіль Дэ Эм* (*Дранько-Майсюк Васіль*). 20 нечаканых фактаў пра Андрэя Мрыя, які першым напісаў пра гвалт і садызм у Чырвонай арміі // Радыё Свабода [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.svaboda.org/a/29486484.html.

4. *Вольскі В.* Аб творчых шляхох беларускага другога дзяржаўнага тэатру // Узвышша. 1930. № 6.

5. *Грахоўскі С.* Два лёсы — дзве трагедыі // Маладосць. 1988. № 1.

6. *Каляда І.* Тэатральныя дыскусіі 1920-х — 1930-х гг.: станаўленне тэатральнага прафесіяналізму // Труды БГТУ. 2017. № 2.

7. *Маракоў Л.* Прышчэпаў Дзмітрый Філімонавіч. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794–1991. Том III. Кніга II [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.marakou.by/by/davedniki/represavanyya-litaratary/tom-iii-kniga-ii/index_21394.html.

8. *Маракоў Л.* Шашалевіч Васіль Антонавіч // Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794–1991. Том III. Кніга II [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.marakou.by/by/davedniki/represavanyya-litaratary/tom-ii?id=19893.

9. *Модэль М.* Тэатр і драматургія: Крытычныя артыкулы. — Мн.: ДВБ, 1935.

10. *Рублевская Л.* Драматурга Василя Шашалевича убили за пьесу из лагерной жизни // Хронікі сада камянёў: Сайт пісьменніцы Людмілы Рублеўскай [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://lir-book.by/ /драматурга-василя-шашалевича-убили-з/.

11. *Хведаровіч М.* Мой шчыры, сціплы таварыш // ЛіМ. 1977. 7 студз.

12. *Шашалевіч В.* Воўчыя ночы: Драматычныя абразы // Узвышша. 1929. № 1.

13. *Шашалевіч В.* Рой: П'еса ў 4-х актах // Узвышша. 1931. № 9.

14. *Шашалевіч В.* Сімфонія гневу: П'еса ў 3-х актах // Тэатральная Беларусь. 1992. № 4.

15. *Шашалевіч В.* Сож (Акварэлі): [Верш] // Узвышша. 1927. № 2.

16. *Шашалевіч В.* Сумны зьвер: Пролёг з новае п'есы «Воўчыя ночы» // Узвышша. 1928. № 5.

СЫМФОНІЯ ГНЕВУ

П'еса ў трох актах

(урывак)

АСОБЫ:

Прафэсар Сальк — кампазытар
Яўгеня — ягоная жонка
Пан Людвіг — муз. выдавец
Касура — падпольшчык-бальшавік
Якубчык — шпік
Панна Анэля
Казімір Цудальскі — мастак
Шэф Палітычны — начальнік «канторы ўсеагульнага спакою»
Журніцкі — старшыня групы беспрацоўных музыкаў
Прафэсар Альтнэр — кампазытар
Дырэктар кансэрваторыі
Студэнты і студэнткі кансэрваторыі
Прафэсар «Ката-лёгіі» школы шпікаў
Дырэктарша «Гранд атэля»
Касірша «Гранд атэля»
Ксёндз Янста
Падпольшчык у масцы
1-я маска
2-я маска
Маленькая жанчына ў масцы
Гандзя — танцоўшчыца
Гандляр-Буржуйчык
Госьці «Гранд атэля» — мужчыны і дамы ў масках
Дзяўчаты «Гранд атэля», лёкаі, паліцыянты

Дзея адбываецца ў адной з фашысцкіх дзяржаў капіталістычнага Захаду.

АКТ III

Абраз 8

Парадныя мармуровыя сходкі кансэрваторыі. Прафэсар Сальк падымаецца ўгару. На адну з пляцовак выбягае шумлівы натоўп студэнтаў і студэнтак, воплескамі і крыкамі сустракаюць Салька.

Крыкі. Віват прафэсару Сальку! Віват! Віват! Няхай жыве прафэсар Сальк! Віват! Вітаем прафэсара Салька!

Студэнт. Прафэсар Сальк! Мы рады, што вы зноў вярнуліся да нас і зноў мы будзем вашымі вучнямі!

С а л ь к . Добры дзень, добры дзень, дарагія мае сябры! Я яшчэ болей рад, што бачу вас, што вы не забыліся на мяне! (*Вітаецца.*) Зноў я сярод вас, зноў буду вучыць вас!.. Так, так... Гэта вялікае шчасьце!.. Вось бачыце, мы зноў сустрэліся з вамі... Ну, выбачайце, мне трэба ісьці пагутарыць з дырэктарам, а потым я зайду да вас...

С т у д э н т ы . Прафэсар Сальк! Мы просім, каб вы выкладалі ў нашай групе.

Г а л а с ы . І ў нас, і ў нас!

С а л ь к . Добра, добра. Я скажу дырэктару.

(Сальк ідзе вышэй. Перад ім расчыняюцца дзьверы круглага «пакоя прафэсараў» кансэрваторыі. За сталом сядзяць некалькі прафэсараў, сярод якіх дырэктар і Альтнэр. Убачыўшы Салька, усе ўстаюць і вітаюць яго.)

Д ы р э к т а р . Прафэсар Сальк! Заходзьце, будзьце ласкавы. Мы рады Вас зноў бачыць у сьценах кансэрваторыі.

(Сальк уваходзіць, вітаецца з усімі. Ён ня можа справіцца з хваляваньнем.)

С а л ь к (*працягнуўшы руку Альтнэру*). Прафэсар Альтнэр. Я глыбока вінаваты перад вамі. Я абразіў вас, прафэсар Альтнэр... Прашу прабачэньня...

А л ь т н э р . Калі ласка. Я не злапамятлівы.

С а л ь к . Я зьявіўся пане дырэктар, згодна вашага запрашэньня.

Д ы р э к т а р . Прашу садзіцца. Мы адчыняем у кансэрваторыі яшчэ адну раўналежную групу па класе тэорыі музыкі і кампазыцыі. Рада прафэсараў кансэрваторыі пры абмеркаваньні кандыдатуры выкладчыка застанавілася на вашай.

С а л ь к . Я вельмі рад і глыбока ўдзячны за гонар, які мне аказала рада прафэсараў. Але я прасіў бы, каб мне далі магчымасьць займацца з маімі былымі вучнямі. Толькі што яны прасілі мяне аб гэтым.

Д ы р э к т а р . Я разумею вас. Рада прафэсараў разгледзіць вашу просьбу і, я думаю, ня будзе супярэчыць. Між іншым, у гэтай новай групе будуць вучыцца студэнты найбольш здольныя. Вядома, сярод іх будуць таксама і вашыя вучні. Так што, я думаю, прафэсар Сальк ня будзе супярэчыць прызначэньню яго ў новую групу.

С а л ь к . Я згодзен.

Д ы р э к т а р . Гэтая новая група ў нас амаль што гатова і аформлена, так што заняткі можна распачаць хоць заўтра. Наконт матэрыяльных умоваў...

С а л ь к . Адносна матэрыяльных умоваў я ніколі не спрачаўся.

Д ы р э к т а р . Вашая ранейшая пэнсія павялічваецца на 25 працэнтаў. Такім чынам вы будзеце атрымліваць у нас найбольшы аклад.

С а л ь к . Скажу шчыра, мне непрыемна такое вылучэньне.

Д ы р э к т а р . Таксама мы нават можам выдаць вам за месяц наперад вашу пэнсію, каб вы маглі прывесьці сябе ў больш прыстойны выгляд.

С а л ь к . Я вельмі ўдзячны і прашу прабачэньня за мой выгляд. Цяжкія матэрыяльныя абставіны... Вашае запрашэньне было зусім нечаканае.

Д ы р э к т а р . Калі ласка... Зараз гэта ня мае значэньня... Так... Ёсьць яшчэ некаторыя абставіны, пра якія я павінен сказаць, прафэсар Сальк. Абставіны, як бы сказаць, крыху непрыемнага характару... (*Альтнэр і іншыя прафэсары выходзяць.*)

С а л ь к . Я слухаю вас, пане дырэктар.

Д ы р э к т а р . Я думаю, пану Сальку вядома, што наша кансэрваторыя амаль на 80 працэнтаў знаходзіцца на дзяржаўным утрыманьні. Безь дзяржаўнай субсыдыі мы не праіснавалі б і пары дзён... Гэтыя абставіны, прафэсар Сальк, прымушаюць нас быць вельмі пільнымі ў адносінах нашага лектарскага складу. Зусім зразумела, урад не дапусьціць, каб кансэрваторыя, на якую трацяцца такія значныя сумы, зьяўлялася рассаднікам антыдзяржаўных і антыпалітычных ідэй.

С а л ь к . Я разумею, пра што пан дырэктар хоча сказаць...

Д ы р э к т а р . Я буду гаварыць зусім канкрэтна. Дырэкцыя кансэрваторыі пастаўлена ў неабходнасьць патрабаваць ад прафэсараў, каб іх палітычная добрасумленнасьць была на вышыні… На жаль, я павінен паведаміць прафэсару Сальку, што яго палітычная рэабілітацыя недастатковая… недастатковая.

С а л ь к . Калі дырэкцыя лічыць мяне палітычна нядобрасумленным, мне дзіўна, што мяне запрасілі на перамаўленьні…

Д ы р э к т а р . Прафэсар Сальк не павінен абражацца на мае словы. Я прымушаны гаварыць зусім адкрыта. Мы запрасілі вас у кансэрваторыю, будучы ўпэўнены, што вы гэтую рэабілітацыю набудзеце. Дзеля гэтага вам патрэбна будзе зрабіць такі нязначны крок, што мы не сумняемся, што вы гэта зробіце.

С а л ь к . Што я павінен зрабіць?

Д ы р э к т а р . Прашу прабачэньня, прафэсар Сальк, пра вас ходзяць самыя разнастайныя чуткі… Нібыта ваша кампазытарская дзейнасьць за апошні час набыла характар, непажаданы ў палітычных адносінах.

С а л ь к . Адкуль такія весткі? Наколькі мне вядома, ніхто з прафэсараў кансэрваторыі не знаёмы з маёй апошняй творчасьцю.

Д ы р э к т а р . Ходзяць чуткі, прафэсар Сальк, што ў апошні час вы пішаце сваю музыку для вуліцы… Не мая справа асуджаць вас за гэта, і, магчыма, у вас ёсьць свае апраўданьні. Аднак павінен сказаць, што да гэтага часу ў нас яшчэ не было падобнага прэцэдэнту. Усё гэта прымушае нас з пэўнай пільнасьцю паставіцца да паступленьня вашага на службу ў кансэрваторыю.

С а л ь к . Я думаю, што прыйшоў у кансэрваторыю… Аднак я цяпер бачу, што трапіў у аддзяленьне «Канторы сакрэтнага нагляду»…

Д ы р э к т а р . Прафэсар Сальк!

С а л ь к . Чаго ж патрабуе ад мяне дырэктар?

Д ы р э к т а р . Вы павінны адмовіцца ад сваёй творчасьці за апошні час і напісаць аб гэтым ліст у газэту. Вы павінны шчыра прызнацца ва ўсіх сваіх палітычных грахах.

С а л ь к . Я хацеў бы ведаць: якія мае палітычныя грахі?

Д ы р э к т а р . Прафэсару Сальку гэта больш вядома, як нам… Аднак самай галоўнай умовай вашага паступленьня на службу ў кансэрваторыю мы ставім падпісаньне вамі гэтага дакумэнту…

С а л ь к (*чытае*). «Невядомымі злачынцамі ўкрадзена мэлёдыя майго апошняга маршу, якая дастасавана да антыдзяржаўных і рэвалюцыйных слоў і сьпяваецца на вуліцах як песьня, у якой нібыта адбіваецца настрой беспрацоўных. Ганьбуючы такі ўчынак, я сам зьнішчаю гэтую сваю мэлёдыю, якая зрабілася песьняй бадзяг і злодзеяў». — Гэта няпраўда! Абсалютная хлусьня! Ніхто ня краў у мяне мэлёдыю!

Д ы р э к т а р . Аднак гэта ж ваш марш сьпяваюць на вуліцах беспрацоўныя?

С а л ь к . Беспрацоўныя, а не бадзягі і злодзеі. Я не падпішу гэтага дакумэнту.

Д ы р э к т а р . Прафэсар Сальк. Вы павінны зразумець, што гэта — пустая фармальнасьць…

С а л ь к . Не, не пустая фармальнасьць. У гэтым дакумэнце мой лёс! Я бачу гэта.

Д ы р э к т а р . Калі так, навошта вы свой лёс і жыцьцё стаўляеце на карту?

С а л ь к . Калі б я падпісаў яго, я ненавідзеў бы сябе ўсё сваё жыцьцё.

Д ы р э к т а р . Прафэсар Сальк! Мне шкада вашага генія. Вы павінны падпісаць гэта і застацца ў кансэрваторыі. (*Сальк ідзе да дзьвярэй.*) Прафэсар Сальк! Я не пушчу вас! Не губіце сябе. Мы цэнім вас, мы ідзем да вас насустрач. Перад вамі зноў адчыняюцца дзьверы храма мастацтва. Няўжо ж вы прамяняеце гэтае вялікае мастацтва на гразь, голад і галечу? Каму вы хочаце служыць? Каму ў ахвяру прыносіце вы сваё жыцьцё і геній? Няшчасным абшарпанцам, якія страцілі вобраз людзей? Ці варты яны гэтага? Мы даём вам усё — славу і грошы, — што яшчэ патрэбна мастаку? А што дадуць яны вам, апрача сваіх бед і няшчасьцяў? Ці разумеюць гэтыя людзі мастацтва? Ці патрэбна яно ім? Рабы і плебеі старадаўняга Рыму крычалі: «Panem et circenses» — «Хлеба і відовішчаў»! Іх зьвярыная душа патрабавала мастацтва. А цяпер, вы чулі, гэтыя людзі крычаць: «Хлеба і працы». Хто зь іх просіць мастацтва?

С а л ь к . Няпраўда! Вы хлусіце! Сьмешна было б ім прасіць у вас мастацтва.

Д ы р э к т а р . Прафэсар Сальк! Вы прыйшлі да нас, так? Значыць, у вас была думка вярнуцца да нас?

С а л ь к . Каюся… Вельмі моцная была спакуса. Але цяпер ужо сам бачу, што для мяне няма звароту… (*Ірве паперку, якую трымаў у руках. Дырэктар, акамянеўшы, глядзіць на яго.*)

(Паўза.)

Д ы р э к т а р . Прафэсар Сальк! Што вы зрабілі! Гэта самагубства!

С а л ь к . Бывайце... (*Выходзіць і спускаецца па сходнях. Студэнты зноў сустракаюць яго шумнымі галасамі.*)

Г а л а с ы . Прафэсар Сальк! Прафэсар Сальк! Зайдзіце да нас!..

С а л ь к (*хмура*). Ня кратайце мяне... я не служу ў вас...

(Студэнты прыціхлі і змоўклі. Паўза. Прафэсар Сальк моўчкі ўваходзіць у свой змрочны пакой.)

(Пераключаецца сьвятло ў пакоі кампазытара.)

(Уваходзіць Яўгеня.)

Я ў г е н я . Ромусь, ты дома? Дзе ты? (*Паўза.*) Ромусь! (*З жахам кідаецца ў глыбіню цёмнага пакоя.*) Сальк! Сальк! Што ты хацеў зрабіць?.. Аддай рэвальвэр!.. (*Цягне яго за рукі на сярэдзіну пакоя. Сальк бязвольна ідзе за ёю.*) Што з табою? Што здарылася? Пакінуць жыцьцё! Родны мой! А я? А я? Ты на мяне забыўся.

С а л ь к . Даруй мне. Я ня вытрываў зьдзекаў жыцьця.

Я ў г е н я . Што зламала цябе? Скажы мне.

С а л ь к . Я не магу музыкай заклікаць у рабства людзей!.. Я адмовіўся.

Я ў г е н я . Сальк! Сальк! Што табе кансэрваторыя? Няўжо ж з-за гэтага разьвітацца з жыцьцём?

С а л ь к . Мая місія скончана: я напісаў «Сымфонію гневу». Далей мне жыць ня важна.

Я ў г е н я . Не, ня скончана твая місія: ты павінен сыграць сваю сымфонію. Ніхто яшчэ ня чуў яе.

С а л ь к . Так, гэта праўда. Але мне цяжка, так цяжка!

Я ў г е н я . Сядзь за раяль, музыкай разьвей сваю роспач. Ну, я прашу цябе, сыграй якую-небудзь імправізацыю. Табе і мне лягчэй будзе на сэрцы. Навошта адчайвацца? Хіба вечна будзе цягнуцца ноч?.. Альбо ты думаеш, без кансэрваторыі нам сьвет завязаўся?.. Я ж знайшла сабе працу... Хлопчык і дзяўчынка — такія слаўныя!... Вучыць па-французску і па-нямецку. І я, такая дурная, адмовілася! Заўтра ж пайду і скажу, што згодна... Бачыш, я адмовілася, бо доктар прызнаў мяне хворай, што ў мяне сухоты. Можа, гэта няпраўда? Ён сказаў, што ёсьць пагроза, нібыта мае сухоты могуць перайсьці ў хуткацечныя. Гэта глупства, я ня веру. Вось пакладзі мне руку на лоб, бачыш, як гарыць мая галава?

С а л ь к . Ты хворая, бедная мая...

Я ў г е н я . Гэта мігрэнь, звычайная мігрэнь... А калі і сьмерць? Ну што ж? Хто можа зачыніцца ад сьмерці і крыкнуць ёй «мяне няма дома»? (*Уваходзіць Журніцкі.*) Хто там?

Ж у р н і ц к і . Гэта я. Прафэсар Сальк, добры вечар.

С а л ь к . Добра, што вы зайшлі.

Ж у р н і ц к і . Я дачуўся, што вы адмовіліся...

С а л ь к . Вы прыйшлі выказаць спачуваньне?

Ж у р н і ц к і . Я ведаю, што вам цяжка, але я чакаў гэтага. Прафэсар Сальк, я зноў прыйшоў да вас ад групы беспрацоўных музыкантаў. Вы ўжо чулі, што пачаўся вялікі галодны паход з правінцыі ў сталіцу. Ідуць дзясяткі тысяч людзей, і праз два тыдні яны будуць у нас. Мы хочам свой канцэрт дастасаваць да дня прыходу галодных. Што са сваіх твораў вы дасьцё нам выканаць на канцэрце?

С а л ь к . Я аддам вам сваю апошнюю рэч, «Сымфонію гневу». Калі яна можа замяніць аплявуху таму сьвету, які я пакінуў, — выканайце яе.

Абраз 9

Шэф і панна Анэля.

Ш э ф . Мы пачынаем з вамі агляд «Канторы ўсеагульнага спакою». Станьце вось сюды. Вам добра відаць?

А н э л я (*зірнуўшы з вочка*). Я бачу толькі аднаго чалавека.

Ш э ф . Зараз адбудзецца лекцыя «Інтэнсіўнага допыту». Гэта школа канфідэнтаў. Адсюль мы набіраем працаўнікоў нашых замежных кансулятаў і вайсковых аташэ. Тут вы ўбачыце людзей, сур'ёзна вывучаючых марксізм і ленінізм, каб зрабіцца правакатарамі камуністычнага падпольля. Адсюль выходзяць паліцыянты і выканаўцы сьмяротных прысудаў... На гэтым месцы, дзе стаіце вы, ня гэтак даўно стаяў сам Дыктатар і слухаў «інтэнсіўны» допыт сваіх ворагаў, якія трапілі ў нашыя рукі.

А н э л я . Хто гэты чалавек?

Ш э ф . Гэта прафэсар «ката-лёгіі». Слухайце лекцыю.

(Сярод змрочных катакомбных зводаў асьвятляецца постаць «прафэсара забойстваў і катаваньняў» — бледны твар аскета, сухія бяскроўныя губы вымаўляюць словы жорстка. Ад іх вее магільным холадам...)

П р а ф э с а р . Шаноўныя панове! Да ведама ўсяго сьвету, законы нашай краіны сурова забараняюць катаваньне жывёлы і людзей. Аднак гэты гуманны закон зусім не забараняе гэтак званыя «меры інтэнсіўнага допыту», якія і ўжываюцца намі ў мэтах выкрыцьця важнай палітычнай тайны, дзяржаўнага злачынства, палітычнай змовы і замаху на высокіх саноўных асоб. Што такое «меры інтэнсіўнага допыту»? Гэтак мы называем у адрозьненьне ад звычайных такія катаваньні, якія пры найбольшай эфэктыўнасьці не пакідаюць на целе чалавека ніякіх сьлядоў. Ні адна кропля крыві «пацыента» не павінна заплямiць вашых крухмальных манжэтаў, не павінна праліцца на падлогу пакоя «інтэнсіўнага допыту»: ні адзін доктар пры самым уважлівым аглядзе чалавека, якому пашанцавала выйсьці з нашых рук, не павінен заўважыць ніякага сьледу вытрыманага «інтэнсіўнага» допыту. Зразумела, гэта ня значыць, што чалавек застаецца такім самым здаровым пасьля «інтэнсіўнага допыту», як быў раней. Нябачныя псыхічныя траўмы ў выглядзе назойлівых ідэй, галюцынацый, гістэрыі могуць застацца на ўсё жыцьцё.

Якая мэта «інтэнсіўнага допыту»? Толькі адзіная: дамагчыся ад нашага «пацыента» поўнага, шчырага прызнаньня і выкрыцьця ўсіх сваіх супольнікаў.

Якімі мэтадамі мы дасягаем гэтай адзінай мэты?

Шаноўныя панове!.. У нашай прафэсіі мы маем справу з гэтак званымі «Ахілесавымі пятамі» арганізму чалавека. Гэтак мы называем найбольш кволыя органы цела чалавека, пры парушэньні якіх адчуваецца максымальная балючасьць, як вочы, вушы, горла, уся вобласьць жывата і, нарэшце, органы, якія з уяўнай сьціпласьці тут не намаляваныя, — палавыя органы чалавека.

Сярод гэтых «Ахілесавых пят» чалавека найбольшай увагай карыстаюцца такія органы, самае лёгкае ўшчымленьне якіх у працягу пяці сэкундаў — і чалавек пакрываецца халодным потам! Далейшы лёгкі ціск у працягу наступных 10 сэкундаў — і ад нечуванага зьвярынага болю гасьне сьвядомасьць «пацыента». Боль запаўняе ўсе куточкі мозгу чалавека. Боль расслабляе яго маральнае супраціўленьне. Ён як бы ўпадае ў гіпнатычны транс. Ён робіцца абыякавым да ўсяго, апрача свайго стыхійнага болю! У такім стане ён можа прадаць усё на сьвеце: чалавецтва, рэвалюцыю, родную маці, каханую дзяўчыну, сяброў-супольнікаў, вінаватых і нават бязьвінных, што таксама бывае часам патрэбна. У наступную нашу лекцыю вы ўбачыце на практыцы, як людзі няскрушнай энэргіі, нязломнай волі, непадкупнай сумленнасьці ў часе «інтэнсіўнага допыту» робяцца мяккімі, як воск, як гліна ў руках скульптара.

А н э л я . Гэта жахліва!

Ш э ф . Вам трэба прызвычаіцца.

А н э л я . Я магла б навучыцца забіваць людзей, але я ніколі не навучуся катаваць іх!

Ш э ф . Вам робіцца шкода іх?

А н э л я . Мне робіцца агідна! Ніхто з маіх продкаў не катаваў людзей.

Ш э ф . Маніце, панна Анэля! Катаваньні перайшлі да нас, як спадчына, ад вашых продкаў. Буйнейшыя магнаты-фэадалы мелі свае сакрэтныя канцыляры й засьценкі, дзе катавалі сваіх ворагаў. Наша заслуга толькі тая, што пад катаваньні мы падвялі навуковы грунт. Трэба раз назаўсёды адкінуць усялякія гуманныя пачуцьці. Меры «інтэнсіўнага допыту» прымаюцца намі ў самых крайніх выпадках. Калі ставіцца на карту існаваньне дзяржавы, нацыі і клясы, што значаць у параўнаньні з гэтым мучэньні аднаго чалавека? Мы ня можам спыніцца перад тым, што дае нам у рукі ключ да выкрыцьця вялікіх палітычных таямніц.

А н э л я . Я бачу, што трапіла ў самае «Дантава пекла». Гэтая «школа шпікоў»...

Ш э ф . Не называйце так, панна Анэля, гэта непрыгожа... Гэта... «школа канфідэнтаў».

А н э л я . Здаецца, я ня вытрымаю і зьбягу ад вас, пан шэф.

Ш э ф . Панна забываецца, што адсюль, як і з Дантава пекла, няма звароту.

А н э л я . Але клянуся вам, у мяне няма здольнасьці займацца гэтай справай. Я не магу быць у Салька, бо ён, здаецца, здагадаўся, хто я.

Ш э ф . Што вы пра яго даведаліся?

А н э л я . Яго жонка пры сьмерці.

Ш э ф . Нас гэта не цікавіць.

А н э л я . Ён адмовіўся ад кансэрваторыі і ўступіў у групу беспрацоўных музыкантаў. Яны рыхтуюць «Сымфонію гневу» Салька.

Ш э ф . Вы чулі гэтую рэч?

А н э л я . Не.

Ш э ф . Што вы даведаліся пра Касуру?

А н э л я . Ніякіх сьлядоў. Як бачыце, я не магу замяніць паліцэйскага сабаку.

Ш э ф . Панна Анэля! Што за параўнаньні?

А н э л я . Я звар'яцею ад гэтай гісторыі! Я не магу яго шукаць там, дзе ён можа быць. Я не магу пралезьці ў рабочае асяродзьдзе. Мяне адразу выкрыюць.

Ш э ф . Няўжо ж я ў вас памыліўся, панна Анэля? Я думаў, што вы будзеце маёй правай рукой.

А н э л я . Я не магу быць нават вашай левай.

Ш э ф . Слухайце, што я скажу. Галодны паход насоўваецца на сталіцу, як грозная хмара. Праз тры дні яны хлынуць на нашыя вуліцы, як саранча. А ці ведае панна Анэля, што на чале галоднага паходу стаіць яе знаёмы?

А н э л я . Касура!

Ш э ф . Але мы гэтых галодных гасьцей сустрэнем ня хлебам-сольлю, а кулямётамі прывітаем іх і браневікамі будзем адганяць ад сьценаў сталіцы. Інакшага ў нас няма выхаду.

А н э л я . Тут выбухнуць грандыёзныя дэманстрацыі.

Ш э ф . У нашым распараджэньні засталіся тры ночы. Гэта павінны быць тры Барталямэеўскія ночы. Адбудуцца масавыя арышты. За гэты час мы павінны пералавіць галоўных падбухторшчыкаў дэманстрацый. Мы будзем арыштоўваць цэлыя грамадзкія арганізацыі, дзе могуць засесьці камуністы: таварыствы дабрадзейнасьці, дапамогі, нацыянальнай школы, банку, левых прафсаюзаў...

А н э л я . Якую ролю вы мне даручаеце?

Ш э ф . Мы даручаем вам важнейшую работу. Справа ў тым, што некаторыя асобы пранюхалі, што ім пагражае, і зьніклі. Але мы добра ведаем іх падпольныя звычаі: яны хаваюцца ў кафэ-шантанах, рэстаранах, і, я ўпэўнены, — маскарад у «Гранд-Атэлі» і магчымасьць там схаваць пад маскай свой твар прывабяць не аднаго падпольшчыка. Вы павінны пайсьці на маскарад у «Гранд-Атэль».

А н э л я . Што я павінна там рабіць?

Ш э ф . Пільна сачыць за ўсімі, штурхацца сярод публікі, падслухоўваць, весьці размовы, правакаваць. Там будуць, у асобным пакоі, людзі, якім мы павінны паведамляць аб падазроных...

А н э л я . Гэта ня вельмі прыемнае даручэньне, пане шэф: у сьмелую адкрытую бойку я гатова кінуцца хоць з самім чортам, але быць падкалоднай зьмяёй, джгаць з-за вугла і наносіць удар у сьпіну — не магу!

Ш э ф . Ах, вы мая рамантычная панна! Вы хочаце, каб мы вам злавілі Касуру, паставілі супроць вас і сказалі б: распачынайце «адкрытую» бойку, панна Анэля... Падпольшчыкі ў адкрытую бойку з намі ня пойдуць. Яны пойдуць толькі тады, калі пачуюць над намі сваю сілу. А тады будзе позна.

А н э л я . Добра, я пастараюся гэта зрабіць. Але я ведаю, якая слава за «Гранд-Атэлем». Мне адной непрыстойна ісьці на маскарад. Хто будзе маім праважатым?

Ш э ф . Я гатоў суправаджаць панну.

А н э л я . О, я вельмі рада! А калі ў гэту ноч выбухне дэманстрацыя?

Ш э ф . Мы на браневіку праімчымся па вуліцах сталіцы, і вы на свае вочы ўбачыце расстрэл дэманстрацыі.

А н э л я . Цудоўна! Праімчымся ў браневіку, які сее згубу і сьмерць! Якая жудасная паездка: імчацца ў крывавым ветры!.. Я згодна...

Абраз 10

Калідор і каса кафэ-рэстарану. Ля дзьвярэй у залю лёкай, загрымаваны ў П'еро, адбірае ў публікі білеты. Праходзяць пары мужчын і жанчын, надзеўшы ў калідоры маскі. Некаторыя з гатовымі білетамі ідуць у залю, іншыя падыходзяць да касы: з залі нясецца заглушаная музыка джазу. Уваходзяць пяць падпіўшых маладых панкоў.

П а н к і (*разам напяваючы*). Мамуля, пяць білетаў дайце нам.

К а с і р ш а . Я не мамуля вам! (*Выдае білеты.*)

П а н к і (*пяюць, узяўшыся за рукі і накіроўваючыся ў залю*).

Адчыняйце, служкі, дзьверы,
Ідуць паны-кавалеры.

Ідзе мастак Казімір Цудальскі. У яго руках закручаная ў газэту карціна. Ён нерашуча падыходзіць да касы.

К а с і р ш а . Білет?

Ц у д а л ь с к і . Не, не білет... А вось, можа быць, вы купіце маю карціну? Вось, калі ласка, зірніце... Гэтая карціна можа ўпрыгожыць любы эўрапейскі музэй...

К а с і р ш а . З гэтым вы зьвярніцеся да дырэктаршы.

Ц у д а л ь с к і . А дзе дырэктарша?

Д ы р э к т а р ш а . Вы па якой справе? (*Крытычна аглядае яго гарнітур.*)

Ц у д а л ь с к і . Вы дырэктарша?

Д ы р э к т а р ш а . Я.

Ц у д а л ь с к і . Вось, калі ласка, можа вы купіце маю карціну. Мастацкая карціна, сапраўдны шэдэўр!

Д ы р э к т а р ш а . У нас досыць карцін.

Ц у д а л ь с к і . Ну, калі ласка, зірніце... Я ўпэўнены, што вы захочаце купіць. (*Распакоўвае. Дырэктарша глядзіць у лярнэт.*)

Д ы р э к т а р ш а . Карціна прыгожая. Толькі чаму ў яе фіялетавыя грудзі?

Ц у д а л ь с к і . Ультрафіялетавыя, мадам. Але зьвярніце ўвагу на яе ногі... Дзе вы бачылі такія ногі?

Д ы р э к т а р ш а . Нідзе ня бачыла.

Ц у д а л ь с к і . А торс?

Д ы р э к т а р ш а . Добра, мы купляем. Колькі хочаце?

Ц у д а л ь с к і . Колькі я хачу? (*Прыдушаным голасам.*) Тры... тысячы!

Д ы р э к т а р ш а . Злотых.

Ц у д а л ь с к і . Вядома, ня грошаў.

(Рашучаю хадою ідзе пан шэф з Анэляю. Спыніўшыся, любуюцца на карціну.)

Ш э ф . Варта большага. Але хто вам дасьць такую суму? (*Ідзе да дзьвярэй разам з паннай Анэляй.*)

Л ё к а й (*перапыняючы*). Білет?

Ш э ф (*паказвае картку. Лёкай з пашанай кланяецца*).

Д ы р э к т а р ш а . Мы ня зможам даць столькі.

Ц у д а л ь с к і . Колькі даеце?

Д ы р э к т а р ш а . Палову.

Ц у д а л ь с к і . Ваша. Ганіце манэту.

Д ы р э к т а р ш а . Што-о? Даражэнькі пане! Пры цяперашняй каньюнктуры мы манэту ня гонім. У такіх выпадках мы плацім толькі натураю.

Ц у д а л ь с к і . Як натураю?

Д ы р э к т а р ш а . Вы гэтыя паўтары тысячы можаце прагуляць у нас.

Ц у д а л ь с к і . Як прагуляць?

Д ы р э к т а р ш а . У нас прыгажэйшыя дзяўчаты, лепшае віно, смачнейшыя стравы. На гэтыя паўтары тысячы вы можаце такі закурыць дым.

Ц у д а л ь с к і . Закурыць дым! (*Кідаецца да яе.*) Пані! Вы, мусіць, ня ведаеце, што дома ў мяне галадаюць дзеці і жонка.

Д ы р э к т а р ш а . Спачуваю вам.

Ц у д а л ь с к і . Пані! Я аддаю карціну за тысячу, але чыстаганам.

Д ы р э к т а р ш а . Ніводнага злотага.

Ц у д а л ь с к і . Пані! Хай будзе так: я прагуляю ў вас пяцьсот і пяцьсот вы мне дасьцё.

Д ы р э к т а р ш а . Ніводнага злотага.

Ц у д а л ь с к і . Пані! Даражэнькая мамуля! Пашкадуйце маю сям'ю! Я прагуляю ў вас дзьвесьце і дзьвесьце вы мне дасьцё.

Д ы р э к т а р ш а . Пане мастак! Я ня матка Боская, каб мяне можна было ўпрасіць.

Ц у д а л ь с к і (*рве на сабе валасы*). Хай яе ліха возьме, гэтую маю карціну! Бярыце яе за сто і давайце мне грошы!

Д ы р э к т а р ш а (*груба*). Вось што: хай пан бярэ гэтую сваю карціну і ідзе дадому... І проша не дурыць мне галавы....

(Цудальскі, уздыхнуўшы, зрабіў некалькі крокаў у напрамку дзьвярэй, потым вярнуўся.)

Ц у д а л ь с к і . Вы — самая благая жанчына, якую я бачыў у сьвеце... Я хацеў бы намаляваць вас голаю...

Д ы р э к т а р ш а . Дзякую.

Ц у д а л ь с к і . І карціну назваць «Чад пекла».

Д ы р э к т а р ш а . Хай пан не стараецца казаць камплімэнты.

Ц у д а л ь с к і . Прагуляць у вас паўтары тысячы?

Д ы р э к т а р ш а . Як пан уважае.

Ц у д а л ь с к і . Што вы мне дасьцё на гэтую суму?

Д ы р э к т а р ш а . Мы можам даць дванаццаць найлепшых абедаў і вячэр.

Ц у д а л ь с к і . Вось што... Ці ня можаце вы гэтыя абеды адаслаць на маю кватэру?

Д ы р э к т а р ш а . Не, толькі тут можаце зьесьці разам з гасьцямі.

Ц у д а л ь с к і (*са стогнам, амаль завыўшы*). Пані. Вы маці самога шатана. Ці вам ня ўсё роўна, хто зьесьць гэтыя абеды — я з гуляшчым панствам ці мае галодныя дзеці?

Д ы р э к т а р ш а . Мы на кватэры не адсылаем абедаў. Яшчэ можам даць — тузін шампанскага, тузін лікёраў, тузін каньякоў, партвэйну...

Ц у д а л ь с к і . Досыць. Я захлынуўся ў віне. Што яшчэ?

Д ы р э к т а р ш а . Ну, і яшчэ — тузін дзяўчат. Гэта пану замнога?

Ц у д а л ь с к і . Хе-хе... Быў конь, ды зьезьдзіўся...

Д ы р э к т а р ш а . Тады хай пан сам з усіх маіх дзяўчат абярэ адну па свайму густу.

Ц у д а л ь с к і . Добра. (*Рэзкім рухам працягваючы карціну.*) Бярыце яе. (*З адчаем хапаючыся рукамі за галаву.*) Найвышні! Што за трагедыя! Карціна, якая павінна быць у Пантэоне, будзе вісець на сьценах публічнага дому!

(Запальваецца агонь у залі «Гранд-Атэлю». Шмат гасьцей. Усе ў масках, мужчыны ў чорных, жанчыны ў ружовых. Збоку стаіць Касура пад маскай, задумаўшыся, курыць сыгару. Да яго падыходзіць падпольшчык.)

П а д п о л ь ш ч ы к . Дазвольце прыкурыць. (*Прыкурвае.*) Ноч выдалася халодная...

К а с у р а . Дзень быў таксама ня цёплы… Хто тут з нашых?

П а д п о л ь ш ч ы к . Ян, Халдзей, Першая Скрыпка, Хобат.

К а с у р а . Ня можна губляць ні хвіліны. Бяжы хутчэй зараз жа да мэталістаў, папярэдзіць: галодныя за пятнаццаць кілямэтраў ад гораду. Раніцою яны будуць у нас… Камісар гораду аддаў загад, каб а 2 гадзіне ночы выступілі браневікі, кулямётамі адганяць галодных! Чуў? Трэба не дапусьціць выхаду браневікоў. А 12 гадзіне трывожны гудок на начную дэманстрацыю, і няхай ідуць да брамы сьвятога Роха! Забарыкадаваць выхад! Дзяжурыць усю ноч і, калі пад'едуць браневікі, грудзьмі легчы, а не дапусьціць, каб пралілася кроў галодных…

П а д п о л ь ш ч ы к . Я зараз…

К а с у р а . Скажы Халдзею гэта самае. Браневікі могуць пайсьці ў абход. Няхай бяжыць папярэдзіць воднікаў, транспартнікаў, швейнікаў, абутнікаў, каб выступілі на дэманстрацыю і ўсю ноч пільнавалі Браму Ўсходнюю да прыходу галодных. Ах, чорт!.. Ён тут!.. Цсс…

П а д п о л ь ш ч ы к . Хто?

К а с у р а . Сам…

П а д п о л ь ш ч ы к . Ня можа быць! Дзе?

К а с у р а . Падышоў да стала, зьлева, зь дзяўчынай. Бачыш? Я пазнаю яго плечы. Трэба ўцякаць. Ён тут няспроста… Аблава?

П а д п о л ь ш ч ы к . Ах, чорт! Шкада, што трэба бегчы… А ў мяне ідэя.

К а с у р а . Якая?

П а д п о л ь ш ч ы к . Прыкінуцца п'яным, галавой яму ў жывот — рраз! Потым па мордзе — хрась! Дзьве сэкунды і ўся апэрацыя!

К а с у р а . Бязглуздая твая ідэя! Можам засыпацца. Зразумеў?

П а д п о л ь ш ч ы к . Ну, чорт зь ім. Хай ходзіць зь непабітай мордай.

К а с у р а . Скажы хлопцам, каб уцякалі праз чорны ход. Калідор па сходнях налева.

(Адчыняюцца дзьверы. У залю ўваходзіць мастак Цудальскі. Ён бяз маскі. За ім лёкаі нясуць некалькі кошыкаў віна.)

Ц у д а л ь с к і (*спыніўшыся, разводзіць рукамі*). Ого! Якое цікавае таварыства! Шыкоўныя дамы вышэйшага сьвету, распусьніцы, п'янчугі і сутэнёры! А, пане ксёнджа! Вас не ратуе маска: я пазнаю вас.

К с ё н д з (*адцягнуўшы мастака, ціха*). Як вы пазналі? Няўжо маска кепска хавае мой твар?

Ц у д а л ь с к і . Ад вока мастака не схавацца: вы схавалі свой твар, але трэ было таксама схаваць і зад.

К с ё н д з . Што?

Ц у д а л ь с к і . Я пазнаў вас адразу. (*Кінуўшы ксёндза, ідзе на сярэдзіну залі.*) Гэй, музыка! Грай! Джаз! Рэж! Смалі! Сёньня я, Казімір Цудальскі, — круль польскі, гультай, гуляка, распусьнік і вар'ят! Гэй, джаз-бандыты, іграйце! Я расплачваюся натураю. Лаві. (*Кідае бутэлькі нэграм, тыя ловяць і пачынаюць іграць нейкую адчайную ліхаманкавую музыку. Мастак аслупянеў, потым мімаволі пачынае скакаць, як аўтамат.*)

Ц у д а л ь с к і (*схапіўшыся за галаву, крычыць*). Музыка Дантава пекла. Што за крывавыя гукі! Клянуся гонарам, я напішу карціну, якая ня сьнілася Пікасо і Чурлёнісу, — «Джаз праклёну»!.. Іграюць страшэнныя пачвары, прыматы людзей з ашчэранымі зубамі, з грымасамі болю. Іграюць джаз, а іх б'юць бізунамі, каб яны скавыталі пад музыку і гралі, пакуль ня здохнуць. І пад гэты «Джаз праклёну», як самнамбулы, скачуць людзі са скажонымі тварамі. Яны скачуць свой танец сьмерці! Яны датанцоўваюць свой век!

Д ы р э к т а р ш а (*да Цудальскага*). Я пакажу вам сваіх дзяўчат. Можаце выбраць…

Ц у д а л ь с к і . Давайце, мамуля! Я выберу самую лепшую. Вока мастака не ашукае. (*П'е шампанскае і набівае кішэні цукеркамі.*)

(Дырэктарша пляскае ў далоні. На сцэну ў зьвіўным танцы выплываюць дзяўчаты. Яны робяць аднолькавыя рухі і дзіўнай гірляндай круцяцца каля мастака.)

Ц у д а л ь с к і (*аслупянеў*). Цэлы эскадрон ба-аб!

Д ы р э к т а р ш а . Ну, якую?

Ц у д а л ь с к і (*тыцнуў пальцам*). Вось гэтую! (*Да мастака падыходзіць вельмі стройная прыгожая дзяўчына і робіць кніксэн.*)

Ц у д а л ь с к і . Якая дзіўная натуршчыца!

Д ы р э к т а р ш а . У пана мастака вельмі тонкі густ.

(Зноў зайграла музыка. Мастак скача зь дзяўчынай. На астатніх дзяўчат накідваюцца госьці і скачуць зь імі. Да Касуры падыходзіць маленькая жанчына.)

М а л е н ь к а я ж а н ч ы н а . Маска! Што ты не танцуеш? Я хачу з табою скакаць!

К а с у р а (*сьмяецца*). Крупінка! Ты заплутаесься ў маіх нагах!

М а л е н ь к а я ж а н ч ы н а . Ня бойся. Я люблю мужчын, якія ў два разы большыя за мяне.

К а с у р а . Сьцеражыся, яны пашкодзяць твайму здароўю.

М а л е н ь к а я ж а н ч ы н а . Я маленькая, але не баюся вялікіх. Давай, я цябе пакахаю…

К а с у р а . Ха, ха, ха. Ты будзеш ваўчком круціцца ад каханьня.

М а л е н ь к а я ж а н ч ы н а . Табе ж лепей.

К а с у р а (*сьмяецца*). Адчапіся ты, дзяўчынка з журавінку! Кахайся з карлікам, пігмэем, ліліпутам. (*Зьнікае сярод гасьцей.*)

А н э л я (*схамянуўшыся*). Дзе я чула гэты сьмех? (*Кідаецца ў гушчу гасьцей.*) Хто? Хто? Хто толькі што сьмяяўся тут? Пакажыце мне гэтага чалавека.

М а с к а . Навошта ён паньне?

А н э л я . Я хачу бачыць чалавека, які так заразьліва сьмяяўся.

М а с к а . Панна хоча заразіцца чужым сьмехам, бо не хапае свайго?

А н э л я . Мне няма калі гутарыць з вамі. Вы бачылі яго?

М а с к а . Бачыў.

А н э л я . Дзе ён?

М а с к а . Гэта я.

А н э л я (*зіркліва глядзіць*). Хлусіце!.. Засьмейцеся…

М а с к а . Гі-га-га-га-га!

А н э л я . У вас — сьмех ідыёта. (*Пайшла ад яго.*)

М а с к а (*ёй усьлед*). Ага! Баісься заразіцца ідыёцкім сьмехам. (*Хутка зьнікае.*)

А н э л я (*шэфу ціха*). Загадайце зачыніць дзьверы. Ён тут.

Ш э ф . Хто?

А н э л я . Касура. Я чула яго сьмех.

Ш э ф . Дзе ён?

А н э л я . Я не магу яго распазнаць сярод гасьцей. Але ён тут, гатова паклясьціся.

Ш э ф . Зараз ён будзе ў нашых руках. (*Абое зьнікаюць. Музыка жвава іграе. Пары круцяцца. Шэф рашучымі крокамі ідзе на сярэдзіну залі, становіцца на крэслы.*)

Ш э ф (*падняўшы руку ўгару, грамавым голасам*). Увага!.. Шаноўныя панове! Па нашых зьвестках, сярод нас прысутнічае буйны дзяржаўны злачынца, якога шукае паліцыя. Ён павінен быць зараз жа апазнаны і арыштаваны. Ні зь месца ўсе, хто тут ёсьць! Дзьверы зачынены. Я — шэф паліцыі. (*Здымае зь сябе маску.*) У імя закону загадваю ўсім мужчынам стаць у рад і зьняць маскі.

Ц у д а л ь с к і (*валяючы дурня*). Зважа-ай! Рады здвой!

(Шэф зьнішчальна глядзіць на яго. Раптам шарэнгу мужчын пакінула адна маска і рашуча зрабіла два крокі да шэфа.)

М а с к а (*з арыстакратычнымі жэстамі і інтанацыямі*). Гэта нечуваная нахабнасьць — псаваць нам вечар! Я пратэстую! Заяўляю катэгарычна: я не здыму маскі! Я жадаю захаваць інкогніта!

Ш э ф . Спакой дзяржавы важней за інкогніта шаноўнага пана! Загадваю зьняць!

М а с к а . Я не здыму! Мне наплявaць на вашых дзяржаўных злачынцаў. Арыштоўвайце іх, дзе хочаце, але проша не перашкаджаць мне забаўляцца!

Ш э ф . Я арыштую пана!

М а с к а . Рукі кароткія, шаноўны шэф!

Ш э ф . Арыштаваць яго! (*Паліцыянты бяруць маску за рукі.*)

М а с к а . Пусьціце!.. (*Рашуча і цьвёрда падыходзіць да шэфа. Ціха.*) Я — граф Патоцкі!

Ш э ф (*аслупянеўшы, стаўшы ва фрунт*). Ваша сьветласьць! Прашу прабачэньня! Я ня мог распазнаць адразу.

М а с к а . Калі ласка. (*Становіцца ўбок.*)

2 - я м а с к а (*да шэфа*). Хай будзе дазволена і мне захаваць сваё інкогніта. (*Ціха.*) У інтарэсах касьцёлу...

Ш э ф . Хто вы?

2 - я м а с к а (*ціха*). Ксёндз Янста...

Ш э ф . Ваша прападоб'е... Калі ласка.

(Астатнія мужчыны здымаюць маскі.)

Ш э ф (*да панны Анэлі*). Апазнайце яго.

А н э л я (*перагледзеўшы ўсіх*). Няма... Яго няма тут...

Ш э ф . Так што ж вы?..

А н э л я . Я памылілася.

Ц у д а л ь с к і . Ага, памылілася, сьцервачка!

Ш э ф . З панны ніколі ня выйдзе добрага шпіка.

А н э л я . Пан шэф сказаў мне каштоўны камплімэнт.

Ш э ф . Шаноўныя панове! Здарылася памылка. Злачынца пасьпеў зьнікнуць. Прашу прабачэньня. Музыка, іграй! Прашу танцаваць і забаўляцца так, як і раней.

(Зноў зайграла музыка. Закруціліся пары, зьнікаючы ў асобных кабінэтах. Мастак застаецца адзін зь дзяўчынай. Ён падводзіць яе да стала.)

Ц у д а л ь с к і (*налівае шампанскага*). Пі! (*Яна п'е. Мастак падсоўвае ёй розныя стравы.*) Еш! (*Яна есьць.*) Што ты такая маўклівая? Скажы што-небудзь.

Д з я ў ч ы н а (*басам*). Бу, бу, бу, бу...

Ц у д а л ь с к і . Ой, маўчы, лепш маўчы! У цябе голас, як іржавыя завалы склепу, дзе ляжаць мерцьвякі! Што ты сказала?

Д з я ў ч ы н а (*басам*). Дай мне цукерак.

Ц у д а л ь с к і . Цукерак? Так, цукерак.... (*Шукае на стале.*) Дзе ж яны падзеліся?.. А, вось... (Дастае з кішэні.) Гэта я ўзяў сваім дзецям.

(Дзяўчына есьць цукеркі.)

Ц у д а л ь с к і . Як завуць цябе?

Д з я ў ч ы н а. Гандзя.

Ц у д а л ь с к і . Ах, ізноў гэты голас!.. Маўчы!.. Ты такая прыгожая. Ты гэтак хораша... У тваім целе тонкае мастацтва геніяльнага скульптара!

Д з я ў ч ы н а . Бу, бу, бу, бу...

Ц у д а л ь с к і . Маўчы, маўчы... Гандзя. Тваё цела найвялікшы шэдэўр! Але ў тваім голасе ўся гніль праклятага сьвету! Піць! Піць! (*П'юць.*) А цяпер абнімі мяне моцна, моцна!.. Мацней! Так! (*Падхапіўшы яе.*) А цяпер скакаць! Я буду скакаць, пакуль не парвецца маё сэрца! Гэта быў бы нядрэнны фініш сэрца мастака. (*Музыка іграе. Мастак адчайна скача. Паволі гасьне сьвятло.*)

А н э л я . Не, вы не разумееце мяне. Я пачынаю ўсіх ненавідзець і больш за ўсіх самую сябе. Я ня ведаю, куды ісьці. У вёску я ўжо не вярнуся: там засталіся адны ненавісныя хлопы, зь якімі распраўляецца цяпер карная экспэдыцыя... А што тут у гэтым горадзе? Ненавісныя мне рабочыя і агідныя буржуа? Куды ісьці?

Ш э ф . Ідзіце да нас. Вам няма іншага выхаду.

А н э л я . Дык я ж і прыйшла да вас. Вы ж бачыце?

Ш э ф . Панна Анэля. Я дасюль не магу зразумець, чаго вы хочаце. За якую ідэю вы гатовы аддаць сваё жыцьцё?

А н э л я . Я хацела б, каб зноў па ўсёй айчызьне паўсталі нашы чароўныя замчышчы, аб якіх плакаў Шапэн...

Ш э ф . І каб вы былі ўладаркай такога замку? І каб лёкаі гнулі сьпіны і хлопцы поўзалі перад вамі?

А н э л я . Ну і няхай гнуць сьпіну. Адны народжваюцца, каб горда несьці галаву і загадваць, а другія — каб поўзаць ніцма і лізаць прах з нашых ног.

Ш э ф . Чакайце... Што гэта?

(З вуліцы чуваць далёкі шум і глухія крыкі натоўпу. Начная дэманстрацыя? Што такое?..)

А н э л я . Ідзем адсюль... Хутэчй у агульную залю!..

(Шэф і Анэля па сходнях зьбягаюць уніз. Загрукалі дзьверы асобных кабінэтаў «Гранд-Атэля». Бягуць уніз устрывожаныя госьці. У агульнай залі яшчэ грае джаз, круцяцца пары, і раптам наперарэз джазу з вуліцы пачулася іншая музыка — глухое пяяньне і крыкі.)

Ш э ф . Ціха. Што там за гоман на вуліцы?

(Джаз перастае іграць. Усе напружана слухаюць. З вуліцы чуваць нястройны гул натоўпу, крыкі: «Хлеба-а. Хлеба-а. Работы». Песьня «Галодныя сем'і, ідзіце на вуліцы» набліжаецца.)

Ц у д а л ь с к і . Ціха! Гэта галодны марш беспрацоўных. Яны ідуць сюды. (*Моўчкі цягне сурвэтку са стала разам з бутэлькамі, тортамі і рознымі стравамі, узвальвае сабе на плечы — накіроўваецца да дзьвярэй.*)

Д ы р э к т а р ш а . Што такое? Куды вы?

Ц у д а л ь с к і . Іду сустракаць галодных з хлебам-сольлю.

Д ы р э к т а р ш а . Ён звар'яцеў! Адбярыце ў яго!

(Лёкаі накідваюцца на мастака. Мастак адбіваецца нагамі. Лёкаі б'юць яго і зноў накрываюць стол. І раптам пачуліся глухія ўдары ў дзьверы.)

К р ы к і . Ах! Ой! Ой! Трымайце дзьверы! Моцна! Езус Мар'я! Загасіце сьвятло! Ціха! Матка найсьвентша! Пан Езус!..

(Госьці прыціснуліся да сьцяны. Лёкаі кідаюцца завальваць дзьверы. Сьвятло гасьне. Застаецца гарэць адзін сіні ліхтар. Усе, згрудзіўшыся каля сьцяны, глядзяць у вар'яцкім страху на дзьверы.)

Д ы р э к т а р ш а . Пане мастак, нясіце ім хлеб-соль...

(У дзьверы пасыпаліся страшныя ўдары.)

Ц у д а л ь с к і . Нясі ім цяпер сама хлеб-соль.

Ш э ф (*кінуўшыся да тэлефона*). Два дзевяноста чатыры! Конная паліцыя? Гаворыць шэф палітычны. Зараз жа выслаць узвод паліцыянтаў для разгону дэманстрацыі галодных, якія разьбіваюць «Гранд-Атэль». Што? Празь 15 хвілін? Загадайце расстрэльваць бязь літасьці! Рубаць шаблямі! На крывавую кашу! Што? Што? Як мага хутчэй!

А н э л я . Што ж вы спалохаліся? Шляхта вы ці статак баязьліўцаў? Дзе ваша зброя, панове? Дзе вашы шляхецкія шпагі? Ня ведаеце, як сустрэць сваіх ворагаў? Залпам! (*Некалькі паноў вынялі рэвальвэры.*)

Ц у д а л ь с к і . Прэч рэвальвэры. Гэта галодныя. (*Бутэлькай выбівае ў некаторых рэвальвэры.*)

(У дзьверы зноў пасыпаліся хуткія ўдары.)

Д ы р э к т а р ш а . Я баюся! Баюся! Баюся гвалту!

(Жанчыны падымаюць віск і лямант.)

Ш э ф . Ціха. Нам толькі 10 хвілін пратрымацца. Высланы атрад коннай паліцыі. Пане ксёнджа, вы ўмееце гаварыць з народам. Запрасіце іх, калі ласка, адчыніце ім дзьверы.

К с ё н д з (*накіроўваючыся да дзьвярэй*). Хай Бог збавіць нас ад няшчасьця. (*Скрыжаваўшы рукі на грудзях.*) Панове галодныя і беспрацоўныя. Мы гасьцінна адчыняем вам дзьверы забаў і радасьцей чалавечых. У імя пана Бога, заходзьце, калі ласка.

(Адчыняе дзьверы. Усе аслупянелі: замест страшнай ватагі галодных уварваўся толькі адзін чалавек, тоўсьценькі, нізенькі гандляр-буржуйчык, напалоханы да апошняй ступені.)

Г а н д л я р (*адчайна махаючы тросткай і вольнаю рукою*). Славу богу! Славу богу! Я жывы! Жывы!

Ш э ф . Што такое? Адкуль вы? Хто вы?

Г а н д л я р . Толькі што мяне хацелі забіць! Мяне абрабавалі! Мой гастранамічны магазын разьбілі!

Ц у д а л ь с к і . Хто? Хто?

Г а н д л я р . Яны! Адкуль я ведаю — хто? Бандыты! Рабаўнікі! Злодзеі! Іх было чалавек дзесяць. З ломамі ў руках уварваліся ў магазын. Па вуліцы ішла дэманстрацыя. Яны выкарысталі гэтую сумятню! Спустошылі мой магазын! Як зьвяры накінуліся на мае прадукты! Яны жэрлі маю асятрыну! Маю сёмгу! Маю ікру! Ой, ёй, ёй! Шкода, што ў мяне не было акулаў: яны зьелі б іх з хвастамі! Мае каўбасы і кансэрвы яны забралі ў мяхі. Калі ў магазыне ўжо нічога не засталося, убачылі, што яшчэ застаўся я! Я сядзеў у бочцы ні жывы, ні мёртвы! Дык яны выцягнулі мяне! Гвалт! Яны трасьлі мяне загрудкі! Яны называлі мяне «буржуем і печаным гадам»! Як вам гэта падабаецца? Я — «печаны гад»!

Ц у д а л ь с к і . Ты — недапечаны!.. Цьфу!

Г а н д л я р . Потым мяне каленам выштурхнулі за дзьверы. Я пабег уцякаць. За мною гналіся! Я падбег сюды і пачаў стукаць. Чаму мне так доўга не адчынялі?

Ш э ф . Куды пайшла дэманстрацыя?

Г а н д л я р . Туды! Усе пабеглі туды!

Ш э ф . Хутчэй у аўтамабіль! (*Шэф і панна Анэля выбягаюць на вуліцу. За імі ўсьлед кідаецца Цудальскі. Шэф хапае яго за руку.*) Куды вы?

Ц у д а л ь с к і . На дэманстрацыю. Я хачу ісьці з дэманстрантамі.

(Шэф груба адштурхоўвае яго. Сцэна акунаецца ў змрок. У абсалютнай цемры парывы і дзікае скавытаньне ветру, тупат людзей. Далёкі гул натоўпу, і раптам пачуўся глухі залп і заляскатаў кулямёт. Сярод наступіўшай напружанай цішы пачуўся нечы зларадасны голас: «Так, так, так, так»...)

[1933]

ЗЬВЕСТКІ ПРА АЎТАРАЎ



Васіль Дранько-Майсюк — драматург, дасьледнік літаратуры, пэдагог, актор, літаратурны рэдактар часопісаў «Вясёлка» і «Буся». Нарадзіўся ў 1981 г. у Давыд-Гарадку. Закончыў БДУКіМ (культуроляг) і БДАМ (рэжысэр драмы). Працаваў акторам і выкладчыкам акторскага майстэрства ў тэатрах Масквы і Менску. Напісаў п'есу «Пясьняр» (2013), якая з посьпехам ідзе на сцэне НАДТ імя М. Горкага і мае шэраг узнагарод. Публікуе літаратуразнаўчыя і крытычныя артыкулы ў часопісах «Верасень», «Дзеяслоў», «Тэксты», газэтах «Літаратура і мастацтва», «Літаратурная Беларусь», «Культура». Праводзіць інтэрактыўна-тэатралізаваныя імпрэзы, прысьвечаныя дзеячам беларускай культуры.



Віктар Жыбуль — літаратуразнаўца, архівіст, паэт. Кандыдат філялягічных навук. Нарадзіўся ў 1978 г. у Менску. Закончыў філялягічны факультэт БДУ, асьпірантуру. Працаваў у рэдакцыях часопісаў «Першацьвет», «Роднае слова», «ARCHE». З 2009 г. — вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага архіву-музэю літаратуры і мастацтва. Аўтар некалькіх кніг паэзіі і больш як 150 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў. Адзін з заснавальнікаў і галоўны рэдактар кніжнай сэрыі «Сьвятлацені» (выдавецтва «Галіяфы», з 2018), прысьвечанай літаратуры міжваеннага пэрыяду. Ляўрэат літаратурнай прэміі «Залаты апостраф — 2011», Міжнароднай адмеціны імя Давіда Бурлюка (2013), «Празрысты Эол» (2019) у намінацыі «Літаратуразнаўства».



Ганна Кавалёва — дасьледніца, гісторык. Нарадзілася ў 1984 г. у Менску. Закончыла Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт і Беларускі калегіюм. У 2012–2017 гг. галоўны рэдактар парталу Беларускага архіву вуснай гісторыі, адна са стваральнікаў Клюбу вуснага гісторыка, аўтарка шэрагу артыкулаў для Віртуальнага музэю савецкіх рэпрэсіяў, суарганізатарка і сакратарка навуковых канфэрэнцыяў, у тым ліку прысьвечаных тэме масавых рэпрэсіяў у СССР.



Вольф Рубінчык — перакладнік, палітоляг, публіцыст. Нарадзіўся ў 1977 г. у Менску. Закончыў Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт па спэцыяльнасьці «Паліталёгія» (1999), асьпірантуру РІВШ БДУ (2002). Працаваў рэдактарам часопісу, выкладчыкам, сацыёлягам, паштальёнам. Займаўся публіцыстыкай, выдаваў газэту «Анахну кан» (2002), часопіс «Шахматы-плюс» (2003–2004) і бюлетэнь «Мы яшчэ тут!» (2003–2009), супрацоўнічаў з часопісамі «ARCHE» і «Роднае слова». Перакладае пераважна зь ідышу (М. Кульбак, Л. Найдус, М. Фэльзэнбаўм, І. Харык, Шолам-Алэйхем і інш.), ангельскай і французскай моваў. Аўтар шэрагу кніг, адказны за выпуск некалькіх зборнікаў яўрэйскай паэзіі.



Антон Рудак — гісторык, літаратар. Нарадзіўся ў 1989 г. у Менску. Закончыў Нацыянальны гуманітарны ліцэй, гістарычны факультэт БДУ і Школу маладога пісьменьніка пры Саюзе беларускіх пісьменьнікаў. У 2014 г. выдаў кнігу вершаў «Верхні горад» (2014).



Ганна Севярынец — гісторык літаратуры, пісьменьніца, выкладчыца. Нарадзілася ў 1975 г. у Менску. Закончыла філялягічны факультэт БДУ, асьпірантуру пры катэдры расейскай літаратуры. З 2015 — аўтар і вядоўца праекту «Чытаем сваё. Клясыка». Укладальніца дакумэнтальнай біяграфіі «Уладзімер Дубоўка. Ён і пра яго», кнігі Алеся Дудара «Выбраныя творы», дакумэнтальнага дасьледаваньня «Вакол Пятра Глебкі», раману «Гасьцініца Бельгія». Ляўрэат прэміі «Гліняны Вялес» (2017) за раман «Дзень сьвятога Патрыка».



Аляксей Стрэльнікаў — тэатразнавец, крытык, выкладчык, арт-мэнэджар. Кандыдат мастацтвазнаўства. Нарадзіўся ў 1983 г. Закончыў факультэт журналістыкі БДУ, асьпірантуру Акадэміі мастацтваў. Кіруе праектамі Цэнтру экспэрымэнтальнай рэжысуры, у 2015–2018 гг. выкладаў беларускую літаратуру ў Інстытуце журналістыкі БДУ. Рэжысэр экспэрымэнтальнага тэатру «Галава-Нага».


Андрэй Хадановіч — паэт, перакладнік, эсэіст. Нарадзіўся ў 1973 г. у Менску. Закончыў філялягічны факультэт БДУ, асьпірантуру. Перакладае з ангельскай, французскай, польскай, украінскай моваў. Выкладае літаратуру ў БДУ. Вядзе заняткі «Перакладніцкай майстэрні». Аўтар васьмі кніг паэзіі для дарослых і адной кніжкі для дзяцей. Укладальнік кнігі Юлія Таўбіна «Выбранае» (2017). Ляўрэат прэміі «Кніга году — 2016» (за дзіцячую кнігу «Нататкі таткі») і прэміі імя К. Шэрмана 2017 году (за пераклад кнігі вершаў Шарля Бадлера).



Язэп Янушкевіч — літаратуразнавец, дасьледнік-архівіст, археограф, перакладнік. Кандыдат філялягічных навук. Нарадзіўся ў 1959 г. у м. Ракаве Валожынскага р-ну Менскай вобл. Закончыў філялягічны факультэт БДУ, асьпірантуру пры Інстытуце літаратуры АН Беларусі, у якім застаўся як навуковы супрацоўнік. Працаваў таксама загадчыкам аддзелу археаграфіі Беларускага НДІ дакумэнтазнаўства і архіўнай справы, на грамадзкіх асновах быў намесьнікам галоўнага рэдактара выдавецтва «Беларускі кнігазбор»; намесьнікам, а потым выканаўцам абавязкаў старшыні археаграфічнай камісіі Камітэту архіваў і справаводзтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусі; старшынём Беларускага літаратурнага фонду. Аўтар шматлікіх кніг і навуковых працаў пра жыцьцё і творчасьць В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, П. Багрыма, К. Каліноўскага, Ул. Караткевіча, В. Ластоўскага ды інш. Ляўрэат прэміі імя Лява Сапегі (Варшава, 2007).




Сяргей Будкін – аўтар ідэі, кіраўнік і прадусар праекту «(Не)расстраляныя». Арт-мэнэджар, аўтар і прадусар больш чым 100 праектаў: канцэртаў, фэстываляў, кінапаказаў, лекцый, тэлешоў, радыёпраграмаў, інтэрнэт-старонак. Сярод іх — партал Tuzinfm.by, праграма «Belsat Music Live», праект «Тузін.Немаўля», прысьвечаны клясыцы беларускага нямога кіно, праект супраць сьмяротнага пакараньня «Апошні золак», музычныя праекты «Перазагрузка», «Re:Песьняры», дакумэнтальны фільм «Ненаўмысны шэдэўр», адукацыйны музычна-паэтычны конкурс «Засьпявай.by», праекты, прысьвечаныя творчасьці Анатоля Сыса, Сяргея Вітушкі, Міхала Анемпадыстава ды інш.



Аўтар фота Nickolai Rozengauz.

«НЕРАССТРАЛЯНЫЯ». МУЗЫЧНЫ АЛЬБОМ



Akute — Я цябе пакахаў (на словы Анатоля Вольнага)
Vuraj — Настроі (на словы Юркі Лявоннага)
Зьміцер Вайцюшкевіч — Будучыня (на словы Ўладыслава Галубка)
Лявон Вольскі — Ты помніш (на словы Юлія Таўбіна)
Vinsent — Мэтрапалітэн (на словы Зямы Піваварава і на ўласныя словы)
Dzieciuki — Бунтар (на словы Міхася Чарота)
Кацярына Ваданосава — Белы сад (на словы Алеся Дудара)
Павал Аракелян — Гультай (на словы Майсея Кульбака)
Relikt — Пра чорныя вочы (на словы Міхася Зарэцкага)
Naka — Адыйшоўшым (на словы Валерыя Маракова)
TonqiXod — Імчы, цягнік (на словы Тодара Кляшторнага)
Сьвятлана Бень — У шэрым змроку (на словы Ізі Харыка)
N.O.I.R./Stern — Восень (на словы Цішкі Гартнага)
Whiskey Way — У гэту ноч (на словы Сяргея Фаміна)
Zanzibar — Вятры (на словы Сяргея Астрэйкі)
Закон Гука — Пішы (на словы Вацлава Ластоўскага)
Вера Бурлак — Дарога (на словы Сяргея Мурзо)

Каманда праекту:

Сяргей Будкін — аўтар ідэі, кіраўнік, прадусар праекту
Віктар Жыбуль — укладальнік і рэдактар кнігі
Анатоль Лазар – мастацкае афармленьне кнігі
Сяргей Кандраценка – вёрстка кнігі
Эліна Калнібалоцкая, Хрысьціна Дарапей — мэнэджмэнт праекту
Вінцук Вячорка — моўны рэдактар кнігі
Арцём Лобач — рэжысэр прома-відэа
Аляксандар Алейнікаў — апэратар
Аляксей Сіпачоў — відэа і стрым лекцыяў
Яўген Шапчыц — відэа
Андрэй Акатаў, Павал Сініла — гукарэжысэры
Наста Шастак — стыль праекту, афішы лекцыяў
Кацярына Пікірэня — дызайн «маўклівых кніг»

Аўтары кнігі «(НЕ)РАССТРАЛЯНЫЯ» і вядоўцы лекцыяў:

Віктар Жыбуль, Андрэй Хадановіч, Ганна Севярынец, Вольф Рубінчык, Аляксей Стрэльнікаў, Антон Рудак, Васіль Дранько-Майсюк, Язэп Янушкевіч, Ганна Кавалёва

Рэцэнзэнт:

прафэсар Ірына Раманава

Партнэр праекту — кнігарня «Логвінаў»
Выдавец — выдавецтва «Янушкевіч»

Акторы:

Павал Харланчук, Алена Гіранок, Андрэй Саўчанка

Аўтары музыкі да праекту:

Лявон Вольскі, Сьвятлана Бень, Кацярына Ваданосава, Vinsent, Зьміцер Вайцюшкевіч, Павал Аракелян, Вольга Падгайская, Вера Бурлак, Павал Харэвіч, гурты Naka, Akute, Dzieciuki, TonqiXod, Relikt, Vuraj, Zanzibar, «Закон Гука», праект N.O.I.R/Stern (Беларусь — Францыя — Ізраіль).

Асаблівыя падзякі:

Ганьне Кавалёвай, Яніне Будкінай, Паўлу Бераговічу, Андрэю Янушкевічу, Сяргею Макарэвічу, Кацярыне Пікірэні, Ігару Логвінаву, Паўлу Касьцюкевічу і кнігарні «Логвінаў», Аляксею Цітовічу, Анжаліцы Венскай, Зьмітру і Насьце Дашкевічам ды кампаніі «Цесьляры», Аляксею Адамовічу, Насьце і Юрасю Юркевічам, Зьмітру Прэдку, Віталю Броўку і пабу «Torvald» (Віцебск), Зьмітру Назараву, Яўгену Меркісу, Ганьне Гаер, Генадзю Кісламу, Дзьмітрыю Еліну, Вацлаву Чорнаму, Юліі Лысковай, Яўгену Шапчыцу, Ганьне Ігнаценцы, Зьмітру Гарачку, Стэфану Эрыксану, Фэліксу Аксёнцаву, Паўлу Касько, Сержу Адзінцу, Вользе Гуляевай, Ігару Стальчынскаму, Насьце Грышчук, Дар'і Бялькевіч, Кастусю Лашкевічу, Марыне Рахлей, інтэрнэт-краме «Мінскер», краме «LSTR Adzieńnie», Мікалаю Маторыну, Алёне Варанец і паб-клюбу «Графіці» (Менск), Яўгеніі Рамановіч і «Дому 46» (Гародня), Алесю Сьнегу, цэнтру «Кола» (Магілёў), Сяргею Палажанку і клюбу «Брюгге» (Менск), Беларускаму інстытуту навукі і мастацтва імя Скарыны (Таронта, Канада) і ўсім, хто ўнёс сваю бонду на плятформах Talaka.by і Ulej.by.


TUZINFM.BY
СЛУШНЫ МУЗЫЧНЫ


ЯНУШКЕВІЧ
выдавецтва


ЛОГВІНАЎ
кнігарня


ВЯРТАННЕ




Радыё Свабода
svaboda.org


графіці
зав.Каліініна, 16


LSTR ADZIEŃNIE


CESLIARY.BY


БЕЛСАТ tv
BELSAT